МОВА ВЫДАННЯЎ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

МОВА ВЫДАННЯЎ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ



МОВА ВЫДАННЯЎ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ


BC

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА АН БССР

А. М. БУЛЫКА, А. І. ЖУРАЎСКІ,
У. М. СВЯЖЫНСКІ

МОВА ВЫДАННЯЎ



МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1990

ББК 81.2Бел.
Б 90

Работа посвящена 500-летию со дня рождения Ф. Скорины. В ней дается общая характеристика белорусского литературно-письменного языка эпохи Скорины. В результате изучения непосредственно по оригиналам пражских книг Скорины показаны орфографические и фонетические особенности этих изданий, выявлено соотношение церковнославянских, белорусских и западнославянских элементов в системе существительных, прилагательных, числительных, глаголов. Отдельный раздел посвящен изучению лексики скорининских книг.

Адресуется филологам, специалистам в области истории белорусского языка, всем, кто занимается изучением исторического прошлого белорусского народа.

А ў т а р ы:
А. М. Булыка («Арфаграфія», «Лексіка»),
А. І. Жураўскі («Уступ», «Дзеяслоў», «Заключэнне», «Дадатак»),
У. М. Свяжынскі («Назоўнік», «Прыметнік», «Займеннік», «Лічэбнік»)

Р э д а к т а р
член-карэспандэнт АН БССР А. І. Жураўскі

Р э ц э н з е н т ы:
д-р філал. навук А. П. Груцо,
канд. філал. навук П. А. Міхайлаў

Б $\frac{4602020100-110}{M316(03)-90}$ 140—90

ISBN 5-343-00447-4

© А. М. Булыка, А. І. Жураўскі,
У. М. Свяжынскі,
1990

УСТУП

У навуковай скарыніяне ўжо даўно належнае месца займаюць пытанні мовы беларускага першадрукара Францыска Скарыны. У мінулым на працягу доўгага часу важнейшым даследаваннем аб мове Скарыны заставаўся спецыяльны раздзел у фундаментальнай манаграфіі П. У. Уладзіміра, апублікаванай у канцы XIX ст. [20, с. 247—317]. Скарынінскія выданні Уладзіміраў разглядаў як помнікі беларускай мовы пачатку XVI ст.: «Скарына называе сваю мову — «рускай мовай», адрозніваючы ў Псалтыры 1517 года «рускія словы» ад «мовы славенскай». Тую ж самую назву «руская мова» мы заўсёды сустракаем у помніках паўднёва-заходняй Расіі XVI стагоддзя. Між тым паходжанне Скарыны з Полацка, сувязі з Вільняй і заснаванне тут першай рускай друкарні надаюць асаблівае значэнне працам Скарыны з боку мовы — значэнне помнікаў беларускай мовы пачатку XVI стагоддзя. З гэтага пункту погляду і належыць разглядаць працы Скарыны ў адносінах да рускай мовы» [20, с. 247].

У адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй П. У. Уладзіміраў добрасумленна выбраў з выданняў Скарыны важнейшы беларускі моўны матэрыял і забяспечыў яго адпаведным тлумачэннем. Але даследчык менш за ўсё цікавіўся тым, якое месца займае гэты матэрыял у агульнай сістэме скарынінскай мовы. У сувязі з гэтым рэцэнзенты Уладзіміра зусім слушна адзначалі, што характарыстыка мовы Скарыны ў Уладзіміра атрымалася невыразнай, і для чытача застаецца няясным, ці сапраўды ў выданнях Скарыны трэба бачыць гутарковую мову адукаваных беларусаў таго часу, ці гэта быў штучны жаргон, створаны з эклектычнага спалучэння беларускай, царкоўнаславянскай, польскай і чэшскай моў [35, с. 256—257; 9, с. 34; 50, с. 324—328].

Многія пазнейшыя даследчыкі свае меркаванні адносна мовы Скарыны грунтавалі выключна або пераважна на матэрыяле П. У. Уладзіміра. Не пазбегнуў гэтага нават і буйнейшы беларускі філолаг Я. Ф. Карскі, які самастойна выданні Скарыны не вывучаў, карыстаўся толькі матэрыялам Уладзіміра і таму цалкам падзяляў погляд свайго папярэдніка [28, с. 24]. Некаторыя пазнейшыя даследчыкі імкнуліся абгрунтаваць погляд на

Скарыну як на заснавальніка беларускай літаратурнай мовы старажытнай пары. Гэты погляд у пасляваенны час атрымаў развіццё ў спецыяльным артыкуле Ц. Ломцева [31, с. 7—13]. Падобную ацэнку Скарыне некалькі пазней даў і М. А. Алексютовіч, на думку якога Скарына быў першым дзеячам беларускай культуры, які выкарыстаў моўны матэрыял народа і ўвёў у літаратуру асноўныя рысы беларускай мовы [1, с. 66]. Для гэтых аўтараў не меў значэння той факт, што ўжо ў часы Скарыны існавала багатая ў жанравых адносінах дзелавая пісьменнасць на беларускай мове, ствараліся шматлікія летапісы, перакладаліся воінскія аповесці тыпу «Александрыі» і «Траянскай гісторыі», зроблены былі пераклады розных апакрыфічных і агіяграфічных твораў і нават асобных кніг свяшчэннага пісання.

З ліку публікацый пазнейшага часу можна адзначыць серыю артыкулаў у юбілейным зборніку «450 год беларускага кнігадрукавання», аўтары якіх таксама звярнулі ўвагу галоўным чынам на беларускі матэрыял у выданнях Скарыны. У выніку ўсяго гэтага ў сучасных беларускіх публіцыстычных і навукова-папулярных працах мова Скарыны безагаворачна кваліфікуецца як беларуская, і гэты погляд многімі ўспрымаецца як адназначны і адзіна правільны.

Але ў скарыніяне вельмі рана ўсталяваўся і супрацьлеглы погляд на мову Скарыны як на мову царкоўнаславянскую. Задоўга да П. У. Уладзіміра польскі мовавед С. Б. Ліндэ, азнаёміўшыся з урыўкамі са скарынінскіх выданняў па кнізе В. Сопікава «Опыт российской библиографии» (1813), яшчэ ў 1816 г. сцвярджаў, што ў кнігах Скарыны даўняя славянская мова значна пераважае беларускую [30, с. 19]. Больш катэгарычна аб царкоўнаславянскай аснове выданняў Скарыны выказаўся буйнейшы гісторык рускай мовы канца мінулага стагоддзя А. І. Сабалеўскі. У рэцэнзіі на кнігу П. У. Уладзіміра ён гаварыў наступнае: «Мноства форм аорыста, імперфекта, вельмі часта няправільных, усемагчымых славянскіх форм і слоў, якія знаходзяцца ў яго перакладах, паказвае, што ён меў на ўвазе выдаць Біблію на славянскай мове і што ён зрабіў для гэтага ўсё тое нямногае, што мог. Пры крайняй слабасці ведання славянскай мовы ў паўднёва-заходняй Русі яго часу, пры неабходнасці працаваць далёка ад людзей, колькі-небудзь дасведчаных у гэтай мове, для чалавека накшталт Скарыны наўрад ці можна было авалодаць славянскай мовай лепш, чым авалодаў ён» [50, с. 328]. Такое ж меркаванне аб мове Скарыны А. І. Сабалеўскі паўтарыў пазней у сваіх лекцыях па гісторыі рускай літаратурнай мовы [51, с. 61—63].

З меркаваннем А. І. Сабалеўскага цалкам узгадняецца і погляд буйнейшага гісторыка беларускай мовы 20-х гадоў нашага стагоддзя Я. Воўка-Левановіча, які ў 1926 г. апублікаваў грунтоўны артыкул аб мове Скарыны. Разглядаючы працу П. У. Уладзіміра, даследчык зусім слушна адзначаў, што «прафесар

Уладзіміраў абыходзіць вельмі важнае і цікавае пытанне аб тым, *у якой меры можам мы лічыць мову Скарыны беларускай»* [21, с. 262]. Сам Воўк-Левановіч катэгарычна сцвярджаў, што для выданняў Скарыны характэрна «ў большасці царкоўнаславянская мова з моцным элементам жывой беларускай мовы і са слядамі літаратурнага ўплыву чэшскай і польскай моў» [21, с. 263]. Такога ж погляду прытрымліваюцца і некаторыя іншыя вучоныя, якія спецыяльна вывучэннем моўных сродкаў Скарыны не займаліся, але імкнуліся вызначыць яго ролю ў агульным працэсе развіцця мовы рэлігійнай пісьменнасці старажытнай эпохі. Напрыклад, французскі славіст А. Мартэль таксама лічыў, што Скарына ў сваёй дзейнасці не мог кіравацца свядомым імкненнем зрабіць зразумелай традыцыйную мову Бібліі, паколькі сам выдавец рэкамендаваў сваім чытачам вывучаць граматыку па Псалтыры, выдадзеным ім на царкоўнаславянскай мове [33, с. 104]. Царкоўнаславянскую аснову мовы выданняў Скарыны прызнаваў і чэшскі скарыніст А. В. Фларoўскі: «Біблію Скарыны,— пісаў ён,— наўрад ці можна называць Бібліяй на жывой заходнерускай народнай мове,— яе пануючая моўная стыхія — царкоўнаславянская з нешматлікімі, праўда, элементамі іншага паходжання, але гэта — не помнік сістэматычнага пераадолення традыцыйнай царкоўнаславянскай асновы, хоць яна і не захавана тут з усёй паслядоўнасцю і дакладнасцю, але паддалася ўздзеянню і жывой мовы самога Скарыны і літаратурных — не царкоўнаславянскіх,— а чэшскіх і інш. дапаможнікаў» [53, с. 169].

Адсутнасць адзіных поглядаў на мову Скарыны тлумачыцца перш за ўсё пэўнай аднабаковасцю ў вывучэнні яго пісьмовай спадчыны. Па-першае, кнігавыдавецкая спадчына Скарыны звяртала на сябе ўвагу галоўным чынам з пункту погляду адлюстравання ў ёй рыс жывой беларускай мовы, а напластаванні іншых моўных стыхій і іх удзельная вага ў агульнай сістэме скарынінскай мовы, як правіла, заставаліся ўбаку. Такі падыход характэрны не толькі для беларускага гістарычнага мовазнаўства. Даследчыкі гісторыі царкоўнаславянскай мовы звярнулі ўвагу, што ў сучасных славістычных даследаваннях наогул адносіны паміж «царкоўнаславянскімі» і «нацыянальнымі» моўнымі кампанентамі ўсё яшчэ разглядаюцца ў адносінах канфлікту і ўзаемных адхіленняў. Некаторыя славянскія вучоныя так захапляюцца апісаннем перамаганоснай «барацьбы» славянскіх нацыянальных моў супроць «чужых» структур царкоўнаславянскай мовы, што яны забываюць апісваць свайго лінгвістычнага «ворага» [43, с. 32].

Па-другое, вывучэнне мовы Скарыны звычайна праводзіцца без супастаўлення яе з адпаведнымі сродкамі беларускай літаратурна-пісьмовай мовы папярэдняга, сучаснага Скарыне і наступнага перыядаў (на гэты недахоп звяртаў увагу яшчэ А. І. Сабалеўскі).

Нарэшце, дакладнаму вырашэнню пытання аб мове Скарыны

перашкаджае і адсутнасць адзінства метадалагічных установак: літаратуразнаўцы, гісторыкі і спецыялісты іншых сумежных галін навукі пры ацэнцы мовы Скарыны зыходзяць галоўным чынам з уліку яе грамадска-функцыянальнай ролі, тады як для мовазнаўцаў, акрамя гэтага, важным з'яўляецца ўлік суадносін матэрыяльна-структурных элементаў у тканіне таго ці іншага твора.

Для многіх даследчыкаў падставай вызначаць мову Скарыны як беларускую служыць і старажытная лінгвістычная тэрміналогія. Як вядома, пра свае перакладныя выданні сам Скарына гаварыў, што яны «выложены на руский ѧзыкъ». На гэтай падставе, як ужо адзначалася, беларускай лічыў мову Скарыны і П. У. Уладзіміраў. Аднак пры гэтым не прымаецца пад увагу, што «тэрміналагічныя формулы могуць не адэкватна адлюстроўваць гістарычную рэальнасць» [43, с. 2]. Як гаварыў А. І. Сабалеўскі, Скарына называў мову сваіх выданняў рускай ці не па той адной прычыне, што для яго словы «рускі» і «славянскі» былі адназначнымі [50, с. 327]. Сапраўды, у выданнях Скарыны ёсць асобныя факты, якія пацвярджаюць гэта меркаванне Сабалеўскага. Такое значэнне, напрыклад, мае наступная фраза з кнігі «Суддзі Ізраілевы»: «Рекоша к нему: рци жъ тое слово Цевволех еже по рускии сказуетсѧ класъ». З гэтай фразы відаць, што няпоўнагалосную паўднёваславянскую форму *класъ* 'колас' Скарына прызнаваў беларускай, хоць у беларускай пісьменнасці яго часу слова *колосъ* было звычайным. Такое ж значэнне мае і выраз з кнігі «Есфір»: «мыслилъ на ни*х* злые речи, абы побилъ ихъ и погубилъ. И пустилъ естъ фуръ, еже нашимъ ѧзыкомъ исказуетсѧ жребей». Вельмі паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца і пасляслоўе да «Канона багародзіцы» з «Малой падарожнай кніжкі»: «Доконанъ естъ канонъ пречистой богородицы выложеный из грѣческого на руски ѧзыкъ докторомъ францискомъ с полоцька». Тым часам гэты канон, як і ўся «Малая падарожная кніжка», выдадзены на царкоўнаславянскай мове, прычым больш архаізаванай, чым царкоўнаславянская мова «Псалтыра» і «Апостала». Ёсць і некаторыя іншыя меркаванні на карысць заключэння, што паняцці «руская мова» і «славянская мова» для Скарыны былі раўназначныя.

Прызнанне дзвюх асноўных моўных стыхій — царкоўнаславянскай і беларускай — у мове перакладных выданняў Скарыны прымушае даследчыкаў пераадолець той традыцыйны бар'ер, які прыводзіць да аднабаковасці ў вывучэнні сінкрэтычных па мове скарынінскіх кніг. Для вызначэння ўдзельнай вагі гэтых асноўных стыхій апраўдана выкарыстанне статыстычнага ўліку, якім матэрыялам — беларускім ці царкоўнаславянскім — запаўняюцца ў кожным канкрэтным скарынінскім тэксце тыя звенні граматычнага ладу і слоўнікавага саставу, якія атрымлівалі неаднолькавае выражэнне ў беларускай і царкоўнаславянскай мовах. У сучасным мовазнаўстве ўжо мала хто можа падтрымаць выказанае ў свой час Ц. Ломцевым сцверджанне, што «спробы

вызначыць нацыянальную прыналежнасць мовы Скарыны, абапіраючыся на колькасную перавагу царкоўнаславянскіх элементаў, з'яўляюцца нядобрасумленнымі ўжо толькі таму, што яны грунтуюцца на механічным аналізе і не ўлічваюць функцыянальнай ролі мовы, а таксама грамадска-палітычных умоў яе функцыянiравання» [31, с. 8]. Сучасным мовазнаўцам іменна колькаснымі паказчыкамі даводзіцца аперыраваць пры аналізе помнікаў з невыразнай моўнай асновай. Так паступаюць, напрыклад, складальнікі слоўніка харвацка-глагалічнай рэдакцыі агульнаславянскай літаратурнай мовы пры адборы крыніц для слоўніка: калі ў пэўным тэксце змяшчаецца больш за 50 працэнтаў царкоўнаславянскіх моўных рыс, такі тэкст прызнаецца стараславянскім і ўключаецца ў канон крыніц слоўніка [36, с. 104].

На сучасным этапе беларускага гістарычнага мовазнаўства такую методыку апраўдана прымяняць і для характарыстыкі мовы Скарыны. Аднак для гэтага неабходна правесці рад папярэдніх распрацовак. У сучасны момант у распараджэнні даследчыкаў ёсць толькі некаторыя статыстычныя даныя па дзеяслоўных формах скарынінскіх выданняў [45, 46].

У скарыназнаўстве ўжо даўно ўсталяваўся погляд, што выданні Скарыны ў адносінах да моўнай апрацоўкі выдаўцом падзяляюцца на два разрады: перакладзеныя Скарынам самастойна 22 кнігі Старога запавету, выдадзеныя ім у Празе ў 1517—1519 гг., і царкоўнаславянскія кнігі, перадрукаваныя з рукапісных арыгіналаў,— пражскі «Псалтыр» 1517 г., віленская «Малая падарожная кніжка» каля 1522 г. і «Апостал» 1525 г. Да апошняга часу ўвагу даследчыкаў звярталі на сябе галоўным чынам пражскія перакладныя выданні. Толькі ў самы апошні час з'явіліся публікацыі па мове скарынінскіх псалтыроў [37, 38, 39, 40, 41, 42] і «Апостала» [4, 5, 6, 7]. Нядаўна апублікаваны таксама артыкул аб моўных асаблівасцях «Малой падарожнай кніжкі» [25]. Зусім зразумела, што вывучэнне гэтых двух разрадаў скарынінскіх выданняў мае перад сабой розныя задачы і таму павінна праводзіцца па-рознаму. Даследчыкаў царкоўнаславянскіх кніг у першую чаргу цікавіць пытанне, у якой меры гэтыя выданні адлюстроўваюць рысы беларускай мовы і ці даюць яны падставу бачыць у іх асобны тып царкоўнаславянскай мовы, адметнай ад царкоўнаславянскай мовы ўсходнеславянскай рэдакцыі. У адрозненне ад гэтага задачай даследчыка перакладных скарынінскіх выданняў з'яўляецца даць адказ у першую чаргу на пытанне, якая мова — беларуская ці царкоўнаславянская — пакладзена ў аснову іх. У залежнасці ад гэтага вырашаецца і пытанне, у якіх адносінах паміж сабой аказваюцца ўсе скарынінскія выданні — перакладныя і неперакладныя царкоўнаславянскія.

У гэтым даследаванні асноўная ўвага аўтараў звернута на мову пражскіх перакладных выданняў Скарыны. Галоўнае адрозненне яго ад папярэдніх мовазнаўчых прац па Скарыне

заключаецца ў тым, што тут аналізуецца сукупнасць усіх моўных фактаў, і гэта дае магчымасць вызначыць ступень і ўдзельную вагу ў выданнях беларускага першадрукара ўсіх асноўных стыхій, якія ўдзельнічалі ў фарміраванні яго мовы.

Вывучэнне моўных фактаў скарынінскіх выданняў у гэтым даследаванні праведзена ў параўнальным плане з чэшскай Бібліяй венецыянскага выдання 1506 г., якая, як гэта ўжо даўно ўстаноўлена даследчыкамі, служыла асноўнай крыніцай для перакладаў Скарыны. Матэрыял гэтай Бібліі ў мінулым галоўным чынам у тэксталагічным плане выкарыстаў толькі П. У. Уладзіміраў, нават А. В. Фларoўскі ў сваім грунтоўным даследаванні абапіраўся на назіранні Уладзіміраў. Тым часам параўнанне моўных сродкаў чэшскай Бібліі са скарынінскімі перакладамі паказвае значна большую залежнасць іх ад чэшскага арыгінала, чым гэта прызнавалася да апошняга часу.

Вывучэнне моўных асаблівасцей скарынінскага перакладу патрабуе абавязковага параўнання з тагачаснымі біблейскімі тэкстамі на царкоўнаславянскай мове. Аднак у сучасны момант біблейскія тэксты беларускага паходжання часоў Скарыны невядомы не толькі ў поўным саставе, але нават у значных па аб'ёму частках. У практыцы беларускіх моваведаў ужо стала традыцыяй параўноўваць як скарынінскія выданні, так і іншыя тагачасныя канфесіянальныя творы на царкоўнаславянскай мове з «Астрожскай бібліяй» 1581 г. Такое выкарыстанне матэрыялу «Астрожскай бібліі» ў сучасных умовах цалкам апраўдана. Як вядома, у аснову «Астрожскай бібліі» быў пакладзены адзін са спісаў «Генадзіеўскай бібліі» 1499 г., прысланы царом Іванам Грозным князю Канстанціну Астрожскаму. Выдаўцы «Астрожскай бібліі» ўносілі ў асобныя кнігі тыя ці іншыя неабходныя змены. Такім чынам, «Астрожская біблія», якая засвоіла многавяковую славяна-грэчаскую праваслаўную традыцыю, найбольш поўна адлюстроўвае царкоўнаславянскую мову ўсходнеславянскай рэдакцыі часоў Скарыны.

У даследаванні мова скарынінскіх выданняў вывучана па ўсіх асноўных узроўнях пісьмовай мовы — арфаграфіі, марфалогіі і лексіцы. Па-за ўвагай аўтараў застаўся толькі аналіз сінтаксічнай сістэмы. Тлумачыцца гэта тым, што сінтаксічная сістэма выданняў Скарыны найбольш залежыць ад чэшскага арыгінала, таму вывучэнне яе патрабуе асобай методыкі і падыходу.

АРФАГРАФІЯ

Арфаграфічная сістэма пражскіх выданняў Ф. Скарыны практычна не мае прынцыповых адрозненняў ад правапісу старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы канца XV — пачатку XVI ст. у яе рэлігійнай жанрава-стылявой разнавіднасці. Нягледзячы на сваю царкоўнаславянскую аснову, яна падпарадкоўваецца шмат у чым заканамернасцям, характэрным для старабеларускіх рукапісаў, і, пераймаючы прыёмы апошніх, хоць і непаслядоўна, але прыкметна адступае ад старажытных традыцыйных норм у бок фанетызацыі пад уздзеяннем жывога беларускага вымаўлення.

Гарманічнае спалучэнне ў скарынінскай арфаграфіі старых традыцый з выпрацаванымі на беларускай глебе інавацыямі выразна праяўляецца ўжо ў выкарыстанні графічных сродкаў. Даніну традыцыі трэба бачыць у беларускага першадрукара, як і ў аўтараў твораў беларускай рэлігійнай літаратуры даскарынінскага перыяду, хаця б у тым, што ў яго кнігах прысутнічаюць многія дублетныя графемы (*е* — ѣ, *і* — *и*, *о* — ѡ, *оу* — *у* — ꙋ, ꙗ — ѧ, *з* — *ѕ*, *ф* — ѳ, *кс* — ѯ, *пс* — ѱ), якія без шкоды для сэнсавай выразнасці тэксту могуць замяняцца адна другой. Затое перанятыя ім з беларускай пісьменнасці, а часам і ўведзеныя самастойна правілы ўжывання асобных літар успрымаюцца як смелы правапісны эксперымент, дзякуючы якому была глыбока парушана прывычная непахіснасць царкоўнаславянскіх пісьмовых канонаў.

Асабліва наглядна парушэнне царкоўнаславянскай арфаграфічнай стабільнасці прасочваецца ў Скарыны на прыкладзе ўжывання графічных сродкаў для абазначэння галоснага гука *е*. З дзвюх найбольш ужывальных у той час графем — *е* (у тагачасным друкарскім варыянце яна мела канфігурацыю ε) і є першая ў адпаведнасці са старабеларускай традыцыяй выступае звычайна ў сярэдзіне і ў канцы слоў пасля мяккіх зычных, другая — у пачатку слоў і пасля галосных: *болеє, вельми, єстъ, железо, жертва, заветъ, заповедь, избавленіє, на требнице, нежели, оумедленіє, періє, поблужденіє, потреба, приношеніє, сребро, сынове, теперь, тоє, человекъ* і г. д. Разам з тым нярэдкія ў скарынінскіх выданнях, як і ў старабеларускіх рукапісных

помніках пачатку XVI ст., і выпадкі ўжывання літары *е* замест заканамернай **є**: *егда, единъ, ести, иные, которые, людие, ожидание, опустение, приношение, причастие* і інш. Гэта сведчыць аб тым, што спецыфічныя функцыянальныя адрозненні паміж разгледжанымі графічнымі варыянтамі сціраліся і наспявала патрэбнасць абмежавацца якім-небудзь адным з іх.

Разнабой у перадачы гука *е* павялічваецца ў Скарыны ў сувязі са змяшэннем літары *е* з *ѣ*, што з'яўляецца адлюстраваннем канвергенцыі гукаў *е* і *ѣ* ў большасці гаворак на беларускай этнічнай тэрыторыі яшчэ ў старажытнарускую эпоху. Зразумела, гэтая правапісная рыса не выглядае ў скарынінскіх тэкстах прынцыпова новай. У старабеларускай пісьменнасці яна праявілася намнога раней, калі меркаваць па больш або менш шырокім адбіцці яе ў тагачасных дзелавых дакументах, у арыгінальных летапісах кароткай рэдакцыі, перакладных рэлігійна-апакрыфічных творах канца XV ст. накшталт «Пакут Хрыста» і «Аповесці аб трох каралях-валхвах», нарэшце, у перакладзеных на беларускую мову ў адзін час з выданнямі Скарыны біблейскіх кнігах з рукапіснага зборніка, які захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літоўскай ССР (RKF — 262). Але ў тэкстах беларускага першадрукара неўпарадкаванасць ва ўжыванні літар *ѣ* і *е* набыла небывалыя да гэтага памеры. З аднаго боку, графема *ѣ*, працягваючы царкоўнаславянскія правапісныя традыцыі, выступае тут заканамерна ў словах з этымалагічным *ѣ*, а часам нават там, дзе было этымалагічнае *е: болѣе, борздѣи, вѣдати, вѣсть, врановѣ, гнѣздо, дѣлити, зѣло, зрѣти, конѣць, на горѣ, напрѣдъ, наслѣдие, первѣи, плѣнъ, понѣже, свѣдение, срѣбро, сыновѣ, тобѣ* і г. д. З другога боку, лексемы гэтага тыпу часта ўжываюцца з літарай *е*, набываючы характар варыянтнай правапіснай нормы: *бесъ, вера, ветръ, гневъ, дело, заповедь, лесъ, место, мне, невеста, победа, река, речь, светъ, сено, сеть, снегъ, стена, хотети, человекъ* і інш. Часта на адной старонцы назіраецца дваякае напісанне адных і тых жа слоў: *болѣсть — болесть, вѣкъ — векъ, грѣхъ — грехъ, лѣто — лето, месѣць — месець, пѣснь — песнь, тѣло — тело, хлѣбъ — хлебъ.*

Захаванне ў скарынінскай «Бібліі» напісанняў з літарай *ѣ* падтрымлівалася аналагічнымі напісаннямі ў царкоўнаславянскіх тэкстах, правапіс якіх, як вядома, грунтаваўся на этымалагічна-марфалагічным прынцыпе і якія выкарыстоўваў Скарына як адну з крыніц пры падрыхтоўцы біблейскіх кніг да выдання. Параўнальна вялікая колькасць выпадкаў напісання *е* замест *ѣ* тлумачыцца агульнай тэндэнцыяй развіцця графікі ў бок спрашчэння і уніфікацыі, уздзеяннем новага фанетычнага прынцыпу, які паступова ўсталёўваўся ў старабеларускай арфаграфіі дзякуючы арыентацыі многіх кніжнікаў на жывое вымаўленне. Не выключана, што тут праявілася і свядомае імкненне беларускага першадрукара надаць рэлігійнаму тэксту своеасаблівую афарбоўку і графіка-арфаграфічнымі сродкамі

зрабіць яго больш даступным для чытача. Можна дапусціць таксама, што ўжыванне літар *е* і *ѣ* аказалася ў нейкай меры ў залежнасці ад колькасці гэтых літар у наборнай касе друкарні. Асобныя ж памылковыя напісанні з літарай *ѣ* на месцы *е* накшталт *ввѣлъ, к нѣму, морѣ, овѣць, плѣменъ, ѣе* з'явіліся, відавочна, па недагляду.

Варта звярнуць увагу і на тую акалічнасць, што адзначаныя парушэнні заканамернасцей ужывання літар *е* і *ѣ* назіраюцца не толькі ў біблейскіх кнігах, якія лічацца самастойнымі перакладамі Скарыны. Яны маюць месца таксама і ў тых выданнях беларускага першадрукара, што адзінадушна прызнаюцца мовазнаўцамі як выданні на царкоўнаславянскай мове,— у пражскім «Псалтыры» і ў віленскіх «Апостале» і «Малой падарожнай кніжцы». Змяшэнне літар *е* і *ѣ* з'яўляецца наогул адной з самых паказальных рыс трансфармацыі царкоўнаславянскай мовы на беларускай глебе ў асобны тып яе, што асабліва інтэнсіўна адбывалася ў XV — XVI стст., але пазней спынілася ў сувязі з распаўсюджаннем на Беларусі царкоўнаславянскіх твораў рускай рэдакцыі.

Неабходна адзначыць, што гэтая рыса ў пасляскарынінскі час знаходзіць у старабеларускай пісьменнасці яшчэ большае пашырэнне. Асабліва характэрна ўжыванне літары *е* замест *ѣ* для дзелавых кніг і дакументаў сярэдзіны і другой палавіны XVI ст., якія ў большай меры, чым помнікі іншых жанраў, набліжаліся да жывога вымаўлення і менш за ўсё адчулі ўплыў царкоўнаславянскай арфаграфіі. Некаторыя дзелавыя помнікі гэтага часу практычна зусім не маюць літары *ѣ*.

Выкарыстанне літар *і* і *и* ў друкаваных кнігах Скарыны таксама грунтуецца ў асноўным на прынцыпах, якія замацаваліся да гэтага часу ў старабеларускіх рукапісах,— першая ўжываецца ў канцы слоў перад галоснымі, другая — у астатніх выпадках: *божіею, идущіи, к веселію, къ корменію, льстивіи, милосердіе, нищіи, о продаваніи, пированіа, ревнованіе, сведеніе, справедливіи, человечіи, чиненіе* і інш. Акрамя таго, літара *і* сустракаецца і ў пачатку ўласных імён і геаграфічных назваў: *богъ Ізраилевъ, Ізраиль, Іоавъ, Іовъ, Іорданъ, Іосифъ, Ісаакъ, Ісусъ, на Іудеи, Іудифъ*. Зразумела, правілы ўжывання літар *і* і *и*, выпрацаваныя старабеларускімі кніжнікамі, не былі кадыфікаваны спецыяльнымі вучэбнымі дапаможнікамі. Яны падтрымліваліся толькі пісьмовай практыкай, таму, натуральна, у пісьменнасці мелі месца выпадкі змяшэння адзначаных літар. Не пазбаўлены іх і скарынінскія выданні, дзе, з аднаго боку, можна сустрэць напісанні з літарай *і* не толькі перад галоснымі *(проразітсѧ, есмі, данілъ)*, а з другога боку — напісанні з *и* перад галоснымі і ў пачатку ўласных слоў *(милосердие, оутиснение, розширение, царствование, Иовъ)*. Увогуле ж літара *і* адзначаецца тут значна радзей, чым *и*.

У выкарыстанні графічных сродкаў для абазначэння гука *о* старабеларускія кніжнікі канца XV — пачатку XVI ст. прытрымліваліся правіл, выпрацаваных у папярэдні перыяд развіцця пісьменнасці,— пісаць літару ѡ ў пачатку слоў, а літару *о* ў іншых становішчах у слове. У адрозненне ад іх беларускі першадрукар паслядоўна захоўвае пачатковую ѡ толькі перад наступнай *т*, калі з гэтых дзвюх літар утвараецца лігатура,— у словах з прыстаўкай *от-* і ў прыназоўніку *от*: *ѡворити, ѡдати, ѡкуле, ѡлучити, ѡнести, ѡповедь, ѡпочивати, ѡпустити, ѡрокъ, ѡтоле; ѡвасъ, ѡколена, ѡлюдеи, ѡовець, ѡплемени, ѡптищь, ѡроду, ѡстада, ѡстраны, ѡчеловека* і г. д. У пазіцыі перад іншымі зычнымі ў скарынінскіх выданнях часцей ужываецца пачатковае *о*, аб чым сведчаць шматлікія прыклады тыпу *обедъ, образъ, обудити, овощe, овца, огонь, огородъ, одолети, ознамити, около, олтарь, они, оправовати, осквернити, осмотрети, оставити, останокъ, отець, очи, очищение*, якія значна пераўзыходзяць колькасць напісанняў з літарай ѡ накшталт *ѡгонь, ѡзеро, ѡстанокъ, ѡсудити, ѡчищати*.

Гук *у* ў выданнях Скарыны, як і ў рукапісных помніках старабеларускай пісьменнасці, абазначаецца дыграфам *оу* і літарамі *ѹ, у*. Аднак у параўнанні з рукапісамі ранейшая сістэма ва ўжыванні гэтых графічных сродкаў тут парушана. У прыватнасці, у скарынінскіх тэкстах наглядаецца даволі частае змяшэнне літар ѹ і *у* ў сярэдзіне і ў канцы слоў: *внѹтри — внутри, зѹполне — зуполне, мѹдрость — мудрость, мѹжь — мужь, погѹбити — погубити, рѹка — рука, со льнѹ — со льну, сѹдъ — судъ*. Колькасць напісанняў з дыграфам *оу* тут значна скарачаецца *(оуста, оухо, оучинити)*, хоць ён, насуперак традыцыі, часам трапляецца і ў сярэдзіне слоў *(зовоутсѧ, о наоуце)*. За кошт дыграфа *оу* ў пачатку слоў знаходзіць пашырэнне літара ѹ: *ѹбежати, ѹбити, ѹбытокъ, ѹделати, ѹмедление, ѹмети, ѹставичне, ѹтекати, ѹчитель, ѹчинити*. Дакладна і вытрымана захоўваецца толькі адна ранейшая заканамернасць: літара ѹ можа выступаць у любым становішчы ў слове, а літара *у* ў пачатку слоў не ўжываецца.

Ужыванне літар ѧ і ꙗ ў біблейскіх выданнях Скарыны ў цэлым падпарадкоўваецца правілам, выпрацаваным у ранняй старабеларускай пісьменнасці,— першая выступае звычайна пасля мяккіх зычных, другая перадае спалучэнне зычнага *j* з галосным *а: вонѧ, десѧтеро, дѧдѧ, землѧ, знамѧ, кнѧзь, мѧсо, опѧть, принѧти, свѧтынѧ; боꙗре, братиꙗ, объꙗвити, приꙗтно, сеꙗти, ꙗзва, ꙗко, ꙗрмо, ꙗрость, ꙗсти*. Разам з тым тут даволі выразна праяўляецца тэндэнцыя да пашырэння літары ѧ за кошт ꙗ: *боѧзнь, диѧволъ, зброѧ, неприѧтель, стоѧти, ѧгоды* і інш. У радзе выпадкаў літары змешваюцца ў адных і тых жа словах, утвараючы паралельныя напісанні накшталт *достоѧние — достоꙗние, поѧсъ — поꙗсъ, ѧзыкъ — ꙗзыкъ*.

Гаворачы аб ужыванні літар ѧ і ꙗ, нельга абмінуць і такую арфаграфічную асаблівасць, як абазначэнне галоснага *а* пасля *j* літарай *а*, што таксама сустракаецца ў скарынінскіх тэкстах, як і ў некаторых старабеларускіх рукапісах рэлігійных жанраў. Напісанні тыпу *вопиати, стоати, ȣбиати, достоание, по писаниахъ, приателка, поколениа, безакониа, складаниа, сыновскаа* адлюстроўваюць царкоўнаславянскі правапісны прыём.

Уплыў царкоўнаславянскіх правапісных прыёмаў, безумоўна, праяўляецца ў Скарыны і тады, калі ён ужывае літары *ъ* і *ь* замест заканамерных *о* і *е*, што даўно ўжо практыкавалася ў старабеларускай пісьменнасці на месцы ранейшых рэдукаваных *(вълна — волна, дьнь — день, дъска — доска, съкровище — сокровище, съхранити — сохранити)*, і калі ўводзіць графемы *ъ* і *ь* у сярэдзіну груп зычных *(глуповъство, деръзкии, молъвити, наполънити, седъмеро)*. Адначасова ў выданнях Скарыны прасочваецца і адваротная тэндэнцыя — не абазначаць мяккасць гукаў *д, з, л, н, с, т* перад зычнымі, у сувязі з чым узнікаюць паралельныя напісанні тыпу *возьми — возми, ганьба — ганба, детьми — детми, людьми — людми, пильность — пилность, письмо — писмо, постельникъ — постелникъ, просьба — просба, роздельне — розделне, свадьба — свадба,* што пазней стала характэрнай асаблівасцю старабеларускай арфаграфіі.

З графічных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца Скарынам для абазначэння зычных гукаў, прыцягваюць да сябе ўвагу толькі дублетныя літары або тыя, якія вылучаюцца пэўнымі асаблівасцямі ўжывання. Дублетныя літары *s (sело, sвеsда)*, ѯ *(сторaѯъ, Аръфаѯатъ)*, ѱ *(ѱаломъ, ѱалтыръ)* сустракаюцца ў Скарыны абмежавана, звычайнымі тут з'яўляюцца напісанні з літарай *з* і спалучэннямі *кс, пс*. Пераважна літарай *ф* абазначаецца і гук *ф (гарфа, ефинъ, Калефъ, фалечный, фарба, Физонъ, философъ, тафта, Францишекъ, фуниковый)*, хоць зрэдку паралельна з ёй выступае і літара ѳ *(есѳеръ, ѳимианъ)*. Для абазначэння зычнага *j* выкарыстоўваецца выключна літара *и: бледыи, великии, горкии, добродеиство, краи, менеи* і г. д. Услед за старабеларускімі рукапісамі практыкуецца напісанне дыграфа *кг* для абазначэння выбухнога гука *г* у словах іншамоўнага паходжання: *кгалбанъ, мкгилѧ, кгимель, микгдалъ, фикги* і інш.

Асноўным арфаграфічным прынцыпам стараславянскай і старажытнарускай пісьменнасці быў прынцып этымалагічна-марфалагічны. З'яўляючыся непасрэднай пераемніцай арфаграфічных прыёмаў пісьменнасці старажытнарускага перыяду, старабеларуская арфаграфічная сістэма першапачаткова трывала захоўвала даўнія традыцыі і толькі зрэдку адступала перад жывой моўнай стыхіяй. Але з цягам часу арфаграфічны воблік старажытных беларускіх тэкстаў паступова пачаў змяняцца, усё больш набываючы новы, самабытны характар. Гэтыя змены ў сістэме напісання з'яўляліся вынікам праяўлення той агульнай для старабеларускага правапісу тэндэнцыі, якую можна ахарактарызаваць

як імкненне да збліжэння з вымаўленчымі нормамі жывой гутарковай мовы беларускага народа. Неабходна адзначыць, аднак, што не ўсе фанетычныя з'явы старабеларускай мовы адлюстраваліся ў помніках аднолькава. У сувязі з гэтым уся сукупнасць арфаграфічных норм старабеларускай пісьменнасці ў залежнасці ад ступені іх адпаведнасці жывому вымаўленню ўяўляецца як сістэма напісання дваякага тыпу — арфаграм, якія склаліся пад уплывам жывога вымаўлення, і правапісных рыс, якія грунтаваліся на этымалагічна-марфалагічным прынцыпе. Абедзве гэтыя разнавіднасці напісання вядомы і пражскім выданням Скарыны, паколькі яго мова адчувала пэўную залежнасць ад тагачаснай старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы. Ды інакш і не магло быць: першыя друкаваныя кнігі толькі прабівалі сабе дарогу на ўсходняй славяншчыне, таму яны не маглі абысціся без пераймання ўсяго таго, што было дасягнута рукапісамі, у тым ліку іх графікі і правапісных прыёмаў.

Да арфаграфічных рыс, выпрацаваных пад уздзеяннем жывога вымаўлення, варта аднесці перш за ўсё адлюстраванне пераходу *в* у *ў*. Ужо ў старабеларускай дзелавой пісьменнасці, летапісах і перакладных рэлігійна-апакрыфічных і свецкіх творах канца XV ст. гэта арфаграфічная рыса выразна аформілася ў выглядзе напісанняў з дыграфам *оу* і літарамі *у*, 8 на месцы этымалагічнага *в*, бо спецыяльнай графемы для абазначэння гука *ў* у тагачаснай графіцы не было. Фактычны ж матэрыял, багата прадстаўлены ў выданнях Скарыны (тыпу 8 *великомъ месте празскомъ*, 8 *своихъ справахъ*, *противъ* 8*сходу солнца*, 8*скорми*, 8 *воде*, 8 *ступе*, 8 *долине*, *по* 8*згоркохъ*, *трубѧще* 8 *трубы*), сведчыць аб тым, што адлюстраванне пераходу *в* у *ў* у пачатку слоў і прыназоўніку *въ* стала тут варыянтнай правапіснай нормай.

У цеснай сувязі з разгледжанай арфаграфічнай рысай з'яўляецца даволі частае ў Скарыны напісанне замест традыцыйнага прыназоўніка *въ* спалучэння *ув* перад галосным наступнага слова, дзе літара *в* служыць для абазначэння пратэтычнага зычнага гука *в*, які ў вусным вымаўленні развіваўся для ліквідацыі гіятуса: 8*в окне*, 8*в оковахъ*, 8*в оковы*, 8*в олеи*, 8*в обувь*, 8*в овцахъ*, 8*в ореху*, *оув очи* і інш.

Даволі шырока адлюстроўваецца ў выданнях Скарыны пераход гука *у* ў *ў*. Як і ў старабеларускіх рукапісах, гэты гук абазначаецца літарай *в*, бо ў тагачаснай графіцы, як ужо адзначалася, не было асобнай графемы для абазначэння *у* нескладовага. Паралельна з напісаннем, дзе літара *у* ў пачатку слоў і прыназоўніку захоўваецца, напісанне з літарай *в* на месцы *у* характэрна для ўсіх скарынінскіх кніг: *вбогии*, *вже*, *взоры*, *вкоризна*, *вмерли*, *вмывалницу*, *вмыти*, *врѧдники*, *вста*, *вчастие*, *вчение*, *вченики*, *вчити*, *вчинити*, *навченыи*, *навчилъ*, *о втекании*, *повчение*, *были суть сие кнѧзи в сыновъ ізраилевыхъ* і інш. Гэтая рыса ў старабеларускай пісьменнасці другой палавіны XVI ст. набыла вялікае пашырэнне, асабліва ў помніках дзелавых і свецкіх жанраў.

Вялікае распаўсюджанне ў выданнях Скарыны атрымала таксама напісанне з літарай *е (ѣ)* на месцы ненаціскнога этымалагічнага ѧ. Калі ў беларускай пісьменнасці XV ст. такое напісанне сустракалася яшчэ спарадычна, то, пачынаючы са Скарыны, яно набывае ў старабеларускіх помніках значэнне варыянтнай правапіснай нормы. Як і ў старабеларускіх рукапісах, ужыванне літары *е* замест ѧ мае месца ў скарынінскіх кнігах у наступных выпадках — у дзеепрыслоўях цяперашняга часу *(будечи, видечи, грозѣчи, завидечи, медлѣчи, приводечи, тошнечи, хотечи)* і ў асобных назоўніках, прыметніках, лічэбніках, дзеясловах, прычым, як у паслянаціскных складах, так і ў першым складзе перад націскам: *двадцеть, деветь, десеть, ечмень, заець, месець, паметь, погледати, присегати, развезати, свезати, светыи, свещенникъ, слышети, тридцеть, тысеща, челедь* і г. д. Зрэдку таксама заўважаецца напісанне літары *е* замест ѧ ў зваротнай часціцы *-ся (веселилосе, полюбилосе, починаетсе)*, што ў беларускіх помніках пазнейшага перыяду знаходзіць асаблівае пашырэнне.

Ёсць падставы такое напісанне кваліфікаваць як ускоснае адлюстраванне якання. Яго нельга лічыць непасрэдным адлюстраваннем жывога вымаўлення перш за ўсё таму, што гэта арфаграфічная рыса сустракаецца амаль ва ўсіх старабеларускіх помніках незалежна ад жанру, а таксама ад месца і часу ўзнікнення іх, тады як у жывым вымаўленні гук *е* ці блізкі да яго ў разгледжанай пазіцыі быў уласцівы, безумоўна, толькі невялікай частцы старажытных беларускіх гаворак. У наш час еканне вядома толькі асобным гаворкам паўднёва-заходняга дыялектнага масіву. Да таго ж не толькі ў выданнях Скарыны, але і ва ўсіх старабеларускіх помніках заўважана вялікая колькасць выпадкаў, дзе ў данай пазіцыі паралельна з *е (ѣ)* ужываюцца літары ѧ, ꙗ, *а*. Напісаннямі такога характару асабліва насычаны дзелавыя помнікі з розных мясцовасцей Беларусі. Між тым агульнавядома, што арфаграфія дзелавой пісьменнасці ў большай ступені, чым іншых жанраў, адлюстроўвае жывое вымаўленне. Таму можна меркаваць, што ў першым складзе перад націскам і ў паслянаціскным становішчы ў пераважнай большасці беларускіх гаворак старажытнага перыяду вымаўляліся іменна гукі *а, 'а* ці *'і* (у зоне дысімілятыўнага якання), але ва ўсякім выпадку не *е*. Напісанне ж з літарай *е* ў даным становішчы можна разглядаць як гіпернармалізм, які ўскосна сведчыць аб тым, што яканне было ў беларускіх гаворках старажытнага перыяду жывой з'явай. Акрамя таго, у асобных выпадках, асабліва ў часціцы *-се*, нельга адмаўляць уплыву польскай арфаграфіі і вымаўлення.

Надзвычай пашыранай рысай у выданнях Скарыны, якая набліжае іх правапіс да жывога беларускага вымаўлення, з'яўляецца адлюстраванне нераходнага памякчэння заднеязычных *г, к, х*. Маючы свае вытокі ў старажытнарускай пісьменнасці,

Гэтая правапісная рыса настойліва прабівала сабе дарогу ў ранніх старабеларускіх помніках і выражалася ва ўсё больш частай замене традыцыйных спалучэнняў *гы, кы, хы* спалучэннямі *ги, ки, хи*. Сярод старабеларускіх рукапісаў XV ст. найбольш актыўна выкарыстаны новыя спалучэнні ў рэлігійна-апакрыфічных творах «Пакуты Хрыста» і «Аповесць аб трох каралях-валхвах». Аднак як аб варыянтнай правапіснай норме аб іх можна гаварыць толькі ў адносінах да скарынінскіх кніг, дзе, няглядзячы на наяўнасць некаторай колькасці напісанняў з архаічнымі *гы, кы, хы* тыпу *врагы, глубокыи, долгыи, книгы, погыбель, проступкы, рогы, слугы*, перавага аддаецца ўсё ж напісанням з *ги, ки, хи: великие, враги, высокии, грехи, драгие, женскии, источники, книги, морскии, муки, оброки, погибель, полки, превеликии, роги, руки, струги, тихии, хитрыи, царскии* і інш. Архаічныя спалучэнні *гы, кы, хы* ў некаторай ступені бытавалі ў старабеларускіх помніках рэлігійных жанраў яшчэ і ў пасляскарынінскі перыяд. У дзелавой жа і свецкай пісьменнасці адзіным правілам стала ўжыванне пасля заднеязычных літары *и*.

З іншых арфаграфічных рыс, якія склаліся пад уплывам жывога вымаўлення, у кнігах Скарыны звяртае на сябе ўвагу даволі частае абазначэнне прыстаўнога гука *і*: *игде, илживое, илживымъ, илживыхъ, илжите, илнѧныхъ, ильва, ильвица, ильснующасѧ, ильстець, ильсти, ильстиве, ильстивыи, ирдѧщасѧ, иржавѣетъ, иржати, иртути, ирци, ирците* і інш. Гэта асаблівасць скарынінскіх выданняў набывае тым большую цікавасць, што ні ў адным старажытным помніку ні да Скарыны, ні пасля яго прыстаўны гук *і* не набыў такога шырокага адлюстравання.

Па адбіццю іншых фанетычных рыс беларускай мовы кнігі Скарыны цалкам прымыкаюць да старажытных беларускіх рукапісаў рэлігійных жанраў першай палавіны XVI ст. Як і ў гэтых помніках, у скарынінскіх выданнях амаль адсутнічаюць выпадкі адлюстравання акання і якання, калі не браць пад увагу адзінкавыя напісанні накшталт *золатаревъ, выстерагатисѧ, манисто*. Звычайным у беларускага першадрукара з'яўляецца этымалагічна-марфалагічнае напісанне тыпу *борона, вода, выкопати, говорити, голова, дорога, жона, зостати, колено, коса, лотокъ, молитва, нога, обедъ, окно, потопъ, робити, споткати, товаръ, ходити* і г. д. Больш таго, у яго кнігах часам выяўляюцца гіпернармалізмы тыпу *кропива, сопогы*, якія з'явіліся ў выніку неадрознення ненаціскнога гука *а* (з *о*) і этымалагічнага *а*. Гэтае напісанне сведчыць аб свядомым імкненні Скарыны следаваць этымалагічна-марфалагічнаму прынцыпу. Такое захаванне старажытнарускіх і царкоўнаславянскіх правапісных традыцый было для таго часу ў нейкай меры станоўчым, бо яно аберагала арфаграфію ад уплыву дыялектных рыс і садзейнічала яе ўнармаванню.

Дзеканне і цеканне ў выданнях Скарыны не адзначана зусім. Прытрымліваючыся этымалагічна-марфалагічнага прынцыпу, беларускі першадрукар паслядоўна ўжывае перад галоснымі

літарамі *е, ѣ, и, і, ю, ѧ* і *ь* этымалагічныя *д* і *т: дѣло, диво, дѧтелъ, люди, медь, молоти, облити, отець, тесть, тина* і г. д. У гэтым сэнсе скарынінскія тэксты таксама нічым не адрозніваюцца ад старабеларускіх рукапісных помнікаў рэлігійных жанраў. Акрамя таго, што выкарыстанне ў адзначанай пазіцыі *дз* і *ц* не прадугледжвалася тагачасным правапісам, стрымліваючым фактарам для старажытных беларускіх кніжнікаў, было імкненне пазбягаць супадзенняў з адпаведнымі асаблівасцямі польскай арфаграфіі. Таму абазначэнне дзекання і цекання магло рэалізавацца ў пісьмовых тэкстах, нават дзелавых, толькі ў выглядзе адзінкавых памылак.

Зацвярдзенне шыпячых прадстаўлена ў Скарыны толькі некалькімі выпадкамі: *жывъ, жывыхъ, жылы, вашымъ*. Сустракаецца таксама напісанне з літарай *ъ* пасля *ш, ж, щ* на канцы слоў: *будешъ, ведаешъ, воздвигнешъ, возмешъ, востанешъ, загинешъ, знаешъ, знаидешъ, любишъ, насеешъ, хощешъ, мужъ, пещъ, помощъ*. Аднак правапіснай нормай трэба лічыць этымалагічна-марфалагічнае напісанне з галоснымі *и, е, ь* пасля шыпячых *ж, ш, щ, ч* накшталт *вещь, должина, ежикъ, жечи, животъ, жити, колачь, можешь, моцнеишии, нынечи, обачити, помощь, порушити, розширити, сушити, сущии, тощии, учинити, число, шило* і г. д. Аб арыентацыі беларускага першадрукара іменна на этымалагічна-марфалагічны прынцып сведчаць і гіпернармалізмы тыпу *чюдо, чюжии, чюти*, што часам сустракаюцца ў яго кнігах паралельна з *чудо, чужии, чути*.

Вельмі нешматлікія ў Скарыны выпадкі адлюстравання зацвярдзелага *р: брытва, крыкъ, прыветливыми очима, прынесите, рызъ, стрыщи, трыдцети*. Сюды можна далучыць і некаторую колькасць прыкладаў з літарамі *ъ, у, о* пасля *р: вихоръ, вихромъ, вихру, простру, цару* і інш. Але ў колькасных адносінах усё гэта толькі адзінкавыя прыклады на тысячы патэнцыяльна магчымых выпадкаў адлюстравання зацвярдзелага *р*. Наадварот, побач са звычайнымі напісаннямі этымалагічна-марфалагічнага характару накшталт *бритва, гривна, зверь, крикъ, мерити, принести, причина, риза, стричи, триста* ў кнігах Скарыны значнае распаўсюджанне атрымалі гіпернармалізаваныя напісанні з літарамі *и, ѧ* на месцы этымалагічных *ы, а: рибы, мудрихъ, старихъ, рижую, въ рибнице, покрил, открити, воскрилие, вырити, крила, которими, сокритость, прикрила, прикритие, зубрѧ* і інш. Аб напісанні такога тыпу можна нават гаварыць як аб факультатыўнай правапіснай норме ў адносінах да напісання, дзе этымалагічна цвёрдае *р* адлюстроўваецца, параўн.: *быстрыи, врачъ, гроза, грызти, добрыи, закрыти, которыи, крыло, крыти, мудрыи, открыти, рыба, рыбникъ, рыжии, скрытыи*.

Зусім няма ў выданнях Скарыны выпадкаў абазначэння зацвярдзелага *ц*. Звычайнымі тут з'яўляюцца напісанні тыпу *агнець, гонець, дубець, жрець, купець, младенець, самець, криници, моци, отроци* і г. д.

Толькі ў адзінкавых выпадках адлюстроўваецца ў скарынінскіх кнігах падаўжэнне зычных у інтэрвакальным становішчы: *возданне, искорененне, въ день отдаванньа*. Гэтак жа рэдка гэтая катэгорыя слоў афармляецца пры дапамозе фарманта *-ье*, што выступаў у якасці нормы ў старабеларускіх пісьмовых помніках: *веселье, збиранье, роженье*. Амаль выключна ў Скарыны выкарыстоўваецца царкоўнаславянская словаўтваральная мадэль на *-ие*, аб чым сведчаць шматлікія напісанні тыпу *блискание, вышивание, гонение, делание, едение, жадание, заслонение, исповедание, корение, кохание, летание, мысление, осужение, пленение, погубление, разграбление, трескание, хуление, чинение, шемрание*.

З іншых фанетычных рыс беларускай мовы спарадычнае адлюстраванне ў выданнях Скарыны знайшлі прыстаўныя зычныя *в* і *г: вужъ, вось обращающаѧсѧ, в навукахъ, гужи, гужами, гусеница;* выпадзенне зычных *д* і *т* у спалучэннях *здн, стн, рдц: позно, празникъ, празнослов, празнота, жалосные, намесникъ, чеснаго, серце;* зацвярдзенне губных зычных: *кровъ, любовъ, осмъ, свекровъ, церковъ, червъ;* асіміляцыя зычных па звонкасці і глухасці: *звѧзалъ, зделали, зделаешъ с шолку, прозбами, з роботы* і інш. Усе гэтыя напісанні выглядаюць памылкамі на фоне этымалагічна-марфалагічнага напісання тыпу *оужъ, наука; праздникъ, сердце; любовь, церковь; просьба, сделати* і толькі могуць служыць пацвярджэннем таго, што пэўныя фанетычныя працэсы ў беларускай мове да гэтага часу ўжо адбыліся.

Ад з'яўлення ў радах арфаграфічна нарміраваных напісанняў адзінкавых адхіленняў разгледжаных вышэй тыпаў беларускі першадрукар не быў гарантаваны не толькі па прычыне адсутнасці ў яго час неабходных правапісных даведнікаў. Пэўную частку памылак неабходна аднесці і на кошт інтэнсіўнасці, можна нават сказаць, паспешнасці яго працы: выдаць за няпоўных два гады больш двух дзесяткаў біблейскіх кніг было не простай справай. Не выпадкова ў асобныя яго выданні пракралася і пэўная колькасць друкарскіх хібаў. Іменна недастатковай уважлівасцю «карэктараў» і самога Скарыны як «рэдактара» можна растлумачыць наступныя друкарскія памылкі ў кнігах «Выхад»: *совлюдите* (6)=соблюдите, *Амравовъ* (14)=Амрамовъ, *с мета* (21б)=с места, *смертию да ѕметь* (36б)=ѕмреть, *разневаетсѧ* (41б)=разгневаетсѧ, *другиги* (46)=другии, *ко други* (48б)=ко другои, *ко сртане* (49)=ко стране, *буешъ* (53б)=будешъ, *на мете* (59)=на месте; «Лічбы»: *малсло* (2б)=масло, *жервта* (4б)=жертва, *вометьт* (10)=возметь, *жертвты* (15)=жертвы, *сиюм* (16)=сыномъ, *буудеть* (28)=будеть, *соктана* (37)=соткана, *оскрернитсѧ* (22б)=осквернитсѧ, *вчиили* (47)=вчинили; «Левіт»: *всоихъ* (6б)=своихъ, *ротсеть* (16б)=ростеть, *всѧтыхъ* (26)=свѧтыхъ, *ѧблотъ* (31)=ѧблокъ, *хрехъ* (33)=грехъ, *кганицѣ* (36)=тканицѣ, *требнина (39)=требника, нечитъ* (42б)=нечистъ, *разневалсѧ* (53б)=разгневалсѧ, *покропреных* (61)=покропле-

ных, *втоыи* (63)=вторыи, *разневасѧ* (66б)=разгневасѧ; «Быццё»: *сынонѣ* (21)=сыновѣ, *дидѧти* (37б)=дитѧти, *тко еси* (49)=кто еси, *вчинхъ* (57б)=вчинихъ, *село* (58)=седло; «Прамудрасць божая»: *книхъ* (2б)=книгъ, *погыгибели* (27)==погибели; «Прарок Данііл»: *звездотечцевъ* (7)=звездочетцевъ, *в жижителех* (18)=в жителех; «Другі закон»: *тко* (32б)=кто, *з думу* (52)=з дому; «Суддзі»: *бого* (38б)=богъ, *гда* (35б)==егда; «Юдзіф»: *зелми* (4б)=земли, *толоко* (15)=толико; «Прытчы Саламона»: *жужъ* (24б)=мужъ; «Ісус Навін»: *ткому* (12)=к тому; «Ісус Сірахаў»: *тко* (73б)=кто; «Іоў»: *тчо* (44б)==что; чатырох кнігах «Царствы»: *закокъ* (1б)=законъ, *жужеви* (8б)=мужеви, *тодга* (51б)=тогда, *въ лпоцехъ* (60)=въ полцехъ, *глагу* (69)=главу, *врерашнихъ* (71)=вчерашнихъ, *люхеи* (83б)=людеи, *фокговъ* (96)=фикговъ, *Салоломонъ* (119б)==Саломонъ, *вдегда* (142)=внегда, *воеда* (152б)=воевода, *мумъ* (159)=мужъ, *глалола* (165б)=глагола, *вдегда* (189)==внегда, *ныые* (219б)=иные. Разгляд падобных пагрэшнасцей дазваляе сучаснаму даследчыку скарынінскай справы звярнуць увагу на тэхнічны бок тагачаснага друкарскага працэсу.

У заключэнне неабходна адзначыць, што ўжытыя беларускім першадрукаром арфаграфічныя прыёмы не засталіся ізаляваным фактам у гісторыі беларускай пісьменнасці. Яны служылі арыенцірам для многіх аўтараў і перакладчыкаў наступных дзесяцігоддзяў, асабліва калі ім даводзілася працаваць у галіне рэлігійных жанраў. Важна пры гэтым падкрэсліць, што нават тыя правапісныя асаблівасці, якія ў выданнях Скарыны выявіліся толькі ў зародкавым стане, атрымалі пашырэнне ў старабеларускай пісьменнасці пазнейшага часу.

НАЗОЎНІК

Уласцівая праславянскай мове сістэма скланення назоўнікаў па асновах у сваім нязменным выглядзе захоўвалася толькі ў стараславянскай мове. У яе ж усходнеславянскай рэдакцыі і ў яшчэ большай ступені ў старажытнарускай мове пачалося пераўтварэнне гэтай сістэмы ў новую сістэму скланення па родах: назоўнікі мужчынскага роду, якія адносіліся раней да пяці розных тыпаў скланення (асновы на **о*, **ŭ*, **і*, **ū*, на зычны), аб'ядноўваліся ў адзін тып, знікаў тып скланення назоўнікаў жаночага роду асноў на *u*, якія разам з назоўнікамі асноў на зычны аб'ядноўваліся са словамі асноў на *і*. Гэты працэс у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове амаль завяршыўся. Паколькі ў выданнях Скарыны сінкрэтызаваліся дзве моўныя стыхіі — царкоўнаславянская і беларуская, то і суадносіны старых і новых форм назоўнікаў у значнай ступені вызначаюць іх моўную аснову.

АСНОВЫ НА **о*

Адзіночны лік

У н а з о ў н ы м склоне назоўнікі мужчынскага роду маюць свой традыцыйны нулявы канчатак: стоить столпъ солѧн (ПБ, 15б) [1]; родъ иный наставает (ЕК, 3б); земл҃ и попелъ сыи (ІС, 18). Этымалагічна мяккія зычныя ў пераважнай большасці выпадкаў захоўваюць сваю мяккасць: Лепъший естъ тать нежели

[1] Пры пашпартызацыі прыкладаў прыняты наступныя скарочаныя абазначэнні выданняў Ф. Скарыны: АІ — Акафіст Ісусу Хрысту; АК — Акафіст крыжу гасподняму; АМ — Акафіст архангелу Міхаілу; АП — Акафіст Пятру і Паўлу; ДА — кніга «Апостал»; ДЗ — кніга «Другі закон»; ДП — кніга «Прарок Данііл»; ДЦ — Другая кніга «Царствы»; ЕК — кніга «Еклесіяст»; ІН — кніга «Ісус Навін»; ІС — кніга «Ісус Сірахаў»; КБ — кніга «Быццё»; КВ — кніга «Выхад»; КЕ — кніга «Есфір»; КІ — кніга «Іоў»; КЛ — кніга «Левіт»; КН — Канон цудатворцу Міколе; КР — кніга «Руф»; КС — кніга «Суддзі»; КЮ — кніга «Юдзіф»; ЛК — кніга «Лічбы»; ПБ — кніга «Прамудрасць божая»; ПЕ — кніга «Плач Ераміі»; ПП — «Песня песень»; ПС — «Прытчы Саламона»; ПЦ — Першая кніга «Царствы»; ТЦ — Трэцяя кніга «Царствы»; ЧЦ — Чацвёртая кніга «Царствы»; ШК — Шасцідневец кароткі. Вынасныя літары арыгіналаў унесены ў радок і выдзелены курсівам.

оуставичный лъгарь (ІС, 33); Мужь грешныи будеть е в собѣ держати (там жа, 45); конець погибели их приидет (ПБ, 19б); выскочилъ естъ мечь острыи (там жа, 28б); Аръфаѧат царь медийский (КЮ, 3). Толькі зрэдку пад уплывам жывога беларускага вымаўлення выдаўца сустракаюцца формы з цвёрдымі канцавымі зычнымі: овощъ его сладокъ (ПП, 4); протѧгни плащъ твой на рабыню свою (КР, 5б). У беларускай пісьменнасці таго часу норму складаюць формы з цвёрдымі канцавымі зычнымі (33, с. 12—13).

Назоўнікі ніякага роду захоўваюць свае спрадвечныя формы. Пры гэтым канчатак *-о* маюць назоўнікі з этымалагічна цвёрдым зычным асновы, канчатак *-е* — з этымалагічна мяккім: Говѧдо их почало (КІ, 27); даж до вознесенѧ на небеса житие его всѣ (Ап., прадм).

У р о д н ы м склоне ў старажытнаруской мове і ў дапісьмовую эпоху ў старажытнарускай назоўнікі мужчынскага роду асноў на **о* мелі выключна спрадвечны канчатак *-а/-я*. Аднак ужо ў самых ранніх старажытнарускіх пісьмовых помніках назіраецца ўздзеянне на іх асноў на **и* і з'яўленне канчатка *-у/-ю*. Назіранні паказваюць, што ў выданнях Скарыны мае месца адчувальная тэндэнцыя да замацавання старога ці новага канчатка назоўнікаў мужчынскага роду роднага склону за словамі пэўных граматычных катэгорый і семантычных груп. Так, традыцыйны канчатак *-а/-я*, як правіла, захоўваюць назоўнікі адушаўлёныя. Выключна з гэтым канчаткам ужываюцца перш за ўсё імёны і прозвішчы людзей — *Адама, Валтызара, Даніила, Иова, Иосифа, Исаака, Исуса, Павла, Саламона:* Лета третьего Валтьзара (ДП, 25); Сказание доктора Франциска (ДЗ, 1б); Предословие доктора Франъциска Скорины (ДП, 1б); Чти книги Ісуса Наѳвина (КБ, 3). У такой форме паслядоўна ўжываюцца таксама назвы людзей па адміністрацыйных пасадах, роду заняткаў, сацыяльнаму становішчу, сваяцкіх адносінах, духоўных якасцях і г. д.— *апостола, доктора, пророка, спасителя, фараона, царя:* До седехии останочного царѧ іѳдина (КБ, 3б); о новосотвореной звезде часу нарожениѧ нашего спасителѧ (там жа, 3б); наслеѳдѵмы делы нашего избавителѧ (там жа, 3б). Па паслядоўнасці захавання старых форм да адзначаных назоўнікаў набліжаюцца геаграфічныя назвы — *вавилона, египта, ерусалима, полоцька:* их же заведе отець мои до вавилона (ДП, 19б); Ізъ египта (ДЗ, 15); ѡт ерусалима (ПЕ, 1б); изъ славнаго града полоцька (ДП, 1); приидоша до виѳлеома (КР, 3б). Стары канчатак з'яўляецца адзіным у назвах месяцаў: месеца августа (ПС, 48); месеца сентевриѧ (КІ, 51б); месеца февралѧ (КЮ, 8).

Традыцыйныя формы з канчаткам *-а/-я* маюць пераважна і канкрэтныя назоўнікі (акрамя аднаскладовых), якія паддаюцца лічэнню: ѡт винограда ѳбо содомска естъ вино ихъ (ДЗ, 62); до града именем Аръ (там жа, 9); вниити до покоѧ его (КЮ, 23); на брегу потока (ДЗ, 10).

Аднак нельга вылучыць разрады назоўнікаў, якія б з такой паслядоўнасцю ўжываліся з новым канчаткам *-у/-ю*. Тым не менш тэндэнцыя да замацавання апошняга за словамі пэўных семантычных груп у вывучаемых тэкстах бясспрэчная. Так, канчатак *-у/-ю* маюць пераважна рэчыўныя назоўнікі тыпу *квасу, праху, туку, ячменю:* далъ ей шесть мерокъ ꙗч^{s}меню (КР, 5); да не будеть квасу (КВ, 23б); ѕтроба его полна ест туку (ІС, 27б). Большменш паслядоўна з новым канчаткам ужываюцца назвы адрэзкаў часу: въ части векѕ стго (ІС, 28б); Пред часом конца живота и веку (там жа, 74б); дали имъ часу (КВ, 25). Новы канчатак маюць у вывучаемых тэкстах таксама назвы з'яў прыроды — *ветру, вихру, грому, дождю:* гласъ ꙗкобы ветру тихого слышах (КІ, 9); искра похищена ѡт вихру (ІК, 27); звѕкъ грому (ІС, 62б); Дасть гсдь вместо дождю вам прахъ (ДЗ, 52). У пераважнай большасці выпадкаў з новым канчаткам ужываюцца і назвы з'яў псіхічнай дзейнасці чалавека — *гневу, разуму, смутку, сорому, страху, стыду:* страху дла нощнаго (ПП, 5б); Смѕткѕ не придавай къ души твоей (ІС, 49б); ѡ избавлении нашемъ ѡт гневу божиа (ДП, 2); Да без^{s} студу сбираеть (КР, 4б). Новы канчатак пераважае і ў аддзеяслоўных назоўнікаў, якія абазначаюць разнастайныя апрадмечаныя дзеянні тыпу *возрасту, въсходу, входу, западу, заходу, исходу, лову, приступу, умыслу, упаду:* козелъ ѡт козъ приходаше ѡт западу сол^{s}нца (ДП, 25); абы избавил^{s} его и до заходу сол^{s}нца (там жа, 21б); до конца исходу (ПБ, 17); дла ѕпаду людей моих (ПЕ, 6); приступу нету (КІ, 47б). Звяртае на сябе ўвагу ступень паслядоўнасці ўжывання з новым канчаткам назваў розных адцягненых паняццяў — *гладу, гласу, гуку, долгѕ, запаху, крику, миру, плачю, плену, свару, смыслу, сну, совету, стану, суду, труду:* прѣсташа ѡт гѕкѕ (КІ, 7б); сладкость доброго запаху (ІС, 39б); сее естъ гласъ крикѕ сего (ПЦ, 12). Паколькі ўсе назоўнікі асноў на **й*, для якіх канчатак *-у/-ю* спрадвечны, аднаскладовыя, з гэтым канчаткам у Скарыны ўжываюцца звычайна аднаскладовыя канкрэтныя назоўнікі — *возу, лну, плоду, стогу, столу, строю, храму:* со лнувиссонѕ (КВ, 49б); въместо плоду скотиного (ПБ, 30); иде спати и лаже подле стогу жит^{s}ного (КР, 5б); ѡт столу царева (ДП, 6); о збитии боку (ІС, 68). У адрозненне ад старажытнарускай пісьменнасці, дзе адушаўлёныя назоўнікі са зборным значэннем маюць звычайна традыцыйны канчатак *-а/-я*, у Скарыны для гэтых назоўнікаў найбольш характэрны новы канчатак *-у/-ю:* з роду волотовъ (ДЗ, 7); ѡт человека теже и до скоту (КВ, 22б); роду его (КР, 4); з народѕ вашего (ДЗ, 4).

Такая тэндэнцыя да замацавання старога і новага канчаткаў роднага склону назоўнікаў мужчынскага роду асноў на **о* з'яўляецца, безумоўна, вынікам уплыву беларускай мовы эпохі Скарыны, дзе новы канчатак *-у/-ю* стаў ужо факультатыўнай нормай [33, 15]. Аднак не ўсе словы з разгледжаных семантычных

груп характарызуюцца ўстойлівасцю сваіх форм у родным склоне адзіночнага ліку, што можа тлумачыцца незавершанасцю працэсу размежавання функцый старога і новага канчаткаў у мове першадрукара. З аднаго боку, назоўнікі, якія звычайна маюць стары канчатак, сустракаюцца і з новым, у выніку чаго ўзнікаюць апазіцыі тыпу постелник его вшедъ до шатра (КЮ, 23) — до шатру ѡлофернова (КЮ, 17б); Изъ египта (ДЗ, 15) — Ізъ египту (там жа). З другога — словы, для якіх больш характэрны новы канчатак, могуць быць адзначаны і са старым: на соор8жение храму (КВ, 45) — на сооружение храма (там жа, 66); знашла ѧчменю ѧкобы три меры (КР, 4б) — зˢбирати класы ѧчˢменѧ (там жа, 3б); ѡт столу царева (ДП, 6) — они же едаху ѡт стола царева (ДП, 6); съхранение закону еѧ (ПБ, 10б); не делай грѣху (КВ, 2) — длѧ коего же греха (ПБ, 15).

Можна меркаваць, што пры выбары таго або іншага канчатка Скарына арыентаваўся на чэшскую Біблію 1506 г., якая, як вядома, служыла яму асноўным дапаможнікам пры падрыхтоўцы выданняў і ў якой новы канчатак значна пашыраны побач са старым. На гэту думку наводзяць шматлікія супадзенні форм роднага склону ў абедзвюх крыніцах: Аще бо сна моего не повѣдите мнѣ (ДП, 7) — gest li že sna ne vkažete mi; 8слышите звукъ... всѧкого строѧ гудебного (ДП, 11) — vslyssijte... zwuk... každeho stroge hudebneeho; ѡтверзъ 8ста своѧ посˢреди огˢнѧ (ДП, 12) — otewrzew vsta swa wpstřed ohne; розмножение мору (ПЦ, 13) — rozmnoženije moru; Того пакъ час8 (ДЦ, 70б) — toho czasu; похищена суть ѡт ветру (ДП, 9) — zdwiženi gsu od wietru; козелъ ѡт козъ приходѧше ѡт западу солнца (ДП, 25) — kozel tož przychažel od zapadu; всѧко слово мудрости и разуму (ДП, 6б) — každe slowo mudrosti y rozumu.

У адрозненне ад гэтага ў «Астрожскай бібліі» асноўнае месца займаюць формы са старым канчаткам, новая ж флексія прадстаўлена тут нязначна: наполни и дха бжіа; вси кнѧзи сонма прежде пожренія т8ка, але не доидоша дˢна рˢв8.

Такім чынам, на афармленне роднага склону назоўнікаў мужчынскага роду асноў на **о* ў выданнях Скарыны аказалі ўплыў родная мова выдаўца і выкарыстаная ім чэшская Біблія.

Ад назоўнікаў мужчынскага роду асноў на **о* стабільнасцю сваіх форм адрозніваюцца словы ніякага роду гэтых асноў. Як і ў царкоўнаславянскай і старажытнарускай мовах, яны ўжываюцца толькі з ранейшым канчаткам *-а/-я:* даже до моря (КЮ, 5); з утра (КІ, 4б); ѡт лица кнѧзева (ЕК, 15); не ѡтходи с полѧ сего (КР, 4).

У д а в а л ь н ы м склоне назоўнікі мужчынскага роду з асновай на **о* ў стараславянскай мове першапачаткова ўжываліся толькі са сваім спрадвечным канчаткам *-у/-ю.* Аднак ужо тады ў выніку ўзаемадзеяння з асновамі на **й* як праяўлення тэндэнцыі да аб'яднання гэтых назоўнікаў у адным тыпе скланення на аснове агульнасці роду сюды пачаў пранікаць канчатак

-ови/-еви. У старажытнарускай мове гэты працэс атрымаў сваё далейшае развіццё, а ў старабеларускай узмацніўся дзякуючы заходнеславянскаму ўплыву. У выданнях Скарыны асноўнае месца займаюць ранейшыя формы (85 %) з канчаткам *-у/-ю*, што тлумачыцца імкненнем выдаўца захаваць традыцыйную моўную аснову праваслаўнай Бібліі. Пры гэтым этымалагічна мяккія канцавыя зычныя асноў, нават *ц*, у большасці выпадкаў захоўваюць сваю мяккасць. З традыцыйным канчаткам выступаюць перш за ўсё неадушаўлёныя назоўнікі. Звычайнымі тут з'яўляюцца формы тыпу *востоку, дождю, духу, западу, звуку, концю, пуху, шатру:* на подобность пуху орꙋловому (ДП, 17б); къ шатру ѡлофернову (КЮ, 22б); Пойду к... западу (КІ, 29б); Кто ест дождю отець (там жа, 46); ѡнъ приводить совѣтники къ гл8пом8 концю (КІ, 17б). Пад уплывам царкоўнаславянскай і старажытнарускай моў з гэтым канчаткам шырока прадстаўлены і назоўнікі адушаўлёныя — *богу, господу, даниилу, мисаилу, мужу, навходоносору, овну, отцу, приятелю, Христу, царю:* бог8 ко чти (ДП, 1); ѡтвеща царь и рече ко даниилу (там жа, 2); Воозъ ест имѧ мужу тому (КР, 5); служити Навходносорови царю (КЮ, 5б).

У выданнях Скарыны новыя формы часцей за ўсё маюць назоўнікі адушаўлёныя, што было закладзена яшчэ ў старажытнарускай мове. Найбольш характэрнымі з'яўляюцца формы адушаўлёных назоўнікаў тыпу *гсдеви, даниилови, дариеви, ефраимови, ияковови, лекареви, медведеви, моисееви, мужеви, навходносорови, олоферновн, отцеви, цареви:* ѡтп8стил людей помолитисѧ гсдеви (КВ, 11); Даниилови в нощномъ видении тайна сиѧ ꙗвлена естъ (ДП, 7б); дай место лекареви (ІС, 61). Як вынік уплыву роднай мовы выдаўца, дзе пры яго жыцці новы канчатак пашыраўся і на неадушаўлёныя назоўнікі, формы такога тыпу выяўлены і ў вывучаемых тэкстах: жертва данаѧ идолови (ІС, 49б). Пашырэнне новых форм роднага склону з канчаткам *-ови/-еви* ў старабеларускай мове часоў Скарыны з'явілася вынікам заходнеславянскага ўплыву. Крыніцамі гэтых форм для Скарыны, акрамя роднай мовы, былі выкарыстаныя ім пры падрыхтоўцы сваіх выданняў чэшская Біблія 1506 г. і невядомая польская. Аб гэтым сведчаць шматлікія выпадкі супадзенняў: внииде даниилъ ко ариотови (ДП, 8) — Danyel wssel k Aryotowi; далъ естъ гсдь богъ данилови милость (там жа, 5б) — Y dal buoch Danyelowi milost. Наогул у чэшскай Бібліі 1506 г. новыя формы пашыраны ў значна большай ступені, чым у «Бібліі» Скарыны, аб чым гавораць частыя выпадкі, калі новай форме ў першай адпавядае старая ў другой: он же прислалъ... послы къ давыд8 (ДЦ, 75) — poslal... posly Dawidowi; Двду же и семени его... да будетˢ мир (ТЦ, 126) — Dawidowi pak a pokolenij geho... budiž pokoy; он же сонъ царю искажеть (ДП, 8) — genž pohadku kralowi powije. Прыведзеныя прыклады з'яўляюцца доказам таго, што Скарына не заўсёды імкнуўся пераймаць нормы чэшскай Бібліі 1506 г., прытрымліваючыся

сваёй устаноўкі на захаванне традыцыйнай моўнай асновы свяшчэннага пісання, ён часам свядома адштурхоўваўся ад яе. У «Астрожскай бібліі» пануючае месца займаюць традыцыйныя формы з канчаткам *-у/-ю*, прычым пашыраны яны тут у значна большай ступені, чым у «Бібліі» Скарыны, аб чым сведчаць прыклады, калі новай форме ў другой крыніцы адпавядае старая ў першай: возвестиша Давыдови (ДЦ, 68) — възвѣстиша двдѕ; речено ест Давыдови (Скар. ДЦ, 74б) — рѣша двдѕ; ѕделали суть домъ Давыдови (Скар. ДЦ, 75) — воздаша дом Двдѕ.

Назоўнікі ніякага роду ў стараславянскай, старажытнарускай і старабеларускай мовах нязменна захоўвалі традыцыйны канчатак *-у/-ю*. Тое ж бачым і ў Скарыны: место къ покаѧнию (ПБ, 18); что естъ потребно к душному спасению (КБ, 1); Конец прѣдсловию (КІ, 2б); Стым его к веселію (там жа, 1).

Першапачаткова ў стараславянскай і старажытнарускай мовах формы в і н а в а л ь н а г а склону мужчынскага роду супадалі з формамі назоўнага. Аднак неабходнасць фармальна выразіць розніцу ў сінтаксічных функцыях суб'екта і прамога аб'екта дзеяння выклікала тое, што назоўнікі адушаўлёныя яшчэ ў старажытнарускую эпоху пачалі ўжывацца ў формах, аднолькавых з родным склонам. У сваіх традыцыйных, аднолькавых з назоўным склонам формах ужываюцца ў Скарыны назоўнікі неадушаўлёныя: вынѧла мечь его (КЮ, 20б); Поострю ѩко молнию мечь мои (ДЗ, 62б); возложи обручь златыи на правую руку (КЮ, 16б); приимуть црство красоты и венець надежи (ПБ, 9); протѧгни плащъ твой на рабыню свою (КР, 5б — 6); во срамоту и въ студъ быхомъ (ДП, 12); Благославите ледъ и снегъ (ДП, 13б).

Адпаведна як працяг тэндэнцыі, якая ўзнікла ў старажытнарускую эпоху, адушаўлёныя назоўнікі ў вывучаемых тэкстах маюць формы з новым канчаткам *-а/-я*, што ўзніклі тут пад уплывам роднага склону: на гсда бога (КІ, 5б); на навходносора царѧ (ДП, 17б); познаваеть мучителѧ (КІ, 41); приведеши телца (КВ, 55б). Толькі ў адзінкавых выпадках сустракаюцца тут ранейшыя формы, агульныя з назоўным склонам: вделалъ имъ телець (КВ, 60б).

Назоўнікі ніякага роду, як і ў стараславянскай, старажытнарускай і старабеларускай мовах, захоўваюць свае ранейшыя формы, агульныя з назоўным склонам: скрозе море чермное (ПБ, 16); Благославите море и реки гсда (ДП, 14); велелъ созвати все войско силы своеѧ (КЮ, 6); ѩдали былие (КІ, 35б); закрыла лице его сытость (там жа, 21).

У старажытнарускай мове, як і ў стараславянскай, у т в о р н ы м склоне адзінымі формамі назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду былі традыцыйныя, з канчаткам *-омь/-емь,* які ў старабеларускай мове ў выніку зацвярдзення губнога набыў выгляд *-омъ/-емъ*. Пад уплывам жывой мовы ў такім выглядзе ён выкарыстоўваецца і ў Скарыны. Канчатак цвёрдай разнавіднасці

асноў *-омъ* ужываецца пасля этымалагічна цвёрдых зычных. Мужчынскі род: Каломъ воловымъ оукиданъ ест ленивыи (ІС, 35); со человѣкомъ (КІ, 26б); прѣдъ^{s} богомъ (там жа, 9б); ніякі род: владеють златомъ (КІ, 75). Пасля этымалагічна мяккіх зычных у адпаведнасці са стараславянскай і старажытнарускай традыцыяй выступае канчатак *-емъ* мяккай разнавіднасці асноў: той захотелъ не токмо царем быти (КЮ, 2); каменемъ драгымъ шафиремъ (ПП, 8); предъ лицем^{s} (ПБ, 13); востанеть царь нестыдатый лицемъ (ДП, 26); предъ свитаниемъ (ПБ, 17б); ꙗко искры межи тростиемъ (там жа, 6). Назоўнікі з асновай на *j* часта ўжываюцца ў характэрнай для стараславянскай мовы форме без інтэрвакальнага *j*: елеомъ свѧтым (ІС, 72б). Такія формы ўласцівы і «Астрожскай бібліі», якая з'яўляецца ўзорам царкоўнаславянскай мовы свайго часу: помазаны елеомъ.

У м е с н ы м склоне назоўнікі мужчынскага і ніякага роду ў стараславянскай і старажытнарускай мовах мелі канчатак *-е(-ѣ)* пры цвёрдай аснове, *-и* — пры мяккай. Гэты канчатак быў атрыманы ў спадчыну і старабеларускай мовай. Разам з тым яшчэ ў старажытнарускую эпоху асновы на **о* ў месным склоне адзіночнага ліку падвергліся ўплыву асноў на **и*, у выніку чаго тут пачаў ужывацца канчатак *-у/-ю*.

У выданнях Скарыны для афармлення меснага склону назоўнікаў мужчынскага роду шырока выкарыстоўваецца стары канчатак. Пасля спрадвечна цвёрдых зычных ужываецца, як правіла, канчатак *-е(∠-ѣ)*. Пры гэтым заднеязычныя ў адпаведнасці з нормай стараславянскай і старажытнарускай моў пераходзяць у свісцячыя. Указаны канчатак па традыцыі ўжываецца пасля шыпячых, *ц* і *р*: в лесе древо ровное вытѧвъ (ПБ, 20); во аде (там жа, 8б); ѕскормлены суть по бозе (КЮ, 2б); на празе домов ваших (ДЗ, 17б); ѡ антихристе и о прельщении его (ДП, 1); о... козле (там жа, 3б); По александре (ІС, 2б); въ человѣце (там жа, 33). Адпаведна канчатак *-и* выступае пасля этымалагічна мяккіх зычных, у тым ліку пасля шыпячых, *ц* і *р*: насилие инших во израили (ПП, 5б); на конци пригоды (ПБ, 17); По цари навходносоре (КЮ, 1б); при навходносоре цари (ДП, 2б); в покои пребудеть (ПБ, 7); в раи (ПП, 2б).

Натуральна, выданні Скарыны не маглі не адчуць уздзеяння працэсу аб'яднання назоўнікаў розных асноў на падставе агульнасці роду, што адбывалася і ў месным склоне асноў на **о*. Амаль у такой жа ступені, як і стары канчатак *-е/-и*, тут пашырана новая флексія *-у/-ю* як вынік уплыву асноў на **ŭ*. Таму шырока прадстаўлены новыя формы тыпу *(в, на, о, при, у) браку, вальтызару, гсду богу, воздуху, дамаску, мужу, овну, плачу, посмеху, посту, праху, следу, суду, языку:* при вальтызару цари (ДП, 2б); смышлѧйте о гсдѕ богу (ПБ, 3); о мужу исповедующем избавление людьское (ДП, 3б); о плачу всехъ людей по немъ (ДЗ, 65); нароженый в руском ꙗзыку (ДП, 4б). У пашырэнні новага канчатка *-у/-ю* ў выданнях Скарыны пэўную ролю магла ады-

граць і чэшская Біблія 1506 г.: o swem muży; w spasyteli; w bogi; na swem ložczy, але w chramu; na cherubinu. У «Астрожскай бібліі» нормай з' яўляецца традыцыйны канчатак *-ѣ/-и*, які ўжываецца ў адпаведнасці з якасцю канцавога зычнага асновы: на херувимѣ, але о мѫжи емь.

Назоўнікі ніякага роду ў вывучаемых тэкстах, як і ў стараславянскіх, старажытнарускіх і старабеларускіх, захоўваюць традыцыйны канчатак *-е/-и* адпаведна пасля цвёрдых і мяккіх зычных (у Скарыны ў тым ліку і пасля этымалагічна мяккіх шыпячых, *ц* і *р*, чым яго выданні адрозніваюцца ад старабеларускіх тэкстаў). У выніку тут адзначаны такія прыклады, як ѧ великомъ месте празскомъ (КЮ, 26); потопила естъ въ мори (ПБ, 16); на поли великомъ (КЮ, 3б); в серци моем (ПЕ, 8); слезы его на лици его (там жа, 3б).

З агульнаславянскай мовы ў старажытнарускую, а з апошняй у старабеларускую перайшла асобая склонавая форма, якую прымалі назоўнікі ў ролі зваротка. Яе прынята называць клічным склонам, або вакатывам. У старажытнарускай мове яна ўжывалася досыць шырока, аднак ужо тады пачалося выцясненне яе формай назоўнага склону. Шырока выкарыстоўваецца клічны склон у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове, разам з тым тут працягвалася выцясненне яго назоўным склонам.

У форме клічнага склону ўжываюцца пераважна назоўнікі ў ролі зваротка і ў выданнях Скарыны. Як і раней, яны маюць канчатак *-е/-ю* адпаведна пасля этымалагічна цвёрдых і мяккіх зычных, пры гэтым заднеязычныя падвяргаюцца палаталізацыі: Въстани ветре полунощныи (ПП, 6б); Боже отець моих (ПБ, 14); Слыши Ізрайлю (ДЗ, 17б); Ізраилю послушай заповедей и судовъ (там жа, 12); даниле рабе бога живаго (ДП, 22); Роде злыи и развращеный, сиѧ ли воздаете гсдеви (ДЗ, 61); але Прото царю советъ мои да полюбитсѧ тобѣ (ДП, 17).

Разам з тым, як і ў старабеларускай пісьменнасці, тут сустракаюцца выпадкі ўжывання ў ролі зваротка форм назоўнага склону, што знаходзіцца ў рэчышчы агульнага для тагачасных усходнеславянскіх моў працэсу выцяснення з ролі зваротка клічнага склону назоўным: рече к нимъ правда ли ест сее сидрахъ мисахъ и авденаго иже боговъ моихъ не честуете (ДП, 11).

Множны лік

Назоўнікі мужчынскага роду ў стараславянскай мове незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы у назоўным склоне мелі канчатак *-и*. Пры гэтым заднеязычныя падвяргаліся палаталізацыі ў адпаведнасці з нормай гэтай мовы. Такі канчатак у пэўнай ступені быў уласцівы і старажытнарускай і кніжным стылям старабеларускай мовы. Імкненнем Скарыны арыентавацца пераважна на нормы царкоўнаславянскай мовы тлумачыцца даволі высокая ўдзельная вага адпаведных форм у яго

выданнях — *воини, мудрци, мужи, раби, согледатаи:* Вопрошаху же его воини (ДЗ, 3б); Абы созвани были гадачи и муд^{s}рци (ДП, 6б); Мужи же тии... падоша свѧзани посреди пещи (там жа, 11б); абы раби твои были соблюдени безъ ѩзвы (ПБ, 29б). Канцавыя заднеязычныя часта пераходзяць у свісцячыя, аднак прыблізна ў такой жа ступені пашыраны і формы без гэтага пераходу: *близнеци, бози, врази, грешници, друзи, потоци, преступници, противници, прузи, светилници, языци,* але *боги, врѧдники, грехи, отроки.*

Яшчэ ў старажытнарускай мове пачалося пранікненне сюды канчатка вінавальнага склону *-ы*. Гэтаму садзейнічала большая выразнасць гэтага канчатка, які не змяняў якасці канцавога зычнага асновы, і аналогія форм назоўнага і вінавальнага склонаў. У выданнях Скарыны гэты новы канчатак пашыраны прыкметна, аднак па колькасці прыкладаў ён уступае традыцыйнаму. Гэта формы тыпу *власы, законы, зубы, львы, персты, рогы, суды:* власы его на подобность пуху, ор^{s}ловому (ДП, 17б); Зубы и пазногты его железны беша (там жа, 24); львы всѧ кости их сотроша (там жа, 22б). Разам з тым яшчэ ў старажытнарускай мове ў выніку ўзаемадзеяння з асновамі на **и* сюды пачалося пранікненне канчатка *-ове/-еве*. Паддаліся яго ўплыву і асновы на **о* ў скарынінскіх выданнях. Па пашыранасці новы канчатак тут займае асноўнае месца. Як і ў тагачаснай беларускай мове, з ім выступаюць пераважна адушаўлёныя назоўнікі, утвараючы формы тыпу *волотове, дедове, коневе, народове, отцеве, родове, предкове, светкове, стражеве, цареве:* иже сѧ видели ѩко волотовѣ (ДЗ, 8б); коневе их прикрили суть долины (КЮ, 24б); вси людие племена и народове трѧслисѧ и боѧлисѧ его (ДП, 19б—20). Але часта, як і ў старабеларускай пісьменнасці, з гэтым канчаткам выступаюць і назоўнікі неадушаўлёныя, утвараючы формы тыпу *грехове, громове, дарове, дождеве, домыслове, зубове, облакове, рогове, судове, щитове:* тѫ пали суть щитовѣ силныхъ (ДЦ, 67б); престали суть громовѣ (КВ, 19б); Посулы и даровѣ заслеплѧють очи сѫдьѩмъ (ІС, 33).

Блізкасцю форм назоўнага склону з вінавальным было абумоўлена іх узаемадзеянне. У выніку ў назоўны склон пранік канчатак мяккай разнавіднасці вінавальнага склону *-е*. Гэта з'ява мела месца ў старабеларускай мове, не абмінула яна і выданні Скарыны. Указаны канчатак у параўнанні з іншымі ў назоўным склоне множнага ліку пашыраны ў найменшай ступені: Агнъце веселѧщесѧ (ПБ, 30); сѣ... коне и велблюды (КЮ, 5б); ногте его ѩко пазног^{s}ти п^{s}тици (ДП, 17б); сиѧ сут... обычае посвѧтные (ДЗ, 15); проклѧты сут овоще земли твоеѧ (там жа, 52). Пашырэнню канчатка *-ове/-еве* ў Скарыны магла садзейнічаць, акрамя яго роднай мовы, дзе гэты канчатак у той час набываў усё большае распаўсюджанне, таксама і чэшская Біблія 1506 г. На гэтую думку наводзяць шматлікія супадзенні форм у абедзвюх крыніцах: тѫ пали суть щитовѣ силных (ДЦ,

67б) — tu padli gsu sstijtowe sylnych; вси людие племена и народове трѧслисѧ и боѧлисѧ его (ДП, 19б—20) — wssyczkni lidee pokolenije a yazykowe trzasli se a strachowali se geho; пред ним же пали были три рогове (ДП, 24) — przed nijmz padli byli trzye rohowe.

Новым формам Скарыны ў «Астрожскай бібліі» адпавядаюць старыя. Адпаведна новаму канчатку *-ы* ў апошняй ужываецца традыцыйны *-и:* возникоша четыре рогы (ДП, 25б) — възыидоша др8зій четыре рози; львы всѧ кости их сотроша (ДП, 22б) — льви и всѧ кости ихъ отончиша. Гэты ж канчатак адпавядае звычайна і канчатку *-ове/-еве* ў Скарыны, параўн.: кружковѣ межи ими (КВ, 70б) — пр8зи ихъ; межи ими и кветкове (КВ, 70б) — цвѣтци.

Назоўнікі ніякага роду ў пераважнай большасці выпадкаў маюць свой спрадвечны канчатак *-а* пасля цвёрдых зычных, *-я* — пасля мяккіх: *дела, жита, места, права, приношения, пута, села, сердца, стада, яблока:* первыи лета были лепшие (ЕК, 11); Сл8зе злому побои и пута (ІС, 54б); приношенiѧ моѧ приѧтна будут вышнему (там жа, 14б). Разам з тым пад уплывам назоўнікаў мужчынскага роду яны могуць мець канчатак *-ы/-и*, што мела месца ў тагачаснай беларускай мове: навратѧтсѧ облаци (ЕК, 17); Облаци же розширѧють свѣтло свое (КІ, 44б).

Яркім доказам арыентацыі Скарыны пры падрыхтоўцы перакладу «Бібліі» пераважна на традыцыйныя моўныя сродкі з'яўляецца тое, што назоўнікі мужчынскага роду выступаюць у р о д н ы м склоне пераважна з ранейшым нулявым канчаткам. Пры гэтым, як звычайна, этымалагічна мяккія зычныя захоўваюць сваю мяккасць — *агнецъ, богъ, власъ, воинъ, грехъ, девственикъ, конець, мужъ, мученикъ, отецъ:* ѧко в^{ѕ} тысещи агнецъ туч^{ѕ}ныхъ (ДП, 12б); и не бѣ с ними богъ чуждъ (ДЗ, 61б); понижены на земли грехъ дела нашихъ (ДП, 12б); возросте... сила твоѧ даже до конець земли (там жа, 17); о мукахъ различныхъ светыхъ мученикъ (ПБ, 5б). Такі канчатак быў нормай старажытнарускай мовы. Аднак яго невыразнасць, аманімія з назоўным склонам адзіночнага ліку сталі прычынай таго, што ў старажытнарускай мове ён пачаў адпаведна пасля мяккіх і цвёрдых зычных замяняцца канчаткам *-овъ/-евъ* роднага склону множнага ліку асноў на *й*, чаму садзейнічала, відаць, агульнасць роду назоўнікаў абедзвюх асноў. У Скарыны гэты новы канчатак займае другараднае пасля традыцыйнай флексіі месца. Тут, у прыватнасці, выяўлены такія формы: *венцевъ, враговъ, греховъ, зубовъ, купцевъ, летописцевъ, мертвецевъ, мужевъ, мучителевъ, неприѧтелевъ, отцевъ, прелюбодейцевъ, скарбовъ, супротивниковъ, товаришевъ, языковъ:* наделаймы собѣ рожаных венцевъ (ПБ, 4б); въ сонмищи мертвецевъ (КІ, 27б); Сынове же прелюбодейцевъ в загинутии б8д8ть (ПБ, 6б).

Найменшае пашырэнне ў вывучаемых тэкстах мае канчатак *-ей.* У праславянскай мове ён быў характэрны толькі для роднага

склону множ[illegible]а ліку асноў на **i*: Послати множество недведей [illegible]идцеть локтей (КЮ, 3б).

У тагачаснай беларускай мовы, як сведчаць пісьмовыя [illegible]кі, ужо быў новы канчатак *-овъ/-евъ*. Гэты ж канчатак з'яўляецца нормай і ў чэшскай Бібліі 1506 г., што відаць на прыкладзе наступных супастаўленняў: з руку богъ (ПЦ, 11б) — od ruky bohuow; ꙗко в тысещи агнецъ тучныхъ (ДП, 12б) — yako w tisyčyech beranuow. Для «Астрожскай бібліі» характэрны стары нулявы канчатак: ѡт рѣки бъ. Разам з тым новы канчатак (яго царкоўнаславянскі варыянт *-ій*) пашыраны тут, відаць, у большай ступені, чым у Скарыны: паде... три тысещи мужъ (КВ, 62) — паде... до трехъ тысѧщъ мѣжіи.

Назоўнікі ніякага роду захоўваюць свой традыцыйны нулявы канчатак: местъ ѿтвержение (ДЗ, 3); почали наставати седмъ летъ гладу (КБ, 76). Гэта ў пэўнай меры было ўласціва старажытнарускай і старабеларускай мовам.

Нормай скарынінскіх выданняў у д а в а л ь н ы м склоне з'яўляецца традыцыйны канчатак асноў на **o -омъ/-емъ*. Яго ўжыванне ахоплівае пераважную большасць адпаведных форм. У многіх к[illegible]ах ён з'яўляецца наогул адзіным. Канчатак *-омъ* ужываецца т[illegible]ькі пасля этымалагічна цвёрдых зычных, канчатак *-емъ* — пасля этымалагічна мяккіх, у тым ліку шыпячых, *ц* і *р*. У выніку тут утварыліся формы тыпу *блудникомъ, богомъ, внукомъ, врагомъ, градомъ, грехомъ, гробомъ, женцемъ, зубомъ, кумиромъ, львомъ, людемъ, мужемъ, народомъ, обычаемъ, отрокомъ, отцемъ, полкомъ, псомъ, рабомъ, судомъ, царемъ, ч[illegible]якомъ, языкомъ:* кто приносить жертву богомˢ чѣждимъ [illegible], 41б); ѡтпущение давалъ еси грехомъ их (ПБ, 18б); за[illegible]ори ѧста львомъ (ДП, 22); псомъ е да дасте (КВ, 42) (мужчынскі род); противенъ ест деломъ нашимъ (ПБ, 5); к добрым делом [illegible] (НС, 4б); будеть трѧсение земли по местомˢ (ДП, 3б) (ніякі род).

У н[illegible]азначнай ступені пашыраны новы канчатак *-амъ/-ямъ*, які пранік сюды пад уплывам скланення назоўнікаў з асновай на *а*: ѡчинить всимъ царствам (ДЗ, 11б). У пашырэнні старых форм з канчаткам *-омъ/-емъ* у выданнях Скарыны пэўную ролю адыграла, відаць, і чэшская Біблія. Так можна сцвярджаць, зыходзячы з таго, што старым формам у Скарыны ў апошняй звычайна адп[illegible]звядаюць такія ж: всемˢ людемъ поколениемˢ и ꙗзыком (Д[illegible] 22б) - vssem lidem pokolenijm y yazykuom (ДП, 5б); дал[illegible]ест бог[illegible]роком сим (ДП, 6) — Y dal buoh tiem mladenczom (Д[illegible] 1б); м[illegible]емъ пресилнымъ ѡт слугъ своихъ повелелъ связати ру[illegible] и но[illegible]идраха Мисаха и авденаго и вовергзти в пещь ог[illegible]ъ гор[illegible]ю (ДП, 11б) — mužuom naysylniegssijm z zastupu [illegible]weho p[illegible]ykazal aby swijezijce rucze y nohy Sydrachowi, Mizachowi a Abdenagowi vwrhli ge w pecz ohnie horzijczeho.

Такія ж адпаведнасці назіраюцца звычайна пры параўнанні выданняў Скарыны і з «Астрожскай бібліяй». Гэта азначае, што

старыя формы былі нормай тагачаснай цар... ...славянскай мовы: кто приносить жертву богом чѫждимъ (КВ, ... требѫ кладет богом; они же глаша во имѧ тзое ца... и кнѧзем нашим ѡтцемъ нашим (ДП, 27) — иже глаша въ имѧ твое къ цремъ нашимъ, и къ кнѧзем^{s} нашим^{s}, и ѡтцемъ нашим; псомъ е да дасте (КВ, 42) — ѳомъ же да дастъ сѧ. У ...этых адносінах ад вывучаемых помнікаў істотна не адрозніваецц... тагачасная беларуская літаратурна-пісьмовая мова. Норму ў ёй таксама ўтваралі формы з традыцыйным канчаткам *-омъ/-емъ*, што мела падтрымку з боку жывой гутарковай мовы.

У стараславянскай мове разглядаемыя назоўнікі, як неадушаўлёныя, так і адушаўлёныя, у в і н а в а л ь н ы м склоне множнага ліку мелі канчатак *-ы* пры цвёрдай аснове, *-и* пры мяккай. Так было пераважна і ў старажытнарускай, а пасля і ў старабеларускай мове. Гэты традыцыйны канчатак утварае асноўную норму і ў скарынінскіх выданнях. Тут, у прыватнасці, зарэгістраваны наступныя адпаведныя формы: выг...ъ естъ жиды из пленениѧ (КЮ, 1б); послы ѡтпустиша празны (там жа, 4); ѫчинилъ... два теже херувимы (КВ, 70); на ...ѧ ...есы (ПБ, 30б). Канцавыя заднеязычныя асноў пры гэтым ... ў адпаведнасці з нормай царкоўнаславянскай мовы перах...яць у свісцячыя: благославите мол^{s}ниѧ и об^{s}лаци гсда (ДП, 14); Благославите вси дуси гсдьни гсда (там жа, 13б). Зрэдку такія формы, як у старажытнарускай мове, заканчваюцца на *гы, кы, хы — врагы, грехы, долгы, полкы, рогы:* останкы их пожре огнь (КІ, 28б); хвалиша богы своѧ (ДП, 18б); воздадите жъ всѣ ... долгы (ДЗ, 3б). Аднак асноўную норму ўтвараюць формы на ...*и, хи,* якія ўзніклі пад уплывам жывой мовы: *враги, грехи, грешники, десятники, полки, помощники, пятдесятники, роги, сотники:* Враги же ихъ потопила естъ въ мори (ПБ, 16); мстѧ грехи ѡтцевъ (ДЗ, 15б); На грешники... гневъ пришелъ ест (ПБ, 2...), онъ собѣ бралъ помощники (КЮ, 5); овенъ единъ стоаше ...дъ озеромъ, имѧ роги высоки (ДП, 25). У адным радзе з разгледжанымі стаяць формы з канчаткам *-е*, які ўзнік тут пад уплывам назоўнікаў ніякага роду гэтых жа асноў. Адпаведныя формы прадстаўлены ў цэлым нязначна: *гае, инее, кладезе, ковче, младенце, мѫже, овоще, пупенце, шершне:* гае ихъ посечите (ДЗ, ...9); Благославите росы и инее гсда (ДП, 13б); мѫже ... жены и ... ти погубихомъ (ДЗ, 9б); послалъ еси шершне (ПБ, ...8).

З развіццём катэгорыі адушаўлёнасці назоўні... якія аб...начаюць жывых істот, пачалі ўжывацца з канчат...ом *-овъ, -евъ,* які ўзнік пад уплывам роднага склону. Гэта з'яв... мела м...ца яшчэ ў старажытнарускай мове. Пэўнае развіццё ... атры...ла ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове... ... выд...ях Скарыны ў цэлым яна адлюстравалася нязначна. Можна прывесці наступныя з нямногіх прыкладаў: наделаеть с нихъ езцевъ и гонъцевъ (ДЗ, 3); Наделалъ есми собѣ певцевъ (ЕК, 4б); Избито естъ мужовъ в тои битве (ПЦ, 11). Адзінкавымі прыкла-

дамі прадстаўлены канчатак *-ей*, які з'яўляецца вынікам уплыву асноў на **i*: выбери... мѫжеи мѫдрыхъ (КВ, 36). З асноў на **и* пранікае канчатак *-ове/-еве*: Благославите духове (ДП, 14). Відаць, узорам у вызначэнні нормы ў даным выпадку ў пэўнай ступені паслужыла чэшская Біблія 1506 г. Гэта дазваляюць сцвярджаць шматлікія паралелі: стеръ оба рогы его (ДП, 25) — zetrzel dwa rohy geho; Благославите росы и инее гсда (ДП, 13б) — Chwalte rosy a gijnije; Избито естъ мужовъ в тои битве на розно (ПЦ, 11) — zbito gest mužuow w te bitwie na ruozno; Благославите духове и души праведных гсда (ДП, 14) — chwalte duchowe a dusse sprawedliwych pana. Гэтага нельга сказаць аб «Астрожскай біблії», з якой у скарынінскіх выданнях тут маюцца частыя разыходжанні: адпаведна традыцыйнаму канчатку *-ы/-и* ў Скарыны ў апошняй часта выступае новая флексія *-а/-я*: выбери... мѫжеи мѫдрыхъ (КВ, 35б) — избери... мѫжа силны; ѫчинилъ... два теже херувимы — сътвори... два херѫвима; стеръ оба рогы его (ДП, 25) — съкрѫши оба рога его. Норму ў старабеларускай пісьменнасці таксама ўтвараюць традыцыйныя формы з канчаткам *-ы/-и*.

Назоўнікі ніякага роду звычайна захоўваюць свой традыцыйны канчатак *-а/-я*, дзякуючы чаму тут на ўзроўні нормы пашыраны ўтварэнні тыпу *вретища, гнезда, жита, дела, имения, колена, лета, лица, места, мяса, оружия, приказания, серца, царства, чрева:* ведаюць гнезда своѧ (КЮ, 2б); попалилъ вси жита их (КЮ, 5); не зрите имъ на лица (ДЗ, 6); мечь мой снесть мѧса их (там жа, 62б). Такія ўтварэнні былі нормай і старабеларускай літаратурнай мовы.

У старажытнарускай мове асноўнае месца ў творным склоне множнага ліку асноў на **о* займаў традыцыйны канчатак *-ы/-и*, агульны з канчаткам назоўнага склону. Гэты канчатак быў атрыманы ў спадчыну і старабеларускай мовай. У выданнях Скарыны старыя формы на *-ы/-и* ўтвараюць асноўную норму. Тут адзначаны шматлікія ўтварэнні тыпу *апостолы, боги, возы, враги, грады, гужи, делы, зубы, леты, львы, народы, ослы, отци, полки, псы, рабы, стогы, хлебы, часы:* К данилу седѧщему въ ѩме со львы (ДП, 4б); С возы и с конники и с стрелци (КЮ, 4б); помститсѧ надъ враги своими (КЮ, 22); скрипели зубы своими (ПЕ, 6б).

З мэтай дыферэнцыраваць творны і назоўны склоны тут яшчэ ў стараславянскай мове пачаў выкарыстоўвацца канчатак *-ми* асноў на **i*. У выданнях Скарыны такі канчатак пашыраны ў некалькі меншай ступені, чым традыцыйны *-и*. Гэта формы тыпу *гадачьми, еленми, князми, конми, людми, медьведьми, мужми, овощми, оленьми, приѧтельми, променми, царьми:* Да поставлю ихъ кнѧзми вашими (ДЗ, 6); вниде с конми фараонъ (КВ, 30); предъ приѧтельми своими (ІС, 67б).

Разам з тым пад уплывам жывой мовы адбывалася ўзаемадзеянне разглядаемых асноў з асновамі на **а*. У выніку сюды

пранікаў канчатак *-ами/-ями*. У скарынінскіх выданнях гэты канчатак пашыраны ў цэлым нязначна. У адпаведнасці з нормай царкоўнаславянскай мовы назоўнікі з асновай на **и* могуць губляць гэты зычны. У выніку тут утварыліся формы тыпу *грехами, евреами, лучами, мудрецами, отроками, рогами, столпами, стрельцами, щитниками:* бежати мыслѧше предъ евреами (КЮ, 23б); кнѧземъ поставилъ его надъ мудрцами (ДП, 19); торкающа рогами своими (там жа, 25). Прыкладна такія суадносіны форм гэтых трох тыпаў характэрны і для беларускай літаратурна-пісьмовай мовы таго часу. Пэўную ролю ў фарміраванні нормы творнага склону адыграла, відавочна, чэшская Біблія 1506 г. Гэта дазваляюць сцвярджаць шматлікія выпадкі супадзення форм у абедзвюх крыніцах — приносѧше часы своими (ПЦ, 8б) — przynassela czasy swymi; надо всеми мудръци халдѣискими (ДП, 9б) — nade wssemi mudrczy Babilonskymi; съ ослы дикими было житие его (там жа, 20) — s diwokymi osły bylo bydlenije ge (ДП, 5); предъ мужми (ДЦ, 69) — przed mužmi. Аднак Скарына не заўсёды ішоў за чэшскай Бібліяй: часта замест традыцыйных у апошняй ён імкнуўся ўжываць новыя, як у прыкладах тыпу со кнѧзми (ПЦ, 7б) — s kniježatij; предъ мужми льстивыми (ДЦ, 72б) — przed muži lstiwymi. Відаць, крыніцай новых форм для Скарыны была тагачасная беларуская мова. У параўнанні з выданнямі Скарыны мова «Астрожскай біблii» ва ўказаных адносінах больш архаічная: розным формам у вывучаемых тэкстах тут адпавядаюць звычайна традыцыйныя: опоѧшеши е повѧсы (Скар. КВ, 55) — опоѧшеши ѧ повѧсы.

Традыцыйны канчатак з'яўляецца асноўным і ў назоўнікаў ніякага роду: *делы, леты, стады, усты, чады:* гневающе его делы руку ваших (ДЗ, 60б); ѡтверзтыми враты (КІ, 35б); предъ сими леты (КЮ, 8б); со чады своими (ДЗ, 4б). На ўзроўні другараднай нормы гэтыя словы пашыраны з новымі канчаткамі, якія праніклі сюды пад уплывам назоўнікаў з асновамі на **а, *і: делами, крылами (крилми), облаками, путами:* отѧжены дѣлами (КВ, 11б); гибаючи крылами (ПБ, 8б); крилми своими (КІ, 47б); воздухъ загустееть облаками (там жа, 45); смири его путами (ІС, 54б).

У старажытнарускай мове назоўнікі мужчынскага роду ў м е с н ы м склоне мелі канчатак *-ѣхъ* пры цвёрдай аснове і *-ихъ* — пры мяккай. У старажытнарускай мове пачаў пашырацца толькі канчатак *-ѣхъ* незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы. Ён быў унаследаваны і старабеларускай мовай. Ужываецца гэты канчатак і ў выданнях Скарыны, дзе ён з'яўляецца асноўным (90 % форм),— *бозехъ, ветрехъ, виноградехъ, возехъ, гаехъ, градехъ, жителехъ, жребиехъ, идолехъ, людехъ, месецехъ, народехъ, полцехъ, престолехъ, розехъ, сапозехъ, сборехъ, скотехъ, станехъ, торзехъ, трудехъ, херувимехъ:* Прогневаша его въ бозехъ чуждихъ (ДЗ, 61б); розделит землю по жрѣбиехъ (там жа, 7б);

Благословенѕ еси созирами безѕдны и седми на херувимехъ (ДП, 13). Зрэдку пад уплывам асноў на *й тут сустракаецца канчатак -охъ, які далучаецца да асноў на цвёрды зычны: о стыхѕ мученикохъ (ПБ, 2); ѕтекаху... по ѕзгоркохъ (КЮ, 23б); по своих рѧдохъ (КВ, 53б); въ скарбохъ (ЕК, 2); Въ шести смѕткохѕ (КІ, 10).

Разам з тым у месным, як і ў радзе іншых склонаў, даныя назоўнікі адчулі на сабе ўплыў асноў на *а. У выніку ўзніклі формы з канчаткам -ахъ/-яхъ. Апошнія ў вывучаемых тэкстах пашыраны нязначна: во оковахъ (ПБ, 31б).

Прыблізна такія ж суадносіны старых і новых форм маюць месца ў цэлым і ў старабеларускай пісьменнасці.

Відавочна, пэўны ўплыў на мову выданняў Скарыны аказала ў даным выпадку чэшская Біблія 1506 г. Аб гэтым можна меркаваць, зыходзячы са шматлікіх выпадкаў супадзення форм у абедзвюх крыніцах: по четырехѕ ветрехъ небесѕныхъ (ДП, 25б) — po cztyrzech wietrzyech nebeskych; в жителех земных (ДП, 18) — w bydlitelech zemskych; о десѧти розех еже имѣаше на главе (ДП, 24) — o desyeti rozyech ktereż miela na hlawie. Традыцыйныя формы з'яўляюцца нормай «Астрожскай біблії»: о десѧти розех еже имѣаше на главе (ДП, 24) — о десѧти розѣхъ его иже на главѣ его.

Істотна не адрозніваюцца ў даных адносінах і назоўнікі ніякага роду. Як і словы мужчынскага роду, яны ў пераважнай большасці выпадкаў выступаюць у сваіх традыцыйных формах з канчаткам -ехъ, аб чым сведчаць шматлікія прыклады накшталт *(въ, на, о, при, у) делехъ, летехъ, местехъ, облацехъ, полехъ, поколениехъ, селехъ, серцехъ, чадехъ:* по всехъ делехъ нашихъ (ДП, 12); по седмидесѧти летехъ (КЮ, 1б); ѕтекаху по полехъ (там жа, 23б). На ўзроўні другараднай нормы пашыраны новы канчатак -ахъ/-яхъ, крыніцай якога з'явіліся асновы на *а: Гэта нешматлікія формы тыпу *(въ, на, о, при, у) гаданиахъ, жилищахъ, коханиахъ, местахъ, серцахъ, царствахъ:* лѣпа есь наймилейшаѧ в коханиахъ (ПП, 9б); оу тесныхъ местахъ (КЮ, 6); во всехъ царствахъ его (там жа, 18); Сила его въ бедрах его (КІ, 48б).

Парны лік

Агульнаславянская мова характарызавалася паслядоўным ужываннем спецыфічных форм, якія выкарыстоўваліся, калі гаворка ішла аб двух ці парных прадметах. Гэтыя формы мелі вялікае пашырэнне і ў старажытнарускай мове, аднак ужо тады з развіццём абстрактнага мыслення формы множнага ліку сталі ўжывацца ў якасці універсальнага сродку абазначэння як мноства, так і двух прадметаў ці з'яў рэчаіснасці. Гэта атрымала далейшае развіццё ў старабеларускай мове, дзе фактычна пачалася страта форм парнага ліку.

У выданнях Скарыны больш-менш прыкметна прадстаўлены формы назоўна-вінавальнага склону парнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду: на оба товариша твоѧ (КІ, 50б); ѡбадва херувима при обоих концехъ молитовнице (КВ, 70). Аднак разам з тым бадай што не ў меншай ступені пашыраны формы множнага ліку назоўнікаў у спалучэнні з лічэбнікамі *два, оба, обадва,* што адлюстроўвае стан парнага ліку ва ўсходнеславянскіх мовах у разглядаемую эпоху: оба рогы (ДП, 25); На оба боки (КВ, 73б); Сии суть два законы (ДЗ, 4). У старабеларускай пісьменнасці ў цэлым формы парнага ліку мужчынскага роду — з'ява надзвычай рэдкая нават у ранніх помніках.

У большай ступені ў вывучаемых тэкстах распаўсюджаны формы назоўна-вінавальнага склону парнага ліку назоўнікаў ніякага роду. З канчаткам парнага ліку *-е/-и* тут, напрыклад, адзначаны наступныя формы, якім адпавядаюць такія ж у Астрожскай і чэшскай бібліях: параўн.: двѣ лѣте царствовал (ДЦ, 68б) — двѣ лѣтѣ црствова — dwie leetie kralowal.

Значна радзей, чым формы назоўна-вінавальнага склону, у выданнях Скарыны сустракаюцца формы родна-меснага склону назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду асноў на **о.* З нямногіх выяўленых тут прыкладаў можна прывесці наступныя: на обу боку (КВ, 53); возлете на крилу ветреню (ДЦ, 111). Звычайна ж гэтыя назоўнікі пры лічэбніках *два, оба, обадва* выступаюць у форме множнага ліку: на обу боцехъ (КВ, 53б); Вделал столъ... дву локот (там жа, 70); о дву крижалахъ (там жа, 59б). Формы родна-меснага склону парнага ліку нязначна прадстаўлены і ў старабеларускай пісьменнасці, уплывам якой, відаць, і тлумачыцца іх слабае адлюстраванне ў Скарыны.

Гэтак жа нязначна прадстаўлены формы давальна-творнага склону. Несумненна, часткова гэта тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі — абмежаванасцю агульнага аб'ёму вывучаемага тэксту, нізкай частотнасцю ўказаных форм у мове наогул у параўнанні з іншымі склонавымі формамі назоўнікаў. Аднак і тэндэнцыя да выхаду іх з ужытку несумненна прывяла да таго, што ў даследуемых тэкстах выяўлены нешматлікія прыклады тыпу плотома виноградныма (ЛК, 49); двемнадесѧте коленома (ПЦ, 2б); Сима двема царема (ДЗ, 11б).

АСНОВЫ НА **й*

Да тыпу скланення асноў на **й* адносілася малалікая група назоўнікаў мужчынскага роду, пераважна неадушаўлёных, якія ў вінавальным склоне адзіночнага ліку мелі канчатак *-ъ(<-й): домъ, медъ, верхъ, низъ, долъ, чинъ, кратъ, полъ, сынъ, волъ, санъ, миръ, родъ, даръ, пиръ.* Нават у стараславянскай мове не ўсе з названых назоўнікаў захоўвалі характэрныя для іх склонавыя формы. У старажытнарускай і асабліва ў старабеларускай мовах разглядаемы тып скланення аказаў уплыў на іншыя тыпы,

перш за ўсё на асновы на **о*, адчуўшы ў сваю чаргу ўплыў іншых асноў, у першую чаргу на **о* і на **а*. Не засталася ў баку ад характэрных для ўсходнеславянскіх моў тэндэнцый і мова выданняў Скарыны.

Адзіночны лік

Разглядаемые назоўнікі ў н а з о ў н ы м склоне маюць выключна свой ранейшы нулявы канчатак. У адрозненне ад асноў на **о* яны маюць толькі цвёрдую аснову, што выключала варыятыўнасць форм: Скорининъ сынъ (КІ, 2б); родъ иный наставаетъ (ЕК, 3б); сынъ божий прииметь и избавить его из руку супротивниковъ (ПБ, 4б); верхъ ѥѧ наполненъ ест терниемъ (ПС, 37б); даръ и миръ естъ изъбраннымъ его (ПБ, 5б); медъ и млѣко подъ ꙗзыкомъ твоимъ (ПП, 6б).

У агульнаславянскі перыяд назоўнікі асноў на **й* ў р о д н ы м склоне адзіночнага ліку мелі адзіны канчатак *-у*. Аднак вельмі рана адушаўлёныя назоўнікі пад уплывам асноў на **о* пачалі ўжывацца з канчаткам *-а*. Гэта адлюстравалася ўжо ў асобных помніках стараславянскай мовы, дзе адзначаны паралельныя формы *сыноу* і *сына* [28, с. 97]. У старажытнарускай і старабеларускай мовах старыя формы такіх назоўнікаў практычна адсутнічаюць. Таму не дзіўна, што ў выданнях Скарыны яны не зарэгістраваны. Тут са спрадвечным канчаткам *-у* ўжываюцца толькі неадушаўлёныя назоўнікі. Відаць, адпаведнасць традыцыі норме жывой мовы выдаўца з'явілася прычынай таго, што гэты канчатак тут з'яўляецца практычна адзіным: Землѧ масла и меду (ДЗ, 21); часть велиа домѫ твоего изотрет (ПЦ, 9б); ѿт верхѫ старыхъ горъ (ДЗ, 64б).

Адушаўлёныя ж назоўнікі маюць толькі пазнейшы канчатак *-а*, што вельмі заканамерна, улічваючы старажытнасць з'явы і час з'яўлення вывучаемых выданняў: Слова... сына двдва (ЕК, 3); Зачатие сына божиѧ (КВ, 3); Працею... скорининa сына (ЕК, 18); прежде нарожениѧ сына божиѧ (ПП, 2б). Пэўную ролю ў фарміраванні нормы роднага склону разглядаемых асноў адыграла, відавочна, і чэшская Біблія 1506 г. Гэта можна сцвярджаць на аснове шматлікіх паралелей тыпу часть сосудов храму господнѧ (ДП, 5) — dijel nadobije domu bożyeho; Вшолъ до дому своего (ДП, 2б) — wssel gest do domu sweho.

У д а в а л ь н ы м склоне адзіночнага ліку назоўнікі разглядаемага тыпу скланення ў агульнаславянскай мове мелі канчатак *-ови*. Аднак у выніку таго, што яшчэ тады пачалося пераўтварэнне ранейшай сістэмы скланення па асновах у сістэму скланення па родах, назоўнікі асноў на **и* як пераважна неадушаўлёныя ў адпаведнасці з агульным правілам пачалі ўжывацца з канчаткам *-у* асноў на **о*. Гэтым тлумачыцца панаванне ўказанага канчатка і ў выданнях Скарыны. У адпаведных новых формах тут выступаюць не толькі неадушаўлёныя, але і адушаўлёныя назоўнікі: Похлѣоуй сынѫ своемѫ (КС, 49); приказалъ есми Ісусу

сыну Навину (ДЗ, 11б); снииду ко сыну своему (КВ, 3); ѕчинилъ дивы... дому его (ДЗ, 18); не ѕказалсѧ есми дому (ПЦ, 9). У гэтым вывучаемыя тэксты супадаюць з чэшскай Бібліяй 1506 г.: сынѕ лаисову (ДЦ, 71) — synu Lays. «Астрожская біблія» ў даных адносінах больш традыцыйная. Новым формам выданняў Скарыны тут часта адпавядаюць ранейшыя: не ѕказалсѧ есми дому (ПЦ, 9) — не изъѧвихсѧ домови; дому ѧковлю (КВ, 36) — домѕ Іаковлю.

Першапачаткова назоўнікі асноў на **й* ў в і н а в а л ь н ы м склоне адзіночнага ліку мелі форму, аднолькавую з назоўным склонам. У далейшым назоўнікі з асновай на **й* ў вінавальным склоне напаткаў той жа лёс, што і назоўнікі з асновай на **о*: з развіццём катэгорыі адушаўлёнасці ўзнікла патрэба дыферэнцыяцыі розных граматычных катэгорый. Са старым нулявым канчаткам у выданнях Скарыны ўжываюцца назоўнікі неадушаўлёныя: сила воды великое текущее на долъ (ПБ, 26); в домъ царства моего (ДП, 17б). Новы канчатак роднага склону маюць адпаведна назоўнікі адушаўлёныя: ѕчить человек сына своего (ДЗ, 20б).

Адзіным у т в о р н ы м склоне быў канчатак *-ъмь*, які ва ўсходнеславянскіх мовах у выніку праяснення рэдукаванага і зацвярдзення губных набыў выгляд *-омъ*. У такім выглядзе ён ужываецца і ў выданнях Скарыны: сыном сѧ божиимъ называеть (ПБ, 5). У асобных жа старабеларускіх пісьмовых помніках яшчэ сустракаюцца формы на мяккі губны.

Побач са спрадвечным канчаткам *-у* назоўнікі асноў на **й* яшчэ ў стараславянскай мове пачалі атрымліваць у м е с н ы м склоне канчатак назоўнікаў з асновамі на **о — ѣ*. Фактарам падзелу функцый гэтых канчаткаў стаў акцэнталагічны. У Скарыны асноўную норму складаюць формы з канчаткам *-у*. З ім тут ужываюцца назоўнікі неадушаўлёныя і адушаўлёныя: о сыну человечиемъ (ДП, 22б); в дому божиемъ (ПЕ, 6); при сыну ѡсиине (там жа, 1б); о сыну человеческомъ (ДП, 3).

Новы канчатак *-е(-ѣ)* пашыраны ў цэлым нязначна: в доме твоем (ДЗ, 16); в домѣ (КІ, 51).

У к л і ч н ы м склоне назоўнікі асноў на **й* ў агульнаславянскай мове мелі канчатак *-оу*. Аднак ужо тады сюды пранікаў канчатак асноў на **о — -ѣ/-е*. Натуральна, што гэтая з'ява знайшла адлюстраванне і ў старабеларускай мове. У выданнях жа Скарыны норму ўтварае традыцыйны канчатак *-у:* разумей сыну человечий (ДП, 26); не звахъ тебе сыну (ПЦ, 10); Сыну, безъ доброе рады не чини ничтоже (ІС, 53). Гэтаму, відаць, садзейнічала чэшская Біблія 1506 г., аб чым дазваляюць гаварыць паралелі тыпу разумеи сыну человечий (ДП, 26) — Rozumiey synu; ѧко сѧ стало сыну мои (ПЦ, 12) — kterak se dalo synu muoy. У «Астрожскай бібліі» сустракаецца і новы канчатак *-е* асноў на **о*: параўн.: разумеи сыну человечий (ДП, 26) — разѕмѣй сѣе.

Множны лік

Спрадвечным для назоўнікаў з асновамі на **й* ў назоўным склоне множнага ліку быў канчатак *-ове*. Побач з ім яшчэ ў старажытнарускай мове пачаў ужывацца канчатак *-ы*, крыніцай якога з'явіліся асновы на **о*; у старажытнарускай і старабеларускай мовах функцыі гэтых канчаткаў аказаліся ў залежнасці ад катэгорыі адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці.

У выданнях Скарыны ў сілу спецыфікі ўмоў іх падрыхтоўкі асноўную норму ўтварае традыцыйны канчатак *-ове* (95 % прыкладаў). У адпаведных формах тут выступаюць назоўнікі як адушаўлёныя, так і неадушаўлёныя: смѣрътелъныи сѣть сыновѣ человѣчести (ІС, 28б); сыновѣ его сътрѣни будуть нищетою (КІ, 25б); Сыновѣ ізрайлевы вышли изъ египта (КВ, 22б); сыновѣ людьстии чинѧть злаѧ дела (ЕК, 13); Сынове же прелюбыдеицевъ в загинутии бѣдѣть (ПБ, 6б); Домовѣ их безпечны сѣть (КІ, 27).

Указаная паслядоўнасць толькі зрэдку парушаецца выпадкамі ўжывання новага канчатка *-ы* з асноў на **о*. Апошні таксама ўжываецца незалежна ад адушаўлёнасці ці неадушаўлёнасці назоўнікаў, што, безумоўна, з'яўляецца вынікам узаемадзеяння розных моўных стыхій у вывучаемых тэкстах: зготоваша сыны ізрайлевы (КВ, 74б); были тѣ три сыны (ДЦ, 69); сыны маютъ честовати родителей своих (ІС, 8); были... два сыны (ПЦ, 5б). Як вядома, у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове традыцыйны канчатак назоўнага склону множнага ліку асноў на **й* атрымаў значнае пашырэнне дзякуючы падтрымцы з боку заходнеславянскіх моў. Гэта датычыць і выданняў Скарыны, дзе, як вядома, крыніцай заходнеславянскага ўплыву з'явілася чэшская Біблія 1506 г.: деѧху сыновѣ его (ПЦ, 8б) — czynili synowe geho; Благославите сыновѣ человѣчести гсда (ДП, 14) — chwalte synowe lidsstij pana; Сыновѣ пакъ Гелиины были сыновѣ безакониѧ (ПЦ, 8) — synowe pak Eli byli synowe Belial neznagijcze boha; зле чинѧть сыновѣ его (ПЦ, 10б) — czynije nesslechetnie synowe geho. Аднак разглядаемыя формы ў супастаўляемых крыніцах не заўсёды супадаюць, што тлумачыцца ўплывам жывой мовы: были тѣ три сыны (ДЦ, 69) — byli tu trzye synowe.

Традыцыйны канчатак *-ове* з'яўляецца асноўнай нормай і ў «Астрожскай бібліі», што зусім натуральна, улічваючы яе моўную аснову, параўн.: будьте сыновѣ силы (ДЦ, 68б) — да бѣдете снове силніи; собрашесѧ сынове (ДЦ, 92б) — събрашасѧ сн҃ове; возложать Ааронъ и сыновѣ его руце (КВ, 55б) — възложитъ Ааронъ и сн҃ове его рѣцѣ.

У родным склоне для назоўнікаў вывучаемых асноў традыцыйным быў канчатак *-овъ: ѡт* сынов^{ъ} ізбиныхъ (ДП, 19б); посрѣди сынов божиих (ПБ, 8); Кроквы домовъ наших суть кедровы (ПП, 4); на вереахъ домовъ (КВ, 23); живущие подлѣ домовъ нечтивыхъ (ІС, 66б).

Спрадвечным для д а в а л ь н а г а склону адзіночнага ліку разглядаемых назоўнікаў з'яўляецца канчатак *-омъ*. Ён і складае норму вывучаемых тэкстаў: к сыномъ ізраилевымъ (ДЗ, 15); заповедаю вамъ и сыномъ вашимъ (там жа, 17); в руце сыномъ (КЮ, 9б). У старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове таго часу побач з указаным традыцыйным ужываўся новы канчатак *-амъ*, характэрны раней толькі для назоўнікаў з асновамі на **а*. Станаўленню ў вывучаемых тэкстах канчатка *-омъ*, відаць, садзейнічала ў пэўнай меры чэшская Біблія: Сыномъ же верзелаевымъ Галадицкаго ѡтдаси (ТЦ, 124) — synuom pak Berzelay haladitskeho odplatijss se dobrym. У гэтых адносінах не вылучаецца і «Астрожская біблія»: поведати сыномъ (КВ, 66) — къ всѣмъ сн҃омъ.

Назоўнікі з асновамі на **й* ў в і н а в а л ь н ы м склоне множнага ліку ў якасці традыцыйнага мелі канчатак *-ы* незалежна ад таго, ці яны абазначалі нежывыя прадметы, ці жывыя істоты: приносити ту будете... первороженꙑныѧ волы и овце (ДЗ, 27—27б); сокрито в домы (КВ, 19); вделал имъ домы (КВ, 6); благославилъ Моисей человѣкъ божий сыны ізраилевы (ДЗ, 63б); сыны своѧ кумиромъ жруще (ПБ, 22б); долы ихъ огнемъ попалите (ДЗ, 20).

Разам з тым назоўнікі адушаўлёныя часам выступаюць з новым канчаткам *-овъ* роднага склону: не остави сынов людских (ПЕ, 8б); навчати будете сыновъ и внуковъ своихъ (ДЗ, 12б); возненавидеша Египтѧне сыновъ ізраилевыхъ (КВ, 5б). Відавочна, на выбар выдаўцом той або іншай формы пэўны ўплыў у даным выпадку аказвала чэшская Біблія 1506 г.: чтилъ сыны своѧ (ПЦ, 9) — cztil syny swe; роди три сыны и две дщере (ПЦ, 8б) — miela trzy syny a dwie dczerzy, але: позвалъ всехъ сыновъ царевыхъ (ТЦ, 121б) — pozwal wssech synuow kralowych. Старыя формы на *-ы* з'яўляюцца нормай «Астрожскай бібліі», дзе яны адзначаюцца замест новых у Скарыны, параўн.: роди три сыны и две дщере (ПЦ, 8б) — роди еще три сны и дщери; облечеши... сыны его с ним (КВ, 54б) — облецы... сны его с нимъ, але позвалъ всехъ сыновъ царевыхъ (ТЦ, 121б) — созва всѧ сны цревы. Традыцыйныя формы на *-ы* былі і ў беларускай літаратурна-пісьмовай мове таго часу.

Для т в о р н а г а склону множнага ліку вывучаемых назоўнікаў спрадвечным быў канчатак *-ми*. Разам з тым у выніку ўзаемадзеяння з асновамі на **о* сюды яшчэ ў агульнаславянскую эпоху пачаў пранікаць канчатак *-ы*. У Скарыны асноўнае месца займае ранейшы канчатак *-ми*: межи мною и сынми (КВ, 60); межи египтѧны и сынми Ізраилевыми (там жа, 22б); Абы не воевалисѧ со сынми (ДЗ, 8). Акрамя гэтага, тут сустракаецца і новы канчатак *-ы*: со старци поидемъ, съ сыны и со дщерами с овцами и с волы (КВ, 20б).

У м е с н ы м склоне множнага ліку разглядаемыя назоўнікі ў якасці спрадвечнага мелі канчатак *-ѣхъ (-ьхъ, -ихъ)*, які ўжы-

ваўся незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы. Гэты канчатак у выглядзе *-ехъ* утварае норму ў выданнях Скарыны: въ домехъ своихъ (КІ, 46); при всих дарехъ (КВ, 54б); то было за сведомие в сынехъ Ізрайлевыхъ (КР, 7); в домехъ м8жевъ ваших (КР, 26); въ сынех (ПБ, 15б). У гэтых адносінах вывучаемыя тэксты адрозніваюцца ад старабеларускіх, дзе формы ўказанага тыпу складаюць толькі асноўную норму.

Парны лік

З усіх склонавых форм парнага ліку вывучаемых асноў у выданнях Скарыны найбольш пашыраны формы н а з о ў н а в і н а в а л ь н а г а склону. Спрадвечным тут з'яўляецца канчатак *-ы*. Аманімія яго з канчаткам назоўнага склону множнага ліку асноў на **о* не дазваляе з дастатковай верагоднасцю ідэнтыфікаваць выяўленыя прыклады: чтилъ сыны своѧ (ПЦ, 9); роди три сыны и две дщере (там жа, 8б); были два сыны (там жа, 5б). Імкненне аўтара пісаць дакладна прымушала яго часам ужываць канчатак *-а* ў гэтым склоне: на оба сына твоѧ (ПЦ, 9б). Формам парнага ліку ў чэшскай Біблії ў Скарыны адпавядаюць такія ж: чтилъ сыны своѧ (ПЦ, 9) — cztil syny swe; роди три сыны (ПЦ, 8б) — miela trzy syny; были... два сыны (ПЦ, 5б) — byli gsu tu dwa syny. Такія формы ў чэшскай Біблії ўжыты і там, дзе ў Скарыны новыя формы парнага ліку з канчаткам *-а* асноў на **о*, што пацвярджае вывад аб паслядоўнасці разглядаемай нормы ў першай з гэтых крыніц: на оба сына твоѧ (ПЦ, 2б) — na dwa syny twe.

У «Астрожскай біблії» нормай з'яўляецца новы для разглядаемых назоўнікаў канчатак *-а* асноў на **о*, што, відаць, тлумачыцца ўплывам старарускай мовы (параўн. сучаснае рускае *у него было два сына*): на оба сына твоѧ (ПЦ, 9б) — на оба сна твоѧ; чтилъ сыны своѧ (ПЦ, 9) — прослави сна своѧ; были... два сыны (ПЦ, 5б) — быша два сна. Разгледжаныя формы вядомы і старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове.

Форм р о д н а-м е с н а г а склону ў выданнях Скарыны практычна не адзначана. Звычайна пры лічэбніках *два, оба, обадва* ім адпавядаюць формы множнага ліку: бог послал к нему смерть сыновъ его обу (ПЦ, 7); о дв8 сынехъ (там жа, 4). Формы родна-меснага склону парнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду не знайшлі адлюстравання і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове.

Формы д а в а л ь н а-т в о р н а г а склону парнага ліку назоўнікаў асноў на **й* не знайшлі шырокага адлюстравання ў вывучаемых тэкстах. Адзначаны нешматлікія прыклады накшталт остала ест со двема сынома (КР, 2б); со двема сынома своима (там жа, 2б). Побач з імі ў такой жа ступені пры лічэбніках *два, оба, обадва* пашыраны формы множнага ліку: со двема сынми (КР, 1б); со двема сынми (там жа, 2).

АСНОВЫ НА **а*

Тып скланення асноў на **а* аб'ядноўваў назоўнікі жаночага і ў невялікай ступені мужчынскага роду з канчаткам *-а/-я (владыка, вода, земля, струя, судья, юноша)*, а таксама з канчаткам *-и (богыни, горъдыни, кънѧгыни, поустыни, рабыни)* і *-ии (ладии, млънии, крабии* 'кошык'). Па цвёрдаму варыянту скланяліся назоўнікі з канчаткам у назоўным склоне адзіночнага ліку *-а*, па мяккаму — з канчаткамі *-я* і *-и*. Гэты тып скланення захаваўся ва ўсходнеславянскіх мовах у найбольшай ступені, аказаўшы значны ўплыў на іншыя тыпы ў працэсе іх уніфікацыі, што відаць і на прыкладзе выданняў Скарыны.

Адзіночы лік

Разглядаемыя назоўнікі маюць свае з ы х о д н ы я формы з канчаткамі *-а* або *-я* ў залежнасці ад якасці канцавога зычнага асновы: *баба, баня, барва, беда, буря, сага, душа, земля, книга, польза, скверна, слава, слуга, судья:* люба была богу душа его (ПБ, 7б); землѧ и попелъ сыи (ІС, 18). Назоўнікі, якія ў праславянскай мове мелі канчатак *-и*, часам яго захоўваюць: рабыни твоѧ (КВ, 38). Аднак пад уплывам слоў на *-я* яны часцей за ўсё атрымліваюць гэты новы канчатак: свѧтынѧ и сі́ла потоптаны будуть (ДП, 25б); милостынѧ противитсѧ грехомъ (ІС, 9). Старыя формы на *-и* захоўваліся ў дзелавых тэкстах старабеларускай мовы на ўзроўні варыянтнай нормы.

Форма назоўнікаў з асновамі на **а* ў р о д н ы м склоне адзіночнага ліку ў старажытнасці залежала ад якасці канцавога зычнага асновы. Асновы на цвёрды зычны мелі канчатак *-ы*, на мяккі — у стараславянскай *-я(-ѧ)*, у старажытнарускай *-е(-ѣ)*. У выданнях Скарыны ў рознай ступені пашыраны ўсе гэтыя канчаткі, што тлумачыцца спецыфікай умоў фарміравання іх мовы як беларускага варыянта царкоўнаславянскай мовы. Так, назоўнікі на цвёрды зычны, акрамя заднеязычных, звычайна маюць традыцыйны канчатак *-ы*: ѡт Маахи дщеры (ДЦ, 70б); искалъ бы на нее вины (ДЗ, 43); изъ волны овець моихъ (КІ, 37); глава моѧ полна естъ росы (ПП, 7). Такі ж канчатак маюць зрэдку і асновы на заднеязычны: милосник наѕкы (ІС,3); с сее книгы (ЕК, 2); ѡт рекы (КІ, 3); Не вреди слугы своего (ІС, 14б); принесут к тобе масла древѧна чиста и бумагы (КВ, 51б). Аднак пад уплывам жывога беларускага вымаўлення тут часцей выступае канчатак *-и*, крыніцай якога з'явіліся асновы на **і*: Подлугъ пророчества патриархи (ДП, 1б); з руки (КІ, 33); Изъ руки господнѧ (ПБ, 9); Естъ ли же множества наѕки жадаеши (там жа, 13); ѧко ѧзычекъ ѕ ваги (ПБ, 17б); законъ ласки (ДЗ, 4); не ѡтвратилъ руки своеѧ (ПЕ, 6); с ноги своеѧ (КР, 7).

Пэўную няўстойлівасць форм праяўляюць назоўнікі з асновамі на мяккі зычны. У нязначнай у цэлым ступені пашыраны стара-

славянскі канчатак *-я(ѧ)*, з якім заканамерна выступаюць назоўнікі жаночага роду з канчаткамі ў назоўным склоне адзіночнага ліку *-я, -и* і мужчынскага роду з канчаткам *-ии*: ветръ вѣликии приде ѡт пⷭстынѧ (КІ, 5б); воздвизаеть ѡт землѧ нища (ПЦ, 7б); сынъ рабынѧ твоеѧ (ПБ, 14). На ўзроўні варыянтнай нормы пашыраны характэрны для разглядаемых назоўнікаў у старажытнарускай мове канчатак *-е*: силою мышце твоеѧ (ПБ, 25); той иже ѡт рабыне (ДЗ, 4); до первенца рабыне (КВ, 2); ни рабыне его (там жа, 38). Норму ж складаюць новыя формы з канчаткам *-и*, які з мэтай уніфікацыі форм роднага склону быў запазычаны з асноў на **i*. Указаны канчатак выступае звычайна і пасля шыпячых, *ц* і *р*. У выніку звычайнымі ў даследуемых тэкстах з'яўляюцца напісанні тыпу *вдовици, винници, девици, души, земли, лапици, милостыни, мышци, одежи, пищи, прелюбодеици, пшеници, судии, шии:* срдце вдовицино тешивалъ есмъ (КІ, 34б); на лице всеѧ земли (ДП, 25); им же несть одежи (КІ, 30). Канчатак *-ы/-и* быў нормай і старабеларускай пісьмова-літаратурнай мовы.

Канчатак *-ы/-и* мог мець падтрымку, акрамя беларускай мовы, яшчэ і з боку чэшскай Біблії 1506 г.: ѡт Маахи дцеры (ДЦ, 70б) — z Macha dczery Гэтым выданні Скарыны адрозніваюцца ад «Астрожскай бібліі», дзе асноўную норму складаюць старажытныя канчаткі *-я* і *-е*: з земли египетское (КВ, 36) — ѡт землѧ егүпетъскіѧ; посреди земли (ПЦ, 7б) — посредѣ землѧ; земли твоеѧ (КВ, 65б) — землѧ твоеѧ.

У д а в а л ь н ы м склоне разглядаемыя назоўнікі ў агульнаславянскай мове мелі пры цвёрдай аснове канчатак *-ѣ*, пры мяккай — *-и*. У адпаведнасці з гэтай традыцыяй афармляюцца назоўнікі асноў на **а* і ў выданнях Скарыны. Пры цвёрдай аснове тут заўсёды бачым канчатак *-е(-ѣ)*, пры гэтым адбываецца пераход заднеязычных у свісцячыя: к нaѕце (ДП, 1); противѧщиесѧ правде (КІ, 28); кто бы сѧ моглъ спротивити руце его (ДП, 18); Ко славе (КІ, 1).

Пры мяккай аснове выступае, як правіла, канчатак *-и*, у тым ліку і пасля шыпячых, *ц* і *р*: Его пречистой матери девици марии (ПП, 11б); Iѕдиѧ повелела служебници своей стоѧти предъ дверми (КЮ, 20); ко отроковици (ПП, 3б); снижены суть к земли врата его (ПЕ, 6); къ души (ІС, 49б); къ тѕчи (КІ, 35). Указаныя канчаткі і традыцыі іх ужывання характэрны і для старабеларускай літаратурнай мовы з той толькі розніцай, што тут пасля шыпячых, *ц* і *р* мог выступаць і новы канчатак *-ы*.

У старажытнарускай і старабеларускай мовах адзіны канчатак в і н а в а л ь н а г а склону *-ѫ/-ѭ* змяніўся толькі фанетычна, набыўшы выгляд *-оу(у)/-ю*. Гэты трансфармант выступае ў якасці адзінай нормы і ў выданнях Скарыны. Пасля цвёрдых зычных ужываецца канчатак *-у*: гсди боже нашъ ѕслыши молитву раба своего (ДП, 28); сей сам собѣ кривду чинить (ПС, 16); злупилъ бы вежливе всю кору (ПБ, 19б); Саломонъ понѧлъ

естъ собѣ жену (ТЦ, 127); Въсадилъ еси до клады ногу мою (КІ, 19); Мъзду которую принялъ Стыи Иовъ (там жа, 2); Кажного мужчизну радней приимуеть жена (ІС, 58б). Пасля мяккіх зычных, у тым ліку часта і пасля шыпячых і *ц*, мае месца канчатак *-ю*; на мулицю (ТЦ, 122), але на мулицу (там жа, 122б); душѧ ѧчить (Пс, 2б). Старабеларуская літаратурна-пісьмовая мова адрозніваецца ў даных адносінах тым, што тут пасля шыпячых і *ц* амаль адзіным з'яўляецца канчатак *-у*.

Уласцівы старажытнарускай мове традыцыйны двухскладовы канчатак т в о р н а г а склону *-ою/-ею* з'яўляецца вынікам толькі фанетычнага змянення агульнаславянскага *-ojo, -ejo* (ст.-слав. -оѭ/-еѭ). У выданнях Скарыны ўказаны канчатак складае адзіную норму. Канчатак *-ею* тут выступае і пасля шыпячых і *ц*: Бранию и рукою силною и мысцею высокою (ДЗ, 14); ангельскою пищею кормилъ еси (ПБ, 25б); да владнете землею (ДЗ, 12); своею невестою (ПП, 2б); под главою моею (там жа, 10); оуделаны суть рукою майстера (там жа, 9); поставилъ... сѧдъею сыновъ (ПБ, 1б); венчаный победою (там жа, 7). У старабеларускай мове пасля зацвярдзелых зычных выступаў і канчатак *-ою*.

У м е с н ы м склоне, як і ў давальным, пасля цвёрдых зычных выступае канчатак *-е(-ѣ)*, пасля мяккіх — *-и*. Яны з'яўляюцца адзінымі і ў Скарыны. Цвёрдая разнавіднасць — канчатак *-е*: по поразце (КЮ, 25б); при реце (там жа, 3б); во книзе сей (там жа, 2); На постѣльце (ПП, 5); Во единой кажной Азбуце (ПЕ, 2б); мяккая разнавіднасць — канчатак *-и*: живущимъ всей земли (ДП, 22б); в земли іюдине (КЮ, 6); на мышци твоей (ПП, 10б); въ троици (там жа, 11б); стреженъ бѧше в темници (ПБ, 27). Указаныя флексіі і іх размеркаванне характэрны і для беларускай мовы.

Традыцыйнымі сродкамі афармлення к л і ч н а г а склону разглядаемых назоўнікаў з агульнаславянскай эпохі былі канчаткі *-о* пры цвёрдай аснове, *-е* пры мяккай. Адпаведныя формы ўласцівы і мове выданняў Скарыны, цвёрдая разнавіднасць: поспеши пріателко моѧ (ПП, 4б); веселисѧ юношо (ЕК, 16б); юношо говори въ речи твоей мало (ІС, 52); мяккая разнавіднасць: Горѣ тобѣ земъле (ЕК, 16). Клічная форма ў скарынінскіх выданнях ужываецца не ўсюды, дзе яна павінна быць у адпаведнасці з агульнаславянскай традыцыяй. Іншы раз на яе месцы выступае форма назоўнага склону адзіночнага ліку: Добро тобѣ землѧ (ЕК, 16). Працэс паступовага знікнення клічнай формы, які пачаўся ва ўсходнеславянскіх мовах, не абмінуў і мову выданняў беларускага першадрукара.

Множны лік

Традыцыйнымі для разглядаемых назоўнікаў у н а з о ў н ы м склоне множнага ліку ў старажытнарускай мове былі канчаткі пры цвёрдай аснове *-ы* (у далейшым сюды з асноў на **і* пранік

канчатак *-и*), пры мяккай — *-е*. Гэтыя канчаткі з'яўляюцца нормай выданняў Скарыны. Пры цвёрдай аснове тут звычайна мае месца канчатак *-ы/-и*, перад якім у выніку ўзаемадзеяння царкоўнаславянскай і беларускай моў заднеязычныя або чаргуюцца са свісцячымі, або змякчаюцца; канчатак *-и*, як правіла, адзначаецца пасля шыпячых і *ц*: ѡни же збираху крохи ползающи подъ столомъ моимъ (КС, 4б); мухы мертвыи казѧть воню масти драгое (КЕ, 15); поминут... дѣти облаковъ (ПБ, 9); будѣть стези живущих (ПБ, 15); Починаютьсѧ книги (ПП, 3); Грѣшници же рукама и словы... добывали (ПБ, 4); рекоша к нему слузи его (КЮ, 17б); Советъ ѣчиниша вси... вельможи (ДП, 21); высохли... лужи (КЮ, 11б); пры мяккай аснове пануючым з'яўляецца канчатак *-е*: Девице его посквернены (ПЕ, 3); Девице мое и младице мое заведены сѣть полономъ (ПЕ, 5); Очи его ѧко голубице (ПП, 7б); ѣста его Лилие (ПП, 7б).

Аднак указанае размеркаванне канчаткаў не вытрымліваецца паслядоўна. Прыкметай таго, што старажытная традыцыя ўжо не была жывой у роднай мове выдаўца, з'яўляецца змешванне канчаткаў пасля зычных адной і той жа якасці, параўн.: выходѧть криници из земли (ДЗ, 21) — Очи его ѧко голубице (ПП, 7б); зацвили винници (ПП, 8б) — Девице его посквернены (ПЕ, 3); Царици и меншици хвалили суть ю (ПП, 8б) — Девице мое и младице мое заведены сѣть полономъ (ПЕ, 5) і інш. Такія ваганні можна разглядаць і як праяўленне тэндэнцыі да ўласці-вага жывой беларускай мове таго часу знікнення канчатка -е і ўжывання замест яго канчатка -ы/-и.

У старабеларускай літаратурнай мове найбольшае пашырэнне меў канчатак цвёрдай разнавіднасці, прычым пасля шыпячых, *ц* і *р* побач з *-и* ўжываўся і канчатак *-ы*.

З агульнаславянскай эпохі назоўнікі з асновамі на *а* мелі ў р о д н ы м склоне нулявы канчатак. У вывучаемых тэкстах ён з'яўляецца пануючым. Пасля цвёрдых зычных выступае *-ъ*: навратила праведныхъ мъзду роботъ ихъ (ПБ, 16); посреде волнъ (ПБ, 8б); из рук силных (КІ, 11). Пасля мяккіх зычных, да якіх у Скарыны адносяцца таксама шыпячыя, *ц* і *р*, выступае *-ь*: *земль, колесниць, меншиць, овець, постель, птиць, темниць, цариць:* до земль чужихъ (КЮ, 8б); стада великѧ овець (ЕК, 4б); спытай... птиць небесныхъ (КІ, 17).

Зрэдку тут выступае канчатак *-ей*, крыніцай якога з'явіліся асновы на **і*: ѧко едину ѡт дщерей (ПЦ, 6). Тут, магчыма, мела месца імкненне адштурхнуцца ад чэшскай Біблії ў бок уласнай пісьмовай традыцыі, параўн.: yako gedne ze dczer.

Тыя ж формы і суадносіны іх выкарыстання характэрны і для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы.

Спрадвечным у асноў на **а* ў д а в а л ь н ы м склоне множнага ліку з'яўляецца спецыфічны канчатак *-амъ/-ямъ*, які пашырыўся на іншыя асновы і ў нязменным выглядзе захаваўся ва ўсходнеславянскіх мовах да нашага часу. У якасці адзінай нормы

ён выступае ў выданнях Скарыны: рамена сиротѕкамъ ламалъ еси (КІ, 28); къ слѫгамъ (ІС, 14); по стѣзѧм его (КІ, 30б); ѡсъла сиротамъ отогнаша (там жа, 30); привѧжешъ его рабынѧмъ твоимъ (там жа, 49); пѣснь пѣснѧмъ (ЕК, 1б).

У в і н а в а л ь н ы м склоне разглядаемыя назоўнікі, як і ў назоўным, мелі канчаткі *-ы* пры цвёрдай аснове і *-е* (у старажытнарускай мове), *-ѧ* (у старославянскай) — пры мяккай. У выданнях Скарыны пры цвёрдай аснове пануючым з'яўляецца традыцыйны канчатак *-ы/-и*, прычым *-ы* выступае паслядоўна толькі пасля этымалагічна цвёрдых зычных, зрэдку пасля заднеязычных, пасля *ц* звычайна мае месца канчатак *-и*, што выклікана іншымі прычынамі: *вдовици, воеводы, жабы, книги, муки, мухи, реки, росы:* не ѡтпустимъ вдовици (ПБ, 5); встановить собе воеводы (ДЗ, 3); допѕстилъ на египет гсдь богъ жабы (КВ, 16); силъные муки терпети будуть (ПБ, 10); кровь же текла естъ з раны его въ пазухы возовы (ТЦ, 181).

Пасля мяккіх зычных зрэдку выступае царкоўнаславянскі канчатак *-а/-я*: надеющесѧ на колесница и на кони своѧ (КЮ, 15б); надеющегосѧ... на колесница своѧ (там жа, 7). Аднак у пераважнай большасці выпадкаў тут адзначаецца старажытнарускі канчатак *-е*, як у прыкладах тыпу *блощице, душе, молние, овце, рабыне, шие:* ко горкости приводили душе ихъ (КВ, 5б); спѕстил гсдь... молние (там жа, 19); напои овце ихъ (там жа, 7). Зрэдку гэтыя ж назоўнікі афармляюцца пры дапамозе канчатка *-и*, у чым, безумоўна, праяўляецца ўласцівая беларускай мове таго часу тэндэнцыя да выцяснення канчаткам *-ы/-и* канчаткаў *-е, -я:* приемлете... кожи барание (КВ, 45); еже милуеши души (ПБ, 17б). Такім формам у «Астрожскай бібліі» адпавядаюць традыцыйныя, параўн.: приемлете... кожи барание (КВ, 45) — возмете... кожа овнѧ. Сустракаюцца прыклады і адваротнага характару: четыре овце за едину овцу (КВ, 40б) — четыри овцы въ овцы мѣсто.

У беларускай мове таго часу ў выніку развіцця катэгорыі адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці ў вінавальным склоне ўжываліся канчаткі нулявы або *-ей* з асноў на **і.*

Разглядаемыя назоўнікі адрозніваліся ад усіх астатніх тыпаў скланення сваім спецыфічным у т в о р н ы м склоне канчаткам *-ами/-ями*, які захаваўся ва ўсходнеславянскіх мовах у нязменным выглядзе да нашага часу, пашырыўшыся на іншыя тыпы скланення. Змянілася толькі яго ўжыванне ў залежнасці ад якасці канцавога зычнага асновы.

Ранейшае размеркаванне разглядаемых канчаткаў захоўваецца і ў вывучаемых тэкстах. Пасля цвёрдых зычных, у тым ліку і пры аснове на *j* у сувязі з падзеннем яго ў інтэрвакальным становішчы, выступае канчатак *-ами: велеможами, вереами, водами, волнами, девками, досками, косами, кропивами, муками, пугами, ритинами, руками, секирами, сернами, синевами, старейшинами, стенами, суетами:* Азъ теже сѕ девками своими буду

сѧ постити (КЭ, 10); взѧвъ обое врата из вереами ихъ и з^{s} замки и возложивъ на рамена своѧ (КС, 34б); пена тонкаѧ еже волнами розторгнена бывает (ПБ, 9). Адпаведна пасля мяккіх зычных адзіным з'яўляецца канчатак *-ями*: стые писма ȣставлѣна... песнѧми и ѱалмы (Пс, 1); надъ иными свѧтыми песнѧми (ПП, 1б).

Спецыфічнае афармленне маюць асновы на **а* і ў месным склоне множнага ліку, дзе здаўна адзіным быў канчатак *-ахъ/-яхъ*, які таксама ў нязменным выглядзе захаваўся да нашага часу, пашырыўшыся на іншыя тыпы скланення. Пасля цвёрдых зычных выступае канчатак *-ахъ: (на, у, при, по) вереахъ, водахъ, женахъ, калитахъ, кончинахъ, краинахъ, межахъ, мисахъ, ношкахъ, ризахъ, ровнинахъ, родинахъ, рукахъ, странахъ:* Сие же рыбы ести будете еже во водахъ суть (ДЗ, 31); на иныхъ всегда мисахъ потравы носили (КЭ, 3б); Праведных^{s} же людеи души в рукахъ божиих^{s} суть (ПБ, 5б). Канчатак *-яхъ* выступае пасля спрадвечна мяккіх зычных: Данъ празновалъ при лодьꙗхъ (КС, 12б); ѡсмое видение о неделѧхъ ўкраченыхъ (ДП, 3б); ꙗко серга златаꙗ въ ноздрѧх^{s} свиньи (ПС, 19); в тых же пустынѧхъ (КЮ, 8).

Разам з тым у нязначнай ступені прадстаўлены канчатак *-ехъ* мяккай разнавіднасці асноў на **о*. Відаць, гэта тлумачыцца імкненнем выдаўца надаць сваёй мове традыцыйную афарбоўку: на вереехъ дому вашего (ДЗ, 26); по дву и шестидесѧти неделехъ ȣбитъ будеть христосъ (ДП, 28б); въ берлозех (КІ, 46б).

Парны лік

Назоўнікі з асновамі на **а* ў адрозненне ад іншых тыпаў скланення захоўвалі формы парнага ліку найбольш устойліва. Разам з тым ужо ў старажытнарускай літаратурна-пісьмовай мове пачынаецца ўжыванне ў спалучэнні з лічэбнікамі *две, обе, обедве* форм множнага ліку.

Спрадвечным для разглядаемых назоўнікаў у назоўна-вінавальным склоне парнага ліку быў канчатак *-е/-и*. У вывучаемых тэкстах незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы ўжываецца толькі канчатак цвёрдай разнавіднасці *-е*. Пашырэнню ж канчатка мяккай разнавіднасці *-и*, відаць, супярэчыла яго аманімія з назоўным і вінавальным склонамі множнага ліку, што не адпавядала ўстаноўцы выдаўца пераважна на архаічныя формы. Канцавыя заднеязычныя асноў звычайна пераходзяць у адпаведнасці з нормай царкоўнаславянскай мовы ў мяккія свісцячыя. У выніку ўсяго гэтага адзначаны шматлікія формы тыпу *две, обе, обедве, досце, дщере, жене, краве, невестце, ноздре, нозе, руце, стране, подставце:* сламалъ две досце (ДЗ, 21б); сȣдил две жене блудници (ТЦ, 127); везли суть его две краве (ПЦ, 14); нозе ваше не ȣꙗзвишесѧ (ДЗ, 20б).

Ужыванню разглядаемых форм парнага ліку магла садзейні-

чаць чэшская Біблія 1506 г., аб чым можна гаварыць на падставе шматлікіх супадзенняў: Да ѕкрепѧтсѧ руце ваше (ДЦ, 68б) — Posylnteż se rucze wasse; руце бо твои не суть свѧзаны (ДЦ, 72б) — rucze twe ne gsut swazane; сеи имеаше две жене (ПЦ, 5) — miel dwie ženie. У адрозненне ад гэтага ў «Астрожскай бібліі» скарынінскім формам парнага ліку адпавядаюць формы множнага ліку: обе жене его с нимъ (ДЦ, 68) — обѣ женѣ его, але ѕмываютъ... руце свое и нозе (КВ, 58) — оумываетъ... рѕки свои и ноги.

Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены спалучэнні лічэбнікаў *две, обе, обедве* з формамі множнага ліку як прыкмета выхаду з ужытку форм парнага ліку: двѣ подъставки подъ каждую дощку (КВ, 49); По сих сут двое книги (ПЦ, 2б); привѧзали суть Ахиора къ древу за руце и за ногы (КЮ, 10).

Са старажытнасці назоўнікі з асновамі на **а* ў р о д н а м е с н ы м склоне мелі канчатак *-у/-ю*. Адпаведныя формы ў выданнях Скарыны адлюстраваны даволі прыкметна, асабліва часта ў такой форме адзначаецца назоўнік *рука:*ѡт руку филистымских и ѡт всехъ (ДЦ, 71б); были суть на руку Адониеву (ТЦ, 126б); ѡт пѧты ногѕ (КІ, 6б). Разам з тым зрэдку на месцы форм парнага ліку выступаюць формы множнага: со обою странъ (ДЦ, 69); што заканамерна, улічваючы гістарычны лёс парнага ліку. Гэтая з'ява знайшла адлюстраванне і ў старабеларускай пісьменнасці.

Ужыванню форм родна-меснага склону назоўнікаў з асновамі на **а* ў вывучаемых тэкстах магла аказваць падтрымку чэшская Біблія 1506 г., як у выпадках тыпу оусекнусѧ камень ѡт горы без руку (ДП, 8б) — vtat gest kamen s hory bez ruku; той можеть изᵴѧти насъ ѡт пещи огънемъ горѧщее и ѡт руку твоихъ (ДП, 11) — muož wyprostiti nas z pecy ohne horzijčyeho a z ruku twych.

Назоўнікі вывучаемага тыпу скланення ў д а в а л ь н а т в о р н ы м склоне парнага ліку мелі канчатак *-ама/-яма*. Разам з тым вельмі рана пачалі ўжывацца формы множнага ліку, якія пазней выцеснілі формы парнага ліку. У выданнях Скарыны формы давальна-творнага склону на *-ама/-яма* з'яўляюцца асноўнай нормай: Грѣшници же рукама и словы со хватаниемъ добывали суть собѣ еѧ (ПБ, 3б); дерᵴжи обема рукама (КР, 6); босыма ногама (ДЦ, 95б); под ногама его (КВ, 44б); с празныма рукама (там жа, 43). У адзінкавых выпадках пад уплывам іншых тыпаў скланення ўжываецца канчатак *-ома:* Со двема невестъкома своима (КР, 2б). Нязначна прадстаўлены і формы множнага ліку на месцы парнага: останки ногами своими потоптываше (ДП, 24); мертваго чинить руками нечстивыми (ПБ, 24). Такія прыклады ў старабеларускай пісьменнасці выкарыстоўваюцца значна шырэй. Нормай чэшскай Бібліі 1506 г. і Астрожскай з'яўляюцца традыцыйныя формы парнага ліку, параўн.: босыма ногама (ДЦ, 95б) — bosyma nohama; останᵴки ногами своими потоптываше (Скар. ДП, 24) — останокъ же ногама попираше.

АСНОВЫ НА **i*

Тып скланення назоўнікаў з асновамі на **i* аб'ядноўвае словы мужчынскага і жаночага роду, якія ў пачатку праславянскай эпохі характарызаваліся тэматычным галосным *-i-*: *врьвь, вьсь, вѣсть, двьрь, длань, кость, мышь, ношть, скрѫбь* (ж. р.); *гвоздь, господь, гость, гѫсь, звѣрь, огнь, пѫть* (м. р.) і інш. У далейшым назоўнікі мужчынскага роду аб'ядналіся з назоўнікамі з асновамі на **o*, да назоўнікаў жаночага роду далучыліся словы з асновамі на зычныя, у выніку чаго асновы на **i* як самастойны тып скланення перасталі існаваць. Гэтыя змены закранулі і мову выданняў Скарыны.

Адзіночны лік

У н а з о ў н ы м склоне незалежна ад роду пасля спрадвечна мяккіх зычных выступае канчатак *-ь*, пасля шыпячых, губных, *ц* і *р*, як у словах тыпу *злость, младость, многость, мощь, нощь, обувь, память, пещь, речь, скорбь, честь, яблонь:* младость борзо исконъчанѧ осужаеть долгыи животъ неправеднаго (ПБ, 7); дана естъ вамъ моць ѡт гсда бога (там жа, 9); была тѧжкаѧ нощь (там жа, 27б). У выніку уплыву роднай мовы выдаўца ў нязначнай ступені тут пасля шыпячых і губных сустракаецца канчатак *-ъ*: боѧзнь толико помощъ (ПБ, 27); сиѧ вдовица Ідиѧъ (КЮ, 2б); кажнаѧ животнаѧ вещ (ІС, 27); таковаѧ речъ (ДЗ, 14). У беларускай мове таго часу такія напісанні былі ўжо нормай.

У р о д н ы м склоне першапачаткова назоўнікі данага тыпу скланення незалежна ад роду мелі канчатак *-и*. Але ўжо ў агульнаславянскай мове назоўнікі мужчынскага роду па ўзору асноў на **o* пачалі выступаць з канчаткам *-я*. Ва ўсходнеславянскіх мовах гэта ўжо набыло значэнне нормы. Тое ж бачым у Скарыны. З ранейшым канчаткам *-и* тут ужываюцца толькі назоўнікі жаночага роду — *жизни, иртути, кости, моци, нощи, пещи, плоти, помощи, речи, роскоши, сладости:* Сии сотлеша ѡт жазни (ПЕ, 10); из пещи огненое (ДЗ, 13б); ѧко ладанъ воню сладости испустите (ІС, 63б). З гэтым канчаткам зрэдку выступаюць і неадушаўлёныя назоўнікі мужчынскага роду; ходѧть безъ пѫти (КІ, 18); снидоша с пути (КВ, 61); Аднак у большасці выпадкаў яны маюць новы канчатак *-я* з асноў на **o*: что бо ѡт огнѧ (ПБ, 26); сойдете с путѧ (ДЗ, 60б); пѫтѧ же гсдьнѧ не познахомъ (ПБ, 8б).

У д а в а л ь н ы м склоне разглядаемыя назоўнікі незалежна ад роду ў агульнаславянскую эпоху мелі канчатак *-и*. Але ўжо тады назоўнікі мужчынскага роду, асабліва адушаўлёныя, пад уплывам асноў на **o* пачалі выступаць з новым канчаткам *-ю*. Заканамерным з'яўляецца такое размеркаванне моўных сродкаў

і ў Скарыны. Са старажытным канчаткам *-и* паслядоўна ўжываюцца толькі назоўнікі жаночага роду: Сотъ медовъ сладокъ естъ горътани твоей (ПС, 37); к полунощи (ЕК, 3б); леторасти росли по малу 8 пупышˢкы, и потомъ wтцвивˢши грозновие ко зрелости принесли (КБ, 73). Выпадковы характар носяць адзінкавыя прыклады ўжывання канчатка *-ови* з асноў на *и*. З ім адзначаны жаночыя імёны на зацвярдзелы губны (Юдиѳъ, Есѳеръ): сѣ домъ Амановъ далъ есми есѳерови (КЕ, 13б); сосуды сиѧ всѧ wтдали людие і8диѳови (КЮ, 24б). Назоўнікі мужчынскага роду, асабліва адушаўлёныя, звычайна маюць канчатак *-ю* з асноў на **о*: судите... гостю (ДЗ, 6).

У в і н а в а л ь н ы м склоне назоўнікі асноў на **і* ў агульнаславянскую эпоху мелі нулявы канчатак, агульны з назоўным склонам. З развіццём катэгорыі адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці пад уплывам асноў на **о* назоўнікі адушаўлёныя пачалі выступаць з канчаткам *-я*, што ва ўсходнеславянскіх мовах стала нормай. Не аказаліся ў баку ад гэтай з'явы і выданні Скарыны. Традыцыйныя формы з нулявым канчаткам тут маюць толькі назоўнікі неадушаўлёныя. Пасля шыпячых, *ц* і *р* пад уплывам беларускага вымаўлення часам выступае *-ъ*: кто вложить вˢ мышление мое казнь (ІС, 36б); ззуй обувь (КВ, 8); Нощь обратили сѧть собѣ в день (КІ, 23); Ани попужай их на бронь (ДЗ, 9); вовѣрженъ будеть в пещь огнемъ горѧщую (ДП, 10б), але они же имеюще моцъ (ПБ, 9б); да будеть вовѣрˢженъ в пещъ огнемъ горѧщую (ДП, 10б).

Назоўнікі адушаўлёныя маюць, як правіла, ужо новы канчатак *-я*, што з'яўляецца вынікам уплыву асноў на **о*: допытавˢшисѧ татѧ каменіемˢ 8били его (ІН, 14б).

У т в о р н ы м склоне ў агульнаславянскую эпоху назоўнікі жаночага роду мелі канчатак *-ию(∠-ью)*, мужчынскага — *-ьмъ (-емъ)*. У выданнях Скарыны назоўнікі жаночага роду маюць толькі старажытнейшы канчатак *-ию*, як у прыкладах тыпу *боязнию, властию, горячестию, грязию, жолчию, завистию, мыслию, мудростию, пилностию, премудростию, приповестию, смертию, темностию, яростию:* засмутѧтсѧ боѧзнию грозною (ПБ, 8); завистию же диаволъскою вниде смерть (там жа, 5б); розгневалсѧ естъ ꙗростию великою (КЮ, 7б). З помнікаў старабеларускай пісьменнасці такі канчатак бачым звычайна толькі ў тэкстах рэлігійных жанраў. У мужчынскім родзе паслядоўна выкарыстоўваецца традыцыйны канчатак *-емъ(∠-ьмъ)* у тым жа трансфармаваным выглядзе, у якім ён ужываўся і ў тагачаснай беларускай мове,— з пераходам *ь* у галосны поўнага ўтварэння *е* і з зацвярдзеннем губнога: Егда идучи путемъ и знайдеши на земли или на древе гнездо (ДЗ, 42б); идите путемъ подлѣ Чермнаго морѧ (там жа, 7б); Кто с татемъ товаришить сей ненавидить души своеи (ПС, 44б). Відаць, заходнеславянскім уплывам можна растлумачыць ужыванне канчатка *-омъ* у жаночым родзе: надеꙗлсѧ его лежати со І8диѳом (КЮ, 23). Магчыма, пад-

ставай для змешвання канчаткаў асноў на **о* і на *и* і ўжывання форм тыпу *братомъ, сыномъ* паслужыла тут цвёрдасць канцавога зычнага асновы.

Разглядаемыя назоўнікі ў м е с н ы м склоне адзіночнага ліку ў старажытнасці мелі канчатак *-и*. Ён і ўтварае адзіную норму ў вывучаемых тэкстах, у тым ліку і пасля шыпячых, *ц* і *р*: *(въ, на, о, при, у) горъдости, добровонности, крепости, мерзкости, мерности, моци, немощи, ненависти, ночи, огни, плоти, погибели, почтивости, пути, смерти, трезвости:* ѡ крепости, ѡ трезвости, ѡ мерности, ѡ почтивости (ІС, 4); погубилъ ест ихъ и въ мерзкости (ІС, 26); въ человѣчиеи моци (ЕК, 12б—13); он же бы в ночи посквернѣнъ былъ сномъ злымъ (ДЗ, 44б); загинули на пути (ПЕ, 10).

Выступаючы ў сінтаксічнай ролі зваротка, назоўнікі асноў на **і* ў к л і ч н ы м склоне мелі канчатак *-и*. Адпаведныя формы адзначаны і ў выданнях Скарыны: послушахъ гласа твоего гсди боже (ДЗ, 49); их же избавилъ еси гсди боже (там жа, 46); господи мой Царю (ТЦ, 121б).

Множны лік

У агульнаславянскую эпоху разглядаемыя назоўнікі ў н а з о ў н ы м склоне множнага ліку мелі форму ў залежнасці ад роду — у мужчынскім з канчаткам *-ие*, у жаночым — з *-и* (гостиѧ, але *ночи*). У далейшым адбылося выраўноўванне форм па жаночаму роду, у выніку чаго адзіным тут стаў канчатак *-и* (пасля зацвярдзелых *-ы*). Нормай у выданнях Скарыны з'яўляецца канчатак *-и*, які ў сілу спецыфікі мовы гэтых тэкстаў ужываецца і пасля шыпячых, *ц* і *р*: звери дивии послушни будутъ ему (КЮ, 18); Звери ходѧщие въ пустыни знають ѧмы своѧ (КЮ, 2б); зродишесѧ мыши (ПЦ, 13); мыши вылезли сутˢ зˢ дуплѧ (КЮ, 23); пути твои просты (ДП, 12); вси речи суще переменены (ПБ, 26). Такія формы былі звычайнымі і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове, аднак у апошняй пасля шыпячых, *ц* і *р* мог выступаць і канчатак *-ы*.

Паслядоўнасць ужывання разгледжанага канчатка іншы раз парушаецца выпадкамі выкарыстання новага канчатка *-е* з асноў на **а*: обе длане руку ѡтвораны были на прагу (ПЦ, 13). «Астрожская біблія» прытрымліваецца ранейшай флексіі, параўн.: обѣ длани р8к8 его отсѣкошесѧ на праг8.

Старажытным канчаткам р о д н а г а склону множнага ліку асноў на **і* быў канчатак *-ьи/-ии*, які ўжо ў старажытнарускай мове набыў выгляд *-ей*. Формы на *-ей* з'яўляюцца нормай скарынінскіх выданняў, ранейшыя на *-ий* тут адсутнічаюць, што збліжае вывучаемыя творы з дзелавымі помнікамі старабеларускай пісьменнасці. У Скарыны адзначаны, у прыватнасці, наступныя прыклады: *жадостей, звереи, костей, мастей, мерзостей, мыслей, путей, речей, сеножатей:* прирожение скотинъ и гневъ

звереи (ПБ, 11б); доткнисѧ... костѣй его (КІ, 6); не наследуете мерзостей тыхъ народовъ (ДЗ, 37).

Акрамя гэтага, у адзінкавых выпадках праявіўся ўплыў асноў на **о*, аб чым сведчаць формы з нулявым канчаткам *(вълкъ, конь)*: къ некоему ѡт зверь (ПБ, 20б). Гэтая з'ява знайшла адлюстраванне і ў старажытнарускай пісьменнасці.

Разглядаемыя асновы, як некаторыя іншыя, у д а в а л ь н ы м склоне множнага ліку мелі канчатак *-емъ(<-емь)*. Адпаведныя формы ў Скарыны з'яўляюцца асноўнымі: *болезнемъ, заповедемъ, зверемъ, зятемъ, костемъ, пѫтемъ:* оучилъ вас заповедемъ его (ДЗ, 13); зверемъ дивимъ... всехъ вкупѣ погубити (ПБ, 18б); прильпе кожа их к костем (ПЕ, 10).

Другім сродкам афармлення давальнага склону множнага ліку вывучаемых назоўнікаў з'яўляецца канчатак *-ямъ* з асноў на **а*, якія, як вядома, аказалі ўплыў на ўсе астатнія тыпы скланення. Адпаведныя формы сустракаюцца значна радзей папярэдніх: гнои же костѧмъ ест зависть (ПС, 23б); дабы не навчили васъ всимъ мерзостѧмъ (ДЗ, 40б).

Асноўную норму ўтвараюць традыцыйныя формы в і н а в а л ь н а г а склону з канчаткам *-и*, які ўжываецца незалежна ад якасці канцавога зычнага: не преставаша раби царевы служащие тѫ подˢпалѧти пещи (ДП, 13); пути в тесныхъ местехъ засекали (КЮ, 7); наберите полны горсти попѣла съ пещи (КВ, 18б); будуть служити вамˢ дающе дани (ДЗ, 40). У такіх формах могуць выступаць і назоўнікі адушаўлёныя: хвалили вместо бога... звери празныи (ПБ, 17). Аднак разам з тым яны могуць мець і новыя формы, агульныя з родным склонам: имаше ли коихъ се зде у себе зѧтей (КБ, 37).

Спрадвечны канчатак т в о р н а г а склону *-ми*, характэрны і для некаторых іншых асноў, займае асноўнае месца, пры гэтым папярэднія шыпячыя і *р* пад уплывам беларускага вымаўлення могуць траціць былую мяккасць: *властьми, зверьми, дверми, немочми, печальми, путми, речми:* со звѣрˢми полˢными и сˢ скотом будеть житие твое (ДП, 17б); многими печальми и смутки покушены быша (КЮ, 14); седмию путми побежите пред ними (ДЗ, 52б). На ўзроўні другараднай нормы пашыраны канчатак *-ями*, які пранік з асноў на **а: горкостями, зверями, костями, мастями, персями, похотями, речами, темкостями:* накормилъ мѧ горкостѧми (ПЕ, 8); костѧми и жилами споил мѧ еси (КІ, 15б); намазала ест лице свое мастѧми (КЮ, 25). Відаць, на аснове агульнасці роду і форм назоўнікаў мужчынскага роду з назоўнікамі тыпу *путь* з асновамі на **о* першыя зрэдку выступаюць у форме, агульнай з назоўным склонам: седми пути побѣгуть пред вами (ДЗ, 51б).

У м е с н ы м склоне шырока адлюстраваўся традыцыйны канчатак *-ехъ*, які ўзнік фанетычна з агульнаславянскага *-ьхъ*. Тут адзначаны цэлы шэраг прыкладаў тыпу *(въ, на, о, при, у) дверехъ, заповедехъ, зверехъ, летораслехъ, моцехъ, печалехъ,*

путехъ, речехъ, сокритостехъ: былъ ест при дверех^{s} царевыхъ (ДП, 96); в леторастехъ его п^{s}тици небесныи (там жа, 17); несть въ речехъ твоихъ ни единое приганы (КЮ, 146). Відаць, на падставе агульнасці роду большасці разглядаемых назоўнікаў з назоўнікамі з асновамі на **а* тут новыя формы з характэрным для іх канчаткам *-ахъ* пашыраны больш прыкметна, чым назоўнікаў з асновамі на **о — (въ, на, о, при, у) вечностяхъ, мерзостяхъ, мысляхъ, речахъ, темностяхъ:* во мысл҃ахъ моихъ смутих^{s}с҃ (ДП, 246); во красных речах (ПЕ, 10); ꙗко щупаеть слепыи во темност҃ахъ (ДЗ, 526). Ступень пашырэння форм такога тыпу, несумненна, вынік уплыву беларускай мовы.

Парны лік

У адрозненне ад некаторых іншых тыпаў асноў формы назоўна-вінавальнага склону парнага ліку асноў на **і* практычна немагчыма ідэнтыфікаваць па той прычыне, што яны аманіміруюць з формамі назоўнага і вінавальнага склонаў множнага ліку. Таму нельга з усёй верагоднасцю сцвярджаць, што наступныя прыклады — тыя, якія павінны тут разглядацца: Две речи видели ми с҃ (ІС, 436); двѣ речи противу дв҃мъ (ІС, 54). Ранейшым формам родна-меснага склону парнага ліку ў вывучаемых тэкстах у спалучэнні з лічэбнікамі *дву, обу, обудву* звычайна адпавядаюць формы множнага ліку: о дву зверехъ (ДП, 36); ѡ дву речахъ (ІС, 42); Во дву речахъ (там жа, 43). Фактычна не зарэгістраваны ў Скарыны і формы давальна-творнага склону парнага ліку разглядаемых назоўнікаў.

АСНОВЫ НА *ū*

Тып скланення асноў на *и* доўгае аб'ядноўвае параўнальна невялікую групу назоўнікаў жаночага роду — *бры, боукы, кры, любы, мъркы, свекры, смокы, тыкы, хоржгы, црькы.* Адметнай асаблівасцю іх з'яўляецца тое, што ў формах ускосных склонаў тэматычны галосны *и* выступае на ступені *ъв*, напрыклад, у родным склоне: *бръве, боукъве, кръве, любъве, мъркъве* і г. д. У далейшым разглядаемыя асновы перасталі існаваць як асобны тып скланення: адны назоўнікі перайшлі ў разрад назоўнікаў з асновамі на **і*, другія — з асновамі на **а*. Гэты працэс адбіўся і ў выданнях Скарыны.

Адзіночны лік

Яшчэ ў помніках стараславянскай мовы пачалося выцясненне ў назоўным склоне адзіночнага ліку старажытных форм тыпу *бры, любы, мъркы* з-за іх невыразнасці формамі вінавальнага склону на *-ъв*. Такія формы ў выданнях Скарыны з'яўляюцца адзінымі. Пры перавазе мяккіх канцавых губных зрэдку

трапляюцца і цвёрдыя: кровь же текла естъ з раны его въ пазухы возовы (ТЦ, 181); силна естъ ѩко смерть любовь (ПП, 10б); але рече к ней свекровъ еѧ (КР, 5); церковъ хстова мати всехъ хрестианъ (ПП, 2б).

У р о д н ы м склоне новы канчатак *-и* назоўнікаў з асновамі на **і*, які пачаў выцясняць канчатак *-е* яшчэ ў агульнаславянскую эпоху, з'яўляецца ў Скарыны, як і ў старабеларускай мове, адзіным. Аб гэтым сведчыць абсалютная аднастайнасць прыкладаў тыпу руце наше не вылили суть крови сее (ДЗ, 41); не могли суть оугасити любви (ПП, 10б); по повелению свекрови своеѧ (КР, 5); ѡт церкви (ПП, 2б).

Назоўнікі разглядаемага тыпу скланення пачынаючы з агульнаславянскай эпохі ў д а в а л ь н ы м склоне нязменна захоўвалі свой спрадвечны канчатак *-и*. Ён і з'яўляецца адзіным у выданнях Скарыны: споведа Руѳѧ свекрови своей (КР, 5); принесе ко свекрови (там жа, 6); ко церкви своеи (ПП, 1б). Такія формы з'яўляюцца нормай і старабеларускай мовы.

Разглядаемыя назоўнікі ў в і н а в а л ь н ы м склоне захоўвалі свае ранейшыя формы з нулявым канчаткам. Адрозненне мовы выданняў Скарыны ад агульнаславянскай мовы заключаецца толькі ў тым, што тут пры перавазе канцавога мяккага губнога часта адзначаецца і цвёрды, што з'яўляецца вынікам уплыву жывога беларускага вымаўлення: обратитсѧ во кровь (КВ, 10); пиюще кровь (ПБ, 18); кровь приношенѧ вылиеши на требникъ (ДЗ, 28б), але кровъ ѕбо ѩко воду выцедите на землю (там жа, 28); кровъ грозновую пиаху (там жа, 61б); Вода ѕ кровъ обратисѧ (КВ, 14б). Формы на мяккі губны з'яўляюцца нормай і старабеларускай мовы.

Нормай скарынінскіх выданняў з'яўляецца старажытны канчатак т в о р н а г а склону *-ию*, які ў разглядаемы перыяд быў адной са спецыфічных рыс царкоўнаславянскай мовы: Межи кровию и кровию (ДЗ, 35б); сынъ божий со апостолы своими бракъ духовный съ цер҃ковию... деѧше (ПП, 1б — 2). Для старабеларускай мовы характэрны формы з канчаткам *-ью*. Формы ж на *-ию* адзначаюцца толькі ў рэлігійных помніках.

У м е с н ы м склоне адзіночнага ліку вывучаемыя назоўнікі ў агульнаславянскі перыяд мелі формы на *-е*, агульныя з родным склонам. У далейшым, як і ў родным склоне, гэты канчатак быў выцеснены флексіяй вінавальнага склону *-и*. Апошняя ў выданнях Скарыны з'яўляецца адзінай: Блгсвенъ еси во церъкви (ДП, 13); Напою стрелы моѧ во крови ихъ (ДЗ, 62б); в добрыхъ делехъ и в любви ѡтчины (КЮ, 2б); тело... лежащее ѕвалено въ крови на земли (там жа, 23).

Множны лік

Малалікасць назоўнікаў разглядаемага тыпу скланення, як вынік гэтага слабая пашыранасць іх у тэксце, з аднаго боку, і ўжыванне большасці з іх у мове толькі ў адзіночным ліку, з дру-

гога, абумовілі тое, што не ўсе склонавыя формы множнага ліку аказаліся прадстаўленымі ў вывучаемых тэкстах. Так, у р о д н ы м склоне множнага ліку на месцы ранейшага нулявога канчатка адзначаны канчатак *-ей*, крыніцай якога з'яўляюцца асновы на **i* (параўн. *мышей, путей*): возложила на служебницу свою обру флѧжᵏку вина, баню олеѧ и мешець крупъ и мало смоквей (КЮ, 16б). У в і н а в а л ь н ы м склоне выступае традыцыйны канчатак *-и*, відаць, таму, што ён супадаў з канчаткам назоўнікаў з асновамі на **i (пути, кости)*: человекъ... оголить главу свою и браду и брови (КЛ, 27б). І нарэшце, у т в о р н ы м склоне зафіксаваны традыцыйны канчатак *-ами*: хоживах8 около храму божиѧ три поколениѧ с хоругᵛвями своими (ЛК, 1б).

АСНОВЫ НА ЗЫЧНЫЯ

У агульнаславянскую эпоху тып скланення асноў на зычныя ўключаў назоўнікі ўсіх трох родаў. Агульнай іх асаблівасцю было тое, што ў назоўным склоне адзіночнага ліку канцавы зычны пад уплывам тэндэнцыі да пабудовы складоў па ўзрастаючай гучнасці быў страчаны. Да данага тыпу скланення адносіліся назоўнікі: а) ніякага роду з суфіксамі: *-ес- (слово, тѣло, небо), -ят- (телѧ, жрѣбѧ, козлѧ), -мен- (брѣмѧ, врѣмѧ, имѧ, сѣмѧ)*; б) мужчынскага роду з суфіксам *-ен- (камы, пламы, ремы, пѧчьмы, коры)*; дзень; в) жаночага роду з суфіксам *-ер- (мати, дъшти)*. Ужо ў праславянскай мове тып скланення асноў на зычныя пачаў разбурацца пад уплывам больш прадуктыўнага тыпу скланення асноў на **i*.

Адзіночны лік

Разглядаемыя назоўнікі выступаюць у з ы х о д н а й форме без суфіксаў, як у прыкладах *знамя, имя, коло, лосеня, мати, рамя, семя:* Имѧ ему Гелькана (ПЦ, 5); коло в телезе (ІС, 53б); младое лосѣнѧ... мнитсѧ быти (КІ, 16б). Толькі назоўнік мужчынскага роду *пламы* часам выступае ў назоўным склоне з суфіксам — п л а м е н ь: слугъ царевыхъ... пожре пламень огнѧ (ДП, 11б); Лѣторастли его высушить пламен (КІ, 21).

У р о д н ы м склоне асноўную норму складаюць прыклады ўжывання канчатка *-и*, крыніцай якога з'яўляюцца асновы на **i*. Як правіла, суфіксы захоўваюцца: виделъ царь стража и свѧтого сходѧщего с небеси (ДП, 17); спѫстил гсдь с небеси громъ (КВ, 19); мужъ терпѧи точение семени (ДЦ, 72); ходили суть посрѣди пламени (ДП, 12); не пожалуютъ дитѧти малого (ДЗ, 53б); не будете варити козлѧти во млеце матери его (там жа, 31). Пад уплывам асноў на **о* мужчынскага і ніякага роду гэтыя назоўнікі часта выступаюць з канчаткам *-я*: исторᵏгнулъ насъ ѡт среды пламенѧ (ДП, 14б); ѡт неѥ же племенѧ родисѧ Хстъ (КР, 2); послухают ли речи знаменѧ первшего (КВ, 9б); 8 каменѧ реко-

маго золехъ (ТЦ, 120б). Назоўнікі з асновамі на *с (небо, слово, тело, ухо)* пад уплывам назоўнікаў ніякага роду з асновамі на **о* часта ўжываюцца з канчаткам *-а* і без суфіксаў *(села, ига, века)*: слова божиѧ послухати (ІС, 11); на конець ѯха (КВ, 56); возрастъ его дотыкалсѧ неба (ДП, 16); Доколе не омыеть водою тела своего (ДЗ, 44б). Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены першапачатковы канчатак *-е*: Анне же не бъ отрочате (ПЦ, 5б); Пошли еѧ с небесе (ПБ, 14б). Усе гэтыя формы ўласцівы і старабеларускай мове. У чэшскай Біблії назоўнікі на *с*, як і ў Скарыны, могуць мець форму слоў ніякага роду з асновамі на **о*, параўн.: ту естъ конець слова (ДП, 24б) — Až potud konecz slowa; возрастъ его дотыкалсѧ неба (ДП, 4) — wzrost geho dotýkal nebe. Але назоўнікі з асновамі на іншыя зычныя ў адрозненне ад выданняў Скарыны выступаюць у спрадвечных формах з канчаткам *-е*, параўн.: Ходили суть посрѣди пламени (ДП, 12) — chodili gsu v prostred plamene; мужъ терпѧи точение семени (ДЦ, 72) — czlowiek trpie tok semene. Традыцыйныя формы адпавядаюць скарынінскім інавацыям і ў «Астрожскай біблії», параўн.: ѡт племенѧ (КВ, 67б) — ѡт племене; ѡт племенѧ Ігдина (КВ, 59б) — с племене Іоудина; даже до временъ и времени (ДП, 24б) — до времене и времѧ. Значыць, норма роднага склону асноў на зычныя фарміравалася ў Скарыны пад уплывам тагачаснай беларускай мовы.

У д а в а л ь н ы м склоне асноўную норму складаюць традыцыйныя формы з канчаткам *-и* і суфіксамі — *имени, княжати, матери, небеси, семени:* имени твоему въспѣвати буду (ДЦ, 112); ѡн же рече ѡтцу своему и матери своей (ДЗ, 64); очи мое к небеси возѕдвигохъ (ДП, 17б); клѧхсѧ... семени ихъ (ДЗ, 65б). Пад уплывам асноў на **о* разглядаемыя назоўнікі часам атрымліваюць канчатак *-ю* (параўн. *коню*): обещалъ естъ богъ ѡтцемъ вашимъ и семеню ихъ (ДЗ, 25б); служили именю гсда бога вашего (там жа, 36б). Уплывам асноў на **о* тлумачыцца і спарадычнае ўжыванне назоўнікаў з асновамі на *с* з канчаткам *-у/-ю* (параўн. *селу, игу, морю* і г. д.): приидуть старейшины... ко телу ѯбитого (ДЗ, 41); приидохъ къ телу (ПБ, 13б). Несумненна, фарміраванне нормы давальнага склону асноў на зычныя ў Скарыны адбывалася ў значнай ступені пад уплывам тагачаснай беларускай мовы.

У в і н а в а л ь н ы м склоне назоўнікі ніякага роду маюць формы, агульныя з назоўным склонам: з канчаткамі *-о* або *-я:* возбудить сѣмѧ брата своего (ДЗ, 47б); собирають во врѣмѧ жатвы (ПС, 12); Беремѧ на сѧ берет кто (ІС, 22); Мертвого человѣка тѣло егда бы знашли на поли (ДЗ, 40); воздвигну на небо руку мою (там жа, 62б).

Яшчэ ў агульнаславянскую эпоху пад уздзеяннем асноў на **і* з'явіліся формы мужчынскага і ніякага роду з суфіксамі і нулявым канчаткам, што бачым і ў Скарыны: пошла ест девица и позвала матерь свою (КС, 6б); посрамотить потомъ матерь свою (ПС. 44); положиша камень на мнѣ (ПЕ, 9).

У т в о р н ы м склоне назоўнікі ніякага і мужчынскага роду маюць традыцыйныя формы з канчаткам *-емъ*, які з'яўляецца вынікам толькі фанетычнага пераўтварэння агульнаславянскага *-ьмь:* благославити васъ именемъ его (ДЗ, 41); изорви насъ чудесемъ своимъ (ДП, 12б); смешани воистинꙋну будуть с человеческимъ семенемъ (там жа, 9); погубить гсдь богъ имѧ его под небесемъ (ДЗ, 56б); чрево его ѩко кость слонова обложена каменемъ драгымъ (ПП, 8). Для назоўнікаў з асновай на *с* характэрны варыянтныя формы з канчаткам *-омъ* і без суфіксаў, што з'яўляецца вынікам уплыву асноў на **о* (параўн. *селомъ, игомъ*): ѩковое жъ николи не было подо всимъ небомъ (ДП, 27б); сотворил вси речи словомъ твоимъ (ПБ, 14); телом своимъ (ПП, 2).

Звяртае на сябе ўвагу аднатыпнасць разглядаемых форм у Скарыны і ў чэшскай Бібліі 1506 г.: подъ всимъ небомъ (ДП, 24) — pode wssym nebem; ѩковое жъ николи не было подо всимъ небомъ (ДП, 27б) — kterake nikdy ne bylo pode wssym nebem. «Астрожская біблія» прытрымліваецца ранейшых форм: подъ всимъ небомъ (ДП, 24) — под всѣмъ нбсемъ.

У м е с н ы м склоне асноўную норму складаюць пазнейшыя формы з канчаткам *-и*, які з'яўляецца вынікам уплыву асноў на **і*: во времени сконанияѧ наполнит сѧ видение (ДП, 26); творѧй чудеса и знамена на небеси (там жа, 22б); всѧка сила на небеси (КР, 1б); се ѳчиних тобѣ по словѣси твоемѳ (там жа, 1); врази твои... не оставѧт каменѧ на камени в тобѣ (ПЕ, 2). Назоўнікі ніякага роду з асновамі на *с*, як і ў іншых склонах, могуць выступаць у формах назоўнікаў з асновай на **о*: ни на небе положена (ДЗ, 58); в теле подданомъ грехомъ (ПБ, 3); о всем словѣ (ДЗ, 20б).

Спрадвечны канчатак *-е* сустракаецца ў адзінкавых выпадках, што тлумачыцца адсутнасцю падтрымкі з боку тагачаснай беларускай мовы: на небесе (ДЗ, 11б).

Множны лік

Асноўную норму ў вывучаемых тэкстах складаюць ранейшыя формы н а з о ў н а г а склону з суфіксамі і з канчаткамі *-а* ў ніякім родзе і *-и* ў жаночым: времена живота ѳставлена суть им (ДП, 23б); перꙋсти и рамена сребрѧна (там жа, 8б); небеса спустѧть ему росу (ДЗ, 65); будѳть на васъ знамена и дивеса (там жа, 53б); Велблудъ и инаѧ звѣрѧта тому подобна (КЛ, 21б). Толькі асобныя назоўнікі з асновамі на *с* сустракаюцца без суфіксаў у формах назоўнікаў ніякага роду з асновамі на **о* тыпу *села, ига, века:* Вси тыи слова пришли суть на навходносора царѧ (ДП, 17б); В рукахъ оубо его есмо и мы и слова наша (ПБ, 12); Сие суть слова еже глаголалъ естъ (ДЗ, 5). Назоўнікі *око, ухо* маюць канчатак *-и* асноў на **і*: очи твое ѩко голубичии (ПП, 4).

Пануючымі ў р о д н ы м склоне з'яўляюцца традыцыйныя формы з суфіксамі і з нулявым канчаткам, як у прыкладах *бременъ, внучатъ, временъ, именъ, львенятъ, небесъ, племенъ, словесъ, телесъ:* седѧмъ врѣменъ поминѳть на тобѣ (ДП, 17б); выриешъ... шесть именъ (КВ, 53); животъ львенѧтъ ем насытиш ли (КІ, 46б).

Для назоўнікаў з асновамі на *с (слово)*, акрамя разгледжаных вышэй традыцыйных, характэрны і новыя формы з нулявым канчаткам і без суфіксаў, што аб'ядноўвае іх з назоўнікамі ніякага роду з асновамі на **о* тыпу *селъ, векъ:* не восхотелъ послушати словъ моихъ (ДЗ, 37б); водле словъ рабы твоеѧ (КЮ, 18); суть словъ двадесеть и два (ПЕ, 2б); много естъ сѳеты и словъ без числа (ЕК, 9).

Асобныя назоўнікі ніякага роду з асновамі на *с* і жаночага на *р* пад уплывам асноў на **і* яшчэ ў агульнаславянскай мове пачалі выступаць з канчаткам *-ей*. У такой форме ў Скарыны рэгулярна выступаюць словы *ухо, око, мати:* на лонех матереи своих (ПЕ, 6б); нестыдливость его чинить заткание ѳшей (ІС, 44б), што было характэрна і для тагачаснай беларускай мовы.

У д а в а л ь н ы м склоне найбольшае пашырэнне маюць традыцыйныя формы з канчаткам *-омъ/-емъ*. Пры гэтым суфіксы паслядоўна захоўваюць толькі назоўнікі з асновамі на іншыя, акрамя *с*, зычныя: ко именомъ (ІС, 37); ни спротивлюсѧ словѣсом стго (КІ, 10б).

Назоўнікі з асновамі на *с*, як і ў іншых склонах, часта выступаюць без суфікса і з канчаткамі іншых асноў. Часцей за ўсё яны атрымліваюць канчатак *-омъ*, які ў Скарыны, як відаць, набыў стылістычную ролю як адзін са сродкаў надання мове выданняў царкоўнаславянскай афарбоўкі: нѣвервющи словом божиимъ (ДЗ, 6б); противящесѧ словомъ божиимъ (там жа, 7б); не приложите жъ ко словомъ сим (там жа, 12). Зрэдку сустракаецца і новы канчатак *-амъ* асноў на **а*, якому суджана было стаць агульным для назоўнікаў усіх родаў: словамъ сущимъ во вѕ стахъ царевыхъ (ДП, 17б).

У в і н а в а л ь н ы м склоне назоўнікі з асновамі на *с* (за выключэннем асобных) і на *н* маюць, як правіла, свой традыцыйны канчатак *-а*: во времена царства анѕтихристова (ДП, 3б); знамена и чудеса ѳчинилъ ест (там жа, 15б); ѳготованы сѳть... млаты бияющие телеса безумныхъ (ПС, 30б); Кто сильно давить вымѧна хотѧ доити млѣко, вытѧгнеть масло (там жа, 46б). У такой форме зрэдку выступае і назоўнік *слово:* Да прорѣку пред ними словѣса сиѧ (ДЗ, 60б); ѡнѕ же ѳслышавъ словеса сиѧ (ДП, 1б). Аднак для яго больш тыповай аказалася форма без суфікса, як у назоўнікаў ніякага роду з асновамі на **о*: Таковые слова глаголали (ПБ, 8б); написалъ ест Моисеи слова закона сего (ДЗ, 60б); слова же сиѧ вѕ серци моемъ соблюдохъ (ДП, 24б). У выніку развіцця катэгорыі адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці назоўнікі з асновамі на *т* са значэннем маладых

істот могуць выступаць у форме, агульнай з родным склонам: не предавай гсди отрочатъ нашихъ (КЮ, 6б).

У творным склоне для назоўнікаў з асновамі на *н, с, т* нормай з'яўляюцца традыцыйныя формы з канчаткам *-ы*, як у прыкладах *зверяты, знамены, имены, небесы, племены, рамены, словесы, чюдесы:* со зверѧты будеть пища его (ДП, 17); имены боговъ чужих не присегайте (КВ, 43); многими чѫдесы (там жа, 9). У такой жа форме сустракаецца і назоўнік *слово:* вашими словесы воздвигните серца ихъ (КЮ, 14): възовѣть словѣсы своими бога (КІ, 42); смѫщаете мѧ словѣсы вашими (там жа, 24). Аднак больш характэрна для яго форма без суфікса, як у назоўнікаў ніякага роду з асновамі на **о (селы, делы):* сонъ свой списа крат^{ъ}кими словы (ДП, 23): не можеть ихъ человѣкъ вымолвити словы (ЕК, 3б); обличаете мѧ словы потопными (КІ, 24б). Радзей сустракаецца гэты назоўнік у форме з канчаткам *-ами*, крыніцай якой з'явілася тагачасная жывая мова: караеши словами твоими (КІ, 20); краткими е словами... написалъ (ЕК, 2); тешил бых и ѧ васъ словами (КІ, 21б). Відавочна, традыцыйныя формы на *-ы* знаходзілі ў мове Скарыны падтрымку з боку чэшскай Бібліі 1506 г.: со зверѧты будеть пища его (ДП, 17) — s zwijerzaty bud pokrm ge. Такія формы былі пашыраны і ў тагачаснай беларускай літаратурна-пісьмовай мове.

У месным склоне асноўнае месца займаюць традыцыйныя формы з канчаткам *-ехъ (<-ьхъ)*. Пры гэтым, як правіла, захоўваюцца і суфіксы: на... каменехъ (КВ, 73б); По временех^{ѕ} же мнѡгихъ (там жа, 7б); Богъ ѫбо *на* небесех^{ѕ} (ЕК, 8б); въ чѫдесехъ его (ІС, 27б). Зрэдку захоўвае суфікс і назоўнік *слово:* по словѣсехъ ваших (КІ, 38б). Аднак яму больш уласціва форма без суфікса, пры гэтым побач з традыцыйным канчаткам *-ехъ* ён часам атрымлівае і новы *-ахъ* з асноў на **а*: Разумнии во словехъ (ІС, 30); во словех закона (ДЗ, 51), але Ани же кто с царевъ великий и сил^{ѕ}ный пытаетсѧ о словахъ таковыхъ (ДП, 7). Без суфікса зрэдку выступаюць і некаторыя іншыя назоўнікі з асноў на *с*, што з'яўляецца вынікам уплыву норм жывой мовы: в телех их (ІС, 66б).

Парны лік

Адносна форм назоўна-вінавальнага склону некаторых назоўнікаў з асновамі на зычныя ў спалучэнні з лічэбнікамі *два, оба, обадва* нельга сцвярджаць, што мы маем справу з формамі парнага ліку, бо ў выніку ўплыву асноў на **і* адбылася уніфікацыя форм назоўнага склону множнага ліку. Таму парны лік пачаў аманіміраваць з множным. Па ўзору асноў на **і* з канчаткам *-и* выступаюць назоўнікі *око, ухо:* оскудеют очи твое (ПЦ, 9б); видели суть очи твое (ДЗ, 25); възбрмѧт обѣ уши его (ПЦ, 10б).

У родна-месным склоне яшчэ ў агульнаславянскай мове назоўнікі *око* і *ухо* мелі канчатак *-ю* па ўзору назоўнікаў

з асновамі на **i*. Тое ж назіраецца і ў выданнях Скарыны: назоўнік *очи* часцей за усё выступае ў царкоўнаславянскай форме *очию*, зрэдку ў форме *очью*, характэрнай для тагачаснай жывой мовы: ѡчью ѡт нищих не годитсѧ ѡтвращевати (ІС, 9б); ѡт очию безумных людеи (ПБ, 5б); ни очию прозрѣти, ни ѕшию слышати (ДЗ, 53б); наклоните ѕшъю вашихъ (ПБ, 9б); во ѕшию моихъ (ПП, 5). Пад уплывам іншых асноў без суфіксаў могуць ужывацца і некаторыя іншыя назоўнікі: понесе ихъ на раму своихъ (ДЗ, 61б).

Побач з гэтым сустракаюцца і спалучэнні форм родна-меснага склону лічэбнікаў *два, оба, обадва* з формамі множнага ліку разглядаемых назоўнікаў: по двою ѧгнетокъ (ПП, 8б). Такія прыклады сведчаць аб паступовым выхадзе з ужытку форм парнага ліку ў жывой народнай мове разглядаемага перыяду.

Нормай давальнага-творнага склону з'яўляецца выступленне назоўнікаў са значэннем парных прадметаў, што асабліва характэрна для назоўнікаў *очи, уши:* пред очима вашима (ДЗ, 47); з заплаканыма очима (КЮ, 12б); виделъ еси ѥа очима своима (ДЗ, 65б); что сѧ любить очима твоима (ПБ, 14б); оушима своима (ІС, 54); слышащие ѕшима своима (там жа, 70). Такія формы з'яўляюцца нормай і ў чэшскай і Астрожскай бібліях: предъ очима твоима (ПЦ, 6б) -- przed oczyma twyma — пред очима твоима. Пашыраны былі такія формы і ў старабеларускай мове.

Такім чынам, перабудова скланення назоўнікаў, якая пачалася яшчэ ў агульнаславянскай мове і працягвалася ў старажытнарускай, у мове скарынінскіх выданняў адлюстравалася даволі прыкметна.

ЗАЙМЕННІК

Паводле марфалагічных прыкмет займеннікі дзеляцца на асабовыя (займеннікі 1-й і 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку) і неасабовыя (указальныя, азначальныя, пытальна-адносныя, адмоўныя і няпэўныя). У граматычных адносінах асабовыя займеннікі набліжаюцца да назоўніка, але ў адрозненне ад апошняга не маюць катэгорыі роду. Толькі ў адзіночным ліку, як займеннік *ты*, скланяецца зваротны займеннік, які не мае формы назоўнага склону. У агульнаславянскай мове гэтыя займеннікі ў давальным і вінавальным склонах мелі поўныя (праклітычныя) і кароткія (энклітычныя) формы, якія працягвалі ўжывацца ва ўсходнеславянскіх мовах старажытнага перыяду.

Вельмі паказальным для вызначэння моўнай асновы скарынінскіх выданняў з'яўляецца той факт, што асноўную норму ў іх складае царкоўнаславянскі займеннік 1-й асобы *азъ* (77 % ужыванняў): виделъ есмъ азъ даниилъ единый самъ видение сее (ДП, 29—29б); ему же рекохъ сѣ азъ (ДЦ, 66б); Азъ муръ и перси мое ꙗко бы столпъ (ПП, 10б); азъ народивсѧ вдыхалъ есми всех҃ посполитый воздухъ (ПБ, 11); вчиню ѡтмщение азъ гсдь (КВ, 23б).

Адпаведна новая форма *я*, якая з'яўляецца вынікам уплыву народнай мовы, пашырана ў значна меншай ступені (23 % прыкладаў): ꙗ человѣкъ смертелный (ПБ, 11); Едали ꙗ есмъ песьꙗ глава (ДЦ, 70б); ꙗ есмъ рукъ раба твоѧ (КР, 5б); Чим пак болѣе будете егда ѕмру ꙗ (ДЗ, 60б).

«Астрожская біблія» прытрымліваецца толькі старажытнай формы *азъ*, параўн.: Едали ꙗ есмъ песьꙗ глава (ДЦ, 70б) — еда песѣѧ глава есмь азъ; ꙗ есмъ (ДЦ, 69) — азъ есмь; Есмъ воистинну и ꙗ человекъ смертелный (ПБ, 11) — Есмъ бо и азъ чл҃къ смртенъ.

У 2-й асобе адзіночнага ліку нязменна выкарыстоўваецца адзіная ў славянскіх мовах форма *ты:* ты҃ избрал мѧ еси (ПБ, 11); Ты же гсди боже нашъ (там жа, 23).

У родным і вінавальным склонах выкарыстоўваюцца традыцыйныя двухскладовыя формы *мене, тебе, себе,* нязменныя з агульнаславянскай эпохі. Родны склон: не послушасте мене (ДЗ, 7б); дот҃кнул҃сѧ мене в҃ часъ приношенѧ (ДП, 28); кроме ѡт тебе

самого царѧ (ДП, 21б); ѡтвратити лице свое ѡт тебе (ТЦ, 125); имаши ли коихъ се з^{s}де ȣ себе зѧтѣй (КБ, 34); знашолъ е годныхъ себе (ПБ, 6); вінавальны склон: самъ себе даеть въ притчи место (там жа, 11); длѧ самого себе (КБ, 2б); не звахъ тебе сыну (ПЦ, 10); днесь не ȣбию тебе (ТЦ, 125б); мене выбрали были вси людие в царѧ место (ТЦ, 125). Побач з пераважаючымі поўнымі формамі (65 % прыкладаў) у вінавальным склоне шырока выкарыстоўваюцца і кароткія *мя, тя, ся* (35 % прыкладаў). Як і прыведзеныя вышэй поўныя, яны ўжываюцца як у пост-, так і ў прэпазіцыі да кіруючага дзеяслова. Гэта сведчыць аб тым, што працэс разбурэння ранейшых узаемаадносін паміж поўнымі і кароткімі формамі, які адбыўся ў старабеларускай мове, закрануў і мову выданняў Скарыны: знашол вину на мѧ (ДЦ, 70б); на мѧ розгневасѧ (ДЗ, 7); вероваху в тѧ (ПБ, 26б); мужъ да не надевает на сѧ одежи женское (Там жа, 42б); раскаѧлисѧ б людие ȣзревши рать на сѧ (КВ, 26б).

У «Астрожскай бібліі» энклітычныя формы асабовых займеннікаў пашыраны ў большай ступені, аб чым сведчаць наступныя паралелі: Тебе же вчиню (КВ, 61) — сътворю тѧ; проклинаѧ тебе проклѧтъ да бȣдеть (КБ, 49б) — проклинаѧ тѧ бȣдет проклѧт; да благославить мене дȣша твоѧ (КБ, 49б — 50) — да блсвить мѧ дша твоѧ; духъ божии сътворилъ ест мене (КІ, 39б) — дхъ бжіи сътворивыи мѧ. Для давальнага і меснага склонаў асабовых займеннікаў характэрны аднаскладовая форма 1-й асобы *(мне)* і двухскладовая 2-й асобы *(тобе)*, а таксама двухскладовая форма зваротнага займенніка *(собе)* са ступенню *о* чаргавання галосных у корані, што з'яўляецца вынікам уплыву беларускай мовы. У давальным склоне гэтыя формы складаюць каля 80 % прыкладаў: ѡтповѣдели есте мнѣ (ДЗ, 6); что естъ приѧтно тобѣ (ПБ, 14); мне же далъ естъ богъ вымолвити разумне и смеле (Там жа, 11б); вчиниша собѣ телѧ (КВ, 61). Астатнія 20 % прыкладаў складаюць энклітычныя формы: полюбилисѧ ми суть слова ваша (ДЗ, 6б); несть ми отодхнениѧ (ПБ, 31б); поведь ми чего жадаеши (ТЦ, 125); молю ти сѧ (КВ, 62); будеть ти рабъ (ДЗ, 33). Кароткая форма зваротнага займенніка ў Скарыны, як і ў старабеларускай пісьменнасці, не зарэгістравана. Месны склон: сед^{s}мъ теже временъ прейдуть на тобе (ДП, 17); растерзавъ на собѣ ризы (ПЦ, 12); сложивши одежу юже на собѣ имеаше (КБ, 70б); положиша камень на мнѣ (ПЕ, 9); помышлю о тобѣ (КР, 5б).

У «Астрожскай бібліі» ўжываюцца, з аднаго боку, формы са ступенню *е* чаргавання галосных у корані, што зусім заканамерна, калі ўлічыць, што яе мова адчула на сабе значны ўплыў старарускай мовы, параўн.: ȣготовахъ тобѣ (КВ, 43) — оуготовахъ тебѣ; вчиниша собѣ телѧ (КВ, 61) — сътвориша себѣ телецъ. З другога боку, кароткія формы ў «Астрожскай бібліі» ўжываюцца значна шырэй, чым у Скарыны, што можна паказаць на наступных паралелях: дамъ тобѣ (КВ, 44б); дам ти; олътаръ

каменныи ѕчиниш мнѣ (КВ, 38б) — олътаръ ѡт камена сътвориши ми; Да принесуть к тобѣ масло (КЛ, 46) — принесѕт ти елеи. Перавага поўных форм займеннікаў над кароткімі — характэрная рыса і старабеларускай мовы.

У творным склоне амаль адзінымі з'яўляюцца традыцыйныя старажытнарускія формы асабовых займеннікаў з двухскладовым канчаткам *-ою*, якія з агульнаславянскай эпохі змяніліся толькі фанетычна: взѧлъ с собою на помощ (КЮ, 5б); вовѣдеши с^{s} собою сед^{s}меро и седмеро сам^{s}це и самице (КБ, 17б); с тобою ест мудрость твоѧ (ПБ, 14б); будеть гсдь с тобою (КВ, 35); они же беша предо мною (ЕК, 4).

У адзінкавых выпадках сустракаюцца формы з аднаскладовым канчаткам *-ой:* некто зъ братии твоей живущихъ съ тобою (ДЗ, 32б). Апошнія і ў старабеларускай пісьменнасці надзвычай рэдкія.

Парадыгма асабовых займеннікаў множнага ліку ў выданнях Ф. Скарыны ў параўнанні з агульнаславянскім станам амаль ніякіх змен не зазнала, за выключэннем таго, што поўнасцю зніклі кароткія формы і амаль поўнасцю — формы парнага ліку. Так, у назоўным склоне ўжываюцца ранейшыя формы *мы, вы*: мы безумныи животъ ихъ имели есмо за дуровъство (ПБ, 7б): тако славнии ѧко мы (ДЗ, 12б); вы пакъ иже служите гсду богу вашему (ДЗ, 12—12б); ѡткѕду есте вы (КБ, 52). У родным, вінавальным і месным склонах выступаюць ранейшыя формы *насъ, васъ:* ѡт среды васъ (ДЗ, 12); Еда ли кому ѡт васъ взѧх^{s} вола или осла (ПЦ, 23б); глаголалъ еси на насъ и на кнѧзей нашихъ (ДП, 27б); ненавидить насъ богъ (ДЗ, 6б).

Праклітычным формам вінавальнага склону скарынінскай «Бібліі» ў «Астрожскай бібліі» часта адпавядаюць энклітычныя, параўн.: побию васъ мечемъ (КВ, 41б) — побію вы мечемъ; освещаѧ васъ (КВ, 60) — осщаа вы; погублю васъ (КВ, 63) — потреблю вы.

Для давальнага склону характэрны традыцыйныя формы *намъ, вамъ,* якія ў параўнанні з агульнаславянскай эпохай змяніліся толькі фанетычна: дозволена намъ сиѧ книга (КЮ, 1б); светло правды не светило намъ (ПБ, 8); проспееть вамъ (там жа, 10б).

Традыцыйныя, нязменныя з агульнаславянскага перыяду формы *нами, вами* з'яўляюцца адзінымі ў творным склоне: еже завещалъ естъ гсдь богъ с вами (ДЗ, 22б); да ѕгишитсѧ гневъ твой над нами (КЮ, 5); прозоветсѧ имѧ его с нами бог (КВ, 3б); Сѣ азъ поставлю завет мои с вами (КБ, 20б).

З форм парнага ліку адзначаны адзінкавыя выпадкі ўжывання родна-меснага склону: кладыи руку свою на обою наю (КІ, 14б); не имають иное части ни достоанию посреди ваю (КБ, 28—28б); Во ваю благославитсѧ Ізраиль (КБ, 90). Гэта тлумачыцца, безумоўна, уплывам жывой народнай мовы, дзе формы парнага ліку ў разглядаемы перыяд ужо фактычна страцілі сваю граматычную ролю.

У пачатку агульнаславянскай эпохі ў ролі займенніка 3-й асобы выступаў указальны займеннік *и* (м. р.), *а* (ж. р.), *ѣ* (н. р.) Тады ж, у агульнаславянскую эпоху апошні страціў формы назоўнага склону, на змену якім прыйшлі формы ўказальнага займенніка *онъ, она, оно*. На вінавальны склон пашырыліся формы роднага. Пасля прыназоўнікаў ва ўскосных склонах развілося пачатковае *н*. Пазней, у старажытнарускую эпоху, пасля адпадзення *ь* у формах творнага і меснага склонаў губны *м* страціў першапачатковую мяккасць. Натуральна, што ўсе гэтыя з'явы не маглі не адлюстравацца ў больш позніх выданнях Скарыны.

Так, у назоўным склоне разглядаемы займеннік у залежнасці ад роду мае тры формы — *онъ* (м. р.), *она* (ж. р.), *оно* (н. р.): онъ же не естъ виненъ смерти (ДЗ, 38б); въстала она і невѣстки ее (КР, 31).

У родным і вінавальным склонах у мужчынскім і ніякім родзе выступае традыцыйная форма *его* (пасля прыназоўніка — *него*). Родны склон: призва имѧ его (КБ, 24б); с него ѕбо напаѧхѫ стада (там жа, 52б); Абы подбил вси земли подъ власть его (КЮ, 1б); вінавальны склон: ѕдарилъ его копиемъ (ДЦ, 69б); его же ѕбил аръба воевода медиискии (КЮ, 1); возвалѕ его гсдь (КВ, 36).

У вінавальным склоне ўказаная двухскладовая форма не адзіная. У мужчынскім родзе яна складае толькі 6 % прыкладаў. Астатнія 94 % прыкладаў — гэта ўжыванні энклітычнай кароткай формы *и*: порази образъ и сотре и во прахъ (ДП, 2); запомнелъ бы снопа... но оставиши и тѕ да возметь его собѣ (ДЗ, 46б); будет ли мужеский полъ ѕбиите и (КВ, 6); Пѕсти хлѣбъ свои на воды текѫщие, понеже по многых летехъ знайдеши и (ЕК, 16). Пасля прыназоўнікаў у ім узнікае пачатковае *н*, у выніку чаго ён набывае выгляд *нь*: Добръ естъ гсдь надеющимсѧ на нь (ПЕ, 8); нападуть на нь всѧ проклѧтиѧ (ДЗ, 56—56б); снииде во облаце слава божиѧ нань (КВ, 2б).

У ніякім родзе энклітычная форма *е* з'яўляецца таксама пануючай. Пасля прыназоўніка і тут паяўляецца пачатковае *н*: владееть имениемъ токмо гледит на не очима своима (ЕК, 9); возрелъ еси на войско ихъ и тмы ѕтомили е (КЮ, 15б); взѧша тело Езаелово и погребоша е (ДЦ, 70); место особливое на не же будете выходити (ДЗ, 44б).

У асобных выпадках назіраецца змешванне форм мужчынскага і ніякага роду, што сведчыць аб паступовай уніфікацыі іх у жывой мове: посѕтавиша храмъ со приправами его и со притворомъ освѧтиша е олеемъ (КВ, 2б) — подотните древо и разѕсеците и (ДП, 17).

Энклітычным формам скарынінскіх выданняў у чэшскай і Астрожскай бібліях часта адпавядаюць праклітычныя, параўн. адпаведна: ста и возва и (ПЦ, 10) — stal a zawolal ho — ста и възва его; кормила и согревала и (ТЦ, 120б) — krmila ho a shryewala ho — ѕдетъ грѣющи его, и да лежитъ с нимъ, и съгрѣетъ господина нашего црѧ, ѕбий и (ДЦ, 67) — zabij ho —

оубій его. Гэта азначае, што выданні Скарыны ў даных адносінах больш архаічныя. У старабеларускай пісьменнасці пануючымі з'яўляюцца праклітычныя формы.

Давальны склон мужчынскага і ніякага роду характарызуецца ўжываннем у якасці адзінай нормы традыцыйнай двухскладовай формы *ему (нему)*, аднолькава ўласцівай як царкоўнаславянскай, так і жывой беларускай мове: Евреи пакъ в томъ не хотѧчи послухати спротивишесѧ ему (КЮ, 1б); возы же и ездци приближахусѧ к нему (ДЦ, 66б); рече к нему (КВ, 63б).

Старажытная форма мужчынскага і ніякага роду *имъ (нимъ)* з'яўляецца адзінай у творным склоне адзіночнага ліку: выидеть за нимъ сваръ (ПС, 34); поживи тамъ с ним за много днеи (КБ, 50).

Традыцыйная форма мужчынскага і ніякага роду *немъ* непадзельна пануе ў месным склоне адзіночнага ліку. Паколькі яна без прыназоўнікаў не ўжываецца, яна заўсёды мае пачатковае *н*: кто помолитсѧ о нем (ПЦ, 8б); да проводѧть тебе пȣтемъ по нем же идеши (КБ, 62); ꙗко же пишеть о немъ (КЮ, 2).

Для жаночага роду ў родным і вінавальным склонах адзіночнага ліку ў якасці варыянтнай нормы характэрна царкоўнаславянская форма *ея (нея)* (15 % прыкладаў). Родны склон: ѡт неѧ приходить все доброе (ПБ, 12б); ꙗдахъ ли безъ заплаты ѡт плодовъ еѧ (КІ, 38); имети буду ѡт неѧ сыны (КБ, 54); вінавальны склон: они же милуют еѧ (ПБ, 10); воспомѧнулъ естъ на неѧ (ПЦ, 6б); внииде где же бѣ Іȣдиѧ и не знаиде еꙗ (КЮ, 23); не возможеть опустити еꙗ (ДЗ, 44).

Разам з тым у крыху меншай ступені пашырана адпаведная ўсходнеславянская форма *ее (нее)* (10 % прыкладаў): хотелъ бы ее понѧти собѣ за жену (ДЗ, 41б); мȣсить ее держати за жену и не возможеть опустити еꙗ (ДЗ, 43б); изведуть ее вонъ пред домъ ѡтца еꙗ и камением ȣбиють ее (там жа, 43б).

Асноўную норму, як і ў мужчынскім і ніякім родзе, складаюць выпадкі ўжывання энклітычнай формы *ю(ню)* (73 % прыкладаў): на ню же вознесоста Іса (КР, 1б); како облекусѧ в ню (ПП, 7); набери воды... вылии ю на землю (КВ, 10); приведе ю во градъ (ТЦ, 127б); въкладаше ю до горнъца (ПЦ, 8); творѧше ю Гелии пиѧну быти (ПЦ, 6).

Кароткім формам у Скарыны ў «Астрожскай бібліі» часта адпавядаюць поўныя, што трэба разглядаць як яшчэ адну прыкмету архаічнасці вывучаемых тэкстаў, параўн.: срамотѧше ю (ПЦ, 5б) — оскорбѧше еѧ; смутѧщи ю (ПЦ, 5б) — оукорѧше еѧ; привѧжеши ю (КВ, 54б) — възложиши еѧ.

У параўнанні ж з чэшскай Бібліяй 1506 г. у Скарыны ва ўжыванні кароткіх форм назіраецца звычайна аднастайнасць, параўн.: смутѧщи ю (ПЦ, 5б) — gie popužegiz; срамотѧше ю (ПЦ, 5б) — pohanela gie; нападоша на ню наглѣ болѣзни еѧ (ПЦ, 12б); — oborzily na ni wnahle bolesti; приведе ю во градъ (ТЦ, 127б) — przywezl gi do miesta; взѧлъ ю мужу еꙗ

(ДЦ, 71) — wzal gi muży. Відаць, ужыванне кароткіх форм у Скарыны мела падтрымку з боку чэшскай Бібліі.

У давальным і месным склонах адзінай з'яўляецца ранейшая форма *ей (ней)*. Давальны склон: помогъ ей (КЮ, 1); рече к ней свекровъ еѧ (КР, 5); месны склон: пишеть в ней о премудрости вечной (ПБ, 2).; Столпы в неи ѕчинилъ сребреные (ПП, 5б); в неи же наполнисѧ исаино пророчество (КР, 1); по ней же аг'нець брести можеть (КБ, 2б).

Традыцыйная двухскладовая форма *ею (нею)* з'яўляецца адзінай у творным склоне: наполните землю и владейте ею (КБ, 10б); пришли ми суть вси добрые речи посполу с нею (ПБ, 11б); ты пакъ знаешъ слѕжбу мою, ею же послужих тобѣ (КБ, 55). Такая форма з'яўляецца адзінай і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове.

У назоўным склоне множнага ліку, як і ў тагачаснай беларускай мове, назіраецца страта ранейшых родавых адрозненняў. Асноўнае месца займае традыцыйная, характэрная раней толькі для мужчынскага роду форма *они,* якая стала агульнай для ўсіх трох родаў: ѡни пакъ вси единою мыслию не хотеша послушати его (КЮ, 3б — 4); они же бдѧху (КВ, 71б); ѡ трѣхъ друзехъ его они же пришли к немѕ потешити его (КІ, 6); Се блажим тыхъ они же потер'пеша (там жа, 1б); Да проклинуть ю они же проклинают' день (там жа, 7б). Гэтая форма з'яўляецца пануючай і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове. На ўзроўні другараднай нормы ў выданнях Скарыны прадстаўлена былая форма жаночага і ніякага роду *оны*: оны даже до глѕбокости чрева проходѧть (ПС, 28б); оны же въ громады сѕть изсыпаны (КІ, 21). Гэтая форма ў жывой мове набывала ўсё большае значэнне.

Адзінай у родным, вінавальным і месным склонах з'яўляецца традыцыйная форма *ихъ (нихъ)*. Родны склон: за единого каждого с нихъ (КІ, 4б); тѕ собирай после ихъ (КР, 4); с нихъ же написалъ (ПБ, 2); вінавальны склон: очищааше их (КІ, 4б); потопъ наведе на нихъ гсдь богъ (КБ, 7); нападе на нихъ страхъ (КВ, 30); месны склон: егда имели суть множество сынове ізрайлевы веселилисѧ о нихъ (ПБ, 16б); в них же слѕшитъ похвалити Ізрайлѧ (ІС, 1б); лежахъ ѧ предъ гсдемъ четыр'десѧть дней и четыр'десѧтъ нощей (ДЗ, 23—23б). У вінавальным склоне ў адрозненне ад пераважнай большасці старабеларускіх помнікаў ужываюцца архаічныя энклітычныя формы. Як правіла, гэта ўласцівая старажытнарускай мове форма мужчынскага і жаночага роду *е*: Взѧвъ же Давыдъ ризы своѧ раздра е (ДЦ, 66б); разумеѧ же сиѧ речи... краткими е словами... написалъ (ЕК, 2); дон'деже пройдутъ людие твои сие их же истѧжа вовѣдъ насадиши е в горе достоаниѧ твоего (КВ, 30); Сыны теже его приведеши изоблачиш ихъ в ризы лнѧны и опоѧшеши е поѧсы (КВ, 55). У адрозненне ад гэтага ў «Астрожскай бібліі» выкарыстоўваецца энклітычны займеннік *я*, уласцівы раней толькі ніякаму роду. У якасці уні-

версальнага для ўсіх трох родаў ён характэрны быў для царкоўнаславянскай мовы, параўн.: опомашеши е помасы (КВ, 55) — опомшеши ѧ помсы.

У давальным склоне адзначана спрадвечная форма *имъ (нимъ)*: не было кто бы 8ломил им (ПЕ, 10); рече к нимъ ростите жъ и множтесѧ (КБ, 20); посылаше к нимъ (КІ, 4б).

Адзінай у творным склоне з'яўляецца традыцыйная форма *ими (ними)*: прииде и диѧволъ с ними (КІ, 4б); зостанеть с ними (ІС, 13); помстилисѧ над ними (ПБ, 16б); обрете т8 три стада и рахиль с ними (КБ, 52); иде Ис8съ... битисѧ с ними (ІН, 24б).

У адрозненне ад пераважнай большасці старабеларускіх пісьмовых помнікаў выданні Скарыны фіксуюць асобныя формы парнага ліку разглядаемых займеннікаў родна-меснага склону: затверде серце фараоново и не посл8шаша ею (КВ, 15); давальнатворнага склону: рече има идите вы и навратитесѧ в дом матереи ваших (КР, 2); повеле има гсдь (КВ, 14б); повѣле гсдь има (КІ, 51).

Як вынік развіцця на ўсходнеславянскай моўнай глебе ўласцівай праславянскай мове трохчленнай сістэмы ў к а з а л ь н ы х займеннікаў у старажытнарускай мове існавалі тры іх віды: *сь, сѧ, сѫ* — для ўказання на бліжэйшы прадмет, *онъ, она, оно* — для ўказання на аддалены прадмет, *тъ, та, то* — для безадноснага ўказання. Будучы невыразнымі, яны яшчэ ў старажытнарускай мове набылі членныя формы шляхам спалучэння такога ж ці іншага займенніка. У жывой беларускай мове старажытнага перыяду ў якасці нормы замацаваўся займеннік *той, тая, тое,* астатнія былі прыналежнасцю галоўным чынам кніжнага стылю. Акрамя таго, у беларускай мове ў творным склоне адзіночнага ліку і ва ўсіх склонах множнага ён выступаў з *ы* на месцы *е(ѣ)*. З улікам гэтых акалічнасцей і трэба падыходзіць да вывучэння сістэмы форм указальных займеннікаў у выданнях Скарыны. Тут займеннік *сей, сия, сее* ўжываецца нароўні з *той, тая, тое.* Гэтым даныя выданні адрозніваюцца ад помнікаў старабеларускай пісьменнасці, дзе займеннік *сей, сия, сее,* які не адпавядаў норме жывой гутарковай мовы, як мы ўжо гаварылі, быў прыкметай толькі кніжнага стылю. Вельмі слаба адлюстраваны ў Скарыны займеннік *оный, оная, оное,* відаць, таму, што ён быў не ўласцівы царкоўнаславянскай мове.

Пры скланенні ўказальныя займеннікі паўтараюць склонавыя формы адносна-якасных прыметнікаў. У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах норму ўтвараюць старажытнарускія формы *той, сей,* утвораныя шляхам спалучэння кароткіх форм з формамі іншага ўказальнага займенніка. Назоўны склон: мудрости той вожъ естъ (ПБ, 12); Той же опѧть биѧше и (ЛК, 49); Сеи бо и дшу свою продасть за пенези (ІС, 18б); вінавальны склон: 8чинил естъ заветъ той (ДЗ, 15б); В той часъ (там жа, 23б); в той день (КВ, 62); в сей же час (КБ, 28); прозовѣте сей день (КЛ, 44).

Форма *той* уласціва і «Астрожскай бібліі», форме ж *сей* у гэтай крыніцы адпавядае царкоўнаславянская форма *сій*, параўн.: той судилъ людей Ізрайлевыхъ четыредесѧтъ лѣтъ (ПЦ, 12б) — той сѳди іилеви, ꙗко мудрости тои вожъ естъ (ПБ, 12) — ꙗко тои премѳдрости водитель есть; соблудите день сей в родехъ вашихъ (КВ, 23б) — въ сій днь; прозовѣте сей день (КЛ, 44) — прозовете сій днь.

Выданні Скарыны адрозніваюцца ад «Астрожскай бібліі» яшчэ і тым, што ў іх, акрамя прыведзеных форм, утвораных спалучэннем розных займеннікаў, сустракаюцца і формы, утвораныя аднолькавымі займеннікамі: на тот час (КБ, 72). Безумоўна, такія формы з'яўляюцца вынікам уплыву старабеларускай пісьменнасці, дзе яны набылі значнае пашырэнне.

У ніякім родзе ў адрозненне ад мужчынскага прыкметна прадстаўлены іменныя формы разглядаемых займеннікаў — *то, се*. Назоўны склон: то было бы ми въ радость (КІ, 10б); се всѧ сиѧ видело ест око мое (там жа, 18). Аднак асноўную норму ўтвараюць прыклады ўжывання поўных форм: тое ꙗвлѧеть чѳдесы и делы (КІ, 31б); чи полюбитсѧ ему тое (там жа, 18); ѡтступи сее ѡт мене (там жа, 32).

У «Астрожскай бібліі» іменныя формы пашыраны ў большай ступені, параўн.: будеть сее (КВ, 54б) — бѳдетъ се; сее слово еже реклъ (КВ, 63б) — се слово еже вѣщалъ; сохрани жъ слово сее законно собѣ (КВ, 24) — снабдите же слово се законно... Займеннік *сий* мае форму, характэрную для царкоўнаславянскай мовы: не бѳди сіе.

У жаночым родзе ў назоўным склоне сустракаецца іменная форма *та:* Да бѳдеть нощ та особлива (ІК, 7б): загинеть душа та ѡт людеи Ізраилевыхъ (КВ, 23б). Пануючымі ж тут з'яўляюцца членныя формы. Толькі ў членнай форме ўжываецца займеннік *сей:* Таѧ то ест часть человѣка (КІ, 26б); таѧ ест мзда злости его (ІС, 24); котораѧ ест сиѧ еже въступуетъ чрез пустыню (КІ, 5б); О нем же пишетсѧ книга сиѧ (там жа, 1б). У «Астрожскай бібліі» такім формам звычайна адпавядаюць іменныя, параўн.: едина сиѧ естъ одежа оу него (КВ, 42) — есть бо одежда емѳ си.

У родным і пры адушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах указальныя займеннікі мужчынскага і ніякага роду маюць нязменныя са старажытнарускай эпохі формы *того, сего.* Родны склон: сего ради (КІ, 28б); Сего делѧ помолюсѧ азъ гсду (КІ, 9б); вінавальны склон: того милуеть (КІ, 17); видѧщи того (ПБ, 19б). У родным склоне жаночага роду адзінымі з'яўляюцца нясцягнутыя двухскладовыя формы. Займеннік *той* выступае толькі ў форме *тое*, характэрнай і для старабеларускай мовы: дали суть ѡтцу своему пити вина нощи тое (КБ, 35); по брѣгу тое жъ реки (КБ, 74); с тое жь грѧзи (КІ, 39б); домышлѧетсѧ тое причины (ПБ, 27). Займеннік *сей* таксама сустракаецца ва ўсходнеславянскай форме *сее*: сее нощи (КБ, 35); найдеш^{s} на початку книги сее о сотворении сол^{s}неца (КБ, 3). Аднак для яго больш

характэрна царкоўнаславянская форма *сеѧ*: На конци же книги сеѧ (ЕК, 2б); сеѧ нощи зачати (КР, 2б); Изъ сеѧ оубо песни (ПП, 1б).

У «Астрожскай бібліі» формы на *я* з'яўляюцца нормай, што можна праілюстраваць паралелямі тыпу ѣдоша ѡт плодовъ земли тое (ІН, 12) — ѣдоша ѡт пшеница землѧ оноѧ. Значыць, Ф. Скарына ў даным выпадку ў адрозненне ад Івана Фёдарава часта арыентаваўся на нормы народнай мовы.

У давальным склоне адзіночнага ліку займеннікі ўсіх трох родаў выступаюць у формах, якія засталіся нязменнымі са старажытнарускай эпохі. У мужчынскім і ніякім родзе гэта формы *тому, сему:* тому глющу (КІ, 5б); сему же ѕмершѕ (там жа, 3б); у жаночым — *той, сей.*

Для жаночага роду ў вінавальным склоне норму ўтвараюць двухскладовыя формы *тую, сию,* што з'яўляецца, безумоўна, вынікам уплыву жывой народнай мовы: чти часто сию книгу (КІ, 2); сѣмени твоему дамъ землю сию (КБ, 24б); оглежу землю тую (ДЗ, 11б); тѣю теже видел есми подъ слнцем (ЕК, 14б); вина... тѣю жъ меру (КВ, 57).

У адрозненне ад гэтага ў чэшскай і Астрожскай бібліях нормай з'яўляюцца іменныя формы, параўн.: всю тую нощъ (ДЦ, 69б) — czelu tu nocz — всю нощъ тѣ.

У творным склоне мужчынскага і ніякага роду адзіная форма займенніка *тымъ* з'яўляецца вынікам уплыву жывой мовы, форма *симъ* — звычайная для займеннага скланення: чимъ съгрешить человекъ, тымъ и мученъ будеть (ПБ, 17); тымъ законом живѧху верующии во Хрста (ДЗ, 3); можете тым именемъ называти вси книги (КБ, 1).

У чэшскай і Астрожскай бібліях нормай з'яўляецца архаічная форма *темъ* (tiem), параўн.: предъ тымъ обычай всегда имеаше чинити (ДП, 21б) — przed tiem obykl czyniti.

Для жаночага роду характэрны выключна традыцыйныя двухскладовыя формы *тою, сею:* нощью тою (КІ, 7б). Тое ж бачым і ў тагачаснай беларускай пісьменнасці.

У месным склоне мужчынскага і ніякага роду ў адрозненне ад старабеларускай пісьменнасці, дзе прабівалі сабе дарогу новыя формы, аднолькавыя з творным склонам, у Ф. Скарыны выступаюць толькі традыцыйныя формы *томъ, семъ:* в томъ ест свѣта (ЕК, 7б); о сем да хвалитсѧ (ПЦ, 7б); на семъ свете (КІ, 42б).

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах множнага ліку ў выданнях Скарыны ў адрозненне ад пераважнай большасці старабеларускіх помнікаў сустракаюцца іменныя формы разглядаемых займеннікаў: розгневалсѧ естъ навходносоръ царь на вси земли ты (КЮ, 4б); ѡтсекоша главы всем имъ и въкладаша ты в коши (ЧЦ, 205б). Нормай жа з'яўляюцца займенныя формы. З іх найбольш пашыраны былыя формы мужчынскага роду *тыи, сии.* Назоўны склон: тии оутешатсѧ

(КІ, 2); тии мудре чинили сѣть (ІС, 30); сии сотлеша (ПЕ, 10); Сии стануть благословѧще гсда на горе (ДЗ, 50); вінавальны склон: написали суть вси сие книгы (ІС, 3); Тыи теже жердъки вделал (КВ, 70б). Былыя формы жаночага роду на *-ые/-ие* займаюць другое месца па пашыранасці. Назоўны склон: Сие сѣть сыновѣ Ісавли (КБ, 66); насташа людие тые (КВ, 19); вінавальны склон: продали есте мене во страны сие (КБ, 83б); Дощки пакъ тые златомъ окуеши (КВ, 49б). Абедзвюм разгледжаным формам па пашыранасці ўступае былая форма ніякага роду, якая таксама праяўляе прыкметы універсальнасці. Назоўны склон: всѧ сиѧ кажет быти сѣтна (ЕК, 3); Сиѧ слова... ꙗвлѧют намъ достоиность (КІ, 1б); вінавальны склон: сиѧ слова да глаголеши (КВ, 36); Глагола гсдь всѧ слова сиѧ (КВ, 36).

«Астрожская біблія» адрозніваецца ў даных адносінах тым, што займенным формам у Скарыны тут адпавядаюць часта іменныя, займеннай жа форме жаночага роду — форма мужчынскага роду, параўн.: согрешили сѣть людие сие (КВ, 62) — съгрѣшиша людіе сіи (КВ, 62); Сии суть бози твои (КВ, 61) — си бози твои. Іменныя формы адпавядаюць скарынінскім займенным і ў чэшскай Біблії, параўн.: Сии сыновѣ (ДЦ, 70б) — si to synowe. Суадносіны форм назоўнага (вінавальнага) склону множнага ліку блізкія да іх суадносін у тагачаснай беларускай мове. У родным, пры адушаўлёных назоўніках вінавальным і месным склонах займеннік *той*, як і ў беларускай мове, выступае пераважна з *ы* ў аснове на месцы старажытнага *ѣ*. У сваіх традыцыйных формах ужываюцца займеннікі *сей, оный*. Родны склон: Дѫхъ ... одыидеть ѿт тых мыслей (ПБ, 3); на твердосердие людей сихъ (ДЗ, 23б); А шаленыхъ тыхъ естъ безъ числа (ЕК, 4); вінавальны склон: се блажимъ тыхъ, они же потерпеша (КІ, 1б); тых их же запаметала нога (КІ, 33); месны склон: в тыхъ днех (КЮ, 6); в тыхъ речахъ (КВ, 35); во всих тыхъ коханиахъ (ЕК, 2б).

Займеннік *тои* зрэдку адзначаецца ў старажытнай форме *техъ* з *ѣ* ў аснове, што з'яўляецца, безумоўна, данінай норме царкоўнаславянскай мовы: боѧщиесѧ бога поищуть техъ (ІС, 7б); з руку богъ превышних техъ (ПЦ, 1—1б). Такая форма ўласціва чэшскай Біблії 1506 г., параўн.: во днех же царствъ тыхъ (ДП, 9б) — we dnech kralowstwij tiech; Во днехъ тыхъ азъ даниилъ плакахъ три недели дний (ДП, 29) — w tiech dnech ya Danyel plakal gsem za dni trzij. Займеннік *сей* зрэдку захоўвае старажытную нясцягнутую форму *сиихъ:* сиих не порозумеють (ІС, 9).

У давальным склоне займеннік *тои* выступае звычайна з *ы* ў аснове, што з'яўляецца вынікам уплыву нормы народнай мовы, займеннік *сей* — у сваёй сцягнутай форме *симъ:* инаѧ тымъ подобнаѧ (ДЗ, 2); тымъ они же в животе своемъ безумне и неправедне жили (ПБ, 19); не приложитежъ ко словомъ сим (ДЗ, 12). У адзінкавых выпадках ужываецца старажытная форма займенніка *той* з *е* ў аснове: сосуды темъ противныѧ (ПБ, 23б).

Форму з *ы* ў аснове займенніка *той* мае амаль заўсёды і ў творным склоне, займеннік *сей* — сваю традыцыйную форму *сими:* тыми речами... далъ еси имъ наибольшие муки (ПБ, 19); иди жъ предъ людми сими (ДЗ, 24б). Зрэдку, як і ў іншых склонах, сустракаецца традыцыйная форма з *е* ў аснове: теми речами ихъ же имели в бога место (ПБ, 19б); Межи теми всеми (ІС, 26б).

Аб тым, што формы множнага ліку ў вывучаемых тэкстах пад уплывам жывой мовы ў значнай меры выцеснілі формы парнага, сведчыць у цэлым нязначнае пашырэнне апошніх. Тут, у прыватнасці, выяўлены асобныя прыклады давальна-творнага склону тыпу сима двема царема (ДЗ, 11б).

Аснову а з н а ч а л ь н ы х займеннікаў у Ф. Скарыны складаюць тыя, што вядомы былі стараславянскай і старажытнарускай мовам, г. зн. агульнаславянскага паходжання: *весь, вся, все (вьсь, вьсѧ, вьсе), иный, иная, иное (инъ, ина, ино), каждый, кажьдо, кожьдо), самый, самая, самое (самъ, сама, само).* Займеннік *каждый* сустракаецца ў варыянтах *кождый, кажный,* уласцівых жывой беларускай мове таго часу. Найбольш пашыраным з адзначаных, як і ў старажытнарускай, царкоўнаславянскай і беларускай мовах, з'яўляецца займеннік *весь (вьсь).* У назоўным (пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным) склоне ён мае тры формы ў залежнасці ад роду: сѣ всѧ земля наша (КЮ, 5б); Бивлиѧ зѳполнаѧ все то в собѣ замыкаеть (КБ, 1); Надо все надъ то (КБ, 3б); велелъ созвати все воиско силы своеѧ (КЮ, 6); поведели суть мнѣ все еже ѳчинила еси свекрови своеи (КР, 4); четырьдесѧтъ меръ брала всѧ банѧ едина (ТЦ, 140б). Старабеларуская мова адрознівалася тым, што тут адбыўся пераход *в* у *у.*

Ва ўскосных склонах адзіночнага ліку (акрамя творнага) выступаюць ранейшыя формы займенніка *весь.* Так, у родным і пры адушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах у мужчынскім і ніякім родзе адзначаецца толькі форма *всего:* со всего тружанияѧ (ЕК, 3); Дал ѳбо напоследы всего водвое (КІ, 2). Паказчыкамі моўнай асновы скарынінскіх выданняў з'яўляюцца формы роднага склону жаночага роду разглядаемага займенніка. Часта тут ужываецца традыцыйная, унаследаваная ад старажытнарускай мовы двухскладовая форма *всее:* со всее праци своеѧ (ЕК, 6б); в сеи книзе всее прироженое мудрости зачало и конець (КБ, 1б); около всее (КВ, 45б). Асноўную ж норму складае форма з царкоўнаславянскім канчаткам *-еѧ,* які тут мае большую ўдзельную вагу, чым у старабеларускай пісьменнасці: множество мудрыхъ людеи, здравие естъ всеѧ земъли (ПБ, 10); безъ всеѧ боязни (ЕК, 13); путемъ всеѧ земли (ТЦ, 124).

У давальным склоне для мужчынскага і ніякага роду характэрна ранейшая форма *всему:* ко всему собору людей (ЕК, 2б). Ранейшая форма *всей* характарызуе давальны і месны склоны жаночага роду: По всей книзе сей (КБ, 2б); на всей земли (ІС, 79б).

Традыцыйную форму *всю,* якая ў беларускай мове змянілася толькі фанетычна, мае разглядаемы займеннік у вінавальным склоне жаночага роду: на всю землю египетскую (КВ, 21); Прошол пакъ естъ ѡлофернъ всю Сирию (КЮ, 6); Предъсловие доктора Франъциска Скорины с Полоцька во всю Бивлию рѳскаго ꙗзыка (КБ, 2).

Творны склон адрозніваецца ад іншых ускосных тым, што тут у мужчынскім і ніякім родзе адзначаюцца дзве формы. Асноўнае месца (80 % прыкладаў) займае форма *всимъ,* якая ўзнікла ў старажытнарускай мове па аналогіі з множным лікам, дзе ў той час адбывалася выраўноўванне асновы на *и* ў формах ускосных склонаў: надо всим безакониемъ (ТЦ, 145); предо всимъ сено будеть вытерто (ІС, 65б); наследуемꙋ тѧ всимъ серꙋцемъ (ДП, 12б). Перавага гэтай формы тлумачыцца падтрымкай з боку жывой беларускай мовы таго часу, норме якой яна адпавядала. Пашырэнню формы *всимъ* магла садзейнічаць і чэшская Біблія 1506 г., якой уласціва аналагічная форма, параўн.: ꙗковое жъ николи не было подо всимъ небомъ (ДП, 27б) — kterake nikdy ne bylo pode wssym nebem. Ранейшая форма *всемъ* па пашыранасці значна ўступае папярэдняй, паколькі ў беларускай мове таго часу яна ўжо набывала кніжны характар: владети ли будеть всемъ имениемъ моимъ (ЕК, 5б); всем сердцемъ (ТЦ, 124); ѳчините всемъ градомъ (ДЗ, 40).

Для жаночага роду характэрна толькі традыцыйная двухскладовая форма *всею,* што мела месца і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове: всею душею вашею (ДЗ, 26).

У месным склоне мужчынскага і ніякага роду выступае толькі традыцыйная форма *всемъ:* оголитъ... власы по всем теле (КЛ, 27б); По всем же свете недоставало хлеба (КБ, 87); во всемъ животѣ (КІ, 32).

Узаемадзеяннем старых і новых норм характарызуецца і парадыгма множнага ліку разглядаемага займенніка. Так, у назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах назіраецца характэрная і для старабеларускай пісьменнасці тэндэнцыя да страты былых родавых адрозненняў. Часцей за ўсё тут адзначаецца форма мужчынскага роду з канчаткам -и (80 % прыкладаў), якая можа спалучацца і з назоўнікамі іншых родаў. Назоўны склон: Вси же мужи Іюдины... шли суть пред царемъ (ДЦ, 104); ѳтекли были мужи посполу и жены и вси старейшины (КС, 24); обойдите градъ вси мужи (ІН, 12б); вси народове... боевали с людми справедливыми (КЕ, 18б); з неа же изыдоша вси цари (КР, 1); вінавальны склон: приносити будуть ѡт даровъ мирныхъ жертву гсду... брюхо и вси чрева (ЛК, 9б); вси богы земные выгубилъ (КЮ, 5б—6); ѡсвещаеть вси речи (ЕК, 3б).

Звычайна гэтай форме ў «Астрожскай бібліі» адпавядае такая ж, параўн.: вси входѧщие во храмъ его (Скар. ПЦ, 13) — вси въходѧщіи въ храмъ; вси вкупе перебилисѧ (Скар. ДЦ,

69) — падоша вси въкупѣ; воставаху вси (Скар. КВ, 63) — стоѧхѫ вси.

Меншай ступенню пашырэння характарызуецца форма ніякага роду *вся* (15 % прыкладаў), якая таксама стала універсальнай. Ужыванне яе ў радзе выпадкаў тлумачыцца фразеалагізацыяй: дахъ... всѧ жертвенѧ (ПЦ, 9); по всѧ дни (ДЗ, 12б); по всѧ часы (КВ, 35б); поражу всѧ страны твоѧ жабами (там жа, 16); по всѧ лѣта (ПЦ, 5б).

У «Астрожскай бібліі» гэтая форма прадстаўлена намнога шырэй — на ўзроўні варыянтнай нормы, аб чым сведчаць шматлікія выпадкі ўжывання яе на месцы дзвюх астатніх форм ў скарынінскіх выданнях, параўн.: помажеши... вси сосуды его (КВ, 75) — остиши и всѧ съсѫды его; вси мужи иже бѣша с нимъ (ДЦ, 66б) — и всѧ мѫжи раздраша ризы своѧ.

Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлена былая форма жаночага роду *все:* ведаючи все наѫки быти минѫщие (КБ, 3б); свѧтое писмо все иные наѫки превышаеть (там жа, 1б); видечи все злые речи (ЕК, 5б); на все дела (там жа, 13). Прыкладна такія суадносіны разгледжаных форм былі ўласцівы і тагачаснай беларускай мове.

У родным, вінавальным (пры адушаўлёных назоўніках) і месным склонах пераважае ранейшая форма *всехъ:* ѡ всихъ всех книгах (ПЦ, 25б); на всехъ каменехъ (КВ, 53б); знаю тѧ паче всехъ (там жа, 63б); позвалъ всехъ (ТЦ, 121б). Новая форма *всихъ,* якая адпавядала норме жывой мовы, значна ўступае папярэдняй, што з'яўляецца прыкметай традыцыйнасці мовы Скарыны. Родны склон (22 % прыкладаў): ѡт всихъ речей (ЕК, 10); выбери со всих (там жа, 35б); со всих градовъ (КЮ, 5б); Всих же людей... было естъ четыреста тысещей (КС, 43б); вінавальны склон (23 % прыкладаў): всихъ враговъ твоихъ предъ тобою хребты обращу (КВ, 43б); месны склон (3 % прыкладаў): во всихъ тыхъ коханиахъ (ЕК, 2б); во всих речахъ (там жа, 14б).

Есць падставы сцвярджаць, што традыцыйная форма *всехъ* у сваім пашырэнні мела падтрымку з боку чэшскай Бібліі 1506 г., аб чым дазваляюць гаварыць шматлікія супадзенні: о всехъ речахъ (ДП, 12) — w wssech wieczech; нежели во всехъ живыхъ[s] (ДП, 8б) — nez we wssech zywych; во всех конъцехъ (ТЦ, 120б) — we wssech konczynach. У беларускай пісьменнасці разглядаемага перыяду пануючай у цэлым з'яўляецца новая форма *всихъ.* Традыцыйная форма з *е* ў канчатку *всемъ* асноўная ў давальным склоне. Аб гэтым сведчаць шматлікія прыклады накшталт быхъ в посмехъ всем людем (ПЕ, 8); Дабы ѧвно было всемъ (ПБ, 26); единостайный естъ ѧзыкъ всемь (КБ, 23). Новая форма з *и* ў канчатку, якая адпавядала норме народнай мовы, займае другараднае месца (29 % прыкладаў): ко всимъ народомъ (КЮ, 3б); дабы не навчили васъ всимъ мерзостѧмъ (ДЗ, 40б); ко всим местом (там жа, 10). У «Астрожскай бібліі» скарынінскай

новай форме адпавядае ранейшая, параўн.: будеши молвити ко всимъ (КВ, 52) — гли къ всѣмъ. Асноўнай у старабеларускай пісьменнасці з'яўляецца новая форма *всимъ*.

Агульная тэндэнцыя да пераважнага ўжывання традыцыйных форм азначальных займеннікӑў не абмінула і творны склон. Асноўнае месца тут займае ранейшая форма *всеми* (71 % прыкладаў): людие твое во срамоте сѣть предо всеми (ДП, 28); поставилъ его кнѧзем над всеми властьми (там жа, 9б); да станеть жрець предъ всеми полки (ДЗ, 39б); гнѣшаютсѧ египтѧне всеми пастѣхами овець (КБ, 86б); предо всеми ими (ДЦ, 72б).

Адпаведна новая форма з *и* ў канчатку *(всими)* па пашыранасці значна ўступае традыцыйнай (29 % прыкладаў): сее хощу промолꙋвити пред тобою и предо всими старейшинами (КР, 6б); надо висми людми (ДЦ, 68б); со всими приправами (КВ, 48). У старабеларускай пісьменнасці ў цэлым пераважае новая форма *всими*.

Астатнія азначальныя займенні̆кі *самъ, самый, всякий, каждый, иный* у сваім скланенні практычна нічым не адрозніваюцца ад прыметнікаў.

Склад прыналежных займенні̆каў у вывучаемых тэкстах такі ж, як і ў старажытнарускай і старабеларускай мовах. Гэта супадзенне тлумачыцца крайняй лексічнай абмежаванасцю займенні̆каў гэтага разраду і старажытнасцю іх паходжання. У выданнях Ф. Скарыны гэтыя займенні̆кі ў параўнанні з іх праславянскім станам зазналі тыя ж змены, што і ва ўсходнеславянскіх мовах.

Прыналежныя займенні̆кі маюць катэгорыі роду і ліку (*мой, мое, моя, твой, твое, твоя, свой, свое, своя, нашъ, наше, наша, вашъ, ваше, ваша* — для адзіночнага ліку, *мои, моя, мое, твои, твоя, твое, свои, своя, свое, наши, наша, наше, ваши, ваша, ваше* — для множнага). Скланяюцца яны, як праславянскі неасабовы займенні̆к **и*, **ꙗ*, **ѥ*. Паколькі шляхам далучэння гэтага займенніка да асноў кароткіх прыметнікаў утварыліся поўныя формы апошніх, то прыналежныя займенні̆кі практычна нічым не адрозніваюцца ў сваім скланенні ад поўных адносна-якасных прыметнікаў.

Сістэма пытальна-адносных займенні̆каў у выданнях Ф. Скарыны таксама адлюстроўвае іх царкоўнаславянска-беларускі моўны сінкрэтызм. Ужо сам іх склад паказвае гэты характар мовы вывучаемых тэкстаў даволі выразна: побач з архаічнымі і традыцыйнымі формамі *кой, который, кто, что* ён уключае і характэрныя для народнай мовы ўтварэнні тыпу *ꙗковый, ꙗкий, хто, што*.

Сярод пытальна-адносных займенні̆каў па сваіх марфалагічных асаблівасцях вылучаюцца займенні̆кі *кто, что*, якія не змяняюцца па родах і не маюць форм множнага ліку. У вывучаемых тэкстах у адрозненне ад пераважнай большасці старабеларускіх пісьмовых помнікаў яны захоўваюць амаль заўсёды свае тради-

цыйныя старажытнарускія формы назоўнага склону *кто, что:* кто же в лѣте ветротлѣненъ бываеть (ПС, 17); чи может кто 8кусити (КІ, 10б); кто ѡтнимаеть ѡт друга своего милосѣрдие (там жа, 11); Аще ли солъж8 что (там жа, 11б); что ему гсдь богъ за его терпение далъ ест (там жа, 16). Гэтыя формы з'яўляюцца нормай і «Астрожскай бібліі», параўн.: что ты сее чиниши з людми (КВ, 35) — что се ты твориши людемъ.

Аднак выданні Скарыны адрозніваюцца ад «Астрожскай бібліі» тым, што тут займеннік *что*, хоць і ў адзінкавых выпадках, адзначаецца і ў характэрнай для народнай мовы форме *што*, у чым ярка адлюстравалася спецыфіка моватворчасці выдаўца: што сѧ в чемъ знаменует (КІ, 26); ѡни же... собирають во вᵕрѣмѧ жатᵕвы шᵕто бы мели напотомъ ѣсти (ПС, 12).

Ва ўскосных склонах, як і ў старажытнарускай мове, займеннік *кто* скланяецца па цвёрдаму варыянту, *что* — па мяккаму.

Так, у родным склоне (займеннік *кто* і ў вінавальным) яны маюць традыцыйныя, нязменныя са старажытнарускай эпохі формы *кого, чего:* клѧтва дармо 8чинена на кого жъ коли приидеть (ПС, 39б); кого богъ хощеть того милуеть (КІ, 17); чего добылъ естъ (ЕК, 5б); чего быхмы не 8мѣли (КІ, 20б). У старабеларускай пісьменнасці пануе форма *чого,* узнікшая па аналогіі з *кого.*

У давальным склоне адзначаюцца толькі ранейшыя формы *кому, чему:* чем8 послал мѧ еси (КВ, 12б); Кому люте: чиему ѡтцу люте кому свары, кому ѣма, ком8 вотще раны (ПС, 36). У старабеларускай мове па ўзору *кому* ўзнікла форма *чому.*

У творным склоне займеннік *что* мае сваю традыцыйную форму *чимъ*, займеннік *кто* ў адпаведнасці з нормай беларускай мовы ў выніку прыпадабнення да *чимъ* атрымаў форму *кимъ*: чимᵕ бы сѧ огонъ брати моглъ (КВ, 71); чимъ болей тружаетсѧ (ЕК, 13б); над ким не светитсѧ свѣтло его (КІ, 31); чимъ более сего человѣкъ гнюсъ (там жа, 31). Форма *кимъ,* якая ўзнікла па аналогіі з *чимъ*, з'яўляецца спецыфічнай для беларускай мовы і адрозніваецца ад старажытнарускай. Варыянтнай нормай старабеларускай пісьменнасці з'яўляецца форма цвёрдай разнавіднасці *чымъ.*

У месным склоне кожны з разглядаемых займеннікаў мае сваю ранейшую форму ў адпаведнасці з якасцю зычнага ў аснове: въ чем будут сѧ огаркове гасити (КВ, 48); в чемъ же не оправдилсѧ (КІ, 39б); се 8бо о чемъ пытахомсѧ (там жа, 10).

Астатнія пытальна-адносныя займеннікі маюць тыповае займеннае скланенне, і канчаткі абумоўлены якасцю канцавога зычнага асновы. Так, займеннікі *каторый, яковый* скланяюцца па цвёрдаму тыпу, як займеннік *самый; чий* — па мяккаму (як *мой*). Займеннік *який* спалучае ў сабе элементы цвёрдага і мяккага варыянтаў скланення.

Склад а д м о ў н ы х займеннікаў у даследуемых тэкстах з пункту погляду іх паходжання даволі стракаты. Акрамя агуль-

наславянскіх і старажытнарускіх *(никто, ничто, никакой, ничий, никоторый)*, сюды ўваходзяць царкоўнаславянскі *ничесо* і беларускі *жадин (ніводзін, ніхто)*. Скланяюцца яны, як і пытальна-адносныя, ад якіх яны ўтварыліся: ничто же квашеного да не знайдетсѧ в домехъ (КВ, 23б); ничего не замешкаеть (ЕК, 11б); никто же возыде на небо (КВ, 3б); сеи не будеть боѧтисѧ ничего же (ІС, 55б); ничто же ест новаго подъ слнцемъ (ЕК, 3б).

Займеннік *жадин* мае тыповыя займенныя формы: жадиное разумное ѡтповеди (ЕК, 13б). Займеннік *никакий* адзначаны ў форме роднага склону адзіночнага ліку ніякага роду, характэрнай для старарускай мовы: Никакова дела да не делаете в нихъ (КВ, 23б).

Таксама ад пытальна-адносных, але пры дапамозе іншых часціц утвараліся н я п э ў н ы я займеннікі. У вывучаемых тэкстах яны адлюстроўваюць тыя ж тэндэнцыі, якія ўласцівы і пытальна-адносным: узаемадзеянне царкоўнаславянскай і беларускай моўных стыхій. Акрамя старажытных тыпу *некто, нечто, некий, некоторый,* ужыванне якіх у старабеларускай пісьменнасці падтрымлівалася царкоўнаславянскай мовай, сярод іх ёсць і новыя, якія паходзілі з жывой мовы,— *неякий, нихто.*

У сваім скланенні яны, натуральна, нічым не адрозніваліся ад іншых неасабовых займеннікаў. Тут таксама назіраецца ўзаемадзеянне царкоўнаславянскіх і ўсходнеславянскіх форм; некто с темници и с окововъ вышедъ (ЕК, 8); На некоемъ бо месте (там жа, 2); неции же хвалѧтсѧ во ѕбожестве своем (ІС, 19); имат некоторую речь предъ собою (ЕК, 2); в том была неѩкаѧ легкость серца нашего (ЕК, 24б); неѩкими тайными речами (КВ, 15); Нихто не ѕвесть сего (КР, 6); их^{s} же преступити нихто не можеть (КЭ, 4б); ждавши велми долго здивишесѧ, иже нихто не ѡтвираеть (КС, 9б).

Разгляд форм займеннікаў у выданнях Скарыны паказвае, што, нягледзячы на лексічную абмежаванасць і марфалагічную кансерватыўнасць гэтай часціны мовы, яна тым не менш не пазбегла агульнай тэндэнцыі вывучаемых тэкстаў да дэмакратызацыі царкоўнаславянскай мовы на беларускай моўнай глебе.

ПРЫМЕТНІК

У агульнаславянскай мове прыметнікі адрозніваліся ад назоўнікаў толькі сваёй сінтаксічнай функцыяй, формы ж скланення ў іх былі агульнымі. Такія прыметнікі называюцца іменнымі, або кароткімі. У далейшым да прыметнікаў з мэтай адрознення іх ад назоўнікаў сталі далучацца ўказальныя займеннікі *и*, *ꙗ*, *є*. У выніку ўзніклі поўныя прыметнікі, якія скланяліся па займеннаму скланенню. Абодва марфалагічныя тыпы прыметнікаў характэрны былі і для старабеларускай мовы. Таму зусім натуральна, што абодва яны прадстаўлены і ў мове выданняў Ф. Скарыны.

ФОРМЫ ІМЕННЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ

Сістэма склонавых форм іменных прыметнікаў у мове выданняў Ф. Скарыны захавалася больш поўна ў параўнанні са старабеларускімі пісьмовымі помнікамі, дзе іменныя прыметнікі паступова страцілі свае адметныя склонавыя формы. Напрыклад, па назіраннях М. Г. Булахава, большасць іменных форм назоўнага і вінавальнага склонаў адносных прыметнікаў пры супастаўленні са старабеларускай пісьменнасцю прыпадае на выданні Скарыны. Гэта з'яўляецца адным з істотных аргументаў у карысць меркавання аб царкоўнаславянскай моўнай аснове выданняў беларускага асветніка.

У старабеларускай пісьменнасці ўстойліва ўжываюцца толькі формы назоўнага склону адзіночнага і множнага ліку. Формы ж ускосных склонаў прадстаўлены нязначна і з'яўляюцца, як правіла, вынікам царкоўнаславянскага ўплыву. Асноўнай іх сінтаксічнай функцыяй з'яўляецца ўжо прэдыкатыўная. Прэдыкатыўнай з'яўляецца асноўная сінтаксічная функцыя іменных прыметнікаў і ў выданнях Скарыны. У атрыбутыўнай жа функцыі выступаюць галоўным чынам прыметнікі якасныя.

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах мужчынскага роду а д з і н о ч н а г а ліку выступаюць традыцыйныя формы з чыстай асновай. Назоўны склон: Нагъ изыдохъ из чрѣва (КІ, 5б); бѣше человѣкъ той непороченъ и праведенъ, благочестивъ и истиненъ (там жа, 4); овенъ трилетен

(ПС, 26); царь Ерихонескъ (ІН, 26б); вінавальны склон: сладок чинѧть звукъ (ІС, 65б).

Іменныя формы ніякага роду маюць свой звычайны канчатак *-о/-е*. У параўнанні з аналагічнымі формамі мужчынскага роду яны сустракаюцца значна радзей: пожду еще время мало (КІ, 6б). Скарынінскім іменным формам назоўнага і вінавальнага склонаў адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду адпавядаюць такія ж у Астрожскай і чэшскай бібліях, параўн.: глаголъ гсдень былъ ест честен (ПЦ, 9б) — глъ гнь бѣ честенъ — rzecz bozye tehdaz byla rzyedka. Выпадкі, калі кароткім формам у «Астрожскай біблії» ў выданнях Скарыны адпавядаюць поўныя, сведчаць аб меншым пашырэнні кароткіх форм у мове беларускага асветніка, што можа тлумачыцца ўплывам яго роднай мовы: В законъ вечный (КВ, 60) — въ завѣт вѣчен. Слабае выкарыстанне іменных форм мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку тлумачыцца здольнасцю іх да адвербіялізацыі, г. зн. да пераходу ў разрад прыслоўяў, што знайшло адлюстраванне і ў мове выданняў Скарыны: зведайте запевно (ПЦ, 50); направо (ЛК, 49); ѕпоѧеть допиѧна (ПС, 19).

Прыкладна ў такой жа ступені пашыраны формы кароткіх прыметнікаў назоўнага склону адзіночнага ліку жаночага роду. Яны таксама ўжываюцца галоўным чынам у прэдыкатыўнай функцыі: вера без делъ мертва естъ (ІС, 4б); естъ тѧжка мука его (КІ, 10); Да бѕдеть нощ та особлива и безъславна (там жа, 7б); да будет скромна реч твоѧ (ЕК, 8б). Выкарыстанне гэтых форм у атрыбутыўнай функцыі менш характэрна: приидет ли на тѧ зла пригода (ІС, 22); ꙗвисѧ свеща огнена (КБ, 28б). Параўн. тое ж у чэшскай Біблії: stala se porazka welika, procz gsy smutna.

У родным і пры адушаўлёных назоўніках мужчынскага і ніякага роду ў вінавальным склонах у выданнях Скарыны ў адрозненне ад старабеларускай пісьменнасці кароткія формы пашыраны больш прыкметна, у тым ліку і ў атрыбутыўнай функцыі. Родны склон:ѡт немудра человека (ІС, 32б); мѕжеска полу і женска (КВ, 25); ѡт орѕжиѧ железна (КІ, 26б); вінавальны склон: забиеть нища и ѕбога (КІ, 30б); создалъ нема и глуха (КВ, 10); понесеши... человѣка немудра, несмыслена и немлстива (ІС, 35б); не ѕничижи человѣка стара сѕща (там жа, 16). Захаванне кароткіх форм роднага склону мужчынскага і ніякага роду тлумачыцца іншы раз фразеалагізацыяй адпаведных зваротаў: погубиша всехъ... ѡт стара и до млада (ІН, 13б — 14).

Кароткія формы роднага склону мужчынскага і ніякага роду ў вывучаемых тэкстах пашыраны менш, чым у «Астрожскай біблії», што відаць з прыкладаў, дзе поўным формам Скарыны ў апошняй адпавядаюць кароткія: Галвану добровонного (КВ, 59) — халванѕ блговонна.

У адрозненне ад старабеларускіх пісьмовых помнікаў у выданнях Скарыны адзначаюцца кароткія формы прыметнікаў роднага склону адзіночнага ліку жаночага роду: ѡт земліѧ нища (ПЦ,

7б); на едину страну стены храмовы (ТЦ, 135б). У «Астрожскай бібліі» поўным формам выданняў Скарыны адпавядаюць кароткія, параўн.: из земли египетское (КВ, 57) — ѡт землѧ егѵпетски.

Прыметнікі жаночага роду ў вінавальным склоне адзіночнага ліку выступаюць са сваім традыцыйным канчаткам *-у/-ю*, які ў параўнанні з агульнаславянскім станам змяніўся толькі фанетычна — страціў насавы рэзананс. Гэтыя формы пашыраны амаль у такой жа ступені, як і адпаведныя формы мужчынскага і ніякага роду. Захаванне іх у помніку часта тлумачыцца іх выступленнем у складзе архаічнай канструкцыі з другім вінавальным: вчинилъ емѫ ризѫ краснѫ (КБ, 68); в землю хананейску (КВ, 26); немощъ тѧжкаѧ трезву чинить душу (ІС, 50); землю имате нечисту (ІН, 42б).

У Астрожскай і чэшскай бібліях такім формам звычайна адпавядаюць формы такога ж тыпу, параўн.: мати делывала ему одежу малу (ПЦ, 8б) — matka dielawala mu sukniczku malu — одежѫ сѫгѫбѫ сътвори емѫ мати его. Аднак у «Астрожскай бібліі» такія формы пашыраны ў большай ступені, аб чым сведчаць выпадкі адпаведнасці ў ёй кароткіх форм поўным у Скарыны, параўн.: ровную вагу (Скар. КВ, 59) — в равнѫ мѣрѫ.

У давальным склоне формы мужчынскага і ніякага роду маюць канчатак *-у*, як і ў агульнаславянскай мове. Гэтыя формы ў выданнях Скарыны пашыраны значна больш, чым у старабеларускай пісьменнасці: живу быти (КІ, 14б); веселу быти (ЕК, 6б); врѣмени же многѫ минѫвшѫ (КІ, 6б); сынѫ человѣческѫ (там жа, 42б); пилну быти (ІС, 56б). У старабеларускай пісьменнасці такія формы прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі як вынік царкоўнаславянскага ці старажытнарускага ўплыву. Аб агульнасці тэндэнцыі развіцця іменных форм давальнага склону адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду ў выданнях Скарыны і старабеларускіх помніках сведчаць адзначаныя ў першых выпадкі адвербіялізацыі ўказаных форм: сей помалу обнищаеть (ІС, 30б).

Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены ў вывучаемых выданнях формы кароткіх прыметнікаў давальнага склону адзіночнага ліку жаночага роду, што якраз і абумоўлена царкоўнаславянскай моўнай асновай гэтых тэкстаў: Противу западу же, то естъ ко стране храмове еже зрить к морю ѫделалъ шесть дощекъ (КВ, 69); все еже ко службѣ храмове прилежить (ЛК, 13); обойдеть полуденную странѫ к горе скорпиеве (там жа, 70б). Для старабеларускай пісьменнасці такія формы не характэрны.

У выданнях Скарыны ў адрозненне ад старабеларускіх помнікаў даволі прыкметныя кароткія формы меснага склону мужчынскага і ніякага роду з канчаткам *-е:* во столпе облачне (ДЗ, 59б); на руне волнѧне (КС, 2); ѡ детищи несмыслене (ПС, 33б): в лесе Ефраимсте (ДЦ, 100б).

У «Астрожскай бібліі» гэтыя формы прадстаўлены шырэй, што можна сцвярджаць на аснове выпадкаў, калі скарынінскім

поўным формам тут адпавядаюць кароткія, параўн.: на месте сѧтом (КВ, 56б) — въ мѣстѣ стѣ; во мраце облачном (КВ, 36б) — въ столпѣ облачнѣ.

Акрамя таго, у выданнях Скарыны адзначана вялікая колькасць прыкладаў адвербіялізацыі разглядаемых форм кароткіх прыметнікаў, чым тлумачыцца іх значна меншая ў параўнанні з царкоўнаславянскай мовай старажытнарускай рэдакцыі пашыранасць: накриве присѧгалъ (ПС, 45б); Егда пойметь человекъ вновѣ жену (ДЗ, 45—45б); судъ внагле прийдет ему (ІС, 33б).

У выданнях Скарыны зрэдку сустракаецца і іменная форма меснага склону жаночага роду: в силе мнозе (ДП, 30); в пещи огнѧне (ПС, 27); на ризе сукнѧне (КЛ, 27); в помощи суетне (ПЕ, 10б). Для старабеларускай пісьменнасці такія формы не характэрны.

У агульнаславянскай мове іменныя прыметнікі ў назоўным і вінавальным склонах м н о ж н а г а ліку мелі формы ў залежнасці ад роду азначаемага назоўніка з канчаткамі: *-и* (м. р.), *-а*/*-ꙗ* (н. р.), *-ы*/*-ѧ* (ж. р.). Відаць, пад уплывам старабеларускай мовы, дзе даная сістэма форм вельмі рана пачала разбурацца, у выданнях Ф. Скарыны пры пераважным ужыванні разглядаемых форм у адпаведнасці з традыцыяй маецца маса выпадкаў іх змешвання.

Так, у назоўным склоне прыметнікі мужчынскага роду выступаюць пераважна са сваім ранейшым канчаткам *-и* незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы: они же тако свободни суть (ЕК, 13); не сѫть такъ велици грехы его (КІ, 40); вси есмо тленни (ІС, 16); поклонѧтсѧ мнози лицу твоемѫ (КІ, 16б); слѫжебници мнози вельми (там жа, 4б). Аднак іншы раз яны выступаюць і з канчаткам *-ы* пры цвёрдай аснове, як у вінавальным склоне: мирны будуть (КІ, 10); Люди немудры и не ѫзрѧть (ІС, 25); они же премоцьны сѫть (КІ, 44б). Параўн. вінавальны склон: поставиша грады тверды (КВ, 5б). Такое змяшэнне, верагодна, з'яўляецца вынікам уплыву старабеларускай мовы, дзе адбывалася уніфікацыя канчаткаў па вінавальнаму склону.

«Астрожская біблія» прытрымліваецца ўжывання разглядаемых форм у адпаведнасці з нормай праславянскай мовы: сътвори емѫ д ободы златы.

У ніякім родзе ў выданнях Ф. Скарыны адзначаюцца пераважна традыцыйныя формы з канчаткам *-а*/*-ꙗ* *(-а*/*-ѧ)*: небеса не сѫть чиста прѣд лицемъ его (КІ, 20б); на места Хананейска, Еттейска, Аморейска, Феризейска, Еввейска и Евузейска (КВ, 8б); мала сѫть лѣта (ІС, 29). Аднак і тут сустракаецца канчатак вінавальнага склону мужчынскага роду *-и*/*-ы:* Сливъ четыре колца златы (КВ, 70).

У жаночым родзе бачым перавагу традыцыйных форм: облечеши в ризы сѧты (КВ, 75); далъ... Двѣ досце сведениѧ каменны (там жа, 60); Красны суть ꙗгоды лица твоего (ПП, 3б). Аднак сустракаюцца і канчаткі іншых родаў: рѣчи готови сѫть емѫ

(КІ, 29б). Прыведзеныя прыклады паказваюць, што ў выданнях Скарыны, як і ў старабеларускіх помніках, праявілася тэндэнцыя замацавання формы множнага ліку назоўнага і вінавальнага склонаў жаночага роду і вінавальнага склону мужчынскага роду з канчаткам *-ы* ў якасці агульнай формы для ўсіх трох родаў. Кароткіх форм іншых ускосных склонаў множнага ліку, акрамя вінавальнага, у выданнях Скарыны, як і ў старабеларускай пісьменнасці, не адзначана.

Формы п а р н а г а ліку кароткіх прыметнікаў у беларускай мове часоў Скарыны ўжываліся надзвычай рэдка, выключна ў рэлігійных тэкстах, дзе яны былі ў выніку царкоўнаславянскага моўнага ўплыву. Гэта звычайна формы назоўна-вінавальнага склону. Толькі формы гэтага склону парнага ліку адзначаны і ў выданнях Скарыны, дзе ўжыванне іх з'яўляецца зусім натуральным, улічваючы царкоўнаславянскую моўную аснову гэтых тэкстаў. Мужчынскі род: беста оба нага (КБ, 12); оба бѣста стара и сошлого веку (там жа, 32); принесеть за себе два врабца жива (КЛ, 27); ніякі род: ꙗко двѣ стаде мале козъ (ТЦ, 175); жаночы род: стеши собе две досце каменьне (ДЗ, 23б).

У «Астрожскай бібліі» такія формы пашыраны ў большай ступені, аб чым сведчаць частыя выпадкі адпаведнасці формам парнага ліку ў гэтай крыніцы форм множнага ў Скарыны, параўн.: далъ двѣ досце сведенїѧ каменны (КВ, 60) — дасть... двѣ досцѣ... каменнѣ. Такім чынам, кароткія формы адносна-якасных прыметнікаў у выданнях Скарыны адлюстраваны ў большай ступені, чым у старабеларускай пісьменнасці, што зусім заканамерна для тэкстаў з царкоўнаславянскай моўнай асновай, якімі яны з'яўляюцца. Разам з тым на складзе гэтых форм адбіліся тыя ж тэндэнцыі, якія дзейнічалі і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове, што з'яўляецца доказам думкі, што Скарына пры яго ўзроўні валодання царкоўнаславянскай мовай не мог пазбегнуць арыентацыі на нормы роднай мовы свайго часу.

ФОРМЫ ПОЎНЫХ АДНОСНА-ЯКАСНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах прыметнікі мужчынскага роду а д з і н о ч н а г а ліку маюць амаль заўсёды традыцыйны нясцягнуты канчатак *-ый/-ий*. Назоўны склон: Пишеть стыи Иоанъ (ПС, 1); Пишеть стыи Іаковъ (КІ, 1б); светый Иѡвъ (КІ, 4); вінавальны склон: вниидемъ в животъ вечныи (КБ, 3б). Пасля заднеязычных менш чым у 1 % прыкладаў выступае канчатак цвёрдай разнавіднасці *-ый* як вынік арыентацыі на норму царкоўнаславянскай мовы: ꙗко песокъ морскыи (КІ, 10б); Елифасъ ѳеманитскый и валдафъ сѵхемскыи и софаръ иааманитскый (КІ, 7); о стражѵ людьскыи (там жа, 12); на рускый ꙗзыкъ (ІС, 4); надъ розумъ людскый (там жа, 8); далъ ест манну хлебъ ангельскый (ПБ, 24б). Аднак пануюць тут новыя спалучэнні гукаў *ги, ки, хи,* што з'яўляецца,

безумоўна, вынікам уплыву жывой мовы: за долгий часъ (ДЗ, 40б); на р8съкий ꙗзыкъ (ДП, 1); его же 8бил аръба воевода медийский (КЮ, 1б); душа розъвѣтсѧ ꙗко мѧкий воздухъ (ПБ, 4б); Григорей Великий 8читель вселенский (КБ, 1б).

Пасля шыпячых непадзельна пашыран канчатак мяккай разнавіднасці *-ий,* што можа служыць адным з асноўных сведчанняў традыцыйнасці мовы Скарыны ў параўнанні са старабеларускімі тэкстамі: плоды вражие попалилъ огнь горѧчий (ПБ, 26б); не проидеть ч8жий посрѣде их (КІ, 21); одинаковою смртию мр8т нищий. богатый и грѣшный (там жа, 26б). Такія формы былі вельмі жывучымі і ў старабеларускай пісьмова-літаратурнай мове, аднак побач з імі тут усё часцей выступалі і новыя формы цвёрдай разнавіднасці.

На фоне амаль адзінага ўжывання старых форм з нясцягнутым канчаткам *-ый/-ий* здаюцца апіскамі надзвычай рэдкія новыя формы са сцягнутым канчаткам *-ы/-и,* крыніцай якіх была жывая беларуская мова таго часу. Тым не менш наяўнасць гэтых форм у Скарыны вельмі паказальна для характарыстыкі мовы яго выданняў: Кивот пакъ гречески или скринѧ завета (КВ, 4б).

Традыцыйныя канчаткі *-ое/-ее* і *-ая/-яя,* якія засталіся нязменнымі і ў беларускай мове, маюць адпаведна поўныя прыметнікі ніякага і жаночага роду. Ніякі род, назоўны склон: тело мое не есть медѧное (КІ, 10б); великое щастье имелъ (там жа, 34); вінавальны склон: Тело чужее за тело свое (КІ, 6); жаночы род, назоўны склон: звезда 8тренѧа (ІС, 79); Людьскаѧ доброта (КІ, 42).

Побач з гэтым сустракаюцца і формы прыметнікаў жаночага роду з характэрным для царкоўнаславянскай мовы канчаткам *-аа* без інтэрвакальнага *j.* Формы такога тыпу прадстаўлены ў цэлым нязначна: честь сыновскаа (ПС, 27).

У родным і пры адушаўлёных назоўніках мужчынскага і ніякага роду ў вінавальным склонах асноўную норму складаюць формы з царкоўнаславянскім канчаткам *-аго/-яго* (па падліках М. Г. Булахава 52,5 % прыкладаў), што з'яўляецца адной з яркіх прыкмет царкоўнаславянскай моўнай асновы вывучаемых тэкстаў. Родны склон: *вавилонскаго, ветхаго, единаго, жидовскаго, еврейскаго, израильскаго, медийскаго, новаго, перскаго, праведнаго, славнаго, твердаго, чермнаго, щедраго, убогаго:* из пленениѧ вавилонскаго (КЮ, 1); о наоуце нового и ветхаго закона (ПЦ, 2б); благославилъ естъ лета праведнаго (там жа, 7б); вінавальны склон: щедраго на пиру похвалѧть 8ста (ІС, 51); высвобоживал есми 8богаго (КІ, 34б).

Адпаведна формы з усходнеславянскім канчаткам *-ого/-его* некалькі ўступаюць папярэднім (46,5 % прыкладаў), што з'яўляецца паказчыкам ступені ўплыву народнай мовы на царкоўнаславянскую мову ў выданнях Скарыны. Родны склон: *безумного, вечного, двадцатого, житного, злого, малого, нощного, огнистого, руского, светого:* ни безумного что глалъ (КІ, 5б); но более плакал

оп8стенїа его вечного (ПЕ, 2); въ грозе виденїа нощного (КІ, 8б); вінавальны склон: знайдете ли любого моего (ПП, 7б).

Пасля шыпячых у адрозненне ад старабеларускай пісьменнасці выступае, як правіла, канчатак мяккай разнавіднасці *-его:* гнев8 горшего (ІС, 41б); сну пригожего (ПБ, 1); грѧдущего добра (КЛ, 3б); з чужего ложа (ІС, 38); не гледи на жену м8жа чужего (там жа, 67б). Толькі ў адзінкавых выпадках тут адзначаецца канчатак цвёрдай разнавіднасці *-ого:* въ дому брата ихъ старейшого (КІ, 5).

Вынікам уплыву народнай мовы на мову вывучаемых помнікаў трэба прызнаць тое, што ў жаночым родзе асноўнае месца займае ўсходнеславянскі канчатак *-ое/-ее* (паводле М. Г. Булахава 136 прыкладаў): ѡт пречистое богородици марии (ПС, 1); промежи шолковое основы (КВ, 73); длѧ болѣсти тѧжкое (КІ, 14б); ѡт подошвы железное (ДП, 9); жалость невинное муки (ІН, 4).

Другараднае месца займаюць адпаведныя царкоўнаславянскія формы з канчаткам *-ыя/-ия.* У цэлым яны пашыраны тут нязначна: воды длѧ потопныѧ (КБ, 17б); ѡт церкви свѧтыѧ (ДЦ, 110б); из земли египетскиѧ (КВ, 13б).

Новым формам выданняў Скарыны ў «Астрожскай біблії» адпавядаюць, як правіла, архаічныя, параўн.: должина гуни единое (КВ, 48б) — длъгота опоны единоѧ.

Нязменныя са старажытнарускай эпохі формы мужчынскага і ніякага роду з канчаткам *-ому/-ему* і жаночага з канчаткам *-ой/-ей* утвараюць адзіную норму ў давальным склоне. Мужчынскі і ніякі род: къ сонъмищу жидовѕскому (ПП, 9); къ чину жреческому (ЛК, 10); к душному спасению (КБ, 1); к чермному морю (ДЗ, 8); не заприши мзды 8богому и нищему (там жа, 46б); жаночы род: ко славе вечной (ІС, 78); к последней части долины (ІН, 35б); ко стране полуночной (там жа, 17).

У вінавальным склоне прыметнікі жаночага роду ў выданнях Скарыны, як і ў царкоўнаславянскай мове старажытнарускай рэдакцыі, з аднаго боку, і ў старабеларускай мове, з другога, маюць свой звычайны канчатак *-ую/-юю,* які ў параўнанні з праславянскім станам змяніўся толькі фанетычна — галосныя ў яго складзе страцілі насавы рэзананс: овцу летошнюю (КЛ, 27б); всю поднебесную онъ прозираеть (КІ, 34); видеша болѣзнь его велию зѣло (там жа, 7); опону синюю (ЛК, 12б); м8ку пшеничную (КЛ, 2б). Пад уздзеяннем вымаўлення галосных няверхняга пад'ёму ў пазанаціскных складах *у* ў канчатку можа пераходзіць у *о:* жертва тельца претѧжъкою муку его объѧвлѧла (КЛ, 4б).

У творным склоне прыметнікі мужчынскага і ніякага роду яшчэ ў стараславянскай мове побач са складаным першапачатковым канчаткам *-ыимь/-иимь* часам атрымлівалі і сцягнуты новы канчатак *-ымь/-имь.* Апошні стаў нормай старажытнарускай, а пазней і старабеларускай мовы. З XV ст. губны *м* у яго складзе падвяргаецца зацвярдзенню. Указаны канчатак з'яўляецца нор-

май і выданняў Скарыны: острымъ коломъ прободеть храпы его (КІ, 48б). Пры асновах на заднеязычныя па традыцыі часам выступае канчатак цвёрдай разнавіднасці *-ымъ:* вѣселихъ ли сѧ надъ многымъ (КІ, 37б); рускымъ ꙗзыкомъ (там жа, 2б); рекомые еврейскым ꙗзыкомъ (ЕК, 1б); греческымъ писмомъ (ІС, 3). Аднак пануючымі тут з'яўляюцца новыя формы з канчаткам мяккай разнавіднасці *-имъ*, які адпавядаў норме народнай мовы: *великимъ, двоякимъ, еврейскимъ, ерусалимскимъ, жесткимъ, многимъ, рускимъ, убогимъ, халдейскимъ:* с плачемъ великимъ (ПЦ, 6); рекомаѧ еврейскимъ ꙗзыкомъ (ПП, 11б); словомъ жесткимъ всехъ вкупѣ погубити (ПБ, 18б).

У жаночым родзе адзінымі з'яўляюцца традыцыйныя формы з двухскладовым канчаткам *-ою/-ею,* які ў параўнанні з праславянскай эпохай зазнаў толькі фанетычныя змены: *долгою, великою, доброю, железною, малою, многою, одинаковою, тучною, чужею:* темностию и долъгою нощию (ПБ, 26б); спицею железною (КІ, 25); одинаковою смртию мр8т (КІ, 26б). Такія формы характэрны і для старабеларускай пісьменнасці.

У стараславянскай мове поўныя прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ў месным склоне мелі канчатак *-ѣмъ,* які выступаў пры цвёрдых і мяккіх асновах. У далейшым пад уплывам скланення неасабовых займеннікаў асновы на цвёрды зычны пачалі атрымліваць канчатак *-омь.* Так адбылася дыферэнцыяцыя форм у залежнасці ад якасці канцавога зычнага асновы. У такім выглядзе канчатак перайшоў у старажытнарускую мову, а пазней — і ў старабеларускую.

У выданнях Скарыны ў мужчынскім і ніякім родзе пашыраны формы з усходнеславянскім канчаткам *-омъ/-емъ,* што трэба разглядаць, безумоўна, як вынік уплыву народнай мовы: в своемъ соборномъ послании (КІ, 1б); на страшном сѫде (там жа, 19); о бѣдном и горком животе людском (там жа, 2); в деле зломъ (ЕК, 12б); о человѣку льстивомъ (КІ, 12б). Пасля шыпячых звычайна выступае канчатак мяккай разнавіднасці асноў *-емъ* у адпаведнасці з ранейшай традыцыяй: о всемогущемъ (КІ, 29).

У выданнях Скарыны з іх царкоўнаславянскай моўнай асновай зусім натуральным з'яўляецца ўжыванне старажытнага канчатка *-ѣмъ* пры асновах на цвёрды зычны. Трэба, аднак, сказаць, што па ступені пашыранасці ён значна ўступае разгледжанаму вышэй усходнеславянскаму: въ безаконии грѣховънѣмъ (ІС, 44); в чермнѣмъ мори (КВ, 29б); во столпѣ облачнем (ІС, 39).

Аднак і месны склон мужчынскага і ніякага роду поўных прыметнікаў не застаўся ў баку ад тых працэсаў, якія адбываліся ў той час у беларускай мове. У выглядзе рэдкіх апісак тут прадстаўлены новы, агульны з творным склонам канчатак *-ымъ/-имъ,* які пазней стаў нормай беларускай мовы: оуслышал ест его великий и стыи в камени громовом^{s} (ІС, 74).

Поўныя прыметнікі жаночага роду ў стараславянскай мове

мелі ў месным склоне канчатак *-ѣй* незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы. Ва ўсходнеславянскіх мовах па аналогіі са скланеннем неасабовых займеннікаў асновы на цвёрды зычны атрымалі канчатак *-ой*. У выданнях Скарыны не без уплыву жывой беларускай мовы таго часу прыметнікі ў большасці выпадкаў маюць канчатак *-ой/-ей* у залежнасці ад якасці асновы: на горѣ Синайской (ІС, 3); ѡ немощи вѣликой (КІ, 6); въ силе великой (ДЗ, 14б); в земли Моавской (КР, 1).

Разам з тым, хаця і ў значна меншай ступені, пашыраны і невыпадковыя ў вывучаемых тэкстах архаічныя формы з канчаткам *-ей (<-ѣй)* пасля цвёрдых зычных: въ горѧчести огненей (ІС, 62); по всей вселенней (там жа, 77); в земли ѕвитидстей (КІ, 3); во пустыни синайстей (ЛК, 10—10б); в земли ханаонстей (КБ, 64б). Толькі такія формы характэрны для «Астрожскай бібліі».

Розніца паміж ёю і выданнямі Скарыны ў гэтых адносінах асабліва ярка відаць на прыкладзе наступных паралелей: в земли Египетской (КВ, 42б) — въ земли егѵпетъстей; в земли Египетской (КВ, 41б) — въ земли егѵпетъстѣи.

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах у праславянскай мове поўныя прыметнікі м н о ж н а г а ліку мелі канчаткі ў залежнасці ад роду: для назоўнага склону мужчынскага роду *-ии,* для назоўнага і вінавальнага склонаў ніякага роду *-ая/-яя,* для назоўнага і вінавальнага склонаў жаночага роду і для вінавальнага склону мужчынскага роду *-ыѣ/-ѣѣ*. Такія ж канчаткі ўласцівы былі і стараславянскай мове, толькі ў назоўным склоне жаночага роду і вінавальным мужчынскага для яе быў характэрны канчатак *-ыѧ/-ѧѧ*.

У выданнях Скарыны назіраецца імкненне да захавання ранейшай сістэмы форм назоўнага і вінавальнага склонаў поўных прыметнікаў. Так, у назоўным склоне мужчынскага роду ўжываецца пераважна канчатак *-ии* незалежна ад якасці канцавога зычнага асновы: дождѣве вѣлици, ѡт горъ мочать (КІ, 30); Людие безѕмнии не спостигнуть мудрости (ІС, 25); горе вамъ мужи немилосерднии (там жа, 66б); наплодили б сѧ на тебе звѣри дивии (КВ, 43б); мужи сильнии (ДЦ, 107). Пад уплывам скланення неасабовых займеннікаў асновы на цвёрды зычны могуць часам атрымліваць канчатак *-ыи,* што было нормай старабеларускай мовы: поражени суть силныи и вдатныи (ДЦ, 67б); Малыи и великии тѕто сѕть (КІ, 8); людие же смысленыи споткаютсѧ с нею (ІС, 25). Як вынік уплыву вінавальнага склону тут часам выступае канчатак *-ые/-ие:* чего хотели оу мене нищие (КІ, 37); нахылѧютсѧ чѕжие (там жа, 37); кратки дние человѣческые (там жа, 19б).

У «Астрожскай бібліі» канчатак *-ые/-ие* як нецаркоўнаславянскі адсутнічае зусім. У назоўным склоне прыметнікі мужчынскага роду маюць толькі традыцыйны канчатак *-ии:* мѕжи ависандьстии и галатстии погребоша саоула; видѣша мѕжи азотъстіи:

Тое ж бачым і ў чэшскай Біблii: lidee nesslechetnij zabili czlowieka; padli sylnij w bogi; widucze mużye Azotsstij takowu ranu; twogi slowutnij a sylnij raneni gsu a zmordowani.

Прыметнікі ніякага роду маюць пераважна свой ранейшы канчатак *-ая/-яя*. Ні ў адным са старабеларускіх помнікаў гэты канчатак не прадстаўлены ў такой ступені, як у Скарыны (паводле М. Г. Булахава, 150 прыкладаў). Такім чынам, гэтая моўная рыса з'яўляецца яшчэ адным яркім сведчаннем царкоўнаславянскай моўнай асновы выданняў: Собралъ есми... богатества царьскаѧ и земъскаѧ (ЕК, 4б); слетешесѧ птици на мѧса мертвыѧ (КБ, 28б); людскаѧ коханиѧ и мысли сѫть собѣ противна (ЕК, 2б); дела великаѧ бѫше емѫ на земли (КІ, 4б); горнѧѧ места (КС, 6); оскудеють слова Еврейскаѧ (ІС, 2). Іншы раз у адпаведнасці з нормай царкоўнаславянскай мовы гэты канчатак выступае без інтэрвакальнага *j*: слова твоѧ нечстиваа възбранѧють того (КІ, 20б); сиѧ слова Апсльскаа ѧвлѧют намъ достоиность (там жа, 1б).

Пад уплывам адпаведных форм назоўнага склону жаночага роду і вінавальнага мужчынскага разглядаемыя прыметнікі могуць выступаць і з канчаткам *-ые/-ие:* надъ тое же зеленые жита (ІС, 65б); знаеть ѫбо дела их злые (КІ, 41б); полѧ чужие пожинають (там жа, 30); выложили иные многые Двдвы стые писма (ІС, 3).

Побач з гэтым адзначаюцца выпадкі пранікнення ў ніякі род і канчатка назоўнага склону мужчынскага роду *-ыш/-иш*. Адпаведныя прыклады прадстаўлены ў даследуемых тэкстах даволі прыкметна: дети малыи (ЧЦ, 187б); очи человѣчии (ПС, 41б); ѧблока зернатыи (ПП, 8б).

Пэўны разнабой ва ўжыванні форм назіраецца і ў жаночым родзе. З аднаго боку, тут выступае спецыфічны царкоўнаславянскі канчатак *-ыѧ/-иѧ:* обидѣли вкупе тихыѧ земли (КІ, 30); на всѧ труды людскыѧ (ЕК, 7б); сповѣдѧть тобѣ рыбы морскыѧ (КІ, 17); не возрадуютсѧ о том дщеры филистымъскиѧ (ДЦ, 67). З другога — найбольш пашыраным з'яўляецца адпаведны ўсходнеславянскі канчатак жаночага роду *-ые/-ие:* многые подобные рѣчи готови сѫть емѫ (КІ, 29б); Лепши естъ имѧ доброе нежели масти драгые (ЕК, 11); вси речи трудные (там жа, 3б).

Акрамя таго, прыметнікі жаночага роду адчулі ў пэўнай меры ўплыў і форм назоўнага склону мужчынскага роду. У выніку гэтага тут часта ўжываецца адпаведны канчатак *-ыи/-ии:* видели суть тебе лживыи речи и безумныи (ПЕ, 6б); давалъ запоны златыи (ДЦ, 67б); приношахусѧ требы мокрии (КВ, 70б); вделаеш ризы свѧтыи (там жа, 52).

Такім чынам, сістэма форм членных прыметнікаў назоўнага і вінавальнага склонаў множнага ліку ў выданнях Скарыны адлюстроўвае тыя ж працэсы, якія дзейнічалі і ў старабеларускай пісьменнасці,— уніфікацыю форм па мужчынскаму або па жаночаму роду. Як і ў беларускай пісьменнасці таго часу, пера-

важае былы канчатак мужчынскага роду *-ыи/-ии* (па падліках М. Г. Булахава, 72,4 % прыкладаў). Канчатак жаночага роду *-ые/-ие* займае другараднае месца.

У родным, вінавальным (пры адушаўлёных назоўніках) і месным склонах поўныя прыметнікі ўсіх трох родаў у праславянскай мове мелі складаны канчатак *-ыихъ/-иихъ*. Гэты канчатак захоўваўся ў стараславянскай мове, аднак ён рана пачаў падвяргацца сцяжэнню, набываючы выгляд *-ыхъ/-ихъ*, які замацаваўся ў якасці нормы ва ўсходнеславянскіх мовах. У царкоўнаславянскай жа мове працягвала захоўвацца ранейшая нясцягнутая форма *-ыих/-иихъ*.

У выданнях Скарыны пераважаюць формы са сцягнутым канчаткам *-ыхъ/-ихъ*. Родны склон: из мртвых (КІ, 1б); четыредесѧт подставокъ сребреныхъ слиеши (КВ, 49); ꙗко тмаръ дымный зꙋ добровонных речей (ПП, 5б); набери речей добровонныхъ (КІ, 58б); Не приимуеть безꙋмныи словъ мудрыхꙋ (ПС, 28—28б); вінавальны склон: на праведных допущаеть беды (КІ, 2); взѧлъ с собою на помощ мужеи силныхъ и годныхъ к бою (КЮ, 6); мужей пресилныхъ и богатыревъ смелость выписуеть (КБ, 7б); месны склон: мудрость... провела его по путех правых (ПБ, 15); по местехъ зеленыхъ (КБ, 74); в ризахъ красныхъ (ІС, 19б); милосѣрдие естъ на стыхъ его (ПБ, 7). Не з'яўляецца выпадковым для вывучаемых тэкстаў тое, што тут пры выяўленай вышэй пераважае ўсходнеславянскага сцягнутага канчатка *-ыхъ/-ихъ* спарадычна ўжываецца і стары нясцягнуты канчатак *-ыихъ/-иихъ:* при вратехъ самарийскиих (ЧЦ, 198). Крыніцай такіх форм для Скарыны, відаць, паслужылі стараславянскія тэксты, больш раннія, чым «Генадзіеўская біблія», якая, як мяркуецца, была ў яго распараджэнні.

Новыя сцягнутыя ўсходнеславянскія канчаткі *-ымъ/-имъ* і *-ыми/-ими* з'яўляюцца адзінымі адпаведна ў давальным і творным склонах. Давальны склон: Человѣкъ разꙋмный любитисѧ бꙋдеть людемъ великоможнымъ (ІС, 33); злымъ и несправедливым даеть щастье (КІ, 2); ко зверем лютым (ІС, 22); творны склон: с мꙋдрими людми (КВ, 34); под простыми словы (КБ, 1б); вси народове... боевали с людми справедливыми (КЕ, 18б).

Формы п а р н а г а ліку ў выданнях Скарыны прадстаўлены больш-менш прыкметна ў параўнанні са старабеларускай пісьменнасцю, хоць ва ўжыванні іх назіраюцца тыя ж заканамернасці, што і ў старабеларускіх тэкстах. Назоўна-вінавальны склон: обе полне руце (ЕК, 8); давальна-творны склон: с празными рукама (КВ, 43); босыма ногама (ДЦ, 95б); плотома виноградныма (ЛК, 49); кривавыма очима (КЕ, 23).

Разам з тым ёсць шэраг выпадкаў, калі пры назоўніку ў форме парнага ліку прыметнік стаіць у форме множнага: прѣчистыи руце мои (КІ, 14б); нозе твои не суть окованы (ДЦ, 72); ѡт руку Египетских (КВ, 8); ѡт руку филистымских (ДЦ, 71б); з рукꙋ Египетскихъ (КВ, 29).

ПРЫНАЛЕЖНЫЯ ПРЫМЕТНІКІ

Гэтаму разраду прыметнікаў уласціва пэўная спецыфіка ў словаўтваральных і марфалагічных адносінах. Яны ўтвараліся пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин, -ьјь-(-јь-), -н-*. Яшчэ ў эпоху ранняй пісьменнасці ва ўсіх славянскіх мовах яны скланяліся па іменнаму тыпу — як назоўнікі асноў на **о* і на **а*. Пад уплывам адносна-якасных прыметнікаў яны пачалі набываць поўныя формы скланення. Аднак побач з поўнымі працягвалі захоўвацца і кароткія. У такім стане сістэма форм прыналежных прыметнікаў уласціва і мове выданняў Скарыны.

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах а д з і н о ч н а г а ліку прыметнікі мужчынскага роду, утвораныя пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин, -ьјь-, -јь, -н-*, захоўваюць ранейшыя іменныя формы з чыстай асновай. Назоўны склон: ѓдъ асъпидов неисцелимый (ДЗ, 62б); царь израилевъ (ЕК, 1); сынъ вѣхоровъ (КІ, 3); елиѳдъ сынъ варахелевъ (там жа, 38); Имонъ сынъ ѡниинъ (ІС, 78б); сынъ навгинь (ІС, 73б); съвѣршен ест храмъ гсдень (ТЦ, 136); сынъ аховороньь (КІ, 3); вінавальны склон: за грехъ мтринъ (ІС, 8); паметай на гневъ гсдень (ІС, 29б); гсдь слышить плачь удовичий и сиротій (там жа, 56б).

Як правіла, іменныя формы характэрны для гэтых прыметнікаў у «Астрожскай бібліі», параўн.: въ храмъ дагонь (ПЦ, 12б) — въ храмъ дагонь; заѳтра празникъ гсдень ест (КВ, 60б) — днь гнь оутрѣ. Прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфіксаў з элементам *j*, толькі зрэдку сустракаюцца ў архаічных іменных формах: сын Еровоамль (ПЦ, 5). Пануючымі, як і ў старабеларускай мове, з'яўляюцца поўныя формы гэтых прыметнікаў. Назоўны склон: сынъ человѣчий червь (КІ, 31); где ест домъ кнѧжий (там жа, 27б); проркъ бжий (там жа, 1б); вінавальны склон: гсдь слышить плачь удовичий и сиротій (ІС, 56б). Нормай жа «Астрожскай бібліі» з'яўляюцца іменныя формы: снъ иереміиль.

Прыналежныя прыметнікі ніякага роду, утвораныя пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин,* паслядоўна захоўваюць свае іменныя формы: поглѣдело на ню око орлово (КІ, 33б). Пѣро пструсово подобно ли ест перу соколову (там жа, 47); сведение адово ѓавлено ест тобѣ (ІС, 24); ѓако Рикание львово, тако и гроза Царева (ПС, 31). Поўныя формы такіх прыметнікаў не былі характэрны і для старабеларускай мовы.

Звычайна ў іменных формах выступаюць прыметнікі ніякага роду, утвораныя пры дапамозе суфікса *-ьнј-(-ьнјь):* слово гсдьне бысть к нему (КБ, 28); бѳди имѧ гсдьнѣ благославено въвѣки (КІ, 5б); хвалили имѧ стое гсдьне (ІС, 75б); лице гсдьне (ПЕ, 10б). Поўныя іх формы былі надзвычай рэдкімі і ў старабеларускай мове.

Наадварот, поўныя формы, як правіла, маюць прыметнікі, утвораныя з дапамогай суфіксаў з элементам *j:* слова ѓавлѧють

сердце человѣчие (ІС, 44); карание бжие (ІС, 26б); писмо теже божие (КВ, 61б). Адпаведныя іменныя формы сустракаюцца даволі рэдка: Поколение теже ефраимле (КС, 6).

Прыметнікі жаночага роду з суфіксамі *-ов, -ев, -ин* выступаюць звычайна ў іменных формах з канчаткам *-а,* што характэрна і для старабеларускай пісьменнасці: срамота сынова (ІС, 8б); дщера матредова (КІ, 3б); анъна пакъ мати самуилова богу помолисѧ (ПЦ, 7); желчь змиева вино ихъ (ДЗ, 62б); баба іѡсеѡва ѡтца царѧ давыдова (КР, 1б); ꙗко естъ глава вужева (ІС, 41б).

Толькі іменныя формы маюць прыметнікі жаночага роду з суфіксам *-ьн- (-ьнjь):* волѧ гсдьнѧ (ПС, 30б); рука гсдьнѧ (КІ, 17—17б); веллепота гсдьнѧ (КВ, 76); субота гсдьнѧ (там жа, 32б).

Прыметнікі з суфіксамі з элементам *j* таксама маюць звычайна іменныя формы: боѧзнь божиꙗ (ІС, 41); ꙗрость божиѧ (ДЗ, 56б); слава божиꙗ (КВ, 2б). У беларускай мове таго часу ўсё большае пашырэнне атрымлівалі поўныя формы гэтых прыметнікаў.

У родным і пры адушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах прыналежныя прыметнікі мужчынскага і ніякага роду, за рэдкім выключэннем, маюць традыцыйныя іменныя формы з канчаткам *-а/-я:* сына сирахова (ІС, 2); из живота материна (КІ, 45б); скорынина сына (там жа, 51б); книга родства іс хрстова (КБ, 1); крику насильникова не слышить (КІ, 47); ѡт племенѧ авраамлѧ (там жа, 38); пасѧше овце жерца мадиамлѧ (КВ, 8); оу двереи храму гсдьнѧ (ПЦ, 8б); совершение страху божиѧ (ІС, 34). Адпаведныя поўныя формы сустракаюцца надзвычай рэдка: з руки насилниковы изторгнеть 8богаго (КІ, 9б). Гэтым выданні Скарыны адрозніваюцца ад старабеларускіх пісьмовых помнікаў, дзе з канца XV ст., г. зн. пры жыцці асветніка, поўныя формы атрымлівалі ўсё большае пашырэнне.

Некалькі іншы малюнак назіраецца ў жаночым родзе. У адрозненне ад мужчынскага і ніякага іменныя формы тут маюць меншую ўдзельную вагу: длѧ нужды братовы (КБ, 61б — 62); къ горе дщеры сионѧ (КР, 1); з руки насилниковы (КІ, 9б); набереши крови телꙋцевы (КВ, 55б); о смерти... жены финиисовы (ПЦ, 11).

Прыметнікі з суфіксам *-ьjь* могуць ужывацца ў дзвюх формах — са старажытным канчаткам *-я* і больш новым *-и:* ѡт руки гсдьнѧ (КІ, 6б); къ горе дщеры сионѧ (КР, 1), але до земли мадиамли (КВ, 7). У «Астрожскай бібліі» ім адпавядае толькі канчатак *-я,* параўн.: ѡт горы ефремли (ПЦ, 5) — ѡт горы ефрѣмлѧ.

Разам з тым больш-менш прыкметна прадстаўлены і поўныя формы. Тут, з аднаго боку, адзначаецца аднаскладовы канчатак *-ей*: дело его полно естъ славы божией (ІС, 68б); несть казни божией над ними (КІ, 27); ѡт руки божией (ЕК, 6). З другога — два тыпы канчаткаў двухскладовых — царкоўна-

славянскі *-ея* і ўсходнеславянскі *-ее:* длѧ бжиеꙗ службы (ЛК, 29); боꙗзни бжиеѧ (ІС, 5) і ожидаеть божиее млсти (КІ, 22б).

Такім чынам, выяўленая ў вывучаемых тэкстах сістэма форм прыналежных прыметнікаў роднага склону адзіночнага ліку ў пэўнай ступені адлюстроўвае працэсы, характэрныя для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы.

У давальным склоне прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ў большасці выпадкаў маюць іменныя формы з канчаткам *-у/-ю.* Усяго ў выданнях Скарыны, па падліках М. Г. Булахава, ужыта 167 такіх форм: къ шатру ѡлофернову (КЮ, 22б); достоꙗние дому ꙗковлю (ІС, 40); не бывай неверенъ страху гсдьню (там жа, 6б); Пѣро пструсово подобно ли ест перу соколову и ꙗстребов8 (КІ, 47). Хоць і ў меншай ступені, пашыраны тут і поўныя формы з канчаткам *-ому/-ему:* мужу божиему (ТЦ, 158); по образ8 божиему сотворилъ его (КБ, 14).

Наяўныя ў выданнях Скарыны суадносіны кароткіх і поўных форм прыналежных прыметнікаў давальнага склону мужчынскага і ніякага роду ў пэўнай ступені адлюстроўваюць становішча тых і другіх у беларускай літаратурна-пісьмовай мове таго часу.

У жаночым родзе іменныя формы з канчаткам *-е(<-ѣ)* у вывучаемых помніках маюць большае пашырэнне, чым у старабеларускай пісьменнасці: па падліках М. Г. Булахава, яны адзначаны тут 26 разоў: ко дщере фараонове (КВ, 7); къ... матери саломоновѣ (ТЦ, 124б); поставленъ бысть другый престолъ матце царевѣ (там жа, 125); сестре сарвийне (ДЦ, 77); дщере і8дине (ПЕ, 3б).

У вінавальным склоне прыналежныя прыметнікі жаночага роду ў выданнях Скарыны выступаюць, як правіла, у іменных формах. Гэта ў першую чаргу датычыць прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин,* якія і ў старабеларускай пісьменнасці мелі звычайна кароткія формы: сохранитъ... болесть ѡтцеву (КІ, 27); ѡтсече главу ѡлофернову (КЮ, 2); сверже с небеси на землю славу ізрайлеву (ПЕ, 5б);

У іменных формах выступаюць звычайна і прыметнікі з суфіксам *-ьн*: Хлѣбъ его во 8тробѣ его обратитсѧ въ желчъ аспидню (КІ, 26); хранѧще стражу гсдьню (КЛ, 18б). У старабеларускай пісьменнасці сустракаюцца і поўныя формы гэтых прыметнікаў.

У старабеларускай пісьмовай мове прыкметна адлюстраваліся і поўныя формы вінавальнага склону прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфіксаў з элементам *j*. У выданнях жа Скарыны яны маюць звычайна іменныя формы: приемлете ѡт нихъ... шерсть козью (КВ, 45); на гор8 божию (там жа, 36); любовь божию еже имеаше к нам грешным (ПП, 1б).

У творным склоне прыналежныя прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ў даследуемых тэкстах, як і ў старабеларускай пісьменнасці, маюць, як правіла, поўныя формы з канчаткам *-ымъ/-имъ:* 8чиних милосѣръдие над домом са8ловым (ДЦ, 70б); скорининымъ сыномъ (ЕК, 1); онъ же глалъ ест именемъ

гсдьнимъ (КІ, 1б); предъ лицемъ человечиимъ (ІС, 55); пред лицем бжиим (КІ, 6). Такія ж формы адпавядаюць прыведзеным і ў «Астрожскай бібліі», параўн.: пѣрстомъ божиимъ (КВ, 60) — прьстом бжіимъ.

Толькі ў займенных формах з традыцыйным двухскладовым канчаткам *-ою/-ею* выступаюць у творным склоне прыналежныя займеннікі жаночага роду: р8кою моисеевою (КВ, 19б); божиею млстию (ЕК, 18); кровию козлею или юнчею (КВ, 4б); просбою сиротиею (ІС, 57); подъ властию фараоновою (КБ, 75б). Такая ж сістэма форм творнага склону адзіночнага ліку прыналежных прыметнікаў характарызуе і старабеларускую пісьменнасць.

У месным склоне ў параўнанні са старабеларускай пісьменнасцю выданні Скарыны адрозніваюцца значна большай удзельнай вагой іменных форм мужчынскага і ніякага роду. Калі ў помніках старабеларускай пісьмовай мовы такія формы ўжываюцца больш-менш свабодна толькі да канца XV ст., то ў скарынінскай «Бібліі» маем яшчэ шмат прыкладаў тыпу в животе материне (ІС, 78); на поли моавли (КІ, 3); По смерти пакъ іосифове (КВ, 5б); на поли воозове (КР, 5); ѡ на8чении цар҃ двдвѣ (ПЦ, 123б); ѡ судѣ саломоновѣ (ТЦ, 127).

Побач з іменнымі пад уплывам жывой народнай мовы ў вывучаемых выданнях значнае пашырэнне атрымалі і займенныя формы меснага склону, якія ў старабеларускай мове пачынаючы з XVI ст. становяцца асноўнымі: во благославении гсдьнем (ІС, 75); о гнезде пташиемъ (ДЗ, 42); во всесоз^{s}жении ов^{s}немъ и юн^{s}цемъ (ДП, 12б); о гневе бжием (ДЗ, 5).

Іменныя формы жаночага роду меснага склону ў беларускай пісьменнасці разглядаемага перыяду прадстаўлены даволі слаба. У Скарыны ж іх удзельная вага намнога большая: ѡ похвале мойсеовѣ и аароновѣ и финиисовѣ (ІС, 72); во оутробѣ материне (там жа, 6); в земли гесемли (КВ, 19); о смерти гелиине (ПЦ, 11); во глубине адове суть весел҃щиис҃ с нею (ПС, 16б). Адпаведныя поўныя формы ў беларускай пісьменнасці таго часу былі ўжо нормай. У Скарыны ж яны значна ўступаюць кароткім: о кл҃тве божией (КБ, 12); въ человѣчией моци (ЕК, 12б); въ церкви господьней (ПЦ, 10); ѡ сладкости божией (ПБ, 18). Такім формам у «Астрожскай бібліі» адпавядаюць звычайна кароткія, параўн.: въ церкви господьней (ПЦ, 10) — въ цркви гни.

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінаваль҃ным склонах м н о ж н а г а ліку прыметнікі ўсіх трох родаў, утвораныя пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин,* у выданнях Скарыны, як і ў старабеларускай мове, звычайна ўжываюцца ў іменных формах. Назоўны склон: на конци ихъ тмы адовы и м8ки (ІС, 34); ѡчи гсдьни на бо҃щихс҃ его (там жа, 55б); мужи іюдины шли суть пред царемъ (ДЦ, 104); вінавальны склон: сосуды горнчаровы искушаеть огонь (ІС, 44); на сыны адамовы (ІС, 64б).

Для прыметнікаў жа, утвораных пры дапамозе суфіксаў з элементамі *j*, звычайнай, як і ў старабеларускай мове, з'яўля-

ецца поўная форма. Назоўны склон: Ангели божии (КІ, 4б); слезы вдовичие на лице ѥѧ плынуть (ІС, 57); вінавальны склон: приемлете... кожи барание (КВ, 45); допѯстилъ... песиѧ мѯхи (там жа, 16); стопы божиѧ осѧгнул еси (КІ, 16).

У родным (пры адушаўлёных назоўніках у вінавальным) і месным склонах прыналежныя прыметнікі ўсіх трох родаў незалежна ад утварэння маюць поўныя формы. Пры гэтым прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин,* маюць канчатак цвёрдай разнавіднасці *-ыхъ,* а прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфіксаў з элементам *j*,— канчатак мяккай разнавіднасці *-ихъ.* Родны склон: з шерстей козих (КВ, 68б); из ложеснъ материныхъ (КІ, 15); ѡт сыновъ Ісавовыхъ (там жа, 3); походъка ногъ человечиих (ІС, 31б); вінавальны склон: судии справовали людеи ізраилевыхъ (КР, 2); пленилъ всих сыновъ тарсиныхъ (КЮ, 4б); месны склон: о десети ѕзвахъ фараоновыхъ (КБ, 4). Толькі поўныя формы ва ўказаных склонах множнага ліку прыналежных прыметнікаў характэрны былі ў часы Скарыны і для беларускай мовы.

У «Астрожскай бібліі» ўказаным формам адпавядаюць кароткія, параўн.: множество сыновъ ізраилевыхъ (КВ, 66) — сонм снов^{s} їилевъ.

У давальным склоне прыналежныя прыметнікі ўсіх трох родаў незалежна ад утварэння выступаюць у поўных формах. Прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфіксаў *-ов, -ев, -ин,* маюць канчатак *-ыхъ,* прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфіксаў з элементам *j*,— канчатак *-ихъ:* рци сыномъ ізраилевым^{s} (ЛК, 34б); сыномъ лотовымъ далъ есмъ ю (ДЗ, 9). Формы толькі такога тыпу характэрны і для старабеларускай пісьменнасці.

Не складае выключэння сярод іншых ускосных склонаў прыналежных прыметнікаў і творны склон. Адзінымі тут з'яўляюцца поўныя формы. Прыметнікі з суфіксамі *-ов, -ев, -ин* маюць канчатак *-ыми,* з суфіксамі з элементам *j* — канчатак *-ими:* бываша свары межи пастухи авраамовыми и лотовыми (КБ, 25б); слюбили людми божиими быти (ПБ, 28б); предъ людьми ізрайлевыми (ДЗ, 15). Тое ж характэрна і для старабеларускай пісьменнасці.

У адрозненне ад пераважнай большасці старабеларускіх пісьмовых помнікаў у выданнях Скарыны ўжываюцца формы п а р н а г а ліку прыналежных прыметнікаў у спалучэнні з такімі ж формамі назоўнікаў. Назоўна-вінавальны склон: беста оба сына гелиина (ПЦ, 11б); Два сына гелиина оубиты (ПЦ, 12); роднамесны склон: были суть на руку адониеву (ТЦ, 120б); ѡтведе их іосифъ ѡт колѣнѯ ѡтцевѯ (КБ, 89); давальна-творны склон: предъ очима божиима (ДЦ, 95); предъ очима воозовыма (КР, 3б); предъ очима царевыма (КЕ, 5б). Разам з тым часта з назоўнікамі ў форме парнага ліку прыналежныя прыметнікі спалучаюцца ў форме множнага: ѡт руку фараоновыхъ (КВ, 7б).

ФОРМЫ СТУПЕНЕЙ ПАРАЎНАННЯ ЯКАСНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ

У праславянскай мове мелі месца толькі формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў, якія ўтвараліся пры дапамозе суфіксаў *-jьs, -ějьs*, якія пазней перайшлі ў *-jes, -ějes*. Як іменныя гэтыя формы скланяліся ў мужчынскім і ніякім родзе, як назоўнікі асноў на **o*, у жаночым — як назоўнікі асноў на **a*.

Гэтыя формы захаваліся ў стараславянскай мове, а ў старажытнарускай, акрамя іх, утварыліся поўныя формы шляхам далучэння да іменных форм указальных займеннікаў *и, ѧ, є*: *легчѣи, легчѣишиѧ, легчѣишиє*.

У старажытнарускай мове ўжо мелі месца і формы найвышэйшай ступені параўнання. Яна выражалася або апісальна пры дапамозе слоў *вельми, очень, самый*, або прыставак *пре-* і *наи-*.

У выданнях Скарыны, як і ў старабеларускай пісьменнасці ранняга перыяду, адзначаюцца толькі іменныя формы назоўнага (вінавальнага) склону ніякага роду. Прадстаўлены яны даволі слаба і выключна ў прэдыкатыўнай функцыі: азъ стареи тебе буду (КБ, 75б); единъ вышии другаго (ДП, 25); не можеть быти горѣе сего (ІС, 24); тое то естъ горше нежели оное (там жа, 64б).

Часта адзначаецца пераход такіх форм у разрад прыслоўяў, аб чым сведчыць іх сінтаксічная функцыя акалічнасцей: звинѧша гласней (ПЦ, 28б); ѕчинилъ еси злей всихъ (ТЦ, 160б); лепеи было нам ѕмрети (ЛК, 32).

У старабеларускай пісьменнасці самым пашыраным сродкам утварэння форм вышэйшай ступені з'яўляецца складаны суфікс *-ейш-*. Відаць, вынікам уплыву беларускай мовы з'яўляецца пераважнае ўжыванне гэтага суфікса і ў выданнях Ф. Скарыны: Дние мои скорѣйшие были сѣть гонца (КІ, 14б); Моцнейшимъ воистинну моцнейшее уготовано ест мучение (ПБ, 9б); богъ... мудрейший иныхъ былъ (ПС, 2); место не будеть мекчейше надъ иное тело (КЛ, 24б); совершенейший храмъ нерукотворенный (КВ, 4б); знашолъ есми жену горчейшую нежели смрть (ЕК, 11б). Суфікс *-айш-*, які ў старажытнарускай мове выступаў звычайна пасля шыпячых, у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове ўжываўся даволі рэдка і насіў ярка выражаны кніжны характар, у Скарыны прадстаўлены нязначна: послалѧ Валакъ множайшие и чеснейшие послы (ЛК, 48б); Седмъ народовъ иже множайшие числомъ сѣть (ДЗ, 18б). Формы з суфіксам *-ш-* адзначаюцца яшчэ радзей, аднак склад прыметнікаў, ад якіх яны ўтвараюцца, лексічна неабмежаваны, што мела месца і ў старабеларускай мове: тѧжъшие ѧвили бы сѧ (КІ, 10б); посмеваютсѧ мнѣ часом младшии (там жа, 23); лучший естъ овощъ мой нежели злато и камение драгое (ПС, 15); Дѣхъ бо мой сладший ест надъ медъ (ІС, 39б); Лепшаѧ ест мудрость нежели оружиѧ (ЕК, 15); ѕбил естъ двѕ мужеи праведныхъ лепших нежели самъ (ТЦ, 126); горший нежели блато животъ его (ПБ, 23).

Звычайна ў аднолькавых кантэкстах формы вышэйшай ступені ў Скарыны і ў чэшскай Біблії па спосабу ўтварэння супадаюць, параўн.: przy taynieyssye stranie — при тайнейшой стране (ПЦ, 13); byli sylnieyssy nežli lwowe — Были... сильнеишии нежели львы (ДЦ, 67б); on bratr muoy starssij — онъ естъ братъ мои старший (ТЦ, 125б); rychleyssij nežli orlicze — скорейшии нежели ѡрли (ДЦ, 67б).

Асноўным сродкам утварэння форм найвышэйшай ступені параўнання ў стараславянскай і старажытнарускай мовах была прыстаўка *наи-*. Пазней яна стала нормай і для старабеларускай мовы. Пры дапамозе данай прыстаўкі ўтвараюцца пераважна формы найвышэйшай ступені і ў выданнях Скарыны. Яна можа далучацца як да форм вышэйшай ступені, так і да прыметнікаў без суфіксаў ступеней параўнання: златомъ наичистейшимъ окуеши ю (КВ, 45б); уста же дерзкыхъ найблизшие суть ку сра-мочению (ПС, 17б); онꙑ же въ наиболшей нищете будеть (КЕ, 9б); и ни барвы наичистеишие в купу бѫдут складатисѧ (КІ, 33б); речи ѕстенъ его сѣт блудъ найгоршии (ЕК, 15б).

Радзей сустракаецца сцягнуты варыянт указанай прыстаўкі *на-*, прыкметна пашыраны і ў старабеларускай пісьменнасці: сосудъ же надражший ест уста наѕченого (ПС, 31б); Набольшии во избавление (ІС, 73б); запирание бога навышшего (КІ, 37б); въ нанижших местехъ (КІ, 45б).

Ні стараславянскай, ні старажытнарускай мовам такая прыстаўка не была ўласціва. Затое яна характэрна была для старапольскай мовы, якая і стала, верагодна, крыніцай яе для старабеларускай мовы, а апошняя ў сваю чаргу — для мовы выданняў Скарыны.

Беларускай жывой мове часоў Скарыны прыстаўка *пре-* была неўласціва, у пісьмовай жа мове таго часу насіла кніжны характар і ўжывалася вельмі абмежавана. У выданнях жа Скарыны яна пашырана даволі прыкметна, што з'явілася вынікам арыентацыі выдаўца ў значнай ступені на нормы царкоўнаславянскай мовы: изъ преславнаго града ерусалима (ІС, 2б); согрешисте грехом прѣвеликимъ (КВ, 62); веалъ пресилный а жгущий ветръ (там жа, 28б); з руку богъ превышних техъ (ПЦ, 11б); мужей пресилныхъ и богатыревъ смелость выписуетъ (КБ, 4б).

Такім чынам, сістэма форм прыметнікаў скарынінскіх выданняў, будучы ў аснове сваёй царкоўнаславянскай, у значнай ступені адлюстравала тыя змены, якія адбыліся ў ёй у старабеларускай мове.

ЛІЧЭБНІК

Назваў лічбаў у стараславянскай мове было нямнога. У далейшым, у працэсе фарміравання старажытнарускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы, адбывалася выдзяленне лічэбнікаў у асобную часціну мовы. Паколькі мова выданняў Ф. Скарыны ўяўляе сабой наступны этап у развіцці царкоўнаславянскай мовы ў напрамку набліжэння яе да народнай жывой мовы, сістэма форм лічэбніка ў адпаведнасці з гэтым зазнала далейшыя колькасныя і якасныя змены. Незавершанасць працэсу фарміравання сістэмы форм лічэбніка ў старабеларускай мове, на нормы якой у пэўнай ступені арыентаваўся Скарына, сінкрэтызацыя ў мове яго выданняў разнамоўных стыхій з'явіліся прычынай значнай варыянтнасці форм лічэбнікаў у вывучаемых тэкстах.

П э ў н а - к о л ь к а с н ы я лічэбнікі з'яўляюцца зыходнымі ва ўтварэнні лікавых назваў іншых семантычных разрадаў. Таму склад іх у даследуемых тэкстах вызначае сістэму ўсіх астатніх.

У выданнях Скарыны ў якасці нормы лічэбніка *единъ* ужываецца варыянт з пачатковым гукаспалучэннем *je*. Гэты варыянт у старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове ўжываўся абмежавана і меў кніжны характар. Паколькі ён мае займенна-прыметнікавае паходжанне, у яго захаваліся катэгорыі роду (единъ (м. р.), едина (ж. р.), едно (н. р.)) і склону. Скланяецца ён, як адносна-якасныя прыметнікі і неасабовыя займеннікі. Ва ўскосных склонах ён мае дзве разнавіднасці форм — для мужчынскага і ніякага роду, з аднаго боку, і для жаночага — з другога.

Нягледзячы на панаванне царкоўнаславянскай формы з пачатковым *je*, даная норма, аднак, вытрымліваецца не да канца. Асаблівасцю мовы вывучаемых выданняў з'яўляецца тое, што тут спарадычна прадстаўлены і адпаведныя ўсходнеславянскія формы з пачатковым *о*: одныхъ речей (ПС, 3); главъ тридесѧть и одн8 (ПС, 46); ув одномъ собꙋрании (ІН, 96). У «Астрожскай біблії», а тым больш у чэшскай ужываецца толькі варыянт з пачатковым *je*, параўн.: херувимъ единъ (КВ, 70) — херувим едінъ; едину ѡт дщерей (ПЦ, 6) — gedne ze dczer.

Колькасны лічэбнік *два* і зборныя *оба, обадва* маюць агульную гісторыю развіцця сістэмы форм. Ад іншых лічэбнікаў яны

адрозніваюцца тым, што з імі звязана значэнне парнага ліку. Належачы да катэгорыі парнага ліку, яны скланяюцца, як указальны займеннік *тъ, та, то*. У назоўна-вінавальным склоне ім уласцівы дзве формы роду: *два, оба, обадва* для мужчынскага і *две, обе, обедве* для жаночага. Назоўнікі мужчынскага роду спалучаюцца з формамі мужчынскага роду лічэбнікаў даволі рэдка: на оба товариша твоѧ (КІ, 50б); на оба сына твоѧ (ІІІ, 9б); Два сына гелиина оубиты (ПЦ, 12); ѡбадва херувина при обоих концехъ молитовнице (КВ, 70). Звычайна ж назоўнікі мужчынскага роду ўжываюцца пры гэтых формах у множным ліку, што адлюстроўвае ўплыў жывой мовы: оба рогы (ДП, 25), на оба боки (КВ, 73б); ѡбадва крае очищениѧ да криють (там жа, 45б).

Затое назоўнікі жаночага і ніякага роду пры адпаведных формах разглядаемых лічэбнікаў звычайна маюць формы парнага ліку: на обе стране (КВ, 53б); имеаше двѣ жене (ПЦ, 5); двѣ лѣте царствовал (ДЦ, 68б), што характэрна і для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы. Такія прыклады з'яўляюцца нормай і ў Астрожскай і чэшскай бібліях, параўн.: далъ... двѣ досцѣ (КВ, 60) — дасть двѣ досцѣ; двѣ лѣте царствовал (ДЦ, 68б) — dwie leetie kralowal. Іншы раз і пры формах парнага ліку назоўнікі жаночага і ніякага роду маюць форму множнага ліку пры перавазе форм парнага: възбрѫмѧт обѣ уши его (ПЦ, 10б).

У родна-месным склоне замест царкоўнаславянскіх форм *двою, обою* бачым старажытнарускія *дву, обу,* якія перайшлі і ў старабеларускую мову. Назоўнікі пры іх таксама часта маюць форму множнага ліку: на дв8 дощкахъ (КВ, 4б); об8дв8 навчил мудрости (там жа, 67б).

У давальна-творным склоне захаваліся традыцыйныя формы *двема, обема, обедвема.* Назоўнікі, асабліва мужчынскага роду, маюць пры іх часцей за ўсё формы множнага ліку, што, безумоўна, адлюстроўвае лёс парнага ліку ў старабеларускай мове: остала ест со двема сынома (КР, 2б); межи человекома двема (ДЗ, 47), але: со двема сынми (КР, 1б); двема п8ти (ІС, 9); подъ двема пруты (КВ, 48); со двема херувимы (КВ, 4б). Прыклады такога тыпу можна сустрэць і ў чэшскай Бібліі 1506 г.: со двѣма ослы (ДЦ, 96) — so dwiema wosly.

Для лічэбнікаў *три, четыре* характэрны толькі формы множнага ліку. У стараславянскай і старажытнарускай мовах яны мелі ў назоўным склоне родавыя адрозненні: *трье, четыре* — для мужчынскага роду і *три, четыри* — для жаночага і ніякага. У працэсе уніфікацыі форм, якая адбывалася ў жывой народнай мове таго часу, формы кожнага з адзначаных відаў пашыраліся на ўсе роды.

Былыя формы мужчынскага роду *трие, четыре,* якія ў старабеларускай пісьменнасці набылі статус кніжных, у Скарыны ўжываюцца досыць часта, прычым з назоўнікамі ўсіх трох родаў: вширь четыре локти (КВ, 68); четыре е8вангелисты (ПЦ, 2),

8слышавши трие друзи (КІ, 6б); четыре овце за едину овцу (КВ, 40б); на вси четыре страны (там жа, 70б).

Разам з тым у скарынінскіх выданнях шырока прадстаўлены і былыя формы жаночага і ніякага роду, якія сталі нормай беларускай мовы. Яны таксама праяўляюць тэндэнцыю да універсальнасці: из него же четыри части исходѧть (ІС, 60); четыри колца златы (КВ, 70); выходили суть четыре рогове (КВ, 71); были т8 три сыны (ДЦ, 69); за три месеци (КВ, 6б); вделаешь четыре круги (там жа, 45б).

У родным склоне пры адушаўлёных назоўніках і вінавальным і месным склонах выступаюць толькі новыя формы *трехъ, четырехъ,* якія пад уздзеяннем займеннага скланення праніклі сюды з меснага склону. Родны склон: ѡт трехъ безумных (ІС, 26); ѡ боѧзни трехъ речей (там жа, 42); трѣхъ речей оулѧкн8лосѧ естъ серъдце мое (там жа, 42б); вышинею четырехъ перстов (КВ, 47); вінавальны склон: на трѣхъ же другоѵъ (КІ, 38); месны склон: на четырехъ столпехъ (КІ, 50); во трех лѣтех (КВ, 14б).

Старажытныя формы, якія змяніліся ў старабеларускай мове толькі фанетычна, адзіныя ў давальным склоне. У Скарыны адсутнічае характэрны для беларускай мовы таго часу пераход *е ў о* ў канчатку: ко четырем^{s} (КВ, 70).

У творным склоне старажытны канчатак *-ми* яшчэ выступае даволі прыкметна: выписахъ ю треми обычаи (ПС, 34б); со треми тельцы (ПЦ, 6б). Аднак асноўнае месца займаюць новыя формы з канчаткам *-ма,* які ўзнік па аналогіі з *двема: трима, трѣма, четырема:* пѧть царей воевалисѧ суть съ четырма (КБ, 26б).

Лічэбнікі *пѧть — десѧть* у Скарыны захоўваюць свае ранейшыя формы, калі не лічыць асобных фанетычных змен. Так, у лічэбніках *пять, девять, десять* насавы галосны ў корані перайшоў у ротавы, што адбылося яшчэ ў дапісьмовы перыяд. У адрозненне ад усходнеславянскіх моў лічэбнік *седмъ* выступае з няспрошчаным спалучэннем зычных, канцавы губны ў лічэбніках *седмъ, осемъ* падвергся зацвярдзенню. Лічэбнік *осемъ* у адпаведнасці з нормай царкоўнаславянскай і старажытнарускай моў выступае без прыстаўнога *в,* як і ў беларускай мове, аднак сустракаюцца і выпадкі захавання этымалагічнай мяккасці губнога. Як і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове, лічэбнікі *девять, десять* могуць выступаць з асновамі *девет-, десет-,* дзе літару *е* варта разглядаць як ускоснае адлюстраванне якання. Назоўны і вінавальны склоны: за седмь дневъ (ІС, 35б); царствовал естъ седмъ лѣтъ (ДЦ, 74б); буди лѣтъ десеть (ІС, 66б); десеть крат срамотили (КІ, 24); будѣть посполу дощек осмъ (КВ, 49б). У «Астрожскай бібліі» лічэбнікі *седмь, осемь* у адрозненне ад выданняў Скарыны ўжываюцца толькі з мяккім канцавым губным асновы, параўн.: Седмъ дней да будеть (КВ, 42) — седмь дній да бѣдет. Ужыванне варыянтаў з цвёрдым губным, акрамя жывой мовы, магло падтрымлівацца і з боку чэшскай Бібліі,

параўн.: царствовал естъ седмъ лѣтъ (ДЦ, 74б) — kralowal gest... sedm let.

У праславянскай мове лічэбнікі *пять — девять* скланяліся ва ўсіх трох ліках па тыпу назоўнікаў адзіночнага ліку з асновай на *і, а *десять* — па тыпу назоўнікаў з асновай на зычныя. Але ўжо ў старажытнарускай мове ў выніку уніфікацыі лічэбнік *десять* стаў скланяцца, як і астатнія лічэбнікі гэтай групы.

У родным, давальным і месным склонах разглядаемыя лічэбнікі захоўваюць у творах Ф. Скарыны свой ранейшы канчатак *-и:* въ пѧти лѣтехъ (ДЦ, 73); Въ шести смȣткох (КІ, 10); всехъ шести прутовъ (КВ, 70б); ѡ девѧти речахъ (ІС, 40б); паче десѧти кнѧзей (ЕК, 11б). Ужыванне варыянтаў з асновамі *пет-, девет-, десет-* магло мець падтрымку і з боку чэшскай Бібліі, параўн.: въ пѧти лѣтехъ (ДЦ, 73) — w pieti letech.

Лічэбнікі *одиннадцать — девятнадцать, двадцать, тридцать* аб'ядноўваюцца агульнасцю склонавых канчаткаў. У стараславянскай і старажытнарускай мовах гэтыя лічэбнікі ўяўлялі сабой сінтаксічныя спалучэнні: да назвы адзінак у назоўным склоне пры дапамозе прыназоўніка *на* далучалася форма меснага склону лічэбніка *десять.* Але яшчэ ў старажытнарускай мове ўказаныя спалучэнні пачалі пераходзіць у зрашчэнні. Гэты працэс завяршыўся ў старабеларускай мове.

Адно слова ўяўляе сабой кожны з разглядаемых лічэбнікаў і ў выданнях Ф. Скарыны. Акрамя таго, другая частка, як і ў старабеларускай мове, з'яўляецца ўжо формай не меснага склону адзіночнага ліку лічэбніка *десять,* а назоўнага. Яркай прыкметай злітнасці гэтых лікавых назваў з'яўляецца адпаведнасць склонавых форм назоўнікаў не першай, а другой частцы лічэбнікаў *одинадцать — шестнадцать:* наделаешъ и гуней с шеръстей козих ѡдиннадесеть (КВ, 48); выступили суть дванадесет мужей (ДЦ, 69); бѧше тȣ дванадесеть источникъ водъ (КВ, 30б); четыринадесеть тысещей (КІ, 51); опоны имеюще локот пѧтнадесеть (КВ, 51б); шестьнадесеть прорковъ (ІС, 3).

Прыклады скланення толькі першай часткі ў адпаведнасці з архаічнай традыцыяй сустракаюцца даволі рэдка: днѧ пѧтогонадесеть (КС, 48). Часцей за ўсё пад уплывам жывой народнай мовы змяняюцца абедзве часткі: о двунадесѧти прорцехъ (ІС, 77б); двȣнадесѧти пророковъ кости (ІС, 78); Иѡсифъ бѧше шестинадесети лѣтъ (КБ, 67б); двеманадесѧте коленома (ПЦ, 2б). Зрэдку сустракаюцца і навейшыя формы са змяненнем толькі апошняй часткі: пѧтнадесети локотъ были опоны (КВ, 71б).

Састаўнымі ў царкоўнаславянскай і старажытнарускай мовах былі і лічэбнікі *двадцать — тридцать.* Першая частка іх уяўляла сабой назвы адзінак, якія паказваюць колькасць дзесяткаў, у назоўным склоне, другая — слова *десять* у назоўным склоне парнага або множнага ліку. Першая частка дапасоўвалася па форме да другой. Пазней другая частка пачала ўжывацца ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку або роднага склону

множнага ліку. Менавіта такія формы пераважаюць у назоўным і вінавальным склонах у выданнях Скарыны: было двадесеть талѣнтъ (КВ, 72б); двадесеть и осмъ локотъ (там жа, 48); тридесѧть и полъчетверта лета (ПП, 2).

Характэрнай рысай мовы вывучаемых тэкстаў з'яўляецца тое, што ўласцівыя беларускай мове формы на *-дцать* па пашыранасці значна ўступаюць папярэднім: двадцеть будеть ко стране полуденной (КВ, 49); стерегли были двадцеть дней (КЮ, 11б); было ест моисеови сто и двадцеть лѣтъ (ДЗ, 65б). Такія формы маглі мець падтрымку ва ўжыванні і з боку чэшскай Біблії, параўн.: без одного двадцети (ДЦ, 70) — bez gednoho dwadczeti; въ тридцети лѣтех (ДЦ, 74б) — we trzydczeti letech.

Лічэбнікі *четыридесять — восемьдесять* (старажытнаруская форма *сорокъ* у выданнях Скарыны не адзначана), як і ў беларускай мове, уяўляюць сабой складаныя словы, якія захавалі прыкметы ранейшых словазлучэнняў назваў адзінак з формай роднага склону множнага ліку слова *десять*. Назоўны і вінавальны склоны: взыйди к богу ты... и седмъдесѧт старейшинъ (КВ, 44); талѣнтовъ седмъдесѧтъ и два тысеща (там жа, 72б); был гелий деветьдесѧтъ и осмъ лѣтъ (ПЦ, 12); той судилъ людей ізраилевыхъ четыредесѧтъ лѣтъ (там жа, 12б). Часам сустракаюцца старажытнарускія формы ўскосных склонаў са змяненнем толькі першай часткі, што натуральна, улічваючы складаны характар мовы Скарыны: ѯ восмидесѧт и во трех лѣтех (КВ, 14б). Разам з тым выступаюць і новыя, уласцівыя жывой беларускай мове формы са змяненнем абедзвюх частак: были опоны пѧтидесѧти локтей (КВ, 71б); ѯ восмидесѧти лѣтех (там жа, 14б). Як і ў старабеларускай мове, у Скарыны сустракаюцца і формы са змяненнем толькі апошняй часткі: по петдесѧти (КВ, 68б).

Назвы соцень, як і дзесяткаў, утвараліся ў старажытнарускай мове шляхам спалучэння назваў адзінак, якія паказвалі колькасць соцень, і слова *сто* ў назоўным склоне парнага або множнага ліку або ў родным склоне множнага ліку. Лічэбнік *сто*, па паходжанню лічбавы назоўнік, яшчэ сустракаецца ў формах ускосных склонаў: родилъ кто сто сыновъ (ЕК, 10); опоны будуть ста локотъ (КВ, 51); слюбилъ стом (ДЦ, 71);

У назоўным і вінавальным склонах астатнія лічэбнікі гэтай групы выступаюць у сваіх зыходных формах: у лічэбніку *двесте* другая частка мае форму парнага ліку, у лічэбніках *пятьсотъ — девятьсот* — роднага склону множнага ліку: двесте четырдесѧть и осмъ (КІ, 51б); были съ авенеромъ триста и шестьдесѧтъ (ДЦ, 70); четыреста осмъдесѧт и четыре лѣта (ПЦ, 4); воловъ пѧтсотъ (КІ, 4б); шестьсотъ тысещей людей пеших (ІС, 26б); седмъсотъ и тридесеть сиклевъ (КВ, 72б).

Ва ўскосных склонах другая частка, як і ў беларускай мове, захоўвае старажытную форму — *сотъ:* с тысещи пакъ и с седмисотъ (КВ, 72); ѡт числа людей шестисотъ тысещей пеших (ІС, 74); ѡт пѧтисотъ и ѡт пѧтидесѧтъ воинъ (КВ, 72б).

Для абазначэння ліку 1000 у Скарыны служыць назоўнік агульнаславянскага паходжання *тысеща,* у адрозненне ад старабеларускай мовы, з царкоўнаславянскім рэфлексам праславянскага *tj*: тысеща сыновъ злыхъ (ІС, 26); нежели тысеща скарбовъ (там жа, 66б); с8пруговъ воловˢ тысеща (КІ, 51). Паколькі назоўнік *тысеща* мае форму асноў на **а*, то і скланяецца ён па ўзору гэтых назоўнікаў: ѡт трехъ тысещей (КВ, 72б); в десети тысещахъ (ІС, 75). Царкоўнаславянскі варыянт лічэбніка *тысеща* паслядоўна ўжываецца ў Скарыны, нягледзячы на тое, што новыя варыянты з пазнейшым рэфлексам праславянскага *tj* уласцівы і мове чэшскай Біблії; zmordowano gest z lidu yzrahelskeho trzydczeti tisiczuow, па cztyrzy tisycze. Паколькі ў чэшскай мове слова tisycza скланяецца, як назоўнік мужчынскага роду асноў на *и*, то формы такога скланення пад уплывам чэшскай Біблії ўжываюцца часам і ў Скарыны: два тысеща лѣтъ (ЕК, 10); талѣнтовъ седмъдесѧтъ и два тысеща (КВ, 72). Параўн. у чэшскай Біблії: zmordowano gest z lidu yzrahelskeho trzydczeti tisyczuow; trzidczeti tisyczuow.

Як і ў старажытнарускай і старабеларускай мовах, у Скарыны лічэбнікі, якія складаюцца з адзінак, дзесяткаў і соцень, выражаюцца спалучэннем незалежных кампанентаў, звязаных злучнікам *и*. Як правіла, спачатку ідуць большыя лікі, потым меншыя: были съ Авенеромъ триста и шестьдесѧтъ (ДЦ, 70); С тысещи пакъ и с седмисотъ и с седмидесѧти и пѧти сиклѣв (КВ, 72); 8 восмидесѧт и во трех лѣтех (КВ, 14б); едина опона имела вдолжъ Двадесетъ и осмъ лакотъ (там жа, 68); Лѣтъ двѣсте и деветь (ІС, 3б); Сии же седмъдесѧтъ и два оучителѧ (там жа, 3).

Незалежнасць кампанентаў састаўных лічэбнікаў можа прыводзіць да паўтарэння пры кожным кампаненце разам са злучнікам і прыназоўніка, які стаіць перад лічэбнікам: ѡт пѧтисотъ и ѡт пѧтидесѧтъ воинъ (КВ, 72б).

Злучэнне кампанентаў пры дапамозе злучнікаў з'яўляецца нормай у Астрожскай і чэшскай Бібліях, параўн.: были съ Авенеромъ триста и шестьдесѧтъ — (ДЦ, 70) — byli s abnerem trzysta a ssedesat; Седмъсотъ и тридесеть Сиклевъ (КВ, 72б) — седмь сотъ и К сиклевъ. Такія прыклады сведчаць аб тым, што пад уплывам жывой мовы злучнік *и* ў састаўных лічэбніках часам можа апускацца. Гэта гаворыць аб тэндэнцыі да больш цеснага аб'яднання кампанентаў: Сто тридесеть и седмъ (КВ, 13б), Четыреста осмъдесѧт и четыре лѣта (ПЦ, 4).

У Ф. Скарыны сустракаюцца прыклады апісальнага абазначэння складанага ліку па спосабу аднімання. Ужыванне такіх спалучэнняў магло мець падтрымку і з боку мовы чэшскай Біблії, параўн.: без одного двадцети (ДЦ, 70) — bez gednoho dwadczeti.

З б о р н ы я л і ч э б н і к і абазначаюць колькасць прадметаў як сукупнасць. Яшчэ ў старажытнарускую эпоху пачалася

страта імі родавых адрозненняў і форм скланення ў адзіночным ліку. Паколькі Ф. Скарына пры падрыхтоўцы свайго перакладу «Бібліі» ў значнай ступені арыентаваўся на нормы беларускай мовы свайго часу, гэтыя змены знайшлі адлюстраванне і ў мове яго выданняў.

У назоўным склоне адзіночнага ліку агульнымі формамі для ўсіх трох родаў зборных лічэбнікаў, якія адпавядалі колькасным *два, три,* з'яўляюцца, як і ў беларускай мове, формы ніякага роду: обое тое милость мудрости (ІС, 65б); гневъ и ꙗрость обое суть мерзка (ІС, 45); всех речей еже беша Иовови толико двое (КІ, 51). Аднак разам з тым сустракаюцца і іншыя формы ліку і роду: двои речи тайного повѣданиѧ (ІС, 67б); двой народовъ (там жа, 37б).

Зборныя лічэбнікі, якія адпавядаюць колькасным ад *чатырох* і далей, утвараюцца ў залежнасці ад націску пры дапамозе суфікса *-ор-* або *-ер-*. Выяўлены ўсе склонавыя формы разглядаемых лічэбнікаў адзіночнага і парнага ліку. Прычым па традыцыі яны выконваюць ролю азначэння, дапасоўваючыся да назоўнікаў у родзе, ліку і склоне. Акрамя таго, як і ў старабеларускай мове, разглядаемыя лічэбнікі могуць спалучацца і з назоўнікамі, якім не ўласціва значэнне зборнасці: былъ вожемъ обоего часѫ (КВ, 27); конець обою их (ЕК, 2б); обоемѫ семѫ чѧдеси оуверили (КВ, 10); со троимъ знаменемъ (там жа, 9б); на обоемъ боку (там жа, 70б); пѧтеры книги Моісеовы (ПЦ, 2); седмеро то прийдет (ІС, 65); Десѧтеро приказаниемъ далъ (КВ, 2).

Як і ў старабеларускай мове таго часу, у выданнях Скарыны шырока ўжываюцца і новыя спалучэнні зборных лічэбнікаў з назоўнікамі ў форме множнага ліку. У назоўным і вінавальным склонах гэтыя лічэбнікі ўжо не дапасоўваюцца да назоўніка, як у прыкладах, прыведзеных вышэй, а кіруюць ім: принесоша... дванадесѧтеро телцевъ (КВ, 44—44б); ко судъѧмъ прѧ обоихъ (там жа, 41); о двоих людехъ (ІС, 42); на обоих подвоехъ (КВ, 23); судѧще обемонадесетема коленом Ізраилевым (ДЗ, 4б).

Яшчэ ў агульнаславянскай мове існаваў асобны разрад п а р а д к а в ы х лічэбнікаў, якія абазначалі парадак прадметаў пры лічэнні. Яны нічым не адрозніваліся ад адносных прыметнікаў, у прыватнасці дапасоўваліся да назоўнікаў і маглі мець іменную і членную формы, выступалі ў ролі азначэння. Утварэнне гэтых лічэбнікаў у выданнях Скарыны, як і ў царкоўнаславянскай мове старажытнарускай рэдакцыі, адбываецца шляхам далучэння прыметнікавага канчатка непасрэдна да асновы колькаснага лічэбніка.

Парадкавы лічэбнік *первый* амаль заўсёды ўтвараецца ад асновы *перв-*, што адпавядала норме царкоўнаславянскай мовы і было характэрна ў пэўнай ступені і для старабеларускай: первѧ ꙗзва (КВ, 1б); 8 первыхъ книгахъ (ЕК, 1б); при первомъ цвету (КІ, 21б); Первое ѳбо естъ слово того, онъ же любить наѳку (ІС, 52). Разам з тым сустракаецца і парадкавы лічэбнік, утво-

раны пры дапамозе суфікса вышэйшай ступені *-ш-*, што з'яўляецца вынікам польскага ўплыву. У мову Скарыны ён мог трапіць праз пасрэдніцтва беларускай мовы, дзе пачаў ужывацца з XV ст.: знамена первшего (КВ, 9б).

Парадкавы лічэбнік, які адпавядаў колькаснаму *два,* у старажытнарускай мове ўтвараўся ад дзвюх суплетыўных асноў — *втор-* і *друг-*. Абодва варыянты ўжываліся і ў старабеларускай мове. Нічым не адрозніваецца ў гэтых адносінах і мова выданняў Скарыны: втораго пакъ породила (КВ, 7б); вторые книгы написал естъ (ЕК, 1б); ѡн же былъ ест вторый царь во Египте (ІС, 2б); хвалить... другый др8гое (ЕК, 2б); на пруте другом (КВ, 70б). Абодва адзначаныя дэрываты выкарыстоўваюцца і ў «Астрожскай біблії»: хер8вим др8гій; има вторѣи Фенана; на камени др8гомъ. Для чэшскай Біблії 1506 г. характэрны толькі лічэбнік, утвораны ад асновы druh-: druha Fenenna; když bylo druheho dne; a druzy s druhee.

Выданням Скарыны ўласцівы агульнаславянскія парадкавыя лічэбнікі, якія адпавядаюць колькасным *три, четыре,* утвораныя не ад асноў колькасных, а ад іх іменных форм: о третей, она же наводить гневъ (ІС, 42); ѩзыкъ третий многыхъ естъ поздвигъ (там жа, 46); Третии и четвертыи книги (ПЦ, 2б); Четвертыи писма ѡт милосѣрднаго (там жа, 2б); Четвертое лице мое оустрашилоса естъ (ІС, 42б).

Парадкавыя лічэбнікі, якія адпавядаюць колькасным *пять — десять,* у агульнаславянскай мове ўтвараюцца шляхам далучэння прыметнікавага канчатка да асновы колькаснага: Иовъ былъ пѧтый (КІ, 3); збирали манн8 в меру шестого пакъ дна (КВ, 30б); во седмый день (там жа, 66); во осмое и во тридеса тое лето (ІС, 2); деса тую часть крупъ (КВ, 57).

Паколькі ў вывучаемых тэкстах для абазначэння лікаў *одиннадцать — девятнадцать* ужываюцца традыцыйныя ўтварэнні пры дапамозе фарманта *надесеть,* то тут маюць месца і парадкавыя лічэбнікі, утвораныя ад іх асноў пры дапамозе прыметнікавага канчатка: дна пѧтого надесеть (КС, 48); пѧтнадеса тый стан (КЛ, 3); четыренадеса того дна (КВ, 23б). Па традыцыі ў іх можа змяняцца толькі першая частка як вынік яе ранейшай самастойнасці: Лета... тысещного пѧтсотого и седмагонадеса т (ІС, 81б).

Парадкавыя лічэбнікі ад колькасных са значэннем дзесяткаў і соцень у агульнаславянскай мове ўтварыліся пры дапамозе суфікса *-ьн-* у другой частцы і без суфікса, хоць гэта не заўсёды паслядоўна вытрымліваецца пры ўтварэнні нават аднаго і таго ж лічэбніка: Лета... тысещного пѧтсотого и седмагонадеса т (ІС, 81б); по нарожению нашего спасителя лѣта четырьсотого двадеса тъ и девѧтого (ІС, 3б); Тысещнаго пѧтсотнаго и осм на деса таго (ЕК, 18); ѡт четырдеса тъ четвертое главы (ІС, 4б).

У якасці назваў частак цэлага ў праславянскай мове выкарыстоўваліся словы, асновы якіх не былі звязаны з лічэбніка-

вымі каранямі. Дробавыя лічэбнікі былі або бессуфіксальнымі, або ўтворанымі пры дапамозе суфікса *-ина: третина, четвьртина* і г. д. Яны былі ўнаследаваны старажытнарускай мовай амаль у нязменным выглядзе. Названыя тыпы дробавых лічэбнікаў адзначаны і ў Ф. Скарыны: вширь локоть и полъ (КВ, 49); ѕбиють з насъ третину або половину (ДЦ, 100б).

Для абазначэння цэлага з палавінай ужываліся словы *полвтора, полтретя, полчетверта;* полутору локтей во вышиню (КВ, 70); тридесѧть и полъчетверта лета (ПП, 2); должинѧ была полтретѧ локтѧ (КВ, 69б); полутретѧ локтѧ (там жа, 70).

Дробавыя лікі маглі выражацца і словазлучэннем, якое складаецца з парадкавага лічэбніка і назоўніка *долѧ:* десѧтую долю ѡтделилъ (ДЗ, 31). Амаль нічым не адрозніваецца ў гэтых адносінах і «Астрожская біблія», параўн.: вширь локоть и полъ (КВ, 49) — лакти же единаго и полъ.

Усе адзначаныя спосабы абазначэння дробавых лікаў былі ўласцівы і старабеларускай мове. Такім чынам, сістэма форм лічэбніка ў выданнях Скарыны адлюстроўвае агульную асаблівасць іх мовы — царкоўнаславянска-беларускі сінкрэтызм.

ДЗЕЯСЛОЎ

У выданнях Скарыны сярод знамянальных часцін мовы — назоўніка, прыметніка, займенніка, лічэбніка, дзеяслова і прыслоўя — дзеяслоўныя формы займаюць першае месца па колькасці і разнастайнасці формаўжыванняў. Гэта тлумачыцца асаблівасцямі біблейскага тэксту, дзе галоўнае месца займае апісанне разнастайных падзей у выглядзе канкрэтных дзеянняў, а эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць, сродкамі выражэння якіх звычайна служаць прыметнікі і прыслоўі, зведзены да мінімуму. Калі не прымаць пад увагу шматлікія ўласныя імёны і геаграфічныя назвы, то агульная лексіка ў перакладах Скарыны размяркоўваецца прыкладна наступным чынам: дзеясловы — 35,4 %, назоўнікі — 26,3, займеннікі — 25,2, прыслоўі — 6,7, прыметнікі — 4,9, лічэбнікі — 1,4 %.

Перакладзеныя Скарынам біблейскія тэксты практычна змяшчаюць усе асноўныя дзеяслоўныя катэгорыі і адпаведна з гэтым усю разнастайнасць граматычных сродкаў іх выражэння. У гэтых адносінах асабліва вылучаюцца кнігі «Быццё», «Царствы», «Руф», «Юдзіф» і інш., дзе асноўны апавядальны выклад уключае і аўтарскую мову і мову персанажаў у выглядзе шматлікіх дыялогаў. Некаторыя біблейскія кнігі дзякуючы свайму зместу вылучаюцца ўжываннем пераважна адных якіх-небудзь дзеяслоўных форм. Напрыклад, у кнізе «Ісус Сірахаў» пераважаюць формы загаднага ладу, бо тут змешчаны разнастайныя настаўленні і павучанні маральна-этычнага і практычна-бытавога характару. Запаведзі Маісея ў кнізе «Другі закон» выражаюцца галоўным чынам формамі будучага часу, чым дасягаецца большая катэгарычнасць і абавязковасць выканання дзеяння. У «Прытчах Саламона» пераважаюць формы цяперашняга часу.

У сістэме дзеяслова скарынінскіх перакладаў у адрозненне ад іншых часцін мовы асабліва выразна відаць суіснаванне розных стыхій — мясцовай беларускай і іншамоўных — царкоўнаславянскай, чэшскай і польскай. Таму ўдзельная вага некаторых з іх у многіх выпадках ілюструецца статыстычнымі данымі.

Формы цяперашняга часу па сваіх канчатках цалкам супадаюць з формамі будучага простага часу, таму іх мэтазгодна разглядаць разам. На працягу гісторыі беларускай мовы ў парадыгме цяперашняга-будучага часу адны кампаненты зазналі значныя змены, што адпаведна адбілася і на гэтых формах у выданнях Скарыны, другія аказаліся больш устойлівымі і захаваліся без істотных марфалагічных змен да нашага часу.

У выданнях Скарыны, як і ў царкоўнаславянскіх і беларускіх помніках таго часу, формы 1-й асобы адзіночнага ліку тэматычных дзеясловаў паслядоўна ўжываюцца з канчаткам *-у*, які ў залежнасці ад характару асновы выступае ў арфаграфічных варыянтах *-у* або *-ю: буду, вижу, вниду, возглаголю, возмогу, вчиню, знаю, люблю, навращусѧ, наделаю, оставлю, погублю, пойду, покажу, положу, пошлю, прославлю, скажу, слышу, ѕмру* і інш. У кантэксце біблейскага выкладу дыялагічная мова наогул займае значнае месца, таму формы 1-й асобы адзіночнага ліку ўжываюцца тут вельмі часта: по пути по нем же паки не навращусѧ хождю (КІ, 22б); Азъ любѧщих мѧ люблю (ПС, 15); знаю иже красна еси жена (КБ, 24б); По путехъ справедливыхъ хождy и посрѣди стезъ судовъ живу (ПС, 15); с вами самими заветъ сей завещаю, и клѧтвѕ сию ѕтвержаю (ДЗ, 75б); гласъ поющихъ азъ слышу (КВ, 61б).

Поўнае флексійнае супадзенне гэтых форм у беларускай і царкоўнаславянскай мовах робіць іх нейтральнымі як паказчыкаў суадносін беларускіх і царкоўнаславянскіх рыс у выданнях Скарыны.

У адрозненне ад гэтага стракаты малюнак маюць формы 2-й асобы адзіночнага ліку, дзе суіснуюць варыянтныя канчаткі *-ши* і *-шъ*. Адносна канчатка *-ши* існуе меркаванне, што ён ужо не быў уласцівы народнай старажытнарускай мове, а наяўнасць яго ў пісьмовых помніках старажытнарускага перыяду кваліфікуецца як царкоўнаславянізм. Царкоўнаславянскія тэксты ўсходнеславянскай рэдакцыі наогул не ведаюць канчатка *-шъ*. У беларускіх помніках часоў Скарыны канчатак *-ши* зрэдку трапляецца ў тэкстах рэлігійнага зместу, тады як канчатак *-шъ* выступае пануючым у помніках розных жанраў XV—XVII стст. Таму ў дачыненні да выданняў Скарыны ёсць усе падставы ўжыванне канчатка *-ши* разглядаць як свядомую даніну царкоўнаславянскай традыцыі. Формы на *-ши* ў кнігах Скарыны прыкметна пераважаюць над утварэннямі на *-шъ*: у прадмовах яны складаюць 65,4 %, а ў біблейскіх тэкстах — 67 %. Іх узорам з'яўляюцца ўтварэнні тыпу *биеши, вопиши, видиши, глаголѣши, даеши, живеши, идеши, лежиши, любиши, молвиши, стрѣжеши, хощеши, храниши, чиниши* і інш.: Любиши ненавидѧщих тебе, и ненавидиши любѧщихъ тѧ (ДЦ, 103); повѣдь ми чего жадаеши (ТЦ, 125); С ложа того на нем^{s} лежиши, не сниидеши но ѕмреши

(ЧЦ, 184б); ѡткуду идеши и камо хощеши ити (КЮ, 17); да поразумееши всимъ речемъ еже чиниши (КБ, 5б); почто биеши ближнего своего (КВ, 7).

Разам з гэтым такія ж дзеясловы ўжываюцца і з канчаткам *-шъ* (арфаграфічна *-шъ, -шь* і *-ш*^{s}), які мае значэнне варыянтнай нормы (у прадмовах — 34,6 %, у біблейскіх тэкстах — 33 %): *даешъ, знаешъ, идешъ, можешъ, хощешъ, чинишъ* і г. д.: Помилуешь всехъ ꙗко все можешъ, и презираешъ грехи людъскиѧ (ПБ, 17б); ѡтк8д8 есь и камо идешъ (ПЦ, 62); да разумееш ъ что 8делати имашъ ему (ТЦ, 124б); прочто такъ худеешъ (ДЦ, 88); ты пакъ знаешъ сл8жб8 мою (КБ, 55); Тогда возмешъ шило и прободеш^{s} 8хо его (ДЗ, 33).

Адзначана некалькі выпадкаў, дзе замест канцавога *-шъ* надрукавана *-жъ:* что можежъ имети (ПЦ, 46); считати будежъ всехъ сыновъ Ізраилевыхъ (КВ, 58). Такія гіпернармалізаваныя напісанні служаць пераканаўчым доказам аглушэння звонкіх зычных у беларускай мове часоў Скарыны. Разам з тым гэтыя выпадкі ў пэўнай меры праліваюць святло на нацыянальнае паходжанне наборшчыкаў, якія працавалі ў друкарні Скарыны: такія памылкі друку хутчэй за ўсё мог дапусціць беларус, у мове якога звонкія зычныя ў пэўных пазіцыях вымаўляліся глуха.

Вельмі часта ў выданнях Скарыны формы 2-й асобы адзіночнага ліку з канчаткамі *-ши* і *-шъ* ужываюцца паралельна ў адных і тых жа сказах: ѡт злого ꙗзыка сокриешисѧ, и не будешь боѧтисѧ беды (КІ, 10); Будеш^{s} ли м8дрыи самъ собѣ будешъ, аще ли же посмевачъ будеши самъ теже понесеши злаѧ (ПС, 16б); б8деши ли богатъ не будешъ безъ греха (ІС, 20); Чему плачешь и прочто не ꙗси, и чем8 смутиши серце свое (ПЦ, 5б); ты даеши отомщение мнѣ, и повинуешъ люди под^{s} мѧ (ДЦ, 112); Чего хощеши Есѳръ и что жадаешь да дамъ тобѣ (КЕ, 10б). Тут, як і ў многіх іншых выпадках, праяўляецца своеасаблівая марфалагічная дысіміляцыя — імкненне пазбегнуць аднастайных граматычных сродкаў з мэтай зрабіць выклад больш гнуткім і рытмічным.

Формы 2-й асобы адзіночнага ліку ў біблейскіх тэкстах наогул выкарыстоўваюцца нераўнамерна. Іх параўнальна мала ў кнігах апавядальнага зместу, дзе пераважаюць разнастайныя формы прошлага часу. Затое іх вельмі многа ў такіх кнігах, як ДЗ, КБ, КВ, КЛ, ЛК і ПС. Напрыклад, у ДЗ, КБ і КВ усяго ўжыта 482 формы на *-ши* і 204 — на *-шъ* (адпаведна 70,4 і 29,6 %). Але і тут яны размяркоўваюцца неаднолькава: КБ — 145 і 37 (79,7 і 20,3 %), ДЗ — 122 і 44 (73,5 і 26,5 %); КВ — 215 і 123 (63,6 і 36,4 %). Тут змешчаны разнастайныя настаўленні аб выкананні рэлігійных рытуалаў, выкладаюцца нормы паводзін людзей, маральна-этычныя павучанні і г. д. У такіх кантэкстах, як відаць з прыведзеных вышэй прыкладаў, формы цяперашняга-будучага часу фактычна выражаюць у больш катэгарычнай форме розныя адценні загаду і граматычна маюць значэнне форм загаднага ладу.

Формы 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга-будучага часу абодвух спражэнняў у выданнях Скарыны паслядоўна ўжываюцца з канчаткам *-т*, які мае рознае арфаграфічнае афармленне: *-ть, -т^{s}, -т*. Найбольш часта ўжываюцца формы з канчаткам *-ть: береть, будеть, возметь, возможеть, вознесеть, востанеть, впадеть, вредить, говорить, губить, едеть, живеть, завидить, заградить, злоречеть, знаидеть, идеть, можеть, ненавидить, оставить, отпустить, пишеть, плачеть, пожреть, претерпить, речеть, скажеть, смееть, стоить, ѕбиеть, ѕмреть, ходить, хранить, чтить* і інш.: богъ кого караеть ѕчить и милуеть (КІ, 39); Кто самъ собѣ завидить не можеть быти горѣе сего (ІС, 24); Кто хранить смокву сеи ести будеть ѡ*т* овощу е҃а (ПС, 41б); Кто много говорить вредить душу свою (ІС, 32); Кто иному ставить сило, той самъ в немъ загинеть (ІС, 45); Се той стоить за стеною нашею, смотрить про окно, выгледаеть скрозе крату (ПП, 4б); Царь плачеть и жалуеть сына своего Авесалома (ДЦ, 102б); глава ми болить, болить ми глава (ЧЦ, 191).

Другое месца па колькасці прыкладаў займаюць формы, дзе пасля канцавога *-т* стаіць значок ^{s}: *будет^{s}, видит^{s}, глаголет^{s}, живет^{s}, копает^{s}, посквернит^{s}, принесет^{s}, судит^{s}, терпит^{s}, ѕбиет^{s}, ѕдавит^{s}, ѕмрет^{s}, чинит^{s}* і інш.: чи ричит^{s} лось егда имат^{s} траву (КІ, 10б); никто же оуслышит^{s} м҃а (КІ, 24б); Высвободь того он^{s} же кривду терпит^{s} (ІС, 9б); Жени*х* самъ къ собѣ глаголет^{s} (ПП, 6); си҃а рада видит^{s} ми с҃а права҃а быти (ДЦ, 98б); Сице глаголет^{s} братъ твои҆ ѡковъ (КБ, 59б); Никто же возможет^{s} супротивитис҃а вамъ (ДЗ, 20).

У такіх напісаннях таксама трэба бачыць мяккі канчатак *-ть*. На гэта ўказваюць шматлікія выпадкі, калі абодва варыянты — формы з *-ть* і *-т^{s}* — ужываюцца побач у адных і тых жа сказах: онъ бо аще ли ранит^{s} и злечить (КІ, 10); Кто под^{s} другомъ копает^{s} ѧму впадеть самъ в ню (ПС, 40б); Кто чтить ѡтца своего сеи҆ долговечен будет^{s} (ІС, 8); той ѕзрить и судит^{s} прю мою (ПЦ, 52); кто смееть рещи чему тако чинит^{s} (ДЦ, 97); кажный он^{s} же знайдеть мене ѕбиет^{s} м҃а (КБ, 14). У многіх іншых словах, дзе канцавое *т* вымаўлялася, несумненна, мякка, у Скарыны гэтая мяккасць таксама абазначаецца значком ^{s}: быст^{s}, гортан^{s}, днес^{s}, памет^{s}, плот^{s}, похот^{s} і г. д.

Нарэшце, невялікі разрад утвараюць формы, дзе канцавое *-т* выносіцца над радком: впада*ет*, лютуе*т*, налие*т*, опустее*т*, открыва*ет*, слѕха*ет*, ѕбива*ет*. Тут таксама выступае мяккі канчатак *-ть*, бо формы з вынасным *-т* часта ўжываюцца побач з варыянтамі без вынасу канчатка над радком: Мѕжа безумнаго ѕбивает гневъ, и маленького оумор҃аеть зависть (КІ, 9); Кто лютует дѕбца ненавидить сына своего (ПС, 22); Кто копаеть ѧму впадает в ню (ІС, 45); Родъ поминѕеть и род^{s} иный наставает, земл҃а же во вѣки стоить (ЕК, 3б).

Наяўнасць мяккага канчатка *-ть* у формах 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга-будучага часу на першы погляд быццам бы

дае падставу бачыць у гэтай з'яве адну з найбольш яркіх рыс беларускай мовы, якія атрымалі адлюстраванне ў выданнях Скарыны. Аднак гэта з'ява патрабуе асобнага тлумачэння. Мяккі канчатак *-ть* быў адзіным у старажытнарускай мове, ён захоўваецца да нашага часу ў многіх славянскіх мовах, у тым ліку ў беларускай, украінскай і паўднёвавелікарускіх гаворках рускай мовы. Старажытнарускія кніжнікі пры перапісцы тэкстаў паўднёваславянскага паходжання паслядоўна замянялі цвёрды канчатак *-тъ* мяккім канчаткам *-ть*, што назіраецца ўжо ў Астраміравым евангеллі 1056—1057 гг. Мяккі канчатак *-ть* быў асноўнай нормай царкоўнаславянскай пісьменнасці ўсходнеславянскай рэдакцыі аж да з'яўлення друкаваных кніг. У царкоўнаславянскіх выданнях Скарыны — «Псалтыры», «Малой падарожнай кніжцы» і «Апостале» — таксама па традыцыі ўжываецца толькі мяккі канчатак *-ть*. Такі ж канчатак яшчэ паслядоўна захоўваецца ў царкоўнаславянскім тэксце Евангелля В. Цяпінскага, выдадзенага каля 1580 г., дзе звычайнымі выступаюць формы тыпу *будеть, возлюбить, идеть, лежить, можеть, просить, речеть, творить* у адзіночным ліку і *будуть, видѧть, жнуть, ищуть, любѧть, рекуть, судѧть* — у множным. Таму гэта рыса таксама не можа служыць паказчыкам суадносін беларускіх і царкоўнаславянскіх сродкаў у выданнях Скарыны.

Ва ўсіх кнігах Скарыны адзначана толькі некалькі выпадкаў ужывання форм 3-й асобы адзіночнага ліку I спражэння без канцавога *-ть:* Кто ю знайдеть, сей знайде млсть (ПС, 3б); ты еси самъ великий, и преꙗсный в силе своей, еꙗ никто не може одолѣти (КЮ, 25); Да не пойме сын^{s} жены ѡтца своего (ДЗ, 44).

Зваротныя дзеясловы ў форме 3-й асобы адзіночнага ліку афармляюцца па марфалагічнаму прынцыпу з канчаткамі *-тсѧ* або *-т^{s}сѧ:* не доткнетсѧ тебе злое (КІ, 10): ȣ воде ȣказуетсѧ лице гледѧщих в ню (ПС, 41б); в людехъ неверныхъ разгоритсѧ гневъ (ІС, 26); Делит^{s}сѧ же сиѧ книга на главы (КІ, 2б); он^{s} же трудитсѧ подъ слн҃цемъ (ЕК, 3б); се Давыд^{s} крыетсѧ в насъ (ПЦ, 50); племѧ его ȣмножит^{s}сѧ в народы (КБ, 90). Адзіны прыклад Онъ же ко гробомъ приведет^{s}ца (КІ, 27б) з набліжэннем да фанетычнага прынцыпу напісання ўказвае на фактычнае вымаўленне форм гэтага тыпу ў тагачаснай беларускай мове.

Трыма варыянтамі прадстаўлены канчаткі 1-й асобы множнага ліку цяперашняга-будучага часу: *-мъ, -мы* і *-мо.* Аднак выявіць якія-небудзь заканамернасці іх ужывання практычна няма магчымасці. Можна толькі адзначыць, што формы на *-мъ* у колькасных адносінах пераважаюць над іншымі варыянтамі. Пашыранасць іх знаходзіць сваё тлумачэнне ў тым, што яны былі ўласцівы большай частцы беларускіх гаворак часоў Скарыны, з'яўляліся адзінай нормай царкоўнаславянскай пісьменнасці і пераважалі ў старабеларускіх помніках. Таму перавага іх у выданнях Скарыны цалкам заканамерная. У яго кнігах утварэнні на *-мъ* складаюць 57,8 %. Тут звычайнымі з'яўляюцца

формы *будемъ, возмемъ, возможемъ, выдадимъ, выидемъ, дадимъ, заплатимъ, ищемъ, можемъ, молимъ, наберемъ, навратимсѧ, напиемсѧ, наследуемъ, насытимсѧ, ожидаемъ, познаемъ, поидемъ, потребуемъ, преставаемъ, прийдемъ, разумеемъ, рекнемъ, смеемъ, смесимъ, созжемъ, спытаемъ, требуемъ, ѕделаемъ, ѕмираемъ, ѕчинимъ, хотимъ, чтимъ* і інш.: в радости хотимˢ прийти (ІС, 16); Вси бо ѕмираемъ и ꙗко воды плынемъ до земли, ѡт нея же паки не возвратимˢсѧ (ДЦ, 91б); наберемъ единый кажный з насъ древа пригожего з леса и ouделаемъ собѣ домъ (ЧЦ, 195б); Не навратимсѧ в домы своѧ но первей пойдемъ вси вкѕпѣ на гаваонитѧнъ (КС, 43); естъли же напиемсѧ воды твоея мы или скотъ нашъ, заплатимъ что справедливого естъ (ЛК, 45).

Варыянтныя формы на *-мы* па колькасці ўжыванняў займаюць другое месца (31,2 %). Іх прадстаўляюць формы тыпу *будемы, живемы, знайдемы, идемы, можемы, молимы, мыслимы, начнемы, пойдемы, почнемы, пошлемы, приймуемы, приходимы, просимы, ѕмремы, чтимы:* достойно его не можемы знайти (КІ, 45); мы идемы к мужемъ симˢ (ПЦ, 27б); велми далеко живемы ѡт васъ (ІН, 20б); мы будемы раби господина твоего (КБ, 81б); с тобою пойдемы к людемˢ твоимъ (КР, 2б). У тэкстах Скарыны з канчаткам *-мы* асабліва часта сустракаюцца формы *будемы, идемы* і *можемы.*

Формы на *-мо* ў 1-й асобе множнага ліку прадстаўлены значна меншай колькасцю прыкладаў (11 %): *боимосѧ, возмимо, возможемо, выйдимо, идемо, медлимо, молимосѧ, молчимо, наполнимо, оставимо, отпочинемо, позовимо, пойдемо, послушаемо, приведемо, приносимо, просимо, седимо, ѕзримо, ѕкажемо, ѕчинимо, ходимо, чинимо:* пойдите к намъ и ѕкажемо вамъ еже хощете (ПЦ, 28); Сего ради доколѣ молчимо и медлимо и не приведемо възадъ царѧ (ДЦ, 103б); И прочто медлимо ѡтнѧти и ѡт руку царѧ Сирскаго (ТЦ, 179); Что мы седимо сезде (ЧЦ, 198); не возможемо възойти на горы (ІН, 34); Молви ты намъ и послушаемо (КВ, 38); молимосѧ тобе за десеть дней (ДП, 6).

Граматычная раўназначнасць такіх варыянтаў пацвярджаецца прыкладамі, калі ў адным і тым жа сказе выкарыстоўваюцца формы з варыянтнымі канчаткамі: Протожъ будемы ли молчати, а не дадимъ веданиѧ во граде до ѕтра, винни будемъ грехомˢ (ЧЦ, 198б); позовимо девицу и спытаемъ воли еѧ (КБ, 44); Сего ради просимо тебе, да пройдемъ скрозе землю твою (ЛК, 44б); ныне наследуемˢ тѧ всимъ серцемъ, и боимосѧ тебе и ищемъ лица твоего (ДП, 12б).

Магчыма, на характар канчаткаў уплывае і тая акалічнасць, што ў мове біблейскіх персанажаў формы цяперашняга-будучага часу нярэдка ўжываюцца побач з формамі загаднага ладу, і ў такіх выпадках варыянтнасць канчаткаў служыць сродкам адрознення граматычнага значэння адпаведных форм: нападемы нань на коемˢ же месте знаидемˢ его и прикриемо и́ (ДЦ, 98б);

Сѣго дла и мы не мстимоса за тыи речи еже терпимы, но покладаймы то быти намъ за грехи наше (КЮ, 14б); Пойдимо и возмимо землю ꙗко можемы приати ю (ЛК, 31б).

Формы на *-мо* і *-мы* трапляюцца і ў віленскіх царкоўнаславянскіх выданнях Скарыны: темъ же молимоса (КН, 6); пойдемо днесъ или завтра в сеи градъ (СП, 7б); молимыса тобе спасе (АІ, 5); да исповемы того похвалу (АК, 10); хвалимы васъ пресватые ангели (АМ, 1б); аще живемы духомъ, духови и прилагаймыса (ШК, 25б); приемлемы то со всакимъ блгодарениемъ (ДА, 69).

Выкарыстанне канчаткаў *-мы* і *-мо* для форм цяперашняга-будучага часу 1-й асобы множнага ліку ў выданнях Скарыны патрабуе адпаведнага тлумачэння. Тэматычныя дзеясловы царкоўнаславянскай мовы такіх канчаткаў не мелі зусім. У беларускай пісьменнасці канчатак *-мы* атрымаў пашырэнне ў перакладах з заходнеславянскіх моў з канца XV ст. Арыгінальныя беларускія помнікі такога канчатка не ведаюць зусім. Сучасныя дыялекталагічныя матэрыялы таксама не даюць падстаў меркаваць аб існаванні такога канчатка ў старабеларускіх гаворках. Усё гэта ўказвае на іншамоўнае паходжанне гэтага канчатка ў выданнях Скарыны і дае магчымасць бачыць тут уплыў польскай мовы. Варыянтны канчатак *-мо* таксама адзначаецца ў беларускіх помніках з канца XV ст., але асаблівае распаўсюджанне ён атрымаў у пісьменнасці канца XVI — першай палавіны XVII ст., калі ён набыў значэнне варыянтнай нормы. Пашырэнню гэтага канчатка садзейнічала, безумоўна, наяўнасць яго ў паўднёва-заходніх беларускіх гаворках, дзе ён захоўваецца да нашага часу.

На ўжыванне гэтых канчаткаў у выданнях Скарыны, несумненна, аказала ўплыў чэшская Біблія 1506 г. Канчатак *-мы* ў Скарыны ў большасці выпадкаў ужываецца там, дзе ў чэшскім арыгінале выступае канчатак *-me: Poczneme li mluwiti tobie* — Почнемы ли молъвити к тобѣ (КІ, 8б); zdaliž muožeme wuoli božye oderzyeti — едали воли божиеи можемы са мы съпротивити (КБ, 93); prosyme pane aby slyssel nas — просимы тебе господине выслыши насъ (КБ, 80). Аднак строгай адпаведнасці ў суадносінах такіх канчаткаў арыгінала і перакладу не назіраецца. З аднаго боку, маюць месца выпадкі, калі канчатку *-me* чэшскага тэксту ў Скарыны адпавядаюць канчаткі *-мо* і *-мъ:* Czož vczynyme s ginymi — что жс вчинимо с ыными (КС, 47); dokawad trpieti budeme toto pohorssenije — доколѣ терпети будемъ беду сию (КВ, 20б). З другога боку, часам у Скарыны ўжываецца канчатак *-мы* там, дзе ў чэшскім тэксце адпавядаюць формы на *-m:* dczer nassych ne muožem gim dati — Дщеръ теже нашихс не можемы дати имъ за жены (КС, 47); my budem slyžebnyczy pana nasseho — мы будемы раби господина твоего (КБ, 81б). Варта адзначыць таксама, што формы на *-мы* і *-мо* Скарына нярэдка ўжывае і ў сваіх прадмовах: С сее книгы

можемы досконале поразумети (ЕК, 2); Чтимы жъ ѕставичне светое Еѕвангелие, а чтѕчи е наследѕймы делы нашего избавителѧ (КБ, 3б); сие малые книжки праци нашее приносимо имъ (КЛ, 2б).

З разгледжанага матэрыялу відаць, што 1-я асоба множнага ліку цяперашняга-будучага часу з'яўляецца такім звяном у дзеяслоўнай парадыгме, дзе асабліва выразна сутыкаюцца сродкі розных моўных стыхій — беларускай, царкоўнаславянскай і заходнеславянскай.

У супрацьлегласць іншым асабовым формам формы 2-й асобы множнага ліку вызначаюцца выключнай устойлівасцю і аднастайнасцю. Яны паслядоўна ўжываюцца з канчаткамі *-ете/-ите*, якія не выяўляюць якіх-небудзь структурных марфалагічных адхіленняў (практычна ў тэкстах у большасці ўжываюцца дзеясловы I спражэння з канчаткам *-ете*): *будете, боитесѧ, загинете, знайдете, идете, можете, насеете, напишете, поживете, пожнете, пойдете, хощете:* нынѣ видечи раны моа боитесѧ (КІ, 11); будете ꙗко боговѣ (КБ, 12); заѕтра пойдете в путь свой (КБ, 33б); есть будете а не насытитесѧ (КЛ, 51); вы днесь идете битисѧ (ДЗ, 39б); скоро загинете, и мало поживете в земли (ДЗ, 58); Много насеете на поли и мало пожнете (ДЗ, 53); почто со мною хощете ити (КР, 2б).

Гэты ж канчатак быў аднолькава ўласцівы і царкоўнаславянскай, і старабеларускай пісьмовай мове. У жывым вымаўленні такія формы, несумненна, адрозніваліся, прычым царкоўнае вымаўленне проціпастаўлялася народна-дыялектнаму, якое ў сваю чаргу залежала ад агульных асаблівасцей фанетычнай сістэмы адпаведных гаворак. Аднак на матэрыяле пісьмовых помнікаў устанавіць такія арфаэпічныя асаблівасці немагчыма.

Формы 3-й асобы множнага ліку ў тэкстах Скарыны паслядоўна ўжываюцца з мяккім канчаткам *-ть* з папярэднім тэматычным галосным *-у/-ю* або *-а/-ѧ* ў залежнасці ад тыпу спражэння: *будуть, ведаютъ, даютъ, знаютъ, идуть, падуть, пиютъ, плынуть, пожруть, ропчуть, ѕбиютъ, чуютъ; боронѧть, видѧть, лежать, побежать, положать, похоронѧть, родѧть, ходѧть:* здалека очи его видѧть (КІ, 47б); Вси реки плынуть в морѣ (ЕК, 3б); на браку бываютъ разноличьные твари (ПП, 2); сыновѣ твои не ходѧть по путехъ твоих (ПЦ, 17); слузи господина моего на голой земли лежать (ДЦ, 84б); раби мои да будуть с ними и да помагаютъ имъ (ТЦ, 132); многие люди з горъ идуть (КС, 23); где тебе мертвую похоронѧть тѕ и мене ѕмершу да положать (КР, 3).

Формы 3-й асобы множнага ліку, як і ў адзіночным ліку, ужываюцца таксама з канцавым *-т^{s}: будут^{s}, идут^{s}, навчат^{s}, оставлѧют^{s}, пасѕт^{s}, погубѧт^{s}, подают^{s}*. Тут, безумоўна, выступае мяккі канчатак, паколькі формы з *-т^{s}* часта ўжываюцца побач з формамі на *-ть:* Они же оставлѧют^{s} пѕть правыи, и ходѧть

пѫтами темными (ПС, 7); людие Ізраилевы ѫтекають и тылъ подаютъ (ІН, 15); Людие Ізраилевы не ѫповаютъ на копиѧ своѧ, ни на стрелы своѧ, но горы боронѧть ихъ (КЮ, 11б).

БУДУЧЫ ЧАС

Як вядома, станаўленне форм будучага часу ў агульнаславянскай мове адносіцца да позняга этапу яе гісторыі. У старажытнасці гэта дзеяслоўная катэгорыя выражалася рознымі спосабамі — простым будучым, які па сваіх канчатках супадаў з цяперашнім часам, і будучым складаным рознай марфалагічнай структуры.

У эпоху Скарыны ў беларускай мове формы простага будучага ўтвараліся шляхам далучэння да асноўнага дзеяслова адпаведных прыставак або суфіксаў, якія надавалі дзеяслову значэнне закончанага трывання. Па сваіх канчатках формы простага будучага нічым не адрозніваліся ад форм цяперашняга часу. У выданнях Скарыны яны ўжываюцца ва ўсіх асобах абодвух лікаў: ѩ ѫделаю тебе стражемъ главы моеѧ (ПЦ, 59); положу завет мой межи мною и тобою и розмножу тѧ превельми (КБ, 30); не остану тебе и не пойду прочь ѡт тебе (КР, 3); естъли же побѣжишъ пред ними нѣ ѫтечеши (ІС, 20); не будеши посломъ днесь но во иный день пойдеши (ДЦ, 101б); С ложа того на немъ же лежиши не снийдеши но ѫмреши (ЧЦ, 184б); купиши за сребро то все еже восхощеши (ДЗ, 31б); той повесть мнѣ егда воздасть имъ за грехи ихъ (КЮ, 18б); кажный онъ же знайдеть мене ѫбиетъ мѧ (КБ, 14); коего жъ ѡт людей ѫсть змей, а погледить на него той живъ будеть (ЛК, 46); мы смолвимосѧ о томъ и предадимъ его в руце цареве (ПЦ, 50); нападемы нань на коемъ же месте знаидемъ его и прикриемо ѝ (ДЦ, 98б); путемъ царскимъ пройдемъ дондеже не выйдемъ с пределовъ твоихъ (ЛК, 46б); всѧ древа плодовитаѧ посечете (ЧЦ, 189); Много насеете на поли и мало пожнете (ДЗ, 53); кой помрутъ на поли снедѧть тыхъ птици небесный (ТЦ, 160б).

У парадыгме 1-й асобы адзіночнага ліку адзіным выключэннем з'яўляюцца два выпадкі ўжывання форм з канчаткам нетэматычных дзеясловаў *-мъ:* Кому прировнам тѧ и кому ѫподоблю тѧ дщеро Ерусалимлѧ: с ким сровнам тѧ и потешу тѧ (ПЕ, 6б). Тут, безумоўна, адлюстраваўся ўплыў чэшскага арыгінала, дзе ўжыта форма przyrownam.

Асаблівасці ўжывання форм будучага часу ў Скарыны выяўляюцца пры супастаўленні іх з адпаведнымі формамі іншых тагачасных біблейскіх крыніц. У некаторых выпадках формы будучага простага супадаюць у чэшскай Біблії, у перакладах Скарыны і ў «Астрожскай біблії», напрыклад: ty radiegij vzrzijss gich zahynutije — ты первей ѫзриши ихъ загинутие (КЮ, 10б) — да ихъ наипаче ты погѵбель оузреши. Аднак у многіх выпадках у Скарыны і ў «Астрожскай біблії» ўжываюцца простыя формы

будучага часу, тады як у чэшскай Бібліі ім адпавядаюць складаныя з дапаможным дзеясловам *быти:* oni vczyti budú tie — Старий наȣчат^{s} тѧ (КІ, 13) — не ли сіѧ наоучить тѧ; yat' was budu krmiti — Азъ ȣбо перекормлю васъ (КБ, 93) — Азъ прекормлю вы; wiedieti budess že pokoy ma czeled twa — ȣвеси ꙗко покой имать челѧдь твоѧ (КІ, 10) — потомъ разȣмѣеши ꙗко оумирит^{s} ти сѧ домъ.

Усе біблейскія кнігі Скарыны вызначаюцца надзвычай вялікай колькасцю аналітычных форм будучага часу, якія ўтвараюцца шляхам спалучэння асабовых форм дапаможных дзеясловаў *быти* або *имати* з інфінітывам асноўнага дзеяслова. Несумненную сувязь выданняў Скарыны з царкоўнаславянскай традыцыяй трэба бачыць у шырокім выкарыстанні будучага складанага з дапаможным дзеясловам *имати.* Гэты складаны будучы час у стараславянскай мове ўжываўся абмежавана, бо, як мяркуюць даследчыкі, ён сфарміраваўся позна, незадоўга да кірыла-мяфодзіеўскай эпохі. Тым не менш гэты будучы ў выданнях Скарыны выступае самастойнай граматычнай формай, паколькі ў большасці выпадкаў дапаможны дзеяслоў тут страціў сваё лексічнае значэнне і набыў функцыю граматычнага паказчыка асобы і ліку. Формы гэтага тыпу адзначаюцца ва ўсіх асобах абодвух лікаў: имам^{s} нечто молвити к тобѣ (ТЦ, 125); что вделати имамъ (КБ, 32); да разумеешъ что ȣделати имашъ ему (ТЦ, 124б); той пакъ исповесть тобѣ что ȣчинити имаши (КР, 5б); Он^{s} же имать согледати и блюсти масло древѧно (ЛК, 13); Той ȣбо имать ити предъ людми сими (ДЗ, 12); Длѧ чего имамы стеречи ȣстенъ своих (ПС, 21); ȣчините совѣт^{s} что имамы делати (ДЦ, 97б); Сие суть заповеди и суды еже имате чинити (ДЗ, 27); не имȣть ести людие дондеже приидеть онъ (ПЦ, 19).

Ужытыя Скарынам некаторыя асабовыя формы дапаможнага дзеяслова *имѣти / имати* падвергліся ўздзеянню асновы дзеяслова *ꙗти* і выступаюць у выглядзе *имаю — имаеши — имаеть — имаемы — имаете — имають:* азъ покажȣ тобе что чинити имаеши (ПЦ, 33б); празникъ славный имаеть быти во граде моем^{s} (ПЦ, 44б); имаемы ли то ȣчинити чили ни (ДЦ, 48); покажу вамъ что чинити имаете (КВ, 10); И стрещи имають ȣ храме сведениѧ (ЛК, 10б). Аднак такія ўтварэнні ў выданнях Скарыны займаюць другараднае месца.

Увогуле скарынінскі матэрыял па адносінах да іншых тагачасных біблейскіх тэкстаў разнастайны і супярэчлівы. З аднаго боку, ужыванне форм будучага часу з дапаможным дзеясловам *имати* Скарынам супадае з ужываннем іх у чэшскай Бібліі і адрозніваецца ад «Астрожскай бібліі», дзе выкарыстоўваюцца формы простага будучага або іншыя граматычна-сэнсавыя адпаведнікі: ay protoliž mam vmrzyeti — И сего ли ради имам^{s} ȣмрети (ПЦ, 30) — и се азъ оумираю; wijess czo mu vdelati mass — разумеешъ что ȣделати имашъ ему (ТЦ, 124б) — оувеси что сътвориши емȣ; Czož mám vczyniti lidu tomuto — что маю ȣчинити з людми сими

(КВ, 33б) — что сотворю людемъ симъ; mamt' ñeczto mluwiti tobie — имамѕ нечто молвити к тобѣ (ТЦ, 125) — рѣчь ми есть к тебѣ.

З другога боку, у Скарыны і ў чэшскай Бібліі ўжываюцца формы будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти,* якім у «Астрожскай бібліі» адпавядаюць утварэнні з дзеясловам *имати:* Yat' budu kralowati — Азъ буду царствовати (ТЦ, 120б) — Азъ имамъ црствовати; Yat' budu mluwiti o to s kralem — Азъ буду молвити о тобѣ къ царю (ТЦ, 125) — азъ имам гл҃ати о тебѣ къ ц҃рю.

Нарэшце, трапляюцца выпадкі, калі ў чэшскай і Астрожскай бібліях ужыты простыя формы будучага часу, а ў Скарыны — складаныя з дапаможным дзеясловам *имати:* ho ne zabiem meczem — не имамѕ ѕбити его мечем (ТЦ, 124б) — не оубію тѧ орѕжіемъ; Do ktore(ho) miesta puoydu — въ кои же градъ имамѕ ити (ДЦ, 68) — в которыи внидѕ.

Неабходна заўважыць, што нярэдка ў выданнях Скарыны канструкцыі «имамъ+інфінітыў» маюць не толькі чыста граматычнае значэнне будучага часу, але і выражаюць дадатковыя мадальныя адценні павіннасці, абавязковасці выканання дзеяння. У такіх выпадках гэтыя спалучэнні набываюць значэнне састаўнога выказніка. Аднак практычна ўстанавіць граматычны статус такіх спалучэнняў вельмі цяжка.

Увогуле ж будучы час з дапаможным дзеясловам *имати* ў Скарыны выкарыстоўваецца больш часта ў параўнанні з «Астрожскай бібліяй», для якой больш характэрны простыя формы: Что имамы чинити съ кивотомъ (ПЦ, 13) — что сътворимъ кіотѕ; азъ покажѕ тобе что чинити имаеши (там жа, 33б) — азъ ти покажѕ ѧже сътвориши; ѕчините совѣтѕ что имамы делати (ДЦ, 97б) — дадѣте совѣтъ что сътворимъ; что жѕ имамъ вчинити дщерамъ и внукомъ своимъ (КБ, 58б) — что сътворю има днесь и чадомъ еа.

У беларускай літаратурна-пісьмовай мове эпохі Скарыны формы будучага складанага часу з дапаможным дзеясловам *имати* выкарыстоўваліся вельмі рэдка. Прыкметным выключэннем з'яўляецца толькі перакладзены ў сярэдзіне XVI ст. з польскай мовы «Псалтыр», дзе такія ўтварэнні складаюць варыянтную норму: выхвалѧти имѕ имѧ твое; выславѧти имоу чюдеса твои; ѡѳитовати имет землѧ; взывати имем имѧ твое; прекладати имоут горы оу глѕбокость морскѕю і інш.

Аднак вялікі фактычны матэрыял паказвае, што ў выданнях Скарыны для выражэння будучага дзеяння асноўнымі з'яўляюцца аналітычныя формы з дапаможным дзеясловам *быти.* Такія формы зусім не былі ўласцівы стараславянскай мове, не ведае іх і старажытнаруская мова, дзе ў такой ролі выкарыстоўваліся звязкі *начьну, почьну, учьну, хочу, имамъ.* Беларуская пісьмовая мова першай сярод усходнеславянскіх моў пачала выкарыстоўваць формы будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти.*

Першы выпадак фіксацыі новай формы будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти* адзначаецца ў Грамаце князя Карыбута 1388 г., што падкрэсліваецца ва ўсіх даследаваннях па гісторыі ўсходнеславянскіх моў. У беларускіх помніках XV ст. такая форма служыць асноўным сродкам выражэння будучага незакончанага дзеяння, што ўласціва і сучаснай беларускай мове. Тут варта адзначыць, што формы будучага складанага з дапаможным дзеясловам *быти* ў рускай пісьменнасці замацаваліся толькі ў XVII ст.

Ужываннем форм будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти* выданні Скарыны істотна проціпастаўляюцца тагачаснай царкоўнаславянскай мове. Гэты унікальны скарынінскі матэрыял заслугоўвае таго, каб праілюстраваць яго адпаведнай колькасцю прыкладаў.

1-я асоба адзіночнага ліку: нань ѣ ѕповати бѕду (КІ, 18б); се ныне бѕду ести ѡт добра моего самъ (ІС, 20б); ѣ бѕдѕ веселитиса и играти (ДЦ, 77б); буду ли ѣ мощи востати з немощи сеа (ЧЦ, 184б); нынѣ не буду мощи ести тыхъ потравъ (КЮ, 19); опѧть будѕ пасти и хранити стадъ твои*х* (КБ, 55б); Азъ же писмо сее чести буду пре*д* тобою (ДП, 19б).

2-я асоба адзіночнага ліку: не будешь боѧтиса беды (КІ, 10); бѕдешь имети приязнь добрую (ІС, 12б); тѕ будеши ѕчити ма (ПП, 10); седмъ дней мене жъдати будешъ (ПЦ, 21); ты на то гледети будеш^{s} (ДЦ, 101); на персехъ своихъ ходити будеши (КБ, 12б); всѧкое лжи стеречиса будешъ (КВ, 42б); Домъ ѕделаеши и не будешъ жити в немъ. Виноградъ насадиши и не будеши пити ѡт вина его (ДЗ, 52б); Сено ѣко волъ ести будешъ (ДП, 17б).

3-я асоба адзіночнага ліку: владети не будеть мочи (КІ, 26); межи множествомъ волотовъ пребывати будеть (ПС, 32б); душа его с нимъ кохатиса будеть (ІС, 51); не будет^{s} мочи еа до конца постигнути (ЕК, 13б); Кто оубо стеречи будет^{s} правды (ПБ, 10); по воли души моеа чинити бѕдеть (ПЦ, 9б); з ѕтра ести бѕдеть ловитву (КБ, 91б); будеть рещи фараонъ о сынехъ Ізраилевыхъ (КВ, 27б); жечи тое бѕдеть на требнице (КЛ, 14).

1-я асоба множнага ліку: бѕдемы ли са молити емѕ (КІ, 27); что будем^{s} мочи ѕчинити (ІС, 70); тако будемъ мощи взѧти градъ (ЧЦ, 199); Сего ради служити будемъ господу (ІН, 46б); тамо будемъ приносити жертву (КВ, 17б); что ж^{s} будемы ести во седмое лѣто, не будем^{s} ли сѣѧти на полѣхъ (КЛ, 48); Не будемъ пити воды ѡт кладезей ваших^{s} (ЛК, 46б).

2-я асоба множнага ліку: будете мощи далеи пройти (ІН, 34б); будете пребывати и стрещи в доме Месса (ЧЦ, 208б); будете ести тѕкъ земли (КБ, 84); ѕвечер^{s} будете ести маасо (КВ, 31б); ести будете а не насытитеса (КЛ, 51); заѕтра будете ѣсти маасо (ЛК, 28); Не бѕдете орати вкупѣ воломъ и осломъ (ДЗ, 43).

3-я асоба множнага ліку: выслухавши тебе будуть стеречи та (ІС, 30б); они та гонити будуть (ДЦ, 116); со мною будуть днесь ѣсти о полудни (КБ, 80); десеть жен^{s} бѕдѕть печи хлебъ во единои

пещи (КЛ, 51); будуть пилно стеречи храму сведенiѧ (ЛК, 7б); вси людие ѕслышавши боѧтисѧ будуть (ДЗ, 36).

Прыведзеныя прыклады з'яўляюцца толькі нязначнай часткай таго неабмежаванага выкарыстання ў выданнях Скарыны форм будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти*. Няма ніякага сумнення, што на ўжыванне такіх форм пэўны ўплыў аказала і чэшская Біблія, дзе формы будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти* вельмі распаўсюджаны. У большасці выпадкаў такія формы чэшскага арыгінала без істотных змен паўтараюцца ў скарынінскім перакладзе: Geho obilé hladowity giesti bude — Жита его голодный ꙗсти будеть (КІ, 9б); dokawadž ty budess plakati Saule — доколѣ ѕдеши ты плакатисѧ по Сауле (ПЦ, 33б), trzy miesyecze budess vtiekati przed neprzátely twymi, a oni tie honiti budú — три мєсеци оутекати будешъ предъ лицемъ враговъ твоихъ, а они тѧ гонити будуть (ДЦ, 116); budete pijti wy y lid wass - будете пити вы и людие ваши (ЧЦ, 189); Slamy was wijecze dawati ne budu — плевъ вамъ болей давати не буду (КВ, 12); zdaliž budu moczy mijeti wijecze syny — Едали буду мощи ꙗ имети сыны (КР, 3).

У «Астрожскай біблii» скарынінскім формам будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти* ў асноўным адпавядаюць прыставачныя формы простага будучага часу і нават беспрыставачныя дзеясловы са значэннем будучага часу: будеш^{ѕ} мочи ити в путь свой (ПЦ, 60) — по сем идеши в пѕть; внеси ꙗдь во ѕнѕтреную клеть и буду ꙗсти з рук^{ѕ} твоихъ (ДЦ, 88б) — внеси ми ꙗдь в нѕтренюю клѣть, и ꙗмъ ѡт рѕкѕ твоею; имени твоему въспѣвати буду (ДЦ, 112) — имени твоемѕ воспою; той седети будеть опослѣ мене на престолѣ моемъ (ТЦ, 121) — той сѧдетъ на престолѣ моемъ; И будете пити вы и людие ваши (ЧЦ, 189) — и піете вы, и стѧжанiѧ ваша; в потѣ лица своего ести будешъ хлебъ свой (КБ, 13) — въ потѣ лица твоего снѣси хлѣбъ твой.

Формы будучага часу з дапаможным дзеясловам *быти* ў царкоўнаславянскай мове ўсходніх славян атрымалі пашырэнне толькі ў пазнейшых друкаваных выпраўленых выданнях Біблii 1751 і 1756 гадоў, адкуль яны перайшлі ў сучасныя выданні Біблii на царкоўнаславянскай мове.

У мове Скарыны практычна адсутнічаюць формы так званага будучага другога часу, якія ў стараславянскай і старажытнарускай мовах утвараліся шляхам спалучэння дапаможнага дзеяслова *быти* з дзеепрыметнікам на *-л* і ўжываліся для абазначэння адноснага будучага часу, папярэдняга другому будучаму. Прыклад з кнігі «Лічбы» — Пакли же будеш^{ѕ} сѧ ѡтхилила ѡт мужа своего и прелюбы ѕчинила с мужемъ чуждимъ. Сиѧ проклѧтиѧ да приидуть на тѧ (15б) — з'яўляецца адзіным ва ўсёй пісьмовай спадчыне Скарыны. Формы такога ўтварэння былі рэдкімі нават у стараславянскай мове, ва ўсіх стараславянскіх помніках выяўлены толькі два выпадкі іх ужывання.

АОРЫСТ

Аорыст у выданнях Скарыны выступае звычайнай граматычнай катэгорыяй, хоць у параўнанні з іншымі тагачаснымі царкоўнаславянскімі тэкстамі ён ужываецца радзей, бо часта замяняецца перфектам. У цэлым у перакладах Скарыны аарыстычныя формы складаюць 33,5 % у адносінах да ўсіх іншых форм прошлага часу.

Пануючым у скарынінскіх кнігах выступае новы сігматычны аорыст, які атрымаў распаўсюджанне ў позняй стараславянскай мове. Формы аорыста ўтвараліся ад асноў прошлага часу на галосны і ад асноў на зычны, прычым у апошніх выпадках у некаторых асобах канчатак далучаўся да асновы пры дапамозе злучальнай галоснай *о*.

У тэкстах Скарыны найбольш часта ў 1-й асобе адзіночнага ліку ўжываюцца формы *быхъ, взѧхъ, видехъ, дахъ, знайдохъ, идохъ, имехъ, ожидахъ, остахъ, поставихъ, рекохъ, согрешихъ, учинихъ, хотехъ, ꙗдохъ* і г. д. Вельмі многа прыкладаў, калі ў адных і тых жа сказах ужываецца па некалькі форм аорыста: остахъ азъ единъ и придохˢ возвѣстити тобѣ (КІ, 5); Се ꙁслышахˢ гласъ твой, и оучтихъ лице твое (ПЦ, 55); согрѣших предъ тобою вельми, ꙗко повѣлех счести людей сих (ДЦ, 116); Азъ вознѣсохъ тѧ ѡт персти и ꙁчинихъ тѧ царемъ надъ людми моими (ТЦ, 164б); И пихъ воды чуждие, и высуших ногами моими вси воды завреный (ЧЦ, 227б); Тогда набрахъ грозновиѧ, и давихъ в чашу юже держахъ и подавахˢ пити фараонови (КБ, 73); егда ми реклъ слова тыѧ воздвигохсѧ и стахъ трепетень (ДП, 29б). Як адзінкавы рэдкі выпадак варта адзначыць спалучэнне формы аорыста са звязкай цяперашняга часу: бремени его нести есмъ не могох (КІ, 37б). Гэты прыклад сведчыць аб штучнасці форм аорыста ў тагачаснай пісьменнасці.

Асабліва часта ў біблейскіх кнігах выкарыстоўваюцца формы 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку, паколькі яны служаць дакладным сродкам перадачы аднаразовых мінулых дзеянняў. Гэтыя формы часцей за ўсё ўжываюцца ў аўтарскай мове: И иде Анна путемъ своимъ, и вниде въ обитель и ꙗде и пие с мужемъ своимъ (ПЦ, 6б); Тогда иде посолъ и пришедши возвѣсти Давыдови (ДЦ, 85б); Онˢ же въставъ ꙗде и пие, и иде ꙁкрепивсѧ ꙗдию тою (ТЦ, 172б); Царь Езехиѧ раздра на собѣ ризы своѧ. И облечесѧ во вретище и вниде в домъ божий (ЧЦ, 22б); Она же поспѣши и возвести ѡтцꙁ своему (КБ, 53); И иде ѡттолѣ Моисей и навратисѧ ко етрꙁ тестю своемꙁ (КВ, 10б); сѧде руѳъ на стране женцевъ и вымѧнши собе с класовъ пражма ꙗде и насытисѧ (КР, 4б).

Відавочную сувязь з традыцыяй стараславянскай мовы выяўляе аорыст 3-й асобы адзіночнага ліку дзеяслова *быти*, ад якога вельмі часта ўжываецца форма *бысть:* бысть побитие великое вѣльми (ПЦ, 28б); И бысть сеча великаѧ в той день (ДЦ, 100б);

Бысть же в то врѣмѧ мужъ единъ ѡт пророковъ божиих (ТЦ, 17б); бысть крикѕ неслыханый посреди становѕ их (КЮ, 23); тѧжко ему бысть тое (КБ, 89б); Моисею неизносимѧ тѧгота бысть (ЛК, 27б).

Можна меркаваць, што перакладчык свядома выкарыстоўваў такую форму, каб адрозніць аорыст дзеяслова *быти* ад ранейшай заканамернай формы *бы*, якая замацавалася ў якасці структурнага элемента ўмоўнага ладу. Формы аорыста такога ўтварэння ад іншых дзеясловаў трапляюцца вельмі рэдка: Осми лѣтъ былъ естъ Осиѧ егда начатѕ царствовати (ЧЦ, 232); Тогда смутишесѧ владыки Едомскиѧ, и кнѧзей Моавскихъ приѧть трепетъ (КВ, 29б).

Формы аорыста 1-й асобы множнага ліку ў біблейскіх тэкстах выкарыстоўваюцца выключна ў дыялагічнай мове. Структурным паказчыкам іх выступае элемент *-омъ*, які далучаецца да адпаведнай формы адзіночнага ліку: сее слышавши мы ѕбоѩхомсѧ и змертвело серце наше (ІН, 7б); съгрешихомъ со ѡтци нашими и незаконне чинихомъ и неправду деахомъ (КЮ, 12б); знайдохомъ ласку предъ очима твоима (КВ, 63б); мѕже и жены и дети погубихомъ не оставихомъ в нихъ ничего (ДЗ, 9б); Сѣ той *ест* день его же ожидахомъ, знайдохомъ ѝ и видехомъ (ПЕ, 6б); Съгрешихомъ и безаконне чинихомъ и неправды пахахо*м*. И ѡтстѕпихо*м* и ѕклонихомсѧ ѡт заповедей твои*х* (ДП, 27).

Формы аорыста 2-й асобы множнага ліку таксама ўжываюцца ў дыялагічнай мове. Фармальным паказчыкам іх выступае элемент *-сте*, які далучаецца да адпаведнай формы адзіночнага ліку: то естъ той гукъ еже вы нынѣ слышасте (ТЦ, 123); поклонистесѧ богомѕ чужимъ и послужисте имъ (ІН, 45); Вы пакъ не хотесте послушати речи моеѩ (КС, 6б); почто пришли есте семо ко человѣку его же возненавидесте первей и выгнасте ѡт себе (КБ, 47б); Тогда приступисте ко мне вси и рекосте (ДЗ, 6б).

У біблейскіх тэкстах асабліва часта ўжываюцца формы аорыста 3-й асобы множнага ліку. Іх паказчыкам з'яўляецца элемент *-ша*, які замацаваўся ва ўсходнеславянскай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы ў старажытнарускую эпоху ў адпаведнасці з канчаткам -шѧ стараславянскай мовы. У Скарыны самымі звычайнымі з'яўляюцца формы тыпу *бежаша, быша, ведоша, видеша, взѧша, знайдоша, идоша, могоша, падоша, побѣгоша, поведиша, поразиша, рекоша, сташа, ходиша, ѩдоша.*

У сукупнасці з іншымі царкоўнаславянскімі рысамі такія формы надаюць асаблівы царкоўнаславянскі каларыт перакладам Скарыны: внидоша людие до лѣса и видеша текущій медъ (ПЦ, 29); побежаша люди Ізраилевы з бою, и мнози з нихъ падоша и ѕмроша (ДЦ, 66б); Тогда внийдоша мужи тиѝ прокаженный в полки, и влезоша в шатеръ единъ. ѩдоша ту и пиша, и набраша тѕ злата и сребра и одежи драгое (ЧЦ, 198б); Ерихонъ градъ облѧгоша сыновѣ Ізраилевы. И седмаго днѧ ѕзѧша и сказиша ѝ, людей всехѕ погубиша (ІН, 12б); Они пакъ вси единою мыслию

не хотеша послушати его, и послы ѡтпустиша празны и безъ всѧкое чти выгнаша их ѡт себе (КЮ, 4); они же погонивши инѧша его, и обсекоша ему р8це и нозе (КС, 4б); рыбы еже быша в реце изомроша (КВ, 15б); Сие внегда видеша вси людие падоша на лица своѧ и похвалиша господа бога (КЛ, 19б).

Аднак такія формы аорыста 3-й асобы множнага ліку не з'яўляюцца адзінымі ў перакладах Скарыны. Яго тэксты вылучаюцца тым, што падобныя ж формы часта ўжываюцца і з канчаткам *-ше:* всѧ кости моѧ смѧтошесѧ (КІ, 9); мнози розмножишесѧ греси их (ІС, 76); людие семо и тамо розбегошесѧ (ПЦ, 28); вкупе плакашесѧ и ридашесѧ вси людие съ Давыдомъ (ДЦ, 72б); Навратишесѧ вси назад^{s} и побиѧше мужей града Гай (ІН, 18); Т8 источьници водъ горкихъ осладишесѧ имъ ко питию (КЮ, 8); 8меншишесѧ воды, и замъкнушесѧ источници (КБ, 18б).

У гэтых адносінах асабліва цікавымі з'яўляюцца шматлікія выпадкі, калі абодва варыянты ўжываюцца побач у адных і тых жа сказах: бишесѧ филистымлѧне и поразиша людей Ізраилевыхъ (ПЦ, 11б); 8клонишесѧ вси, и не хотеша внийти во градъ в той день (ДЦ, 103); Тогда возбоѧшесѧ и въсташа вси пирующие (ТЦ, 123б); Они же взѧша Самарию и вселишесѧ во градех^{s} ея (ЧЦ, 221б); Они же пришедше скоро навратишесѧ и побегоша (ІН, 14б); бившисѧ с ними поразиша ихъ и гнашесѧ за ними (КС, 45); розмножишесѧ воды и воздвигоша ковчегъ на высокость (КБ, 18); 8вериша людие и возрадовашесѧ о томъ (КВ, 11); Тий же ѧдоша с ними и кланѧшесѧ богомъ ихъ (ЛК, 53б); Они же возопиша и плакаше (КР, 2б). З прыведзеных прыкладаў відаць, што канчатак *-ше* асабліва часта ўжываецца ў зваротных дзеясловах, якія маюць у сваім складзе часціцу *-сѧ*. Колькасць такіх ужыванняў практычна неабмежаваная ў перакладах Скарыны.

Па фармальных прыкметах скарынінскія формы аорыста 3-й асобы множнага ліку на *-ше* знешне супадаюць з формамі імперфекта 3-й асобы адзіночнага ліку тыпу *бежаше, бываше, ведѧше, живѧше, идѧше, искаше, лежаше, пасѧше, седѧше, чинѧше* і інш., якія таксама шырока ўжываюцца ў перакладах Скарыны. Такое супадзенне, якое не мае аналогіі ў граматычным ладзе як царкоўнаславянскай, так і беларускай моў, прыходзіцца тлумачыць недастатковым валоданнем Скарынам царкоўнаславянскай мовай, на што ўжо даўно ўказваў А. І. Сабалеўскі.

Цікава адзначыць, што формы на *-ше* ў значэнні аорыста 3-й асобы множнага ліку трапляюцца і ў царкоўнаславянскім выданні «Псалтыра» Скарыны 1517 г.: Оуглие возгорешесѧ ѡт него (16); к тобѣ возваша и спасошесѧ (20); кости мое см8тишесѧ (27); лѧдви мое наполнишесѧ поруганиѧ (35) і інш. Але ў пражскім выданні «Псалтыра» ў большасці захаваны правільныя формы аорыста на *-ша.* Затое ў віленскім перадруку «Псалтыра» 1522 г. у складзе «Малой падарожнай кніжкі» формы на *-ше* ўжываюцца вельмі часта. Гэта відаць з параўнання адных і тых жа фраз з абодвух выданняў — у пражскім «Псалтыры»:

8множишасѧ немощи их (14) — у віленскім: 8множишесѧ немощи ихъ (13), адпаведна скорьби срдца моего 8множишасѧ (23) — скорьби серца моего 8множишесѧ (22); на мѧ возвѣселишасѧ и снидошасѧ (31б) — на мѧ возвеселишесѧ и снидошесѧ (30б); возъш8меша и см8тишасѧ воды их (42) — возшумеша и смутишесѧ воды ихъ (41); царие земстии собрашасѧ, снидошасѧ въ к8п8 (43) — царий земстии собрашесѧ и снидошесѧ въ к8п8 (42); 8бомшасѧ и см8тишасѧ бездны (68) — 8бомшесѧ и смутишесѧ бездны (67); возвеличишасѧ дела твоѧ (83) — возвеличишесѧ дела твоѧ (82); вознѣсошасѧ волны его (97) — вознесошесѧ волны его (96).

Аорысты 3-й асобы множнага ліку з канчаткам *-ше* трапляюцца і ў розных месцах «Малой падарожнай кніжкі» 1522 г.: волъсви возвратишесѧ во вавилонъ (АБ, 6); мнози зачатию твоему во старости их дивишесѧ (АП, 4); вси бо навчишесѧ воскресшему богу пети (ПГ, 4б); елико их прикоснушесѧ спасени быша (АІ, 3).

Такія формы зрэдку трапляюцца і ў «Апостале» 1525 г., напрыклад у той частцы, якая мае назву «Деанїѧ апостолъскаѧ»: неціе ѡт нихъ вероваша и прилучишесѧ къ павлу (50б); Сила пакъ и тимоѳей осташесѧ т8 (51б); они же возвратишесѧ в домы своѧ (61).

Ужыванне форм імперфекта 3-й асобы адзіночнага ліку на *-ше* замест форм аорыста 3-й асобы множнага ліку складае выключную асаблівасць мовы Скарыны. Гэта рыса належыць да ліку асаблівасцей, якімі перакладныя выданні першадрукара аб'ядноўваюцца з неперакладнымі царкоўнаславянскімі — «Псалтыром», «Малой падарожнай кніжкай» і «Апосталам».

Пры разглядзе аорыста ў выданнях Скарыны ўяўляецца мэтазгодным звярнуць увагу на тое, у якіх адносінах аказваюцца гэтыя формы з сістэмай форм прошлага часу тагачасных біблейскіх тэкстаў. У чэшскай Біблії аорыстаў няма наогул. Аднак у скарынінскім перакладзе аорыст часта ўжываецца там, дзе ў чэшскім арыгінале ўжыты перфект са звязкай або без яе: tak gsem ya tie milowal — тако и ѧ возлюбихъ тебе (ДЦ, 67б); A przykázal gsem wam wsseczky wieczy — И повѣдехъ тогда вам вси речи (ДЗ, 6); Toho czasu take przyssel gest posel k krali ssalomunowi — В той часъ теже прийде вестьникъ къ царю Саломону (ТЦ, 12б); Odpowiediel mu mladenecz — ѡтвеща к нему отрокъ той (ДЦ, 66б).

Для выяўлення граматыка-семантычнага значэння аорыста ў выданнях Скарыны асобае значэнне мае параўнанне іх з тэкстам «Астрожскай бібліі». У большасці выпадкаў назіраецца поўнае супадзенне ў выкарыстанні гэтых форм у абедзвюх крыніцах. Напрыклад, у «Астрожскай бібліі»: почто бо въ оутробѣ не оумрох и ꙗко ис чрева изшед и абіе не гибохъ — у Скарыны: прочто въ 8тробѣ не 8мрохъ, из чрѣва вышедъ скоро не погыбохъ (КІ, 7б); адпаведна Рекохъ азъ въ срдцы моемъ — Рекохъ ѧ въ срдци

своемъ (ЕК, 4б); се дахъ землю въ р8к8 егѡ — сѣ дахъ землю в руце его (КС, 4б); азъ ископахъ кладѧзь сій — азъ выкопахъ кладезь сей (КБ, 38); цр҃ь иезекіѧ раздра ризы своа, и облечесѧ въ вретище и вниде въ домъ гн҃ь — царь Езехиѧ раздра на собѣ ризы своѧ. И облечесѧ во вретище и вниде в домъ божий (ЧЦ, 226); И рѣша отроцы ем8 — Тогда рекоша к нему слузи его (ТЦ, 120).

У многіх выпадках тэксты Скарыны адрозніваюцца іншымі сінанімічнымі па значэнню лексемамі, але яны таксама, як і ў «Астрожскай бібліі», маюць форму аорыста: и взѧ са8лъ мечь свой, и паде на него — Тогда Са8лъ извлече мечь свой и налѧже нань (ПЦ, 64); Моѵсій рабъ мой скончасѧ — Моисей раб^{s} мой 8мре (ІН, 5); землѧ сѧ потресе, и нб҃о възм8тисѧ и облаци прокапаша вод8 — землѧ потрѧсесѧ и небеса, и облаци спустиша дождь (КС, 12); И приведоша и́ въ іерслимъ, и оумре т8 — И потомъ привезоша и́ до ерусалима, и оумре т8 (КС, 4б).

Старажытныя формы прошлага часу — аорыст, перфект і імперфект — Скарына часта выкарыстоўваў у аднолькавых семантыка-граматычных умовах, чым дасягалася, як гэта наогул характэрна для Скарыны, разнастайнасць выкладу: Чересъ полѣ лениваго человѣка шолъ есми, и по винограде мужа безумного идох (ПС, 37б); Онъ же не хотѧше прийти к нему. И внегда оудругое послалъ по нѣго, и онъ теже не хотелъ ест прийти к нему (ДЦ, 93); Богатый имеаше овець и воловъ много вельми, 8богый пакъ ничто же иного не имел^{s} токмо агницу едину (там жа, 86); повышилъ есмъ тебе ѡт среды людей, и поставих тѧ царем^{s} над^{s} людми моими (ТЦ, 160); споение лѧдвей его ослаблѧшесѧ, и колена его восполокъ собивахусѧ (ДП, 18б); послужили суть богомъ чужим^{s} и поклонихусѧ тымъ их^{s} же не знаху, и ниже к нимъ бѣша прилучени (ДЗ, 56б).

У гэтых адносінах асаблівую цікавасць мае выклад у кнізе «Лічбы», дзе на адной і той жа старонцы ў адным і тым жа значэнні выкарыстаны ўсе тры формы прошлага часу: Сочтены суть по именохъ своихъ, ѡт двадцети лѣтъ и вышей вси еже можаху к бою ити (ЛК, 6б); сочтены суть по именохъ своих ѡт двацети лѣт^{s} и вышей, вси еже могоша к бою ити (там жа); сочтены суть по именохъ своих ѡт двацети летъ и вышей вси, еже могли к бою изыйти (там жа).

Такая варыяцыя разнапланавых граматычных сродкаў адсутнічае ў «Астрожскай бібліі», дзе формы прошлага часу ўжываюцца ў адпаведнасці са сваім традыцыйным значэннем: Богатый имеаше овець и воловъ много вельми, 8богый пакъ ничто же иного не имел^{s} токмо агницу едину (ДЦ, 86) — оу богатаго стада бѧх8 и б8иволи мноѕи ѕѣло. а оу оубогаго не бѣ ничто же; И стоѩлъ естъ оселъ подле телеси мертваго и левъ стоѩше посполу с ним^{s} (ТЦ, 159) — и оселъ стоѧше над нимъ, и левъ стоѩше близь телесе его.

Асобны разрад форм 1-й асобы адзіночнага ліку ўтвараюць

словаформы, дзе да дзеепрыметніка на *-л* у форме жаночага роду далучаецца элемент *-х* як паказчык прошлага часу: *далахъ, змыслилахъ, зналахъ, знашлахъ, пришлахъ, слышалахъ, слюбилахъ, ѕчинилахъ, хотелахъ*. Тыповымі ўзорамі такіх ужыванняў з'яўляюцца наступныя прыклады: жадаючи тебе видети и знашлахˢ тѧ (ПС, 14); Она же едъши и ѕтираючи ѕста своѧ речеть не ѕчинилахъ зла (ПС, 46); ꙗко мирра избраннаѧ далахъ сладкость доброго запаху (ІС, 39б); И змыслилахъ раба твоѧ (ДЦ, 91б); одиное речи малое пришлахъ просити ѕ тебе (ТЦ, 125); рано встала и хотелахъ накормити сына моего (там жа, 128б); истинна суть словѣса еже слышалахъ в земли моеи (там жа, 149б).

Выяўлена таксама некалькі выпадкаў, калі элемент *-х* далучаецца да іншых слоў у сказе: не хотела есми верити повѣдающимˢ мнѣ. Дондежехъ сама пришла и ѕзрела очима (ТЦ, 149б); И внегдахˢ кричала и слышалъ крикъ мои (КБ, 72). Зафіксаваны адзін выпадак ужывання гэтага элемента ў значэнні мужчынскага роду: что жъ есмъ ѕделалˢ ижехˢ с ними молвилъ (ПЦ, 36б). Як адзінкавы можна таксама адзначыць прыклад, калі дзеепрыметнік у форме жаночага роду з элементам *-хъ* спалучаецца з дапаможным дзеясловам прошлага часу, утвараючы такім чынам своеасаблівую форму плюсквамперфекта: Побѣдныѧ жертвы за здравие твое слюбилахˢ была (ПС, 14).

У чэшскай Біблії такім скарынінскім утварэнням адпавядаюць звычайныя перфектныя формы са звязкай: Y myslila gsem služebnicze twa. Budu mluwiti k krali — И змыслилахъ раба твоѧ буду тако молвити къ царю (ДЦ, 91б — 92); Jaa gsem dala dijewku swu do luona tweho — сѣ азъ далахъ рабу мою до лона твоего (КБ, 29).

Такія штучныя ўтварэнні зусім невядомы іншым помнікам таго часу — як беларускім, так і царкоўнаславянскім. У «Астрожскай біблії» ім адпавядаюць звычайныя формы аорыста: Азъ далахъ рабу мою до лона твоего (КБ, 29) — се азъ дах раб8 мою въ р8цѣ твои. Можна меркаваць, што перакладчык элемент *-хъ* форм аорыста ўспрымаў як абагульнены паказчык прошлага часу і далучаў яго да адпаведных форм жаночага роду, збліжаючы іх такім чынам з аарыстычнымі формамі тыпу *дахъ, начахъ, слышахъ*.

Разнастайныя формы аорыста Скарына вельмі часта выкарыстоўваў у сваіх прадмовах: камень безˢ руку ѡтсечесѧ ѡт скалы и порази образъ и сотре ѝ во прахъ, самъ же возрасте великъ и наполни весь светъ (ДП, 2); Тиѝ же смотреша и презреша мѧ, разделиша собѣ ризы моѧ, и о одежи моеѝ меташа жребиѧ (КЛ, 4б).

ІМПЕРФЕКТ

Формы імперфекта, як і аорыста, у выданнях Скарыны ўтвараюць звычайную катэгорыю прошлага часу. У пераважнай большасці выпадкаў імперфект захоўвае сваё ранейшае зна-

чэнне — служыць для выражэння мінулага працяглага дзеяння, не абмежаванага ў часе. Яго формы ўтвараюцца ад асноў дзеясловаў незакончанага трывання.

Як вядома, у стараславянскай мове ўжываліся пераважна нясцягнутыя формы імперфекта тыпу *ведѣахъ, делаахъ, знаахъ, плакаахъ, хвалѧахъ, хождѧахъ*. Але ўжо і ў стараславянскай мове ў выніку дзеяння фанетычных працэсаў, асабліва асіміляцыі і сцягнення галосных гукаў, пачалі ўжывацца сцягнутыя формы імперфекта на *-ѣх-* або *-ах-*, у сувязі з чым некаторыя імперфектныя формы знешне супалі з аарыстычнымі ўтварэннямі. Гэта ўжо адлюстроўваецца пазнейшымі стараславянскімі помнікамі.

Як несумненную свядомую даніну старажытнаму формаўжыванню трэба разглядаць наяўнасць у выданнях Скарыны нясцягнутых форм імперфекта, з якіх па колькасці ўжыванняў пераважаюць формы 3-й асобы абодвух лікаў: Вса бо мерзости сиѧ они суть чинили, прото жъ в ненависти имеахъ их (КЛ, 39б); Сице же деѧше Иовъ по всѧ дни (КІ, 4б); онъ же имеаше двѣ жене (ПЦ, 5); Никто бо не смеаше послуговати во храме божиемъ (КЛ, 2б); онъ же не хотѧаше приити к нему (ДЦ, 93); не имеахомъ воды ко питию (ДЗ, 21б); последоваху богъ суетныхъ и суетнаѧ деѧху (ЧЦ, 220б); Людие не имеаху воды во граде и прото хотѧх8 предати градъ (КЮ, 11).

Аднак у выданнях Скарыны асноўнай граматычнай нормай выступаюць новыя сцягнутыя формы імперфекта. Апавядальным стылем біблейскага выкладу абумоўлена тое, што тут ужываюцца ў большасці формы 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку. У 3-й асобе адзіночнага ліку найбольш часта ўжываюцца формы тыпу *ведѧше, живѧше, идѧше, лежаше, можаше, плакаше, пребываше, прихожаше, седѧше, спаше, течаше, чинѧше, ѩдѧше* і інш. Старое граматычнае значэнне такіх форм відаць з наступных прыкладаў: М8дрость теже пребываше со мною (ЕК, 5); очи его были пошли и не можаше зрети (ПЦ, 12); Давыдъ же не ведѧше о томъ (ДЦ, 72); Олофернъ пакъ лежаше на ложи своемъ ѡт великого пиѧнства спаше твердо (КЮ, 20б); ѩвисѧ ему гсдь во пламени огнѧ посреди кусту. И виделъ иже кустъ горѧше а не изгорѧше (КВ, 8); вси людие племени и народове трѧслисѧ и боѧлисѧ его. Ихъ же бо хотѧше 8биаше и ихъ же хотѧше соблюдаше, и коихъ хотѧше возносѧше и коихъ хотѧше смиряѧше (ДП, 19б — 20).

Асабліва архаічную афарбоўку тэкстам Скарыны надаюць шматлікія формы імперфекта 3-й асобы множнага ліку тыпу *бежаху, бираху, вопрошаху, даваху, деѧху, живѧху, збираху, знаху, идѧху, можаху, пиѧху, приношаху, стоѧху, хотѧху, чинѧху, ѩдаху* і інш. Аб распаўсюджанасці такіх форм у выданнях Скарыны сведчаць сказы, дзе выкарыстоўваецца па некалькі імперфектаў 3-й асобы множнага ліку: видехъ тыхъ они же чинѧху безаконие, сеѧху неправду и пожинаху ю (КІ, 8б); Копыта ѡтпадаху с ногъ конѣмъ их егда 8текаху к вапне, и падаху с них мужи силний (КС, 13); ѡбычай 8бо имеаху егда собирахусѧ вси овце,

ѡтвалеваху камень и напоивши стада опѧть полагаху и̑ надъ ѕстиемъ кладезѧ (КБ, 52б); И схожаху ѕбо людие и збираху Манну около шатровъ и назбиравши ее мелѧху во жерновахъ, или толчаху ѕ ступе и зваривши во горнеци чинѧхѫ с нея покармы (ЛК, 27б); послужили суть богомъ чужимъ и поклонихусѧ тымъ ихъ же не знаху (ДЗ, 56б); Тии̑ же часто бываху в доме ѧхимове, и прихожаху к нимъ вси людие они же имеаху суды (ДП, 35).

Як вядома, у старажытнарускай пісьменнасці ў многіх формах імперфекта 3-й асобы множнага ліку развіўся другасны канчатак *-ть*, што стала факультатыўнай нормай. У Скарыны адзначаецца толькі адна такая форма: И оставилъ *их* ѕ царѧ Моавского и пребывахуть ѕ него по всѧ дни (ПЦ, 47).

Формы імперфекта належаць да тых яркіх царкоўнаславянскіх рыс, якія Скарына свабодна выкарыстоўваў у арыгінальных частках сваіх выданняў: онъ же к тому имеаше царство Вавилонское (КЮ, 1б); иныи̑ поймали собъ девице в силоме граде егда танцеваху (КС, 46); Каинъ и Авель приношаху жертву гсдеви (КБ, 13); Моисеѧ нароженого хранѧху родители его (КВ, 6); Никто бо не смеаше послуговати во храме божиемъ (КЛ, 2б); Жертвы пакъ еже приношаху во храме едины бываху на кажъдыи̑ день (КЛ, 3); Тамъ роптаху людие на бога (ЛК, 4).

Чэшская Біблія 1506 г., вядома, не была крыніцай імперфектных форм для Скарыны. Яны з'явіліся ў яго пад уздзеяннем царкоўнаславянскіх узораў. У большасці выпадкаў скарынінскія імперфекты супадаюць з ужываннем іх у «Астрожскай бібліі»: во единъ день сынове Іовови и дщери его ѧдѧху и пиѧху вино въ дому брата ихъ (КІ, 5) — ѧко сеи̑ дн҃ь сн҃ве Іовови и дщерѧ его ѧдѧхѫ и піахѫ вино въ домѫ брата своего; Гелиі̑ же жрець седѧше на кресле своемъ при дверѧхъ храму (ПЦ, 5б) — Иліи же жрець сѣдѧше на прстлѣ при празе двери храма; одеваху его ризами многими, и не можаше согретисѧ (ТЦ, 120) — одѣвахѫ и̑ ризами многими, и не съгрѣвашесѧ; имеаху двери тайные подъ столомъ, ими же вхожаху, и пожираху всѧ сѫщаѧ во храме (ДП, 38б) — Сіи же имѣахѫ под трапезою съкровенъ вход и вхождахѫ тѣмъ всегда і изъѧдахѫ е́.

Аднак у Скарыны імперфект часам ужываецца і там, дзе ў «Астрожскай бібліі» стаіць аорыст: Тогда ѡтшедъ Самуилъ и спаше (ПЦ, 10) — І иде самоилъ и спа; Жена едина *ѡт* женъ пророческих вопиаше ко Елисею (ЧЦ, 190) — жена бѣ еди̑на *ѡт* сн҃овъ пророчъ и возопи къ іелисееви; ѧковъ же идѧше пѫтемъ своимъ (КБ, 59) — Иаковъ иде на свои пѫть; и призвавъ их поведаше имъ сонъ (КБ, 74) — і исповѣда имъ фараонъ сонъ.

І наадварот, трапляюцца выпадкі, калі імперфектным формам «Астрожскай бібліі» ў Скарыны адпавядаюць перфектныя ўтварэнні, аб чым ужо гаварылася вышэй. Аднак асноўная колькасць імперфектных ужыванняў у Скарыны адпавядае іх традыцыйнаму граматычнаму значэнню. Гэта паказвае, што перакладчык свядома выкарыстоўваў такі спецыфічны сродак царкоў-

наславянскай мовы з мэтай надання выкладу спецыфічнага адцення ўрачыстасці і ўзнёсласці ў адрозненне ад звычайных сродкаў жывой беларускай мовы.

У выданнях Скарыны асабліва стракаты малюнак маюць формы прошлага часу дзеяслова *быти,* якія характарызуюцца разнастайнасцю фанетыка-марфалагічных варыянтаў. Формы аорыста гэтага дзеяслова замацаваліся ў якасці дапаможнага дзеяслова ў складзе ўмоўнага ладу, і гэта, несумненна, паслужыла прычынай таго, што ў тэкстах Скарыны для прошлага часу ў большасці выкарыстоўваюцца формы імперфекта *бѣхъ — бѣ — бѣхомъ — бѣсте — бѣху.* Усе члены гэтай парадыгмы адлюстраваны ў кнігах Скарыны: Братъ бехъ змиемъ и товаришъ пструсомъ (КІ, 36б); Пришлець бѣхъ в земли чужъдей (КВ, 7б); рече Саѳлъ къ отроку иже бѣ с нимъ (ПЦ, 18б); се тѳ бѣ жена вдовица (ТЦ, 167б); раби бѣхомъ фараонови во египте (ДЗ, 18); мы ѩкобы прузи мали бехомъ пред ними (ЛК, 34); вы бѣсте приходы в земли египетской (КЛ, 38); вы пришелци бесте в земли египетской (КВ, 41б); Богаты ѳбо бѣху велми и жити вкупѣ не могоша (КБ, 66); не можаху пити воды ѡт Мараѳы понеже горки беху (КВ, 30).

З гэтага рада асабліва часта выкарыстоўваецца форма 3-й асобы адзіночнага ліку *бѣ (бе),* што выклікана кантэкстам: Бѣ человѣкъ той богатый велми (ПЦ, 52б); бе хром на обе нозе (ДЦ, 82); возрение его бѣ грозно зело (ДП, 8б). Гэта словаформа скарынінскіх перакладаў у большасці адпавядае формаўжыванню «Астрожскай бібліі»: бѣ мужъ той силный и богатый (ЧЦ, 193) — сіи мѳж бѣ веліи и силенъ; земля же бѣ неплодна и неѳкрашенна (КБ, 9) — земля же бѣ невидима и неоукрашена.

Аднак у формах 3-й асобы абодвух лікаў часта ўжываюцца і нестандартныя формы, утвораныя шляхам кантамінацыі імперфектнай асновы з канчаткамі аорыста ці наадварот: онъ же беаше на Иоръдани (ІС, 3б); бѣше человѣкъ той непороченъ и праведенъ (КІ, 4); позналъ его царь Ізраилевъ ѩко ѡт пророкъ единый беше (ТЦ, 176б); Слышалъ ѳбо ѩко болѣнъ баше Езехия (ЧЦ, 229); не баше тѳ воды людемъ пити (КВ, 33); дела великая баше емѳ на земли (КІ, 4б); бѣша ѳ него тысеща и четыриста возовъ (ТЦ, 151); одолеша людие иже бѣша подъ Амриею, надъ тыми людьми иже быша под Тевниемъ (ТЦ, 166); Збилъ вся сосуды златый иже беша во храме (ЧЦ, 238); Не сия ли бахѳ слова еже молвихомъ тобе во египте (КВ, 28).

Некаторыя з такіх форм рэдкія нават у старославянскіх помніках або адсутнічаюць там наогул. Немагчымасць кантролю з боку жывога ўжывання з'явілася асноўнай прычынай узнікнення такіх штучных форм, якія для перакладчыка паслужылі сродкам надання кніжнага каларыту біблейскаму тэксту.

ПЛЮСКВАМПЕРФЕКТ

У перакладных выданнях Скарыны формы даўномінулага часу, або плюсквамперфекта, з'яўляюцца звычайнай катэгорыяй прошлага часу дзеяслова. Старажытная, даволі рэдкая форма плюсквамперфекта, у якой дапаможны дзеяслоў *быти* выражаўся старой імперфектнай формай, у Скарыны адзначаны толькі адзінкавымі прыкладамі: Гелий же бѣ состарелсѧ вельми (ПЦ, 8б); веръни ми жену мою Михолю, юже бѣхъ собѣ слюбилъ (ДЦ, 71); прозвалъ имѧ граду тому иже бѣ поставилъ, именемъ Сомѣровымъ (ТЦ, 166).

Асноўнай формай у Скарыны з'яўляецца плюсквамперфект новага ўтварэння, у склад якога ўваходзіць дзеепрыметнік на *-л* і дапаможны дзеяслоў *быти* ў форме перфекта адпаведнай асобы і ліку. Такі плюсквамперфект зрэдку сустракаецца ўжо ў стараславянскіх помніках і ў царкоўнаславянскіх тэкстах усходнеславянскай рэдакцыі. Аднак граматыкі Л. Зізанія і М. Смотрыцкага іх не прыводзяць.

Плюсквамперфект новага ўтварэння ў Скарыны сустракаецца двух відаў: са звязкай у складзе перфекта дапаможнага дзеяслова і без звязкі. Формы са звязкай выкарыстоўваюцца параўнальна рэдка: рознемоглсѧ есмъ былъ днесь (ПЦ, 62б); ѣвилсѧ естъ былъ гсдь Самуилови въ силомѣ (ПЦ, 11); Авесаломъ пакъ его же помазали есмо были собѣ на црство в бой забитъ естъ (ДЦ, 103б); Принѧли были есмо его ѣко чужоземца (КЕ, 24б).

Граматычнай нормай у Скарыны з'яўляецца плюсквамперфект без звязкі ў складзе дапаможнага дзеяслова. Такі плюсквамперфект па сваёй структуры супадае з адпаведнымі формамі сучаснай беларускай мовы, адрозніваючыся толькі фанетычнымі паказчыкамі: Самуилъ пакъ вже оумерлъ былъ (ПЦ, 59); Іоавъ же и мѫжи его пришли были потомъ (ДЦ, 71б); Сирѧне пакъ везде наполнили были землю (ТЦ, 175); онъ же вже былъ перебегъ ѫ часовнику (ЧЦ, 229); теже былъ самъ ѫмеръ въ грѣсе своемъ (ІН, 42б); Царь Медийский подбилъ былъ многиѧ ѣзыки подъ свою власть (КЮ, 3); Вси тии собралисѧ были до долины лесное (КБ, 26б); Самъ ѫбо толико Царь Огъ оставъ былъ ѡт племенѧ волотовъ (ДЗ, 10б).

У кнігах Скарыны, як і наогул у старажытных славянскіх мовах, плюсквамперфект абазначае ў большасці дзеянне, якое адбылося раней за якое-небудзь іншае мінулае дзеянне. Ён ужываецца пераважна ў тых частках складаназалежных сказаў, якія паясняюць сэнс галоўных сказаў: людие Ізраилевы иже были оутекли предъ филистымлѧны навратилисѧ воспѧтъ (ДЦ, 113); очистилъ вси нечистоты Ідольский, еже поделали были ѡтци его (ТЦ, 162б); погубилъ естъ слугъ тыхъ они же забили были ѡтца его (ЧЦ, 213б); вси сосуды церковные еже былъ побралъ Навходносоръ царь во храме Саломоновѣ имъ вернулъ (КЮ, 1б — 2); вси речи иже побрали были врази ихъ, привезли суть

с собою (КЮ, 24); Очи же Ізраилевы затмилисѧ были старости делѧ великое, и ꙗсне гледети не могъ (КБ, 89); съвлѣчеть с себе ризы в нѧ же сѧ былъ облекъ входѧй во свѧтыню (КЛ, 33); Тых^{s} же который хотели были загубити Даниила вовергоша въ ꙗму ко львом^{s} (ДП, 40).

У многіх выпадках плюсквамперфект абазначае дзеянне, аднесенае проста ў мінулае безадносна да якога-небудзь іншага мінулага дзеяння. У такіх выпадках плюсквамперфект мае значэнне, блізкае да аорыста,— ён выражае аднесенае да мінулага дзеянне як поўнасцю закончаны ў мінулым акт. Такое значэнне плюсквамперфекта лёгка ўстанаўліваецца кантэкстам: Он^{s} же был^{s} первей перевезъ Царѧ черес^{s} Іоръданъ (ДЦ, 105); Царь Давыдъ вже былъ состарелсѧ (ТЦ, 120); Им^{s} же обещалъ былъ дати землю плынущую млекомъ и медом^{s} (ІН, 11б); Розмоглсѧ ȣбо былъ гладъ на земли (КБ, 24); всѧка ȣбо плоть порушила была путь свой на земли (КБ, 16б); сѣ рогъ иный малый выраслъ былъ спосреди ихъ (ДП, 23б).

Параўнанне скарынінскага перакладу з тэкстам чэшскай Бібліі 1506 г. паказвае, што ў большасці выпадкаў плюсквамперфект Скарыны адпавядае такой жа форме чэшскага тэксту: zgewilse gest byl pan Samuelowi w Sylo — ꙗвилсѧ естъ былъ гсдь Самуилови въ силомѣ (ПЦ, 11); oczy mu byly possly, že giž ne mohl wideti — очи его были пошли и не можаше зрети (ПЦ, 12); byl zkazyl modly Baal, kterež byl zdielal otecz geho — сказилъ кумиры Ваалевы, еже былъ оучинилъ отець его (ЧЦ, 188); Gezy pak byl przedssel ge — Езий пакъ былъ предшол^{s} *их* (ЧЦ, 192).

Аднак трапляюцца выпадкі, калі плюсквамперфекту чэшскага тэксту ў Скарыны адпавядае аорыст або імперфект: služebnyczy Semey vtekli byli k Achys — побѣгоша раби Семееви къ Ахису (ТЦ, 126б); Z zemie pak syrske byli wyssli nieyaczij lotrzykowe — ѡ*т* земли пакъ Сир^{s}ское исхождѧху неѧций разбойници (ЧЦ, 193).

Але ў параўнанні з «Астрожскай бібліяй» плюсквамперфект у Скарыны ўжываецца больш часта, бо ў «Астрожскай бібліі» ў многіх адпаведных кантэкстах выкарыстоўваецца аорыст або імперфект ці наогул іншыя граматычныя сродкі: Корабль теже великий оуделалъ былъ царь Саломонъ (ТЦ, 148б) — И сътворй цр҃ѣ соломо*н* корабль; показали ему сыновѣ его путь имъ же былъ ѡ*т*шолъ мужъ божий (ТЦ, 158) — и показаша емȣ сн҃ове его пȣть им^{s} же иде чл҃къ бжій; И очистилъ вси нечистоты Ідольский, еже поделали были ѡ*т*ци его (ТЦ, 162б) — і искорени всѧ изваѧннаѧ ꙗже сътвориша ѡ*т*цы его; погубил^{s} естъ слугъ тыхъ они же забили были ѡ*т*ца его (ЧЦ, 213б) — избй рабы своа. оубившаа ѡ*т*ца его.

У параўнанні з іншымі формамі прошлага часу плюсквамперфект у выданнях Скарыны — найменш ужывальная форма, ён складае толькі 2,5 % ад агульнай колькасці форм прошлага

часу. Тлумачыцца гэта ў першую чаргу ўмовамі кантэксту, дзе рэалізацыя плюсквамперфекта была абмежаванай. На характар ужывання гэтай формы несумненны ўплыў аказала чэшская Біблія. Разам з тым тут можна бачыць і арыентацыю на жывое беларускае формаўжыванне, паколькі плюсквамперфектныя формы выкарыстоўваліся ў старабеларускай пісьменнасці на працягу ўсяго старажытнага перыяду, захоўваюцца яны і ў сучаснай беларускай мове. Па ўзору плюсквамперфекта ў Скарыны адзначаюцца адзінкавыя ўтварэнні, якія не маюць аналогіі ў іншых тагачасных крыніцах: Побѣдныѧ жертвы за здравие твое слюбилахъ была (ПС, 14); И поѧхъ ю былъ собѣ за жену (КБ, 25).

ПЕРФЕКТ

У выданнях Скарыны асноўным сродкам выражэння прошлага часу служыць перфект, які ў многіх выпадках ужываецца на месцы аорыста і імперфекта тагачасных царкоўнаславянскіх тэкстаў. Больш шырокае выкарыстанне ў перакладах Скарыны перфектных утварэнняў з'яўляецца заканамерным адлюстраваннем разбурэння ранейшай сістэмы прошлага часу ў жывой мове, дзе ў часы Скарыны асноўнай формай выражэння прошлага часу стаў перфект. Як і ва ўсёй старабеларускай пісьменнасці, структурныя асаблівасці скарынінскаму перфекту надае ў першую чаргу аблічча звязкі, якая зазнала пэўныя фанетыка-марфалагічныя змены як пад уздзеяннем беларускай народна-дыялектнай мовы, так і ў выніку іншамоўных уплываў.

Па даўняй традыцыі звязка звычайна ўжываецца пры адсутнасці асабовага займенніка ў функцыі дзейніка. У формах перфекта 1-й асобы адзіночнага ліку звязка ўжываецца ў варыянтах *есмъ* і *есми,* прычым другі варыянт па частотнасці яўна пераважае над першым: наделалъ есми собе домовъ, садилъ есми виногради, ѕчинилъ есми собѣ огороды и сады, и насадилъ есми е ѡт всѧкого плоду древиемъ, и наделалъ есми собѣ рыбниковъ (ЕК, 4б); грады его далъ есми поколению Рувинову (ДЗ, 11); ѕчинилъ есми тобѣ имѧ велико и славно (ДЦ, 78б); далъ есми тобе серце мудро и разумно (ТЦ, 128); сребро то закопалъ есми въ землю (ІН, 16); вси земли подбилъ есми подъ власть свою (КЕ, 20); поѧлъ есми ю собѣ за жену (КБ, 36); ѕмыслила есми сама въ серци своемъ (КЮ, 17).

Нарматыўнасць такога ўжывання звязкі *есми* пацвярджаецца прыкладамі з прадмоў Скарыны, якія напісаны выдаўцом самастойна, незалежна ад царкоўнаславянскіх узораў: О томъ ширей написалъ есми въ предословии (КЕ, 2); О томъ кратко ткнулъ есми во предословии своемъ (ДЗ, 2б); Положилъ есми в сихъ книгахъ образци Храму (ТЦ, 119б).

Сінанімічны варыянт *есмъ,* які ўяўляе сабой фанетычны рэфлекс старажытнай формы *есмь,* у тэкстах Скарыны ўжываецца ў тых жа кантэкстных умовах, што і форма *есми:* В ты часы

реклъ есмъ к̀ вамъ (ДЗ, 5б); Око былъ есмъ слепом8 и нога хромому (КІ, 34б); азъ есмъ споилсѧ с тобою (ІС, 59); З войска Ізраильскаго 8бежалъ есмъ (ДЦ, 66б); жаль ми иже поставилъ есмъ Са8ла царемъ (ПЦ, 31б).

Вельмі часта ў выданнях Скарыны абодва варыянты звязкі ўжываюцца побач у адным і тым жа сказе. Такую варыяцыю раўназначных граматычных сродкаў можна тлумачыць імкненнем перакладчыка пазбегнуць аднастайнасці ў выкладзе, зрабіць мову больш гнуткай і рытмічнай: ожидалъ есми словъ ваших, и слышалъ есмъ раз8мность ваш8 (КІ, 38б); Добылъ есмъ собѣ слугъ и служебниць, и имелъ есми челѧдь великую (ЕК, 4б); 8слышалъ есми молитву твою, и возрѣлъ есмъ на плачь твой (ЧЦ, 228б); Искала есми его и не знашла есмъ (ПП, 5). Такое ж паралельнае выкарыстанне абедзвюх форм звязкі назіраецца не толькі ў асноўным біблейскім тэксце, але і ў прадмовах Скарыны: О томъ ширей написалˢ есми въ предословии (КЕ, 2); о томˢ более дотъкнулˢ есмъ въ предмолве своей (там жа, 2б).

У чэшскім арыгінале скарынінскім формам звязкі *есми* і *есмъ* адпавядае адна толькі форма *gsem:* Widiel gsem trapenije lidu meho w Egiptu — виделъ есмъ беду людей моихъ во египте (КВ, 8); Tehdy rzekl gsem wam toho czasu — В ты часы реклъ есмъ к вамъ (ДЗ, 5б); Z woyska žydowskeho vtekl gsem — з войска Ізраильскаго 8бежалъ есмъ (ДЦ, 66б).

Звязка ў складзе перфекта 2-й асобы адзіночнага ліку ў выданнях Скарыны таксама адзначаецца ў двух варыянтах: *еси* і *есь (есъ)*. Старажытная форма *еси,* адзіная ў царкоўнаславянскай мове, у старабеларускай пісьменнасці ўжывалася на працягу ўсяго старажытнага перыяду. Таму зусім натуральным з'яўляецца ўжыванне яе і ў тэкстах Скарыны: воздвиглъ еси прозбы прѣдъ богомъ (КІ, 20); исторглъ еси мѧ ѡт часу злого (ІС, 80б); пришла еси в люди незнаемые (КР, 4б); почто не поставилъ мнѣ еси храму кедрова (ДЦ, 78); возлезъ еси на ложе ѡтца своего (КБ, 90); сее слово еже реклъ еси вчиню (КВ, 63б); образу златому еже поставилъ еси не кланѧемсѧ (ДП, 11б).

Зусім новай з'явай, фактычна невядомай беларускай пісьменнасці папярэдняй эпохі, трэба лічыць шырокае ўжыванне Скарынам скарочанага варыянта звязкі *есь (есъ):* руцѣ 8труженыхъ посилѧлъ есь ты (КІ, 8б); се ты 8же состарелсѧ есь (ПЦ, 17); ты ходилъ есь прѣдъ лицемˢ моимъ (ТЦ, 143); поведилъ ми есь ложъ (КС, 35); почто 8чинила есь сее (КБ, 12б); рекъ есь знаю тѧ по имени (КВ, 63б); Бога родшего тѧ оставилъ есъ (ДЗ, 61б); воистину солгалˢ есь на главу свою (ДП, 37); чему жˢ обидилˢ есъ мѧ (КБ, 53б); 8чинилъ есь злое предъ очима его (ПЦ, 32).

Як і ў іншых выпадках, Скарына нярэдка выкарыстоўвае абодва варыянты ў адным і тым жа кантэксце, чым дасягаецца звычайная для Скарыны варыянтнасць: что сѣ вчинити восхотелˢ есь иже извелъ еси насъ изъ египта (КВ, 28); палсѧ еси на корис-

техъ, и 8чинилъ есь злое предъ очима его (ПЦ, 32); сѣ с путѧ далеко пришолъ еси, прочто не шолъ есь в домъ свои спати (ДЦ, 84б); сохранилˢ еси ѡтцу моему Давыду всѧ еже глаголалъ есь (ТЦ, 243); раздралъ еси ризы свое и плакалсѧ есь предо мною (ЧЦ, 233); сѣ вже есь состарелъсѧ, и долго еси былъ живъ (ІН, 27); чего не имелˢ есь вчинити 8чинилъ еси нам (КБ, 36); гость еси ты и вышолъ есь ѡт места своего (ДЦ, 94б); Се ты на8чалъ еси многихъ и руцѣ 8труженыхъ посилѧлъ есь ты (КІ, 8б); людие твои ихˢ же вывелˢ еси изˢ египта скоро пошли суть с путѧ еже показалˢ есь имъ (ДЗ, 22б).

Звязка *есь* у складзе перфекта 2-й асобы адзіночнага ліку шырока выкарыстоўваецца таксама ў неперакладных выданнях Скарыны, асабліва ў «Малой падарожнай кніжцы». У «Псалтыры» гэтага выдання трапляюцца выразы: изгналъ есь ꙗзыки (71б); ѡтвратилˢ есь помощˢ (79б); разгневалсѧ есь (51б); подалъ есь добротѣ моеи сил8 (25б); стерлъ есь главы змиемъ (64б). У іншых частках «Малой падарожнай кніжкі» звычайнымі з'яўляюцца выразы: спасенияѧ нашего помощница была есь; далˢ ми есь познати тебе; избавилъ есь триехъ мужевъ; наказала есь окраденыхъ 8момˢ; распѧтие принѧлъ есь; во плоти ꙗвилсѧ есь і інш. У «Малой падарожнай кніжцы» ў такім выглядзе ўжываецца гэта звязка і як састаўная частка іменнага выказніка: ты 8бо есь знамение; ты 8бо есь наставникъ спасению; длѧ грѣховъ порабощенъ есь; ты есь сынъ мои возлюбленныи і г. д.

У царкоўнаславянскай мове часоў Скарыны звязка *есь* зусім не ўжывалася. Напрыклад, скарынінскай фразе почто вчинилъ ми есъ тако (КБ, 53б) у «Астрожскай бібліі» адпавядае что се сътворил еси. Крыніцай гэтай формы для Скарыны не паслужыла і чэшская Біблія, бо там паслядоўна для 2-й асобы ўжываецца форма *gsy:* koho gsy haniel, a komus se ruhal, a proti komu gsy pozdwihl hlasu tweho a pozdwihl gsy wzhuoru oczij twych — кому еси ганилˢ и кому сѧ есь ругалˢ и на кого воздвигˢ гласъ твои, и вознесъ есь очи твое (ЧЦ, 227).

Звязка *есь* у складзе перфекта 2-й асобы адзіночнага ліку выкарыстоўвалася зрэдку і ў беларускай пісьменнасці пазнейшага часу, хоць ва ўсіх помніках яна займала падпарадкаванае становішча. Яе адпаведнік фактычна прысутнічае ў сінтэтычных формах перфекта тыпу *далесь, моглесь, реклесь,* што стала самай звычайнай з'явай у беларускай пісьменнасці з канца XVI ст. Скарынінскія выданні такіх утварэнняў не ведаюць зусім.

Істотныя асаблівасці ў выданнях Скарыны маюць формы перфекта 3-й асобы адзіночнага ліку. Яны наогул у параўнанні з іншымі формамі ўжываюцца найбольш часта, што тлумачыцца агульным апавядальным стылем біблейскага выкладу. Тут адрозніваюцца два тыпы форм: са звязкай і без звязкі. Асноўнае адрозненне перфекта 3-й асобы заключаецца ў тым, што звязка ўжываецца пры наяўнасці дзейніка, выражанага назоўнікам або асабовым займеннікам, або калі дзейнік фармальна адсут-

нічае, але лёгка ўстанаўліваецца з кантэксту. У Скарыны звязка ўжываецца выключна ў цвёрдым варыянце — *естъ,* прычым у многіх выпадках спалучэнне зычных літар *ст* выносіцца над радком: была естъ жена красна вельми (ДЦ, 84); онъ же былъ *ест* мужъ боевный (ІН, 33); предо всею братиею своею 8мерть естъ (КБ, 45б); В ты часы былъ естъ мужъ единъ Евреанинъ во граде Зузе (КЕ, 5б); всѧ сиѧ видело *ест* око мое (КІ, 18); сталсѧ *ест* гладъ в земли Іюдине (КР, 2); Царь скоро восталъ естъ с престола своего (КС, 9); великий страхъ напалъ естъ на страны тые (КЮ, 5б); многыхъ погубило естъ вино (ІС, 51); солнце разуму не взошло естъ намъ (ПБ, 8); Заклѧлъ естъ Са8лъ людей клѧтвою (ПЦ, 28б); въ сѣдмый день сталасѧ естъ битва (ТЦ, 175б); Царь розослалъ естъ послы по въсей земли (ЧЦ, 233б).

Крыніцай такога ўжывання для Скарыны паслужыла, несумненна, чэшская Біблія, дзе ў адпаведных месцах ужываецца звязка *gest:* dokonal gest buoh dne sedmeho praczy swú — дакончалъ *ест* богъ днѧ шестаго дело свое (КБ, 10б); Stalo se když vmrzel gest kral Saul — бысть внегда 8мерлъ естъ царь Са8лъ (ДЦ, 66); meży zmužilymi stal se gest swar — межи силными сталсѧ *ест* сваръ (КС, 12б); ne chtiel gest odienecz zabiti geho — не хотелъ *ест* отрокъ забити его (ПЦ, 64); Duom pak swuoy dielal gest Ssalomun trzynaczte let — Домъ пакъ свой делалъ естъ царь Саломонъ тринадесеть лѣтъ (ТЦ, 136б).

Ужыванне звязкі ў складзе перфекта 3-й асобы адзіночнага ліку ўспрымалася перакладчыкам як асноўная граматычная норма гэтай дзеяслоўнай формы. Скарына нярэдка ўжываў звязку нават у сказах, дзе ў чэшскім арыгінале яна адсутнічае: Olofernes druheho dne przykazal woysku swemu — Олоферн дрⷭгаго днѧ приказалъ естъ войску своему (КЮ, 11); Y vdelal Abraham hody welike — И вделалъ *ест* Авраамъ пиръ великий (КБ, 37); A byla panna naramnie sliczna — И была естъ девица красна вельми (ТЦ, 120б); Stalo se slowo na dworze Nabochodonozora krale — сталосѧ естъ слово на дворе Навходносора царѧ (КЮ, 4). Прыкладаў такога несупадзення вельмі многа.

Аб нарматыўнасці для Скарыны перфекта са звязкай у 3-й асобе адзіночнага ліку сведчаць і шматлікія прыклады ўжывання такіх форм у прадмовах выдаўца: Каинъ теже позналъ естъ грехъ свой (ДЗ, 2); нашъ спаситель реклъ естъ (ПС, 1б); о немъ же прежде написалъ естъ царь Саломонъ (ПП, 2б); во днѣхъ судей дѣласѧ *ест* речь таѧ (ПЦ, 2—2б). Аб гэтым жа сведчаць і выпадкі ўжывання перфекта такой канструкцыі і ў кантэкстах царкоўнаславянскіх віленскіх выданняў, дзе ў «Астрожскай бібліі» ўжыты аорыст: скоро трусъ земли сталсѧ *ест* великъ (ДА, 49б) — внезап8 же трусъ бысть веліи; прѣбылъ *ест* т8 павелъ полтора лѣта (ДА, 54) — сѣде же лѣто и мѣсѧца шесть; Длѧ того поддалъ *ест их* въ жадости не8чьтивыѧ (ПА, 6б) — Сего ради предастъ ихъ бг̃ъ въ страсти безчестіѧ.

У складзе перфекта 1-й асобы множнага ліку ўжываецца толькі звязка *есмо,* якая адпавядае форме *gsme* чэшскага арыгінала: Ja a žena tato bydlely gsme w gednom domie — Азъ и жена сиѧ жили есмо въ единомъ домѣ (ТЦ, 128б). Вельмі паказальна, што ў Скарыны зусім не ўжываецца старажытная, заканамерная для 1-й асобы множнага ліку форма *есмъ,* паколькі ў 1-й асобе адзіночнага ліку побач з новай формай *есми* ўжывалася і *есмъ,* якая ўзнікла ў выніку зацвярдзення колішняга мяккага *-мь.* Такім чынам, Скарына свядома выкарыстаў новую форму *есмо,* самую распаўсюджаную ў беларускай пісьменнасці ўжо з канца XIV ст. У большасці выпадкаў гэта звязка ўжываецца пры адсутнасці фармальна выражанага дзейніка — асабовага займенніка *мы:* въ безаконiй нашемъ сотлѣли есмо (ПБ, 8б); Шли есмо сухою ногою по глубокости Іордана (ІН, 11); сѣ пришли есмо к горѣ Аморейской (ДЗ, 6б); в ден^{s} добрыѧ пришли есмо к тобѣ (ПЦ, 53). Асабовы займеннік у такіх канструкцыях ужываецца вельмі рэдка: мы познали есмо тебе (ІС, 58).

У 2-й асобе множнага ліку ў Скарыны паслядоўна ўжываецца старажытная форма звязкі *есте,* ніякіх іншых фанетыка-марфалагічных варыянтаў тут няма: вы есте вчинили все злое сее (ПЦ, 24); не хотели есте послушати гласа моего (КС, 14); вы гледели есте на тое очима вашима (ДЗ, 14); ѕчинили есте милосердие на*д* господином своимъ, иже похоронили есте Саѕла (ДЦ, 68); розделите користь юже побрали есте *ѡт* враговъ ваших (ІН, 42). У чэшскім арыгінале ў такіх канструкцыях ужываецца звязка *gste:* Tehdy gste mi odpowiedieli — Тогда ѡтповѣдели есте мнѣ (ДЗ, 6). Наогул жа формы перфекта 2-й асобы множнага ліку ўжываюцца значна радзей у параўнанні з формамі іншых асоб, бо выкарыстанне іх уласціва выключна дыялагічнай мове. Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены формы перфекта польскага ўзору, дзе звязка 2-й асобы множнага ліку зліваецца з дзеепрыметнікам у адно слова, утвараючы, такім чынам, сінтэтычную форму: Чемѕ противилистесѧ словомъ правды (КІ, 11); Мнѣ теже во всихъ делехъ послушни былисте (ІН, 41б).

У супрацьлегласць гэтаму звязка 3-й асобы множнага ліку *суть* у складзе перфекта, як і ў адзіночным ліку звязка *естъ,* ужываецца надзвычай часта, што тлумачыцца агульным апавядальным стылем біблейскага тэксту: Таковые слова глаголали суть во аде тиѧ, они же грешили сѕть (ПБ, 8б); друзи моѧ запомеѕли сѕть мене (КІ, 24б); даѧли суть имъ мужи из градовъ тыхъ дани (КС, 6); Волотовѣ же были суть на земли во дни оны (КБ, 16); Вси тые ѕстроилисѧ суть вкупе к бою (КЮ, 11); они вси пришли суть къ царю (ПЦ, 47б); тѕ пали суть щитовѣ силныхъ (ДЦ, 67б); Они же давали суть покарм^{s} и оброки ѕрченые царю (ТЦ, 129б).

Тут, як і ў 3-й асобе адзіночнага ліку, скарынінская звязка *суть* у пераважнай большасці выпадкаў адпавядае чэшскім канструкцыям са звязкай *gsu:* nassli gsu pole w zemi Semarskie —

знашли суть полѣ в земли Сеннар (КБ, 22б); tu padli gsu sstijtowe sylnych — тѫ пали суть щитовѣ силныхъ (ДЦ, 67б); Y ssli gsu odtud s weselijm — И шли суть ѡттуду з вѣселиемъ (ТЦ, 123); Tehdy poslalí gsu posly swee ze wssech miest — Тогда послали суть послы своѧ со всѣх градовъ (КЮ, 5).

Але ў Скарыны звязка *суть* нярэдка ўжываецца і ў кантэксце, дзе яе няма ў чэшскім арыгінале: Zebee pak a Salmana odpoczywali s ostatkem lidu — Зевей же и Салманъ ѡтпочивали суть в тои часъ с остаткомъ людей (КС, 19); A wzemsse na se odienije swe boyowne wosadili mijesta vzka — И вземши на сѧ зброе осадили суть ѯзкаѧ места (КЮ, 11); wysechly czysterny y lauže wod — высохли сѯть кладези дождевые и лужи (там жа, 11б). Тут таксама звязка *суть* выступае як агульная норма скарынінскай пісьмовай мовы.

Разам з тым у выданнях Скарыны ўжываюцца і формы перфекта без звязкі. Гэта мае месца пераважна ў 3-й асобе адзіночнага і множнага ліку ў выразах, калі дзейнік выражаны назоўнікам ці займеннікам або калі ён лёгка ўстанаўліваецца з папярэдняга выкладу: ѯхо слышащее благославило мене (КІ, 44б); Не хотелъ Аммонъ высѯхати прозбы еѧ (ДЦ, 89); Илиѧ закрилˢ лице свое плащемъ, и вышедъ сталˢ ѯ дверей пещеры (ТЦ, 172б); Епископˢ взѧлˢ скриню и оковавˢ ю ѯделалˢ зверху дирю (ЧЦ, 210); Тои же идѧ з войскомъ казилъ вси речи (КЮ, 4); жена моѧ породила мнѣ два сына (КБ, 82б); они же тогда кричали к бою идуще (ПЦ, 36); тогда собравшесѧ вси пришли искати Давыда (ДЦ, 75—75б); Халдеи же добывали града около лежаще (ЧЦ, 239); оградили села своѧ и навозили житъ готующесѧ к бою (КЮ, 6); склонившисѧ людие поклонилисѧ до земли (КВ, 24). Тут таксама выяўляецца пэўная залежнасць ад чэшскага арыгінала — у Скарыны звязка звычайна адсутнічае там, дзе яе няма і ў чэшскім тэксце: Sedm klasuow wzrostlo z stbla gednoho — Седмъ класовъ выросло с стебла единого (КБ, 74); Rano take rosa ležala wuokol woyska — Рано теже роса лежала около становъ (КВ, 31б); Buoh otczuow wassych poslal mie k wam — богъ ѡтцѣвъ вашихъ послалъ мѧ к вамъ (КВ, 8б); ne chtielo srdcze me wijecze praczowati — не хотело срдце мое болѣе тружатисѧ (ЕК, 5б); dal gemu dczeru swu za manželku — далъ емѯ дщеру свою за жену (КС, 5); w tiech dnech ne bywalo widienije zgewne — во днехъ тыхъ не бывало видение ѡткрываемо (ПЦ, 9б).

Граматычная і семантычная раўназначнасць форм перфекта са звязкай і без яе пацвярджаецца прыкладамі, дзе перфектныя формы абодвух відаў ужываюцца побач у адным і тым жа сказе: светло правды не светило намъ и солнце разуму не взошло естъ намъ (ПБ, 8); взѧвши ѝ пестуньѧ его бежала с нимˢ, и егда поспѣшала ѯтекаючи ѯпала естъ (ДЦ, 73б); всѧ земълѧ идумейскаѧ служила естъ Давыдови и дань давала ему (ДЦ, 81).

У мове Скарыны з формамі перфекта па структуры зближаюцца своеасаблівыя ўтварэнні са значэннем прошлага часу, якія ў мовазнаўчай літаратуры прынята называць новым даўнамінулым часам. Такія формы ўтвараліся ад так званых многакратных дзеясловаў, якія сваім лексічным зместам указваюць на паўтаральнасць дзеяння. У выданнях Скарыны зафіксаваны ў асноўным беспрыставачныя формы, якія ад звычайных форм перфекта адрозніваюцца наяўнасцю суфікса *-ива-* або *-ва-* з пэўнымі фанетычнымі змяненнямі зычнага ў аснове. Гэтыя формы асабліва часта ўжываюцца ў кнізе «Іоў»: ихъ же ѡтцевъ не хощивалˢ есми сажати со псы (КІ, 23); Некой межи прѣносиша, загонѧли стада, и пасывали суть ихъ (КІ, 30); они же глодывали кору во пустыни (КІ, 35б); внегда единый каждый находили к нимъ, съ крикомъ суть бегивали (КІ, 35б). Такія ўтварэнні трапляюцца і ў іншых кнігах: мати делывала ему одежу малу (ПЦ, 8б); въ таковой одежи хоживали девици дщеры царевы (ДЦ, 89); Съвѣща царь Ровоам съ мѫжми старыми иже стоивали суть предъ Саломономъ (ТЦ, 155); тако чинивали есте дщерамъ Ізраилевымˢ (ДП, 37); Дщеры бегивали по стене и прогневали его (КБ, 91); схожалъ столпъ облачный и стоивалъ ѕ дверей (КВ, 63); Мардохей седавалъ ѕ дверей полаты царевы (КЕ, 7).

Падобныя формы шырока ўжываліся ў беларускай дзелавой пісьменнасці на працягу ўсяго старажытнага перыяду, пачынаючы з канца XV ст. Але для Скарыны крыніцай іх паслужыла, несумненна, чэшская Біблія, паколькі ўжыванне іх аднолькавае ў абодвух помніках: w takowem russe chodijewaly panny dczery kralowske — въ таковой одежи хоживали девици дщери царевы (ДЦ, 89); Ay slychawali gsme, že kralowe Yzrahelssty gsu milostwy — Сѣ слыхивали есмо, иже цари Израилевы суть милостиви (ТЦ, 175б); A když tudy czasto chodijewal stawowal se v nije aby pogedl — И внегда туда часто ходивалˢ стоивалˢ ѕ нее ѣсти хлеба (ЧЦ, 190б).

Імперфектнае значэнне такіх форм выразна выяўляецца ў прыкладах, калі адзін і той жа дзеяслоў ужываецца ў розных формах у залежнасці ад сэнсу выказвання: И веселъ былъ естъ Олофернъ видѧй ю. И пилъ вина вельми много, иже николи такъ много не пивалъ в животе своемъ (КЮ, 20); не давалъ дани царю Асирскому, ꙗко прежде давывалˢ ест (ЧЦ, 220); А иные приношенїѧ бывахѕ за очищение... Теже иные приношенїѧ бывали з начатковъ житъ и овощевъ (КЛ, 3). «Астрожская біблія» зусім не ведае такіх форм. Тут ім адпавядаюць або імперфект, або іншыя дзеяслоўныя ўтварэнні.

Шматлікія прыклады выкарыстання Скарынам перфекта фактычна адлюстроўваюць стадыю пераўтварэння его ў абагульненую форму прошлага часу безадносна да вынікаў у момант гутаркі. Вялікі фактычны матэрыял дазваляе канстатаваць, што ранейшае граматычнае значэнне перфекта — указанне на сувязь мінулага дзеяння з сітуацыяй у момант гутаркі — зусім не вы-

трымліваецца ў мове Скарыны. Тут, несумненна, трэба бачыць уздзеянне формаўжывання чэшскага арыгінала, дзе формы аорыста і імперфекта наогул не ўжываюцца і іх ранейшыя значэнні перадаюцца перфектам. Аб граматычнай генералізацыі значэння перфекта ў выданнях Скарыны сведчаць шматлікія прыклады, калі скарынінскаму перфекту адпавядаюць аорыст або імперфект у «Астрожскай бібліі»: во днехъ тыхъ не бывало видение ѡткрываемо (ПЦ, 9б) — в ты дни не бѣ видѣніе посылаемо; И были т8 три сыны Сарвиины (ДЦ, 69) — и быша тамѡ три сынове сар8іевы; И была естъ девица красна вельми (ТЦ, 120б) — И бѣ юнотка добра видѣніемъ сѣло; Кому еси ганил^{s} и кому с҃ есь ругал^{s} и на кого воздвиг^{s} гласъ твой, и вознесъ есь очи твое (ЧЦ, 227) — Ком8 поноси и кого пох8ли, и на кого вознесе гласъ свой, и воздвиже на высот8 очи свой; И взм҃ла ѡт плоду его и ела и дала мужу своему он^{s} же елъ с нею (КБ, 12) — и въземши ѡт плода его и м҃де, и дасть и́ м8ж8 своему съ собою и м҃доста.

Аб адсутнасці ў Скарыны выразнага размежавання значэння перфекта і іншых форм прошлага часу сведчыць прыклад з прадмовы да кнігі «Левіт», дзе ў адных і тых жа сэнсавых умовах ужыты перфект і імперфект: Теже иные приношениѧ бывали з начатковъ житъ и овощевъ (3) — иное приношение бываше осквернившимсѧ речми нечистыми (там жа).

Перфектныя формы Скарына больш часта ўжывае і ў царкоўнаславянскіх выданнях. Такія формы ёсць, напрыклад, у віленскім «Псалтыры» ў фразах, дзе ў «Астрожскай бібліі» стаіць аорыст: 8готовалъ на с8дъ престол^{s} свой (ВП, 9) — оуготова на с8дъ престолъ свой; ст8дъ лица моего покрил мѧ (ВП, 39б) — ст8дъ лица моего покры мѧ; возненавиделъ еси безаконие (ВП, 40б) — възненавидѣ безаконіе; извелъ еси насъ в покой (ВП, 55б) — ізведе насъ в покой; видели с8т^{s} очи наше (ВП, 31) — видѣша очи наши. У пазнейшых царкоўнаславянскіх друкаваных выданнях «Бібліі» ў такіх кантэкстах ужываецца, як і ў Скарыны, перфект. Назіраецца таксама і адрозненне паміж пражскім і віленскім выданнямі «Псалтыра». У пражскім часта ўжыты аорыст, а ў віленскім — перфект: не сътвори искрѣнем8 своем8 зла (13б) — не вчинилъ искренем8 своему зла (12б); возвѣдѣ мѧ еси (62б) — возвелъ мѧ еси (61б).

Дзеепрыметнік на *-лъ* у складзе перфекта ад дзеясловаў з асновай на галосны ў выданнях Скарыны не зазнаў ніякіх фанетыка-марфалагічных змен, ён ужываецца ў тым жа выглядзе, як і ў складзе плюсквамперфекта і ўмоўнага ладу. Аднак у скарынінскай мове па-рознаму выкарыстоўваюцца дзеепрыметнікі ад дзеясловаў з этымалагічнай асновай на зычны ў формах перфекта адзіночнага ліку мужчынскага роду. Яны ўжываюцца ў двух варыянтах: з канцавым *-лъ* і без яго. Дзеепрыметнікі першага тыпу яўна пераважаюць у колькасных адносінах: *воздвиглъ, вознеслъ, вывезлъ, выверглъ, вырослъ, высохлъ, заверглъ,*

застиглъ, исторглъ, моглъ, облеглъ, отверзлъ, отвлеклъ, паслъ, перевезлъ, привыклъ, прирекл̀ъ, пристиглъ, реклъ, рознемоглъсѧ, рослъ, сверглъ, спадлъ, спаслъ, ѕвѧзлъ, ѕмерлъ, ѕтеклъ і інш. Зместам біблейскага выкладу тлумачыцца асабліва частае ўжыванне форм *моглъ, реклъ* і *ѕмерлъ*. Ужыванне дзеепрыметнікаў гэтага тыпу відаць з наступных прыкладаў: Корень мой *ѡтвѣрзълсѧ ест* при водахъ (КІ, 35); исторглъ еси *мѧ ѡт* часу злого (ІС, 80б); рознемоглсѧ есмъ былъ днесъ (ПЦ, 62б); выверглъ естъ *ѡт* лица людей своих (ДЦ, 79); По нѣкоихъ же днехъ высохлъ *ест* потокъ (ТЦ, 167б); стень солнцевъ рослъ (ЧЦ, 229); И реклъ естъ Каинъ ко Авелю (КБ, 13б); Оумерлъ же естъ Самуилъ (ПЦ, 52б); онъ же ѕтеклъ естъ предъ тобою (ДЦ, 31б).

Аднак тлумачэнне выкарыстанню такіх словаформ Скарынам можна даць рознае. Старажытныя формы дзеепрыметнікаў на *-лъ* ужываліся ў старабеларускай пісьменнасці да пачатку XVI ст. Іх асабліва многа ў вядомай Чэцці 1489 г., якая шмат у чым працягвала традыцыі царкоўнаславянскай мовы. Разам з тым такія словаформы вельмі часта выкарыстоўваюцца ў перакладзеных з польскай мовы ў канцы XV ст. апакрыфічных і агіяграфічных творах «Пакуты Хрыста», «Аповесць аб трох каралях-валхвах» і «Жыціе Аляксея», дзе іх наяўнасць лягчэй за ўсё тлумачыць уздзеяннем арыгіналаў. Такім чынам, скарынінскія дзеепрыметнікі на *-лъ* маглі мець крыніцай і царкоўнаславянскія ўзоры, і ўплыў заходнеславянскіх моў. Але ж можна меркаваць, што крыніцай форм на *-лъ* для Скарыны паслужыла чэшская Біблія. Аб гэтым сведчаць шматлікія паралелі: gsy zawrhl mne za chrzbet swuoy — заверглъ мѧ еси за хребѣтъ свой (ТЦ, 160б); nema kto by geho pozdwihl — не имать кто бы воздвиглъ его (ЕК, 8); korzyst z miesta wywezl gest weliku welmi — користъ з града того вывезлъ *ест* велику велми (ДЦ, 87б); Po niekoliko pak dnech wysechl gest potok — По нѣкоихъ же днехъ высохлъ *ест* потокъ (ТЦ, 167б); žadny z nich ne mohl vteczy — не моглъ *ѡт них* ни единъ ѕтечи (КС, 9б); a vweden bude do miesta do kterehož se vtekl — И воведетсѧ во градъ до него же ѕтеклъ (ЛК, 72б).

Разам з гэтым у кнігах Скарыны нярэдкія і формы дзеепрыметнікаў без канцавога *-лъ*, што цалкам адпавядае стану іх у жывой беларускай мове таго часу і таксама адзначаецца ў беларускай пісьменнасці: *внесъ, воздвигъ, возлегъ, возлезъ, вознесъ, втекъ, запрѧгъ, збегъ, зволокъ, могъ, облекъ, перебегъ, перевезъ, помогъ, притекъ, простеръ, рекъ, стеръ, ѕвѧзъ, ѕмеръ, ѕтекъ* і інш. Такія формаўжыванні таксама пацвярджаюцца прыкладамі: Зволокъ с мене славѕ мою (КІ, 24б); ѕмеръ естъ отець его (ІС, 48б); Авесаломъ на дубе за власы ѕвѧзъ (ДЦ, 100); на кого воздвигъ гласъ твой, и вознесъ есь очи твое (ЧЦ, 227); богъ дѧ доброго ѕмыслу еѧ помогъ ей (КЮ, 2б); поразилъ *их* и стеръ даже во прахъ (КС, 17б); возлезъ еси на ложе *ѡтца* своего (КБ, 90); внесъ скриню завета до храму (КВ, 75б); простеръ еси десную

рук8 свою (КВ, 29б). Граматычная раўнапраўнасць форм абодвух тыпаў пацвярджаецца адначасовым ужываннем іх у аднолькавых сінтаксічных умовах: Воздвигъ еси мѧ и ѭко на вѣтръ выставивъ, свѣрглъ еси мѧ сильне (КІ, 36); Естъли же бы пакˢ кто имеѧ в ненависти ближнего своего... забилъ и́ до смерти. И втекъ бы до некоего сверху меноваными градовˢ. Да пошлютˢ старейшины града того и возмуть и́ изˢ града до него же втеклъ (ДЗ, 38б); 8мерлъ же естъ Са8лъ и три сыновѣ его (ПЦ, 64) — 8меръ естъ Са8лъ и три сыны его (там жа). Магчыма, тут праявілася свядомае імкненне перакладчыка разнастаіць выклад сінанімічнымі граматычнымі сродкамі, што наогул уласціва мове Скарыны.

У чэшскай Бібліі такім формам, як правіла, адпавядаюць формы перфекта з дзеепрыметнікам на *-l:* Przebiehl gsem wsseczky wieczy rozumem mym — Пребегъ есми вси речи раз8момъ моимъ (ЕК, 12); Tehdy vmrzel gest Elimelech — Потомˢ 8меръ *ест* Елимелехъ (КР, 2).

Дзеепрыметнікі гэтага тыпу маюць такія ж асаблівасці і ў складзе плюсквамперфекта і ўмоўнага ладу.

ЗАГАДНЫ ЛАД

Формы загаднага ладу ў выданнях Скарыны прадстаўлены вялікай колькасцю ўжыванняў дзякуючы таму, што ў біблейскіх тэкстах вельмі шырока адлюстравана дыялагічная мова. У гэтых формах асабліва ярка выяўляюцца суадносіны ўсіх асноўных стыхій, на якіх грунтуецца мова Скарыны: царкоўнаславянскай, беларускай і чэшска-польскай.

Структура форм загаднага ладу, акрамя таго, вызначалася і ўнутрымоўнымі фактарамі: характарам асновы і месцам націску. Адпаведна выдзяляецца некалькі тыпаў форм загаднага ладу.

У кнігах Скарыны самымі ўстойлівымі аказваюцца формы з асновай на адзін зычны і з націскам на канчатку: *бежи, веселисѧ, вложи, внеси, возбуди, возми, жени, запрежи, иди, извлечи, искуси, молисѧ, набери, навратисѧ, нахили, оборони, отдали, паси, побуди, погледи, погреби, подожди, поиди, помози, поседи, поспеши, прикажи, приклони, принеси, приступи, проси, скажи, стережисѧ, 8креписѧ, ходи, чини* і інш. Трэба, аднак, агаварыцца, што ў выданнях Скарыны націск не абазначаўся, і аб ім у формах загаднага ладу можна рабіць заключэнне толькі на падставе словаформ сучаснай беларускай мовы. Даследчыкам вядома, што агульнай заканамернасцю эвалюцыі акцэнтуацыі дзеяслоўных форм у беларускай мове з'яўляецца перанос націску з канчатка на аснову. Наяўнасць жа ў сучаснай беларускай мове форм тыпу *вазьмі, паглядзі, прынясі, скажы, хадзі* з націскам на канчатку дае падставу для меркавання, што і ў старажытнасці яны таксама мелі націск на канчатку. З вялікага фактычнага матэрыялу прыходзіцца абмежавацца толькі некалькімі прыкладамі: ко словамъ моимъ нахили 8хо твое (ПС, 10б); въ

пригоде твоей иск8си его (ІС, 12б); веселисѧ юношо во младости твоей (ЕК, 16б); проси ѡт мене чего же хощеши (ТЦ, 127б); на лица избранныхъ твои*х* погледи (КЮ, 10б); иные вси речи возми собѣ (КБ, 27б); принеси ми двое козлѧтъ (КБ, 48б); вложи слова моѧ во уста его (КВ, 10); Прикажи Ісусу и 8крепи его и потверди (ДЗ, 12); поиди семо и поседи т8 мало (КР, 6б); скажи сонъ рабомъ своимъ (ДП, 7). У чэшскай Біблії формам гэтага тыпу адпавядаюць утварэнні без канцавога *-і: вложи — wlož, вступи — wstup, вчини — vczyň, запрежи — zaprzež, погледи — pohled, прикажи — přzykaž, п8сти — pust, ходи — chod* і інш.

З улікам сучасных заканамернасцей акцэнталагічнай сістэмы беларускай мовы можна лічыць, што націск на аснове мелі наяўныя ў Скарыны формы тыпу *буди, востани, еди, избави, остави, остани, откини, поведи, повстани, постави, позычи, пребуди, престани, слыши, стани, сѧди, 8дари, 8здрави, 8слыши* і інш.: не остави мене в мышлениѧхˢ *их* (ІС, 36б); 8слыши слова рабы твоеа (ПЦ, 54); пребуди жъ оу мене еще днесь (ДЦ, 84б); востани и ежъ хлѣбъ и б8ди веселъ (ТЦ, 177б); 8дари стрелою 8 землю (ЧЦ, 212б); остани 8 мене еще днесь (КС, 40б—41); остави нынѣ кривин8 сию (КБ, 93); востани рано, и стани предъ фараономъ (КВ, 17); молю ти сѧ 8здрави ю́ (ЛК, 30); Брату же своему еже потребуеть позычи без росту (ДЗ, 45); избави насъ ѡт руку враговъ нашихъ (КЕ, 22б); поиди ты и сѧди посреди нас (ДП, 37).

З форм гэтага тыпу ў выданнях Скарыны асабліва часта ўжываецца форма *буди*. Яна выкарыстоўваецца ў зваротах да бога, у прывітаннях, праклёнах, малітвах, у шматлікіх настаўленнях маральна-этычнага характару: Не буди приѧтелемъ мужу гневливом8 (ПС, 34б); Не буди велеречивъ посрѣди старши*х* (ІС, 14б); ныне буди зѧть царевъ (ПЦ, 40); Здравъ буди царю (ДЦ, 102); буди жъ градъ сей проклѧтъ (ІН, 13б); проклѧта буди межи всеми животными (КБ, 12б); 8креписѧ жˢ и буди смелый (ДЗ, 59).

Разам з тым формы гэтага тыпу шырока ўжываюцца і без канцавога *-и: будь, верь, встань, добудь, дозволь, едь, живсѧ, избавь, лѧжъ, мовъ, направъ, облѧжъ, обрежъ, оправъ, оставъ, поедь, позычь, помажь, поплачь, поставъ, приедь, радьсѧ, слышъ, ставъ, сѧдь, 8слышъ, 8трать* і г. д.: противъ лицу моем8 поставсѧ (КІ, 39б); не всѧкому слову верь (ІС, 31); направъ п8ть свой (ІС, 7); не товаришь съ человѣкомъ нена8ченымъ (ІС, 16); Мало поплачˢ надъ оумерлымъ (ІС, 35); 8тратˢ пенѧзи для приѧтелѧ (ІС, 47б); въстань да ѡтпущу тѧ (ПЦ, 20); нынѣ събери останокъ людей и облѧжъ и добудь ты самˢ (ДЦ, 87б); едь скоро домовъ (ТЦ, 171б); поедь со мною и видь ревность мою (ЧЦ, 206б); Кажного града ограженного добудь ми (КЮ, 4б); нынѣ избавь насъ (КС, 25б); приедь ко мнѣ не медлѣчи (КБ, 83б); сѧдь и ежь ѡт лову моего (КБ, 49); дозволь намъ пройти скрозе землю свою (ЛК, 46б); николи не мовъ более ко мне о речи сей (ДЗ, 11б). Граматычная раўназначнасць форм на *-и* і без *-и* пацвярджаецца прыкладам тыпу Тако буди ты здравъ господи мой

царю, и тако будь жива душа твоѧ (ДЦ, 84б). У чэшскай Бібліі формам гэтага тыпу таксама адпавядаюць формы без канцавога *-і:* Powież czo žadass — повѣдь ми чего жадаеши (ТЦ, 125); czo tobie do pokoge. pod a ged za nami — что тобѣ до миру подь и едь за мною (ЧЦ, 202); nikoli ne mluw wijecz o tom — николи не мовъ более ко мне о речи сей (ДЗ, 11б). Несумненна, заходнеславянскі ўплыў трэба бачыць у выпадках ужывання форм без канцавога *-и,* якія ў беларускай мове маюць націскны канчатак *-и:* Течи поспешь побуди приѧтелѧ твоего (ПС, 12); молисѧ предъ лицемъ бжиимъ и ѕмаль безакониѧ (ІС, 28); ѡтдальсѧ ѡт нечестиваго (ІС, 14); подь и едь за мною (ЧЦ, 203б); погледь сѣ оно людие из загорка ѕказываютсѧ (КС, 23).

Формы без канцавога *-и* зрэдку трапляюцца і ў віленскіх выданнях Скарыны, не звязаных з чэшскай Бібліяй: поведь ми аще ты римлѧнинѕ еси (ДА, 65б); востани и стань на ногу твою (ДА, 71б); плачсѧ о делехѕ своих (КП, 2); видь, се ілию зоветѕ (ШК, 33).

Вылучаецца таксама невялікая колькасць форм, якія адрозніваюцца ў загадным ладзе характарам зычнага асновы. Такія формы ўжываюцца або з уласцівымі царкоўнаславянскай мове свісцячымі *ц, з,* або з беларускімі шыпячымі *ч, ж: облецисѧ — облечисѧ, помози — поможи, рци — речи:* облецисѧ в ризы смутные (ДЦ, 91) — намажсѧ и облечисѧ в лепший ризы (КР, 5б); помози ныне мнѣ сироте (КЕ, 21б) — ты поможи мнѣ (ДЗ, 83); иди и рци рабу моему Давыду (ДЦ, 78) — стой предъ фараономѕ и речи к нему (КВ, 18б). Невялікая колькасць такіх формаўжыванняў не дае магчымасці выявіць якія-небудзь заканамернасці іх выкарыстання. Аднак можна канстатаваць, што форма *помози* пераважае над сваім адпаведнікам *поможи.*

Асобны тып утвараюць формы з асновай на два ці тры зычныя. Тут таксама адрозніваюцца формы з націскам на канчатку і на аснове. Формы першага разраду, натуральна, ужываюцца з канчаткам *-и:* слухай же мене а молъчи (КІ, 40б); не смотри на труды ихъ (ІС, 26); протѧгни руку твою (ІС, 25б); Понижъ сердце свое и претерпи (ІС, 7); Тѧгни мѧ за собою (ПП, 3); возвѣсти ми что оучинилъ есь (ПЦ, 30); Пѕсти хлѣбъ свой на воды текѕщие (ЕК, 16); рости жъ и множисѧ (КБ, 64б); протѧгни жезлъ свой (КВ, 16б).

Канцавы *-и* ў большасці выпадкаў захоўваецца і ў формах з націскам на аснове: Помни иже не знаешъ делъ его (КІ, 43б); Не молви с нимѕ заровно (ІС, 22б); помни ѧко вси есмо тленни (ІС, 16); завержи злость ѡт тела твоего (ЕК, 17); Наполни рогъ сей олеѧ (ПЦ, 33б); очисти грехъ раба твоего (ДЦ, 116); воздвигни очи свое напрѧмо (КБ, 26); исторгни мѧ ѡт боѧзни моеѧ (КЕ, 22б).

Аднак і ў гэтым тыпе трапляюцца формы без канцавога *-и:* ѡт всѧкое злости очисть срдце твое (ІС, 61); Сего длѧ помысль и разумей (ПЦ, 53б); выйди и молвъ к людемъ веселе (ДЦ, 103);

выйди к фараонѫ и молвъ ему (КВ, 18). Але асноўнымі тут трэба прызнаць формы з канцавым *-и.*

У формах загаднага ладу з прыстаўкай *вы-* пераважаюць утварэнні з канцавым *-и: выбери, выведи, выжени, высвободи, выстрели:* себе самого высвободи (ПС, 12); выведи сию *ѡт* мене вонъ (ДЦ, 89); рече Елисей выстрели стрелу (ЧЦ, 212б); выжени рабу сию и сына ее (КБ, 37); выведи жабы на землю египетскую (КВ, 16); выбери дванадесеть мѫжей (ІН, 10). Але побач з гэтым трапляюцца і формы без *-и:* Высвободь того онъ же кривду терпитъ (ІС, 9б); Возьми его и выкинь з возу (ЧЦ, 204); выедь ми прошу тебе изъ земли (ЧЦ, 224).

Формы загаднага ладу з асновай на галосны паслядоўна ўжываюцца з канчаткам -и: *бии, воюи, вылии, допущаи, забии, налии, напийсѧ, отповѣдаи, пии, побии, похвалѧйсѧ, слухаи, стои, ѫбии, ѫделаи, ѫмыйсѧ* і інш.: слухай же мене а молъчи (КІ, 40б); Не похвалѧйсѧ заѫтрейшимъ днемъ (ПС, 41); За правду воюй (ІС, 10б); Не допущай мене впасти в срамотѫ *их* (ІС, 36б); пий с радостию вино твое (ЕК, 14б); изъвлечи мечь свой и забий мѧ (ПЦ, 64); приступи к нему и ѫбий й (ДЦ, 67); юху наверхъ вылий (КС, 14б); въстани рано и стой предъ фараономъ (КВ, 18б); ѫмыйсѧ ты и намажсѧ (КР, 5б); ты же царю постави пищу и налий вина (ДП, 38б).

У 1-й асобе множнага ліку формы загаднага ладу выступаюць у трох варыянтах — з канчаткамі *-мъ, -мо* і *-мы.* Аднак першы з іх ужываецца вельмі рэдка. Тлумачыцца гэта, відаць, тым, што канчатак *-мъ* больш уласцівы формам абвеснага ладу, таму выкарыстанне яго ў загадным ладзе было непажаданым. Між іншым у кантэксце біблейскага тэксту часам бывае цяжка адрозніць формы загаднага ладу ад абвеснага, напрыклад: наберемъ единыи кажныи з насъ древа пригожего з леса и оуделаемъ собѣ домъ (ЧЦ, 195б); рекнемъ имъ слютуйтесѧ надъ ними (КС, 47б); пойдемъ ныне и будемъ битисѧ (ДЗ, 7б).

Асноўнымі для загаднага ладу 1-й асобы множнага ліку з'яўляюцца формы на *-мо: бежимо, биймо, возмимо, вратимосѧ, воюймо, гледимо, даймо, загѫблѧймо, идемо, извольмо, мстимосѧ, наполнимосѧ, обыйдимо, подьмо, пождимо, поживаймо, покоримо, пойдимо, послужимо, поставимо, пошлимо, прикриемо, принесмо, приступимо, пролеваймо, противмосѧ, спимо, ступмо, ѫдармо, ѫпоймо, чтимо:* противмосѧ емѫ и корѣнь слова знайдемо противу ему (КІ, 25); Сего длѧ подмо и поживаймо добрыхъ речей (ПБ, 4б); приступимо первеи и совѣщаймо з богомъ (ПЦ, 29б); оудармо на филистымлѧнъ ѫ ночи и биймо ихъ (ПЦ, 29б); подьмо и возвѣстимо сее во дворѣ цареве (ЧЦ, 198б); ѫделаймо ѫ насъ комору малу и поставмо ему в неи ложе (ЧЦ, 190б); пойдемо и наделаймо плитъ и спалимо е́ огнемъ (КБ, 22б); не загѫблѧймо души его и не пролеваймо крови брата своего (КБ, 68б); ѫпоймо его виномъ и спимо с нимъ (КБ, 35); Пойдимо и возмимо

землю (ЛК, 31б); подьмо и послужимо богомъ чуждимъ (ДЗ, 29б).

Канчатку *-мо* скарынінскага перакладу ў чэшскай Біблії адпавядае канчатак *-me: gdieme — идемо, nadielayme — наделаймо, podme — подмо, postawme — поставмо, pr̀zynesme — принесемо, spieme — спимо, vderzme — оудармо* і г. д. Формы на *-мо* трапляюцца і ў неперакладных выданнях Скарыны — у «Псалтыры», «Малой падарожнай кніжцы» і «Апостале»: *будьмо, пребываймо, чуймо.*

Варыянтныя формы на *-мы* па колькасці ўжыванняў займаюць другараднае месца: *верьмы, жадаймы, каймыс҃, наделаймы, найдемы, наполнимы, оставмы, подмы, поедмы, послухаймы, поставимы, согледаймы, 8пиемыс҃, 8чинимы, хвальмы:* Найдемы все имение драгое, наполнимы домы наша користей (ПС, 5б); хвальмы мужей славныхъ (1С, 70б); Конець молвени҃ вси вкупѣ послухаймы (ЕК, 17б); Согледаймы прото естъли с8ть правы слова его, искусмы кой речи имають прийти на него, и 8вемы что будеть послѣднее его (ПБ, 5); розошлѣмы послы во вс҃ страны (ПЦ, 22б); каймыс҃ того, и ѡтпущени҃ грехомъ своимъ съ плачем^{s} жадаймы ѡт него (КЮ, 13б); Чтимы жъ 8ставичне светое Е8вангелие, а чт8чи е́ наслед8ймы делы нашего избавител҃ (КБ, 3б); встань и подьмы в путь свой (КС, 42).

Аднак у тэкстах «Бібліі» Скарыны ўсе адзначаныя варыянты форм загаднага ладу 1-й асобы множнага ліку не выкарыстоўваюцца ізалявана, часцей за ўсё яны ўжываюцца побач у адным і тым жа сказе: 8пиемыс҃ любого обнимани҃ и насытимъс҃ жадостию плоти (ПС, 14); выйдемы на полѣ и поживемъ в селехъ. Рано встан^{s}мы на виннице, соглѣдаймо естъли же естъ зацвила винница (ПП, 9б); нападемы нань на коем^{s} же месте знайдемъ его и прикриемо и́ (ДЦ, 98б); Сѣго дл҃ и мы не мстимос҃ за тыѝ речи еже терпимы, но покладаймы то быти намъ за грехи наше (КЮ, 14б); пойдимо жъ а 8биемъ его и вовѣржемъ до кладез҃ старого (КБ, 68б); подъмы и принесемъ жертву богу нашему (КВ, 11б); подьмы и послужимо богом^{s} чужимъ (ДЗ, 30). У такіх выпадках ажыццяўляецца своеасаблівая марфалагічная дысіміляцыя — імкненне пазбягаць аднастайных марфалагічных сродкаў, што, як было паказана вышэй, праводзілася перакладчыкам і ў іншых катэгорыях дзеяслова і іншых часцінах мовы. Формы загаднага ладу на *-мы* выкарыстоўваюцца і ў неперакладных выданнях Скарыны, асабліва ў «Апостале»: *делаймы, ежъмы, наследуймы, осужаймы, піймы, понимаймы, поспешаймы* і інш.

Формы загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку ўтвараюцца ад адпаведных форм адзіночнага ліку шляхам далучэння аглютынатыўнага канчатка *-те.* Тут таксама адрозніваюцца два асноўныя тыпы. У Скарыны шырэй ужываюцца уніфікаваныя формы на *-ите* незалежна ад тыпу спражэння. Тут, з аднаго боку, паслядоўна ўжываюцца новыя формы дзеясловаў 1-га спражэння на *-ите* замест ранейшага канчатка *-ѣте* тыпу *возмите, войдите,*

живите, зовите, идите, привезите, приведите, принесите, соблюдите і інш. З другога боку, з такім жа канчаткам ужываюцца і формы ад дзеясловаў II спражэння, дзе гэты канчатак быў спрадвечным: *браните, вчините, гледите, купите, любите, пустите, сказите, судите, ходите.* Ва ўжыванні гэтых форм адлюстравалася агульная эвалюцыя іх як у частцы беларускіх гаворак, так і ў царкоўнаславянскай мове ўсходнеславянскай рэдакцыі. Тыповымі прыкладамі ўжывання такіх форм з'яўляюцца наступныя: расторгните ризы ваша и облецитесѧ во вретища (ДП, 72б); того бойтесѧ, тому поклонитесѧ, тому приносите жертвы (ЧЦ, 222б); идите жъ до леса и высечите собе грады (ІН, 34); идите опѧть и накꙋпите намъ мало пища (КБ, 79); суды моѧ вчините и заповеди моѧ соблюдите и в законе моемъ походите (КЛ, 34б — 35); требища ихъ сказите, кумиры ихъ сокрушите, гае ихъ посечите (ДЗ, 19); Подотните древо и объсеците ветие его, и ростресите листие его и размечите плодъ его (ДП, 16).

Адзначана толькі некалькі форм з захаваннем ранейшага канчатка *-ѣте (-ете):* возмѣте и ꙋчините возъ новый (ПЦ, 14б); соблюдете заповѣди его и наследуйте его (ІН, 41б); сице рцете ему (ЧЦ, 233); тако рцѣте господину моемꙋ (КБ, 59б). Аднак такія адзінкавыя рэліктавыя ўтварэнні зусім не маюць значэння нават варыянтнай нормы. Уніфікаваны канчатак *-ите* паслядоўна выкарыстоўваецца і ў неперакладных скарынінскіх кнігах.

Разам з тым у Скарыны вельмі многа форм, утвораных ад форм адзіночнага ліку з націскам на аснове без канцавога *-и: будьте, верте, видьте, встаньте, выберте, выскочте, едьте, ежте, избавте, множтесѧ, насыпте, обидте, обрежте, оставте, останьте, отпочиньте, плачте, подте, повѣдте, повесте, помысльте, поставте, приедьте, слыште, станьте, ꙋставте, чиньте:* избавъте мѧ из руки вражиѧ (КІ, 11); осыпте мѧ ѩбълоками (ПП, 4б); Вы будте наши раби (ПЦ, 35б); Въстаньте скоро и преплавтесѧ чересъ реку (ДЦ, 99б); слыште сиѧ людие вси (ТЦ, 180б); насыпте до нѣго соли (ЧЦ, 187б); тогда вы выскочте из залогы (ІН, 17); Повесте главу сию на стене градове (КЮ, 22б); помыслъте вси вкупе о деле семъ (КС, 42); мѧса съ кровию не ежте (КБ, 20); приедьте ко мне (КБ, 84); Не обидте а не прелщайте вкꙋпе братию вашу (КЛ, 48); вы обрежте обрезки серць вашихъ (ДЗ, 24б); Видьте жъ ѩко азъ есмъ единъ (ДЗ, 62б).

Цікава, што ў множным ліку трапляюцца формы, скарочаныя зыходныя формы якіх у адзіночным ліку не адзначаюцца. Такімі з'яўляюцца, напрыклад, *вопте, гледте, кричьте, молте, наꙋчьтесѧ, сложте, ходьте:* придите и ходѣте по путехъ разумности (ПС, 16); кричьте гласомъ болшимѕ (ТЦ, 170б); вопте вже и кричте (ІН, 13); сѣ нынѣ сложте окрасу свою (КВ, 63); Не гледѣте на лица ꙋбогаго (КЛ, 37); Наꙋчьтесѧ ихъ и деломъ наполните чинити е́ (ДЗ, 15б). Усе такія скарынінскія асаблівасці цалкам адпавядаюць структуры гэтых форм у чэшскай Біблії: *budte — будьте, wstaňte — въстаньте, wywedte — выведте, kryczte — кричте,*

množte se — множтесѧ, pomyslte — помыслъте, placzte — плачте, slysste — слыште і г. д.

Формы загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку, утвораныя ад форм адзіночнага ліку без канцавога *-и*, нярэдкія і ў віленскіх выданнях Скарыны — «Малой падарожнай кніжцы» і «Апостале»: праве сѣдьте сыновѣ (ВП, 50); слыште людие мои (ВП, 72б); ненавидьте зла (ВП, 85б); оставте ж^{s} сихъ ѡтити (АК, 12); исправте пѣть господень (АП, 6); Видьте людие непокоривии (ШК, 7); Будьте ж^{s} себе пильни (ДА, 60); ѣслыште мой нынѣ къ вам^{ъ} ѡтветъ (ДА, 64); нынѣ же плачтесѧ слезѧще (СП, 8).

Падобным жа чынам утвараюцца і формы, якія ў адзіночным ліку канчаюцца на *-й*: *бийте, бойтесѧ, ведайте, владейте, втекайте, дайте, делайте, забийте, лекайтесѧ, послухайте, стойте* і інш.: егда рекнѣ вамъ бийте его, забийте ѝ а не бойтесѧ никого (ДЦ, 90); землѧ в моци вашеѝ естъ, делайте, купѣйте и владейте ею (КБ, 63); да не страшитсѧ серце ваше, не бойтесѧ, не втекайте и не лекайтесѧ предъ ними (ДЗ, 39б).

Формы загаднага ладу 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку ўтвараюцца шляхам спалучэння загаднай часціцы *да* з асноўным дзеясловам цяперашняга або будучага простага часу. Часціца *да* мае агульнаславянскае паходжанне, яна ўжывалася ў старажытнарускай і царкоўнаславянскай мовах. У перакладах Скарыны яна належыць да ліку самых яркіх рыс, якія надаюць царкоўнаславянскую афарбоўку яго выданням.

Адзіночны лік: всѧка повесть твоѧ да будеть во заповѣдѣхъ вышнего (ІС, 17б); да не хвалитсѧ силныѝ силою своею (ПЦ, 7б); да идеть тамъ и живеть с ними (ЧЦ, 221б); да ѣтишитсѧ гневъ твоѝ над^{s} нами (КЮ, 5); что ростеть во виноградехъ да не ѣсть, вина и питиѧ пианого да не пиеть и что *ест* нечисто да не есть (КС, 30б); да будеть клѧтва межи нами (КБ, 47б); Осквернѧѣѝ суботу смертию да ѣмреть (КВ, 60); Тоѝ да есть агнеца пасхи по обычаю (ЛК, 24).

Множны лік: вземши то да идуть прочь (ПЦ, 63); Да ѣкрепѧтсѧ руце ваше (ДЦ, 68б); раби моѝ да будуть с ними и да помагають имъ (ТЦ, 132); даѝ хлебы ты людем^{s} да ѣдѧть (ЧЦ, 192б); да собѣрутсѧ воды еже суть по*д* небесемъ (КБ, 9б); да ѣдѧть мѧсо нощи тое (КВ, 23); Всѧку же требу жреческу на огни да сожгуть (КЛ, 14); тѣ и мене ѣмершу да положать (КР, 3); да дають намъ кашу крупѧну ести и воду пити (ДП, 6).

Часціца *да* ў складзе форм загаднага ладу зрэдку ўжывалася ў беларускай пісьменнасці па традыцыі да пачатку XVI ст. Але ў беларускіх помніках пачынаючы з сярэдзіны XV ст. асноўным сродкам выражэння апісальных форм загаднага ладу 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку стала часціца *нехай* заходнеславянскага паходжання, якая параўнальна хутка выцесніла з беларускай пісьменнасці ранейшыя часціцы *да* і *ать*.

Некалькі выпадкаў ужывання часціцы *нехай* адзначана і ў выданнях Скарыны: Нехаѝ сѧ самъ помстить Вааль над тымъ

онˢ же требникъ его раскопалˢ (КС, 15б); Вино новое другъ новый, нехай сѧ ѫстараѥт и во сласть напиешисѧ (ІС, 17); Нехай со обою странъ изыйдуть отроци и биютсѧ (ДЦ, 69). Аднак такія адзінкавыя прыклады ніколькі не парушаюць агульнай сістэмы форм загаднага ладу 3-й асобы абодвух лікаў з часціцай *да,* ужыванне якой цалкам адпавядае царкоўнаславянскай мадэлі. Гэта відаць з параўнанняў з «Астрожскай бібліяй»: Да ѫкрепѧтсѧ руце ваше (ДЦ, 68б) — да оукрѣпѧтсѧ рѫки ваша; да помажеть его тамъ Садохˢ (ТЦ, 122) — да помажетˢ его тѫ Садокъ; да прийдеть ко мнѣ Нааманˢ (ЧЦ, 193б) — да пріидет къ мнѣ нꙗ҃нъ Нееманъ.

Скарынінскім канструкцыям загаднага ладу з часціцай *да* ў чэшскай Біблііі адпавядаюць спалучэнні форм дзеяслова цяперашняга або будучага часу з часціцамі *atʼ* і *nech / nechtʼ*: atʼ nawraty se krew gich na hlawu Ioabowu — да обратитсѧ кровь ихъ на главу Іоавову (ТЦ, 126); atʼ mi požehna dusse twa — да благославитˢ мѧ душа твоꙗ (КБ, 49); atʼ mi obietuge na pussti — да принесѫтˢ ми жертву в пѫстыни (КВ, 11); nechtˢ se obratij hnew twuoj na mie — да обратитсѧ гневъ твой на мѧ (ДЦ, 117); nechtˢ Adonyass kraluge po mnie — Адонияѧ да царствуеть по мнѣ (ТЦ, 121б).

З гэтага матэрыялу відаць, што Скарына аддаваў перавагу царкоўнаславянскай мадэлі з часціцай *да.* Па падліках І. У. Сацуты, у адзіночным ліку яна ўжыта 1049 разоў, у множным — 469.

УМОЎНЫ ЛАД

Асобнай граматычнай дзеяслоўнай катэгорыяй у Скарыны выступае і ўмоўны лад, формы якога, акрамя непасрэдна ўмовы, выражаюць і разнастайныя іншыя мадальныя адценні пажадання, мэты, магчымасці, неабходнасці дзеяння і г. д. У Скарыны ў асноўным выкарыстоўваюцца новыя аналітычныя формы ўмоўнага ладу, якія складаюцца з дзеепрыметніка на *-л* і аорыста дзеяслова *быти.* Умоўны лад такой структуры замацаваўся ўжо ў старажытнарускі перыяд. Дзеепрыметнік на *-л* мае такую ж структуру, як і ў складзе іншых аналітычных форм прошлага часу. Затое формы аорыста ў складзе ўмоўнага ладу зазналі значныя змены, і таму абліччa іх, па сутнасці, і вызначае структурныя асаблівасці ўмоўнага ладу.

У 1-й асобе адзіночнага ліку звычайна выступае аорыст у выглядзе *быхъ:* Ныне бо оумеръши молъчалъ быхъ, и сномъ моимъ ѡтпочивалъ быхъ (КІ, 7б); Абы ко мне вси шли иже имеють суды, судилˢ быхъ ѧ справедливе (ДЦ, 93б); Видело ми сѧ ꙗко быхˢ стоꙗлъ на брегѫ речномъ (КБ, 74б). Разам з тым у даданых сказах з мадальнымі адценнямі пажадання, мэты, неабходнасці дзеяння форма *быхъ* спалучаецца са злучнікамі *а, да, иже,* у выніку чаго яна выкарыстоўваецца ў выглядзе *абыхъ, дабыхъ, ижебыхъ:* послана есми ѡт него, абыхъ поведила вамъ сиѧ (КЮ,

18б); тое ми приказалъ мужˢ той абыхъ всегда ходила за женци его (КР, 5); Сего ради пришолъ есмъ к тобѣ абыхъ купилъ гумно твое (ДЦ, 117); Абыхъ имелъ мечь, то прокололˢ быхˢ тѧ (ЛК, 49); кто есмъ азъ дабыхˢ шолъ ко фараону (КВ, 8б); пойду предъ лице кнѧзѧ Олоферна, дабыхъ поведила ему тайные речи ихъ (КЮ, 17); Едали ѫ богъ есмъ ижебыхъ забитого моглъ оживити (ЧЦ, 193б). У чэшскім арыгінале ў гэтых сказах адпавядаюць формы *bych* і *ábych:* nynije vmra mlczel bych, a snem mym odpoczywal bych; kto gsem ya abych ssyel k Faraonowi; Y zdali gsem ya bohem, abych mohl zabige obžywiti.

Аорыст дапаможнага дзеяслова ў формах 2-й і 3-й асобы адзіночнага ліку выступае ў выглядзе *бы, абы, дабы:* кто бы забилˢ мѫжа того, царь даровалˢ бы тому богатества много (ПЦ, 36б); И не осталъ естъ ни единый онˢ же бы сѧ не перевезлъ чересъ реку (ДЦ, 99б); жена единаго хотела бы помочи мужу своему (ДЗ, 47б); ѫстройсѧ на то абы моглъ забити Давыда (ДЦ, 109б — 110); жедалˢ животу своему абы ѫмерлъ (ТЦ, 172); Боюсѧ ѫбо дабы и той не вмерˢ ѫко братиѧ его (КБ, 70).

У 1-й асобе множнага ліку побач з асноўнай формай звязкі *быхомъ* ужываюцца таксама спалучэнні яе са злучнікамі ў выглядзе *абыхомъ* і *дабыхомъ:* лепей естъ намъ быти живымъ в неволи а хвалити гсда бога, нежели быхомъ сами такъ померли (КЮ, 12); Видело ми сѧ ѫко быхомъ вѧзали снопы на поли (КБ, 68); не было естъ ни единого места его же быхомъ не взѧли (ДЗ, 10б); не жадаи того сыну моѝ не жадаи абыхомˢ вси пришли к тобѣ (ДЦ, 89б); Что мы седимо сезде абыхомъ гладомъ помѣрли (ЧЦ, 198); Кто дасть намˢ дабыхомъ насытилисѧ мѧса (ЛК, 27); Кто *ест* всемогущий дабыхомˢ служили ему (КІ, 27).

2-я асоба множнага ліку характарызуецца формай *бысте,* якая спалучаецца са злучнікамі *а* і *да:* Толико блюдитесѧ того абысте крови не ели (ДЗ, 28б); тоѝ дасть дождь земли вашеѝ, по времени раныѝ и позныѝ. Да бысте збирали жито и вино (ДЗ, 26).

Аднак гэта сістэма заканамерных традыцыйных форм умоўнага ладу парушаецца шматлікімі адхіленнямі, выкліканымі ўздзеяннем жывой і літаратурна-пісьмовай беларускай мовы. Так, у 3-й асобе множнага ліку ранейшая звязка *быша* ў выданнях Скарыны зусім не ўжываецца, тут паслядоўна выкарыстоўваецца уніфікаваная форма *бы — абы,* прычым у Скарыны форма *бы,* па сутнасці, упершыню адзначаецца ў скарочаным варыянце *б* пасля папярэдняга слова на галосны гук: не ѫпадши во глубокое запомѧнутие и не могли бˢ принѧти твоеѧ помощи (ПБ, 25); да некогда раскаѧлисѧ бˢ людие ѫзревши рать на сѧ и навратилисѧ бˢ до египта (КВ, 26б); да не опустееть землѧ и наплодили бˢ сѧ на тебе звѣри дивий (там жа, 43б); престали бъ приносити жертвъ, егда бы не имели совѣсти греховное (КЛ, 3б); послалˢ послы ко иныѧ народомˢ абы служили ему (КЮ, 3); службу на нихъ наложилъ абы делали плиты и ставили грады (там жа, 8).

Самым прыкметным адрозненнем скарынінскага ўмоўнага ладу з'яўляюцца шматлікія выпадкі, дзе побач з дзеепрыметнікам на *-л* асноўнага дзеяслова і аорыстам дапаможнага дзеяслова ўжываецца звязка цяперашняга часу дзеяслова *быти*. З'яўленне звязкі выклікана было тым, што уніфікаваная форма аорыста *бы* страціла здольнасць абазначаць асобу, таму пры адсутнасці фармальна выражанага займенніка-дзейніка звязка цяперашняга часу стала выкарыстоўвацца як неабходны сродак для абазначэння асобы. Формы ўмоўнага ладу ў такіх выпадках сталі ўтвараццa па мадэлі «аорыст дапаможнага дзеяслова *быти* + звязка цяперашняга часу + дзеепрыметнік на *-л*». Умоўны лад такой будовы асабліва часта ўжываецца ў 1-й асобе множнага ліку і ў 2-й асобе абодвух лікаў: посылалъ есми к тобѣ просѧ абы пришолъ еси ко мнѣ (ДЦ, 93); Не хощу бо абы порожнѧ есь шла ко свекрови своей (КР, 6б); Саломонъ наоучаеть насъ, абы есмо не запоминали законѕ и заповѣдей (ПС, 7б); Не гледи на жену многохтивую абы не ѕпалъ еси в сила ея (ІС, 17); лепей ѥст абы осталъ еси во граде (ДЦ, 100б); Стережисѧ пильне абы не впалъ еси оу прокажение (ДЗ, 46); помышлю о тобѣ абы еси имела ѡтпочинутие (КР, 5б); пилне поразумейте абы есте познали мудрость (ПС, 9б); Сие же речете абы есте могли жити в земли Гесемли (КБ, 86б); Аще бы есте не орали на юници моей не ѡтгадали бысте загадки моеѧ (КС, 32б); воздвигши очи свое к небеси ѕзрели бы есте солнце месець и все звезды (ДЗ, 13).

Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены ўжыванні розных аарыстычных форм у значэнні іншых асоб: И что ты веси его же быхъ и мы не вѣдали, или что разумеешъ чего быхѕ мы не ѕмѣли (КІ, 20б); к тому наоучаеть насъ абы есмо все свое въпование имели въ бозе (ПС, 8).

Ва ўсіх такіх выпадках адлюстроўваецца ўмоўны лад пазнейшага этапу старажытнарускай мовы, дзе гэтыя мадэлі атрымалі пашырэнне з XIV ст. Падобных утварэнняў не ведае чэшская Біблія, дзе звычайна ў складзе ўмоўнага ладу выкарыстоўваецца аорыст дапаможнага дзеяслова і дзеепрыметнік на *-l:* by mi dal polowiczy kralowstwije tweho ne puogdutʼ s tebu — бы ми далъ еси половину имениѧ своего, не поиду с тобою (ТЦ, 158); strzežte se abysste ne wstupowali na huoru — блюдитесѧ абы есте не встѕповали на гору (КВ, 36б); hlediž aby ne boyowal proti nim — Гледи жъ абы еси не воевалсѧ с ними (ДЗ, 9).

У выданнях Скарыны асабліва штучнымі і ненатуральнымі з'яўляюцца формы ўмоўнага ладу, дзе на месцы дзеепрыметніка на *-л* ужываецца плюсквамперфект: кто ми то дасть абыхѕ ѣ былъ ѕмерлъ за тѧ (ДЦ, 102б); Людие же твой бы были не погоръдели мною, не воздвигъ быхъ былъ копиѧ своего на нихъ (КЮ, 17б — 18); бы есте были ихъ живили не погубилъ быхъ васъ (КС, 19б); естъли же бы не ѕклонилосѧ было ослѧ с путѧ, то ѕбилѕ быхѕ тѧ былъ (ЛІК, 49б); естьли быхѕ былѕ сее ѕделалѕ зло смѣле противѕ души моей, не было бы то тайно царѧ (ДЦ, 101).

У Скарыны трапляюцца таксама і чатырохкампанентныя формы ўмоўнага ладу, дзе звязка ў складзе плюсквамперфекта стаіць у форме перфекта: Бы еси былъ того не оучинилъ, оуже бы былъ нынѣ ѕкрепилˢ гсдь црство твое (ПЦ, 26); бы ми еси былъ реклъ то рано престали бы были людие моѝ гонити васъ (ДЦ, 69б); бы есте были ихъ живили, не погубилъ быхъ васъ (КС, 19б). У чэшскай Бібліі ў такіх канструкцыях звязкі няма: by byl tak mluwil rano przestalt by lid muoy honiti was — бы ми еси былъ реклъ то рано престали бы были людие моѝ гонити васъ (ДЦ, 69б); yakot gsem ya s wami vczynila milosrdenstwije, tak i wy abysste vczynili se mnu — ꙗко же ꙗ ѕчинила с вами милосердие, тако и вы абы есте ѕчинили со мною (ІН, 7б). Можна адзначыць таксама і адзінкавы выпадак з прадмовы да кнігі «Быццё», дзе замест дзеепрыметніка на *-л* у складзе ўмоўнага ладу выкарыстана форма аорыста: О сихъ книгахˢ всѣѧ Библий подле малости розуму моего розделы вократце положихˢ, а в чемˢ быхˢ сѧ омылих, разумнейшие поправте (КБ, 6б).

Такім чынам, умоўны лад скарынінскіх выданняў адносіцца да такіх дзеяслоўных словаформ, якія не працягвалі нормы царкоўнаславянскай мовы, а афармляліся ў адпаведнасці з развіццём адпаведных форм у пісьмовай беларускай мове.

ДЗЕЕПРЫМЕТНІК

Сістэма дзеепрыметнікаў у выданнях Скарыны асабліва ярка адлюстроўвае суадносіны царкоўнаславянскай і беларускай стыхій. Разам з тым яна адлюстроўвае стадыю пераўтварэння дзеепрыметнікаў у дзеепрыслоўі, што ўжо фактычна завяршылася ў беларускай мове эпохі Скарыны.

Старажытныя формы актыўных дзеепрыметнікаў цяперашняга часу мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку назоўнага склону трывала захоўваюцца ў выданнях Скарыны. Гэты тып прадстаўлены шматлікімі ўтварэннямі накшталт *биѧ, веселѧсѧ, вземлѧ, видѧ, воюѧ, вставаѧ, глаголѧ, гневаѧсѧ, дотыкаѧсѧ, злореча, знаѧ, идѧ, избавлѧ, имеѧ, меча, можа, молѧсѧ, надеѧсѧ, обнимаѧ, ожидаѧ, очищаѧ, пиѧ, плача, провожаѧ, продаваѧ, противѧсѧ, рикаѧ, стоѧ, терпѧ, толкуѧ, убоѧсѧ, утекаѧ, целуѧ, ѣдѧ* і інш.

З вялікага фактычнага матэрыялу дастаткова прывесці толькі невялічкую нізку прыкладаў: Лепшиѝ естъ ѕбогыѝ имеѧ потребу свою, нежели славныѝ требуѧ хлеба (ПС, 20); Семей же идѧше по вѣрху горы противу имъ злореча и камение меча и персть сыпаѧ на Давыда (ДЦ, 97); прийде Ахавъ въ домˢ своѝ гневаѧсѧ и скрегча зубы на Навота (ТЦ, 177); былъ естъ зѧть в доме тьстѧ своего три дни ѣдѧ и пиѧ с нимъ и веселѧсѧ (КС, 40б); ѕбоѧсѧ бо рещи ꙗко жена ему бѣ, надеѧсѧ дабы не вбили его красы дла ее (КБ, 46б); Тоѝ же идѧ з войскомъ казилъ вси речи (КЮ, 4); пребыхъ на горѣ четыредесѧтъ дней и четыредесѧтˢ нощей хлеба

не ѧдѧ и воды не пиѧ (ДЗ, 22б); Седелъ Еремиѧ плача и ридаѧ во ерусалиме (ПЕ, 3).

Асаблівую цікавасць маюць выпадкі такіх ужыванняў: ѡтшолъ не дбаѧ иже продалъ перворожение свое (КБ, 46); ѡтпочиваѧ возлег^{s} есь ꙗко левъ (там жа, 90б). Ужыванне ўласна беларускіх дзеясловаў у форме такіх архаізаваных дзеепрыметнікаў сведчыць аб устойлівасці гэтай катэгорыі ў свядомасці перакладчыка. Разам з тым прыклад тыпу к нему же пришла еси надеѧсѧ на оборону его (КР, 4б), дзе для жаночага роду ўжыта форма мужчынскага роду, сведчыць аб няўстойлівасці такіх форм у беларускай мове часоў Скарыны.

Гэты тып дзеепрыметнікаў мужчынскага роду назоўнага склону адзіночнага ліку дапаўняецца вялікай колькасцю суадносных поўных форм, якія ўтвараюцца ад кароткіх шляхам далучэння ўказальнага займенніка *и: берѧй, ведѧй, верѹй, видѧй, висѧй, входѧй, даѧй, живѧй, идѧй, любѧй, ненавидѧй, несѧй, освещаѧй, оскверняѧй, палѧй, пиѧй, приносѧй, просѧй, растѧй, седѧй, служай, стоѧй, терпѧй, ходѧй, хотѧй, чинѧй, щедѧй, ꙗдѧй* і інш. Аб распаўсюджанасці такіх утварэнняў у выданнях Скарыны сведчаць прыклады, калі ў адным і тым жа сказе пры адным дзейніку ўжываюцца дзве або тры дзеепрыметнікавыя формы: Ходѧй же правымъ путемъ и боѧйсѧ бога погорденъ бывает (ПС, 22); Ты еси былъ выводѧй и въводѧй людей Ізраилевыхъ (ДЦ, 74); Былъ ѕбо естъ в той час^{s} Гелѧй ꙗдѧй и пиѧй (ТЦ, 165); Блгсвенъ бѕдешъ входѧй в дом свой и выходѧй (ДЗ, 51); он^{s} же не зрить на лица и ни приимаеть даровъ, чинѧй судъ сироте и вдовици, и любѧй пришельца и даѧй ему пищу и одежу (там жа, 24б).

З гэтым тыпам дзеепрыметнікаў збліжаюцца і частыя ў Скарыны формы на *-ый*, якія ўтвараюцца ў асноўным ад дзеясловаў са значэннем закончанасці дзеяння, што выражаецца адпаведнымі прыстаўкамі або суфіксамі. Такія формы абазначаюць пераважна дзеянне, папярэдняе ў адносінах да дзеяння, выражанага асабовай формай: *ведый, возвеличивыйсѧ, выложивый, заблудивый, изведый, моливыйсѧ, оставый, пришедый, растерзавый, родивыйсѧ, розмогыйсѧ, создавый, сотворивый, ѕбежавый, ѕбивый, ѕслышавый, ѕчинивый* і інш.: где естъ богъ сотворивый мене (КІ, 42б); Азъ есмъ днесь ѕбежавый з бою и азъ есмъ пришедый днесь ѡт полка (ПЦ, 12); Азъ есмъ изведый сыны Ізраилевы изъ Египта, исторгий вы из руку фараоновыхъ (ПЦ, 21б); прииде мужъ з войска Саѕлова, растерзавый ризы своѧ (ДЦ, 66—66б); Не сам^{s} ли сей естъ отець твой стѧжавый тѧ, и сотворивый и создавый тѧ (ДЗ, 61); Ты еси царь возвеличивыйсѧ и розмогыйсѧ (ДП, 17).

Ва ўскосных склонах актыўныя дзеепрыметнікі ўсіх трох родаў маюць у сваім складзе фармант *-щ-* — стараславянскі адпаведнік старажытнага спалучэння *tj*. У многіх выпадках гэтыя дзеепрыметнікі ўжываюцца ў кароткіх (нячленных) формах, што адпа-

вядае формаўжыванню старославянскай мовы: видеваху вси людие столпъ облачный стоащъ 8 дверей (КВ, 63); вижу азъ полкъ идущ^{s} (ЧЦ, 203б); 8чинилъ посреди пещи ѩкобы ветръ росный шумѧщ^{s} (ДП, 13); знайдоша Саѵла лежаща и спѧща въ шатре своемъ (ПЦ, 56); И быст^{s} земл҃ сирскаѧ Давыдови служаща и дань дающа (ДЦ, 80); оузре мужа стоѧща противу ему и держаща мечь (ІН, 22); видеша ю̀ старѣйшины тые на кажный день вхожащу и гулѧющу в заграде (ДП, 35); гору видели есте горѧщу огнемъ (ДЗ, 16б). У біблейскіх тэкстах такія формы часцей за ўсё ўжываюцца ў функцыі азначэння да назоўнікаў-дапаўненняў, што стаяць у родным або вінавальным склоне.

Усе дзеепрыметнікі гэтых разрадаў прыкметна збліжаюць мову скарынінскіх выданняў з тагачаснай царкоўнаславянскай мовай і надаюць ёй спецыфічны архаічны каларыт. У пісьменнасці на беларускай мове часоў Скарыны такія дзеепрыметнікі трапляюцца вельмі рэдка — толькі як даніна старажытным пісьмовым традыцыям. Разам з тым у тэкстах Скарыны адзначаюцца і з'явы, якія адлюстроўваюць далейшую эвалюцыю дзеепрыметнікаў у выніку ўнутранага развіцця граматычнага ладу пісьмовай мовы.

Тут перш за ўсё трэба адзначыць уніфікацыю, выраўноўванне структуры асноў дзеепрыметнікаў — пранікненне суфікса *-щ-* у формы назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду: м8жъ оубогый ходѧщий во простоте своей лепший *ест* нежели богатый грызущий оустнѣ свое (ПС, 29б); Ловитва львови *ест* лось ходѧщий во пустыни (там жа, 23); Азъ есмъ видѧщий (ПЦ, 19б); бысть ему Осиа рабъ дающий дани (ЧЦ, 220); внегда было рано ветръ жг8щий воздвиже кобылки (КВ, 21); поведилъ Арбонъ постелникъ царевъ стоѧщий въ службе пред^{s} ним^{s} (КЕ, 13).

Граматычнай нормай у Скарыны з'яўляюцца таксама поўныя формы дзеепрыметнікаў ва ўсіх склонах адзіночнага і множнага ліку: И сѣ мужи идущие путемъ 8зрели суть тело меръ҃твое лежащее на пути, и льва стоѧщего при немъ (ТЦ, 159); веалъ пресилныи а жгущий ветръ всю нощъ (КВ, 28б); Любѧщий бога помолитсѧ о гресех^{s} своих (ІС, 8); Надежа продолжающаѧсѧ смутить дш҃у (ПС, 21б); 8хо слышащее благословило мене (КІ, 34б); Нѣ бѣ тому противлѧющагосѧ ни едина м8жа (ПЦ, 29б — 30); Сладок^{s} естъ сонъ человѣку делающему (ЕК, 9); рече Саѵлъ ко отроку носѧщему оружие его (ПЦ, 64); виде во сне лестъвиц8 стоѧщ8ю на земли (КБ, 51б); І8дей живущий во граде плакали суть (КЕ, 8б); Азъ любѧщих^{s} мѧ люблю (ПС, 15); паде страхъ его на всехъ людей живущихъ на земли (КЮ, 5).

Актыўныя дзеепрыметнікі цяперашняга часу ў ролі азначэння ў выданнях Скарыны ўжываюцца выключна па царкоўнаславянскаму ўзору з фармантам *-щ-*, форм з усходнеславянскім адпаведнікам *-ч-* у атрыбутыўнай функцыі ў Скарыны няма зусім. Вельмі паказальна, што дзеепрыметнікі такой структуры

Скарына паслядоўна выкарыстоўвае і ў сваіх прадмовах: Понеже ѡт прирожениѧ звери ходѧщие въ пустыни знають ꙗмы своѧ. Птици летающие по возъдухꙋ ведають гнезда своѧ. Рибы плывающие по морю и в рекахъ чують виры своѧ (КЮ, 2б); сей имелъ тридцеть сыновъ ездѧщихъ на тридцети ослехъ и кнѧжащихъ во тридесети градехъ (КС, 2б); Тымъ законом^{s} живѧху верующий во Хрста (ДЗ, 3).

Розныя формы дзеепрыметнікаў выкарыстоўваліся перакладчыкам як пэўны стылістычны сродак, што дазваляла вар'іраваць формаўжыванне і тым самым пазбягаць аднастайнасці ў выкладзе: Да будет^{s} всегда в роде Іоавовѣ мужъ терпѧй точение семени и прокаженный, и подпираꙗсѧ посохом^{s}, и падающий ѡт меча и трѣбующий хлеба (ДЦ, 72). Цікава адзначыць, што гэта фраза ў беларускім перакладзе пачатку XVII ст. польскай Біблії Я. Вуйка ў адпаведнасці з тагачаснымі нормамі мае толькі дзеепрыметнікі на *-ч-:* нехай не ꙋстаеть з дому иѡавового плынене насѣньꙗ терпꙗчий, и трꙋдоватый, и держачий щитъ, и ѡт меча ꙋпадаючий, и потребуючий хлѣба.

Арыентацыя Скарыны на пісьмовыя нормы царкоўнаславянскай мовы праявілася ў тым, што ён свабодна ўжываў розныя формы дзеепрыметнікаў там, дзе ў чэшскай Біблії выкарыстаны апісальныя азначальныя звароты або іншыя дзеяслоўныя формы: Tehdy tahna yudas proti kananeowi kteryż bydlil w miestie Ebron — ѡттоле пакъ иде Іюда на хананеанъ пребывающих въ хѣвроне (КС, 4б); czlowiek ge ne byl, kteryžby dielal zemi — человѣк^{s} не был^{s} делаѧ земли (КБ, 11); gsy mu dal syna kteryž sedy na stoliczy geho — далъ еси ему сына седѧщего на престолѣ его (ТЦ, 127б); nalzli gsu Saule an ležy a spij w stanu w swem — знайдоша Саꙋла лежаща и спѧща въ шатре своемъ (ПЦ, 56); milugess ty kteryž tie nenawidije, a w nenawisti pak mass ty kteryž tie milugij — Любиши ненавидѧщих тебе, и ненавидеши любѧщихъ тѧ (ДЦ, 103); služebnyk twuoy bal se pana boha — рабъ твои бѣ боѧйсѧ гсда бога (ЧЦ, 190).

Разам з тым у сістэме дзеепрыметнікаў скарынінскіх выданняў праяўляюцца рысы, якія ў некаторых адносінах збліжаюць формаўжыванне іх з нормамі тагачаснай беларускай пісьмовай мовы. Тут перш за ўсё кідаецца ў вочы такая асаблівасць, як пераважнае выкарыстанне канчатка *-его* ў родным склоне адзіночнага ліку дзеепрыметнікаў мужчынскага і ніякага роду: *висѧщего, выходѧщего, збирающего, имеющего, имущего, кладущего, приидущего, прославлѧющего, седѧщего, стоѧщего, ꙋпоꙗющего* і г. д. Гэтым канчаткам скарынінскія дзеепрыметнікі адрозніваюцца ад царкоўнаславянскіх, якія ўжываліся выключна з канчаткам *-аго/-ѧго:* Далеко буди ѡт человѣка имеющего моць загубити (ІС, 17б); прославлѧющего мѧ прославлю (ПЦ, 9); видел^{s} есми Авесалома висѧщего на дубе (ДЦ, 101); знайде Еровоама стоѧщего на требнице и кладущего кадило на ꙋглие (ТЦ, 157б); ꙋзре царѧ седѧщего на престолѣ своемъ (ЧЦ, 209);

тою кровию покропить седмъ крать очищающегося (КЛ, 27б); Они же видывахꙋ лице выходящего Моисеа (КВ, 66); знашли человека збирающего трески в день сꙋботный (ЛК, 36).

Гэтыя ж дзеепрыметнікі ў назоўным і вінавальным склонах множнага ліку вельмі часта ўжываюцца з канчаткам *-ие*, што таксама было асноўнай нормай беларускай пісьменнасці часоў Скарыны: мочи ли будешъ споити блищащие звезды (КІ, 46); Бощиеся бога не будутꙋ неверни слову его (ІС, 7б); виннице цветущие выдали запахъ своꙗ (ПП, 4б); Пꙋсти хлѣбъ своꙗ на воды текꙋщие (ЕК, 16); быша Давыдови Моавлѧне раби дающие дань (ДЦ, 80); сѣ нынѣ оумножишеся раби ꙋтекающие ѡт господъ своихъ (ПЦ, 53); молчаша вси людие стоѧщие на стенахъ (ЧЦ, 225б); изомроша бо вси ищꙋщие дꙋши твоеѧ (КВ, 10б); буду збирати класы падающие опосле женцевъ (КР, 3б).

Па ўжыванню разгледжаных канчаткаў з пражскімі перакладнымі кнігамі Скарыны збліжаюцца і яго неперакладныя выданні, асабліва віленскія «Малая падарожная кніжка» і «Апостал». Напрыклад, у розных частках «Малой падарожнай кніжкі» звычайнымі з'яўляюцца формы *владеющего, вопиющего, грѧдущего, дарующего, дающего, ищущего, жаждущего, носѧщего, подающего, прибегающего, приидущего* і г. д. Віленскі «Псалтыр» у складзе «Малой падарожнай кніжкі» вылучаецца вялікай колькасцю дзеепрыметнікаў назоўнага склону множнага ліку з канчаткам *-ие*, які адпавядае канчатку *-еи* «Астрожскай бібліі»: *воздающие, востающие, живущие, знающие, ищущие, ненавидѧщие, пиющие, спѧщие, стꙋжающие, творѧщие, уповающие, хотѧщие* і інш.

Выданні Скарыны, нягледзячы на тое, што яны з'явіліся ў свет за параўнальна кароткі тэрмін у 9 гадоў, усё ж зазналі некаторую эвалюцыю ў формаўжыванні, і гэта асабліва выразна відаць на канчатках дзеепрыметнікаў. Напрыклад, у пражскім выданні «Псалтыра» ўжываюцца дзеепрыметнікі з традыцыйнымі канчаткамі *-аго* ў родным склоне і *-еи* або *-ии* ў назоўным склоне множнага ліку, тады як у віленскім тэксце гэтага помніка выступаюць новыя канчаткі. Напрыклад, у пражскім выданні несть помагающаго ми (20б) — у віленскім несть помагающего ми (19б); адпаведна: знающеи имѧ твое (10) — знающие имѧ твое (9); востающіи на мѧ постыдѧтсѧ (99б) — востающие на мѧ посътыдѧтсѧ (98б). Такія замены ў віленскім выданні набылі значэнне варыянтнай нормы. Яны аб'ядноўваюць у адзін тып скарынінскія перакладныя і неперакладныя выданні і даюць падставу адносіць усе іх да беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы.

Як вядома, дзеепрыслоўі славянскіх моў паходзяць з кароткіх дзеепрыметнікаў, якія ў пэўных сінтаксічных умовах перасталі ўжывацца ў ролі азначэння і страцілі здольнасць дапасоўвацца да назоўнікаў. У ходзе гэтага працэсу актыўныя дзеепрыметнікі перасталі змяняцца па склонах і ліках і ператварыліся

ў застылыя нязменныя формы. Такое пераўтварэнне дзеепрыметнікаў ужо выяўляецца ў позніх старажытнарускіх помніках. У скарынінскую эпоху пераўтварэнне дзеепрыметнікаў у дзеепрыслоўі ў беларускай мове праходзіла асабліва актыўна, і гэта знайшло сваё адлюстраванне ў выданнях Скарыны. У яго мове на старую сістэму дзеепрыметнікаў накладваліся шматлікія граматычныя неалагізмы, у сувязі з чым агульны малюнак узаемаадносін дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў выглядае вельмі стракатым і супярэчлівым.

Асноўнай граматычнай нормай у тэкстах Скарыны з'яўляецца ўжыванне традыцыйных форм дзеепрыметнікаў назоўнага склону множнага ліку з фармантам *-ще*. Але па сваёй марфолага-сінтаксічнай ролі такія ўтварэнні маюць значэнне дзеепрыслоўяў, абазначаючы другараднае дзеянне ў адносінах да асноўнага дзеяння, выражанага выказнікам: они же потонуша ѕповающе на силу свою (ІС, 26б); они лежаху по земли ѧдуще и пиюще и ѧкобы празникъ чинѧще (ПЦ, 62б); шло естъ все множество людей за нимъ трубѧще и радующесѧ (ТЦ, 122б); бежаша токмо хотѧще избавити животы своѧ (ЧЦ, 198б); оградили села своѧ и навозили житъ готующесѧ к бою (КЮ, 6); в тои день пришли суть раби Ісаакови возвещающе ему о кладези (КБ, 48); смутисѧ все войско вражие и вопиюще и кричаще побегоша (КС, 18); будете є розмолвѧти седѧще в домех^{s} своих, и ходѧще путем^{s} своим^{s} ложащесѧ и вставающе (ДЗ, 17б).

Адносна ўстойлівымі з'яўляюцца таксама традыцыйныя царкоўнаславянскія формы жаночага роду адзіночнага ліку на *-щи:* Склонивши же Версавиа лице свое к земли и поклонилаѕ царю глаголющи (ТЦ, 122); Она же ѕздыхала седѧщи на осле (КС, 5); ѕказалаѕ естъ Ревека идущи и несущи ведро на плечи своемъ (КБ, 43).

Аднак скарынінскія тэксты даюць многа прыкладаў парушэння ранейшай парадыгмы дзеепрыметніка, калі формы множнага ліку ўжываюцца ў значэнні адзіночнага, формы жаночага роду выступаюць у значэнні мужчынскага ці наадварот і г. д.: гонили суть людей Асирскихъ побиѧющи оружиемъ (КЮ, 23б); они же збираху крохи ползающи под столомъ (КС, 4б); Людие роптахѕ на моисеѧ боѧщисѧ волотов^{s} (ЛК, 3); Ковчегъ же былъ естъ носѧщисѧ по верху водъ (КБ, 18); Саѕлъ приближалсѧ идуще за волы своими (ПЦ, 22б); Имъ же зачинала Мариамъ глаголюще (КВ, 30); стала естъ сама Іѕдиѧъ предъ ложемъ, молѧщисѧ с плачем^{s}, двизаѧ ѕстами и молъчкомъ гл҃ѧ (КЮ, 20б).

Усе такія прыклады сведчаць, што перакладчык сутыкнуўся з вялікімі цяжкасцямі пры выкарыстанні ў сваіх тэкстах гэтых дзеяслоўных форм. Недастатковае валоданне царкоўнаславянскай мовай, з аднаго боку, і пераўтварэнне дзеепрыметнікаў у дзеепрыслоўі ў жывой беларускай мове, з другога, стала прычынай таго, што формы розных храналагічных зрэзаў і рознага паходжання ўжываліся побач у адным і тым жа кантэксце:

в ней же с девками своими завирающесѧ живѧше имеющи власѧницу на бедрахъ своихъ постѧчисѧ по всѧ дни (КЮ, 13); Манны людие не хотечи ропчуть на Моисеѧ жадающе мѧса (ЛК, 27). Беларускія формы дзеепрыслоўяў на *-чи,* па паходжанню формы жаночага роду адзіночнага ліку, у выданнях Скарыны выкарыстоўваюцца ў якасці уніфікаваных для ўсіх родаў адзіночнага і множнага ліку: въсталъ естъ *ѡт* стола гневаючисѧ Енаѳа (ПЦ, 45); Тогда билсѧ естъ в перси своѧ Давыдъ жалуючи того (ДЦ, 11б); видѧчи тое выдалꙋсѧ есми самъ на погибель (КС, 29); Онꙋ же плакалъ *ест* едучи во ерусалимъ (ПЕ, 2); Другаѧ же панна шла за нею несучи плащъ еѧ (КЕ, 23); стигаючи é египтѧне внийдоша вослед ихъ (КВ, 28б); судьи и врѧдници во всѧкихъ местахъ хвалили Ꙉдеовъ, боѧчисѧ Мардохеѧ (КЕ, 15); приступите к некоторому граду хотѧчи добыти его (ДЗ, 40).

Дзеепрыслоўі гэтага тыпу належаць да ліку самых яркіх рыс, якімі мова выданняў Скарыны збліжаецца з беларускай мовай. Разам з тым гэты скарынінскі матэрыял паказвае, што ў беларускай мове часоў Скарыны дзеепрыслоўе выступала ўжо самастойнай дзеяслоўнай формай, семантычна і сінтаксічна адасобленай ад дзеепрыметніка.

Актыўныя дзеепрыметнікі прошлага часу ў выданнях Скарыны ўжываюцца значна радзей. Поўныя формы іх у ролі азначэння зафіксаваны ў розных склонавых формах: Людие же ходивший в погоню за асирѧны, победивши *их* навратишесѧ до веѳулии (КЮ, 24); никто же Ꙉбиеть и́ всѧкъ знашедший его (КБ, 14); сѣ людие вышедшие из египта прикриша землю (ЛК, 48б); море медѧное бывшее в дому божиемъ сокрушиша халдеѧне (ЧЦ, 239б); Рече же Давыдъ ко отроку возвестившему ему новину сию (ДЦ, 67); ту Ꙉбо воистину погребоша людеи пожадавшихъ мѧса (ЛК, 29); годолию оставилꙋ надꙋ людми оставшимисѧ тѲ (ЧЦ, 238б).

Такія дзеепрыметнікі асабліва часта ўжываюцца ў форме роднага склону, калі яны дапасуюцца да адушаўлёных назоўнікаў. Тут, як і ў дзеепрыметніках цяперашняга часу, часцей за ўсё ўжываецца канчатак *-его,* і гэтай асаблівасцю ўжыванне такіх дзеепрыметнікаў збліжаецца з нормамі тагачаснай беларускай пісьменнасці: пытахусѧ на Ꙉделавшего дело тое (КС, 15б); не запоминайте господа бога вашего, изведшего васъ зꙋ египта (ДЗ, 21); выведи проклѧвшего имѧ мое вонъ с полковъ (КЛ, 46б).

Дзеепрыметнікі гэтага тыпу часта ўжываюцца са зваротнай часціцай -сѧ: видехꙋ всих людеи Ізраилевыхъ разбегшихсѧ по горахъ (ТЦ, 180); забилъ единыи кажныи мужа споткавшегосѧ с ним (ТЦ, 174б); годолию оставилꙋ надꙋ людми оставшимисѧ тѲ (ЧЦ, 238б); знашли *их* ополчившихсѧ при мори (КВ, 27б); тѲ Ꙉбо видеша фараона пригнавшегосѧ за ними (ЛК, 2).

У чэшскай Бібліі такім скарынінскім формам адпавядаюць або апісальныя звароты, або іншыя дзеяслоўныя формы: rzekl

Dawid tomu poslu mladenczy, kteryž mu nowinu powiediel — Рече же Давыдъ ко отроку возвестившему ему новину сию (ДЦ, 67); Widiel gsem wesskeren lid Izrahelsky an se rozbiehl po horach — видехˢ всих людеи Ізраилевыхъ разбегшихсѧ по горахъ (ТЦ, 180). Такія параўнанні паказваюць, што царкоўнаславянскія мадэлі былі для Скарыны вызначальнымі, калі чэшскія канструкцыі, па перакананню перакладчыка, аказваліся непрымальнымі.

Вельмі стракатым выглядае ўжыванне дзеепрыметнікаў прошлага часу ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду. У большасці выпадкаў тут захоўваецца старажытнае формаўжыванне дзеепрыметнікаў на *-въ* тыпу *взѧвъ, въставъ, завезавъ, затворивъ, оковавъ, опустивъ, оставивъ, повѣсивъ, пославъ, поставивъ, призвавъ, приступивъ, скочивъ, слышавъ, созвавъ, ступивъ, укрепившсѧ* і інш.: Воздвигъ еси мѧ и ꙗко на вѣтръ выставивъ, свѣрглъ еси мѧ (КІ, 36); Дв҃дъ же гудѧше на гуслѧхˢ повѣсивˢ е҆ собѣ на раменехˢ (ДЦ, 77); Онˢ же въставъ ꙋде и пие, и иде ѕкрепившсѧ ꙋдию тою (ТЦ, 172б); Іоада епископˢ взѧлˢ скриню и оковавˢ ю҆ ѕделалˢ зверху дирю (ЧЦ, 210); Лаванˢ пакˢ воставъ в ночи поцелова дщеры своѧ и внѕки своѧ, и благославивъ ихъ, навратилсѧ естъ в домъ свои (КБ, 59); ѕслышавˢ фараонъ речь тую искаше ѕбити Моисеѧ (КВ, 7); Сиѧ слышавъ Ааронъ молчалъ естъ (КЛ, 20); огонь с небеси ступивъ спалилъ Хорея (ЛК, 55); Сиѧ же ѕслышавъ царь исполнисѧ ꙗрости (ДП, 7б).

Трывала захоўваюцца таксама ў выданнях Скарыны дзеепрыметнікі прошлага часу жаночага роду адзіночнага ліку на *-ши,* паколькі яны супадалі і ў царкоўнаславянскай, і ў беларускай мовах, адрозніваючыся ў некаторых формах толькі складам гукаў у асновах: Она же въставши поклонисѧ до земли (ПЦ, 55б); секира спадши с топорища забила товариша его (ДЗ, 38); Она же вземши муки смеси с водою, и роспустивши вделала ему кашку, и ѕварившии выложила предъ него (ДЦ, 88б); тогда жена та взѧвши мужеи съкрила ихъ (ІН, 6); вшедши младшаѧ дщера спала естъ с нимъ (КБ, 35); Орфа поцеловавши Ноему свекровъ свою навратисѧ в домъ своѝ (КР, 3); Опѧть Лиѧ почавши породила сына шестаго (КБ, 55). Такія формы цалкам адпавядаюць формаўжыванню царкоўнаславянскай мовы, што пацвярджаецца параўнаннямі з «Астрожскай бібліяй»: И заченши Лиѧ роди ꙗковѕ сына (КБ, 53б) — И заченши Ліѧ роди Іаковѕ сн҃ъ; она вземши скоро плащъ своѝ, закры лице свое (там жа, 44б) — сіѧ же вземши ризы оутвореныѧ и облечесѧ.

Старажытнаму формаўжыванню такіх дзеепрыметнікаў адпавядаюць і шматлікія выпадкі выкарыстання форм множнага ліку мужчынскага роду на *-ше:* Давыдъ же и мужи его в той пещере внутри съкрившесѧ седѧху (ПЦ, 51); тогда собравшесѧ вси пришли искати Давыда (ДЦ, 75—75б); они же пришедше скоро навратишесѧ и побегоша (ІН, 14б); Сиѧ ѕзревше сторожи

Асирстии бежаху скоро к шатру Олофернову (КЮ, 22б); наклонившесѧ вси падоша на землю предъ нимъ (КВ, 11); ѡттоле воздвигшесѧ пришли к потокꙋ зареѳъ (ЛК, 46).

Як і дзеепрыметнікі цяперашняга часу, дзеепрыметнікі прошлага часу жаночага роду адзіночнага ліку на *-ши* вельмі часта ўжываюцца з назоўнікамі іншых родаў абодвух лікаў. Асабліва часта такія формы адносяцца да назоўнікаў мужчынскага роду, што тлумачыцца кантэкстам: Тогда иде посолъ и пришедши возвѣсти Давыдови (ДЦ, 85б); Мифивозеѳъ... изыйде въ стретение царю, не ꙋмывши ногъ своихъ и не острыгши брады своеѧ и не изоправши ризъ своих (там жа, 104б); Олофернъ оупившисѧ вина ꙋсне твердо (КЮ, 20); Царь же привитавши его, пыталъ ꙋ него (КБ, 87); подпивши царь Валтызаръ повѣле принести сосуды златые (ДП, 18б).

Ва ўсіх такіх выпадках дзеепрыметнікі ўжо выступаюць у функцыі дзеепрыслоўяў, на што ўказвае адсутнасць ранейшага дапасавання. Тое ж мае месца і пры дзейніках у форме множнага ліку: выслухавши тебе будуть стеречи тѧ (ІС, 30б); Тако и мы народившисѧ скоро преставаемъ быти (ПБ, 8б); Вземши же они мужу дары и пенези двой, и понѧвши Вениамина идоша во египетъ (КБ, 79б); Они же пришедши до долины грозновы исходивши всю землю и навратившисѧ розвратиша серца сынов^{s} Ізраилевых^{s} (ЛК, 66б); они же ранивши забили суть и́, и вземши главу его шли путемъ по пустыни (ДЦ, 73б); Сыновѣ теже Ізраилевы съчетъшисѧ, и набравши стравы вышли суть (ТЦ, 175).

Побач з асноўнымі формамі дзеепрыметнікаў прошлага часу на *-въ* у выданнях Скарыны зафіксавана вялікая колькасць дзеепрыметнікаў на *-дъ* ад дзеяслова *ити* і вытворных ад яго: *шедъ, вшедъ, вышедъ, обышедъ, отшедъ, пошедъ, пришедъ.* Такое ўжыванне адпавядае старажытным нормам стараславянскай мовы: Новавъ теже шедъ добылъ естъ града Канаѳа (ЛК, 68); Олофернъ вшедъ в землю ихъ облѧже найпервей градъ Веѳулию (КЮ, 2); Илиѧ закрил^{s} лице свое плащемъ и вышедъ стал^{s} ꙋ двери пещеры (ТЦ, 172б); обышедъ землю и прошедъ поднебесную приидохъ (КІ, 4б); ѡтшед^{s} ѡттоле розбилъ шатры своѧ за столпомъ (КБ, 65); Пошед^{s} ѡттолѣ копалъ естъ иный кладезь (КБ, 47б); Тогда пришедъ Моисей повѣдаше людемъ всѧ словеса (ЛК, 28б). У кантэксце біблейскага выкладу дзеяслоў руху *ити* са сваімі вытворнымі асабліва часта выкарыстоўваецца не толькі ў розных асабовых спрагальных формах, але і ў формах дзеепрыметнікаў на *-дъ,* і гэта надае выкладу архаічнае царкоўнаславянскае адценне.

Вялікай колькасцю фанетыка-марфалагічных варыянтаў вылучаецца дзеепрыметнік прошлага часу ад дзеяслова *взѧти: возмѧ — вземъ — воземъ — вземши — воземши — взѧвъ — взѧвши — вземше.* Усе гэтыя варыянты адлюстроўваюць розныя этапы развіцця дзеепрыметнікаў у царкоўнаславянскай мове

і вынікі ўздзеяння на мову Скарыны жывой і пісьмовай беларускай мовы: онˢ же возмѧ полную горсть ѡт неѧ спалить на требнице (КЛ, 12б); Ісаакъ же вземъ Ревекѳ вовѣде в домъ (КБ, 44б); Моисеи воземъ ѡт нихъ возы и волы далъ е́ левитомъ (ЛК, 18); вземши на сѧ зброе осадили суть ѳзкаѧ места (КЮ, 11); воземши на сѧ зброю идите жъ напредъ (ДЗ, 11); Взѧвъ же Давыдъ ризы своѧ раздра е́ на собѣ (ДЦ, 66б); Они же взѧвши тельца едина его же дали имъ (ТЦ, 170); Главу же Езвозеѳову вземше похоронили ю́ во гробѣ Авенерове (ДЦ, 74). У колькасных адносінах пераважае варыянт *вземши,* другое месца займае форма *вземъ,* а варыянт *возмѧ* адзначаны радзей за іншыя.

Ужыванне дзеепрыметнікаў прошлага часу ў перакладных выданнях Скарыны ў большасці выпадкаў адпавядае аналагічным формам чэшскай Бібліі: Tehdy ona przystupiwssy padla k noham geho — Тогда она приступивши пала ѳ ногу его (ЧЦ, 192); a powolaw gich wyprawowal sen — И призвавˢ *их* поведаше имъ сонъ (КБ, 74); A wyssed druheho dne vzrzel dwa žydy ani se wadije — Вышедъ пакъ во вторый день виде два мужа Евреанина биющесѧ (КВ, 7).

Побач з актыўнымі дзеепрыметнікамі прошлага часу на *-ш* у Скарыны ў зародкавым стане вызначыўся і тып такіх дзеепрыметнікаў на *-л:* все ѳкраденое и згиблое на мне биралъ еси (КБ, 58); имети будетˢ собѣ ѧко плевы железо, и ѧко древо згнілое медь (КІ, 50—50б); толико жˢ класовъ тонкихъ и ѳвѧлыхъ выростало (КБ, 74); отець жалеѧ скоро оумерлаго сына ѳчинилъ собе ѳподобление (ПБ, 21б); Елисей секиру ѳтонулую въ Іордани ѳсплави (ЧЦ, 195). У беларускай пісьменнасці часоў Скарыны дзеепрыметнікі такога ўтварэння адзначаюцца ў перакладах з польскай мовы. Несумненна, заходнеславянскае паходжанне маюць яны і ў выданнях Скарыны.

З актыўнымі дзеепрыметнікамі цяперашняга і прошлага часу ў выданнях Скарыны суадносяцца і пасіўныя дзеепрыметнікі. У залежнасці ад часавых адносін да дзеяння дзеяслова-выказніка яны па традыцыі таксама падзяляюцца на дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу.

Пасіўныя дзеепрыметнікі цяперашняга часу ўтвараюцца ад асноў цяперашняга часу пры дапамозе суфікса *-м-* з рознымі папярэднімі тэматычнымі галоснымі. Кожная форма мае свой канчатак, які выражае склон, род і лік. У тэкстах Скарыны пасіўныя дзеепрыметнікі выкарыстоўваюцца як у атрыбутыўнай, так і ў прэдыкатыўнай функцыі і змяняюцца па ўзору цвёрдай разнавіднасці кароткіх або поўных прыметнікаў. Але ў перакладах Скарыны дзеепрыметнікі гэтага тыпу выкарыстоўваюцца вельмі абмежавана, што адпавядае іх агульнай гісторыі ў славянскіх мовах. У Скарыны зафіксавана іх усяго крыху больш за два дзесяткі: *ведомый, видомый, восприемлемый, збираемый, знаемый, зовемый, любимый, незаходимый, неизносимый, ненавидимый, ненасытимый, непобедимый, неугасимый, очищаемый,*

посылаемый, превозносимый, рекомый, розгибаемый, рознашаемый, сказаемый, соблюдаемый, содержаемый, уздравѧемый, укреплѧемый і некаторыя іншыя. Тыповымі прыкладамі такіх дзеепрыметнікаў з'яўляюцца наступныя формаўжыванні: Пожреть его огнь невгасимый (КІ, 26б); их^{s} же житие добрѣ знаемо естъ въ поколениехъ вашихъ (ДЗ, 6); Вси пути людскые знаеми сѫть пред^{s} очима его (ПС, 25б); брюхо же несправедливыхъ ненасытимо естъ (ПС, 22); Моисею неизносимаѧ тѧгота бысть (ЛК, 27б); мѫжъ же строптивый ненавидимъ естъ (ПС, 23); неоугасимое естъ светло еѧ (ПБ, 11б); дымъ онъ же ветромъ рознашаемъ естъ (ПБ, 9); пришла еси в люди незнаемые (КР, 4б).

Паказальна, што Скарына ўжывае такія формы ў сваіх прадмовах і аргументах — кароткіх выкладах зместу кожнага раздзела біблейскага тэксту: то суть третиѩ книги Моисеевы зовемый Ваикра (КЛ, 2); Законъ прирожденый в томъ наболей соблюдаемъ бываеть (ДЗ, 1б); Дондеже приидеть он^{s} же посылаемъ естъ (ДП, 1б); ѩвлѧеть бога необъсѧзаема быти (КІ, 16); премудрость *ест* свѣтъ незаходимый (ПБ, 11); право... ѡт всехъ народовъ посполите соблюдаемо естъ (ДЗ, 3); В сей малой книзе рекомой Руѳъ о великой речи пишеть (КР, 1б). Гэтыя прыклады паказваюць, што ў свядомасці перакладчыка пасіўныя дзеепрыметнікі цяперашняга часу ўспрымаліся як нармальныя сродкі пісьмовай мовы. Гэтым самым мова Скарыны збліжалася з царкоўнаславянскай і аддалялася ад беларускай, дзе такія формы практычна не ўжываліся ў часы Скарыны.

Затое пасіўныя дзеепрыметнікі прошлага часу ў выданнях Скарыны не маюць ніякіх абмежаванняў у сваім ужыванні. З пункту погляду свайго ўтварэння пасіўныя дзеепрыметнікі прошлага часу падзяляюцца на два разрады, не аднолькавыя па лексічнай напоўненасці: формы з суфіксам *-н-* і формы з суфіксам *-т-*. Формы з суфіксам *-н-* (часта са злучальным галосным *е*) — самы распаўсюджаны, нічым не абмежаваны тып дзеепрыметнікаў у выданнях Скарыны. Шмат іх адзначаецца і ў іншых помніках старабеларускай пісьменнасці. Асноўная колькасць такіх дзеепрыметнікаў утвараецца ад прыставачных дзеясловаў закончанага трывання: *взысканый, внесеный, возвеличеный, воздвиженый, возложеный, возлюбленый, всаженый, выведеный, выверженый, выгнаный, выгубленый, выдавленый, выданый, выкупленый, выложеный, вынесеный, выпаленый* і г. д. Разам з тым выяўляецца пэўная колькасць дзеепрыметнікаў і ад беспрыставачных дзеясловаў незакончанага трывання тыпу *важеный, вареный, веденый, венчаный, верженый, виданый, воеваный, даваный, деланый, держаный, еденый, караный, кладеный, малеваный, милованый, мученый, пасеный, печеный, писаный, пытаный, резаный, тесаный, тѧгненый, хваленый, храненый* і інш. З гэтага разраду некаторыя дзеепрыметнікі вылучаюцца асаблівасцямі ўтварэння і сінтаксічных функцый: жадный камень стены не моглъ видѧн^{s} быти (ТЦ, 134б); ѩко жребѧ коньское

будеть гонѣнъ (ІС, 38); дозрели винные грознове и едены могли быти (ЛК, 31); на сыны ея будеть погледено (ІС, 38).

Разам з тым ва ўтварэнні пасіўных дзеепрыметнікаў прошлага часу назіраюцца і некаторыя асаблівасці рэгулярнага характару. Так, у Скарыны, як і наогул ва ўсходнеславянскай пісьменнасці, дзеепрыметнікі ад дзеясловаў з асновай на губныя зычныя *б, в, м, п* ужываюцца з эпентэтычным гукам *л: возлюбленый, выгубленый, выдавленый, выкупленый, загубленый, закупленый, заставленый, здробленый, кривленый, оставленый, подавленый, поставленый, притупленый, прославленый, скропленый, укрепленый, установленый, утопленый* і інш. Аднак такія і падобныя дзеепрыметнікі ўжываюцца і без эпентэтычнага *л:* восхощеши ли абы были выбавени люди твое то скоро избавени будемъ (КЕ, 21); не будеть загубена к тому всѧка плоть водами потопными (КБ, 20б); И ту умре Ааронъ и погребенъ естъ (ДЗ, 24); несилне поставени суще ветромъ порушени будуть (ПБ, 7); боже отець нашихъ хваленъ и прославенъ и превознесенъ во вѣки (ДП, 13); Буди то олеемъ скропена или не скропена все сыномъ Ааароновымъ в делъ ровный да будетъ розделено (КЛ, 15).

Формы такога ўтварэння маюць, несумненна, заходнеславянскае паходжанне, яны ўпершыню адзначаюцца ў перакладах з польскай мовы ўжо ў канцы XV ст. У скарынінскіх тэкстах яны з'явіліся пад уплывам чэшскай Біблії: Lepegi bylo zbitym meczẽ neż zhubenym hladem — Лепеи было побитымъ оружиемъ нежели згубеным гладом (ПЕ, 10).

Выключнай асаблівасцю скарынінскіх выданняў з'яўляецца частае ўжыванне пасіўных дзеепрыметнікаў з падвоеным *н* у суфіксе: *возлюбленный, искушенный, наказанный, нароженный, насаженный, плененный, помазанный, посвѧщенный, предложенный, развращенный, сокрушенный, уготованный, укорененный, упокоенный, устроенный, утруженный* і інш. Аднак такія ўтварэнні могуць ужывацца паралельна з формамі з адным *н: искушеный, нароженый, насаженый, плененый, помазаный, посвѧщеный, развращеный, сокрушеный* і г. д. Дзеепрыметнікаў з падвоеным *н* яшчэ не ведала стараславянская мова, але ва ўсходнеславянскай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы яны пачалі ўжывацца з XIII ст. Скарына, такім чынам, і ў гэтых адносінах збліжаў мову сваіх выданняў з тагачаснымі царкоўнаславянскімі ўзорамі: сѣ естъ сынъ мои возлюблѣнныи (ІН, 4); мужъ же мудрыи и наказанный хранитсѧ ѡт сихъ (ІС, 66); Ведите тамъ единого жерца ѡт плененныхъ (ЧЦ, 221б); Ртовѣ праведныхъ согледають любезнаѧ, оуста же неверныхъ развращеннаѧ (ПС, 18); в души съкрушенноѝ и в серци смиренномъ приати будемъ (ДП, 12б); М8жу 8покоенному его же пути справлены с8ть во всехъ делехъ (ІС, 66); Жена м8драѧ созиждаеть домъ свои, безумнаѧ же 8строенныи сказить руками (ПС, 22).

У помніках на беларускай мове часоў Скарыны такія формы не адзначаюцца. Яны атрымалі значнае пашырэнне толькі ў кніж-

ных стылях першай палавіны XVII ст., калі беларуская пісьменнасць зноў пачала падвяргацца царкоўнаславянскаму ўплыву.

У супрацьлегласць гэтаму пасіўных дзеепрыметнікаў прошлага часу з суфіксам *-т-* у Скарыны зусім мала, іх выяўлена ўсяго каля трох дзесяткаў: *битый, взѧтый, вылитый, вынетый, выпитый, выр[illegible]тый, высутый, вытертый, дутый, забитый, завитый, занѧтый, молотый, набытый, надутый, обитый, омытый, оттѧтый, питый, побитый, подтѧтый, пожатый, политый, потертый, початый, прибитый, прикрытый, принѧтый, проклѧтый, розбитый, ритый, слитый, сокрытый, убитый* і інш. Такія дзеепрыметнікі ў кароткай форме выкарыстоўваюцца ў прэдыкатыўнай функцыі, поўныя формы з'яўляюцца азначэннем: со обудву стран[s] враги биты были (ІН, 18); ныне не будет[s] вылита кровь моꙗ на землю (ПЦ, 57); да ѕделает с него образъ дутый и ритый (КС, 37б); Дали суть Давыдови... ечменѧ крупъ бобу и сочевице, и молотое гречихи (ДЦ, 100); Лепей было побитым[s] оружием[s] нежели згубеным гладом (ПЕ, 10); попалиша всѧ жита их нежатаѧ и ѕ копнах[s] пожатаѧ (КС, 33); ꙗкобы куделѧ свинутаѧ тако и множество грешных (ІС, 33б). Дзеепрыметнікі на *-т-* вядомы былі і чэшскай Біблііі, і ўсходнеславянскім творам на царкоўнаславянскай мове, таму выданні Скарыны па ўтварэнню і выкарыстанню іх якіх-небудзь спецыфічных асаблівасцей не выяўляюць.

Разгледжаныя формы пасіўных дзеепрыметнікаў прошлага часу з суфіксамі *-н-* і *-т-* з пункту погляду суадносін царкоўнаславянскіх і беларускіх элементаў у мове Скарыны займаюць нейтральнае становішча, бо ў абедзвюх мовах яны супадаюць структурна, адрозніваючыся толькі ступенню прадуктыўнасці і лексічнай напоўненасцю.

Калі ж гаварыць пра актыўныя дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу, дык іх царкоўнаславянскае паходжанне ў мове Скарыны зусім відавочнае. Сюды адносяцца ў першую чаргу формы мужчынскага роду назоўнага склону адзіночнага ліку тыпу *видѧ, знаѧ, идѧ*, поўныя іх формы мадэлі *беръи, видѧи, идѧи* і *ведый, пришедый, создавый*, формы на *-щ-* накшталт *видѧщий, лежащий, носѧщий*, формы прошлага часу на *-въ* тыпу *взѧвъ, пославъ, слышавъ*.

Беларуская стыхія больш прыкметна выяўляецца толькі ў выкарыстанні кароткіх форм дзеепрыметнікаў цяперашняга і прошлага часу, уніфікаваных для ўсіх родаў і абодвух лікаў у значэнні дзеепрыслоўяў тыпу *беручи, идучи, несучи, взѧвши, понѧвши, пришедши*. Аднак і такія формы ўжываюцца паралельна з іх царкоўнаславянскімі адпаведнікамі.

Наяўныя ў выданнях Скарыны, як і наогул у старабеларускай пісьменнасці, інфінітывы ў залежнасці ад характару асновы падзяляюцца на некалькі тыпаў, якія атрымалі неаднолькавае марфалагічнае развіццё на працягу гісторыі беларускай мовы: 1) інфінітывы з асновай на галосны; 2) інфінітывы з асновай на спалучэнне зычных і 3) інфінітывы з асновай на заднеязычныя *г* і *к*.

Асновы большасці зафіксаваных у выданнях Скарыны інфінітываў канчаюцца на галосныя гукі, і такія інфінітывы як пануючую граматычную норму маюць у канцы фармант *-ти: бити, быти, важити, верити, видети, вопиати, гледети, гонити, дати, делати, жити, зрети, имети, искати, пити, поведити, познати, предати, служити, ѕчити, ходити, чинити* і інш.: егда начнемы сѧ бити (ПЦ, 60б); вы же имате имъ помощни быти (КЕ, 25); ꙗ бѕдѕ веселитисѧ и играти (ДЦ, 77б); к богу моему вопиати буду (ДЦ, 110б); не продолжай дати бедующему (ІС, 9б); Добро намъ естъ было жити во египте (ЛК, 28); буду збирати класы (КР, 3б); всихъ речей множество имети будете (ДЗ, 21); Имамы искати мѕдрости болѣе нежели злата (ПС, 6б); даймо емѕ пити вина и сее нощи (КБ, 35); не хотели есте послушати гласа моего (КС, 14); тамо будемъ приносити жертву (КВ, 17б); хотѧху бо людие камениемˢ ѕбити его (ПЦ, 61б); по воли души моеѧ чинити бѕдеть (ПЦ, 9б).

Помнікі беларускай актавай пісьменнасці XIV ст. даюць прыклады інфінітываў новага ўтварэння без канцавога *-и*, што сведчыць аб уплыве народна-дыялектнай мовы таго часу. Некаторыя помнікі канца XV ст. маюць інфінітывы на *-ть* у якасці варыянтнай нормы. Аднак у беларускіх помніках інфінітывы гэтай новай структуры больш ці менш сістэматычна адлюстроўваюцца толькі з другой палавіны XVI ст. Інфінітывы старой структуры з фармантам *-ти* захоўваюцца да нашага часу ў частцы паўднёва-заходніх гаворак, у часы Скарыны тэрыторыя іх распаўсюджання была, несумненна, значна большай.

Інфінітывы без канцавога *-и* ў выданнях Скарыны прадстаўлены толькі адзінкавымі прыкладамі: Не имать быть речено тое (ІС, 64б); знашли сѕть ослице, их же ѡтходилˢ есь искатˢ (ПЦ, 20б); храм гсденˢ повеле царь Іоасъ оправлѧтˢ (ЧЦ, 209б); наверхѕлˢ единого на место его подавать пити собѣ (КБ, 73б); Вси еже входили послуговатˢ во храме завета (ЛК, 14); будете приноситˢ жертвы (ДЗ, 33б); они же бы могли ѕчинить месть (ЛК, 64); Доколѣ храмать будете на обе стране (ТЦ, 170). Інфінітывы без канцавога *-и* былі ўласцівы роднай полацкай гаворцы Скарыны. Але выдавец пазбягаў іх ужывання, прытрымліваючыся традыцыйных пісьмовых норм, якія мелі і адпаведнасць у царкоўнаславянскай мове. Інфінітывы такой структуры зрэдку трапляюцца і ў віленскіх выданнях Скарыны: потреба

ест единому человек8 8мрет^{ѕ} за люди (АК, 12); радуйс҃ милостыню творить повелева҃ (АП, 10—10б).

На фоне тысяч ужыванняў традыцыйных інфінітываў на *-ти* такія адзінкавыя выпадкі зусім не прэтэндуюць нават на значэнне варыянтнай нормы. Яны належаць толькі да ліку з'яў, якія, як заўважыў у свой час Я. Воўк-Левановіч, паказваюць, што жывая беларуская мова часоў Скарыны была ўжо такой, якой мы ведаем яе цяпер.

Інфінітывы дзеясловаў з асновай на два і больш зычныя ў Скарыны таксама паслядоўна ўжываюцца з канцавым *-и*, як у формах *блюсти, брести, воверзти, впасти, въскласти, нести, пасти, погрести, понести, принести, пробости, снести, счести, упасти, чести:* по ней же агнець брести можеть (КБ, 2б); Царь повелелъ Данила воверзти до ѧмы (ДП, 20б); не допущай мене впасти в срамот8 *их* (ІС, 36б); опѧть буд8 пасти и хранити стадъ твои*х* (КБ, 55б); 8хопилъ Са8лъ копие хотѧ пробости его (ПБ, 45); лепей мнѣ естъ оупасти в руце господни (ДЦ, 116б); Азъ же писмо сее чести буду пред тобою (ДП, 19б).

Ужыванне інфінітываў на *-ти* ад асноў на галосны і на спалучэнні зычных у выданнях Скарыны таксама знаходзіцца ў адпаведнасці з агульнымі нормамі тагачаснай пісьменнасці. Інфінітывы на *-ти* былі адзінымі ў царкоўнаславянскай мове на працягу ўсяго перыяду яе развіцця. Яны былі пануючымі і ў беларускай пісьменнасці часоў Скарыны. З ліку беларускіх помнікаў таго часу вылучаецца толькі Вісліцкі статут канца XV ст., дзе новыя формы інфінітываў без канцавога *-и* маюць значэнне варыянтнай нормы: *боронить, брать, быть, гонить, дать, держать, ехать, забить, иметь, ловить, платить, судить* і інш. Аднак гэты помнік не аказаў істотнага ўплыву нават на мову дзелавой пісьменнасці свайго часу. Для формаўжывання Скарыны, несумненна, пэўнае значэнне меў і той факт, што ў чэшскай Біблії інфінітывы таксама ўжываліся з канцавым *-ti:* ne chtielo srdcze me wyecze praczowati — не хотело ср҃дце мое болѣе тружатис҃ (ЕК, 5б); Protož služiti budem bohu — Сего ради служити будемъ господу (ІН, 46б); Slamy wam wijecze dawati ne budu — плевъ вамъ болей давати не буду (КВ, 12).

Іншы малюнак маюць у выданнях Скарыны інфінітывы ад дзеясловаў з асновай на заднеязычныя *г* і *к*. Суадноснымі тут выступаюць царкоўнаславянскія формы на *-щи* і беларускія на *-чи: мощи, помощи, стрещи, стрищи* і *мочи, помочи, стеречи, стричи*. Але лексічнае напаўненне гэтых тыпаў неаднолькавае. Ва ўсіх кнігах ужываецца толькі форма *рещи,* беларускага адпаведніка тут няма зусім: Кто рещи можеть ем8 чему тако чинишъ (КІ, 14); Кто смееть рещи чему тако чинит^{ѕ} (ДЦ, 97); будеть рещи фараонъ о сынехъ Ізраилевыхъ (КВ, 27б). Абодвума варыянтамі прадстаўлены інфінітыў *мощи — мочи* пры відавочнай колькаснай перавазе царкоўнаславянскай формы: Еда обранити нас^{ѕ} будет^{ѕ} мощи сеи (ПЦ, 22); тако будемъ мощи взѧти

градъ (ЧЦ, 199); будете мощи далей пройти (ІН, 34б); не буду мощи ести тыхъ потравъ (КЮ, 19); будеши мощи служити ему (КВ, 35б); не будуть мощи сеати на ней (ДЗ, 56б); Едали буду мощи ѣ имѣти сыны (КР, 2б—3); мочи ли будешъ споити блищащие звезды (КІ, 46); что будемѕ мочи ѕчинити (ІС, 70); будешѕ мочи ити в путь свой (ПЦ, 60).

У пары варыянтаў *помощи — помочи,* наадварот, перавагу мае беларуская форма *помочи:* Добро естъ тобѣ помочи справедливому (ЕК, 11б); жена единаго хотела бы помочи мужу своему (ДЗ, 47б); никто же ми помочи не можеть (КЕ, 21б); самъ собѣ не можеть помощи (ПБ, 20б); Кто возможеть помощи намѕ (КЮ, 12). У такіх жа суадносінах знаходзяцца і карэлятыўныя пары *стрещи — стеречи, стрищи — стричи:* выслухавши тебе будуть стеречи тѧ (ІС, 30б); их же оставилѕ естъ стеречи двору царева (ДЦ, 97б); будете пребывати и стрещи в доме Месса (ЧЦ, 208б); В той часъ ѡтшолъ былъ Лаванѕ стрѣщи овець своихъ (КБ, 57); не будеши стричи первороженыѧ овецѕ (ДЗ, 33).

Нарэшце, некаторыя інфінітывы гэтага тыпу адзначаюцца толькі ва ўсходнеславянскім фанетычным афармленні: жечи тое бѕдеть на требнице (КЛ, 14); десеть женѕ бѕдѕть печи хлебъ во единой пещи (КЛ, 51); се нынѣ мусилъ ѕтечи из земли дляѧ Авесалома (ДЦ, 103б). На афармленне інфінітываў гэтага тыпу ў многіх выпадках аказала ўплыў чэшская Біблія: Dobre gest tobie pomoczy sprawedliwemu — Добро естъ тобѣ помочи справедливому (ЕК, 11б); žadny z nich ne mohl vteczy — не моглъ ѡт нихъ ни единѕ ѕтечи (КС, 96б).

Усяго ў Скарыны адзначаецца 55,2 % інфінітываў на *-щи* і 44,8 % на *-чи.* Інфінітывы гэтага разраду ў пэўнай ступені знаходзяцца ў суадноснасці з назоўнікамі тыпу *нощь, овощъ, свеща, тысеща,* якія ў Скарыны ўжываюцца толькі ў царкоўнаславянскай форме (за выключэннем назоўніка *свеща,* для якога ёсць і беларускі адпаведнік *свеча*). Такім чынам, наяўнасць у тэкстах Скарыны карэлятыўных пар *мощи — мочи, помощи — помочи, стрещи — стеречи, стрищи — стричи* і адсутнасць беларускіх адпаведнікаў для назоўнікаў *нощь, овощъ, пещь, тысеща* наводзіць на думку, што рысы беларускай мовы ў сістэме дзеяслова адлюстраваліся ў большай меры, чым у разрадзе назоўнікаў. Аднак і тут перавага царкоўнаславянскай словаўтваральнай мадэлі застаецца відавочнай.

НЕТЭМАТЫЧНЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ

У беларускай народна-дыялектнай і літаратурна-пісьмовай мове часоў Скарыны нетэматычныя дзеясловы ўжо не выступалі як спецыфічны самастойны клас, іх асабовыя формы падвергліся ўздзеянню тэматычных дзеясловаў і набылі іх канчаткі. Але ў мове Скарыны ў цяперашнім часе яны яшчэ захоўваюць у многіх

адносінах старажытнае формаўжыванне, прычым кожны з гэтых дзеясловаў меў свае асаблівасці. Таму іх мэтазгодна разгледзець асобна.

Дзеяслоў *быти* ў цяперашнім часе абодвух лікаў меў формы *есмъ/есми — еси/есь — естъ — есмо — есте — суть*. У такім выглядзе гэты дзеяслоў ужываецца як звязка ў складаных дзеяслоўных формах і ў складзе іменнага выказніка. Старажытная форма 1-й асобы адзіночнага ліку *есмь* у выніку фанетычных працэсаў змянілася ў *есмъ:* Врѣтище пошилъ есм^{s} на кож8 мою (КІ, 22); азъ есмъ споилсѧ с тобою (ІС, 59); Черна есмъ но лѣпа (ПП, 36); Едали азъ не лепший есмъ тобѣ (ПЦ, 5б); Азъ есмъ рабъ твой (ДЦ, 81б); Азъ же еще есмъ младенецъ малъ (ТЦ, 128); человекъ божий есмъ (ЧЦ, 185); Азъ есмъ первороженый сынъ твой (КБ, 49).

Разам з тым у такім жа ўжыванні выкарыстоўваецца і новы варыянт *есми,* які ў беларускіх граматах фіксуецца ўжо ў канцы XIV ст., а пазней стаў адзінай формай ва ўсіх жанрах старабеларускай пісьменнасці. Усе перакладныя тэксты Скарыны даюць вельмі многа прыкладаў такога ўжывання: Слыхалъ есми часто кратъ таковые речи (КІ, 21б); Пребегъ есми вси речи раз8момъ моимъ (ЕК, 12); сѣ азъ есми жена таѧ (ПЦ, 7); днесь пришолъ есми на стретение тобѣ (ДЦ, 104б); далъ есми тобѣ серце мудро (ТЦ, 128); Сребро то закопалъ есми в землю (ІН, 16); виделъ есми сон (ДП, 6б).

Вельмі часта ў выданнях Скарыны абодва варыянты ўжываюцца побач у адным і тым жа сказе: Елъ есми сотъ с медомъ моимъ, и пилъ есмъ вино мое съ млѣком^{s} моим^{s} (ПП, 7); Днесь 8 восмидесѧти и в пѧти летехъ есми, и так^{s} еще есмъ дужъ (ІН, 29б); пришолъ есми во градъ Гаваонъ с женою своею, и тамъ есмъ хотелъ ѡтпочинути (КС, 42б); Выбралъ есми з васъ мужей м8дрыхъ и разумныхъ и поставилъ есмъ з нихъ кнѧзей воеводъ (ДЗ, 6). У цэлым жа варыянт *есми* практычна пераважае па частаце ўжывання, напрыклад у ЕК ужыта 60 разоў форма *есми* і толькі 14 — *есмъ*.

У 2-й асобе адзіночнага ліку таксама ўжываюцца два варыянты звязкі дапаможнага дзеяслова быти — *еси* і *есь*. Першы з іх, старажытны па паходжанню, збліжае мову Скарыны як з царкоўнаславянскай мовай, так і з формаўжываннем беларускай пісьменнасці яго часоў: Почто еси пришолъ и чем8 не паслъ еси дома овець (ПЦ, 36б); вознеслъ мѧ еси даже и доселе (ДЦ, 79); прах^{s} еси и в прахъ обратишисѧ (КБ, 13); множеством^{s} славы твоеѧ стеръ еси супротивных^{s} наших (КВ, 29б).

Варыянт *есь* (арфаграфічна зрэдку і *есъ*) ужываецца амаль у такой жа колькасці, што і *еси:* Ты взѧтъ есь вихромъ огнѧным^{s} (ІС, 76б); Се ты красенъ есь любый мой (ПП, 4); сѣ ты сам^{s} Са8лъ есь (ПЦ, 59б); почто чинишсѧ иною, нежели есь (ТЦ, 160); прочто разгневалсѧ есь (КБ, 13б); своими 8сты молвилъ есь (ДЗ, 45).

Як і варыянты 1-й асобы *есмъ* і *есми,* формы *еси* і *есь* часта ўжываюцца ў адным і тым жа кантэксце: понеже есь и́ видѧл^{s}, почто не пробол^{s} еси его мечем^{s} (ДЦ, 105); Кому еси ганил^{s} и кому сѧ есь ругал^{s} и на кого воздвиг^{s} гласъ твой, и вознесъ есь очи твое (ЧЦ, 227); людие твой их^{s} же вывел^{s} еси из^{s} египта скоро пошли суть с путѧ еже показал^{s} есь имъ (ДЗ, 22б).

Скарочаны варыянт звязкі *есь* Скарына вельмі шырока выкарыстоўваў у віленскіх царкоўнаславянскіх кнігах: смирилъ есь насъ (ВП, 39б); наставилъ мѧ есь (ВП, 52); во плоти ꙗвилсѧ есь (АІ, 7); ты ȣбо есь знамение (АК, 1б); ты есь сынъ мой возлюбленный (АП, 2); ты ȣбо есь болей пророка (АП, 9); ты ȣбо есь наставникъ спасению (АС, 3); верных^{s} навчилъ есь воспѣвати тобѣ (АН, 3б); дал^{s} ми есь познати тебе (КГ, 8); принѧлъ есь ѡт бога власть (КП, 7); ꙗвилсѧ есь ȣченикомъ своимъ (ПГ, 8); распѧтие принѧлъ есь (ШК, 2); имелъ есь образъ разума (ПА, 8б).

Заслугоўвае ўвагі таксама факт, што звязка *еси* пражскага выдання «Псалтыра» ў віленскім «Псалтыры» часта перадаецца як *есь:* у пражскім: благоизволил^{s} еси в нихъ (40) — у віленскім: благоизволил^{s} есь в нихъ (39); ты стѣрлъ еси главы змием^{s} (65б) — ты стерлъ есь главы змиемъ (64б); ѡтвратилъ еси помощ^{s} (80б) — ѡтвратил^{s} есь помощ^{s} (79б). Такое ўжыванне звязкі належыць да самых яркіх рыс, якімі пражскія перакладныя выданні Скарыны аб'ядноўваюцца з віленскімі неперакладнымі.

У 3-й асобе адзіночнага ліку звязка ўжываецца толькі ў форме *естъ:* лепей мнѣ естъ оупасти в руце господни (ДЦ, 116б); Солнъце возышло естъ надъ землю (КБ, 34б); Душа наша высхла есть (ЛК, 27); Каинъ теже позналъ естъ грехъ свой (ДЗ, 2).

Для 1-й асобы множнага ліку ўжываюцца формы *есмо* і *есмы* пры яўнай перавазе першага варыянта: мы живи есмо в животѣ толико (ІС, 76б); по плоти есмо сыновѣ Адамови (ПП, 2б); животъ ихъ имели есмо за дуровъство, и конецъ ихъ мнели есмо быти безо чти (ПБ, 8); мы есмо первороженный (ДЦ, 106); раби твои есмо все (ЧЦ, 205б); Ныне же в рукахъ твоихъ есмо (ІН, 20б); сѣ мы кость твоѧ и тело твое есмы (ДЦ, 74); сѣ есмы вси раби господина нашего (КБ, 82); Ныне же есмы в кадысе граде (ЛК, 44б).

У 2-й і 3-й асобах множнага ліку захоўваюцца старажытныя формы звязак *есте* і *суть:* вы есте кость моѧ и тело мое есте (ДЦ, 103б); вы гледели есте на тое очима вашима (ДЗ, 14); слова мой болѣсти полны сут^{s} (КІ, 10б); Іȣдей живущий во граде плакали суть (КЕ, 8б).

Формы цяперашняга часу нетэматычнага дзеяслова *быти* ў спалучэнні з адмоўем *не* па царкоўнаславянскаму ўзору зліваюцца ў адну словаформу: несмъ низъший з васъ (КІ, 18); несмъ лепший нежели ѡтцеве мой (ТЦ, 172); видьте иже несмъ самъ собѣ трудилсѧ (ІС, 40б). Гэта з'ява асабліва характэрна для 3-й асобы адзіночнага ліку, яна надае тэкстам Скарыны прыкмет-

ную царкоўнаславянскую афарбоўку: несть казни божией над нами (КІ, 27); несть гнев8 горшего над^{s} гневъ женский (ІС, 41б); несть злости в рукахъ мои^{х} (ПЦ, 51б); богъ веренъ и несть неправды в немъ (ДЗ, 61); несть студу 8повающимъ на тѧ (ДП, 12). Такія словаформы Скарына ўжывае і ў сваіх прадмовах, чым гэтыя часткі яго кніг збліжаюцца з асноўным біблейскім тэкстам: их^{s} же для краткости несть потрѣба ту мѣновати (ІС, 3); несть лепшего толико ѣсти и пити и чинити добро души своей (КВ, 2).

Дзеяслоў *вѣдѣти* ў нетэматычным спражэнні цяперашняга часу ў аснове таксама захоўвае старажытныя формы, адрозненне толькі ў форме 1-й асобы адзіночнага ліку, дзе ў выніку зацвярдзення канцавога *-мь* узнікла форма *вемъ*, а ў 1-й асобе множнага ліку *вѣмъ* ператварылася ў *вемы*. Такім чынам, парадыгма гэтага дзеяслова ў цяперашнім часе мае наступны выгляд: *вемъ — веси — весть — вемы — весте — ведѧть:* по правдѣ вемъ иже тако е$с$т (КІ, 13б); не вемъ дня смерти моеѧ (КБ, 48б); не вемъ о васъ (ДЗ, 64); сѣ ты веси елика 8чинил^{s} е$с$т Са8лъ (ПЦ, 59); Ты воистинну веси раба твоего (ДЦ, 79); ты веси ѧко послужи^{х} тобѣ (КБ, 55); кто не вѣсть тыхъ речей (КІ, 17); догадыватиса будеть о томъ чего же не весть (ПС, 35); кто сее весть (КЕ, 9б); вемы ѧко 8 тебе есмо сочтени (ПБ, 23); вемы что еси велел^{s} ему 8чинити (КЮ, 18); Вѣмы 8бо иже добръ е$с$т законъ (ДЗ, 2); Не весте ли того (ДЦ, 69б); едали не весте иже несть мне ровнаго во вмении гадания (КБ, 82); Вы бо добрѣ вестѣ ѧко жили есмо в земли Египетской (ДЗ, 56); не ведѧт^{s} сами гдѣ претыкаютса (ПС, 10б); Ведѧть 8бо вси люди Ізраилевы (ДЦ, 98б); не ведѧть того иже ты еси богъ нашъ (КЮ, 15б).

Нетэматычная парадыгма гэтага дзеяслова захоўваецца і ў вытворных формах у асноўным са значэннем будучага часу і з дадатковымі семантычнымі адценнямі тыпу *сповемъ, увемъ, повеси, увеси, исповесть, повесть, увесть, повемы, сповемы* і г. д.: сповемъ правду пред^{s} лицемъ твоимъ (КЮ, 7б); сличи всехъ да оувемъ число колико естъ ихъ (ДЦ, 115б); повѣси вси речи еже сѧ стали (ДЦ, 85); нынѣ 8веси что ѧ 8чиню (ПЦ, 58б); не оувѣсть сего душа моѧ (КІ, 14); повемы на тѧ свѣдецьство (ДП, 35б).

Дзеяслоў *вѣдѣти,* захаваўшы асаблівасці нетэматычнага спражэння ў цяперашнім часе, адлюстроўвае змяненне яго ў іншых формах, асабліва ў загадным ладзе. Старажытныя формы на *-ждь* або *-жь* у тэкстах Скарыны адзначаны адзінкавымі прыкладамі: сповѣждь ми чем8 мѧ такъ с8дишь (КІ, 15); сповѣжъ ѧковую мзд8 ѡт мене взѧти хощеши (КБ, 53); заповежъ Ааронови и сыномъ его (КЛ, 13б). Аднак большасць фактычнага матэрыялу адлюстроўвае выраўноўванне асновы, і гэта зноў-такі відаць на формах загаднага ладу, дзе замест *-ждь/-жь* пачалі ужываць *д:* поведь мнѣ имаши ли разумъ (КІ, 45); повѣдь ми что видиши (ПЦ, 59); поведи ми что имаши в доме твоем^{s} (ЧЦ, 190); повѣдь намъ загадку (КС, 32); иди и поведь сыномъ Ізраилевымъ

(КВ, 13); поведь сонъ рабомъ твоимъ (ДП, 7); ведь же иже будеть сѳдъ (КІ, 25б); повѣдте ми что естѣ видели (КБ, 73); поведите ми что сѳть за люди сие (КЮ, 7).

У эпоху Скарыны ў беларускай мове дзеяслоў *вѣдѣти* фактычна быў заменены формай *ведати,* і гэта таксама адлюстроўваюць скарынінскія тэксты: не ведаю можетъ ли сѧ стати сее (ЧЦ, 198); не ведаю кто ѳчинилъ ест дело сее (КБ, 37б); ведаете ли вы где поле Іоавово (ДЦ, 93); Вѣдають бо они тое добрѣ (ЧЦ, 199).

Нарэшце, трэба адзначыць, што побач з дзеясловам *вѣдѣти/ведати* ў Скарыны ўжываецца і сінонім *знати.* Нярэдка абодва гэтыя дзеясловы выкарыстоўваюцца ў адных і тых жа кантэкстных умовах: знаете мужа, и что глаголалъ естъ по тому же вестѣ (ЧЦ, 203); Онъ же рече ѡтцу своему и матери своей не знаю васъ. И братии своей не вемъ о васъ (ДЗ, 64); Ты самъ веси всѧки таины, и знаеши иже в ненависти имамъ славу людей грешныхъ (КЕ, 22б).

Такім чынам, на прыкладзе ўжывання дзеяслова *вѣдѣти* наглядна відаць суіснаванне ў мове Скарыны форм рознага паходжання: архаічных, царкоўнаславянскіх і новых, уласна беларускіх.

У значна меншай меры тэксты Скарыны адлюстроўваюць старажытнае нетэматычнае спражэнне дзеяслова *дати.* Члены ранейшай парадыгмы *дамь — даси — дасть — дамъ — дасте — дадѧть* ужо поўнасцю не вытрымліваюцца: форма 1-й асобы множнага ліку *дамъ* замянілася формай *дадимъ,* а ў 3-й асобе множнага ліку замест *дадѧть* пачала ўжывацца форма *дадуть.* Усе гэтыя формы ў Скарыны ўжываюцца ў значэнні будучага часу, што ўласціва і сучаснай беларускай мове: проси ѡт мене чего же хощеши, и дамъ тобѣ (ТЦ, 127б); дамъ вамъ в достоание землю текущую млекомъ и медомъ (КЛ, 39б); Жены твое и сыны твоѧ даси мнѣ (ТЦ, 174); Не даси брату своему сребра в ростъ (ДЗ, 45); ветие еѧ не дасть плоду (ІС, 38); животы наше выдадимъ за тѧ на смерть (КВ, 7б).

У значэнні цяперашняга часу ў беларускай мове пачалі ўжывацца асабовыя формы тэматычнага дзеяслова *давати,* і гэта таксама адлюстроўваецца тэкстамі Скарыны: сѣ тобѣ даю днесь все имение (ДЦ, 96б); ѡтповѣди даю правые людемъ (там жа, 107б); кто еси ты иже вопиши и не даешъ царю спати (ПЦ, 57б); ты даеши отомщение мнѣ (ДЦ, 112); богъ вашъ даеть вамъ землю сию в достоание (ДЗ, 11); да дають намъ кашу крупѧну ести (ДП, 6); плевъ не дають намъ (КВ, 12).

Разбурэнне ранейшай парадыгмы нетэматычнага спражэння дзеяслова *дати* асабліва выразна выяўляецца ў формах загаднага ладу. Ранейшыя формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку *даждь/дажь* і *дадите* ў Скарыны не ўжываюцца зусім, тут выступаюць толькі новыя ўтварэнні *дай* і *дайте:* дай часть юже дахъ тобѣ (ПЦ, 20); дай помощъ и высвободи нас (ІН, 21б);

дай ми силу (КЮ, 16); дай намъ хлеба (КБ, 87б); дай намъ воду да пиемъ (КВ, 33); даймо емѵ пити вина (КБ, 35); Приедьте ко мне и дайте ми помощъ (ІН, 21).

Скарынінскія навацыі ў гэтых адносінах асабліва выразна выяўляюцца пры параўнанні з формаўжываннем у «Астрожскай бібліі»: дай ми сыны. Аще ли ни то ѵмру (КБ, 54) — даждь ми чада, аще ли ни то оумрѵ азъ; продай олеи и заплати долгъ твой (ЧЦ, 190б) — продаждь сіи іелеи и заплати лишевникомъ своимъ; дайте ю емѵ за жену (КБ, 63) — дадите оубо ю въ женѵ емѵ.

Вельмі стракаты малюнак маюць у Скарыны асабовыя формы нетэматычнага дзеяслова *ѣсти*. Тлумачыцца гэта ў першую чаргу варыянтнасцю зыходнай інфінітыўнай формы, якая ўжываецца ў варыянтах *ести* і *ꙗсти*. Першы, беларускі па паходжанню, варыянт у колькасных адносінах амаль у 3 разы перавышае другі, царкоўнаславянскі: сей ести будеть ѡт овощу еѧ (ПС, 41б); ѵделай ему ести (ДЦ, 88б); далъ ести осломъ ихъ (КБ, 80б); бѵдете ести хлебъ пресный (КВ, 23б); не будете ести николи же ни крови ани лою (КЛ, 9б); Не будете мощи ести во градех вашихъ (ДЗ, 28).

З зыходнай формай *ести* звязана ўжыванне ў тэкстах Скарыны асабовых форм *есть, емы, есте, ѣдѧть, ѣлъ, ѣла, ѣли* і дзеепрыслоўяў *ѣдъ* і *ѣдши*. З парадыгмы цяперашняга часу такія формы можна праілюстраваць наступнымі прыкладамі: Всѧкъ чѵжземець да не есть ѡт него (КВ, 25); покармы продай намъ за цену да емы (ДЗ, 9б); Серну тако ести будете толико крови ихъ да не есте (там жа, 28); суть ли чисты слузи твои наболеи ѡт женъ, да ѣдѧтˢ и́ (ПЦ, 46). Ад дзеяслова *ести* пераважна беларускія формы ўжываюцца ў сістэме загаднага ладу 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку: Сынѵ ежь медъ понѣже естъ добрый (ПС, 37); иди а ежъ во вѣселии хлебъ свои (ЕК, 14б); ежъ хлѣбъ и бѵди веселъ (ТЦ, 177б); пий нынѣ и ежъ с веселиемъ (КЮ, 20); прииди семо и ежь хлебъ (КР, 4б); Пойдите ежьте хлебъ мой (ПС, 16); толико мѧса съ кровию не ежьте (КБ, 20); варите мѧсо предъ дверми храмовыми и тамо ежте е́ (КЛ, 18).

Зыходная царкоўнаславянская інфінітыўная форма *ꙗсти* ў выданнях Скарыны ўжываецца зусім рэдка. Напрыклад, у КБ, КВ і ДЗ яна адзначана толькі 9 разоў, тады як форма *ести* — 67 разоў. Затое ў асабовых формах цяперашняга і прошлага часу яўна пераважаюць царкоўнаславянскія ўтварэнні тыпу *ꙗси, ꙗсть, ꙗсте, ꙗдѧть, ꙗдохъ, ꙗде, ꙗдахомъ, ꙗдосте, ꙗдоша, ꙗдѧше, ꙗдꙗху:* чему плачешь и прочто не ꙗси (ПЦ, 5б); прочто не ꙗси хлѣба (ТЦ, 177); Справедливый ꙗсть и насытить душу свою (ПС, 22); позовите его да ꙗсть хлеба с нами (КВ, 7б); да прииметь и ꙗсть единый каждый мужъ вино свое (ЧЦ, 225); Да не ꙗсте квашенаго хлеба (КВ, 26); Да не ꙗсте мѧса со кровию (КЛ, 37б); ꙗдѧть хлебъ немилостивости (ПС, 10); дай хлебы ты людемˢ да ꙗдѧть (ЧЦ, 192б).

Як і ў многіх іншых выпадках, Скарына свабодна выкарыстоўвае розныя па паходжанню формы ў адных і тых жа кантэкстных умовах і нават у адным і тым жа сказе: не имѣть ести людие дондеже приидеть онъ. Понѣже онъ напервеи благославить жертвы, и потомъ ѫсти будуть (ПЦ, 19); что ростеть во винограде хъ да не ѫсть, вина и питиѧ пианого да не пиеть и что *ест* нечисто да не есть (КС, 30б); Лѣта пакъ седмаго оставиши ю̀ да ѿпочинеть. Да едѧть нищиѝ людеѝ твоихъ. И еже останетсѧ да ѫдутˢ звери польныѝ (КВ, 42б).

Па традыцыі да нетэматычных адносяцца і асабовыя формы цяперашняга часу дзеяслова *имати,* хоць гэта і аспрэчваецца некаторымі даследчыкамі. Скарынінскі матэрыял усё ж дае падставу аднесці гэты дзеяслоў да нетэматычных. Яго парадыгма ў большасці ўжыванняў мае наступны выгляд: *имамъ — имаши/имашъ — имать — имамы — имате — имуть.* Гэтыя формы ў асноўным уваходзяць у структуру складанага будучага часу і разам з тым ужываюцца ў сказах з самастойным лексічным значэннем. Зафіксаваны яны вялікай колькасцю прыкладаў ва ўсіх асобах абодвух лікаў: Колико имамъ неправды и грѣховъ (КІ, 18б); не имамъ хлебовъ простыхˢ (ПЦ, 46); не имамъ сына ни единаго (ДЦ, 101б); имамˢ нечто молвити к тобѣ (ТЦ, 125); тобѣ имамъ дати ю̀ (КБ, 26); поведь мнѣ имаши ли разумъ (КІ, 45); Имаши ли скотъ осмотри жъ его (ІС, 14б); имаши ли ту ѧкое оружие (ПЦ, 46); имаши ли коихъ се зде ѕ себе зѧтей (КБ, 34); имаши к тому понѧти Руѳъ (КР, 7); всѧ елика имать Иовъ предаю в руце твое (КІ, 5); онъ имать надежду в тобѣ (ПС, 9); кто седети имать по смерти твоеи на престолѣ твоемъ (ТЦ, 122); тоѝ гость имать жену (КС, 41б); кто з васъ имать злато (КВ, 61б); его же животъ захованъ имать быти (ДЗ, 38); Имамы искати мѕдрости болѣе нежели злата (ПС, 6б); кошика со овощемъ не имамы (ПЦ, 18б); мы сами имамы сено и плевы (КС, 41б); не имамы сребра ани скоту (КБ, 87б); землю имате нечисту достоанияѧ вашего (ІН, 42б); иного брата имате (КБ, 79); Сие пакъ сутˢ речи еже приносити имате (ЛК, 59); вы же имате имъ помощни быти (КЕ, 25); ѕделѧеть мудрость и славу тыхъ они же имѕть ю̀ (ІС, 6); не имѕть ести людие (ПЦ, 19); сѣ вчинихъ да верѕ имѕть (КВ, 9б).

Гэты дзеяслоў у параўнанні з іншымі найбольш паслядоўна захоўвае старажытную сістэму форм. Але і тут нетэматычныя формы дапаўняюцца асабовымі формамі дзеяслова *имѣти,* ад яго да асновы дзеяслова *имати* дадаецца асабовы канчатак, у выніку чаго ўзніклі кантамінаваныя формы *имаю — имаеши — имаеть — имаемы — имаете — имаютъ:* имаю волы и ослы (КВ, 59б); покажѕ тобе что чинити имаеши (ПЦ, 33б); празникъ славныѝ имаеть быти во граде моемˢ (ПЦ, 44б); имаемы ли то ѕчинити чили ни (ДЦ, 98); Вемъ ѕбо ѧко много имаете скоту (ДЗ, 11б); кому имаютъ быти сии речи (ДЦ, 96).

Адзначана таксама некалькі выпадкаў ужывання новых асабовых форм дзеяслова *имѣти* без пачатковага *и,* што атрымала

далейшае развіццё ў пазнейшай гісторыі беларускай мовы: Отець маеть имети под^{с} казнию сына своего всегда (ІС, 48б); ѩко сѧ ко слугамъ маемъ имети (там жа, 53); Ничто же иное приимуть толико мають имети досыть на десѧтинахъ (ЛК, 41б).

Да нетэматычных дзеясловаў па ўтварэнню форм загаднага ладу прымыкае і дзеяслоў *видѣти*. Ад яго ў выданнях Скарыны адзначана некалькі форм загаднага ладу па ўзору нетэматычных дзеясловаў: Поглѣди на небо и позри и виждь воздухъ (КІ, 42); воздвигни очию своихъ и вижь (КБ, 57); шедъ и вижъ здрави ли сѣть братиѧ (там жа, 68б). У такіх выпадках таксама трэба бачыць даніну старажытнаму формаўжыванню. Але асноўнай нормай загаднага ладу для гэтага дзеяслова з'яўляецца форма *видь/видьте,* вядомая беларускай мове з канца XV ст.: слышачи слова сиѧ ѩкобы во сне видь и чюй (ІС, 23); видь оно многые людие з горъ идуть (КС, 23); возри и видь студъ лица нашего (ПЕ, 11); стойте и видте речь великую (ПЦ, 24б); Видьте жъ ѩко азъ есмъ единъ (ДЗ, 62б); видьте болесть мою (ПЕ, 5).

ФОРМЫ ПАРНАГА ЛІКУ

У перакладных выданнях Скарыны дзеяслоўныя формы парнага ліку яшчэ адлюстроўваюцца як перажытак ранейшых лікавых адносін. Але тут назіраюцца і шматлікія адхіленні ў бок замены іх формамі множнага ліку. Тут перш за ўсё варта адзначыць іх фактычную адсутнасць у цяперашнім і будучым простым часе, дзе выступаюць звычайна формы множнага ліку. Гэта наглядна відаць з параўнання адпаведных месц з «Астрожскай бібліі»: се пойдемо и что принесемъ къ мѫжѫ божию (ПЦ, 18) — се поидевѣ и что внесевѣ къ чл҃кѹ бж҃ію; вшедши во градъ скоро знайдете его (там жа, 19) — ѩко внидета во градъ, тако и обрѧщета и́; с тобою поидемы к людемъ твоимъ (КР, 2б) — но идева с тобою в люди твоѧ.

Больш рэгулярна формы парнага ліку выкарыстоўваюцца ў сістэме аорыста, хоць і тут назіраюцца асобныя адхіленні, асабліва ў 1-й асобе. Маюць месца выпадкі, калі формы парнага ліку ўжываюцца ў кантэкстах, дзе павінна быць форма множнага ліку, што відаць з параўнання з «Астрожскай бібліяй»: Ходихове до земли до неа же посыласте насъ (ЛК, 31б) — ходихом на землю, на ню же ны посыласте; Ходили есмо въ полки Сиръский, и ни една мужа знайдоховѣ тамо (ЧЦ, 198б) — внидохомъ в полкъ сѵрійскіи и се не бысть тѫ мѫжа ни гласа чл҃ча. У апошнім прыкладзе форма *знайдоховѣ* адносіцца да *чатырох персанажаў,* якія паведамілі аб сваім наведванні лагера сірыйцаў.

Адносна часта выкарыстоўваюцца формы аорыста парнага ліку 3-й асобы: Изыйдоста оба вкупе Саѫлъ и Самѫилъ (ПЦ, 20); бѣста тогда два властелина надъ разбойниками (ДЦ, 73); Мѫжа два беста въ единомъ^{с} граде (там жа, 86); херувимовѣ ростѧгоста криле свои надъ кивотомъ (ТЦ, 142); Они же оба стоѧста надъ

Іорданомѕ (ЧЦ, 186б); беста оба нага Адамѕ и жена его и не стыдестасѧ (КБ, 12); видеста оба сонъ нощи единое (там жа, 73); не потемнеста очи его и не погнушесѧ зубы его (ДЗ, 65б); ѵмроста оба Маалонъ и Хелионъ (КР, 2б).

Трапляюцца таксама выпадкі, калі ў адным і тым жа сказе адзін дзеяслоў мае форму парнага ліку, а другі — множнага: Сего длѧ идита ѩко днесь знайдете его (ПЦ, 19); И тако идоста вкупе и пришли на место (КБ, 39); идоста Моисей а Ісусъ и сташа во храме сведенiѧ (ДЗ, 59).

У выданнях Скарыны часта ўжываюцца звычайныя формы множнага ліку там, дзе па ўмовах кантэксту павінны быць формы парнага ліку: И везли суть его две краве (ПЦ, 14); Тогда идоша обадва посполу (ЧЦ, 186б); Роптали на него Ааронѕ и Мариѧ (ЛК, 29); рече има идите вы и навратитесѧ в домѕ матерей ваших (КР, 2б). Такія адхіленні ва ўжыванні заканамерных форм парнага ліку наглядна відаць пры параўнанні з адпаведнымі месцамі «Астрожскай бібліі», хоць і ў гэтым помніку формы парнага ліку часам таксама замяняюцца множным лікам: Прото жъ нынѣ подѕмо к немѵ (ПЦ, 18б) — нн҃ѣ оубо идевѣ тамо; сѣ мы идемы к мужемъ симѕ (там жа, 27б) — се мы преидевѣ к мѵжемъ; оба клѧшесѧ тѵ оу кладезѧ того (КБ, 38) — тѵ клѧстасѧ оба; Состарелсѧ же ест Ісаакъ и затмѣшесѧ очи его (там жа, 48б) — Бысть же ѩко състарѣсѧ исаакъ, и ослѣпоста очи емѵ; пойдемы к людемѕ твоимъ (КР, 2б) — идева с тобою в люди твоѧ.

На ўжыванне ў выданнях Скарыны дзеяслоўных форм парнага ліку аказала ўплыў, відаць, і чэшская Біблія, дзе такія формы яшчэ часткова захоўваліся: byla dwa muže w gednom miestie — Мужа два беста въ единомѕ граде (ДЦ, 86); ona obadwa stala gsta nad Iordanem — Они же оба стоѧста надъ Іорданомѕ (ЧЦ, 186б).

У пісьменнасці на беларускай мове часоў Скарыны формы парнага ліку ў галіне дзеяслова ўжо не ўжываліся, замест іх паслядоўна выкарыстоўваліся формы множнага ліку. У гэтым заключаецца асноўнае адрозненне сістэмы дзеяслова ад іншых зменных часцін мовы, у прыватнасці ад назоўніка, дзе парны лік у пісьменнасці выкарыстоўваўся значна пазней, а рэшткі яго захоўваюцца ў беларускіх гаворках да нашага часу.

ЛЕКСІКА

Лексіка пражскіх выданняў Ф. Скарыны па свайму складу не з'яўляецца аднароднай. Яна ўключае розныя па часу і месцу ўзнікнення, па шляхах пранікнення і па спосабах утварэння словы, якія ахопліваюць самыя разнастайныя назвы рэалій, з'яў і паняццяў акаляючай рэчаіснасці. У ёй, як у люстэрку, адбілася ступень развіцця тагачаснага ўсходнеславянскага насельніцтва, кола яго духоўных інтарэсаў, яго звычаі, побыт і ўзровень матэрыяльнай культуры.

Спецыфіка творчай дзейнасці беларускага асветніка і першадрукара ў параўнанні з іншымі беларускімі культурнымі дзеячамі старажытнага перыяду праявілася перш за ўсё ў тым, што яму давялося рабіць пераклады біблейскіх кніг, адчуваючы моцнае ўздзеянне з боку роднай, царкоўнаславянскай і чэшскай моўных стыхій. Таму зусім натуральна, што лексічны склад скарынінскіх выданняў у многім вызначаецца арыгінальнасцю і непаўторнасцю на фоне старабеларускай і наогул усходнеславянскай пісьменнасці таго часу, як рукапіснай, так і друкаванай, і што менавіта спрадвечна беларуская, царкоўнаславянская і запазычаная лексіка фарміруюць генетычную аснову яго слоўніка.

Характарызуючы спрадвечна беларускую лексіку як адну з асноўных састаўных частак слоўнікавага складу мовы Скарыны з пункту погляду яе паходжання, трэба мець на ўвазе тую акалічнасць, што гэтая лексіка ў большасці выпадкаў працягвала традыцыі старажытнарускай мовы, якая да XIV ст. з'яўлялася агульным сродкам зносін усходніх славян і паслужыла зыходнай крыніцай для рускай, беларускай і ўкраінскай моў. Паколькі цэнтральнае ядро ў старажытнарускай лексічнай сістэме ўтваралі словы, што збярэгліся ад перыяду праславянскай этнічнай агульнасці, многія з іх перайшлі і ў старабеларускую мову, а праз яе сталі неад'емнай прыналежнасцю скарынінскага слоўніка.

Сярод слоў праславянскага паходжання, якія асабліва шырока выкарыстаў беларускі першадрукар пры перакладзе міфаў аб стварэнні свету, шматлікіх бытавых і батальных сцэн з жыцця старажытных народаў, самы буйны і семантычна разна-

стайны разрад утвараюць назоўнікі. У пераважнай ступені яны звязаны тэматычна з характарыстыкай навакольнай рэчаіснасці. Значная частка праславянскіх назоўнікаў служыць, напрыклад, для абазначэння рэалій зямной паверхні *(бродъ, вода, волна, гора, грязь, долина, камень, купина, лесъ, лука, межа, море, озеро, островъ, поле, потокъ, река, ровъ, ручей, ставъ, суша, холмъ, яма)*, праяў надвор'я і розных атмасферных з'яў і працэсаў *(буря, ведро* 'вёдра', *ветръ, вихрь, градъ, громъ, дождь, дымъ, зной, иней, ледъ, мгла, молния, пара, роса, снегъ, тма, туча)*, пор года, пэўных адрэзкаў часу *(векъ, весна, вечеръ, година, годъ, день, зима, лето, неделя, ночь, утро)*, агульных паняццяў светабудовы, перспектывы і напрамкаў *(верхъ, глубина, долъ, западъ, звезда, зоря, лучь, небо, низъ, светъ* 'сусвет', *северъ, солнце)*. Прыкметную тэматычную групу ўяўляюць сабой назвы раслін, іх частак і пладоў: *бобъ, груша, дубъ, дыня, жито, кора, корень, ленъ, листъ, орехъ, осотъ, пелынъ, пшеница, слива, стебло, сукъ, тернъ, трава, чеснокъ, яблоко, яблонь, ягода, ячмень*. У яшчэ большай колькасці выступаюць назвы свойскай і дзікай жывёлы: *баранъ, быкъ, волкъ, волъ, голубъ, горностай, дятелъ, жаба, заецъ, зубръ, коза, конь, куръ, ланя, лебедь, лось, медведь, моль, муха, мышь, овца, олень, орелъ, оселъ, песъ, пчела, свинья, сова, соколъ, тхоръ, ужъ, шершень, ястребъ*. У асобную групу аб'ядноўваюцца назвы органаў і частак цела чалавека і жывёл: *бедро, бровь, веко, вымя, голень, горло, гортань, губа, дясна, жила, зубъ, колено, копыто, лобъ, локоть, мозгъ, мышца, нога, ноздря, носъ, око, палецъ, плече, пупъ, пята, ребро, рогъ, ротъ, рука, сердце, стопа, темя, ухо, хвостъ, челюсть, чешуя, шия* і інш.

Параўнальна вялікая колькасць праславянскіх назоўнікаў, зафіксаваных у тэкстах скарынінскіх выданняў, характарызуе розныя бакі чалавечай дзейнасці і сацыяльных узаемаадносін. Тут, у праватнасці, прыкметнае месца займаюць назвы асоб у залежнасці ад полу і ўзросту, ступені сваяцтва, працоўнага занятку: *братъ, вдова, внукъ, господаръ, дедъ, дитя, жена, женихъ, зять, мати, мачеха, мужъ, невеста, отецъ, сватъ, свекоръ, свекровь, сестра, сирота, сынъ, тесть, теща*. Даволі шырока ўжываецца лексіка, звязаная з бытавой і гаспадарчай сферамі, напрыклад назвы мэблі і пасуды, адзення і абутку, прадметаў бытавога ўжытку *(бочка, бритва, ведро, вертено, жерновъ, замокъ, игла, ключъ, корито, котелъ, кошъ, мехъ, миса, мыло, ножь, обувь, поясъ, ремень, решето, свеча, столъ, ступа, судъ* 'пасудзіна', *чаша)*, прылад і прадуктаў працы, транспартных сродкаў і збруі *(возъ, гвоздь, дрова, дуга, клещи, коло, коса, лемешъ, лодья, ободъ, обручъ, ось, пила, плугъ, седло, секира, серпъ, сеть, снопъ, соха, стадо, стогъ, уда* 'вуда', *узда, шило)*, жылых і гаспадарчых пабудоў, іх частак *(верея, гумно, двери, домъ, доска, клеть, колъ, лествица, окно, печь, плотъ, стена, столбъ, стреха, токъ, уголъ, хлевъ, шатеръ, ясли)*, прадуктаў

харчавання, пітва *(вино, каша, квасъ, крупа, масло, медъ, мука, пирогъ, сыръ, тесто, хлебъ, юха)*, карысных выкапняў, металаў *(глина, железо, медь, мелъ, олово, руда, свинецъ, сера, соль, сребро, уголь)*, іншых рэалій і паняццяў з галіны матэрыяльнай культуры і быту *(воскъ, гнездо, гной, гробъ, дворъ, имя, искра, масть, мера, могила, обедъ, огонь, попелъ, рой, смерть, сотъ, тело, ядъ, язва)*.

Актыўная роля ў мове Скарыны належыць словам, якія характарызуюць эканамічную і гандлёвую сферы *(вено, гривна, дань, даръ, дедина, дедичъ, долгъ, доходъ, застава, истецъ, купецъ, купля, лихва, оброкъ, пенязь, товаръ, торгъ, цена)*, грамадскія адносіны *(вина, господинъ, гость, грабежъ, другъ, дружба, жалоба, законъ, князь, краина, край, миръ, народъ, обычай, пиръ, племя, посолъ, право, присяга, приязнь, приятель, родъ, сваръ, свобода, слуга, староста, судъ, судья, челядь)*, арганізацыю ваеннай справы *(битва, бой, вой* 'воін', *война, войско, доспехъ, дружина, копье, користь, лукъ, мечь, палица, полкъ, рана, рать, стрела, тулъ, хоругвь, щитъ)* і г. д.

Для асвятлення духоўнага жыцця Скарына прыцягваў многія праславянскія назоўнікі адцягненага значэння. Сярод іх на пярэдні план выступаюць у скарынінскіх тэкстах лексічныя сродкі, якія даюць уяўленне аб эмацыянальным стане чалавека *(боязнь, гневъ, горе, жаль, любовь, мука, обида, печаль, радость, скорбь, страсть, страхъ, студъ, тоска, трепетъ, ужасъ, хоть* 'жаданне'), выражаюць паняцці з галіны этыкі *(блудъ, зло, клятва, кривда, ласка, лесть, ложь, позоръ, правда, хула, честь)*, інтэлектуальнага жыцця *(басня, беседа, книга, мысль, память, писмо, повесть* 'апавяданне', *притча, слово, умъ)*, сведчаць аб светапоглядзе людзей *(бесъ, богъ, вера, господь, грехъ, духъ, душа, пекло, постъ, рай)*, з'яўляюцца назвамі іншых абстрактных паняццяў *(бегъ, беда, блескъ, воля, воня, диво, краса, крикъ, напасть, плачъ, покой, сила, смехъ, сонъ, хвала, часъ, шумъ)*.

Частка назоўнікаў праславянскага паходжання мае ў Скарыны па 2—4 значэнні. Да многазначных адносяцца, у прыватнасці, лексемы *бокъ* 'правая ці левая частка тулава': онъ же розгневався велми бияше и жезломъ по боку (ЛК, 49), 'старана прадмета': вытесание боковъ дощаныхъ на углехъ ся конало (КВ, 69), 'горны схіл': идеть подле боку горы Яримъ (ІН, 30б); *животъ* 'жыццё': вѣкъ старости есть животъ нескверныи (ПБ, 6б), 'частка цела ў чалавека і жывёл': вышли суть изъ живота матери ихъ (ІС, 64б); *земля* 'зямля як частка сусвету': роспрашить васъ господь богъ во всехъ народехъ, отъ зачала земли даже до конець ея (ДЗ, 54б), 'рэчыва, якое ўваходзіць у састаў нашай планеты': навратятся въ землю она же есть мати всехъ (ІС, 64б), 'поле, ніва, ралля': снесть землю и жита ея, и попалить основания горамъ (ДЗ, 62), 'краіна, уладанне': вы владети будете землею ихъ (ДЗ, 59); *месець* 'месяц, спадарожнік Зямлі': познали... солънце и месець (ПБ, 19), 'месяц, дванаццатая частка

года': плачеть отца своего и матери своея целыи месець (ДЗ, 41б); *полъ* 'пол (біялагічны)': учинили бы есте собе кумира или уподобление мужеска пола или женъска (ДЗ, 13), 'палавіна': широта ея локоть и полъ (КІ, 46); *речь* 'размова': оухо горъливое слышить вси речи (ПБ, 3), 'рэч, прадмет': подьмо и поживаимо добрыхъ речеи (ПБ, 4); *трудъ* 'праца': добрыхъ бо трудовъ прославленъ есть плодъ (ПБ, 6), 'пакута': видехъ трудъ ихъ иже теръпять отъ египътянъ (КІ, 8б), 'хвароба': проказа или трудъ на человецехъ... розознанъ имелъ быти (КЛ, 24); *языкъ* 'язык': медъ и млеко подъ языкомъ твоимъ (ПП, 6б), 'гаворка': по языку мудрость бываеть познана (ІС, 10б), 'мова': книга... зуполне выложена на рускыи языкъ (ПБ, 1), 'народ': погублю ихъ и заглажу имя ихъ подъ небесемъ и поставлю тя надъ инымъ языкомъ болшимъ и сильнеишимъ нежели сеи есть (ДЗ, 22б) і інш.

Другі па колькасці значных адзінак разрад праславянскіх слоў складаюць у скарынінскіх выданнях дзеясловы, шырокае выкарыстанне якіх дазволіла беларускаму першадрукару даць усебаковую характарыстыку разнастайных дзеянняў і працэсаў, звязаных з жыццём чалавека і прыродай. Найбольш істотная частка гэтых лексічных сродкаў з'яўляецца абазначэннем фізічных дзеянняў: *бити, варити, вешати, вязати, гасити, гладити, грызти, давити, доити, жати, класти, ковати, копати, красити, кусати, лепити, ловити, мазати, метати, молоти, молотити, орати, писати, резати, сеяти, стирати, стлати, стреляти, стричи, сыпати, тесати, толчц, топтати, точити, целовати, черпати, чистити, щупати* і інш. Даволі развітыя лексіка-семантычныя групы ўтвараюць таксама дзеясловы, якія абазначаюць рух і перамяшчэнне ў прасторы *(бегати, бежати, бечи, брести, везти, водити, возити, ездити, ехати, ити, лезти, летати, летети, нести, носити, падати, плавати, скакати, ступати, ходити)*, стан, дзеянне як працэс пераходу з аднаго стану ў другі *(болети, висети, гинути, гнити, горети, ждати, жити, кипети, лежати, рости, светити, седети, спати, стеречи, стояти, терпети, тлети, тонути, умирати, худети)*, адчуванні, эмацыянальныя праяўленні *(веселити, вздыхати, видети, гневати, гордети, грозити, жадати, завидети* 'зайздросціць', *любити, миловати, пети, плакати, ревновати, рыдати, слухати, страшити, тешити, трепетати, тужити, хотети)*, мысленне, маўленне *(беседовати, ведати, говорити, забыти, звати, знати, казати, кликати, кричати, мнети, молвити, молити, молчати, мыслити, помнити, просити, пытати, речи, шептати)*, іншыя дзеянні і працэсы *(блудити, быти, верити, воевати, гнати, гримети, губити, дати, держати, ести, звинети, играти, искати, кормити, мочи, мучити, служити, судити, чинити)* і г. д. У асноўным гэта невытворныя дзеясловы, не ўскладненыя словаўтваральнымі фармантамі, у чым і заключаецца іх адрозненне ад дзеяслоўных лексічных сродкаў, што ўзніклі пазней у асобных славянскіх мовах.

Разрад выкарыстанай Скарынам дзеяслоўнай лексікі праслa-

вянскага паходжання ў значнай ступен дапаўняецца зваротнымі дзеясловамі рознага семантычнага зместу, сярод якіх найбольшай ужывальнасцю вылучаюцца словы накшталт *битися, блюстися, боятися, веселитися, видетися, воеватися, гнатися, гневатися, годитися, даватися, делитися, деятися, дивитися, доведатися, достатися, зватися, кланятися, клятися, крытися, любитися, мнетися, молитися, остатися, плакатися, радоватися, родитися, статися, трястися, указатися, хвалитися, явитися* і інш.

Адзначаюцца ў кнігах Скарыны і мнагазначныя дзеясловы, напрыклад *брати* 'забіраць': Левгитин... часть покармовъ брати будет (ДЗ, 37), 'адбіраць': они же брали насилием работу ихъ (ПБ, 7б), 'змяшчаць у сабе': четырьдесять меръ брала вся Баня едина (ТЦ, 140б); *вести* 'накіроўваць чый-небудзь рух': въсадилъ его на конь и ведя подъ нимъ конь напередъ вопиялъ (КЕ, 12), 'выкарыстоўваючы спецыяльныя прыстасаванні, падаваць што-небудзь у пэўнае месца': воду вели трубами во градъ (ЧЦ, 224), 'быць шляхам куды-небудзь': приидохомъ во пустыню еже ведеть къ чермному морю (ДЗ, 8), 'хіліць на што-небудзь': вела убо ихъ к тому годная потреба (ПБ, 29), 'нагаварваць': онъ... сосрамотилъ и велъ на девицу имя злое (ДЗ, 43); *веяти* 'веяць': Гедеонъ веялъ жито на гумне (КС, 14), 'павяваць': онъ же повеле веяти отъ заходу солнъца велми прудкому ветру (КІ, 21); *вступити* 'ступіць': на поле сиротковъ не въступи (ПС, 35б), 'узняцца': въступлю на фуникъ и нащиплю отъ овощевъ его (ПП, 9б), 'прыйсці': въступилъ есть ангелъ божии отъ галгалъ на место где же плакали сынове ізраилевы (КС, 6б), 'заняць (трон)': Дарии медиискии въступилъ на царство (ДП, 20б); *ламати* 'ламаць': они же ламали и тесали камение на горе (ТЦ, 132б), 'заломваць': филистымляне... ламали собе руки вопиюще (ПЦ, 11б); *палити* 'паліць': он же палити будеть лои на требнице (КЛ, 16), 'награваць': солнце палить горы (ІС, 69); *пасти* 'упасці': кропъля росы предъ свитаниемъ... на землю падеть (КЕ, 9), 'загінуць': ни единыи мужъ не палъ отъ воиска его (КЮ, 17), 'выпасці': земля пакъ Галаадова пала есть во жребеи сыномъ манасиинымъ (ІН, 33б); *течи* 'цячы': река огънивая и быстрая течаше отъ лица его (ДП, 23б); 'рухацца, ісці': узрела людеи текущихъ до храму божия (ЧЦ, 209), 'спяшыць': течи поспешь побуди приятеля твоего (ПС, 12); *ткнути* 'ткнуць': якобы иглою тъкнулъ (КІ, 25б), 'закрануць': о томъ кратъце тъкнулъ есми во предословии своемъ (ДЗ, 2б) і інш.

Значную частку скарынінскага слоўніка складаюць праславянскія прыметнікі, якія абазначаюць колеры, масці, адценні *(белый, бледый, гнедый, голубый, зеленый, пестрый, румяный, рыжий, светлый, синий, темный, черный, ясный)*, фізічныя ўласцівасці і адчуванні людзей і жывёл *(босый, глухий, голодный, дужий, косматый, лысый, нагий, немый, слепый, хромый, худый)*, уласцівасці рэчаў *(гладкий, горкий, густый, кривый, мокрый, мяккий. острый, суровый, сухий, сырый, твердый, теплый, утлый)*.

Параўнальна многа ў Скарыны прыметнікаў праславянскага паходжання, якія характарызуюць памер, вагу, прасторавыя і часавыя прыметы *(больший, быстрый, великий, вечный, высокий, глубокий, давный, долгий, левый, легкий, малый, наглый* 'раптоўны', *позный, скорый, тесный, толстый, тонкий, тяжкий, узкий, частый, широкий)*, якасці характару і разумовых здольнасцей *(веселый, гордый, добрый, злый, кроткий, лакомый, ласкавый, ленивый, лживый, лихий, лукавый, лютый, мудрый, ревнивый, скупый, хитрый, честный, щедрый)*, іншыя прыметы і ўласцівасці *(бедный, богатый, божий, ветхий, вещий, гнусный, годный, готовый, грешный, грозный, дивный, дикий, домашний, достойный, живый, лесный, любый, мерзкий, мертвый, милый, новый, пеший, подобный, полный, простый, святый, тайный, убогий, целый, чужий, явный)* і інш.

Некаторыя праславянскія прыметнікі маюць па некалькі значэнняў, напрыклад *верный* 'верны': укроченъ бяше огнь, дабы не попалилъ техъ звереи еже къ вернымъ посланы суть (ПБ, 25), 'правільны': правыи есть сонъ и верно выкладание его (ДП, 9б); *красный* 'чырвоны': сосуды... были суть с меди красное (ТЦ, 141), 'прыгожы': красны суть ягоды лица твоего яко горлички (ПП, 3б), *крепкий* 'моцны': поставилъ градъ вельми крепкии (КЮ, 3), 'упарты, зацяты': бе брань крепка съ филистымляны (ПЦ, 52б); *пустый* 'пустынны': въходять до емафа даже до моря пустого (ЧЦ, 215), 'неапрацаваны': уставили суть Гозоръ еже лежить в поляхъ пустыхъ (ІН, 39), 'адзінокі': стези моя сокрушилъ и вывратилъ и положилъ мя пуста (ПЕ, 7б); *старый* 'пажылы': лепъшее есть дитя мудрое а оубогое, нежели царь старыи и безумныи (КЕ, 8), 'былы, мінулы': зопытаите о днехъ старыхъ еже быша предъ вами (ДЗ, 14), 'які даўно ўзнік, старадаўні': кончается книга... у славномъ старомъ месте празъскомъ (ПБ, 31б), 'карэнны, вопытны': они старии жители на земли твоеи святои (ПБ, 17б); *тихий* 'спакойны': азъ же яко агънець тихии на заколение веденъ (КІ, 4), 'глухі (пра вёску)': обидели вкупе тихыя земли (КІ, 30); *чистый* 'чысты, без прымесі': Авраамъ отважилъ... четыреста сиклевъ сребра чиста купецьска (КБ, 40б), 'бязгрэшны': въходящии къ жене ближънего своего не будеть чисть егда дотъкнется ея (ПС, 13) і інш.

У ліку праславянскіх слоў, ужытых у выданнях Скарыны, даволі буйны разрад утвараюць лічэбнікі: *вторый, два, двесте, двое, девятый, девять, десятеро, десятый, десять, другий, оба, одинъ, осмъ, первый, пятый, пять, седмый, седмь, сто, третий, три, четвертый, четыре, шестый, шесть* і інш. Прыкметнае месца займаюць у скарынінскім слоўніку праславянскія па паходжанню займеннікі накшталт *вашъ, весь, всякий, вы, иный, который, кто, мой, мы, нашъ, некий, некоторый, никто, ничто, онъ, самъ, свой, себе, таковый, твой, ты, чий, что, я, який.* Праславянскі характар маюць многія скарынінскія прыслоўі тыпу *вне, внутрь, вонъ, всегда, всюду, вчера, еще, заутра, зде* 'тут', *иногда, когда,*

мимо, много, нельзя, ныне, опять, подле 'побач', *после, прочь, рано, такъ, тамъ, туда, тутъ, уже.* Шырокай ужывальнасцю характарызуюцца праславянскія злучнікі, прыназоўнікі, часціцы *а, абы, безъ, бо, бы, въ, да, до, же, за, и, изъ, къ, ли, на, надъ, не, ни, но, о, отъ, по, подъ, при, съ, у, черезъ, чи* і інш.

Разгледжаныя словы ўяўляюць сабой самы старажытны пласт скарынінскай лексікі. Яны былі засведчаны ўжо ў стараславянскай і старажытнарускай літаратурна-пісьмовых мовах. Але гэта не асноўны паказчык праславянскага паходжання слоў. Не менш даўнія і многія лексічныя сродкі, якія ў сувязі з адсутнасцю спрыяльнага кантэксту не атрымалі ў старажытнарускіх пісьмовых помніках фіксацыі, але ўжываюцца ва ўсіх ці большасці славянскіх моў, як, напрыклад, назоўнікі *белмо, берлога, брюхо, виръ, грабли, гуня, доля, дупло, ель, желчь, злость, знакъ, клей, комора, кротъ, лапа, лишай, перо, плащъ, пылъ, сало, скала, стукъ, улей, ходъ, хрущъ, черепъ, щека, яворъ, ярмо,* дзеясловы *бирати, блискати, валити, вернути, винити, ганити, гледети, гнути, гоняти, гудети, дбати, добывати, дражнити, дышати, жалети, жечи, замыкати, карати, кивати, конати, лизати, моргати, ревети, скрипети, тратити, хлебтати, хромати, щипати,* прыметнікі *близкий, боязливый, буйный, военный, глупый, горячий, далекий, дерзкий, кислый, любый, прикрый, ровный, свежий, смелый, сытый, упорный, упрямый, ядовитый,* прыслоўі *близко, более, больше, быстро, внутри, выше, горее, далеко, дармо, потомъ* і інш.

Маючы ўстойлівыя лексічныя значэнні і служачы для абазначэння найбольш важных прадметаў, прымет і працэсаў з акаляючай рэчаіснасці і жыцця чалавека, праславянскія лексічныя адзінкі, выкарыстаныя Скарынам, з'яўляліся часткай асноўнага слоўнікавага фонду славянскіх моў, г. зн. самай ужывальнай катэгорыі слоў у паўсядзённых моўных зносінах кожнага славянскага народа. У адносінах да лексічнага складу скарынінскіх выданняў гэты пласт слоў можна кваліфікаваць як нейтральны, паколькі ён не дае ўяўлення аб творчай манеры перакладчыка. Такую ж лексіку з аднолькавай верагоднасцю мог ужыць прадстаўнік любой славянскай народнасці, аўтар ці перакладчык пісьмовага твора любой жанрава-стылявой прыналежнасці, абы толькі яму давялося сутыкнуцца з абазначэннем рэалій і паняццяў, з якімі прыйшлося мець справу беларускаму першадрукару. І ў той жа час, улічваючы намеры Скарыны зрабіць мову сваіх выданняў больш зразумелай простаму чытачу і маючы на ўвазе прыналежнасць адзначаных слоў да слоўніка старабеларускай мовы, няма падстаў не разглядаць гэту лексіку як спрадвечна беларускую.

Другі пласт спрадвечнай беларускай лексікі ў мове выданняў Скарыны складаюць лексічныя адзінкі, якія ўзніклі ў перыяд развіцця старажытнарускай народнасці, а пасля сталі неад'емнай часткай старабеларускага слоўніка. Большасць з іх — словы, утвораныя на базе праславянскіх каранёў пры дапамозе пэўных

словаўтваральных сродкаў. У галіне назоўніка — гэта перш за ўсё старажытнарускія інавацыі, звязаныя з абазначэннем асоб паводле роднасці і сваяцтва, службовай дзейнасці, асаблівасцей характару, паводзін. Сярод іх пераважаюць назоўнікі мужчынскага роду з суфіксамі *-никъ (данникъ, конникъ, любовникъ, милосникъ, мужеложникъ, мытникъ, насилникъ, отметникъ* 'адступнік', *племенникъ, помазанникъ, пятьдесятникъ, служебникъ, спротивникъ, церковникъ, щитникъ, ябедникъ), -ецъ (братанецъ, гудецъ* 'спявак', *'музыкант', делецъ, молодецъ, осталецъ, сновидецъ, стрелецъ, туземецъ, чужоземецъ),* іншымі словаўтваральнымі сродкамі *(братаничъ, вожъ, бояринъ, возатай, ворожбитъ, дворянинъ, дядковичъ, дядя, корчмаръ, наймитъ, поваръ, правнукъ, праотецъ, приставъ, царь, челядинъ).* Пэўная частка назваў асоб прадстаўлена назоўнікамі жаночага роду: *братанна, внука, дочка, меншица* 'малодшая дачка', *наложница, невестка, подруга, прабаба, служебница, суседа, царица.*

Даволі шырока адлюстраваны ў перакладных выданнях Скарыны назоўнікі старажытнарускага паходжання, якія характарызуюць узровень тагачаснай матэрыяльнай і духоўнай культуры. У ліку іх назвы рэалій, з'яў і паняццяў са сфер быту і акаляючай рэчаіснасці *(веникъ, винничина* 'вінаградная лаза', *голубица, кубокъ, лукоморье, лядвина* 'нырка', *масличина* 'масліна', *медведица, меденица* 'медны таз', *мертвечина* 'падла', *мешокъ, мошница* 'торба', *наплечникъ* 'адкладны каўнер', *ножницы, одевало* 'коўдра', *ожерелье, ослица, паволока* 'пакрывала з дарагой тканіны', *платье* 'адзенне', *плетеникъ* 'кош', *плетеница* 'пасма валасоў', *поводь* 'паводка', *подолокъ* 'падол, прыпол', *поленце, породъ* 'роды', *портъ* 'адзенне', *посохъ, пугвица, рукавица, скатерть, сочевица, триногъ, умывалница),* гаспадарча-эканамічнай дзейнасці (*вязба* 'цянёты; пятля, ячэйка', *дарокъ, дворецъ* 'палац', *животина* 'жывёла', *житница* 'свіран', *закладъ, копна, маковица* 'купал', *мерило* 'вагі', *накладъ* 'выдатак', *наковальня, огнище* 'жароўня, ачаг', *оправа, оратва, подбой* 'вушак дзвярэй', *подкладъ* 'фундамент', *пошло* 'карыта', *поминокъ* 'падарунак', *помостъ, посадъ* 'прадмесце', *посулъ* 'хабар', *пошлина, приплодъ, прядиво, сени, сеножать, скотина, сребреникъ* 'манета', *стояло* 'адстойнік', *торговля, точило* 'ціскі для выціскання вінаграднага соку', *уломокъ* 'абломак'), грамадскіх адносін (*насильство, неволя, первенецство* 'першародства, старшынства', *погоня, поклепъ, помочь, посмехъ* 'насмешка', *посольство, похвала, розбой, сеча, стрельба, татьба, уразъ* 'удар, пашкоджанне', *урокъ* 'падатак', *урядъ, царство, яремъ* 'непасільны цяжар, прыгнёт'), інтэлектуальнага і культурнага жыцця (*азбука, книжка, книжница* 'бібліятэка', *летописецъ* 'летапіс', *помыслъ, пословица, прегудница* 'музычны інструмент', *розумъ, смыслъ, сопель* 'жалейка', *умыслъ* 'думка, разважанне') і інш.

Пласт старажытнарускіх назоўнікаў у Скарыны дапаўняецца словамі, якія сведчаць аб арыентацыі чалавека ў часе і прасторы:

округъ 'гарызонт', *полдень* 'поўдзень, напрамак свету', *полночь* 'поўнач, напрамак свету', *половина, половица, примракъ, рубежъ, светло, теснота, третина, ширина* і інш. Добра прадстаўлены ў яго перакладах і назвы адцягненых паняццяў: *мольба, набожество, надежа, немощство, непокой, погибель, подоба, пригода, простота, просьба, пустота, рожество, седина, синева, синета* і інш.

Значны ў выданнях Скарыны і разрад старажытнарускіх па паходжанню дзеясловаў. Усе яны адрозніваюцца ад лексем праславянскага паходжання наяўнасцю пэўных словаўтваральных элементаў, пераважна прыставак. Дзякуючы ўвядзенню гэтага разрада слоў беларускі першадрукар істотна павялічыў выражальную здольнасць асноўных лексіка-семантычных груп дзеясловаў, атрымаў магчымасць семантычна разнастаіць апісанне даўніх падзей і больш дакладна перадаваць дзеянні і працэсы, звязаныя з важнейшымі сферамі чалавечага жыцця.

Аб шырокім выкарыстанні Скарынам дзеяслоўнай лексікі, утворанай у старажытнарускі перыяд, сведчыць тое, што яна намнога паўней, чым словы праславянскага паходжання, ахоплівае ў перакладах розныя фізічныя дзеянні *(влити, выдрати, выломити, высекати, вытерети, зажигати, закладати, заколоти, замазати, запалити, запечатати, наварити, наострити, насеяти, омыти, оплести, оседлати, остричи, отомкнути, переорати, побелити, повесити, погладити, пожати, покропити, попалити, посеяти, потопити, потоптати, почерпнути, пролити, слепити* 'зляпіць', *сломити, смочити, сплести, ссекати, стиснути, столчи, угасити, устрелити)* і гэтак жа рознабакова адлюстроўвае стан прадметаў і асоб *(выгнити, вытечи, загаснути, надождити, обетшати, оглохнути, огустети, окаменети, омеркнути, опичивати, ослабети, осхнути, отпасти, побледети, поболети, побыти, повиснути, погинути, погрязнути, пождати, пожити, полежати, померети, помешкати, порости, поспати, постояти, потечи, потонути, почернети, почивати, прилипати, сгнити, спасти, увянути, угаснути, упасти, уснути, усохнути, утолстети)*. Вялікая колькасць дзеясловаў старажытнарускага ўтварэння служыць для характарыстыкі людзей у маральных, эмацыянальных і інтэлектуальных адносінах: *всплакати, вспоминати, забывати, зведати, злоречити, змыслити, назвати, намолвити, научити, обидети, оболгати, ожесточити, онемети, оплакати, отмолвити, отповедети, отпросити, побеседовати, поговорити, позвати, познати, помолчати, помыслити, помянути, поругати, похотети, припомянути, прозвати, проклинати, проречи, прочести, розгневити, розмыслити, смышляти, спросити, спытати, считати, уведати, умыслити* і інш.

Пералічаныя словы складаюць толькі дзесятую частку дзеяслоўнай лексікі старажытнарускага ўтварэння, зафіксаванай у скарынінскіх выданнях. Практычна такім жа багатым слоўнікавым матэрыялам, што бярэ вытокі ў старажытнарускай мове, можна праілюстраваць і любую іншую лексіка-семантычную групу дзеясловаў, прысутную ў гэтых творах. Актыўная роля

многіх лексічных дэрыватаў таго перыяду ў мове беларускага першадрукара зусім відавочная. Варта звярнуць увагу хаця б на такую акалічнасць, што істотная частка старажытнарускіх дзеясловаў выступае ў Скарыны, як і ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове яго часу, даволі разгалінаванымі лексічнымі гнёздамі. Гэта, напрыклад, аднакарэнныя дзеясловы, утвораныя ў старажытнарускі перыяд на базе праславянскіх *бежати (выбежати, забежати, отбежати, побежати, прибежати, убежати), везти (вывезти, отвезти, перевезти, привезти, свезти), дати (вдати, выдати, отдати, подати, придати, роздати), жечи (зажечи, ожечи, пожечи), ковати (оковати, росковати, сковати, уковати), копати (закопати, окопати, подкопати, прокопати, роскопати), купити (выкупити, накупити, окупити, покупити), лезти (влезти, вылезти, полезти), носити (вносити, выносити, приносити), писати (записати, написати, попписати, списати), резати (вырезати, зарезати, обрезати, отрезати, урезати), садити (всадити, насадити, осадити, посадити, ссадити), сести (всести, обсести, ссести), сечи (высечи, отсечи, посечи, просечи, розсечи), слати (выслати, отослати, послати, прислати), судити (осудити, отсудити, присудити, розсудити), тяти (оттяти, подтяти, ростяти, стяти, утяти).*

Асабліва прыкметны ў мове Скарыны шматлікасцю аднакарэнных прыставачных утварэнняў такога тыпу лексічныя гнёзды, асновай для якіх паслужылі ў старажытнарускі перыяд праславянскія дзеясловы *бити (выбити, добити, набити, побити, прибити, пробити, розбити, убити), вести (ввести, вывести, довести, завести, навести, обвести, отвести, перевести, повести, подвести, привести, провести, свести), водити (вводити, выводити, наводити, низводити, отводити, приводити, проводити), вязати (завязати, навязати, обвязати, привязати, розвязати, связати, увязати), гнати (вогнати, выгнати, загнати, отогнати, погнати, пригнати, прогнати), ехати (выехати, заехати, наехати, объехати, отъехати, поехати, приехати), ити (взыити, воити, выити, заити, обоити, отоити, переити, подыити, поити, приити, проити, уити), пустити (впустити, выпустити, напустити, опустити, отпустити, попустити, припустити, пропустити, роспустити, спустити, упустити), ступити (выступити, заступити, наступити, обступити, отступити, оступити, переступити, поступити, приступити, сступити), ходити (входити, выходити, заходити, низходити, обходити, отходити, походити, приходити, проходити, сходити)* і інш.

Істотную частку слоўніка Скарыны складаюць старажытнарускія па паходжанню прыметнікі. Дзякуючы выкарыстанню гэтага разрада слоў беларускі першадрукар намнога больш, чым гэта можна было б зрабіць на аснове лексем праславянскай спадчыны, павялічыў якасную характарыстыку прадметаў *(безпутный, безславный, горбоватый, греховный, жалосный, завидливый, злобный, искреный, любимый, мужный, печальный, плачливый, плешивый, послушный, противный, сварливый, сильный, славный, страшливый, страшный, стыдливый, трепетный),* атры-

маў магчымасць для выражэння прымет, якія могуць праяўляцца з рознай ступенню інтэнсіўнасці *(молодший, мудрейший, низший, смутнейший)*. Разам з тым у адрозненне ад прыметнікавай лексікі, што бярэ пачатак ад праславянскай эпохі і ў пераважнай сваёй масе звязана з абазначэннем якасцей і ўласцівасцей прадметаў, якія непасрэдна ўспрымаюцца органамі пачуццяў, прыметнікі старажытнарускага ўтварэння прыкметна паляпшаюць у скарынінскіх выданнях і магчымасць абазначаць прымету прадмета праз яго адносіны да другога прадмета або паказваць яго прыналежнасць асобе ці жывой істоце.

Найбольш значны ў тэкстах Скарыны пласт адносных прыметнікаў старажытнарускага ўтварэння, якія выражаюць адносіны прадмета да матэрыялу, з якога ён складаецца, да часу існавання, месца знаходжання, прызначэння, дзеяння: *безводный, боярский, внутреный, восточный, ездный, железный, западный, зимний, иноплеменничий, книжный, конечный, людский, медяный, морский, невольный, ножный, ночный, оловяный, особный, памятный, потопный, пришлый, пшеничный, речный, соляный, судовый, торговый, утрений, финиковый, язвеный* і г. д. Невялікай колькасцю прыкладаў прадстаўлены ў яго выданнях вядомыя ад старажытнарускага перыяду прыналежныя прыметнікі: *антихристовъ, змиевъ, китовъ, козловъ, львовъ, мастеровъ, отцевъ, фараоновъ, царевъ; невестинъ, сатонинъ.*

У складзе якасных і адносных прыметнікаў, выкарыстаных Скарынам, вылучаецца даволі вялікая група слоў з прэфіксам *не-*, што сведчыць аб прадуктыўнасці гэтага словаўтваральнага тыпу ў старажытнарускай мове: *неведомый, невидимый, недостаточный, недостойный, нелюбый, немалый, немногий, немудрый, неплодный, неповинный, непорочный, непослушный, неправый, неслыханый, нечистый* і інш.

З ліку наяўных у пражскіх выданнях лічэбнікаў старажытнарускага ўтварэння найбольшай ужывальнасцю характарызуюцца словы *двадцеть, деветьсотъ, одиннадцеть, осмдесятъ, пятьдесятъ, пятьнадесять, пятьсотъ, седмдесять, седмеро, тридесять, тридцеть, тринадесеть, четырнадесеть, шестьдесять, шестьнадесеть, шестьсотъ.* У галіне старажытнарускіх прыслоўяў звяртаюць на сябе ўвагу лексемы *бедне, верне, весело, взадъ, вместе, вправду, высоко, годно, достойно, конечно, крепко, криво, ласкаво, любо, мало, мирно, мудре, назадъ, наконецъ, направо, недавно, нигде, никогда, окроме, особно, отколе, оттоле, праведне, просто, скоро, тихо, хитре, явно.* З іншых часцін мовы вылучаюцца лексічныя адзінкі *ано, либо, нетъ, никаковый, самый, сей, сесь, то, той, тотъ, увы, хотя* і інш.

Прыкметны ў выданнях Скарыны і старажытнарускі лексічны ўклад за кошт даўніх усходнеславянскіх запазычанняў. Пераважная частка іх пранікла ў старажытнарускую пісьменнасць кніжным шляхам непасрэдна або праз стараславянскае пасрэдніцтва з грэчаскай мовы, дзе ў сваю чаргу многія з гэтых слоў

мелі пашырэнне пад уплывам лацінскай, старажытнаяўрэйскай і старажытнаегіпецкай моў. Сярод назоўнікаў такога паходжання колькасна вылучаецца група слоў, якія адносяцца да рэлігійнай сферы: *адъ, аминь, ангелъ, антихристъ, апостолъ, архангелъ, архиерей, демонъ, диакъ, дияволъ, евангелие, еввангелистъ, епископъ, ерей, еретикъ, идолъ, кивотъ, крилосъ, пасха, патриархъ, презвитеръ, псаломъ, псалтырь, сатана, херувимъ, христианинъ*. Іх замацаванню ў старажытнай пісьменнасці садзейнічала інтэнсіўнае распаўсюджанне хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях. Астатнія старажытнарускія назоўнікавыя запазычанні з грэчаскай мовы тэматычна групуюцца як назвы месяцаў і дзён *(августъ, апрель, генварь, декаврий, мартъ, октябрь, сентябрь, субота, февраль)*, раслін, пладоў і прадуктаў раслiннага паходжання *(елей, исофъ, кедръ, кипарисъ, ладанъ, манна, нардъ, фимианъ, финикъ)*, жывёл, каштоўных камянёў, грашовых адзінак і іншых рэалій і паняццяў *(астрономия, грамота, кимвалъ, китъ, мраморъ, оксамитъ, плита, полата, сикль, скоропия, смарагдъ, стихия, стихъ, талантъ, тимпанъ, топазионъ, трапеза, фараонъ, философия, философъ)*.

Менш шырока адлюстраваны ў выданнях Скарыны старажытнарускія запазычанні цюркскага паходжання *(богатырь, жемчугъ, клобукъ, коверъ, ковчегъ, кумиръ, серга, телега, чертогъ)*, даўнія ўсходнеславянскія германізмы *(крюкъ, левиафанъ, мастеръ, шапка)*, а таксама лексічныя адзінкі, што прыйшлі ў X — XIV стст. з лацінскай мовы *(аметистъ, буволъ, олей, олтарь, оцетъ, пардусъ)*.

У разрадзе ўласнабеларускай лексікі, ужытай Скарынам, пэўнае месца займаюць словы агульнаславянскага і старажытнарускага паходжання, якія ў старажытнасці мелі вузкі арэал распаўсюджання, абмежаваны пераважна будучай беларускай тэрыторыяй, і захаваліся ў спецыфічна беларускім фанетычным афармленні. Беларускі першадрукар хацеў зрабіць мову сваіх выданняў больш зразумелай простаму чытачу. Таму зусім па-сучаснаму гучаць, напрыклад, ужытыя ім назоўнікі *баба, блощица, вежа, волотъ, вышиня, гай, гужъ, гукъ, жниво, зборъ, згода, клопотъ, корогодъ, криница, кроква, кропля, куделя, кутъ, лытка, нива, пастухъ, помста, прикладъ, промень, скриня, смутокъ, стегно, страва, струмень,* прыметнікі *горший, даремный, дробный, дурный, лагодный, лепший, приветливый, пригожий, смутный,* дзеясловы *гучати, досягати, засмутити, змовитися, лаяти, нахилити, помстити, робити, уживати, утекати, ховати,* прыслоўі *вдолжъ, доловъ, домовъ, досыть, ледва, лепей, николи* і інш. Многія з іх былі вядомы ў помніках старабеларускай пісьменнасці, а некаторыя беларускі першадрукар увёў у літаратурны ўжытак упершыню.

Пры вызначэнні ўласнабеларускага лексічнага ўкладу ў скарынінскі слоўнік неабходна, аднак, адзначыць, што найбольш істотную колькасную частку складаюць у ім словы, утвораныя

ў працэсе развіцця лексічнай сістэмы старабеларускай мовы або і самім першадрукаром на базе слоўнага матэрыялу праславянскага і старажытнарускага паходжання пры дапамозе ўласцівых для перыяду функцыяніравання мовы беларускай народнасці словаўтваральных сродкаў — суфіксаў, прыставак і інш. У ліку слоў, утвораных суфіксальным спосабам, большасць складаюць назоўнікі і прыметнікі. Сярод лексем прыставачнага ўтварэння пераважаюць дзеясловы.

Вытворныя назоўнікі беларускага паходжання, ужытыя Скарынам, характарызуюцца разнастайнасцю фармантаў. Сярод адушаўлёных назоўнікаў, напрыклад, шматлікасцю словаўтваральных тыпаў вылучаюцца назвы асоб, што ўзніклі дзякуючы выкарыстанню суфіксаў *-аръ, -ачъ, -ецъ, -икъ, -никъ, -окъ* і інш. Большасць гэтых фармантаў не мела прыметы навізны на беларускай глебе. Пэўная частка скарынінскіх слоў такога ўтварэння, як ужо адзначалася, з'яўлялася спадчынай старажытнарускага перыяду. З лексем, узнікненне і распаўсюджанне якіх храналагічна адносіцца да часу самастойнага функцыяніравання беларускай мовы, Скарына выкарыстаў такія адзінкі, як *воевникъ, долникъ, користовникъ, помочникъ, постелникъ, ремесникъ, ровесникъ, урядникъ (врядникъ), чародейникъ; ездецъ, мудрецъ, тубылецъ; наместокъ, наследокъ, светокъ; играчъ, насмевачъ, ткачъ, трубачъ; господичичь, золотарь, кликунъ, оборонца, старшина, ткаль, чародейца* і інш. Яны сведчаць аб тым, што беларускі першадрукар і ў перыяд выдавецкай дзейнасці ў Празе не парываў сувязі з роднай мовай.

Асаблівай жа ўвагі заслугоўваюць лексічныя сродкі, якія можна лічыць прадуктам індывідуальнай словатворчасці Скарыны, бо яны на ўсім працягу развіцця старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы заставаліся прыналежнасцю толькі яго перакладаў і ні ў адным іншым усходнеславянскім пісьмовым помніку не паўтарыліся. Да гэтых інавацый належыць, напрыклад, шэраг слоў з суфіксам *-никъ,* у прыватнасці *боенникъ* 'асоба, здольная да бітвы': обоидите градъ вси мужи боенници одинова на день (ІН, 12б); *любезникъ* 'той, хто любуецца чым-небудзь, прыхільнік': согледахъ того абыхъ узялъ ю собе за невесту, и любезникъ быхъ крисы ея (ПБ, 12); *последовникъ* 'паслядоўнік': азъ теже недостоиныи последовникъ нароженыи в рускомъ языку с помощию божиею (ДП, 4б); *придверникъ* 'швейцар': Багатанъ и Фаресъ... были суть и придъверниками а оу первыхъ двереи ложъницы Царевы стоиваху (КЕ, 7); *скотоложникъ* 'скаталожнік': праведному законъ не естъ положонъ, но... мужеложъникомъ и скотоложъникомъ лъгаремъ (ДЗ, 2б).

Скарынінскімі новаўтварэннямі можна лічыць і некаторыя словы з суфіксам *-ецъ,* такія, як *вестецъ* 'вяшчун': царь пытаеть мудреци вестъци гадачи и заклинателе (ДП, 8); *плешивецъ* 'пляшывы, аблыселы чалавек': дети малыи вышедъши изъ града посмевалися ему глаголюще въступи на гору плешивъче (ЧЦ,

187б); *седивецъ* 'сівы чалавек': о яко почъстива речь седивцомъ розознати судъ (ІС, 41); *тужилецъ* 'тубылец': такъ приходъ яко и тужилець тымъ же обычаемъ будуть приносити требы (КЛ, 35). Менш актыўна выкарыстаны беларускім першадрукаром пры ўтварэнні новых слоў са значэннем асобы мужчынскага полу іншыя словаўтваральныя сродкі — фактычна вынікі такога словаўтварэння ва ўсіх пражскіх выданнях абмяжоўваюцца лексічнымі адзінкамі *меденаръ* 'майстар па медзі': гадается зъ златники и съ сребреники, но и меденаревъ наследуеть (ПБ, 23); *приростокъ* 'падлетак': вы востали на места отцевъ своихъ приросътковe и ускоръмни людеи грешъныхъ (ЛК, 67); *ускормень* 'выхаванец': ускормень мои дедичомъ моимъ будеть (КБ, 28). Толькі старажытная словаўтваральная мадэль на *-атай* атрымала ў Скарыны далейшае развіццё: *жнатай* 'жнец': встановить собе воеводы и сотники и ратаи поль своихъ и жнатаи житъ своихъ (ПЦ, 17б); *оборонатай* 'абаронца': оставилъ убо по собе оборонатая дому своего противу врагомъ своимъ (ІС, 48б); *пригледатай* 'няглядчык': пригледатаи видя падение ближънего своего, доброе убо во злое обращаеть (ІС, 21); *пригонатай* 'прыганяты': тако вышедъши приставы и пригонатаи делъ рекоша к людемъ (КІ, 11б); *прозиратай* 'празорлівец': двема пакъ мужемъ прозиратаемъ реклъ есть исусъ (ІН, 14); *согледатай* 'назіральнік': послове и согледатаи наши засътрашили суть серъца наша (ДЗ, 6б).

Адушаўлёныя назоўнікі жаночага роду, якія сустракаюцца ў выданнях Скарыны, характарызуюцца наяўнасцю суфіксаў *-иц(а), -ниц(а) (велбудица, мулица, ненависница, племенница, подворница, постельница, предстоятельница, прелюбодеица, самица, святица), -к(а), (горличка, матка, нянька, поганка, полонянка, приятелка, родителька, сохранителка, ящерка), -евн(а), -овн(а), -ин(я), -ь(я) (дядьковна, пестунья, пророкиня, скакунья, царевна)*. Асобныя з іх могуць быць кваліфікаваны як прадукт словатворчай дзейнасці беларускага першадрукара, напрыклад *подворница* 'суседка, якая жыве ў сумежным двары': розъболеся сынъ жены вдовици подъворници дому того (ТЦ, 168); *постельница* 'пакаёўка': тогда служебници Есъферовы и постельници, пришедши к неи поведели еи еже видеша (КЕ, 9); *предстоятельница* 'прадстаўніца': даи ми пресътола твоего предъстоятельницу мудрость (ПБ, 12б); *святица* 'святая, праведніца': конъчается книга судеи... всемъ небеснымъ силамъ, святымъ и святицамъ божиимъ ко славе (КС, 48).

Для ўжытых у выданнях Скарыны адушаўлёных назоўнікаў ніякага роду характэрны суфіксы *-ен(я) (лосеня, львеня, медведеня), -ч(а) (телча)*. Хоць амаль усе яны не знайшлі адлюстравання ў помніках старабеларускай пісьменнасці ні да Скарыны, ні ў пазнейшы час, усё ж лічыць іх прадуктам словатворчай дзейнасці беларускага першадрукара не прыходзіцца — у беларускай літаратурна-пісьмовай мове старажытнага часу гэты тып утварэння назваў маладых істот быў добра вядомы. Ды і ў сучаснай

беларускай мове адушаўлёныя назоўнікі ніякага роду на *-н(я)* — звычайная з'ява.

Разнастайнасць словаўтваральных сродкаў наглядаецца таксама ў галіне скарынінскіх неадушаўлёных назоўнікаў. Праўда, як гэта назіралася і сярод адушаўлёных назоўнікаў, асобныя словаўтваральныя тыпы гэтай катэгорыі слоў прадстаўлены ў пражскіх выданнях з неадналькавай паўнатой. Так, сярод назоўнікаў мужчынскага роду найбольш аб'ёмную групу складаюць словы з суфіксам *-окъ: загорокъ, излишокъ, искидокъ, наколенокъ, обрезокъ, огарокъ, огурокъ, полокъ, початокъ, пребытокъ, преснокъ, связокъ, средокъ, угарокъ, узгорокъ, упадокъ, утинокъ, утокъ*. Іншыя суфіксальныя ўтварэнні, відаць, па прычыне адсутнасці спрыяльнага кантэксту абмежаваны адзінкавымі фіксацыямі. Найбольш яркімі сярод іх можна лічыць словы з суфіксамі *-ень (свечень, стрижень), -ецъ (дубецъ, образецъ), -акъ (тесакъ), -ачъ (толкачъ), -никъ (ополоникъ, часовникъ* 'капліца'). Затое ў выданнях Скарыны маюць некаторае пашырэнне лексічныя адзінкі прыставачнага паходжання — з прыстаўкамі *вы- (выкладъ, вымыслъ, выписъ), за- (загонъ, закровъ), на- (написъ), о- (окладъ), пере- (перекопъ, переписъ), по- (поездъ, пологъ, пописъ), при- (припевъ, пристрой), про- (проездъ)* і інш. Пераважная большасць гэтых суфіксальных і прэфіксальных утварэнняў была ўласціва старабеларускай пісьменнасці яшчэ ў XV ст., частка распаўсюдзілася ў ёй пасля скарынінскай выдавецкай дзейнасці, напрыклад *поездъ* 'паездка', *пологъ, преснокъ, средокъ* 'сярэдзіна', а некаторыя вядомы выключна выданням беларускага першадрукара. У прыватнасці, да ліку лексічных сродкаў, якія засталіся толькі прыналежнасцю мовы пражскіх выданняў Скарыны, трэба аднесці словы *загорокъ* 'месца за гарою': людие изъ загорка указываются (КС, 23); *искидокъ* 'выкідыш': искидокъ сокритыи не обрелъся быхъ, или яко зачатыи суще иже не видеша света (КІ, 7б); *припевъ* 'адзін з дзвюх тысяч вершаў «Псалтыра»': книги рекомые по гречески псалтиромъ... имають в собе кафизъмъ двадесеть, псалъмовъ полътораста, стишъковъ или припевовъ две тысещи (КБ, 5); *пристрой* 'састаўная частка, дэталь': все присътрое требъника посполу завинуть кожами синими, и привяжуть ко жеръдкамъ (ЛК, 13); *свечень* 'падсвечнік': на немъ же клали суть хлебы посвященъные, и свечъневъ златыхъ пять на правой стране и пять на левои (ТЦ, 141). Не выключана магчымасць, што аўтарам большасці з іх быў сам Скарына.

Сярод неадушаўлёных назоўнікаў жаночага роду самы шматлікі словаўтваральны тып — каля 150 лексічных адзінак — складаюць словы з суфіксам *-ость*. Тут, зразумела, і словы, якія з'яўляліся ў старабеларускай мове праславянскай і старажытнарускай спадчынай, і лексемы стараславянскага паходжання. Аднак асноўная частка скарынінскіх назоўнікаў на *-ость* — новаўтварэнні перыяду самастойнага развіцця беларускай мовы, не

зафіксаваныя да Скарыны ні старажытнарускімі, ні царкоўнаславянскімі лексікаграфічнымі даведнікамі. Сярод іх варта назваць такія назоўнікі, як *близкость, великость, верность, вечность, вонность, высокость, гадкость, глубокость, горячесть, грозность, добротливость, достойность, живность, закритость, ильстивость, колзкость, любость, малость, мерность, многость, мокрость, невидность, округлость, парность, плодность, подобность, почесность, приветливость, противность, ровность, руйность, скритость, служебность, спешность, спорность, сухость, тайность, темность, толстость, тяжкость, узкость, чуйность, широкость* і інш. Пэўная частка гэтых слоў — відавочна, вынік словатворчай дзейнасці беларускага першадрукара.

Іншыя словаўтваральныя тыпы неадушаўлёных назоўнікаў жаночага роду беларускага ўтварэння прадстаўлены ў пражскіх выданнях Скарыны колькасна менш значнымі лексічнымі групамі. З суфіксальных утварэнняў сюды адносяцца словы з фармантамі *-иц(а), -ниц(а) (виселница, десятница, доленица, зверяница, зоряница, лапица, лучница, молитовница, певница, покладница, правица, репица, розница, скляница, стороница, студница, ступица, тресавица), -ин(а) (грудина, зженина, лысина, новина, первотина, пухлина, ритовина, ровнина, розседлина, хворостина), -к(а) (веревка, защепка, мерка, пищалка, подставка, походка, сетка, сморщка, сопелка, стежка, стружка), -от(а) (дремота, плоскота, псота, темнота), -их(а) (гречиха), -б(а) (севба), -в(а) (сеатва), -н(я) (гулня)* і інш. З прыставачных утварэнняў звяртаюць на сябе ўвагу лексемы з фармантамі *вы- (вымова), на- (направа, наспа), от- (отмена, отплата), по- (покора, покуса, порада, постава, потрава), под- (подлога), при- (пригана, прикора, приправа), про- (проходня), у- (украса, утрата), ус- (усхода)* і інш. Мяркуючы па тым, што даволі многія з гэтых лексічных сродкаў не былі вядомы старабеларускай пісьменнасці XIV — XVIII стст. і не зафіксаваны ў старарускіх і царкоўнаславянскіх помніках, іх аўтарам быў сам Скарына. Да ліку скарынінскіх наватвораў, відавочна, трэба аднесці словы *десятница* 'мера сыпкіх рэчываў': возлиание приноситися будеть и две десятници крупъ пшеничныхъ покропленыхъ олеемъ на жертву (КЛ, 44); *зверяница* 'планета Венера': зверяницю надъ конци земли поставити повелишъ (КІ, 46); *зженина* 'спаленая ахвяра': пакли бы и жена сама умерла, то дасть... зженину за зженину (КВ, 40); *лапица* 'студня': лапица поставлена естъ на стежце его (КІ, 23б); *певница* 'музыка': восхощеш ли пакъ учитися Музики то есть Певници, премножесътво стиховъ и песнеи светыхъ по всеи книзе знаидеши (КБ, 3); *плоскота* 'плоскасць': плоскота безъдны стискается (КІ, 46); *покладница* 'скарбніца': Саломонъ... поставилъ е на глажении каменъномъ, и покладъницу суботнюю, до нея же цари и люди славнии метали дары (ЧЦ, 219б); *прикора* 'крыўда': оскоръбяше ю ненависница ея, и великие прикоры чиняше (ПЦ,

5б); *розседлина* 'расколіна': въстани и поспеши... голубице моя, в розъседлинахъ скальныхъ (ПП, 4б).

Выкарыстаныя Скарынам назоўнікі беларускага паходжання ніякага роду характарызуюцца наяўнасцю суфіксаў *-ств(о) (глуповство, детинство, доброволенство, добродейство, дуровство, ленивство, мастерство, мужебойство, небезпеченство, подобенство, послушенство, прикритство, приятельство, скуповство, товаришство, человеченство), -л(о) (гасило), -цтв(о) (пророцтво)*. Ёсць і прыставачныя ўтварэнні *(приимя)*, і лексемы, утвораныя прэфіксальна-суфіксальным спосабам *(навивало, прикривало, утирало)*. Сярод іх сустракаюцца, несумненна, скарынінскія неалагізмы: *гасило* 'гасільнік': клали суть... клещки златыи, и гасила и удици, и чашки, и ступки (ТЦ, 141); *глуповство* 'дурасць': узрелъ есмъ иже такъ много пресягаеть мудрость надъ глуповъство (КЕ, 5); *навивало* 'навой': древо копия его было тако толсто яко навивало ткачево (ПЦ, 35); *приимя* 'другое імя': слово откровено бысть Данилови, ему же приимя было Валътызаръ (ДП, 29); *прикривало* 'пакрыццё': вделаешъ и иное прикривало стрехъ храмовыхъ с кожеи баранихъ черъленыхъ (КВ, 49); *скуповство* 'скупасць': естъ человекъ онъ же розбогаченъ баваеть скуповъствомъ (ІС, 20).

Яркай прыметай трывалай сувязі скарынінскай лексікі з лексічным багаццем беларускай народнай мовы трэба лічыць ужыванне ў яго перакладах слоў з суфіксамі эмацыянальнай ацэнкі. Найбольшай разнастайнасцю словаўтваральных сродкаў характарызуюцца дэрываты мужчынскага роду — словы з суфіксамі *-окъ, -екъ (збанокъ, долокъ, задокъ, каменекъ, киекъ, колокъ, кружокъ, обручокъ, пенекъ, пупокъ, ретезокъ, снопокъ, челнокъ, язычекъ), -ецъ (бубенецъ, смытецъ, столпецъ, студенецъ, сырецъ* 'невялікі сыр'), *-икъ (кошикъ, кресцикъ, лианикъ, мечикъ, покоикъ)*. Формы экспрэсіўнай ацэнкі жаночага роду ўяўлялі сабой утварэнні, якія ўзніклі ў выніку далучэння да асноў назоўнікаў суфікса *-к(а) (долинка, кашка, лопатка, ношка, опонка, пеленка, петелька, победка, постелька, пуговка, сиротка, ступка, тростка, ягодка)*, ніякага — *-к(о) (копытко)*. Некаторыя з гэтых лексем можна лічыць прадуктам словатворчай дзейнасці беларускага першадрукара, напрыклад *каменекъ* 'невялікі камень': яко каменекъ песковыи, тако мала суть лета противъ веку (ІС, 29); *лианикъ* 'блін, ляпёшка': возми съ собою десятеро хлебовъ, и лианикъ единъ и сосудъ меду (ТЦ, 160); *победка* 'перамога': глава о частыхъ победъкахъ Давыдовыхъ (ДЦ, 79б); *смытецъ* 'смык': услышите звукъ трубы и сопелъки и гуслеи и смытъца и прегудницци и гарфы (ДП, 10б).

Для ўжытых у выданнях Скарыны назоўнікаў ніякага роду характэрны таксама суфіксы *-ятк(о), -етк(о): дитятко, зернетко, сернятко, ягнетко*. У адносінах да лексічнага складу старабеларускай мовы гэтыя назоўнікі не з'яўляюцца раўназначнымі. Словы *дитятко* і *зернетко*, напрыклад, у тым жа фанетыка-мар-

фалагічным афармленні, што і ў Скарыны, зафіксаваны ў многіх пісьмовых помніках розных жанрава-стылявых разнавіднасцей старабеларускай пісьменнасці ад XV да XVIII ст. Некалькі меншай колькасцю выпадкаў ужывання ў беларускіх тэкстах засведчана лексема *ягнятко,* але ў форме *ягнетко* яе выкарыстоўваў толькі Скарына: вси имеюще по двою ягнетокъ, и яловое несть посреди ихъ (ПП, 6). Лексема ж *сернятко* сустракаецца выключна ў Скарыны: две перси твое яко два младыхъ серънятка близенъци серъни (ПП, 9).

Зрэдку ў выданнях Скарыны сустракаюцца памяншальна-ласкальныя назоўнікі з суфіксамі *-очек (звоночекъ), -ичк(а) (маковичка), -ечк(о) (гнездечко, колечко).* У выніку памяншальна-ласкальныя формы некаторых назоўнікаў размяшчаюцца па ступенчатай мадэлі: *левъ — львикъ — львичекъ.* Дарэчы, апошнія два дэрываты сустракаюцца толькі ў скарынінскіх кнігах: Данъ львикъ младыи и потечеть щедре отъ васана (ДЗ, 64б); львичекъ львовъ іуда, на користь сыне мои воступилъ еси (КБ, 90б).

Значнае месца ў мове Скарыны займаюць уласнабеларускія прыметнікі. Даволі разгалінаваныя тыпы прадстаўлены тут лексемамі, утворанымі суфіксальным спосабам ад назоўнікаў са значэннем асобы і наогул ад адушаўлёных назоўнікаў. Звяртае на сябе ўвагу, напрыклад, словаўтваральны тып адносных прыметнікаў *-ск(ий), -цк(ий), -еск(ий): аптекарский, богатырский, вдовический, вдовский, военский, гафтарский, девический, делателский, диавольский, дойлидский, ковалский, лекарский, местьский, мужеский, неприятельский, пекарский, пророцкий, птический, рицерский, сыновский, царский, языцкий.* Зыходнай базай для гэтых утварэнняў, як відаць з прыкладаў, паслужылі як спрадвечна беларускія, так і запазычаныя асновы назоўнікаў. Пры гэтым некаторыя словы, відавочна, утвораны па агульнай словаўтваральнай мадэлі самім Скарынам, бо ні ў адным помніку старабеларускай пісьменнасці на ўсім працягу яе функцыяніравання яны ні разу не паўтарыліся. У прыватнасці, такое меркаванне можна дапусціць да лексічных адзінак *вдовический* 'удавіны': сложивши одежу юже на собе имеаше, облечеся в ризы вдовическия (КБ, 70б); *девический* 'дзявочы': пакли жъ бы отець девице дати не хотелъ, отбудеть сребромъ по обычаю вена девическаго (КВ, 41б); *делателский* 'работніцкі': не естъ слышана секира ни долото ани жадное железо делателское на томъ месте где ставили суть (ТЦ, 134); *птический* 'птушыны': все еже полозить по земли имея криле пътические нечисто вамъ естъ и не имате ести (ДЗ, 31).

Гэтак жа актыўна выкарыстоўваў беларускі першадрукар звычайныя для старабеларускай мовы прыналежныя прыметнікі, якія ўзніклі шляхам далучэння да асноў адушаўлёных назоўнікаў, як спрадвечна беларускіх, так і запазычаных, фармантаў *-ов, -ев: апотекаревъ, аспидовъ, баволовъ, быковъ, вужевъ, вышивачевъ, горнчаревъ, единороговъ, жениховъ, жерцевъ, кня-*

зевъ, красилниковъ, кузнецевъ, ловцевъ, мужевъ, наймитовъ, насильниковъ, орловъ, ословъ, пастыревъ, пауковъ, подворниковъ, поручниковъ, пструсовъ, работяговъ, скоропиевъ, соколовъ, гелцевъ, ткачевъ, ястребовъ і інш. Прычым адносна некаторых з іх прыходзіцца меркаваць як аб скарынінскіх наватворах, напрыклад аб прыметніках *вышивачевъ* 'які належыць вышывальшчыку': сынъ вышивачевъ от Вефлиома убилъ естъ Голиафа (ДЦ, 110); *подворниковъ* 'які належыць блізкаму суседу': тяжка суть сия человеку имеющему разумъ карание подъворниково и лаяние того онъ же позычилъ естъ (ІС, 48); *пструсовъ* 'страусіны': перо пъструсово подобъно ли естъ перу соколову (КІ, 47). Усе гэтыя словы аказаліся эфемернай з'явай у гісторыі лексічнай сістэмы беларускай мовы. Несумненна, скарынінскага ўтварэння і ўжытыя ў яго выданнях прыналежныя прыметнікі ад асноў неадушаўлёных назоўнікаў накшталт *медовъ* 'мядовы': сотъ медовъ сладокъ естъ горътани твоеи (ПС, 37); *солнцевъ* 'які належыць сонцу': снадъно естъ то абы стень солънцевъ рослъ (ЧЦ, 229).

Прыналежныя прыметнікі беларускага паходжання з суфіксам *-ин,* якія і ў іншых помніках старабеларускай пісьменнасці не вызначаліся шматлікасцю і частатой ужывання, сустракаюцца ў выданнях Скарыны вельмі рэдка: *девичинъ, дщеринъ, материнъ, пъявицинъ, ящеричинъ.* З іх толькі прыметнік *девичинъ,* відавочна, скарынінскага ўтварэння: за вину взложать нань сто сиклевъ сребра дати отцу девичину (ДЗ, 43).

Больш прыкметнай разнастайнасцю словаўтваральных сродкаў характарызуюцца выкарыстаныя Скарынам тыпы ўласнабеларускіх прыметнікаў, што ўзніклі на базе неадушаўлёных назоўнікаў і іншых часцін мовы. Некаторыя з гэтых тыпаў аб'ядноўваюць па некалькі дзесяткаў актыўна ўжывальных лексем, якія выражаюць у сваёй сукупнасці шырокі дыяпазон прымет. У гэтых адносінах вылучаецца, напрыклад, прадуктыўны словаўтваральны тып на *-ов(ый), -ев(ый),* асноўнае ядро якога складаюць прыметнікі *возовый, годовый, громовый, домовый, еловый, жиловый, каменевый, кедровыи, ладановый, месецевый, моровый, огневый, опоновый, песковый, притворовый, светилниковый, соборниковый, столповый, тиновый, тополевый, червцевый, шатровый, яблоневый, яворовый, яловцевый* і інш. Звяртае на сябе ўвагу сваёй шматлікасцю таксама прадуктыўны тып на *-н(ый): безпечный, бумажный, воздушный, вымолвный, гудебный, долинный, житный, земельный, квасный, летописный, обычайный, оливный, подорожный, покорный, пригодный, роботный, росный, скальный, спокойный, телный, убежный, чародейный, щасный* і інш.

Іншыя словаўтваральныя тыпы прыметнікаў не атрымалі ў выданнях Скарыны шырокага адлюстравання, аднак іх роля як сродкаў выражэння прымет, якасцей і ўласцівасцей прадметаў тут не менш значная, чым разгледжаных вышэй прыметнікавых груп. У прыватнасці, гэта можна сказать аб прыметніках,

утвораных шляхам выкарыстання суфіксаў *-ив(ый) (болезнивый, боязнивый, жадостивый, злостивый, илживый, ильстивый, лютостивый, огнивый, седивый, шолудивый, яростивый), -лив(ый) (бодливый, дрочливый, жалобливый, крикливый, молчанливый, нестыдливый, падливый, рокитливый, спорливый, упорливый, хватливый, язычливый), -ян(ый) (водяный, волняный, звездяный, илняный, крупяный, полотняный), -оват(ый) (взороватый, иловатый, пясковатый), -л(ый) (гиблый, дозрелый, зрослый, навыклый, прошлый, розводнилый, сошлый, увялый, умелый, утонулый), -овит(ый) (грановитый, двоитый, удвоитый, утроитый), -ат(ый) (зернатый), -к(ий) (колзкий), -ист(ый) (огнистый), -еньк(ий) (маленький), -ок(ий) (одинокий), -ем(ый) (ролемый), -им(ый) (зримый), -ом(ый) (рекомый), -яв(ый) (дирявый), -яч(ий) (козлячий)* і інш.

Пэўнае распаўсюджанне ў выданнях Скарыны маюць утвораныя на беларускай глебе формы ступеней параўнання прыметнікаў. Характэрнай прыкметай простых форм вышэйшай ступені параўнання з'яўляецца ў большасці выпадкаў наяўнасць суфікса *-ейш-: белейший, воннейший, горчейший, должейший, жолтейший, злейший, краснейший, легчейший, моцнейший, мякчейший, негоднейший, повышэнейший, пожиточнейший, раднейший, светлейший, склоннейший, скорейший, славнейший, смачнейший, теснейший, тончейший, ужиточнейший, утешенейший, хитрейший, червонейший, чернейший, чеснейший, чистейший, щаснейший, яснейший* і інш. Вельмі рэдка можна сустрэць выпадкі ўжывання суфікса *-айш-: множайший.* Затое звяртае на сябе ўвагу як варыянтная норма форма вышэйшай ступені з суфіксам *-ш-: близший, богатший, высший (вышший), глубший, глупший, долший, променитший, прудший, справедливший, сытший, тяжший.* Форма вышэйшай ступені параўнання ад прыметніка *старый* выступае ў Скарыны ў дублетных варыянтах *старейший — старший.*

Формы найвышэйшай ступені параўнання якасных прыметнікаў адрозніваюцца ад форм вышэйшай ступені наяўнасцю прыстаўкі *най- (на-): наближший (наближший), наивернейший, наигорший, наикраснейший, наилучнейший, наимоцнейший, наимудрейший, наипоследнейший, наиправший, наиприемнейший, наипростейший, наисмирнейший, наисправедливший, наитвердейший (наитвердший), наичистейший, наровнейший* і г. д. Многія формы ўжываюцца з прыстаўкай то ў варыянце *наи-*, то ў варыянце *на-: наибольший — набольший, наивышший — навышший, наилепший — налепший, наименший — наменший, наимилейший — намильший, наинизший — нанижший, наисильнейший — насилнейший, наиславнейший — наславнейший.*

Менш характэрны для выданняў Скарыны прэфіксальныя прыметнікі. У прыватнасці, адзінкавымі тут выглядаюць прыметнікі з прэфіксамі *без- (безпотребный, безстыдный), на- (надольный), о- (округлый), по- (побожный, погребателный, посвятный), под- (подпопелный), с- (сседалый)* і інш. Толькі прыметнікі

з прэфіксам *не-*, якія абазначаюць адсутнасць таго ці супрацьлегласць таму, што названа ўтваральным словам, прадстаўлены ў скарынінскіх перакладах даволі вялікай колькасцю лексічных адзінак: *небывалый, невступный, негибкий, негожий, недбалый, недоконалый, незбройный, неисведомый, неквасный, неласкавый, нелюбимый, нелютостивый, немолвный, ненабожный, ненавистный, ненадежный, непокойный, непочесный, непочтивый, непрямый, неровный, несильный, неслушный, несмелый, несмышленый, неспокойный, несправный, неужиточный (невжиточный), неумелый, неучтивый, нещасный* і інш.

Самы буйны разрад уласнабеларускіх слоў складаюць у выданнях Скарыны дзеясловы. У адрозненне ад назоўнікаў і прыметнікаў, што з'явіліся ў беларускай мове пераважна ў выніку прымянення суфіксальнага спосабу ўтварэння, яны характарызуюцца ў большасці выпадкаў наяўнасцю фармантаў прэфіксальнага тыпу. Найбольш істотная частка скарынінскай дзеяслоўнай лексікі ўласнабеларускага паходжання прадстаўлена ўтварэннямі з наступнымі прадуктыўнымі прыстаўкамі:

вы-: выбавити, выбрати, вывабити, вывоевати, выгладити, выгубити, выдолбати, выеждяти, выжати, выжечи, вызвати, выкипети, выкопати, вылетети, вылупити, вымолвити, вымыти, выналожити, выобразовати, выпалити, выписати, выпытати, вырити, вырости, высвободити, высербнути, высушити, вытягнути, выцедити, вычистити;

з-: збавити, збити, збыти, зварити, згинути, згладити, згорети, зготовати, зграбити, згубити, здержати, здробити, зженути, ззвати, зламати, злупити, злучити, змазати, зменити, змерити, змыти, змякчити, знайти, знищити, зносити, зродити, зрозумети, зрушити, зъездити, зъести;

за-: забити, забрехати, завезти, завернути, завищати, загадати, загримети, загустети, задержати, задрижати, заженути, закричати, закрыти, закупити, замолчати, заплакати, заплести, запомнити, запродати, запрячи, заревети, заскочити, заслепити, застогнати, затвердети, затопити, затрубити, заховати, зацвести, зашкодити;

на-: набрати, навернути, навозити, нагорети, наготовити, надати, наделати, назбирати, наклонити, накрити, налити, наловити, намазати, наняти, напалити, напечи, наплодити, напрясти, напрятати, нарезати, народити, насечи, наскочити, настроити, настругати, натесати, наторгати, нахватати, начерпати, нащипати;

о-: обити, обудити, огледети, огнюсити, одождити, одужети, ожесточети, оключити, окрасити, окреяти, окропляти, омастити, оплывати, опнути, оползти, опухнути, оскочити, оскупети, ослати, осмотрети, острыгати, осягнути, осякнути, отесати, отыкати, отяжети, охромети, оцистити, ошедивети, ощупати;

об- (обо-): оббирати, обвеселяти. обвезти, обвинути, обволочи, обвоняти, обгоняти, обжаловати, обжити, обкладати, обкру-

жати, облегати, облезти, облецити, облячи, облити, обмазати, обмерти, обмыти, обняти, обобрати, обогнати, обоскоминети, обрости, обсекати, обсечи, обтяжити, обхожати, объездити, объявляти;

по-: поблудити, побудити, поважити, поверити, повеяти, повиноватити, повышити, погнути, погордети, поделати, подремати, пожрати, позабыти, покарати, поламати, помножити, поострити, поплакати, поплескати, порадити, послепити, поспешити, поставити, пострелити, посхнути, потемнети, потрудити, почестовати, пошити, пощадити;

роз- (розо-, рос-): розбивати, розбогатети, розвеличити, розвинути, роздрати, роздробити, розженути, розжечи, розлити, розлучити, розмножити, розмышляти, розобрати, розогнати, розознати, розослати, розрезати, розсевати, розсылати, розтолстети, розтрести, розтучнети, розширити, роспалити, росплодити (розплодити), роспостерти (розпостерти), ростоптати, росторгнути (розторгнути), ростягнути, росчесати;

у-: уварити, увойти, угнати, удвоити, уделити, удергнути, удирати, удусити, удушати, узычити, укривдити, укрочати, уменшити, умешкати, умолкати, упевнити, уплетати, уплывати, упокоити, упросити, упущати, установляти, устрояти, утерети, утоптати, утратити, ухвалити, ухватити, уцелети, ушкодити і інш.

Пэўнае пашырэнне маюць у скарынінскіх тэкстах таксама дзеяслоўныя тыпы з прыстаўкамі *в- (вбежати, вбити, ввергнути, вканути, вкласти, впинати, вплести, вступовати, вхожати, въезждяти), до- (доводити, докормити, домолвити, доплыти, дорости, досветчити, досмотрети), от- (отбыти, отважити, отвязати, отгадати, отдалити, откинути, отплакати, отпочинути, отростати, отсылати), под- (подбити, подвернути, поддати, подкасати, поднести, подпалити, подпоясати, подрезати, подрости, подрубити), при- (привезати, привернути, приковати, приневолити, принутити, припровадити, прировнати, прирости, прихилити, пришити), про- (пробудити, провеяти, провинити, продрати, прозвинети, прокласти, проколоти, пролетети, проплакати, проспети), с- (свозити, сжечи, сказити, скиснути, скопати, слити, спечи, стесати, сузити, схилити)* і іншымі прэфіксальнымі словаўтваральнымі сродкамі, хоць у колькасным выражэнні яны значна ўступаюць пераліченым вышэй тыпам.

Дзеясловы суфіксальнага спосабу ўтварэння ў мове выданняў Скарыны менш разнастайныя ў структурна-тыповых адносінах. Сярод іх адзначаюцца лексічныя адзінкі з суфіксамі *-а-(-я-) (вивати, горевати, зловати, иржавяти, молвяти, обороняти, потешати, сватати, стукати, щепати), -и- (виноватити, двоити, мовити, наглити, неволити, путити, способити, товарышити, тонити, щепити), -ова- (знайдовати, обедовати, памятовати, пословати, послушенствовати, посполитовати, похлебовати, справовати, ступовати, честовати), -ива- (-ыва-) (бегивати, глодывати, говоривати, делывати, леживати, молвивати, пасы-*

вати, слыхивати, хоживати, чинивати), радзей дзеяслоўныя ўтварэнні з суфіксамі *-ну- (владнути, вуркнути, женути, зевнути, кинути, плынути, рекнути, станути), -ева- (имевати, порожневати), -е- (пернатети).*

Прыкметную ў колькасных адносінах групу складаюць у скарынінскіх перакладах прэфіксальна-суфіксальныя дзеясловы накшталт *выкопывати, выписывати, загадывати, заделывати, наполневати, нахиливати, обкружовати, оплакивати, отступовати, перемолчивати, помазовати, поскакивати, потоптывати, припрaвовати, промешивати, розваживати, смочивати, уступовати, уготововати, утрушовати* і інш.

Нарэшце, звяртае на сябе ўвагу вельмі вялікая ў Скарыны колькасць уласнабеларускіх постфіксальных, прэфіксальна-постфіксальных і прэфіксальна-суфіксальна-постфіксальных дзеясловаў тыпу *влитися, вплетатися, выбиратися, догадыватися, завязоватися, заслепитися, зеленетися, зместитися, метися, наклонятися, ослухиватися, отхилитися, палитися, подкасатися, посорометися, приближиватися, пробудитися, пущатися, розлегатися, роспалитися, ручитися, смутитися, соромятися, стовариштися, тулятися, убратися, успокоитися, хилитися, честоватися, щититися* і г. д.

У пражскіх выданнях Скарыны ўжываецца больш як 800 дзеепрыметнікаў беларускага паходжання. Самую вялікую групу сярод іх — амаль 500 лексічных адзінак — складаюць дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу з суфіксам *-ен-(-енн-): боденый, важеный, вкорененый (вкорененный), выбавеный, выличеный, гоненый, досветченый, еденый, загашеный, зарученый, зраненый, квашеный, наводненый, начиненый, обновленый, осоленый, погоршеный, помщеный, похваленый, притупленый, розбогаченый, смаженый, спаленый, стомленый, толченый, уваленый, ускормленый, хваленый, чтеный, явленый* і г. д. Другое месца па колькасці лексем займаюць у Скарыны дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу з суфіксам *-н-: венчаный, вкованый, выбраный, доконаный, жаданый, закопаный, зготованый, иманый, кованый, милованый, намазаный, ораный, подкасаный, потоптаный, розвязаный, складаный, ссеканый, тесаный, укаменованый, хованый* і інш. Параўнальна невялікай колькасцю выпадкаў прадстаўлены тут дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу з суфіксам *-т- (битый, взятый, вылитый, забитый, молотый, набытый, обвинутый, пожатый, розлитый, упитый).* Гэтак жа абмежавана выкарыстоўвае беларускі першадрукар дзеепрыметнікі незалежнага стану прошлага часу з суфіксамі *-вш-, -ш- (веровавший, гонивший, змерший, знашедший, минувший, пожадавший, померший, слышавший, уделавший, ходивший), -л- (высыхлый, доконалый, застарелый, згиблый, згнилый, минулый, опустелый)* і дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі *-ем-, -им- (гонимый, збираемый,*

ненавидимый, обсязаемый, посылаемый, розгибаемый, сказаемый, укрепляемый).

У ліку выкарыстанай Скарынай старабеларускай прыслоўнай лексікі найбольш значнае месца займаюць словы суфіксальнага ўтварэння. Да іх адносяцца ў першую чаргу даволі шматлікія адпрыметнікавыя прыслоўі з суфіксамі *-о, -е,* якія абазначаюць прымету, названую ўтваральным словам, з дадатковым акалічнасным значэннем: *бело, взоровато, возможно, глубоко, горде, добротливе, достаточне, законно (законне), знаемо, ильстиве, квапне, кругло, лакомо, маленько, мужно (мужне), нагле, обычайне, потребно, прикро (прикре), роздельне, роскошно, розно, слушно (слушне), смачно, тесно, ужиточно, упорне, хулно, щасливо, щедре* і інш. Менш ужывальныя ў пражскіх выданнях адназоўнікавыя прыслоўі з суфіксамі *-ом(-ем), -ою(-ею),* што абазначаюць акалічнасную прымету па адносінах да таго, што названа ўтваральным словам: *двоицею, десетерицею, днемъ, летомъ, молчкомъ, нарокомъ, проволокомъ, родомъ, силою, следомъ, троицею, часомъ.*

Пэўную ролю выконваюць у Скарыны прэфіксальныя прыслоўі тыпу *безвинне, задармо, запевно, заровно, напотомъ, напрямо, нарозно, неведоме, неверне, недалеко, недармо, недобро (недобре), недолго, незлобиве, немного, немудре, неомылне, неправе, непросто, неслушно, несправедливе, нестыдливо, нетерпеливе (нетерпливе), нечстиве.* Даволі часта сустракаюцца тут прэфіксальна-суфіксальныя прыслоўі — адназоўнікавыя *(ввеки, ввышки, взгору, взиме* 'зімой', *влете* 'летам'; *вмеру, вширки, довека, додому, збоку, зверху (сверху), згоры, здолу, зысподу (сысподу), кверху, кгоре* 'уверх', *навеки, наверху, нанизу, начеле, ополудни, отправды* 'сапраўды', *отчасти, поверху, поправде, сзаду, уночи),* адпрыметнікавыя *(допияна, дочиста, зажива, зблизка, здавна, здалека, змолоду (змолода), зособна, налево, по гречески, по еврейски, полегку, помалу, поровну, порозну, по руски, посуху, сполна, стиха, сцела)* і адлічэбнікавыя *(вдесятеро, вдругое, водвое, водругихъ, вопервыхъ, вотретихъ, вседмое, втрое, вчетвертое, заодно, упервое, усемое, утретее).* Нарэшце, можна адзначыць некалькі прыслоўяў прэфіксальна-нуль-суфіксальнага ўтварэння: *вдень, вширъ, набокъ, навекъ, наверхъ, навечеръ, наприкладъ, напротивъ, наширь, увеченъ.*

У выданнях Скарыны адзначаюцца ўсе тагачасныя спосабы формаўтварэння прыслоўяў. Вышэйшая ступень параўнання якасных адпрыметнікавых прыслоўяў характарызуецца ў пераважнай большасці выпадкаў наяўнасцю суфікса *-ей: вышей, далей, злей, меней, нижей, пожиточней, прилежней, радней, раней, светлей, смелей, старей, частей, явней.* Паралельна з гэтым сродкам формаўтварэння выступае, хоць и значна радзей, больш старажытны суфікс *-ее: крепчее, мудрее, простее, скорее, справедливее.* Зрэдку ўжываюцца таксама формы з суфіксам *-ш- (горше, тише),* які часам далучаецца да форм на *-ей (мякчейши, сил-*

нейши, хитрейши), служачы, такім чынам, дадатковым паказчыкам вышэйшай ступені параўнання. Арфаграфічная неўсталяванасць, уласцівая наогул для старажытнай пісьменнасці, прыводзіць у радзе выпадкаў да паралелізму пры напісанні адных і тых жа слоў, напрыклад *борздее — борздей, легчее — легчей, радее — радей* або *глубей — глубши, ширей — ширши.* А вышэйшая ступень параўнання ад прыслоўя *долго* рэалізуецца аж у трох варыянтах: *должее — должей — должейши:* за единъ месець или должее пребываше облакъ надъ храмомъ (ЛК, 24б); былъ естъ тамъ должеи надъ выреченыи день ему отъ царя (ДЦ, 106б); должеиши земли мера его и ширши моря (КІ, 16б).

Сустракаецца ў скарынінскіх тэкстах і найвышэйшая ступень параўнання прыслоўяў. Яна адрозніваецца ад вышэйшай ступені наяўнасцю прыстаўкі *най- (на-): наболее (-ей), наилепей (налепей), наипервей (напервей), наисильней, нарадней, наясней.* Аднак колькасць такіх утварэнняў абмежаваная.

Царкоўнаславянскую лексічную стыхію ў выданнях Скарыны найбольш ярка прадстаўляюць назоўнікі тыпу *агнець, багреница, бездна, божество, величество, ветошь, вещь, виноградъ, воздухъ, вопль, всадникъ, горесть, десница, естество, зерцало, измена, исповедь, источникъ, клевета, месть, нищета, обитель, победа, пророкъ, рабъ, соузъ, стезя, суета, телець, ярость* і інш. Шматлікія ў Скарыны таксама царкоўнаславянскія дзеясловы накшталт *безаконовати, величати, взимати, внимати, вопрошати, глаголати, гнушатися, грясти, довлети, завещати, запретити, истязати, медлити, мудрствовати, обитати, обличати, отверзати, победити, покусити, поработати, посетити, празновати, разумети, сетовати, создати, спасати, требовати, угодити, уповати, ясти* і інш. З ужытых у пражскіх выданнях царкоўнаславянскіх прыметнікаў звяртаюць на сябе ўвагу такія, як *алчный, багровый, велеречивый, виноградный, внешний, вселенский, всяческий, вышний, десный, еликий, жесткий, жестокий, заветный, истинный, нищий, победный, прилежный, присный, приятный, смиреный, сугубый, сущий, трезвый, тучный,* сярод прыслоўяў вылучаюцца *воистинну, вотще, всуе, выну, елико, зело, купно, одесную, окрестъ, ошую, присно, токмо,* сярод іншых часцін мовы — *азъ, аще, предъ, презъ, разве, чрезъ, убо* і інш. У ліку гэтых слоў і лексічныя адзінкі, што перайшлі ў спадчыну ад старажытнарускай мовы, і лексемы, уласцівыя царкоўнаславянскай мове ў перыяд развіцця старабеларускай пісьменнасці. Некаторыя з прыведзеных слоў праславянскага паходжання, але захаваліся толькі ў царкоўнаславянскай мове, што і дае падставу кваліфікаваць іх як царкоўнаславянізмы.

У радзе выпадкаў Скарына падае праславянскія словы ў дзвюх формах — царкоўнаславянскай і беларускай, аб чым сведчыць наяўнасць у тэкстах няпоўнагалосных і поўнагалосных форм адных і тых жа слоў, напрыклад назоўнікаў *брегъ — берегъ, бремя — беремя, глава — голова, гладъ — голодъ,*

длато — долото, древо — дерево, жлабъ — жолобъ, млатъ — молотъ, обрана — оборона, оградъ — огородъ, платно — полотно, пленъ — полонъ, прагъ — порогъ, прахъ — порохъ, средина — середина, стража — сторожа, стражъ — сторожъ, страна — сторона, дзеясловаў *бранити(ся) — боронити(ся), влачити(ся) — волочити(ся), забраняти — забороняти, облечися — оболочися, обранити — оборонити, остречи — остеречи, побранити — поборонити, поздравити — поздоровити, пленити — полонити, похранити — похоронити, провлечи — проволочи, свлечи — сволочи (зволочи), срамотити — соромотити* і г. д. Пры гэтым характэрна, што ў колькасных адносінах перавага ў большасці выпадкаў належыць царкоўнаславянскім варыянтам, а асобныя з прыведзеных поўнагалосных форм у Скарыны наогул адзінкавыя. У якасці ілюстрацыі можна спаслацца на словы *берегъ, беремя, голова, голодъ, дерево, оболочися, порохъ, середина, соромотити, сторожъ, сторона,* ужывальнасць якіх на ўсе 22 біблейскія кнігі абмяжоўваецца адным, часам двума выпадкамі, тады як іх царкоўнаславянскія адпаведнікі фіксуюцца калі не ў кожнай, то ў пераважнай большасці кніг, прычым, як правіла, у некалькіх дзесятках словаўжыванняў.

Трэба мець на ўвазе таксама тую акалічнасць, што ў скарынінскіх перакладах ёсць нямала і такіх лексем, якія выступаюць толькі у няпоўнагалоснай форме, хоць для кожнай з іх у тагачаснай беларускай літаратурна-пісьмовай мове былі поўнагалосныя адпаведнікі. У прыватнасці, да такіх лексем адносяцца назоўнікі *благо, брада, бракъ, брань, владыка, власть, власъ, врагъ, вранъ, врата, вредъ, время, гласъ, градъ, длань, жребий, злакъ, злато, зракъ, кладезь, младенець, мразъ, мракъ, нравъ, облакъ, область, пламя, смрадъ, храмъ, чрево,* дзеясловы *благоволити, благословити, блажити, владети, вредити, гласити, извратити, обладати, облечи, обличати, обратити, оградити, отвратити, предати, презирати, прельстити, прелюбыдеяти, претися, упредити, хранити,* прыметнікі *благоверный, благородный, благочестивый, вредный, главный, драгий, здравый, златый, краткий, младый, сладкий, странный, храбрый* і інш. У параўнанні з імі поўнагалосныя формы накшталт *борозда, борона, дорога, жерело, забороло, короста, шоломъ; бороздити, ворочатися, забороняти, оболокатися, перечити,* якія ў выданнях Скарыны выступаюць без царкоўнаславянскіх адпаведнікаў, малапрыкметныя.

Аналагічны малюнак назіраецца і ў формах, суадносных па выніках рэфлексацыі праславянскіх спалучэнняў *dj, tj*. Нягледзячы на тое што шэраг слоў такога тыпу фіксуецца ў Скарыны і з царкоўнаславянскімі рэфлексамі *жд, щ,* і са старабеларускімі *ж, ч (нощь — ночь, одежда — одежа, пещь — печь, помощь — помочь, свеща — свеча; мощи — мочи, помощи — помочи, схождати — схожати; полунощный — полуночный, чуждий — чужий),* перавага ўсё ж на баку кніжных форм. Многія ж лексічныя адзінкі наогул выступаюць толькі ў царкоўнаславянскай форме:

влагалище, вражда, вретище, жажда, куща, нужда, овощь, пещера, пища, свещенникъ; возвещати, навещати, насыщатися, нуждатися, освещати, подвращати, смущати, созиждати; всемогущий, немощный, помощный, священный; между, прежде і г. д. Выключна з царкоўнаславянскім *щ* у суфіксах ужываюцца ў Скарыны дзеепрыметнікі незалежнага стану цяперашняга часу, якіх у пражскіх выданнях налічваецца больш за 300 самастойных адзінак: *алчущий, блищащий, везущий, гледящий, гудущий, делающий, ездящий, жгущий, заходящий, знающий, играющий, ищущий, кипящий, лежащий, минающий, мыслящий, нападающий, обретающий, пишущий, поющий, родящий, ростущий, светящий, текущий, умеющий, хвалящий, царствующий, чующий, шумящий, являющий* і г. д.

Некаторыя з адлюстраваных у тэкстах Скарыны слоў спалучаюць у сабе адначасова прыметы абедзвюх моў. Так, назоўнік *гражанинъ*, маючы царкоўнаславянскую прымету няпоўнагалосся, выступае з беларускім рэфлексам *ж* праславянскага спалучэння *dj*. Гэта ж можна сказаць аб дзеясловах *вовлечи, извлечи, оражати* і інш.

Царкоўнаславянскі ўплыў у выданнях Скарыны адбіўся і на выкарыстанні ім царкоўнаславянскіх словаўтваральных сродкаў, напрыклад пры напісанні вытворных дзеясловаў беларускі першадрукар ужывае царкоўнаславянскія прэфіксы *воз-//вос- (возалкати, возбудити, возвеличити, возвеселити, возвести, возвестити, возглаголати, воздати, воздвигнути, воззвати, возложити, возлюбити, возненавидети, вознести, возникнути, возопити, возрасти, возрастити, возтрубити, воскресити, воспети, восприяти, воспросити, восхвалити, восхотети), из-//ис- (избавити, избежати, избрати, извести, известити, изволити, изгнати, излити, изменити, измерити, изнемочи, изречи, изыскати, исказити, искоренити, искупити, искусити, исповедати, исполнити, исправити, испытати, иссякнути, истлети, истощати, исцелити), раз-//рас- (разбити, развезати, разгневати, разграбити, разделити, раздрати, разлучити, разметати, размножити, разорити, разплотати, разсечи, разсеяти, разсудити, разхитити, раскопати, распрашити, распростерти, распустити, распяти, рассыпати, растерзати, растоптати, расторгати, расточити)* або карыстаецца прыстаўкай *пре-* як паказчыкам царкоўнаславянскага паходжання многіх дзеясловаў *(пребыти, превернути, превести, превознести, превратити, превышити, прегрешити, прегорчити, презрети, преизволити, преити, преклонити, прекормити, преламати, преложити, прельстити, пременити, пренести, преобразовати, препоясати, препустити, престати, престрашити, преступити, претерпети)*, некаторых назоўнікаў *(прелюбодейца, премножество, премудрость, преходъ)*, пры ўтварэнні абсалютнай найвышэйшай ступені прыметнікаў *(преблагословенный, превеликий, превечный, превысокий, превышний, предивный, преизлишний, преисподний, прекрасный, премногий, премудрый, преподобный, пресветлый, пресвятый,*

преславный, претвердый, прехвалный, пречистый, пречудный), прыслоўяў *(превыше, пресилне)* і інш.

Значнай данінай царкоўнаславянскай мове з'яўляецца ў выданнях Скарыны напісанне назоўнікаў ніякага роду тыпу *беззаконие, безводие, величие, господствие, здравие, знамение, каменне, копие, листие, милосердие, насилие, одение, платие, прутие, распутие, стеблие, терние, устие, чувствие, щастие* з канчаткам *-ие*. Асабліва шматлікія выпадкі ўжывання аддзеяслоўных назоўнікаў на *-ние* як царкоўнаславянскага паходжання, так і ўтвораных на беларускай глебе па царкоўнаславянскай словаўтваральнай мадэлі: *брание, врожение, выполнение, гризение, допущение, зажигание, знайдение, изведение, карание, лепление, мысление, наливание, обирание, отделение, пасение, покушение, признание, пухнение, разознание, розширение, свитание, смилование, считание, трубение, указывание, умоление, утружание, хватание, царствование, шествование, щипание* і інш. На іх фоне напісанні беларускага тыпу з *-нье* накшталт *возренье, обецанье, свитанье* выглядаюць адзінкавымі.

Са слоў суфіксальнага ўтварэння кніжны характар маюць у выданнях Скарыны назоўнікі ніякага роду на *-ищ(е)* з агульным значэннем 'месца, дзе знаходзіцца што-небудзь, адбываецца якое-небудзь дзеянне'. Большасць такіх слоў фіксавалася яшчэ ў помніках старажытнарускай пісьменнасці *(гноище, исходище, побоище, прибежище, пристанище, приходище, становище, судище, требище, убежище),* астатнія ўзніклі ў пазнейшы час *(виннище, воище, жнище, молбище, проходище, сечище, утечище).*

Звяртаюць на сябе ўвагу таксама назоўнікі мужчынскага роду са значэннем асобы з суфіксам *-тель,* многія з якіх былі вядомы яшчэ стараславянскай мове: *властель, вседержитель, гонитель, делатель, житель, защититель, идолослужитель, избавитель, мучитель, победитель, покровитель, проповедатель, родитель, ругатель, сведетель, сказатель, спаситель, строитель, учитель, хранитель.* Гэты спіс дапаўняецца лексічнымі адзінкамі царкоўнаславянскага і старабеларускага паходжання накшталт *веритель, еднатель, заклинатель, испытатель, неприетель, учинитель,* а таксама скарынінскімі наватворамі, сярод якіх можна адзначыць такія словы, як *важитель* 'вагаўшчык': важитель духом ест богъ (ПС, 25б); *виноградоделатель* 'вінаградар': их же оставилъ былъ Навходнасоръ, Царь Вавилонский, то естъ виноградоделателе и ратае земли (ЧЦ, 240); *высвободитель* 'вызваліцель': той же воздвиже имъ высвободителя именем Аиофа (КС, 8б); *древоделатель* 'разбяр': тии же выдавали муралемъ и древоделателемъ елико было потреба ко опреве храму божия (ЧЦ, 210б); *отомститель* 'мсцівец': богъ убо отомститель помстить тобе (ИС, 11) і інш.

Дарэчы, аб словатворчай дзейнасці Скарыны на базе царкоўнаславянскіх асноў ці з выкарыстаннем царкоўнаславянскіх

фармантаў выдатна сведчыць і тая акалічнасць, што ў яго выданнях ужываецца многа кніжных лексічных сродкаў, якія або з'яўляюцца прыналежнасцю толькі яго кніг і больш ніколі не паўтарыліся ні ў адным з помнікаў старабеларускай пісьменнасці, або сустракаюцца ў асобных старабеларускіх пісьмовых помніках толькі ў адзінкавых выпадках: *агньчий, брадавица, великоможие, ветротленный, взалчети, водотечие, вожаздети, воскиснение, вхожающий, выпрание, главня, глаголавый, двизание, дщание, дщета, жаждный, златарский, злосмелость, известовати, класъ* 'колас', *крава, крастель, младопомазанный, огижденый, огнищный, прегроза, предкладъ, предмолва, презоръ, прекопъ, схождати, трезвливе, яростивый* і інш. Праўда, некаторыя з прыведзеных тут няпоўнагалосных форм можна растлумачыць і чэшскім уплывам, бо яны знешне супадаюць з адпаведнымі старачэшскімі формамі ў адэкватных месцах чэшскай Бібліі венецыянскага выдання 1506 г.

Адносна некаторай часткі старажытнай лексікі цяжка меркаваць, ці яна ўжыта беларускім першадрукаром таму, што была вядома яму з роднай мовы, дзе з'яўлялася старажытнарускай спадчынай, ці па той прычыне, што ўжывалася ў выкарыстаных ім царкоўнаславянскіх арыгіналах біблейскіх кніг. Верагодна, тут мелі значэнне абедзве гэтыя акалічнасці, хоць дакладна дыферэнцыраваць кожнае канкрэтнае слова ў адзначаным плане не ўяўляецца магчымым. Адно несумненна, што аднолькава ўжывальнымі і ў старажытнарускай, і ў стараславянскай пісьменнасці былі і ўтвораныя на базе праславянскіх каранёў лексемы са значэннем асобы тыпу *блудникъ, блудница, вдовица, грешникъ, домочадецъ, законникъ, законодавецъ, законопреступникъ, заступникъ, кормникъ, певецъ, первенецъ, послушникъ, праведникъ, преступникъ, приставникъ, пришелецъ, проповедникъ, пущеница, пьяница, работникъ, разбойникъ, родительница, советникъ, сребролюбецъ, старейшина, супротивникъ, творецъ, чародеецъ, чародеица,* і назвы многіх рэалій і паняццяў са сфер гаспадарча-эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця накшталт *водоносъ* 'вядро', *врачба, действо, зачало, кадилница, ложесно, множество, неясить, опреснокъ, отечество, отрасль, пагуба, пругъ, пустыня, сведетельство, святыня, скриница, слепота, смоковница, спасъ, строительство, судьба, темница, требникъ, убожство, удица, укоризна, цветецъ, человечество, щедрота* і інш. Адносна ж асобных лексем гэтага тыпу, у прыватнасці слоў *вестникъ, девственикъ, преселникъ,* хоць яны ўжыты ва ўсходнеславянскім моўным арэале ўпершыню ў Скарыны, цяжка меркаваць, ці яны былі ўтвораны на беларускай глебе, ці запазычаны з царкоўнаславянскай мовы, бо вядомы яшчэ ў стараславянскай мове.

Сярод слоў іншамоўнага паходжання самы буйны пласт у выданнях Скарыны складаюць лексічныя адзінкі заходнеславянскага паходжання — чэшскія і польскія. Прычына адлюстравання чэшскіх слоў у «Бібліі» Скарыны зусім зразумелая. Яны

з'явіліся ў пераважнай большасці вынікам непасрэдных кантактаў беларускага першадрукара з чэхамі ў перыяд выдавецкай дзейнасці ў Празе (1517—1519) і выкарыстання ім ў якасці асноўнага дапаможніка пры апрацоўцы біблейскіх тэкстаў чэшскай Біблії ў венецыянскім выданні 1506 г. Паланізмы атрымалі фіксацыю ў сувязі з распаўсюджаннем на тэрыторыі Беларусі беларуска-польскага двухмоўя.

З пункту погляду адносін да лексічнай сістэмы старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы чэшскія па паходжанню лексемы ў біблейскіх кнігах Скарыны можна падзяліць на чатыры групы. Адну з іх, самую буйную па колькасці адзінак, складаюць лексічныя чэхізмы. Як правіла, імі з'яўляюцца словы, зусім адрозныя ад тэрмінаў, якія ўжываліся для абазначэння адпаведных прадметаў, з'яў і паняццяў у старабеларускай мове. Да такіх чэхізмаў адносяцца лексемы *вчерашекъ* 'учарашні дзень', *жадость* 'просьба', *жаларъ* 'турма', *жизень* 'смага', *зазлити* 'ставіць у віну', *залога* 'засада', *змизати* 'знікнуць', *комонство* 'світа', *лебка* 'чэрап', *ледвина* 'нырка', *либивость* 'прыгажосць', *наводъ* 'настаўленне, інструкцыя', *нежитъ* 'фурункул', *нутити* 'прымушаць', *осидлитися* 'пасяліцца', *ошеметникъ* 'ашуканец', *позоровати* 'сачыць', *рерюха* 'настурка', *розмагатися* 'распаўсюджвацца', *розсапати* 'разарваць', *рукавникъ* 'сетка для лоўлі птушак', *рыбникъ* 'сажалка', *смыркъ* 'елка', *стребати* 'хлябтаць' і інш. Усе гэтыя словы паслядоўна перадаюцца Скарынам у тым жа арфаграфічным афармленні, у якім яны выступаюць у чэшскай мове.

Група лексічных чэхізмаў значна папаўняецца за лік лексем, пры выкарыстанні якіх Скарына, згодна з патрабаваннямі царкоўнаславянскай і старабеларускай арфаграфічных сістэм, дапускае неістотныя змены ў канчатках. Асобны разрад сярод іх складаюць формы прыметнікаў, дзеепрыметнікаў і парадкавых лічэбнікаў мужчынскага роду з канчаткамі *-ый, -ій,* адпаведнымі чэшскім *-y, -i: вырченый* 'вызначаны', *выседлый* 'выступаючы', *горливый* 'прылежны', *днешний* 'сённяшні', *планый* 'дзікі', *ратолесный* 'галіністы', *урченый* 'назначаны'. Асаблівасцю арфаграфічнага асваення Скарынам чэхізмаў з'яўляецца таксама тое, што ў назоўніках ніякага роду ён замяняе канчатак *-і* царкоўнаславянскім канчаткам *-ие* (часам усходнеславянскім *-ье*). Звычайна з гэтым канчаткам выступаюць у скарынінскіх кнігах лексемы *заважие* 'гіра', *локтушие* 'хустка', *надобье* 'пасуда', *поглавие* 'пол', *сведомие* 'сумленне'. Такім жа чынам афармляюцца і аддзеяслоўныя назоўнікі чэшскага паходжання: *занепразнение* 'занятасць', *запоменутие* 'забыццё', *премышлевание* 'роздум' і інш.

У другую групу ўваходзяць словы, якія адрозніваюцца ад старабеларускіх сваім марфалагічным афармленнем. Утвораныя, як і старабеларускія эквіваленты, на базе праславянскага караняслова, яны супадаюць з апошнімі па каранях і вылучаюцца

толькі спецыфікай выкарыстання словаўтваральных сродкаў: *вдатный* 'удалы, мужны', *вдолие* 'даліна', *вымолва* 'адгаворка', *выстража* 'перасцярога', *дивокий* 'дзікі', *злобивый* 'злосны', *зреймый* 'прыкметны', *кедуживый* 'хваравіты', *одреный* 'абадраны', *плытовъ* 'плаўнік', *поводнение* 'паводка', *поволити* 'дазволіць', *посилнитися* 'падмацавацца', *словутный* 'славуты', *смолва* 'дагавор', *сполягнути* 'паспадзявацца' і інш. Да адзначанай групы лексем чэшскага паходжання далучаецца значная колькасць слоў з разнастайнымі словаўтваральнымі фармантамі, якія служаць паказчыкамі пэўных граматычных катэгорый. Так, напрыклад, найбольш характэрнымі чэхізмамі мужчынскага роду тут з'яўляюцца назоўнікі з суфіксамі *-ец (врабець* 'верабей', *звонець* 'звон', *мешець* 'мяшок', *пупенець* 'пупышка'), *-ач, -ич* (*вышивачъ* 'вышывальшчык', *гадачъ* 'варажбіт', *голичъ* 'цырульчік', *послухачъ* 'слухач'), *-ок* (*зачатокъ* 'пачатак', *придавокъ* 'дабаўка', *святокъ* 'свята', *хитрокъ* 'хітрэц'). Сюды ж адносяцца яшчэ такія лексемы, як *заечекъ* 'заяц', *котликъ* 'кацялок', *лгарь* 'ілгун' і інш. З чэхізмаў жаночага роду можна ўключыць у гэту групу словы з суфіксамі *-ость* (*навыклость* 'прывычка', *нестыдатость* 'нахабства', *славность* 'урачыстасць'), *-к-* (*задоржка* 'затрымка', *кожка* 'шкурка', *поражка* 'паражэнне', *хижка* 'хатка'), а таксама лексемы *можрина* 'забалочанае месца', *мерица* 'мера'.

Да трэцяй групы належаць фанетычныя чэхізмы, г. зн. словы, якія адрозніваюцца ад старабеларускіх толькі сваёй фанетычнай формай. Усе яны праславянскага паходжання, але набылі на чэшскай глебе рысы, уласцівыя фанетычнай сістэме чэшскай мовы, напрыклад: *блазе* 'добра', *сладце* 'соладка', *червеный* 'чырвоны', *шедины* 'сівізна': параўн. старабеларускія *болозе, солодко, чырвоный, седина.* Сюды ж адносяцца лексемы са спалучэннем *-дл-*, адпаведным усходнеславянскаму і царкоўнаславянскаму *-л-: зерцадло* 'люстэрка', *кридло* 'крыло', *отпочивадло* 'плашчадка', *радлица* 'лямеш' і інш.

Нарэшце, чацвёртую групу выяўленых у скарынінскай «Бібліі» чэхізмаў утвараюць лексемы, якія былі ўласцівы і старабеларускай лексічнай сістэме, але мелі ў чэшскай мове іншыя значэнні, чым у беларускай,— так званыя семантычныя чэхізмы: *бегунъ* 'валацуга' (ст.-бел. 'уцякач'), *выразити* 'выбіць' (ст.-бел. 'выразіць'), *выходъ* 'усход' (ст.-бел. 'выхад'), *загрида* 'агарод, сад' (ст.-бел. *загорода* 'загарадзь'), *заходъ* 'туалет' (ст.-бел. 'захад'), *кончина* 'краіна, край' (ст.-бел. 'канец'), *лихота* 'ліслівасць' (ст.-бел. 'бяда'), *настрой* 'інструмент, прылада' (ст.-бел. 'настрой'), *обруба* 'кайма' (ст.-бел. *обрубъ* 'участак зямлі'), *пахати* 'тварыць' (ст.-бел. 'араць'), *погнутися* 'зварухнуцца, крануцца' (ст.-бел. 'сагнуцца'), *светити* 'светкаваць' (ст.-бел. 'свяціць') і інш. Магчыма, колькасць семантычных чэхізмаў можна павялічыць, але патрэбна адзначыць, што яны дзякуючы свайму

знешняму супадзенню з беларускімі словамі цяжка выяўляюцца ў старажытным тэксце.

Адзначаецца ў кнігах Скарыны і некаторая колькасць дэрыватаў ад лексем чэшскага паходжання. Больш за ўсё сярод іх прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, утвораных ад адпаведных назоўнікаў і дзеясловаў, напрыклад: *врабець — врабцевый; жадость — жадостивый; либевость — либевый; нестыдатость — нестыдатый; нутити — нученый, принутити; поражка — поразивый; смыркъ — смырковый, смырчина* і інш. Аднак большасць чэхізмаў зафіксавана ў скарынінскіх перакладах у зыходнай форме, што было звязана часцей за ўсё з іх слабай словаўтваральнай актыўнасцю ў чэшскай мове, а часткова з адсутнасцю спрыяльнага кантэксту для іх адлюстравання ў «Бібліі» Скарыны.

Увогуле ж лексічныя чэхізмы ў Скарыны ўтвараюць значны пласт. Іх агульная колькасць, уключаючы вытворныя, складае каля 200 лексічных адзінак. Па сваёй ужывальнасці ў тэкстах яны не аднолькавыя. Адны лексемы, напрыклад назоўнікі *вымолва, выходъ, жадость, заграда, залога, запоменутие, комонство, кончина, мешець, поглавие, поражка, святокъ, смолва,* прыметнікі *днешний, жадостивый, ратолесный, смырковый, червеный,* дзеясловы *зазлити, запоменути, позоровати, попудити, светити,* дастаткова актыўныя і характэрны для некалькіх кніг. Другія, у прыватнасці *бегунъ, вдолие, врабець, вчерашекъ, вышивачъ, гадачъ, дивокий, звонець, лгарь, лихота, надобие, нестыдатый, нутити, планый, плытовъ, рерюха, рибникъ, рибница,* сустракаюцца толькі ў адной-дзвюх кнігах. Большасць жа, каля 70 % усіх адзначаных чэхізмаў, абмежаваны ва ўсіх 22 біблейскіх кнігах Скарыны толькі аднаразовай фіксацыяй. У сувязі з гэтым яны выглядаюць на фоне скарынінскай лексікі як чужыя, выпадковыя элементы, якія сведчаць толькі аб індывідуальнай манеры перакладчыка, а не аб сваім арганічным уліцці ў лексічную сістэму мовы перакладаў.

Зусім эпізадычнай з'явай аказалася большасць скарынінскіх чэхізмаў і ў адносінах да лексічнай сістэмы старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы. Можна катэгарычна сцвярджаць, што з усіх прыведзеных вышэй лексем толькі адзінкавыя зафіксаваны ў папярэдніх і сучасных Скарыне беларускіх пісьмовых помніках, напрыклад *заграда, рыбникъ, червеный.* Прычым яны характэрны пераважна для тых пісьмовых крыніц, якія былі непасрэдна перакладзены з чэшскіх арыгіналаў («Траянская гісторыя» пачатку XVI ст., «Песня песням» са зборніка № 558) або з выкарыстаннем чэшскіх рэдакцый («Пакуты Хрыста»), а таксама маглі адчуць на сабе ўплыў скарынінскай «Бібліі» (зборнік № 262).

Большая частка адлюстраваных у пражскіх выданнях Скарыны чэхізмаў не замацавалася і ў старабеларускай пісьменнасці пазнейшага часу і. такім чынам, не выйшла са сферы індывідуальнага ўжывання беларускага першадрукара. Толькі

лексемы *бегунъ, выкладачъ, горливый, днешний, зерцадло, кончина, наводъ, поражка, похиба, светити, сладце, хижка* сустракаюцца ў пазнейшых старабеларускіх помніках. Аднак можна меркаваць, што яны пашырыліся тут пад уплывам польскай мовы, а не пад непасрэдным уздзеяннем скарынінскіх кніг. Аб гэтым сведчыць перш за ўсё тое, што помнікі пісьменнасці, у якіх яны ўжываюцца, аддзяляюцца ад скарынінскага перыяду значным адрэзкам часу: амаль усе гэтыя помнікі датуюцца канцом XVI і XVII ст., калі асабліва ўзмацніўся ўплыў на старабеларускую мову з боку польскай пісьмовай мовы, якая, дарэчы, якраз у XVI ст. у найбольшай меры была насычана чэшскімі лексічнымі элементамі.

Такім чынам, эфемернасць прыведзенага чэшскага лексічнага матэрыялу ў скарынінскіх выданнях не выклікае сумнення. Іншую ацэнку неабходна даць выкарыстанай беларускім першадрукаром лексіцы польскага паходжання. Хоць у колькасных адносінах яна значна ўступае чэшскай лексіцы, амаль аб усіх польскіх лексемах можна меркаваць як аб лексічных адзінках, якія або ўжо да Скарыны ўжываліся ў беларускай літаратурна-пісьмовай мове на роўных правах з беларускімі словамі, або арганічна ўліліся ў яе ў пасляскарынінскі перыяд.

Сярод паланізмаў у пражскіх выданнях Скарыны самую вялікую групу складаюць назоўнікі рознай лексіка-семантычнай характарыстыкі: *драпежца* 'асоба, якая груба парушае парадак, робіць бясчынствы', *живелъ* 'стыхія', *збродень* 'злачынца', *здрада, кроликъ, листъ* 'пісьмовы дакумент', *моцъ, мужчизна, нерядъ* 'распуста', *панъ, подданый, родицъ, скарбъ, справца* 'распарадчык', *статокъ* 'маёмасць', *сукня* 'вопратка', *тканица* 'далікатная тканіна', *устава* 'пастанова', *цнота, яскиня* 'пячора' і інш. Некалькі слабейшым аказаўся польскі лексічны ўплыў на іншыя часціны мовы: *ачкольве* 'хоць', *восполокъ* 'сумесна', *жадинъ* 'ніхто', *збытний* 'лішні', *мглый* 'слабы', *обецати, певный, пильный, позычати, посполитый* 'агульны, просты', *розмаитый* 'розны', *уставичный* 'пастаянны', *устеклый* 'шалёны, раз'юшаны' і інш.

Польская мова з'явілася для Скарыны і крыніцай шэрага слоў заходнееўрапейскага паходжання, напрыклад лацінскіх *алоесъ* 'альяс', *ахатесъ* 'агат', *бериль, библия, докторъ, кгалбанъ* 'смала', *коруна, крата, кришталъ, лилия, лоика* 'логіка', *микгдалъ, мулъ, органъ, филозофия, филозофъ, цимбалы, ясписъ* 'яшма', *яцинктъ* 'гіяцынт', нямецкіх *балька, барва, боханъ, вага, гапликъ, гарфа, жолнеръ, лотръ* 'разбойнік', *мураль, муръ, павъ* 'паўлін', *панцеръ, рада, салитра, скиба, смакъ, спижа* 'прадукты харчавання', *танецъ, фарба, фикга, флястръ* 'пластыр', *фрунтъ, шкода, шнуръ* і інш.

Сустракаюцца ў мове Скарыны і словы, якія ў аднолькавай форме і значэнні ўласцівы польскай і чэшскай мовам: *власный, гарцовати, гвиздати* 'свістаць', *гостина* 'пір', *грошъ, дека* 'кіжал', *длугый, збыточный, коневъ* 'бідон', *кухаръ, лекатися* 'палохацца',

лечъ 'аднак', *мары* 'насілкі для нябожчыка', *местечко, место, мешкати* 'жыць, знаходзіцца', *мещанинъ, нехати* 'кідаць', *праца, прудкий* 'хуткі', *родина* 'сям'я', *рожа, смертельный, шлея* і інш. Частка з іх ужо ў пачатку XVI ст. ужывалася ў старабеларускай мове дзякуючы польскаму ўплыву. Аднак, мяркуючы па тым, што беларускі першадрукар пры апрацоўцы біблейскіх тэкстаў выкарыстоўваў чэшскія арыгіналы, можна лічыць большасць адзначаных запазычанняў у яго выданнях чэшскімі. Іх жа шырокае распаўсюджанне ў помніках старабеларускай пісьменнасці пазнейшага часу, безумоўна, трэба звязваць з польскім уздзеяннем.

Значную частку скарынінскай лексікі — каля 3000 слоў — складаюць уласныя назоўнікі і вытворныя ад іх лексічныя сродкі.

Сярод уласных назоўнікаў каля 1000 антрапонімаў і звыш 1000 тапонімаў. Большая частка антрапанімічнай лексікі — звыш 800 адзінак — гэта мужчынскія імёны: *Ааронъ, Барахъ, Валаамъ, Гавриилъ, Гирамъ, Давыдъ, Дарий, Елиазаръ, Ефремъ, Зевулонъ, Измаилъ, Иосифъ, Каинъ, Киръ, Лаванъ, Лука, Маркъ, Моисей, Никодимъ, Олофернъ, Пилатъ, Ромулъ, Саломонъ, Симеонъ, Тимофей, Урия, Феодосий, Хамъ, Цисъ, Яковъ* і інш. Менш шырока прадстаўлены жаночыя імёны: *Абра, Арара, Бозра, Воссора, Гера, Дельвора, Ева, Елисавефъ, Зареса, Зельфа, Идида, Козва, Лия, Мария, Михоля, Наама, Оливама, Рахиль, Сава, Семфора, Терса, Фамаръ, Хекура, Юдифъ, Яхиль* і інш.

У групе тапанімічнай лексікі налічваецца каля 800 назваў гарадоў і іншых населеных пунктаў: *Азоръ, Ахаронъ, Белонъ, Вавилонъ, Вифлеомъ, Гаваонъ, Дафаимъ, Езвонъ, Ерусалимъ, Зуза, Идерофъ, Кариатаримъ, Лахисъ, Ляванатъ, Мизоръ, Намай, Нефталимъ, Ормъ, Офиръ, Пальмирумъ, Рамесъ, Роовъ, Саниръ, Сидонъ, Тевисъ, Укукъ, Филистымъ, Хиршемесъ, Цедесъ, Ярамотъ* і інш. Прадстаўлены ў Скарыны і назвы краін: *Аравия, Асирия, Галилея, Египетъ, Ефиопия, Идумея, Израиль, Индия, Италия, Иудея, Каликия, Ливанъ, Ливия, Мезопотамия, Самария, Сирия, Халдея* і інш. Астатнія тапонімы належаць да назваў рэльефу — гор, далін, пустынь, узгоркаў, скал, пячор, асобных камянёў, слупоў, дрэў *(Аваримъ, Анги, Боемъ, Боозъ, Ваалермотъ, Ветарамъ, Гаилонъ, Гермонъ, Еваль, Есель, Золехъ, Кадисъ, Кармель, Маонъ, Неофъ, Оревъ, Оръ, Рафаимъ, Ремонъ, Саферъ, Синъ, Уразъ, Фаворъ, Хоревъ, Цинъ, Яримъ)*, рэк, азёр, крыніц, ручаёў, калодзежаў і іншых вадаёмаў *(Авана, Азанъ, Бетберъ, Весора, Геонъ, Дораксъ, Ефратъ, Иорданъ, Кисонъ, Масрефотъ, Роель, Тигръ, Фарфаръ, Цедронъ, Язонъ)*.

Невялікая група ўласных назоўнікаў выступае і ў ролі антрапонімаў, і ў ролі тапонімаў, напрыклад: *Авдонъ, Аранъ, Асеръ, Версавия, Галаадъ, Давиръ, Ептай, Каатъ, Моавъ, Оривъ, Реммонъ, Сеннаръ* і інш.

Звяртаюць на сябе ўвагу таксама групы ўласных назоўнікаў, якія абазначаюць імёны старажытных багоў, ідалаў *(Адра-*

мелехъ, Астарта, Ваалимъ, Вельфегоръ, Дагонъ, Ематъ, Маозимъ, Молохъ, Наамелехъ, Недрахъ, Приипъ, Саваофъ, Сохотвенотъ, Тартатъ, Хамосъ), назвы біблейскіх і свецкіх кніг *(Апокалипсисъ, Ваикра, Гесферъ, Еклезиястъ, Леувитъ, Махавеи, Неемия, Паралипоменонъ, Троия, Юдитъ)* і інш.

Няма патрэбы спыняцца на гэтым тыпе лексікі больш падрабязна, бо амаль уся яна характарызуе далёкае ад рэчаіснасці XVI ст. мінулае, звычайна прысутнічае ў кожным біблейскім выданні і ў адносінах да скарынінскага слоўніка займае нейтральнае становішча.

Гэта ж неабходна сказать і аб большасці прыметнікаў, утвораных на базе ўласных назоўнікаў. У колькасных адносінах вытворныя ад антрапонімаў і тапонімаў прыметнікі складаюць значную лексічную групу — каля 900 адзінак. Унутры гэтай групы яны распадаюцца на дзве нераўназначныя па велічыні падгрупы — прыналежныя і адносныя.

Прыналежныя прыметнікі, якіх у выданнях Скарыны каля 600, паходзяць, як правіла, ад антрапонімаў, прычым пераважная большасць іх утворана ад мужчынскіх імён пры дапамозе суфікса *-овъ/-евъ: Аароновъ, Асеровъ, Ваалевъ, Вениаминовъ, Гедеоновъ, Гирамовъ, Давыдовъ, Дариевъ, Елиазаровъ, Ешколевъ, Завдиевъ, Зуфовъ, Исааковъ, Каатовъ, Лотовъ, Манасиевъ, Ноевъ, Олоферновъ, Путифаровъ, Рехавовъ, Рувимовъ, Саломоновъ, Семионовъ, Теодозиевъ, Уриевъ, Фарановъ, Хамовъ, Цисовъ, Яванов, Яковлевъ* і інш. Невялікая колькасць прыналежных прыметнікаў утворана ад жаночых імён, а таксама мужчынскіх імён на *-а/-я* пры дапамозе суфікса *-инъ: Агефинъ, Ваасинъ, Гелиинъ, Езавелинъ, Замвриинъ, Илиинъ, Исаинъ, Лиинъ, Мерариинъ, Нафаниинъ, Озиинъ, Ревечинъ, Сезаринъ, Тафнинъ, Фарниинъ, Хетуринъ, Явинъ* і інш. У сувязі з некаторай марфалагічнай неўсталяванасцю асобныя прыметнікі гэтага тыпу, утвораныя ад мужчынскіх імён на *-а/-я*, характарызуюцца двайнымі паказчыкамі: *Гельхиинъ — Гельхиевъ, Енафинъ — Енафовъ, Еремиинъ — Еремиевъ, Ефонинъ — Ефоновъ, Заринъ — Заровъ, Иоасинъ — Иоасовъ, Иудинъ — Иудовъ, Манасиинъ — Манасиевъ, Уриинъ — Уриевъ.*

Нарэшце, невялікая група прыналежных прыметнікаў, утвораных ад уласных назоўнікаў, мае словаўтваральныя фарманты *-ль(-лий), -нь(-ний): Аммоний, Анань, Васаний, Велиамль, Дагонъ, Ефремлий, Зевулоний, Исавлий, Нефталимль, Рафаимлий, Семионий, Яковль* і інш.

Прыкладна трэцюю частку вытворных прыметнікаў ад уласных назоўнікаў складаюць адносныя. Яны, як правіла, адтапанімічнага паходжання. Большасць адносных прыметнікаў узнікла на базе назваў населеных пунктаў пры дапамозе суфікса *-ск-: акаронский, аскалонский, вавилонский, вифлеомский, галгалский, гоморский, дамаский, ерусалимский, завулонский, идолямский, кармельский, левнийский, мерарский, неоманский, оррейский,*

празский, римский, сидонский, содомский, тирскій, урийский, фаворский, филистымский, хевронский, ценерофский, явисский і інш. Менш шырока прадстаўлены адносныя прыметнікі ад назваў краін і народаў *(асирский, греческий, еврейский, египетский, идумейский, индийский, латинский, мезопотамский, палестынский, перский, руский, сирский, халдейский)*, назваў рэк і мораў *(ефратейский, иорданский, понтский)* і г. д.

Аб значных патэнцыяльных магчымасцях анамастычнай лексікі сведчыць яе здольнасць утвараць назоўнікі, якія з'яўляюцца назвамі жыхароў па краінах і гарадах. Сярод 87 лексем такога тыпу большасць складаюць назоўнікі мужчынскага роду на *-анинъ (-енинъ, -янинъ): азотянинъ, амалехитянинъ, аравленинъ, асирянинъ, вавилонянинъ, вузитянинъ, гаваонитянинъ, гергесеанинъ, египтянинъ, ерусалимлянинъ, зифеанинъ, идумеанинъ, измаильтянинъ, кенезеанинъ, лецядимонянинъ, макидонянинъ, моавлянинъ, одоламитянинъ, римлянинъ, самарианинъ, сирянинъ, тирянинъ, филистымлянинъ, хореанинъ, цинеанинъ* і інш. Зрэдку выкарыстоўваюцца Скарынам назоўнікі без гэтага суфікса *(ергисей, хеттей)*, а некаторыя лексемы ўжываюцца ў двух варыянтах: *амореанинъ — аморей, еввеанинъ — еувей, евреанинъ — еврей, евузеанинъ — евузей, иудеанинъ — иудей, ферезеанинъ — ферезей, халдеанинъ — халдей, хананеанинъ — хананей.* Толькі асобныя лексічныя адзінкі абазначаюць асоб жаночага полу, выступаючы з суфіксамі *-анк(а), -инк(а), -янк(а): евреанка, египтянка, моавлянка, мурининка, хананеанка.* Па сваёй семантычнай характарыстыцы гэтая група назоўнікаў набліжаецца да апелятыўнай лексікі.

Акрамя ўласна лексічных сродкаў, якія нясуць у Скарыны неабходную семантычную нагрузку і выконваюць актыўную функцыянальную ролю, прыкметнае месца ў яго выданнях займаюць разнастайныя іншамоўныя ўкрапленні — як асобныя словы, так і цэлыя выразы. Знаходзячыся за межамі лексічных сістэм і старабеларускай, і царкоўнаславянскай моў, яны ўжыты беларускім першадрукаром у пэўных стылістычных мэтах і сведчаць аб яго свядомым імкненні пазнаёміць чытача з элементамі чужых моў, распаўсюдзіць свае веды на больш шырокае кола асоб.

Было б памылкай лічыць, што Скарына з'явіўся першаадкрывальнікам ва ўвядзенні ў пісьменнасць гэтага стылістычнага прыёму выражэння думак. Ужо да яго, у канцы XV ст., у старабеларускіх перакладных творах былі вядомы выпадкі выкарыстання іншамоўных украпленняў, напрыклад: тогды на его экъсеквие албо слоужбу тисяць тисячеи ангелов пели хваления («Пакуты Хрыста»): соут оу них домы опришне их же тамо алхам зовуть («Аповесць аб трох каралях-валхвах»). Заслугу беларускага першадрукара трэба бачыць перш за ўсё ў тым, што ён надышоў да гэтай справы творча. У яго выданнях, асабліва ў арыгінальных прадмовах і пасляслоўях да біблейскіх кніг, іншa-

родныя ўкрапленні атрымалі важкую пазнавальную нагрузку, сведчачы аб высокім адукацыйным узроўні выдаўца. Узорам могуць служыць наступныя цытаты са скарынінскіх твораў: книги пятыи моисеовы зовемыи от евреи гельгадворимъ, по греческии девторономосъ, по латине секунда лексъ, а по рускии вторыи законъ (ДЗ, 1); третии же книги царя Саломоновы нарицаються Сира сиримъ, по латине Кантикумъ кантыкорумъ, еже по рускыи исказуется Песнь песнямъ (ЕК, 1б); словы латинскими езусъ назоренусъ рексъ юдеорум, по руски ся сказует Ісусъ Назорянинъ царь іюдеискии (ІН, 4б); то естъ конець первыхъ книгъ Моисеовыхъ еже от евреи называются Брешисъ, по греческии же и по латине именуются Енезеосъ, а по руски Бытья (КБ, 94); месеца перъваго иже словеть по евреискии Нисанъ, то естъ Апрель (КЕ, 8); может ся называти латинскимъ языкомъ Либеръ Оферториусъ, еже по руски сказуется Книга о жертвахъ (КЛ, 2б); доконаны суть четвертыи книги Моисеевы рекомые от евреи Ваидаберъ, по гречески Аритми по латине Нумери, а по рускии Числа (ЛК, 74); Притчи же нарицаются евреискымъ языкомъ Масшлофъ, а греческымъ Параболе, по латине же Провербия, а по рускыи Притчи или Присловия (ПС, 2б); книги двунадесяти пророковъ, иже от евреи Фареасра называются (ПЦ, 3б); книги сии называются евреиским языком Маляхимъ, а по рускыи словуть Третии Царствъ (ТЦ, 119б) і інш.

Як сведчаць прыведзеныя прыклады, іншамоўныя ўкрапленні ў большасці выпадкаў лёгка выяўляюцца ў помніках пісьменнасці дзякуючы спецыяльнаму слоўнаму акружэнню. Іх іншароднасць відавочная хоць бы таму, што такія словы або выразы суправаджаюцца звычайна перакладам на беларускую мову або апісальнымі тлумачэннямі. Разам з тым пры іх у большасці выпадкаў ёсць указанне на мову, адкуль дадзенае слова ці выраз узяты: *по грецку, по еврейску, по египетску, по латинску* і г. д. Акрамя таго, на іншамоўны характар лексічных элементаў такога тыпу выразна ўказваюць як іх семантычная маладаступнасць, так і адсутнасць беларускіх марфалагічных рыс у сінтаксічным дапасаванні з кантэкстам.

Неабходна таксама адзначыць, што некаторыя іншамоўныя ўкрапленні ў скарынінскіх тэкстах у выніку шматразовага ўжывання пазней былі асвоены на беларускай глебе, наблізіўшыся да звычайных запазычанняў. Наглядным прыкладам такога асваення варта лічыць лексему *адаръ,* вядомую ў Скарыны на правах украплення: тогда вынялъся ест месець дванадесятый зовемый у евреи адаръ еже естъ мартъ (КЕ, 8). Ужыванне гэтага слова ў помніках XVII ст. ужо без суправаджальнага беларускага семантычнага эквіваленту сведчыць аб тым, што яно к гэтаму часу стала ўжо даступным шырокаму колу чытачоў: минула зима и холоднии дни, а надшол месяць адар («Хроніка» М. Бельскага); уставили празник для тринадцатаго адара по всемъ свете обьходить (Зборнік павучанняў сярэдзіны XVII ст. № 82) і інш.

Падобным чынам было асвоена і слова *алефъ,* ужытае ўпершыню беларускім першадрукаром у якасці іншамоўнага ўкраплення: первое слово называется алефъ, еже по рускии сказуеться наука (ПЕ, 2б). Ілюстрацыі з пісьменнасці XVII ст. даюць падставу лічыць, што беларускімі кніжнікамі гэтага часу яно ўспрымалася ўжо калі не як шырокаўжывальнае, то па меншай меры як зразумелае слова са значэннем 'першая літара яўрэйскага алфавіта': Алеосъ: чрез алефъ, Долготръпелив, Верен видецъ людий, жесток («Лексікон» П. Бярынды); тыи першии осмъ вершовъ починаются от литеры Алефъ («Выклад тлумачэнняў біблейскіх кніг сярэдзіны XVII ст.»). Паступова далучыліся да лексічных сродкаў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы ў пазнейшы час і скарынінскія ўкрапленні *апокалипсисъ, еклезиястъ, провербия* і інш.

Характарызуючы ў цэлым слоўнікавы склад пражскіх выданняў Ф. Скарыны, можна з упэўненасцю гаварыць як аб яго аб'ёмнасці, так і аб семантычнай разнастайнасці. Аб'ядноўваючы 10516 розных па паходжанню апелятываў, у тым ліку 5058 дзеясловаў (уключаючы сюды 1293 дзеепрыметнікі), 3329 назоўнікаў, 1169 прыметнікаў, 670 прыслоўяў, 290 лічэбнікаў, займеннікаў і службовых слоў, а таксама маючы каля 3000 анамастычных адзінак, скарынінская лексіка з'яўлялася дастатковай базай для перадачы без асаблівай кніжнай мудрагелістасці самых тонкіх сэнсавых адценняў біблейскіх тэкстаў. У такім падборы лексічнага матэрыялу ва ўсёй паўнаце раскрыўся перакладчыцкі талент і шырокі філалагічны дыяпазон пачынальніка беларускага кнігадрукавання, выявіўся яго намер як мага лепш ажыццявіць прагрэсіўную для таго часу мэту — набліжанымі для народнага разумення сродкамі зрабіць тэкст «Бібліі» даступным простаму чытачу. Мяркуючы па ўдаламу спалучэнню ў перакладах лексічных элементаў розных моўных стыхій, арганічнаму ўпляценню ў традыцыйную кніжную канву многіх слоў роднай мовы, спробу Скарыны дэмакратызаваць лексіку царкоўнаславянскіх твораў можна лічыць у пераважнай большасці выпадкаў плённай.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Большасць апублікаваных у мінулым навуковых прац аб мове перакладных выданняў Скарыны была прысвечана выяўленню разнастайных беларускіх моўных рыс у кнігах беларускага першадрукара. Напластаванні ж іншых моўных стыхій і іх удзельная вага ў агульнай сістэме скарынінскай мовы заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў.

У гэтым даследаванні ўпершыню за час скарыназнаўства зроблена спроба выявіць і паказаць суадносіны разнамоўных марфалагічных і лексічных стыхій у мове перакладных выданняў Скарыны. Праведзенае вывучэнне з гэтага пункту погляду яшчэ раз пацвердзіла заключэнне буйнейшага гісторыка беларускай мовы 20-х гадоў нашага стагоддзя Я. Воўка-Левановіча, што ў выданнях Скарыны «ў большасці царкоўнаславянская мова з моцным элементам жывой беларускай мовы і са слядамі літаратурнага ўплыву чэшскай і польскай моў» [21, с. 263].

Гэтым заключэннем, аднак, не вычэрпваецца кола пытанняў, звязаных з вывучэннем мовы Скарыны. Яшчэ А. І. Сабалеўскі ў рэцэнзіі на даследаванне П. У. Уладзіміра ва «Доктор Франциск Скорина. Его переводы, печатные издания и язык» пісаў, што Уладзіміраў для правільнай ацэнкі мовы Скарыны павінен быў азнаёміцца з асаблівасцямі мовы як мага большай колькасці паўднёва- і заходнерускіх рукапісаў XV — XVI стст., а не абмяжоўвацца некалькімі кароткімі заўвагамі адносна літаратурнай мовы перадскарынінскай і скарынінскай эпохі [50, с. 324].

Гэта зусім слушная заўвага буйнейшага гісторыка рускай мовы канца XIX ст. захоўвае сваю актуальнасць і ў наш час, бо яшчэ і цяпер многія даследчыкі характарызуюць мову Скарыны без супастаўлення яе з мовай іншых тагачасных канфесіянальных помнікаў. Між тым ужо даўно адзначаецца, што ізаляванае вывучэнне моўных фактаў прыводзіць да непазбежных памылак, ставіць моваведа ў бязвыхаднае становішча. Зусім зразумела, што супастаўляльнае вывучэнне мовы Скарыны апраўдана і яго мэтазгодна праводзіць шляхам параўнання з моўнымі сродкамі той жа самай жанрава-стылявой разнавіднасці старабеларускай пісьменнасці, да якой адносяцца выданні Скарыны,— у першую чаргу з біблейскімі тэкстамі і блізкім да іх іншымі творамі канфесіянальнай літаратуры.

Аднак вывучэнне мовы Скарыны ў плане супастаўлення з іншымі тагачаснымі рэлігійнымі тэкстамі сутыкаецца з пэўнымі цяжкасцямі. Па-першае, да нашага часу дайшло вельмі мала рэлігійных помнікаў эпохі Скарыны, каб на падставе іх можна было атрымаць адносна поўнае і дакладнае ўяўленне аб агульнай эвалюцыі мовы беларускай рэлігійнай літаратуры той эпохі. Па-другое, мова нават гэтых нешматлікіх канфесіянальных твораў даскарынінскай і скарынінскай эпохі ў беларускім гістарычным мовазнаўстве спецыяльна пакуль не вывучалася, таму ў сучасны момант у асобных выпадках прыходзіцца абмяжоўвацца толькі параўнаннем урыўкаў. Па-трэцяе (і гэта самае галоўнае), граматычны лад і слоўнікавы састаў старабеларускай і царкоўнаславянскай моў характарызуецца выключнай блізкасцю. Гэта знаходзіць сваё тлумачэнне не толькі ў генетычнай роднасці адзначаных моў, але і ў актыўным узаемадзеянні іх у часы Скарыны, калі ў пісьменнасці на беларускай мове элементы царкоўнаславянскай мовы былі яшчэ адчувальнай састаўной часткай, а ў тэксты на царкоўнаславянскай мове ў сваю чаргу пранікалі рысы беларускай мовы, што ў канчатковым выніку прывяло да ўзнікнення беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы.

У агульным працэсе гісторыі канфесіянальнай мовы на Беларусі вызначаюцца два этапы. На першых парах праявілася імкненне збліжаць з беларускай народнай мовай рэлігійныя некананічныя агіяграфічныя і апакрыфічныя творы. Тыповым узорам гэтага роду тэндэнцый з'явіўся пераклад на беларускую мову ў канцы XV ст. з польскіх крыніц апокрыфаў «Пакуты Хрыста» і «Аповесць аб трох каралях-валхвах» і агіяграфічнага твора «Жыціе Аляксея». У гэтых перакладах сляды царкоўнаславянскай мовы зусім нязначныя.

Аналагічныя творы праваслаўнай традыцыі таксама насычаліся беларускімі рысамі ў такой меры, што мова іх значна аддалялася ад традыцыйнай царкоўнаславянскай мовы ўсходнеславянскай рэдакцыі. Тыповым узорам гэтага роду пісьменнасці служыць вядомая «Чэцця» 1489 г., перапісчык якой, паповіч Бярозка з Навагрудка, кажучы словамі А. І. Сабалеўскага, як быццам прыклаў усе намаганні, каб наблізіць мову царкоўнаславянскіх тэкстаў да мясцовай заходнерускай [51, с. 60]. На жаль, гэты вялікі па аб'ёму і цікавы па зместу і мове помнік пакуль застаецца нявывучаным. Мова тут у асноўным царкоўнаславянская беларускай рэдакцыі, але некаторыя часткі можна лічыць сапраўднымі перакладамі на тагачасную беларускую літаратурна-пісьмовую мову. Паколькі ўвесь помнік перапісаны адной асобай, то разнамоўнасць яго тэкстаў можна тлумачыць тым, што аўтар выкарыстаў пратографы рознага паходжання. Гэта ў сваю чаргу дае падставу меркаваць, што збліжэнне мовы падобных твораў з жывой беларускай мовай ажыццяўлялася значна раней, чым час з'яўлення самой «Чэцці».

Вось невялічкі ўрывак з гэтага помніка (л. 49—50):

Еще вам братꙗ скажемъ о попѣ ѡдномъ. в манастыри на светом йерданѣ. въ ѡдинъ дн҃ь виделъ дей ѐсми женоу чистоу и свѧтꙋ. ѻ҆бразом пречстымъ. багрѧнꙋю ризꙋ имѣла на собѣ. и ѡбаполъ ѐе стоꙗть два честна моужа освещенными ѿбразы и҆ врозꙋмѣлъ есми. што ж госпожа влдчца наша бц҃а. а тых мꙋжов познахъ ст҃го їан҃а крстителꙗ. и ст҃го ивана бг҃ослова иеванг҃листа. и҆ выбеглъ есми грѣшныи к ней. и҆ начах молитисѧ ее ст҃ои млсти. што бы оустꙋпила въ домъ мой. сотворила блгсвние. и она не похотѣла. и҆ былъ есми великии час молꙗсѧ. а рекоучи. што бых оспоже не пошол безъ твоег блгсвниꙗ. и ѡна ми ꙗсно ѡтвечала рекоучи. какъ ты хочешь абыхъ была в домоу твоем. а ты держишь оу клети своеи ворога моего. и какъ рекла ми тое слово. так не оувиделъ есми ее ст҃ое млсти, ни ст҃ых апсловъ и почал есми скорбѣти и тꙋжити. и плакатисѧ горко. а мыслꙗ собѣ самъ. ачей боудꙋ што помысломъ моимъ изгрешилъ. заноуж нѣтъ ничого иного въ клети моей. только ꙗ ѡдинъ. и мъногажды смотрѣх в себе и не нашолъ есми ворога въ клети моей. и был есмї оу великои печали. и в горких слезахъ. и взѧлъ есми книги прочести. што бых сѧ а тымъ потѣшилъ и прочол есми всю книгоу. и на конци книги нашолъ есми двѣ слове написаны ѡканного несторьꙗ зловѣръного. што хоулили ст҃оую бц҃ю. и в тот час врозꙋмѣлъ есми. што ж сии двѣ слове проклꙗтого несторьꙗ ворога влдчце нашее бц҃е присно҃двы мр҃ии. мт҃ре бж҃ьи. и в тотъ час поскочилъ есми к томоу. хто ми былъ далъ тыи книги на подержанье. и рекох емоу. возми свои книги брате. не стало ми помочи ѡт них. только ми бедꙋ и погибель твои книги вчинили. и онъ мѧ почалъ пытати. какоую тобѣ бедꙋ мои книги вчинили. и ꙗ емоу споведалъ. што в неи двѣ слове написаны оканног несторьꙗ. за то пречстаꙗ не бл҃гсвила домꙋ моег. ѡнъ ж честныи моуж разжеглъсѧ гневом великимъ ѡ тыи двѣ слове злого пса вонючего несторіꙗ и вырезавъ ис книги въкиноулъ на огонь. а рекꙋчи. не будь ни в хоромине моеи ворогъ ѡспожи пречистое. и так несторьева ересь згорѣла. а дьꙗвольскаꙗ лесть и сила погибла.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што гэты ўрывак напісаны на тыповай беларускай літаратурна-пісьмовай мове канца XV ст., калі яшчэ царкоўнаславянскі струмень быў у ёй даволі адчувальным.

У гэты ж час пачалі з'яўляцца і непасрэдныя пераклады на беларускую мову асобных біблейскіх кніг. З вядомых у сучасны момант такіх перакладаў самым раннім лічыцца тэкст «Песні песень», які змяшчаецца ў зборніку № 558 быўшай Сінадальнай бібліятэкі. Да гэтага помніка блізкімі па часе з'яўляюцца тэксты ў «Бібліі» Ф. Скарыны, зборніку № 262 Цэнтральнай бібліятэкі АН Літоўскай ССР і ў «Астрожскай бібліі». Некаторыя з гэтых тэкстаў узыходзяць да чэшскай Бібліі. Уяўленне аб іх

моўных асаблівасцях даюць наступныя ўрыўкі з кнігі «Руф» (II, 5—9).

Чэшская Біблія 1506 г.:

Tehdy rzekl gest Booz mládenczy tomu kterýž stál za ženczy. Czye ge to mladicze: gemuž to on odpowiedie. To tie ta Moabitská kteráž przyssla s Noemi z zemie Moab: a prosyla mne aby zbijerala klasy kteréž padagij po ženczyech: a trwá tu na poli od gijtra až dosawad: aniž ge kam chodila. Tehdy rzekl Booz k Ruth: Slyssijss li dczero: ne chodiž ginã sbierat klasuow. aniž chod s tohoto pole ale bud s dewkami mými: a kdežt' ony budú žyeti tu zbijeray po nich: nebt' gsem przykázal služebnijkuom mým: at' by žádný ne překážel. bude lit' se chtijeti pijti gdi k lahwiczyem: a napij se wody. kterúž pigij ženczy mogi.

«Астрожская біблія»:

И̂ рече воо̂зъ о̂трокꙋ своѐмꙋ стоа́щемꙋ за жа́тели кто ѐсть ôтрокови́ца т̂а. И̂ ѡтвѣща̀ ѐмꙋ моа́витини ес, пришедшаѧ с ноѐмъми́ною, ѡт села моа́влѧ. И̂ рече ми да съберꙋ вˢ сно́пы̀ по слѣдꙋ жнꙋщихъ. и̂ ꙗ̂ко прїи́де и̂ ста̀ ѡт о̂у́тра и̂ до́ ве[че]ра, и̂ не почива̀ на ни́вѣ ни ма́ла. И̂ рече воо̂зъ къ рꙋѳи, слы́ши дˢщѝ. не ходи събира́ти на и̂нꙋ, и̂ не ѡтходи́ши ѡтсю́дꙋ, н̂о здѣ̀ приста́ни къ ôтрокови́цамъ мои́мъ. И̂ ôчи твои̂ да бꙋдета̀ на ни́вѣ и̂дѣже жнꙋтъ, и̂ да хо́диши въ слѣд и̂хъ. и̂ с̂е заповѣ́даю о̂троком мои́мъ не присѧщи к тебѣ̀, и̂ ѐгда̀ въжада́еши да и̂де́ши къ сосꙋдомъ. и̂ пїеши ѡтнꙋдꙋже че́рпают жа́тели

«Біблія» Ф. Скарыны:

И̂ рече паки Воо̂зъ ко ѡтроку стоѧщему за женˢци г̃лѧ чиѧ то ѐстъ младица. ѡтвеща ѡтрокъ то ѐстъ таѧ Моа̀влѧнˢка ѐже пришла с ноѐмою и̂зˢ земли Моа́вˢское́, и̂ просила менѣ а̂быхъ ѐи̂ дозволилˢ сбирати класы падаю́щие о̂после женˢцевˢ и̂ пребываѐть тꙋ на поли ѡт ꙋтра даже доселе и̂ нигде не ѡтходила. Тогда рече Воо̂зъ к руѳе слыши ты дˢщеро не ходи жъ и̂нˢде збирати класовъ, и̂ не ѡтходи с полѧ сего но буди с девками мои̂ми, и̂ и̂где о̂ни жати будуть тꙋ сбирай после нихъ. Понеже ѐсми приказалˢ о̂трокомъ мои̂мъ а̀бы ни ѐдинъ не перекажалъ тобѣ. Захощеть ли ти сѧ пакъ пити то да и̂деши кˢ сосудомˢ и̂ напии̂сѧ воды ю̀же пию̀ть женци мои̂.

Зборнік № 262:

и̂ реклъ боа̀зъ детине што стои̂ть над женьци чиѧ молодица се. и̂ ѡтказал детина тот што стоѧлъ над женци и̂ реклъ молодица маа̀витѧ́нка ѡна котораѧ жь вернꙋласѧ съ наа̀миею ѡт поль моа́вˢских. и̂ рекла зˢберꙋ вˢже и̂ попрѧчꙋ съ сноповъ после женцовъ и̂ пришла и стоѧ́ла ѡт заоутреѧ досюль седенїа ее въ дворѣ мало. и̂ реклъ боа̀зъ рꙋте чи не слышишь до́чко не ходї збирати въ поле иное ани перестꙋпаи ѡтсюль и̂ тꙋтъ прилеписѧ з дѣвˢками моими. ѡ̀чи твои в поли иж жнꙋть и̂ пои̂дешь за ними ведь же вказалъ ѐсми молоденьцомъ а̀бы сѧ не дотыкати

тебе и̂ пожадаѐшь и̂ пойдешь къ сꙋдомъ и̂ бꙋдешь пити ѡттꙋль и̂же пьють молодици.

Кнігі «Руф», на жаль, няма ў зборніку № 558, таму мэтазгодна прывесці ўрывак з кнігі «Песня песень», якая ёсць у гэтым зборніку і ў іншых тагачасных крыніцах (II, 8—13).

Чэшская Біблія 1506 г.:

Hlas milého mého. Ay tento berze se skacze po horách. przeskakuge pahrbky. podobný muoy milý k srnie a k kolúchowi gelenijemu. Ay on tot stogij za stienú nassij. hledie skrze okno, wyhledage skrze mrzyeže. Ay milý muoy mluwij ke mnije. wstañ a pospiess przyetelkynije ma holubiczko má. krasna má a pod: nebo gižt ge zyma pominula, przyewal pominul a odssel, kwietije okazalo se w zemi nassye, czas obrzezowanije winnicz przyssel ge hlas hrdliczky slyssan gt' w zemi nassye. Fijk wydal prwnije owocze swee. Winnicze rozkwetlee wuoni wydali gsú.

«Астрожская біблія»:

Гла́съ бра́та моѐго, сѐ та́ко прїиде скача̀ на́ горы и̂ прескача̀ на хлъмы. подо́бенъ ѐсть братъ мои сернѣ̀, и̂ли мла́дꙋ ѐлени на гора́хъ веѳи́льских. сѐ сїи стоѧше за стѣно́ю на́шею, преглѧда́ѧ ѻ̆ко́нцемъ проглѧда́ѧи сквозе мре́жꙋ. ѡтвѣща́етъ бра́тˢ мои и̂ г҃леть мнѣ, въста́ни и̂ прїиди̇̀ ближнѧѧ моѧ до́браѧ моѧ голꙋби́це моѧ. ꙗ̆ко с̂е зима̀ пре́иде, до́ждъ ѡти́де и̂ прои́де въ себѣ. цвѣти ꙗви́шасѧ на земли̇̀, времѧ ѡтрѣзанїѧ приспѣ. гла́съ го́рлицы слы́шанъ въ земли̇̀ на́шеи, смо́квы и̂знесе цвѣтъ свои. виногра́ди зрѣюще даша во́ню.

Зборнік № 558:

Голос милого моег а̂и тот то ес пришолъ скачючи по горах а̂ перескакиваючи погорки и̂ холмы, подобны ес милыи мои серне а ланѧти еленемꙋ. Аи ѡн то стоит за стѣною н҃шею. смотрѧчи сквозе ѡкна а преглѧдаючи черес боронки. а̀ милыи мои мовил ко мнѣ въстан поспешис прїетелко моѧ милаѧ голубичко моѧ краснаѧ. а̂ поиди бо оуже ѕима поминоула превалъ лютости ѡтшол и̂ ѡтстꙋпил. квѣтіе оуказалос оу̀ нашои земли час обрезыванїа винˢниць оужо ес пришелъ. голос горъличинъ слышан ес вь земли нашои. ѳиник выдал ес первые ѡвощи свои. винˢници квитꙋчи дали сꙋть винˢность свою.

«Біблія» Ф. Скарыны:

Гласъ любого моѐго, се ѻ̆нъ и̂деть скачущи по горах и̂ прѣскакую̀ще холˢми. Подобный ѐстъ любый мои̇̀ къ серˢне и̂ къ младому ѐленеви. Се той стои̇ть за стеною̀ нашею̀, смотрить про ѻ̆кно выгледаѐть скрозе крату, се любый мои̇̀ глаголѣть ко мнѣ... Въстани и̂ поспеши прїателˢко моѧ голубицѣ моѧ краснаѧ моѧ и̂ пои̇ди. Вже бо зима проминула, дожˢдь велий минулˢ и ѡтшолˢ ест. Цветы ꙗ̆вишасѧ в земли нашей. Часъ ѻ̆брезываниѧ виноградовъ пристиглъ ѐстъ. Гласъ горˢличий слышанˢ ест въ земли̇̀ нашей, смокˢвѧ и̂спустила перˢвые ѻ̆воще своѐ. Ӑ винˢнице цвитущиѐ выдали запахъ свои̇̀.

Зборнік № 262:

Голосъ любовни́ка моêгò â се пришелъ скачеть на горы перескак8еть на холмы. подобенъ милостникъ мои ѡ̀леню â лю́бо козел҄чик8 сернѧчом8 ѡ̂во сеи стоить за стѣною нашею перезираѐть з аконъ заглѧд8еть з щѣлинъ. ѡтвѣчалъ милостникъ мо́и и реклъ мнѣ въстань собѣ подр8го моѧ краснице моѧ пойди собѣ. и̇же â се зима прошла â до́ждь ѡтмѣнилъсѧ и̂ пошолъ собѣ. цвѣты оуказалисѧ по земли̇ â часъ жатвы приспѣлъ â гласъ горлици слышан въ земли̇ нашо́и. смоква созрѣла въ сырости своеи̂ â розинкы бозкосточныи дали запах свои.

Параўнанне прыведзеных урыўкаў з беларускіх крыніц паказвае поўную незалежнасць іх тэкстаў. Апошнімі даследаваннямі А. А. Аляксеева ўстаноўлена, што тэксты зборніка № 558 і «Бібліі» Скарыны ўзыходзяць да чэшскіх крыніц, якія не звязаны з кірыла-мяфодзіеўскай пісьмовай традыцыяй і вытокам якіх была лацінская Вульгата. Арыгіналам для перакладу ў зборніку № 558 паслужыла чэшская Падэраўская біблія 1433 г., якая была пакладзена ў аснову 3-й рэдакцыі чэшскай Бібліі. Ад чэшскай Бібліі залежыць і пераклад Скарыны. Кніга «Песня песень» «Астрожскай бібліі» ўяўляе сабой засваенне шматвяковай славяна-грэчаскай праваслаўнай традыцыі, але сляды чэшскага ўздзеяння, мабыць, праз выданне Скарыны адчуваюцца зрэдку і тут. Затое зусім іншае паходжанне мае тэкст зборніка № 262. У аснове яго ляжыць старажытнарускі пераклад Кіеўскай эпохі са старажытнаяўрэйскага арыгінала масарэцкай традыцыі.

Прыведзеныя ўрыўкі паказваюць, што найбольш блізкімі да тагачаснай беларускай народнай мовы з'яўляюцца тэксты зборнікаў № 262 і 558. Скарынінскія тэксты займаюць як бы прамежкавае становішча паміж імі і «Астрожскай бібліяй». Аднак для больш дакладнага вызначэння асаблівасцей мовы Скарыны на фоне аднажанравай тагачаснай літаратуры неабходна выпрацаваць нейкія аб'ектыўныя крытэрыі.

Для вывучэння асаблівасцей пісьмовай спадчыны розных гістарычных эпох выкарыстоўваюцца і розныя методыкі вызначэння адрозненняў паміж блізкароднаснымі пісьмовымі мовамі. Так, для старажытнарускай эпохі, калі старажытнаруская і царкоўнаславянская мовы былі вельмі блізкімі ў граматычных адносінах, дыферэнцыяльнымі прыкметамі гэтых моў прызнаюцца галоўным чынам адрозненні ў сінтаксісе і лексічнай семантыцы. Аднак у скарынінскую эпоху жывая мова беларускай народнасці ўжо значна аддалілася ад царкоўнаславянскай і ў галіне граматычнага ладу, і таму для гэтай эпохі вельмі паказальнымі з'яўляюцца і марфалагічныя адрозненні.

У гісторыі вывучэння моў агульнапрынята перакананне, што ступень роднасці моў вызначаецца не пэўнай колькасцю падобных слоў, а ў першую чаргу тоеснасцю ці падабенствам граматычнага ладу. З гэтага пункту погляду для вызначэння адрозненняў паміж рознымі помнікамі з рознай ступенню насычанасці беларус-

кімі і царкоўнаславянскімі рысамі неабходна ўзяць пад увагу, у якіх звеннях граматычнага ладу і слоўнікавага саставу царкоўнаславянская мова найбольш прыкметна проціпастаўляецца тагачаснай беларускай літаратурна-пісьмовай мове. Супастаўленне гэтых моў дазваляе выдзеліць асноўны комплекс такіх дыферэнцыяльных прыкмет.

1. У галіне лексікі найбольш яркім паказчыкам адрознення царкоўнаславянскай мовы ад беларускай служаць суадносіны няпоўнагалосных і поўнагалосных форм тыпу *глава, градъ, злато* і *голова, городъ, золото*. Колькасць такіх карэлятаў даволі вялікая ў кожным помніку, і таму нават па аднаму гэтаму паказчыку можна адносна беспамылкова зрабіць заключэнне аб моўнай аснове тэксту. Напрыклад, у чатырох кнігах «Царствы» Скарыны ўжыты 2434 няпоўнагалосныя формы і толькі 90 поўнагалосных, што складае адпаведна 96,4 і 3,6 %. Толькі ў няпоўнагалоснай форме (у розных склонах) назоўнік *градъ* тут ужыты 316 разоў, *глава* — 186, *страна* — 72, *врагъ* — 69, *злато* —49, *гласъ* — 39, *гладъ* — 16, *прахъ* — 15, прыметнікі *златый* — 31, *драгий* — *15, младый* — 12. Беларускіх поўнагалосных адпаведнікаў гэтым словам у кнігах «Царствы» няма зусім. У некаторых помніках пасляскарынінскага часу словы гэтага тыпу трапляюцца ў польскай агаласоўцы: *злото, оброна, прожне, сромота, строжа, уздровити*. Такія словы апраўдана разглядаць як лексічныя паланізмы, і таму яны не ўлічваюцца пры вызначэнні суадносін царкоўнаславянскіх і беларускіх лексічных сродкаў у тым ці іншым тэксце.

2. У галіне словаўтварэння яркім паказчыкам суадносін царкоўнаславянскіх і беларускіх сродкаў з'яўляюцца абстрактныя назоўнікі царкоўнаславянскага афармлення на *-ие* і беларускага на *-ьe: веселие, карание, милосердие, обличие, питие* і *веселье, каранье, милосердье, обличье, питье*. У пазнейшых помніках у словах гэтага тыпу суфіксальны зычны часта пішацца над радком: *весе^{ъ}е, кара^{ъ}е, обли^{ъ}е*. Такія формы апраўдана прыраўноўваць да беларускіх на *-ьe*, паколькі яны трапляюцца ў помніках, дзе падобныя словы без вынасу суфіксальнага зычнага пішуцца праз *-ьe*. Лексіка гэтага разраду прадстаўлена таксама вялікай колькасцю прыкладаў ва ўсіх вывучаных тэкстах.

3. Прыкметным адрозненнем у сістэме назоўніка з'яўляюцца розныя канчаткі назоўнікаў былых асноў на *-і* жаночага роду ў творным склоне адзіночнага ліку: царкоўнаславянскія *злостiю, лестiю, печатiю, радостiю, смертiю* і беларускія *злостью, лестью, печатью, радостью, смертью*. У пазнейшых помніках зычныя асновы нярэдка выносяцца над радком: *зло^{ст}ю, радо^{ст}ю, хитро^{ст}ю*. Такія словаформы разглядаюцца як адпаведныя беларускія *злостью, радостью, хитростью*.

4. У марфалагічных адносінах вельмі паказальнымі з'яўляюцца формы назоўнага склону множнага ліку з асновамі на заднеязычныя *г, к, х*, якія ў царкоўнаславянскай мове ўжываюцца са змяненнем заднеязычных у свісцячыя, а ў беларускай —

без такога змянення: *бози, грѣси, друзи, пророци, человеци* і *боги, грехи, други, пророки, человеки.* Аднак формы гэтага тыпу ў помніках ўжываюцца параўнальна рэдка.

5. З ліку прапанаваных размежавальнікаў менш паказальнымі выступаюць формы назоўнікаў мужчынскага роду роднага склону множнага ліку. Формы старажытнага роднага склону з нулявым канчаткам трапляюцца ў многіх вывучаных тэкстах, але яны яўна ўступаюць месца новым утварэнням на *-овъ*, што наогул адлюстроўвае эвалюцыю гэтага канчатка ва ўсходнеславянскай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы: *богъ, врагъ, грѣхъ* і *боговъ, враговъ, грѣховъ.*

6. У парадыгме прыметнікаў, дзеепрыметнікаў і парадкавых лічэбнікаў асабліва паказальнай рысай, якая размяжоўвае царкоўнаславянскае і беларускае формаўжыванне, з'яўляюцца канчаткі мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку *-аго/-ѧго* і *-ого/-его: ближняго, новаго, стараго* і *ближнего, нового, старого.* Форм гэтага тыпу ў помніках вельмі многа, што дазваляе з пэўнай ступенню верагоднасці гаварыць аб удзеле царкоўнаславянскай і беларускай стыхій у кожным канкрэтным помніку.

7. Яркай дыферэнцыянальнай прыкметай у сістэме дзеяслова служаць канчаткі 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу — царкоўнаславянскі *-ши* і беларускі *-шъ: видеши, идеши, несеши* і *видешъ, идешъ, несешъ.* Такія формы ў біблейскіх тэкстах таксама выкарыстоўваюцца вельмі шырока.

8. Адрозненне царкоўнаславянскіх актыўных дзеепрыметнікаў цяперашняга часу на *-щ-* і адпаведных беларускіх на *-ч-* тыпу *берущий, идущий, несущий* і *беручий, идучий, несучий* належыць да ліку асабліва яркіх паказчыкаў адрознення царкоўнаславянскіх і беларускіх тэкстаў. Сюды ж залічваюцца і кароткія дзеепрыметнікі, якія фактычна выступаюць у функцыі дзеепрыслоўяў. Формы гэтага тыпу таксама даволі часта выкарыстоўваюцца ў рэлігійных тэкстах.

9. Формы загаднага ладу 2-й асобы адзіночнага ліку з націскам на аснове тыпу *буди, види, услыши* і *будь, видь, услышь* таксама служаць надзейным паказчыкам суадносін у помніку царкоўнаславянскай і беларускай стыхій, хоць увогуле яны сустракаюцца параўнальна рэдка.

10. Яркай рысай проціпастаўлення царкоўнаславянскіх і беларускіх помнікаў з'яўляюцца формы прошлага часу дзеяслова — аорыст і імперфект, з аднаго боку, і перфект і плюсквамперфект — з другога. Кожны тэкст практычна дае найбольшую колькасць формаўжыванняў гэтага тыпу. Аднак трэба мець на ўвазе, што атрыманыя ў працэсе статыстычнай апрацоўкі тэкстаў паказчыкі маюць не абсалютнае, а толькі адноснае значэнне, бо перфект і плюсквамперфект выкарыстоўваліся і ў царкоўнаславянскіх помніках.

Колькасць падобных дыферэнцыяльных прыкмет можна значна павялічыць, аднак накладванне сеткі з гэтых асноўных дзесяці

паказчыкаў на кожны асобны тэкст практычна дае магчымасць з адноснай ступенню верагоднасці адказаць на пытанне, з беларускім ці царкоўнаславянскім тэкстам прыходзіцца мець справу ў кожным канкрэтным выпадку.

Для вызначэння месца скарынінскіх выданняў у адносінах мовы ў агульнай спадчыне рэлігійнай пісьменнасці канца XV — першай палавіны XVI ст. праведзена статыстычнае абследаванне важнейшых вядомых цяпер тагачасных рэлігійных помнікаў, прычым невялікія па аб'ёму творы выкарыстаны поўнасцю, а вялікія — урыўкамі. Храналагічна гэтыя помнікі размяркоўваюцца наступным чынам:

1. «Чэцця» 1489 г., якая цяпер захоўваецца ў бібліятэцы АН УССР. Вялікі рукапіс на 376 лістах (752 старонках па два слупкі тэксту на кожнай) змяшчае пераважна словы і павучанні Іаана Златавуста і Іаана Дамаскіна і жыціі многіх хрысціянскіх мучанікаў. Большая частка змешчаных тут тэкстаў на царкоўнаславянскай мове беларускай рэдакцыі, але некаторыя часткі напісаны на тагачаснай беларускай мове, вядома, з моцным царкоўнаславянскім элементам. З ліку рукапісных старабеларускіх помнікаў «Чэцця» вылучаецца тым, што мае дакладныя звесткі пра пісца, месца і час напісання — яе пісаў паповіч Бярозка з Навагрудка ў Камянцы ў 1489 г.

2. «Песня песень» і «Аповесць аб трох каралях-валхвах» у зборніку канца XV ст., які цяпер захоўваецца ў Дзяржаўным Гістарычным музеі ў Маскве (зб. Сінад. № 558). У гэтым зборніку тэкст «Песні песень» змешчаны на л. 37—45б. Пасля публікацыі помніка М. Кастамаравым ва ўкраінскім часопісе «Основа» яго сталі лічыць украінскім, але ў ім ёсць несумненныя прыклады акання. На беларускае паходжанне помніка ўказваў у свой час і А. І. Сабалеўскі. Тэкст «Аповесці аб трох каралях-валхвах» (99—166б) той жа рэдакцыі, што і ў зборніку № 391, але больш царкоўнаславянізаваны.

3. «Пакуты Хрыста», «Аповесць аб трох каралях-валхвах» і «Жыціе Аляксея» ў зборніку Залускага бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына Q. I. 391. Гэты рукапіс «як па часу напісання і па зместу, так і па асаблівасцях мовы з'яўляецца адным з самых выдатных помнікаў старой заходнерускай пісьменнасці» (Я. Ф. Карскі), быў напісаны, як мяркуюць даследчыкі, у канцы XV ст. Мова яго вывучана Я. Ф. Карскім у даследаванні «Западнорусский сборник XV в. императорской Публичной библиотеки в. С.-Петербурге. Q. I. № 391».

4. Біблейскія кнігі Скарыны. Вялікі аб'ём скарынінскіх выданняў прымушае абмежавацца выбарачным абследаваннем асобных яго кніг: «Іоў», «Песня песень», «Юдзіф», «Есфір», «Руф», «Плач Ераміі» і ўсе чатыры кнігі «Царствы». Агульны аб'ём абследаванага матэрыялу складае 471 ліст (942 старонкі), што роўна амаль палавіне аб'ёму скарынінскай перакладной спадчыны. Пры

гэтым асаблівая ўвага звярталася на кнігі, якія ёсць і ў іншых тагачасных рукапісных зборніках.

5. Для параўнання асаблівае значэнне мае рукапісны зборнік пачатку XVI ст. Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літоўскай ССР RKF 262. Гэты унікальны зборнік, на жаль, пакуль мала вывучаны,— як яго састаў, так і мова. Ён змяшчае разнастайныя рэлігійныя тэксты, якія ў адносінах мовы займаюць крайняе і прамежкавае становішча ва ўсім спектры пераходу ад традыцыйнай царкоўнаславянскай мовы ўсходнеславянскай рэдакцыі да перакладаў на тагачасную беларускую мову. Асноўная частка зборніка напісана на царкоўнаславянскай мове. Але ў ім ёсць і такія тэксты, якія належаць да лепшых узораў беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы, напрыклад кніга «Прарок Данііл» (114—126б). Сапраўднымі ж перакладамі на беларускую мову можна лічыць кнігі «Іоў» (12—30б), «Руф» (31—33б), «Песня песень» (83—86), «Еклесіяст» (86б — 92б), «Прытчы Саламона» (93—109б), «Плач Ераміі» (110—113б), кніга «Эсфір» (127—133). Зборнік цікавы таксама і ў тых адносінах, што ўзнікненне яго якраз адносіцца да часу дзейнасці Скарыны. Ён пачынаецца дакладна перапісанай прадмовай Скарыны да пражскага «Псалтыра» 1517 г. З гэтага можна зрабіць вывад, што зборнік узнік у перыяд паміж 1517 і 1522 гг., бо калі б перапісчыку вядома было выданне «Псалтыра» ў складзе «Малой падарожнай кніжкі» 1522г., ён, натуральна, хутчэй за ўсё выкарыстаў бы гэта апошняе выданне. Аднак для дакладнай даціроўкі помніка неабходна правесці дадатковыя пошукі.

6. Важнай крыніцай для назіранняў над беларускай мовай у рэлігійнай сферы служыць рукапісны «Псалтыр», які цяпер захоўваецца ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна ў Маскве (№ 335). Даследчык гэтага «Псалтыра» Я. Ф. Карскі, зверыўшы пераклад з вядомымі польскімі рэдакцыямі псалтыроў, прыйшоў да высновы, што ў тэксталагічных адносінах гэты помнік найбольш блізкі да тэксту «Псалтыра» выдання В. Урубля 1539 г. Тут ужо сапраўдны пераклад у поўным сэнсе гэтага слова, царкоўнаславянскі струмень у тэксце зусім нязначны.

7. Пераклад «Евангелля» В. Цяпінскага каля 1580 г. Тут зусім няма адзначаных вышэй царкоўнаславянізмаў, ім адпавядаюць беларускія моўныя сродкі.

Па ступені распаўсюджання названых вышэй царкоўнаславянскіх і беларускіх моўных рыс вывучаныя канфесіянальныя творы беларускага паходжання XV—XVI стст. размяркоўваюцца наступным чынам у прыведзенай ніжэй табліцы.

З гэтай табліцы відаць, што з вывучаных беларускіх канфесіянальных твораў XV—XVI стст. іменна выданні Скарыны змяшчаюць найбольшую колькасць царкоўнаславянскіх моўных рыс, якіх тут 63,4 % пры 36,6 % беларусізмаў. Аднак і ў выданнях Скарыны царкоўнаславянізмы размяркоўваюцца нераўнамерна, што залежыць, як можна меркаваць, ад зместу твора: най-

Твор	Царкоўнаславянізмы		Беларусізмы	
	усяго	працэнт	усяго	працэнт
1. «Песня песень» Ф. Скарыны	320	72,1	124	27,9
2. Кніга «Плач Ераміі» Ф. Скарыны	582	71,8	228	28,2
3. Кніга «Прарок Данііл» (зб. № 262)	870	70,7	361	29,3
4. Першая кніга «Царствы» Ф. Скарыны	2410	66,9	1188	33,1
5. Кніга «Іоў» Ф. Скарыны	1441	66,3	731	33,7
6. Чацвертая кніга «Царствы» Ф. Скарыны	2110	65,3	1122	34,7
7. Кніга «Быццё» Ф. Скарыны	3304	61,8	2038	38,2
8. Кніга «Юдзіф» Ф. Скарыны	904	60,3	594	39,7
9. Другая кніга «Царствы» Ф. Скарыны	1693	59,4	1156	40,6
10. Кніга «Эсфір» Ф. Скарыны	725	57,9	528	42,1
11. Кніга «Руф» Ф. Скарыны	221	57,1	166	42,9
12. Трэцяя кніга «Царствы» Ф. Скарыны	1894	56,4	1462	43,6
13. «Псалтыр» (зб. № 262, л. 57б—76)	792	47,5	875	52,5
14. «Чэцця» 1489 г. (л. 49—111б)	1087	36,6	1885	63,4
15. «Песня песень» (зб. № 558)	126	33,9	245	66,1
16. «Прытчы Саламона» (зб. № 262)	253	25,1	756	74,9
17. «Еклесіяст» (зб. № 262)	84	20,1	335	79,9
18. «Аповесць аб трох каралях-валхвах» (зб. № 558)	618	16,7	3086	83,3
19. «Аповесць аб трох каралях-валхвах» (зб. № 391)	509	11,5	3915	88,5
20. Кніга «Эсфір» (зб. № 262)	67	11,1	534	88,9
21. «Пакуты Хрыста» (зб. № 391)	342	9,9	3124	90,1
22. «Псалтыр» XVI ст. (л. 74б—132)	127	5,9	2016	94,1
23. «Жыціе Аляксея» (зб. № 391)	10	4,9	194	95,1
24. Кніга «Руф» (зб. № 262)	10	3,6	268	96,4
25. «Евангелле» В. Цяпінскага (л. 7—35б)	—	—	1631	100,0

большы працэнт царкоўнаславянізмаў прыходзіцца на тыя біблейскія кнігі, якія у большай ступені звязаны з выкладам правіл хрысціянскай маралі, з маральна-этычнымі настаўленнямі («Плач Ераміі», кніга «Іоў»). І наадварот, у біблейскіх кнігах гістарычнага зместу (кнігі «Царствы», «Юдзіф», «Руф» і «Эсфір»), дзе пераважае выклад свецка-бытавых матываў, колькасць царкоўнаславянізмаў прыкметна змяншаецца за кошт павелічэння беларусізмаў.

Даныя прыведзенай вышэй табліцы даюць магчымасць зрабіць некаторыя абагульненні. Табліца паказвае надзвычай шырокую варыяцыю ў выкарыстанні царкоўнаславянскіх і беларускіх моўных сродкаў у помніках беларускай канфесіянальнай літаратуры XV—XVI стст. У сувязі з гэтым паўстае пытанне: якія з вывучаных помнікаў апраўдана лічыць царкоўнаславянскімі, а якія — беларускімі? Гэта пытанне можна вырашаць толькі з улікам вопыту тых славянскіх філолагаў, якія сутыкаліся з аналагічнай сітуацыяй, у прыватнасці методыкі складальнікаў слоўніка харвацка-глагалічнай рэдакцыі агульнаславянскай літаратурнай мовы [36, с. 104].

З гэтага пункту погляду, паколькі ніводная з вывучаных кніг Скарыны практычна не змяшчае менш чым 50 % царкоўнаславянізмаў і ў ніводнай з іх працэнт беларусізмаў не дасягае

50, іх нельга лічыць перакладамі на беларускую мову. Гэта становіцца асабліва відавочным, калі ўлічыць, што ў больш ранніх па часе ўзнікнення канфесіянальных тэкстах, такіх, як «Чэцця» 1489 г., «Песня песень» (Зб. № 558), працэнт беларусізмаў значна вышэйшы. Біблейскія кнігі зборніка № 262 («Прытчы Саламона», «Еклесіяст», кніга «Эсфір», кніга «Руф»), хоць і адносяцца да часу дзейнасці Скарыны, але беларусізмы ў іх відавочна пераважаюць над царкоўнаславянізмамі, гэта ўжо сапраўдныя пераклады на беларускую мову. Сказанае яшчэ ў большай меры адносіцца да «Псалтыра» сярэдзіны XVI ст. і асабліва да «Евангелля» В. Цяпінскага, дзе царкоўнаславянізмаў няма зусім.

Назіранне над перакладнымі выданнямі Ф. Скарыны паказвае, што выдавец неаднолькава выкарыстоўваў царкоўнаславянскія і беларускія граматычныя і лексічныя сродкі нават у адных і тых жа кантэкстах. Напрыклад, Скарына ў розных сваіх выданнях выкарыстоўвае цытаты з біблейскіх крыніц, але пры гэтым яны не паўтараюцца літаральна, а ў кожным выпадку маюць стылістычна-моўныя адрозненні. Для ілюстрацыі мэтазгодна прывесці некалькі такіх прыкладаў паралельна з тэкстам «Астрожскай бібліі».

Цытата з «Апостала» (Пасланне да яўрэяў, X, 1—4).

«Астрожская біблія»: Сѣнь б҃о и҆мыи зако́нъ грѧдꙋщихъ бл҃гъ, а не самый о҆́бразъ вещеи, на вс҃ѧ лѣта тѣми жрътвами, и҆х же прино́сѧтъ вы́нꙋ. ꙗже никогда́ же могꙋтъ пристꙋпа́ющихъ съверши́ти поне́же преста́ли б҃ы оу҆бо бы́ша приноси́мы, за е҆же ни еді́нꙋ и҆мѣти е҆ще со́вѣсть о҆ грѣсѣхъ, слꙋжа́щимъ, е҆ді́ною о҆чище́номъ. н҃о в нихъ въспомина́нїе грѣхомъ е*ст* на коеждо лѣто. Невъзмо́жно б҃о кро́ви юнчи и҆ ко́злїи ѡ*т*пꙋщати грѣхѝ.

Ф. Скарына. Прадмова да кнігі «Левіт»: Стень войстин^{s}ну и҆мѣѧ законъ ветхый грѧдущего добра, не замыкаѧ в собѣ о҆́бразу речемъ. На кож^{s}дое ꙋбо лѣто теми жъ жер^{s}твами ꙗже приносѧть всегда, николи не могуть приходѧщи*х* совер^{s}шеныхъ ꙋчинити. Понѣже престали бъ приносити жертвъ, егда бы не и҆мели совѣсти греховное е҆диною̀ очищены. Но в тых^{s} же воспоминание греховъ на кождое лѣто бываеть. Невозможно бо естъ кровию̀ телцевъ и҆ козлов^{s} ѡ*т*нѧти грехи.

Ф. Скарына. «Апостал» 1525 г.: Стень ꙋбо имеѧ ветхї*и* закон^{s} прїидущего добра, и не имый в собѣ совер^{s}шениѧ. понеже на каж^{s}дое лѣто тыми жъ жертвами, ꙗже приносѧт^{s} всегда, николи могуще приходѧщихъ совер^{s}шити. оуже бы престали быша приношениѧ, занеже ни е҆диное имели бъ сове*с*ти греховныѧ, принесши единова, и очистены суще, но въ тых^{s} же воспоминание бываетъ греховъ на каждый годъ. Невозможно бо крови юньчей, и козлей ѡ*т*пущати грехы.

Яшчэ прыклад цытаты з трэцяй кнігі «Царствы» (III, 11—12).

«Астрожская біблія»: И҆ рече г҃ь к немꙋ зане́же просѝ ѡ*т* менѐ г҃лъ се́и. и҆ не просѝ ѡ*т* менѐ д҃нїи мно́го, и҆ не просѝ

богатства, ниже просѝ ⁘дша врáгъ твои*х* ѝо ѝспросѝ себѣ м8дрости ѝ рáз8ма, да послⷭшаеши с8да. сѐ сътвори*х* по ⁘гл8 твоѐм8. сѐ дáхъ ⁘ти ср*д*це смы́слено, ѝ м8дрость. ⁘ако же нѣсть бы́лъ м8жъ пре*д* тобо́ю ѝ по тебѣ не воста́нет подо́бенъ тебѣ.

Ф. Скарына. Прадмова да «Прытчаў Саламонавых»: Й ѡтвеща к нем8 г*с*дь богъ понеже жадалъ ѐси оў мене словѣси сего. А̑ не просилъ ѐси собѣ дней многы*х*ˢ, ни богатесˢтва, ниже душъ врагов*ˢ* твои*х*. Но жадалъ ѐси собѣ м8дрости к навчению с8довъ, се 8чини*х* тобѣ по словѣси твоѐм8. Й дахъ тобѣ ср*д*це м8дро ѝ смыслено таково, ѝже несть былъ пред тобою ѝ по тобѣ не встанеть ѝнъ подобенъ тобѣ.

Ф. Скарына. Трэцяя кніга «Царствы:» Й рeч г*с*дь къ Саломону, понеже жадалъ ѐси собѣ речи сее, а̑ не просилˢ ѐси собѣ дней многыхъ ни богатества ѝ ни д8шъ враговъ твоѝхъ. Но просилъ ѐси мудрости, а̑бы оўмелъ розознати прю суду. Сѣ 8чинихъ тобѣ по словѣси твоѐму, ѝ далъ ѐсми тобѣ серˢце мудро ѝ разумно, тако велˢми ѝже жадинъ предˢ тобою не былъ тобѣ ровный, ѝ по тобѣ не встанеть.

Цяжка растлумачыць такія разыходжанні ў гэтых цытатах. З аднаго боку, дапушчальна меркаваць, што пры падрыхтоўцы сваіх выданняў Скарына карыстаўся рознымі крыніцамі, якія адрозніваліся паміж сабой пэўнымі розначытаннямі. З другога боку, не выключаецца магчымасць, што выдавец праводзіў свядомую апрацоўку пазнейшых сваіх кніг, уносячы моўныя і тэксталагічныя ўдакладненні.

Пэўнае ўяўленне аб асаблівасцях скарынінскага перакладу ў параўнанні з тэкстам «Астрожскай бібліі» дае наступны ўрывак з кнігі «Быццё» (XLII, 1—7):

«Біблія» Ф. Скарыны	«Астрожская біблія»
Слышавˢ же ⁘аковъ ⁘ако пшениц8 продаютъ во египте рече сыномъ своймъ, почто медлите сѣ 8бо слышахъ ѝже пища продаетˢс⁘ во египте. Снийдите жˢ и купите намˢ жита, да можемˢ живи остати и не помремъ ѡт гълад8. Тогда шло естъ бра̀тиѝ Ѩсифовы десеть купити жита во египте. Вениамина же не пусти ⁘ковˢ со братиею его, глаголⷭ да не прилⷭчитсⷭ емⷭ что злое на пути. И внийдоша до земли Египетское со иными они же шли суть куповати жита. Былъ 8бо тогда гладъ	Видѣв же іа́ковъ ⁘ако к8пл⁘ есть пшени́цы въ егѵптѣ рече ⁘номъ своймъ. Почто̀ не радитѐ, се слы́шахомъ ⁘ако пшени́ца есть въ егѵптѣ, идѣте та́мо к8пите намъ мало пи́ща да жи́ви б8демъ, и не оумремъ. І̑ идо́ша бра́тіⷭ іо́сифл⁘ десⷭть к8пити пшени́цы въ егѵпет. вениами́на же брата іо́сифова не п8стѝ съ бра́тіею его. вѣща бо егда̀ слⷭчи́тсⷭ на п8ти ѐмⷭ зло. Прїидоша же сно́ве ⁘ѩлви к8пити съ приходⷭщими, бⷭше бо гла́дъ въ всѐи земли ханаа́нъстѣй. Іо́сифъ же бⷭше кнⷭзь

в земли Ханаони. Їосифъ же былъ ест кнѧзь в земли египетской. И съ его повелѣниемъ жито людемъ продавах8. И внегда поклонишесѧ пред^{s} нимъ братиѧ его и познавъ их. ꙗко бы къ ч8ждимъ прикро молвилъ естъ к нимъ, г҃лѧ ѡтколѣ есте пришли. Они же ѡтповѣдели ем8 ѡт земли Ханаони приидохомъ купити пище.

всéи землѝ, сїѝ продаꙗше всѣмъ лю́демъ насéлнымъ. Прїидоша же бра́тїѧ іо́сифовы, и поклони́шасѧ ем8 ни́ць до землѧ̀. ви́дѣв же іо́сифъ бра́тїю свою̀, и познà ѧ и ѡтмета́шесѧ ихъ, и г҃лаше имъ поро́ко. рече же имъ ѡтк8д8 хо́дите, сїи же рѣша ѡт землѧ̀ ханаанскїѧ, к8пити пи́ща.

Характарыстыка выдавецкай дзейнасці Скарыны была б няпоўнай, калі пакінуць без увагі яго так званыя царкоўнаславянскія выданні — пражскі «Псалтыр» 1517 г. і віленскія «Малую падарожную кніжку» 1522 г. і «Апостал» 1525 г. Адзначаныя выданні таксама ў многіх адносінах адышлі ад традыцыйнай царкоўнаславянскай мовы ўсходнеславянскай рэдакцыі ў бок збліжэння з тагачаснай беларускай пісьмовай мовай. Гэта можна бачыць з параўнання аднаго і таго ж урыўка з «Псалтыра» па «Астрожскай бібліі» і «Псалтыра», выдадзенага Ф. Скарынам (XXXIV, 1—8).

«Астрожская біблія»

С8дѝ г҃и оби́дѧщаѧ мѧ, възбранѝ борю́щаѧ мѧ. прїимѝ ôр8жїе и̂ щитъ, и̂ въста́ни въ по́мощь мою. и̂зъс8ни ѻ҆р8жїе, и̂ заврѝ съпротив гонѧщихъ мѧ̂. ръцы д҃ши моеи, сп҃сенїе твое ê смь а҆́зъ. да посты́дѧтсѧ, и̂ посрамѧтсѧ и҆щ8щеи д҃ш8 мою. да възвратѧтсѧ въспѧть. и̂ постыдѧтсѧ мыслѧщей ми зла́ѧ. да б8д8ть ꙗ҆́ко прахъ пред^{s} лицемъ вѣтр8, и̂ а҆́г҃глъ г҃нь оскорблѧ́ѧ и҆́хъ б8ди п8ть их тма̂ и ползокъ, и̂ а҆́г҃глъ г҃нь погонѧ́а и҆́хъ. ꙗ҆́ко въс8е́ съкры́ша ми̂ паг8б8 сѣти своей. въс8е поносиша д҃ши моеи. да прїидетъ ê м8 сѣть юже не съвѣсть. и̂ лови́тва ю҆́же съкры̀.

«Псалтыр» Ф. Скарыны 1522 г.

С8ди гсди ѻ҆́бидѧщиѧ мѧ, побори борющих^{s}сѧ со мною̀. прии̂ми ѻ҆́ружие и̂ щитъ, и̂ востани в помощь мне. и̂зъторˢгни ѻ҆́р8жие и̂ заври против8 гонѧщим^{s} мѧ, р^{s}ци души моеѝ спасение твое ê смъ азъ. да постыдѧтсѧ и̂ посрамѧтсѧ и̂щ8щие души моêꙗ. да воз^{s}вратѧтсѧ восъпѧть и̂ постыдѧтсѧ мыслѧщей злаѧ мне, да б8д8ть ꙗ҆́ко прахъ пред^{s} лицемъ ветру, и̂ а̂нгелъ гсдень ѻ҆́скор^{s}блѧꙗ и̂хъ. б8дуть п8ти и̂хъ тмы и̂ ползкость, и̂ а̂нгелъ господень погонѧꙗ их. ꙗ҆́ко вс8ѐ сокриша ми паг8бу сети своеꙗ, вс8ѐ поносиша души моеѝ, да придет^{s} нань сеть е̂ꙗ же не весть, и ловитва ю̀же сокри.

Пры параўнанні гэтых выданняў выяўляюцца перш за ўсё шматлікія лексічныя адрозненні, прычым у Скарыны, як правіла, выкарыстоўваюцца лексічныя сродкі тагачаснай беларускай літаратурнай мовы, у «Астрожскай бібліі» ім адпавядаюць тыповыя царкоўнаславянізмы, яўна архаічныя ў свядомасці тагачаснага чытача. Напрыклад, у Скарыны биенъ (63б) — у «Астрожскай бібліі» ꙁвенъ, адпаведна: ближнему (21) — искренемѫ, болесть (35) — болѣзнь, взѧти (26б) — прїати, возвеличать (62б) — оублажѧть, всегда (61) — выну, горнець (51б) — конобъ, долину (51б) — юдолъ, жадайте (53) — желайте, забыть (9б) — забвенъ, не замедли (36б) — не закосни, крепость (38б) — держава, милости (66б) — щедроты, надежа (53) — оупованїе, надеюсѧ (48б) — оуповаю, олтарю (38б) — жертвеникѫ, погибнѫтъ (33б) — потребѧтсѧ, почто (44б) — вскѫю, прийдущему (61б) — грѧдѫщемѫ, слово (49) — глаголъ, хѫление (26б) — гажденіе і г. д.

У сістэме дзеяслова выданне Ф. Скарыны характарызуецца частым ужываннем перфекта са звязкай або без яе там, дзе ў «Астрожскай бібліі» захоўваецца аорыст або імперфект: видели сѫтъ (31) — видѣша, виделъ есь (44б) — видѧше, возвелъ еси (55б) — въведе, возненавиделъ еси (40б) — възненавидѣ, далъ естъ (49б) — дастъ, забылъ (9б) — забы, избавилъ еси (47) — избави, извелъ еси (55б) — ізведе, наставилъ еси (20б) — настави, покрилъ (39б) — покры, соделалъ еси (58) — съдѣла, совершилъ еси (57) — съверши і інш.

У скарынінскім выданні звязка *еси* ў складзе перфекта 2-й асобы адзіночнага ліку часта ўжываецца ў скарочаным варыянце *есь*, чаго зусім не ведае «Астрожская біблія»: благоизволилъ есь (39) — благоволилъ еси; смирилъ есь (39б) — смирил еси; наставилъ мѧ есь (52) — наставилъ мѧ еси; стерлъ есь (64б) — стерлъ еси.

Вельмі прыкметнае адрозненне скарынінскага выдання заключаецца ў частым выкарыстанні форм імперфекта пераважна зваротных дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку ў значэнні аорыста 3-й асобы множнага ліку, што, як адзначалася раней, вельмі характэрна для перакладных пражскіх біблейскіх кніг Ф. Скарыны: тии видевше тако дивишесѧ, смутишесѧ и подвизашесѧ (42) — тїи видѣвше тако дивишасѧ, смѫтишасѧ подвизашасѧ; царии земстии собрашесѧ и снидошесѧ въ кѫпѫ (42) — цр҃іе земстїи събрашасѧ, снидошасѧ въ кѫпѣ; кости мое смутишесѧ (26) — кости мои смѫтишасѧ.

Скарынінскае выданне «Псалтыра» таксама адрозніваецца шматлікімі рысамі нерэгулярнага характару. Такія рысы трапляюцца і ў іншых тагачасных царкоўнаславянскіх помніках беларускага паходжання. З ліку найбольш тыповых адрозненняў скарынінскага «Псалтыра» ад «Астрожскай бібліі» можна адзначыць наступныя: розсеалъ еси насъ (39) — разсѣялъ ны еси; трѣпетъ приѧтъ ихъ (42) — трепетъ прїатъ ѧ; ни помяну же именъ ихъ ѫстнами моими (13) — ни помянѫ же именъ ихъ

оустнама моима; очи его на нищего призирають (10) — очи его на нищаго призираетъ; предвариша мѧ сети смертные (15) — предвариша мѧ сѣти смертныѧ; просвети очи мое (11б) — просвѣти очи мои; о мне поѧху пиющие вино (59) — о мнѣ поѧхѫ піющеи вино; приидите и видите дела божиѧ (41) — пріидѣте и видѣте дѣла бжїѧ.

У сучасны момант яшчэ няма магчымасці дакладна вызначыць генезіс шматлікіх беларусізмаў у гэтых скарынінскіх выданнях. З аднаго боку, дапушчальна лічыць, што многія граматычныя і лексічныя беларусізмы маглі ўжо існаваць у спісах, якімі карыстаўся Ф. Скарына. Старажытныя беларускія рукапісы, як гэта ўжо даўно заўважана даследчыкамі, наогул вылучаюцца імкненнем перапісчыкаў зрабіць зразумелым для чытача славянскі тэкст шляхам замены царкоўнаславянскіх форм і слоў мясцовымі, беларускімі.

З другога боку, няма дастатковых падстаў сумнявацца ў тым, што многія беларусізмы гэтых скарынінскіх выданняў былі ўнесены ў тэкст самім выдаўцом. Больш чым 120 гадоў назад А. Я. Віктараў падкрэсліваў, што розначытанні ў скарынінскім «Псалтыры» ўзяты выдаўцом не з арыгінала, які быў у яго пад рукамі, а належаць самому Скарыне, які для яснасці наўмысна выпраўляў тэкст «Псалтыра», уводзячы мясцовыя формы і выразы і замяняючы імі ўстарэлыя славянскія. У сваёй сукупнасці ўсе такія навацыі значна аддалялі скарынінскую мову ад традыцыйнай царкоўнаславянскай мовы ўсходнеславянскай рэдакцыі і паставілі выданні Ф. Скарыны ў адзін рад з помнікамі, якія адносяцца да беларускага варыянта царкоўнаславянскай мовы. Кнігі Скарыны нельга лічыць перакладам на беларускую мову, бо царкоўнаславянская моўная аснова іх выступае дастаткова адчувальнай і выразнай.

Пералічаныя вышэй рысы, якія адрозніваюць скарынінскае выданне «Псалтыра» ад тэксту «Астрожскай бібліі», належаць да найбольш яркіх прыкмет беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы. Аднак беларускія кніжнікі таго часу пры апрацоўцы тэксту «Псалтыра» ў бок збліжэння з жывой беларускай мовай пайшлі значна далей Скарыны. У гэтых адносінах асаблівую цікавасць мае тэкст «Псалтыра» ў складзе адзначанага вышэй рукапіснага зборніка № 262 Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літоўскай ССР. У гэтым зборніку «Псалтыр» змешчаны на л. 34—82б — якраз у той частцы зборніка, дзе ёсць і іншыя біблейскія кнігі на беларускай мове. Уяўленне аб моўных асаблівасцях гэтага помніка ў параўнанні з выданнем Скарыны дае наступны ўрывак:

«Псалтыр» Ф. Скарыны 1522 г.	«Псалтыр» са зб. № 262
в онь же день аще призовѫ тѧ, скоро оуслыши мѧ. йсчезо-	въ которомъ коли дни възовѫ тебе скоро. оуслы́ши мене, ѧко

ша 8бо ꙗко дымъ дние мое, и кости мое ꙗко сушило сосхошесѧ. оу҃ꙗзвенъ быхъ ꙗко трава, и сⷭше серⷣце мое, ꙗко забыхъ снести хлебъ мои. ѡт гласа воздыханиѧ моего, прильпе кость моѧ плоти моеи. оу҃подобихсѧ неꙗсыти пⷭстынному, быхъ ꙗко нощный вранⷭ на нырищи. бдехъ и быхъ ꙗко птица бсобливаѧ на зⷭди. весь день поношаху ми врази мои, и хвалѧщие мѧ на мѧ кленѧхусѧ. занеже попелъ ꙗко хлебъ ꙗдохъ, и питие моѐ съ плачемъ растворѧхⷭ. ѡт лица гнева ꙗрости твоеѧ, ꙗко вознесъ низверже мѧ. дние мои ꙗко стень 8клонишесѧ, и ѧзъ ꙗко сено сосхохⷭ (87б—88).

скончалисѧ ꙗко дымъ дни мои и кости мои ꙗко трость съсхоша. побиенъ быхъ ꙗко трава и съсхло срдце моѐ иже забылъ ѣсми ѣсти хлѣбъ мои. ѡт гласа въздыханеи моихъ прилнⷭла кость моѧ тѣлⷭ моемⷭ: ровенъ былъ ѣсми кожанⷭ оуѣдиненомⷭ, быхъ ꙗко ночны врон въ ѡбьхоженьи. бдѣлъ ѣсми и быхъ ꙗко птахъ оуѣдиненыи въ бⷭдованьи. вѣсь дн҃ь поносили мнѣ врáси мои и хвáлѧщiи мене напротив мене кленⷭтсѧ: иже попелъ ꙗко бы хлѣбъ ѣдохъ и питьѐ моѐ съ плачом размѣшахъ ѡт лица гнѣва ꙗрости твоеѧ ꙗко възнесъше ѡпⷭстилъ ѣси мене. дн҃и мои ꙗко тѣнь склонилисѧ и ѧ ꙗко сѣно съсохлъ ѣсми (66б—67).

«Псалтыр» са зборніка № 262 вельмі прыкметна адрозніваецца ад скарынінскага перш за ўсё ў галіне лексікі. Многім словам царкоўнаславянскага паходжання выдання Скарыны ў зборніку № 262 адпавядаюць лексічныя сродкі тагачаснай беларускай мовы. Сярод іх прыкметны і некаторыя паланізмы, якія асабліва актыўна сталі выкарыстоўвацца ў беларускай пісьменнасці пазнейшага часу. Такія адрозненні назіраюцца ў розных лексіка-граматычных разрадах, больш за ўсё іх у галіне назоўніка: у Скарыны — безчадие (30б), у зборніку № 262 — бесплодие (44), адпаведна благо (43б) — добро (49б), благолепие (22б) — доброт8 (41), брань (67б) — битвы (59), брашна (68) — кормⷭ (59б), виноградъ (72) — винницⷭ (61), времѧ (73) — часъ (61), глаголы (67) — слова (59), грады (61) — мѣста (56), державⷭ (76) — цѣсарство (62б), достоꙗние (52) — дѣдичьство (53), дщи (40б) — дочка (48б), имскъ (27б) — мⷭлъ (43), крѣпость (65б) — моць (58б), миръ (62) — покой (57), надежа (53) — надѣѧ (53), персть (89) — порох (67б), сведетель (79) — свѣдокъ (63б), в силе (112б) — въ моци (76б), во сокровищахⷭ (28) — въ скарбѣх (43), стезѧ (8б) — пⷭти (35б), трапезоу (68) — покормленіе (59б), трѣпетъ (42) — страх (49), трудъ (80б) — праца (64), ⷭпование (67б) — надѣю (59), храминⷭ (74) — домъ (61б), хранило (35) — сторожⷭ (46), чаша (65б) — келих (58б), чⷭдеса (66б) — дивности (59). Падобныя ж адрозненні ў вялікай колькасці маюць месца і ў сістэме дзеяслова: весть (63) — вѣдаеть (57б), глаголати (29б) — говорити (43б), облобызастасѧ (75) — поцеловалисѧ (62), ѡтвратил (79б) — ѡтвер-

н8лъ (63б), пожреть (59) — полкнеть (55б), показни (34) — покараи (45б), потребитсѧ (33) — погибнеть (95), сохранѧть (79) — заховаютъ (63б), 8зриши (81) — оувидишь (64б), оущедри (5б) — помил8и (34б), чаѧхъ (47б) — ждах (51).

Сістэматычна замяняюцца беларускімі адпаведнікамі прыметнікі, дзеепрыметнікі, прыслоўі: биенъ (63б) — битъ (57б), велий (42) — великыи (49), забвенъней (77) — забытой (63), искрънему (13) — ближнем8 (37), нищихъ (36) — оубогыхъ (36), силенъ (78) — моцный (63), внегда (25б) — коли (42), воск8ю (19) — чем8 (39б), вын8 (17б) — всегда (39), егда (65) — коли (58), село (42) — велми (49), окрестъ (15) — ѡколо (38), семо (63) — тоутъ (57б).

У «Псалтыры» са зборніка № 262 часта ўжываюцца поўнагалосныя формы, якія практычна вельмі рэдка трапляюцца нават у пражскіх перакладных выданнях Скарыны: бремѧ (34) — беремѧ (45б), власъ (36б) — волосовъ (46б), главы (51б) — головы (52б), гладъ (92) — голод (68б), градъ (41) — город (48б), злато (101) — золото (72), облакомъ (68б) — ѡболокомъ (59б), обладаеши (78) — володѣешь (63), престани (32) — перестани (44б).

У парадыгме назоўніка асабліва яркай рысай, якая збліжае мову помніка з жывой беларускай мовай, з'яўляецца частае ўжыванне канчатка *-овъ* у родным склоне множнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду, якім у выданні Скарыны адпавядаюць старажытныя формы з нулявым канчаткам: власъ (36б) — власовъ (46б), врагъ (57б) — враговъ (55), грех^{s} (45) — грѣховъ (50), конець (52) — концовъ (53), облакъ (97) — ѡблаковъ (70б), отець (41) — ѡтьцовъ (48б), перстъ (8б) — перстовъ (35б), рогъ (20) — рогов (40), рабъ (79б) — рабовъ (64).

Тэкст зборніка № 262 характарызуецца наяўнасцю вялікай колькасці поўных займеннікаў у адпаведнасць кароткім формам царкоўнаславянскага скарынінскага тэксту: скажи ми (21б) — скажи мнѣ (40б); воньми ми и 8слыши мѧ (47) — вънми мнѣ и оуслыши мене (51); помил8й мѧ (23) — помил8й мене (41), дасть ти (32) — дасть тобѣ (44б); согрешихъ ти (37) — съгрѣшихъ тобѣ (47); возвеселиша тѧ (40б) — насладиша тобе (48); обыдеть тѧ (90) — ѡкр8жит^{s} тебе (64б); помниши и́ (8б) — помниши его (35б); смирит^{s} и́ (10) — смирить его (36); смутить ѧ (4б) — см8тить их (34); постигну ѧ (16б) — постигн8 их (38б); иск8сил^{s} ны еси (55б) — пок8силъ еси нас (54); 8повай нань (32) — оуповай на него (44б).

У прыметніку выдзяляецца больш частае ўжыванне займенных форм на месцы кароткіх скарынінскага выдання: безуменъ (12) — без8мный (37), злата аравийска (62б) — злата аравійского (57), смирѣна и нища (73) — смиреного и нищого (61б), юна (60) — юнаго (56), скорби многы и злы (61б) — скорби многыи и злыи (56б). У зборніку № 262 больш часта ўжываюцца прыметнікі мужчынскага роду ў родным склоне адзіночнага

ліку з канчаткам *-ого*: великаго (42) — великого (49), нечестиваго (33б) — нечистивого (45б), нощнаго (81) — ночного (64б), праведнаго (32б) — праведного (45).

Асабліва прыкметныя разыходжанні паміж гэтымі помнікамі назіраюцца ў сістэме дзеяслова. У формах 2-й асобы адзіночнага ліку ў зборніку № 262 пануючым з'яўляецца канчатак *-шь*: вознесеши (17) — вознесеш (38б), изведеши (90б) — изводишь (68), наставиши (26) — наставишь (42), наст8пиши (64б) — наст8пишь (64б), на8чиши (83) — наоучишь (65), обновиши (91) — wбновишь (68), повѣдаеши (44б) — повѣдаешь (49б), положиши (18б) — положишь (39б), поставиши (16б) — поставишь (38б), прославиши (44б) — прославишь (49б), смириши (16) — смиришь (38), сокр8шиши (42б) — съкр8шишь (49), 8слышиши (34б) — оуслышишь (45б), хвалиши (46) — хвалишь (50б).

У «Псалтыры» са зборніка № 262 асноўнай формай прошлага часу выступае перфект, хоць аорыст і імперфект тут таксама зрэдку выкарыстоўваюцца: озлоби люди и изгна *их* (39) — wзлобил еси люди и изгнал ихъ (47); п8сти стрелы своѧ и разгна ѧ (15б) — п8стил стрѣлы своѧ и разгнал ихъ (38); землѧ 8боѧсѧ и 8молча (66) — землѧ оустрашиласѧ и оупокоила (58б); се нищий возва и гсдь 8слыша и́ (29) — се нищыи въскликн8л и г҃ъ оуслышал его (43б); ѧко же слышахомъ тако и видехом^{s} (42б) — ѧко же слышали есмо тако видѣли есмо (49); сии быша т8 (76б) — тые были т8тъ (62б); тии изнемогоша (23) — тые изнемогли с8ть (41).

У адрозненне ад звязкі *есь* скарынінскага тэксту ў зборніку № 262 захоўваецца традыцыйная форма звязкі *еси*: ты со мною есь (20б) — ты со мною еси (40); призва^{l} мѧ есь (72б) — призвал еси мене (61); разгневалсѧ есь (51б) — прогнѣвалсѧ еси (52б); смирилъ есь насъ (39б) — смирил еси нас (48).

Тэкст «Псалтыра» са зборніка № 262 вылучаецца таксама пераважным ужываннем дзеепрыметнікаў беларускага ўтварэння з фармантам *-ч-*: пищ8 далъ *ест* боѧщимсѧ его (99б) — пищ8 далъ боѧчимсѧ его (71б); смутишесѧ вси видѧщие *их* (54) — см8тилисѧ вси видѧчии *их* (53б); разыдутсѧ вси делающие безаконие (82) — потребѧтсѧ вси дѣлаючии безаконіе (64б). Гэты помнік з'яўляецца, па сутнасці, першым у беларускай рэлігійнай пісьменнасці, дзе замест дзеепрыметнікаў ужываюцца апісальныя азначальныя звароты: Блажен^{s} раз8меваѧ на нища и 8бога (37) — блаженъ иже роз8мѣеть на нища и оубога (46б); несть изъбавлѧѧ и́ (61) — нѣсть иже избавить его (56б); несть творѧй благое (46б) — не есть иже творит добро (50 б); не ты ли боже wтрин8вый насъ (52) — не ты ли б҃е иже wтрин8лъ еси нас (52б); восхвалишесѧ вси ненавидѧщие тебе (64) — въсхвалени с8ть иже ненавидѧт тебе (57б); растаѧсѧ землѧ и вси живущие на неѝ (65) — разстаѧласѧ есть землѧ и вси иже

живѫть на ней (58); воздремаша вседшии на конѧ 66 — въздрѣмали вси иж всѣли на кони (58б).

У зборніку № 262 беларускія моўныя рысы некалькі пераважаюць над суадноснымі царкоўнаславянскімі — 52,3 і 47,7 %. Таму мову гэтага помніка ўжо можна лічыць перакладам на беларускую мову. Ва ўсякім выпадку беларусізмаў тут больш, чым у перакладах Скарыны.

Неперакладныя царкоўнаславянскія выданні Скарыны таксама пражылі пэўную эвалюцыю ў збліжэнні з беларускай літаратурна-пісьмовай мовай. Гэта наглядна відаць з параўнання «Псалтыра» пражскага выдання 1517 г. і віленскага 1522 г. Уласцівыя пражскаму выданню архаічныя напісанні з ъ пасля плаўных у віленскім «Псалтыры» ў многіх выпадках выпраўлены ў адпаведнасці з пазнейшымі пісьмовымі нормамі: истръгый (20б) — исторгый (19б), помръче (93б) — померче (92б), потръпѣхъ (36б) — потерпѣхъ (35б), прѣмлъчи (98б) — премолчи (97б), растръгнѣмъ (5б) — растергнем (4б), тръпѧщие (33) — терпѧщие (32), хръбетъ (17б) — хребетъ (16б).

Уласцівыя пражскаму выданню старажытныя напісанні з *ы* пасля заднеязычных у віленскім тэксце часта заменены напісаннямі з літарай *и*: восхытити (11) — восхитити (10); врагы (83) — враги (82), мѫхы (93б) — мухи (92б), недугы (90) — недуги (89), погыбнѫть (83) — погибнѫть (82), рѣкы (83б) — реки (82б) і інш. У віленскім выданні больш шырока адлюстравана ўласцівае беларускай мове вымаўленне *у* нескладовага: навчи (22б) — навчи (21б), повчение (106) — повчение (105), во ѫжасе (103б) — во вжасе (102б), ѫбогаго (11) — вбогаго (10), не оудали (37б) — не вдали (36б), не ѫтаисѧ (35) — не втаисѧ (34).

Многія архаічныя займеннікавыя формы ў віленскім выданні таксама заменены новымі беларускімі: не прѣдасть мѧ (104б) — не предасть менѣ (103б), воздасть ми (103б) — воздасть мне (102б), ѫподобить ти сѧ (37) — ѫподобитсѧ тобѣ (36), обыметь и (31) — обымет его (30), руцѣ мои (107) — руце мое (106), стрѣлы твоѧ (68) — стрѣлы твое (67), ѫста своѧ (98) — ѫста свое (97).

Прыметнікі і дзеепрыметнікі віленскага выдання ў назоўным склоне множнага ліку больш часта ўжываюцца з уніфікаваным канчаткам *-ие/-ые*: звѣри дубравныи (91) — звери дубравные (90), сети смертныѧ (16) — сети смертные (15), востающіи на мѧ (99б) — востающие на мѧ (98б), живущии на ней (87) — живѫщие на ней (86), рожденныи на земли (43б) — рожденные на земли (42б), ѫповающеи на тѧ (7б) — оуповающие на тѧ (6б).

Прыкметныя адрозненні назіраюцца і ў сістэме дзеяслова. Тут у першую чаргу варта адзначыць ужыванне ў многіх выпадках перфектных форм на месцы аорыстаў пражскага выдання: возвѣдѣ (62б) — возвелъ (61б), позна (82б) — позналъ (81б), сътвори (13б) — вчинилъ (12б). Звязка *еси* ў складзе перфекта

пражскага выдання ў віленскім варыянце часта перадаецца праз *есь*, што было вельмі характэрна для перакладных выданняў Скарыны: благоизволилѕ еси (40) — благоизволилѕ есь (39), изгналѕ еси (72б) — изгналъ есь (71б), реклъ еси (79б) — реклъ есь (78б), стѣрлъ еси (65б) — стерлъ есь (64б).

Віленскае выданне «Псалтыра» істотна адрозніваецца ад пражскага і збліжаецца з перакладнымі біблейскімі кнігамі і вялікай колькасцю форм імперфекта 3-й асобы адзіночнага ліку ў значэнні аорыста 3-й асобы множнага ліку: тіи видевше тако дивишасѧ, смѵтишасѧ подвизашасѧ (43) — тии видевше тако дивишесѧ, смутишесѧ и подвизашесѧ (42); на мѧ возвѣселишасѧ и снидошасѧ (31б) — на мѧ возвеселишесѧ и снидошесѧ (30б); смѵтишасѧ ѩзыци и ѵклонишасѧ цртвиѧ (42) — смѵтишесѧ ѩзыци и ѵклонишесѧ цртвиѧ (41).

Такія замены даюць падставу заключыць, што выдавец свядома апрацоўваў свае царкоўнаславянскія выданні ў бок збліжэння з нормамі перакладзеных ім біблейскіх кніг. Гэта, у сваю чаргу, дае падставу аб'яднаць усе скарынінскія выданні ў адзін тып пісьмовай мовы.

У «Малой падарожнай кніжцы» ёсць многа ўрыўкаў з «Апостала». Параўнанне такіх урыўкаў таксама паказвае некаторыя моўна-тэксталагічныя адрозненні паміж імі, што відаць з наступнага фрагмента («Пасланне да галатаў», V, 22—26; VI, 1—2):

«Малая падарожная кніжка» 1522 г.

Братие плодъ духовный естъ любовь, радость, миръ, долготеръпение, бл҃годатѕ, бл҃гостыни, вѣра, кротость, воздержание. на таковыхъ несть закона. они же хрстови плоть свою распѧша съ стрстьми, похотьми. аще живемы духомъ, духови и прилагаймысѧ. не будемъ дщеславни, другъ друга прѣзирающе, другъ другу завидѧще. Братие аще ли же человекъ впадеть в некое прѣгрешение, вы духовний навчайте таковаго духомъ кротости, блюдаи себе, еда и ты искушенѕ будеши. другѕ другѳ тѧготы носите, и тако скончаете законѕ хрстовъ («Шасцідневец кароткі», 25б—26).

«Апостал» 1525 г.

Плодъ же духовный естъ любовь, радость, миръ, долготерпение, бл҃годать, добротливость, вера, кротость, и воздержание. на таковыхъ несть закона. бни же хсви плотѕ распѧша со страстьми и похотѧми. Аще живемы духомъ, доховных и наследуимы. Не будемѕ тъщеславни другъ друга презирающе. другъ другу завидѧще. Братие вопадетѕ ли человекѕ в некое прегрешение, вы духовнїи навчайте таковаго, въ духу кротости. блюдый себе да некогда и ты покушенъ будеши. Другъ другу тѧготу носите, и тако наполните законъ хсвъ (97—97б).

* *
*

Разгледжаны матэрыял паказвае, што моватворчая дзейнасць беларускага першадрукара Францыска Скарыны праходзіла ў адпаведнасці з агульнымі тэндэнцыямі развіцця мовы беларускай пісьменнасці таго часу. На беларускай глебе значнаму ўздзеянню з боку народна-гутарковай мовы падверглася і царкоўнаславянская мова, якая на працягу ўсяго старажытнага перыяду заставалася афіцыяльнай мовай праваслаўнай царквы. Як адзначаў у свой час чэшскі даследчык А. В. Фларoўскі, ва ўсходніх славян рэакцыя супраць царкоўнаславянскай мовы не з'явілася колькі-небудзь рэзкім і рашучым аддзяленнем ад царкоўна-культурных стыхій. Набліжэнне мовы кніг свяшчэннага пісання да жывой мовы праходзіла спакойна і натуральна, без выбуху або разрыву з царкоўнаславянскай традыцыяй [53, с. 157]. Характар узаемаадносін паміж царкоўнаславянскай і мясцовымі славянскімі мовамі ў старажытнасці трапна характарызуе сучасны даследчык гісторыі царкоўнаславянскай мовы Р. Пікіё. Ён адзначае, што ў кожнай вобласці праваслаўнага славянства «праваслаўная царкоўнаславянская мова» не ўжывалася як «другая мова», а толькі як сістэма міжславянскіх норм або «ізанорм», дзякуючы чаму тэксты маглі свабодна распаўсюджвацца сярод чытачоў рознага лінгвістычнага ўзроўню. У той час як адзінства літургічнай царкоўнаславянскай мовы грунтавалася на дагматычных прынцыпах, адзінства праваслаўнай славянскай мовы залежала выключна ад практычных і функцыянальных меркаванняў. Ступень, да якой пісьменнік мог уводзіць у тэкст мясцовыя формы, залежала ад публікі, на якую ён арыентаваўся. Дэталёвае вывучэнне ступені выкарыстання царкоўнаславянскай і мясцовай моў рознымі аўтарамі ў розных абласцях і ў розныя перыяды павінна быць звязана як з гісторыяй наднацыянальных функцый праваслаўнай царкоўнаславянскай мовы, так і з гісторыяй фарміравання славянскіх нацыянальных літаратурных моў. З'яўленне такіх моў можна разглядаць як рух наперад ад максімуму царкоўнаславянскай мовы да максімуму мясцовага ўжывання [43, с. 33].

У прапанаваную схему ўзаемаадносін царкоўнаславянскай мовы праваслаўнага ўжытку з мясцовымі славянскімі мовамі добра ўкладваецца і мова выданняў беларускага першадрукара. Канфесіянальныя тэксты літургічнага прызначэння («Псалтыр», «Малая падарожная кніжка» і «Апостал») Скарына выдаў без істотных моўных змен, і яны аказаліся ў разрадзе тэкстаў артадаксальнай царкоўнаславянскай мовы. Больш свабодна абыходзіўся выдавец з нелітургічнымі біблейскімі тэкстамі. Наяўнасць у вывучаных перакладных кнігах Скарыны прыкладна 36 % беларусізмаў у галіне марфалогіі і лексікі паказвае, што мова

гэтых выданняў далёка адышла ад традыцыйнай царкоўнаславянскай мовы. Але захаванне ў гэтых кнігах 64 % царкоўнаславянскіх граматычных і лексічных дыферэнцыяльных прыкмет, на месцы якіх выкарыстоўваліся мясцовыя адпаведнікі ў тагачасных помніках на беларускай мове, паказвае, што Скарына не здолеў і, відаць, не ставіў перад сабой мэту канчаткова пераадолець царкоўнаславянскі струмень, практычна зразумелы тагачаснаму чытачу.

У навуковай літаратуры не без падстаў гаворыцца пра заняпад царкоўнаславянскай мовы на Беларусі ў XIII—XVI стст. Аб гэтым сведчыць у першую чаргу малалікасць пісьмовых помнікаў той эпохі на царкоўнаславянскай мове. Галоўную прычыну аслаблення ролі царкоўнаславянскай мовы трэба бачыць у паступовым, але няўхільным пашырэнні каталіцкай веры і як вынік — у аслабленні праваслаўя, падзенні ўзроўню адукаванасці сярод праваслаўных іерархаў. Як заўважае А. І. Сабалеўскі, якраз малалікасць царкоўнаславянскіх тэкстаў заходнерускага паходжання і дазваляе меркаваць, што веданне царкоўнаславянскай мовы ў Заходняй Русі ў XV і першай палавіне XVI ст. было далёкім ад росквіту [51, с. 61]. Гэта, несумненна, добра разумеў і беларускі першадрукар, пад пяром якога царкоўнаславянская мова была адаптавана прымяняльна да густаў і адукацыйнага ўзроўню тагачасных чытачоў.

Змешчаныя ў табліцы даныя па іншых помніках паказваюць, што ў некаторых храналагічна больш ранніх канфесіянальных тэкстах колькасць беларусізмаў значна большая, чым у перакладных выданнях Скарыны. Некаторыя з іх (напрыклад, «Песня песень» са зборніка № 558, часткі «Чэцці» 1489 г.) можна лічыць ужо сапраўднымі перакладамі на беларускую мову. Гэта ж адносіцца і да асобных біблейскіх кніг са зборніка № 262.

Як бачым, беларускія кніжнікі XV—пачатку XVI ст. кіраваліся свядомым імкненнем зрабіць даступнай і зразумелай для шырокіх колаў чытачоў мову канфесіянальных твораў, што знаходзіць сваё тлумачэнне ў агульным заняпадзе канфесіянальнай царкоўнаславянскай мовы на Беларусі. Аднак гэта імкненне ажыццяўлялася неаднолькавымі шляхамі, што залежала ад адукацыйнага ўзроўню як саміх перакладчыкаў, так і чытачоў, на якіх арыентаваліся такія творы, ад асяроддзя, дзе яны працавалі, і г. д.

Трэба адзначыць, што дзейнасць Скарыны, як і іншых перакладчыкаў і адаптатараў канфесіянальных тэкстаў, не была выключна беларускай асаблівасцю сярод тагачаснага ўсходняга славянства. Цікавыя звесткі па гэтаму пытанню прыводзіць Л. П. Якубінскі ў сваёй працы аб развіцці рускай літаратурнай мовы XI—XVII стст. У пачатку XVI ст. у Маскве быў перакладзены з грэчаскай мовы пад кіраўніцтвам спецыяльна запрошанага вучонага, афонскага манаха Максіма Грэка, Тлумачальны псалтыр. Максім Грэк, які тады яшчэ не ведаў царкоўнаславян-

скай мовы, перакладаў з грэчаскай мовы на лацінскую, а прыстаўленыя да яго рускія пасольскія перакладчыкі рабілі пераклад з лацінскай мовы на царкоўнаславянскую. Гэтыя перакладчыкі ў радзе выпадкаў замянялі традыцыйныя царкоўнаславянскія словы і формы рускімі ці блізкімі да рускіх, у чым, свядома ці несвядома, праявілася імкненне наблізіць мову «Псалтыра» да жывой мовы, зрабіць яе больш даступнай. Напрыклад, замест царкоўнаславянскіх слоў *выну, вскую, утробы, велии* ставілі *всегда, чесо, ради, почки, велик;* царкоўнаславянскія формы прошлага часу замянялі рускімі з суфіксам *-л-* і дапаможным дзеясловам: замест *видяше, течаше* пісалі *видѣлъ еси, текъ еси*; займеннікавыя формы накшталт *ми, ны* замянялі на *мнѣ, насъ* і інш. [56, с. 137].

Гэты вельмі цікавы факт адлюстроўвае не толькі агульную тэндэнцыю, але і канкрэтныя формы яе праяўлення, што відаць з разгледжанага вышэй скарынінскага матэрыялу. Але ў рускай пісьменнасці адзначаны факт аказаўся адзінкавым і эфемерным, тады як на беларускай глебе развіццё ішло паслядоўна ў такім кірунку, што ў канчатковым выніку пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. прывяло да з'яўлення непасрэдных перакладаў на беларускую мову многіх кананічных твораў.

ДАДАТАК

Змешчаны ніжэй дадатак у выглядзе ўрыўкаў з розных перакладаў Бібліі дае магчымасць атрымаць уяўленне аб асаблівасцях скарынінскага перакладу і яго месцы ва ўсходнеславянскай біблеістыцы. Крыніцамі ўрыўкаў паслужылі наступныя біблейскія тэксты:

1. Вульгата — лацінскі пераклад Бібліі, завершаны каля 405 г. Еранімам Блажэнным. Лацінская Вульгата паслужыла крыніцай для перакладу Бібліі на многія еўрапейскія мовы, Скарына таксама карыстаўся ёю. У дадатку прыведзены ўрыўкі з Вульгаты па выданню: Biblia łacińsko-polska, czyli Pismo święte starego i nowego testamentu. Podług textu łacińskiego Wulgaty, i przekładu polskiego X. Jakóba Wujka T. J. Wilno, 1861.

2. Чэшская Біблія 1506 г.— асноўная крыніца біблейскага тэксту для перакладаў Скарыны. Выдадзена ў 1506 г. у Венецыі. Гэта трэцяе друкаванае выданне Бібліі на чэшскай мове пасля пражскага выдання 1488 г. і кутнагорскага 1489 г.

3. Бивлиꙗ рꙋска выложена докторомъ Францискомъ Скориною из славнаго града Полоцька, богꙋ ко чти и людемъ посполитымъ к добромꙋ наꙋчению. Выдадзена ў Празе ў 1517—1519 гг.

4. «Астрожская біблія» — першае поўнае друкаванае выданне царкоўнаславянскай Бібліі ва ўсходніх славян. Выдадзена Іванам Фёдаравым у 1581 г. ва ўкраінскім горадзе Астрогу. У аснову выдання пакладзены адзін са спісаў «Генадзіеўскай бібліі» 1499 г. «Астрожская біблія» прадстаўляе рускую рэдакцыю царкоўнаславянскай мовы часоў Скарыны.

5. Сучасная царкоўнаславянская Біблія, якой цяпер карыстаюцца ўсходнія славяне, вядома ў многіх выданнях, аднолькавых па мове. Нормы царкоўнаславянскай Бібліі застаюцца нязменнымі пасля выдання так званай Елізавецінскай Бібліі 1751 і 1756 гг.

6. Беларуская рукапісная Біблія пачатку XVII ст. уяўляе сабой пераклад на беларускую мову польскай Бібліі Я. Вуйка, выдадзенай у Кракаве ў 1599 г. Рукапіс захоўваецца ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе (F. I. 2).

Вульгата

1. Post duos annos, vidit Pharao somnium. Putabat se stare super fluvium, 2. de quo ascendebant septem boves, pulchrae et crassae nimis; et pascebantur in locis palustribus. 3. Aliae quoque septem emergebant de flumine, foedae, confectaeque macie; et pascebantur in ipsa amnis ripa in locis virentibus; 4. devoraveruntque eas, quarum mira species, et habitudo corporum erat. Expergefactus Pharao, 5. rursum dormivit, et vidit alterum somnium. Septem spicae pullulabant in culmo uno plenae atque formosae, 6. aliae quoque totidem spicae tenues, et percussae uredine oriebantur, 7. devorantes omnem priorem pulchritudinem. Evigilans Pharao post quietem, 8. et facto mane, pavore perterritus, misit ad omnes conjectores Aegypti, cunctosque sapientes; et accersitis narravit somnium, nec erat qui interpretaretur. 9. Tunc demum reminiscens pincernarum magister, ait: Confiteor peccatum meum: 10. Iratus rex servis suis, me et magistrum pistorum retrudi jussit in carcerem principis militum, 11. ubi una nocte uterque vidimus somnium praesagum futurorum. 12. Erat ibi puer Hebraeus, ejusdem ducis militum famulus: cui narrantes somnia. 13. audivimus quidquid postea rei probavit eventus: ego enim redditus sum officio meo, et ille suspensus est in cruce. 14. Protinus ad regis imperium eductum de carcere Joseph totonderunt; ac veste mutata, obtulerunt ei. 15. Cui ille ait: Vidi somnia, nec est, qui edisserat, quae audivi te sapientissime conjiecere. 16. Respondit Joseph: Absque me Deus respondebit prospera Pharaoni. 17. Narravit ergo Pharao, quod viderat: Putabam me stare super ripam fluminis, 18. et septem boves de amne conscendere, pulchras nimis, et obesis carnibus: quae in pastu paludis virecta carpebant. 19. Et ecce, has sequebantur aliae septem boves in tantum deformes et macilentae, ut nunquam tales in terra Aegyptii viderim: 20. quae, devoratis et consumptis prioribus, 21. nullum saturitatis dedere vestigium: sed simili macie et squalore torpebant. Evigilans, rursus sopore depressus, 22. vidi somnium: Septem spicae pullulabant in culmo uno plenae atque pulcherrimae. 23. Aliae quoque septem tenues et percusae uredine, oriebantur e stipula: 24. quae priorum pulchritudinem devoraverunt. Narravi conjectoribus somnium, et nemo est qui edisserat. 25. Respondit Joseph: Somnium regis unum est, quae facturus est Deus, ostendit Pharaoni. 26. Septem boves pulchrae, et septem spicae plenae: septem ubertatis anni sunt: eandemque vim somnii comprehendunt. 27. Septem quoque boves tenues atque macilentae, quae ascenderunt post eas, et septem spicae tenues, et vento urente percussae: septem anni venturae sunt famis. 28. Qui hoc ordine complebuntur: 29. Ecce septem anni venient fertilitatis magnae in universa terra Aegypti: 30. quos sequentur septem anni alii tantae sterilitatis, ut oblivioni tradatur

cuncta retro abundantia: consumtura est enim fames omnem terram, 31. et ubertatis magnitudinem perditura est inopiae magnitudo. 32. Quod autem vidisti secundo ad eandem rem pertines somnium, firmitatis indicium est, eo quod fiat sermo Dei, et velocius impleatur. 33. Nunc ergo provideat rex virum sapientem et industrium, et praeficiat eum terrae Aegypti.: 34. qui constituat praepositos per cunctas regiones: et quintam partem fructuum per septem annos fertilitatis, 35. qui jam nunc futuri sunt, congreget in horrea: et omne frumentum sub Pharaonis potestate condatur, serveturque in urbibus. 36. Et praeparetur futurae septem annorum fami, quae oppressura est Aegyptum, et non consumetur terra inopia. 37. Placuit Pharaoni consilium et cunctis ministris ejus; 38. locutusque est ad eos: Num invenire poterimus talem virum, qui spiritu Dei plenus sit? 39. Dixit ergo ad Joseph: Quia ostendit tibi Deus omnia, quae locutus es, numquid sapientiorem et consimilem tui invenire potero? 40. Tueris super domum meam, et ad tui oris imperium cunctus populus obediet: uno tantum regni solio te praecedam. 41. Dixitque rursus Pharao ad Joseph: Ecce, constitui te super universam terram Aegypti. 42. Tulitque annullum de manu sua, et dedit eum in manu ejus; vestivitque eum stola byssina, et collo torquem auream circumposuit. 43. Fecitque eum ascendere super currum suum secundum, clamante praecone, ut omnes coram eo genu flecterent et praepositum esse scirent universae terrae Aegypti.

Чэшская Біблія 1506 г.

Po dwú letech miel gest sen Farao. Zdálo mu se: on stogÿ nad potokem: z ňehożto wystupowalo sedm kraw krásnych a náramnie tlustých: a pásły se po mokrzynách: giných také sedm wycházelo z rzeky szeredných a zprzechurawielých. a pásły se po brzegu rzeky tee na mÿestech zelenych: a sežraly tygichżto diwná krása a tlustost tiel byla. Proczýtiw Farao opiet ge vsnul a miel druhý sen. Sedm klasuow wzrostlo z stbla gednoho plných a krásných: giných také toliko klasuow zlenilých a vswadlých wycházelo zžyeragÿczých wssech prwnÿch krásu. Proczýtiw Farao po odpoczynutÿ: a kdyż bylo rano: strachem gsa porażen: poslal ke wssem hadaczuom Egipským: a po wsseczky mudrce a powolaw gich wyprawowal sen: aniż ge byl ktoby wyložyl. Tehda tepruw rozpomenuw se vrzednik nad sseňky rzekl. Wyznawam hrzech swuoy: Rozhniewaw se kral na służebnÿky swe: na mie a na vrzednÿka nad pekarzy: wsaditi nas rozkazal do żalarze knyežete rytyérzstwa: kdežto gedné noczy sen miela swa: oznamugyczý budúczye wieczy. Byl gest tu mládenecz żyd téhoż knyežete rytÿerzstwa służebnÿk: gemuż to wyprawiwsse sny: slysseli gsme czoż ge se koli potom w skutku stalo. nebo yá gsem nawráczen k vrzadu swemu; a on obiessen gest na ssybeniczy. Y hned k rozkázanÿ królowskému wywedsse z żalarze Jozefa: oholili gsú, a dawsse mu rúcho gine: postawili ho przed králé. Gemużto on rzekl.

Miel gsem sny a nenye kto by mi ge wyložyl. Ale gsem slyssel o tobie: že ty vmÿess ge múdrze wykladati. Odpowiediel Jozef: Beze mnet^{s} buoh wykladati bude sstiastné wieczy Faraonowi. Tehda wyprawowal Farao czoż ge widiel. Zdálo mi se že gsem stál nad brzehem potoka: a sedm kraw z rzeky wystupowalo krásných náramnie a vtylých: kteréż pasúcze se po mokrzynách: zelenu trávu sklubaly: a tot' po nich wycházelo giných sedm kraw: tak welmi sseredných a churawých: že gsem nikdá takowých ne widel w zemi Egipské: kteréžto sežrawsse a sniedsse prwnÿe: žadného znamenÿe ne okazaly sytosti. Ale túż churawosty a sserednosty nedužywiely. Procÿtiw a opiet vsnuw miel gsem sen. Sedm klasuow rostlo na stblu gednom plných a naramnie piekných: giných také sedm ztenczylých a vswadlych wychazelo z stébla kterzyżto krásu prwnych sežrali. Wyprawowal gsem wyhladaczõ snuow a žadne^{o} nenÿe kto by wyložyl. Odpowiediel Jozef. Sen králuow gednostayný gest: czo budúczyeho czasu vczyniti má buoh okázal gest Faraonowi. Sedm kraw krásnych. A sedm klasuow plných sedm let hoyné vrody znamenagÿ a gednostaynú mocz snu zawyeragÿ. Sedm pak kraw ztenczylých a churáwych: kteréż gsú wystupowali po nich: a sedm klasuow ztenczylých a wedrem vswadlých: sedm let znamenagÿ budúczyeho hladu: kteráż tyemto se porzádkem wyplnÿ: tot' sedm let przigde vrody weliké po wssÿe zemi Egipskee: po kterýchżto bude sedm let giných tak weliké nevrody: že w zapomenutÿe dána bude wsseczka prwnÿe hoynost: mát' gistie zkazyti hlad wsseczku zemi: a hoynost vrody zkažena bude welikostÿ hladu. Že gsy pak widiel y podruhé: k gednostayné wieczy przyslussegÿczý sen: vwrzenyet gest znamenye proto žet' se stane slowo bożye: a tyem se spyesse plnÿ. Protož giż opatrz král muże múdrzého a rozssafného: a vdelay ho wládarzem nad zemy Egipskú: aby ten vstanowil vrzednyky po wssech kragyech a pátýdiel obile przes sedm let vrody kteréż giż hned przygyti magÿ: at' swozye do stodol: a wsseczko obilee at' gest pod moczý Faraonowú skládáno: a at' ge chováno po miestech, a at' se przyprawuge k sedmi letuom budúczyeho hladu. kterýżto sużyti maa Egipt: at'by ne byla zkažena ziemie hladem. Slybila se Faraonowi rada: y wssem služebnykuom geho. Y mluwil gest k nim. Zdaliż nagyti budeme moczy takowého muże: kterýż by ducha bożyeho pln byl. protož mluwil k Iozefowi. Poniewadż gest okázal tobie buoh wsseczko czo gsy mluwil zdaliż mudrzeyssyeho a tobie podobného budem moczy nalezti. ty budess nad králowstwym mým: a k rozkazany vst twých wssyczek lid poslucháti bude: samú toliko kralowskú stoliczy nad tie budu. Y rzekl opiet Farao k Iozefowi. Tot^{s} gsem tie vstanowil nade wssy zemÿ Egipskú. Y wzal prsten z ruky swé a dal gey na ruku geho: a oblékl ho rúchem stkwúczym: a na ssygi geho toczenicy zlatú wložil: y kazal mu wsyesti na swuoy wuoz druhý: a birzyczy wolati: aby wssyczkni przed nym kolena klonili a znali že ge zpráwcze wssye zemie Egiptské.

Пераклад Скарыны

И бысть по дву лѣтехъ Виде фараѳнъ сонъ Мнѧшесѧ стоѧ надˢ рекою, с неѧ же выступовало седˢмъ кравъ добрыхъ, и велми сытыхъ, и пасѧхѳсѧ по мокринахъ. Иныхˢ теже седˢмъ з реки выхожало злыхъ и велми либевыхˢ и пасѧхусѧ по брѣгу тоѥ жъ реки по местехъ зеленыхъ. И сожрали тыхъ ихˢ же дивнаѧ краса и сытость телесˢ была ест. Прочутивъ фараѳнъ, А ѳпѧть ѳснул иˢ видел другый сонъ. Седˢмъ класовъ выросло сˢ стебла ѥдиного полˢныхˢ и красныхˢ. Иныхˢ теже толико жˢ класовъ тонˢкихъ и ѳвѧлыхъ выростало пожираѭщи всю красу перˢвыхъ. Пробудивсѧ фараѳнъ ѡт сна и вне[г]да было рано ѳлѧкнулˢсѧ и послалъ по всехъ сказателевˢ и по мудръцевъ Египетˢскихъ. И призвавˢ их поведаше имъ сонъ, и не бѣ кто толˢкуѧ его. В той часъ воспомѧнѳлˢ Подˢчаший Царев· на Іѳсифа и рече вызнаваю грехъ свой. Розˢгневалсѧ былъ Царь на рабы своѧ. На мѧ И На старейшинѳ пекареска, И повелелъ насъ всадити до темницѣ кнѧзѧ надъ воѧми И тамо видехомˢ ѳба ѥдиное нощи сны, знамен8ю̀ще будущий речи. И былъ с нами ѡтрокъ Евреѧнинъ того же кнѧзѧ вой рабъ. Ему же ѥгда поведихомъ сны своѧ толˢкова намъ по томѳ ѧко же сѧ и пригодило мнѣ быти во своемъ ѳрѧде, А ѳному повѣшенѳ на древе. И скоро на повѣлениѥ Царево выведоша Іѳсифа с темˢницѣ, И ѳсˢтригˢши и возложили на него ризы иныѥ и поставили ѥго предˢ фараѳномˢ. К нему же Царь рече видехъ сны, и несть кто бы ми их выложилъ. Слышахˢ же ѳ тобѣ ѧко ѳмеѥши мудрѣ выкладати. ѡтвеща Іѳсифъ, без мене богъ выкладати будетъ щасные речи фараѳнови. Тогда нача поведати фараѳнъ ѥже виделъ Гл҃а, Видело ми сѧ ѧко быхˢ стоѧлъ на брегѳ речˢномъ, И седˢмъ кравъ з реки выступовали велми добрыхъ и сытыхˢ, и пасѳщесѧ по мокринахˢ зелен8ю̀ трав8 ск8бах8. И сѣ после их выступовало иншѧ седмъ кравˢ велми злыхˢ и либѣвыхˢ ѧковыхˢ же не видахˢ в земли Египетˢской ѳни пакˢ сожравши первыхˢ жадного знамена не ѳказали сытости но при той же либивости ѳстали Прочѳтивсѧ и ѳпѧть ѳснухъ и видехъ сонъ, Седˢмъ класовъ росло ѥстъ на стебле ѥдиномъ полˢныхъ, и вельми красныхъ. Иныхъ теже седˢмъ тъщихъ и ѳвѧлыхъ за ними выхожало изˢ стебла, ѳни же крас8 перˢвыхъ сожˢрали. И повѣдахъ сее выкладачомъ сновъ, и никто же былъ выложивый ѥго. ѡтвѣща Іѳсифъ сонъ Царевъ ѥдиностайный ѥстъ, чˢто прийдущего часу сˢтворити имать бог показа фараѳнови. Седˢмъ кравъ сытыхъ И седˢмъ класовˢ полˢныхˢ Седˢмъ лѣтъ плодˢныхъ знаменуѭть И ѥдиностайнѳ̀ю силу снѳ вˢказуѭть. Седˢмъ пакъ кравъ хѳдыхъ

и҆ либѣвыхъ ѻ҆ни же и҆схожаху ѻ҆послѣ их. И҆ седˢмъ класовъ тъщихъ и҆ ведромъ ꙋвѧлыхъ. Седˢмъ летъ знаменаю́ть будущего гладу. О҆ни же тымъ ѻ҆бычаѐмъ наполˢнѧтсѧ. О҆то седˢмъ лѣтъ прии҆дуть плодовитыхъ по всей земли Е҆гипетˢской. По нихˢ же будуть и҆наѧ седˢмъ лѣтъ велˢми гладныхъ, и҆ запоменꙋта будеть всѧ перˢваѧ плодносˢть, и҆ загꙋбить гладъ всю землю, и҆ не будеть знати ѻ҆билиѧ земли длѧ гладу. А҆ и҆же виделъ ѐси сонъ вторый ѐдиностайноѐ дело ест И҆ ꙋтверˢжениѐ знаменꙋѐть, ꙗ҆ко зˢбудетсѧ сеѐ слово божие и҆ скоро сѧ наполˢнить. Нынѣ же да знаи҆деть Царь мужа мꙋдра и҆ смыслена, И҆ да вчинить ѐго старейшиною̀ надъ землею̀ Е҆гипетˢскою̀. Дабы той ꙋстановилъ вˢрѧдники по всихъ сˢтранахъ. И҆ пѧтую̀ долю житъ да собираю́ть тыхъ седˢми лѣтъ плодовитыхъ ѐже скоро настануть, и҆ да свожаю́ть вˢ гумна и҆ сˢкладаю́ть подъ властию̀ фараѻ҆новою̀, да бꙋдеть соблюдено во градехъ, и҆ положено на седмъ лѣтъ прии҆дущего гладу, ѻ҆нˢ же и҆мать гꙋбити Е҆гипетъ, да не будетˢ скажена землѧ гладомъ. И҆ полюбилисѧ суть фараѻ҆нови слова І҆ѻ҆сифовы, И҆ вˢсемъ слугамъ ѐго И҆ рече к нимъ ѐдали можемы знаи҆ти такового мꙋжа ꙗ҆ко сей ѻ҆нˢ же бы духа божиѧ полонъ былъ. И҆ потомˢ рече Ко І҆ѻ҆сифу. Понѣже показалъ ѐстъ тобѣ богъ все ѐже глаголалъ ѐсь, не можемъ мы знаи҆ти мудрѣи҆шего и҆ли тобѣ подобнаго. Сего длѧ ты будешъ надˢ Царствомъ моимъ, И҆ на повѣлениѐ ꙋсˢтъ твои҆хъ вси людие послушати будуть. Развей престоломъ Царˢскимъ А҆зъ старей тебе буду. И҆ паки рече І҆ѻ҆сифꙋ Сѣ поставлѧю̀ тѧ надо всею̀ землѣю̀ Е҆гипетˢскою̀. И҆ снемъ перˢстень з руки своѐꙗ̀ далъ и҆ на руку ѐго, и҆ ѻ҆блече и҆ в ризы красны, и҆ гривнꙋ злату возложи на шию̀ его. И҆ повѣле ѐмꙋ въсесˢти на колесницꙋ свою̀ другую̀ И҆ кликуномˢ вопити дабы вси лꙋдиѐ кланѧлисѧ предˢ нимˢ, и҆ знали ꙗ҆ко старейшина ест всеѧ земли Е҆гипетˢское.

Астрожская біблія

Бысть по сем въ второ́е лѣто дн҃и. видѣ фарао́нъ сонъ. мнѧшесѧ стоѧ̀ на́ брезѣ рѣчнѣмъ, и҆ с҃е а҆ки ѡт рѣки̇ и҆схожда́ше се́дмь кравъ до́бра взорꙋ і҆ и҆збра́нны телесы̀, и҆ пасѧ́хꙋсѧ по́ брегꙋ. И҆ дрꙋгїѧ же кравы седмь, по си́хъ и҆зыдо́ша и҆з рѣки̇ зл҃ы, ѻ҆бразом и҆ телесы̀ хꙋ҆ды и҆ пасѧ́хꙋсѧ съ кравами по́ брегꙋ рѣчномꙋ. І и҆зыидо́ша седмь злыѧ възо́ромъ, и҆ хꙋдыѧ телесы̀ седмь кравы до́брыхъ, ѻ҆бразом и҆збра́нных. и҆ сїѧ неви́дими быша, и҆же вънидо́ша въ чресла̀ их. Въста́в же фарао́нъ и҆ ви́дѣ со́нъ вторы́и. и҆ с҃е седмь клас и҆схожда́хꙋ и҆сˢ сте́блїѧ ѐді́наго и҆збра́нїи и҆ до́бры. друга́ѧ же седмь кла́съ то́нцы и҆стонче́ни вѣтромъ, и҆зница́хꙋ по ни́хъ. и҆ пожро́ша седмъ клас то́нцы и҆стончени. седмь кла́съ и҆збра́нныхъ и҆ плѣ́ных. Въста́въ же фарао́нъ ѡт сна̀,

ꙗ҆ко бы*с* заоу҆тра. и҆ възмꙋти́сѧ дш҃а е҆го. посла́вши же съзва̀ всѧ сказа́телѧ е҆гѵ̀петъскы, и҆ вс҃ѧ мꙋдрыѧ и́хъ. і҆ и҆сповѣ́да и҆мъ фарао́нъ со́нъ. н҆о не бѧ́ше никто́ же сказа́ти т҆о фарао́нꙋ. И҆ рече старѣи́шина вина́рьскъ къ фарао́нꙋ г҃лѧ, грѣ́хъ мои помѧнꙋ́хъ днесь. фарао́нъ е҆гда̀ разгнѣвасѧ на рабы̀ своѧ̀, и҆ въвр́ъже н҆ы въ темни́цꙋ, в домꙋ̀ воѐво́ды вои менѐ и҆ старѣ́ишинꙋ жита́рьска. И҆ ви́дѣховѣ со́нъ ѻ҆́ба е҆ді́ной нощи. а҆́зъ и҆ о*н* ко́ждо сво́й сонъ видѣ́ховѣ. И҆ бѧ́ше тамъ с нама ѻ҆́трокъ, ю́ноша жидови́нъ пентефри́евъ. і҆ и҆сповѣ́даховѣ е҆мꙋ и҆ сказа̀ намъ. И҆ бысть же ꙗ҆ко сказа̀ на́мъ, та́ко и҆ слꙋчи́сѧ мн҆ѣ быти въ свое́мъ старѣ́ишинъствѣ а҆ о́ного повѣ́сити. Посла́вши же фарао́нъ възва̀ і҆о́сифа і҆ и҆зведо́ша и҆ с тверди́ла и҆ о҆стриго́ша и҆. і҆ и҆змѣни́ша ризы е҆мꙋ̀, и҆ прїиде къ фарао́нꙋ. рече же фарао́нъ і҆о́сифꙋ. со*н* видѣхъ и҆же бы ми кт҃о сказалъ е҆го, нѣ́сть сего̀, а҆́зъ же слы́шахъ о҆ тебѣ гл҃юща, слы́шавшаѧ тѧ сны проповѣ́дающа. ѡ҆твѣща́вˢ же і҆о́сифъ рече фарао́нꙋ, безъ бг҃а не ѡ҆твѣщаютсѧ фарао́нови спс҃еныѧ вещи. ре*ч* же фарао́нъ, і҆о́сифꙋ гл҃ѧ, въ снѣ̀ моѐмъ мнѧсѧ стоѧ̀ на́ брезѣ рѣчнѣмˢ и҆ а́ки ѡ*т* рѣкѝ и҆схожда́ше се*д*мь кра́въ. и҆збра́нныхъ телесы̀ и҆ добры̀ ѻ҆́бразо*м* и҆ пасѧхꙋ́сѧ по́ брегꙋ. и҆ с҆е дрꙋгїѧ седмь кравъ и҆ны́хъ и҆схожда́хꙋ въ слѣ*д* и҆хъ, и҆з рѣкѝ, и҆ злы̀ не добры̀ ѻ҆́бразомъ и҆ хꙋды телесы̀, ꙗ҆цѣ́хъ же нѣсмъ ви́дѣлъ. тацѣ́хъ в землѝ е҆гѵ̀петъстѣи. І҆ и҆зъꙗдо́ша се*д*мь кра*в* злы́ѧ и҆ не до́брыѧ ѻ҆́бразомъ хꙋды́ѧ се*д*мь пр́ъвыхъ до́брыхъ і҆ и҆збранны*х*. И҆ вънидо́ша въ оу҆тро́бꙋ и҆хъ и҆ не ꙗ҆ви́шасѧ. ꙗ҆ко вънидо́ша въ оу҆тро́бꙋ и҆хъ, и҆ ѻ҆бли́чїѧ же и*х* зл҃а быша ꙗ҆ко и҆спр́ъва. Въста́въ же паки лего*х*, и҆ ви́дѣхъ па́ки въ снѣ̀, а҆ки се*д*мь кла*с* и҆схожда́ше и҆зъ е҆ді́наго сте́блїѧ по́лˢны и҆ добры. дрꙋга́ѧ же седмь кла́съ то́нци и҆ тщѝ вѣтромъ и҆стонче́ни. и҆зница́хꙋ въ слѣ́дъ и҆хъ. И҆ пожро́ша седмь кла́съ тщи, и҆ вѣтромъ и҆стонче́ни. седмь кла́съ до́брыхъ и҆ по́лныхъ, и҆ повѣ́дахъ с҆е сказа́телемъ, и҆ не бысть кт҃о повѣ́дыи. Рече же І҆о́сифъ фарао́нꙋ, со́нъ фарао́не е҆ди́но е҆сть, е҆ли́ко б҃ъ твори*т*. оу҆каза̀ фарао́нꙋ седмь сїю кравъ до́брыхъ, се*д*мь лѣтъ е҆сть. И҆ се*д*мь кла́съ до́брыхъ се́дмь лѣтъ е҆сть, со́нъ фарао́не е҆ди́но е҆сть. Се*д*мь кра́вˢ хꙋды́хъ ꙗ҆́же и҆зыдо́ша по сихъ, се́дмь лѣтъ е҆сть, и҆ седмь кла́съ тщи*х*, и҆стонче́ныхъ вѣтромъ. се́дмь лѣтъ е҆сть, и҆ бꙋде*т* се́дмь лѣ*т* гла́дъ. С҆е же слово е҆же реко́хъ фарао́нꙋ е҆ли́ко б҃ъ твори́тъ оу҆каза̀ фарао́нꙋ. И҆ с҆е, се*д*мь лѣтъ прїидетъ ѻ҆би́лность, въ всю зе́млю е҆гѵ̀петъскꙋю. Прїидетъ же по си́хъ се*д*ми, се́дмъ лѣтъ гла́дꙋ. и҆ забꙋ́детъ по все́и землѝ е҆гѵ̀петˢстѣи сы́тость. и҆ погꙋби́тъ гла́дъ зе́млю и҆ не бꙋдетˢ зна́ти, ѻ҆би́лїѧ земна́го, ѡ*т* гла́да бꙋ́дꙋщаго по семъ, и҆ вели́къ бꙋ́детˢ ѕѣло. ѿ втори́ци же сна̀ фарао́не е҆же д҆вои́чно видѣ ꙗ҆ко пра́во е҆сть сло́во с҆е ѡ*т* б҃а, оу҆скори́тъ б҃ъ сло́во с҆е сътвори́ти. Нн҃ѣ оу҆бо и҆щѝ чл҃ка мꙋ́дра и҆ смы́слена, и҆ приста́ви е҆го все́и землѝ е҆гѵ̀петъстѣи. И҆ да

сътвори́тъ фарао́нъ старѣ́ишины по все́и землѝ и̂ да събира́ютъ всѧкъ пло́дъ житенъ тыхъ се́дмь лѣтъ о̂би́лных е̂же и̂мꙋть бы́ти. И̂ да съберет пи́щꙋ и̂ пшени́цꙋ въ рꙋцѣ̀ фарао́ни, и̂ пи́ща въ градѣхъ да сѧ съблюдет, и̂ бꙋ̂детъ пи́ща съблюде́на на землѝ. на се́дмъ лѣтъ гла́дныхъ. е̂же и̂мꙋтˢ быти въ землѝ е̂гѵ̀петъстѣ. да не поги́бнетъ землѧ̀ въ гла́дъ. Оу̂диви́ша же сѧ словеса̀ пред фарао́номъ. и̂ пред всѣми рабы̀ е̂го. И̂ рече фарао́нˢ всѣмъ рабо́мъ свои̂мъ, не о̂брѧщем чл҃ка сицева́го, и̂же и̂мать дх҃ъ бж҃їи в себѣ. Рече же фарао́нъ і̂о́сифꙋ, е̂лма́ же ти показа б҃ъ вс҃е. и̂ нѣсть чл҃ка мꙋдрѣиша, ни смысленѣиша тебѐ. Ты бꙋ̂ди въ домꙋ̀ мое́мъ, и̂ оу̂стъ твои̂хъ да послꙋ̂шаютъ вс҃и лю́дїе мои̂, развѣ прсто́ломъ а̂зъ бо́лее тебѐ бꙋ̂дꙋ. реч же фарао́нъ і̂о́сифꙋ. с̂е поставлѧ́ю тѧ д҃нсь въ все́и землѝ е̂гѵ̀петстѣи. И̂ сънéмъ фарао́нъ прь́стень с рꙋкѝ своеѧ̂, и̂ възложи е̂го і̂о́сифꙋ на́ рꙋкꙋ, и̂ о̂блечѐ и̂ въ ри́зꙋ чръвле́нꙋ, и̂ възложѝ гри́внꙋ зла́тꙋ на вы́ю е̂го. и̂ всади е̂го на колесни́цꙋ свою̀ вторꙋ̂ю, и̂ проповѣ́даѧ пред ни́мˢ проповѣ́дателникъ, и̂ поста́ви е̂го все́и землѝ е̂гѵ̀петъстѣи.

Сучасная царкоўнаславянская Біблія

Бы́сть же по двою̀ лѣ́тꙋ дне́й, фараѡ́нъ ви́дѣ со́нъ: мнѧ́шесѧ стоѧ́ти при рѣцѣ̀. И̂ сѐ а̂ки и̂зˢ рѣкѝ и̂схожда́хꙋ се́дмь кра́въ дѡбры̀ ви́домъ, и̂ и̂збра́нны тѣлесы̀, и̂ пасѧ́хꙋсѧ по бре́гꙋ. Дрꙋгі̂ѧ же се́дмь кра́въ и̂зыдо́ша по си́хъ и̂зˢ рѣкѝ, ѕлы̀ ви́домъ и̂ тѣлесы̀ хꙋ̂ды, и̂ пасѧ́хꙋсѧ съ кра́вами по бре́гꙋ рѣчно́мꙋ. И̂ поѧдо́ша се́дмь кра̂вы ѕлы̀ѧ и̂ хꙋды̀ѧ тѣлесы̀ се́дмь кра̂въ до́брыхъ ви́домъ, и̂ и̂збра́нныхъ тѣлесы̀ (и̂ сїѧ неви̂димы бы́ша, ꙗ̂кѡ внидо́ша въ чре́сла и̂хъ) воста́ же фараѡ́нъ. И̂ ви́дѣ со́нъ вторы́й: и̂ сѐ се́дмь кла́си и̂схожда́хꙋ и̂зˢ сте́блїѧ е̂ди́нагѡ и̂збра́нны и̂ добры̀. Дрꙋзі̂и же се́дмь кла́си то́нцыи, и̂стонче́ни вѣ́тромъ, и̂зраста́хꙋ по ни́хъ. И̂ пожро́ша се́дмь кла́си то́нцыи и̂ и̂стонче́ни вѣ́тромъ, се́дмь кла́сѡвъ и̂збра́нныхъ и̂ по́лныхъ. воста́ же фараѡ́нъ, и̂ бѧ́ше со́нъ. Бы́сть же заꙋ̂тра, и̂ возмꙋти́сѧ дꙋша̀ е̂гѡ̀: и̂ посла́въ, созва̀ всѧ̀ сказа́тели е̂гѵ́петскїѧ, и̂ всѧ̀ мꙋ̂дрыѧ е̂гѡ̀: и̂ повѣ́да и̂мъ фараѡ́нъ со́нъ сво́й: и̂ не бѧ́ше сказꙋ̂ѧй тогѡ̀ фараѡ́нꙋ. И̂ речѐ старѣ́йшина вїна́рскъ къ фараѡ́нꙋ, глаго́лѧ: грѣ́хъ мо́й воспомина́ю дне́сь. Фараѡ́нъ разгнѣ́васѧ на рабы̀ своѧ̂, и̂ вве́рже на́съ въ темни́цꙋ въ домꙋ̀ а̂рхїмаги́ра, менѐ и̂ старѣ́йшинꙋ жита́рска. И̂ ви́дѣхомъ со́нъ о̂ба е̂ди́ныѧ но́щи а̂зъ и̂ о̂нъ, кі́йждо сво́й со́нъ ви́дѣхомъ. Бѧ́ше же та́мѡ съ на́ми ю̂ноша, о̂трокъ е̂вре́инъ а̂рхїмаги́ровъ, и̂ повѣ́дахомъ е̂мꙋ, и̂ разсꙋдѝ на́мъ. Бы́сть же, ꙗ̂коже сказа̀ на́мъ, та́кѡ и̂ слꙋчи́сѧ, мнѣ̀ па́ки бы́ти во свое́мъ старѣ́йшинствѣ, а̂ о̂номꙋ повѣ́шенꙋ. Посла́въ же фараѡ́нъ, призва̀ і̂ѡ́сифа: и̂ и̂зведо́ша е̂го̀

и҆з҄ тверды́ни, и҆ ѡ҆стриго́ша е҆го̀, и҆ и҆змѣни́ша ри́зы е҆мꙋ: и҆ прїи́де къ фараѡ́нꙋ. Рече́ же фараѡ́нъ і҆ѡ́сифꙋ: со́нъ ви́дѣхъ, и҆ сказꙋ́ѧй е҆гѡ̀ нѣ́сть: а҆́зъ же слы́шахъ ѡ҆ тебѣ̀ глаго́лющихъ, ꙗ҆́кѡ слы́шавъ сны̀, разсꙋжда́еши ты́ѧ. ѡтвѣща́въ же і҆ѡ́сифъ фараѡ́нꙋ, речѐ: без҄ бг҃а не ѡтвѣща́етсѧ спасе́нїе фараѡ́нꙋ. Рече́ же фараѡ́нъ і҆ѡ́сифꙋ, глаго́лѧ: во снѣ̀ мое́мъ мнѧ́хсѧ стоѧ́ти на бре́зѣ рѣ́чнѣмъ: и҆ а҆́ки и҆з҄ рѣкѝ и҆схожда́хꙋ се́дмь кра̑вы дѡбры̀ ви́домъ, и҆ и҆збра̑нны тѣлесы̑, и҆ пасѧ́хꙋсѧ по бре́гꙋ. И҆ се̑ дрꙋгїѧ се́дмь кра́въ и҆схожда́хꙋ въ слѣ́дъ и҆́хъ и҆з҄ рѣкѝ, ѕлы̑ и҆ недѡ́бры̀ ви́домъ, и҆ хꙋ́ды тѣлесы̑, ꙗ҆ковы́хъ не ви́дѣ таковы́хъ во все́й землѝ е҆гѵ́петстѣй хꙋ́ждшихъ. И҆ и҆з҄ѧдо́ша се́дмь кра̑вы ѕлы́ѧ и҆ хꙋды̑ѧ се́дмь кра́въ пе́рвыхъ до́брыхъ и҆ и҆збра́нныхъ. и҆ внидо́ша во оу҆трѡ́бы и҆́хъ, и҆ не ꙗ҆ви́шасѧ, ꙗ҆́кѡ внидо́ша во оу҆трѡ́бы и҆́хъ: и҆ ѡ҆бли́чїѧ и҆́хъ ѕла̑ бы́ша, ꙗ҆́кѡ и҆ и҆спе́рва: воста́въ же, (па́ки) оу҆снꙋ́хъ. И҆ ви́дѣхъ па́ки во снѣ̀ мое́мъ, и҆ а҆́ки се́дмь кла́си и҆схожда́хꙋ и҆з҄ е҆ди́нагѡ сте́блїѧ по́лны и҆ добры̀. Дрꙋзі́и же се́дмь кла́си то́нцыи и҆ вѣ́тромъ и҆стонче́ни и҆зница́хꙋ въ слѣ́дъ и҆́хъ. И҆ пожро́ша се́дмь кла́си то́нцыи и҆ вѣ́тромъ и҆стонче́ни се́дмь кла́сѡвъ до́брыхъ и҆ по́лныхъ. рѣ́хъ оу҆́бѡ сказа́телемъ, и҆ не бы́сть повѣ́даѧй мнѣ̀ тогѡ̀. И҆ речѐ і҆ѡ́сифъ фараѡ́нꙋ: со́нъ фараѡ́новъ е҆ди́нъ е҆́сть: е҆ли́ка бг҃ъ твори́тъ, показа̀ фараѡ́нꙋ. Се́дмь кра̑вы дѡ́брыѧ, се́дмь лѣ́тъ сꙋ́ть; и҆ се́дмь кла́си до́брїи, се́дмь лѣ́тъ сꙋ́ть. со́нъ фараѡ́новъ е҆ди́нъ е҆́сть. И҆ се́дмь кра̑вы хꙋды̑ѧ, ꙗ҆́же и҆зыдо́ша по си́хъ, се́дмь лѣ́тъ сꙋ́ть. и҆ се́дмь кла́си то́нцыи, и҆ и҆стонче́ни вѣ́тромъ, се́дмь лѣ́тъ сꙋ́ть: бꙋ́дꙋтъ се́дмь лѣ́тъ гла́да. Сло́во же е҆́же рѣ́хъ фараѡ́нꙋ, е҆ли́ка бг҃ъ твори́тъ, показа̀ фараѡ́нꙋ. Сѐ се́дмь лѣ́тъ прихо́дитъ, о҆би́льность мно́га во все́й землѝ е҆гѵ́петстѣй. Прїидꙋ́тъ же се́дмь лѣ́тъ гла́да по си́хъ: и҆ забꙋ́дꙋтъ сы́тѡсти бꙋ́дꙋщыѧ во все́мъ е҆гѵ́птѣ, и҆ погꙋби́тъ гла́дъ зе́млю: и҆ не позна́етсѧ о҆би́лїе на землѝ ѡт гла́да бꙋ́дꙋщагѡ по си́хъ: си́ленъ бо бꙋ́детъ ѕѣлѡ̀. Повтори́сѧ же со́нъ фараѡ́нꙋ два́жды, ꙗ҆́кѡ и҆́стинно бꙋ́детъ сло́во е҆́же ѡт бг҃а: и҆ оу҆скори́тъ бг҃ъ сотвори́ти о҆́но. Ны́нѣ оу҆́бо оу҆смотрѝ человѣ́ка мꙋ́дра и҆ смы́слена, и҆ поста́ви е҆го̀ над҄ земле́ю е҆гѵ́петскою: и҆ да сотвори́тъ фараѡ́нъ, и҆ поста́витъ мѣстоначальники по землѝ: и҆ да собира́ютъ пѧ́тꙋю ча́сть ѡт всѣ́хъ плодѡ́въ землѝ е҆гѵ́петскїѧ седмѝ лѣ́тъ о҆би́льныхъ: и҆ да соберꙋ́тъ всѧ́кꙋю пи́щꙋ седмѝ лѣ́тъ грѧдꙋ́щихъ до́брыхъ си́хъ: и҆ да собере́тсѧ пшени́ца под҄ рꙋ́кꙋ фараѡ́ню: пи́ща во градѣ́хъ да храни́тсѧ. И҆ бꙋ́детъ пи́ща соблюде́на землѝ на се́дмь лѣ́тъ гла́дныхъ, ꙗ҆́же и҆́мꙋтъ бы́ти въ землѝ е҆гѵ́петстѣй, да не потреби́тсѧ землѧ̀ въ гла́дѣ. Оу҆го́дно же бы́сть сло́во пред҄ фараѡ́номъ и҆ пред҄ всѣми рабы̑ е҆гѡ̀. И҆ речѐ фараѡ́нъ всѣ́мъ рабѡ́мъ свои́мъ: е҆да́ ѡбрѧ́щемъ человѣ́ка сицева́го, и҆́же и҆́мать дх҃а бж҃їѧ въ себѣ̀; Рече́ же фараѡ́нъ і҆ѡ́сифꙋ: поне́же пока-

за̀ бг҃ъ тебѣ̀ всѧ̑ сїѧ̑, нѣ́сть человѣ́ка мꙋдрѣ́йша и̂ смы́сленнѣйша па́че тебѐ. Ты̀ бꙋ̑деши въ домꙋ̀ мое́мъ, и̂ оу̑стъ твои́хъ да послꙋ̑шаютъ всѝ лю́дїе мои̇: ра́звѣ престо́ломъ а̑зъ бо́лѣе тебѐ бꙋ̑дꙋ. Рече́ же фараѡ́нъ і̂ѡ́сифꙋ: сѐ поставлѧ́ю тѧ̀ дне́сь надˢ все́ю земле́ю е̂гѵ́петскою. И̂ сне́мъ фараѡ́нъ пе́рстень съ рꙋкѝ своеѧ̀, возложѝ е̂го̀ на рꙋ̑кꙋ і̂ѡ́сифовꙋ: и̂ ѡ̂блечѐ е̂го̀ въ ри́зꙋ червле́нꙋ и̂ возложѝ гри́внꙋ зла́тꙋ на вы́ю е̂гѡ̀. и̂ всадѝ е̂го̀ на колесни́цꙋ свою̀ вторꙋю, и̂ проповѣ́да предˢ ни́мъ проповѣ́дникъ: и̂ поста́ви е̂го̀ надˢ все́ю земле́ю е̂гѵ́петскою.

Беларуская рукапісная Біблія пач. XVII ст.

По двох лѣтах видѣл фараѡн сонъ дивныˢ, потом тежъ дрꙋгиˢ, а ѡднои ночи, которих ему вси мꙋдрецы его выложит не могли. тепер подчашиˢ привѣлъ собѣ на памет иѡсифа, и его мудрост вспомнел в той мѣре: и ѡзнаˢмил цареви. цар росказал заразъ иѡсифа привест, ѡстрижоного и прибраного, бо был ꙗко вꙗзен нꙋжныˢ ѡдертыˢ и зарослыˢ и поставили перед ним. которому ѡнъ реклъ: мѣлом сны, а немашъ хто бы выложил, которое слышал есмъ же ты велми мудре выкладаешъ. ѡтповѣдалъ иѡсифъ: без мене богъ ѡтповѣдаеть речи счасливыи фараѡнови. Повѣдал теды фараѡн што видѣлъ. Здало ми сꙗ жем стоꙗл на берегꙋ реки, з которои выходило семъ коров велми ѡздобных и толстого тѣла, и паслисꙗ на мѣстцахъ мокрих. А по тых вышли дрꙋгии теж семъ коров, такъ шпетны и хꙋды жем николи таких на земли египетской не видѣл: и паслисꙗ на самом берегꙋ реки на мѣстцах зеленых, А пришедши до сытых пожерли ихъ, А сами жадного знаку сытости не дали, але так же были шпетны ꙗко и первѣй. ѡчнꙋвшисꙗ, зновꙋ твердо заснꙋвши, видѣл есмъ сонъ семъ колосов выростало из стебла ѡдного полныхъ и велми ѡздобных, А по них дрꙋгих семъ счꙋплых и тонкихъ з стебла выходило. которыи перших ѡздобных пожерли. ѡтповѣдал иѡсифъ: сонъ царскиˢ ѡдин есть: што богъ мает ꙋчинит ѡзнаˢмилъ фараѡнови. Семъ коров добрих и сем колосов полных, семъ лѣтъ суть ꙋрожаю живностꙗмъ, и ѡдно значене снꙋ замыкают. Семъ тежъ коров хꙋдых а шпетных котории вышли по них и семъ колосов тонкихъ и вѣтром варꙗчим заражоных суть голодꙋ пришлого, котории сꙗ тым порꙗдкомъ выполнꙗть. ѡто приˢдꙋть сем лѣтъ живности великой по всей земли египетской, по которих наступꙗт дрꙋгих семъ лѣт такого неꙋрожаю, же сꙗ запомнит всꙗ ѡбъфитост прошлаꙗ, голод бовѣмъ попсꙋе всю землю, А великост ѡбъфитостиˢ выгꙋбит великость недостатку. А што естес повторе видѣлъ сонъ, ку тоˢже рѣчи належачиˢ: знакъ есть певности же сꙗ стане мова божаꙗ и прꙋдко сꙗ выполнит, тепер тобѣ царю ражꙋ шꙋкати чл҃вка мудрого и довтипного, а дай ему преложенство над всею египетскою землею, коториˢ нехай постановит ꙋрꙗдники по всих краинах, абы ꙋрожаи збожꙗ всꙗкого през семъ лѣтъ ꙋрожаˢных котории ꙋже тепер

при^{s}д8ть, неха^{s} збирают до гумен, а все збоже под моцъю фараωновою неха^{s} сыпано и ховано будет по мѣстахъ. а нехай се наготует на сем лѣтъ пришлого голод8 которыи по них буд8т. Подобаласѧ рада фараωнови и всим слугам его, и мовил до них: аболи можемо на^{s}ти такового мужа, которы^{s} бы д8ха божего полны^{s} был. И реклъ до иωсифа: поневаж тобѣ богъ 8казалъ тое все што есь мовил, теды над тебе м8дръшаго и тобѣ подобного не найд8ю. ты справоват маешъ весь дом мой и панство мое, тебе вси слухат буд8т, самою толко столицею царскою продковат тебе буд8. А далъ ему перстен з р8ки своей, и 8бравши его в дорогие шаты, взложилъ ланц8хъ золоты^{s} на шию его. и всадит его на свой возъ втори^{s}, и по мѣсте ωбкликати казал, абы кожды^{s} зналъ преложоного над всим египтом а кланѧтсѧ ему и чтит его 8мѣлъ, ѧко первого по цари.

ДРУГАЯ КНІГА «ЦАРСТВЫ», ГЛ. 1, В. 1—15

Вульгата

1. Factum est autem, postquam mortuus est Saul, ut David reverteretur a caede Amalec, et maneret in Siceleg duos dies. 2. In die autem tertia apparuit homo veniens de castris Saul veste conscissa, et pulvere conspersus caput; et ut venit ad David, cecidit super faciem suam, et adoravit. 3. Dixitque ad eum David: unde venis? Qui ait ad eum: De castris Israel fugi. 4. Et dixit ad eum David: Quod est verbum, quod factum est? indica mihi. Qui ait: Fugit populus ex proelio, et multi corruentes e populo mortui sunt: sed et Saul et Jonathas filius ejus interierunt. 5. Dixitque David ad adolescentem, qui nuntiabat ei: Unde scis, quia mortuus est Saul, et Jonathas filius ejus? 6. Et ait adolescens, qui nuntiabat ei: Casu veni in montem Gelboe, et Saul incumbebat super hastam suam: porro currus et equites appropinquabant ei, 7. et conversus post tergum suum, vidensque me vocavit. Cui cum respondissem: Adsum, 8. dixit mihi: quisnam es tu? Et ajo ad eum: Amalecites ego sum. 9. Et locutus est mihi: Sta super me, et interfice me: quoniam tenent me angustiae, et adhuc tota anima mea in me est. 10. Stansque super eum, occidi illum: sciebam enim, quod vivere non poterat post ruinam, et tuli diadema, quod erat in capite ejus, et armillam de brachio illius, et attuli ad te dominum meum huc. 11. Apprehendens autem David vestimenta sua scidit, omnesque viri, qui erant cum eo, 12. et planxerunt, et fleverunt, et jejunaverunt usque ad vesperam super Saul, et super Jonathan filium ejus, et super populum Domini, et super domum Israel, eo quod corruissent gladio. 13. Dixitque David ad juvenem, qui nuntiaverat ei: Unde es tu? Qui respondit: Filius hominis advenae Amalecitae ego sum. 14. Et ait ad eum David: Quare non timuisti mittere manum tuam, ut occideres christum Domini?* 15. Vocansque David unum de pueris suis, ait: Accedens irrue in eum. Qui percussit illum, et mortuus est.*

Чэшская Біблія 1506 г.

Stalo se kdyż vmrzel gest král Saul: a Dawid nawrátiw se z porażky kterúż vczynil na Amalechythských byl gest w miestie Syczelech dwa dni. Trzetÿ pak den przyssel czlowiek z woyska Saulowa: mage na sobie rúcho roztrżene: a prachem posypal hlawu swú. A kdyż przyssel k Dawidowi padl ge na twarz swú przed nÿm klaniege se. Tehdy rzekl k niemu Dawid. Odkud gdess. kteryżto rzekl gemu. Z woyska żydowskeho vtekl gsem Tehdy dÿe gemu Dawid: kterak se stalo powiez mi. Kteryżto odpowiediew dÿe. Vtekl gest lid Izrahelsky z boge: a mnozÿ z nich padli a zbiti gsu: ale y Saul: y Jonathas syn geho zabiti gsú. Rzekl Dawid mladenczy kterýż mu rozpráwiel nowinu. Kterak ty to wÿesz: że zabit gest Saul a Jonatha syn geho. Odpowiediel mu mladenecz ten. Nahodú gsem przyssel na huoru Gelboe: a Saul byl spolehl na kopÿe swe: wozowe pak a gezdczy tiskli nań. Tehdy Saul obrátiw se zase: a vzrzew mie zawolal mne. Gemużto kdyż odpowiediel gsem: ted gsem. Y rzekl mi. kto gsy ty. Odpowiediel gsem mu. Já gsem czlowiek Amalechytsky. Tehdy rzekl mi przystupie ke mnie dobÿ mie: nebo vzkosti obklÿczyli mie: a gesstiet' gest dusse we mnie. Y stoge nad nÿm zabil gsem ho: neb gsem widiel że ne bude żyw gsa tak welmi ranen. A snial gsem korunu kteráż byla na hlawie geho y záponu s ramenú geho: a przynesl gsem k tobie panu memu sem. Tehdy Dawid vyaw rúcho swe roztrh na sobie: y wssyczkni mużÿe teeż kterzyż byli s nÿm a plakali gsú, a kwÿelili a postili se aż do weczera żelegÿcz Saule a Jonathy syna geho: y nad lidem pánie: y nad domem Izrahelským: żeby zmordováni byli meczem. Tehdy rzekl Dawid tomu poslu mládenczy: kterýż mu nowinu powiediel. Odkud gsy ty. Odpowiediel syn czlowieka Amalechytskeho yá gsem. Y rzekl gemu Dawid: żes ty smiel kdy ztáhnuti ruku swú: aby zabil pomazaného bożyeho. Tehdy powolaw Dawid gednoho z Służebnÿkuow rzekl mu. Przystúpie k niemu zabÿ ho. Y zabil ge ho.

Пераклад Скарыны

І бысть внегда ѕмерслъ ѣстъ Царь Саѵлс Давыдъ же в то времѧ поразивъши Амалехитѧнъ пребываше во граде Сицелехѕ два дсни. Въ третиѝ пакъ день прийде мужъ з войска Саѵлова, растерсзавыѝ ризы своѧ, ѝ посы[па] прахомс главу свою. И внегда вниде къ давы[ду] паде на лице своѣ кланѧючисѧ ѣму. И рече к нему Дв҃дъ ѡтколѣ ѝдеши. Онс же рече з войска Ізсрайльскаго ѕбежалъ ѣсмъ. То паки рече к нему Давыдъ ꙗко сѧ стало тамъ сповѣдаѝ ми. Онс же ѡтвеща ѝ рече, побежаша люди Ізсрайлевы з бою, ѝ мнози з нихъ падоша ѝ ѕмроша. Но ѝ Саѵлъ ѝ Енаѳа сынъ ѣго ѕбиты сѵть. И рече Дв҃дъ къ

человеку тому ѻ҆н҆ же поведал҆ ѐм8 новину сию̀ како веси тоѐ и҆же 8битъ ест Са8лъ и҆ Е҆наѳа сынъ ѐго. ѡтвеща к нему ѻ҆трокъ той 8текаю̀чи и҆ прии̇дохъ на гору Е҆львоѐ, и҆ сѣ Са8лъ налѧжаше на ѻ҆ружии̇ своѐм҆. Возы же и҆ ѐз҆дци приближахусѧ к нему, и ѻ҆зревшисѧ за собою̀ 8виделъ мѧ и҆ возвал҆ мѧ, ѐму же рекохъ сѣ азъ. И҆ гл҃а ко мне кто ѐси ты, ѡтвещахъ к нему А҆з҆ ѐсмъ мужъ А҆малехитѧнин҆. Тогда ми рече приступи ко мнѣ и҆ добий мѧ, понеже скор҆би ѻ҆дер҆жат҆ мѧ и҆ ѐще всѧ душа моѧ во мне ест, и҆ ꙗ҆ стоѧ над҆ нимъ добих ѐго. Видехъ бо ꙗ҆ко не будеть живъ тако велми з҆ранен сый. И҆ взѧхъ венець цар҆ский и҆же бѣ на главе ѐго и҆ запону съ рамени ѐго, и҆ принесохъ ѐ к тобе гс҃дину моѐму. Взѧвъ же Давыдъ ризы своѧ раз҆дра ѐ на собѣ. И҆ вси мужи и҆же бѣша с нимъ, и҆ плакашесѧ и҆ рыдашасѧ и҆ постишесѧ до вечера, жалую̀чи Са8ла и҆ Е҆наѳы сына ѐго, и҆ людей гс҃дьних и҆ дому І҆з҆раи̇лева, ꙗ҆ко побиѐны быша ѻ҆ружиѐмъ. Рече же Давыдъ ко ѻ҆троку воз҆вестившему ѐму новину сию̀ ѡткуду ѐси ты. О҆нъ же ѡтвеща к нему и҆ рече сынъ человѣка А҆малехитѧнина пришельца ѐсмъ а҆зъ. И҆ рече к нему Давыдъ, како не боꙗ҆лсѧ ѐси воз҆двигнути руки своѐѧ и҆ 8бити помазан҆ника божиѧ. Тогда позвалъ Давыдъ ѐдинаго ѡт слугъ свои̇хъ и рече ѐму приступи к нему и҆ 8бии̇ и҆. И҆ 8би ѐго и҆ 8мре.

Астрожская біблія

И бы́сть ѐгда̀ ѻ҆у́мре саоу́лъ, и҆ дв҃дъ възврати́сѧ побѣжа́ѧ а҆м҆мали́ка, и҆ сѣде давы́дъ въ скелазѣ дн҃и дв҃а. И҆ бысть въ тре́тїи дн҃ь, и҆ с҃е м8жъ прїиде ѡт полка людїи саоу́ловъ. ры́зы же ѐго бѧ́х8 раздра́ны и҆ прь́сть на главѣ ѐм8. и҆ бы́сть ѐгда вни́де къ дв҃д8 ѻ҆трокъ, и҆ пад на земли̇ поклони́сѧ ѐм8. И҆ рече ѐм8 дв҃дъ ѡтк8д8 ты прїиде. и҆ рече ѐм8 ѡт по́лъка і҆и҃лева, то́кмо а҆́зъ ѐсмь ѐді́нъ оу҆гоньзлъ. И҆ рече ѐм8 дв҃дъ чт҃о ѐсть слово с҃е възвѣсти м҃и. и҆ се́й рече ꙗ҆ко побѣго́ша лю́ди ѡт бра́ни, и҆ падо́ша мно́ѕи ѡт людїи і҆ и҆зъмро́ша. и҆ саоу́лъ и҆ ѻ҆анаѳа́нъ сн҃ъ ѐго ѻ҆у́мре. И҆ рече дв҃дъ ѻ҆трок8 възвѣщейшем8 ѐм8, како ви́дѣ ꙗ҆ко ѻ҆у́мре саоу́лъ і҆ ѻ҆анаѳа́нъ с҃нъ ѐго. И҆ рече ѻ҆трокъ възвѣща́ѧ ѐм8 бѣжа прїидо́хъ въ гор8 гелв8иск8ю, и҆ с҃е саоу́лъ натѧжа́шесѧ на ѻ҆р8жїе свое и҆ с҃е колесни́ци и҆ вельмо́жа събра́шасѧ на́нь. И҆ ѻ҆зрѣв҆сѧ саоу́лъ и҆ ви́дѣ м҃ѧ и҆ призвавъ м҃ѧ и҆ рече м҃и, кт҃о ты̀ ѐси. и҆ рѣхъ а҆м҆мали́китъ ѐсмь а҆́зъ. И҆ рече м҃и прїиди оу҆бо оу҆бїи м҃ѧ ꙗ҆ко о́бъѧт м҃ѧ оу҆же тма̀ лю́таѧ. и҆ къ сем8 ѻ҆у́же дш҃а моа̀ нѣсть въ мнѣ. И҆ прист8пихъ к нем8 оу҆бихъ и҆. ви́дѣхъ бо ꙗ҆ко не бѣ ѐм8 живота̀. по нападе́нїю ѐго, и҆ в҆зѧхъ вѣне́цъ цр҃ьскїи, и҆же б҃ѣ на главѣ ѐго и҆ ѻ҆скри́лъ ѐже б҃ѣ на пле́щ8 ѐго, и҆ принесохъ са́м҆ ѻ҆бо́е къ господи́н8 моѐм8. И҆ а́бїе

дв҃дъ ѐмˢсѧ за ри́зы своа̀, и̂ раздра ѧ҃. и̂ вс̂ѧ мꙋжи раздра́ша ри́зы своѧ̀ и̂же с ни*м*. И̂ бишасѧ и̂ пла́кашасѧ, и̂ постиша*с* до́ вечера по саоу́лѣ, и̂ по і̂о̂анаѳѣ сн҃ѣ ѐго и̂ по лю́де*х* і̂оу́дина*х*, и̂ по домꙋ і̂и҃левѣ ꙗ҆ко и̂збїе́ни бы́ша ѕѣло. И̂ рече дв҃дъ о҆́трокꙋ възвѣщˢшемꙋ ѐмꙋ, ѡ*т*кꙋдꙋ ты̀ ѐси. и̂ рече сн҃ъ мꙋжа ѡ*т* до́мꙋ а̂мˢмали́кова ѐсмь а҆́зъ. И̂ ре*ч* ѐмꙋ дв҃дъ. т̂о ка́ко не оу̂боѧ́сѧ въздви́гнꙋти рꙋкѝ своѧ на х҃а гн҃ѧ. Призва̀ дв҃дъ ѐді́наго ѡ*т* о҆́трокъ свои́хъ, и̂ рече и̂дѝ оу̂бїи ѐго, и̂ ше*д* оу̂би и̂, и̂ оу́мре.

Сучасная царкоўнаславянская Біблія

И̂ бы́сть ѐгда̀ оу́мре саꙋ́лъ, и̂ даві́дъ возврати́сѧ побѣди́въ а̂мали́ка, и̂ пребы́сть даві́дъ въ секела́зѣ днѝ два̀. И̂ бы́сть въ тре́тїй де́нь, и̂ сѐ мꙋ́жъ прїи́де ѡ*т* полка̀ люде́й саꙋ́ловыхъ, ри̂зы же ѐгѡ̀ (бѧ́хꙋ) раздра́ны, и̂ пе́рсть на главѣ̀ ѐгѡ̀: и̂ бы́сть ѐгда̀ вни́де къ даві́дꙋ (о҆́трокъ), и̂ па́дъ на землѝ поклони́сѧ ѐмꙋ̀. И̂ речѐ ѐмꙋ̀ даві́дъ: ѡ*т*кꙋ́дꙋ ты̀ прише́лъ ѐсѝ; и̂ речѐ ѐмꙋ̀: ѡ*т* полка̀ і̂сра́илева а҆́зъ и̂збѣго́хъ. И̂ речѐ ѐмꙋ̀ даві́дъ: что̀ сло́во сїѐ; возвѣсти́ ми. и̂ речѐ: ꙗ҆́кѡ побѣго́ша лю́ди ѡ*т* бра́ни, и̂ падо́ша мно́зи ѡ*т* люде́й, и̂ и̂змро́ша, и̂ саꙋ́лъ и̂ і̂ѡнаѳа́нъ сы́нъ ѐгѡ̀ оу́мре. И̂ речѐ даві́дъ о҆́трокꙋ возвѣсти́вшемꙋ ѐмꙋ̀: ка́кѡ зна́еши, ꙗ҆́кѡ оу́мре саꙋ́лъ, и̂ і̂ѡнаѳанъ сы́нъ ѐгѡ̀; И̂ речѐ о҆́трокъ возвѣща́ѧй ѐмꙋ̀: по слꙋ́чаю прїидо́хъ въ го́рꙋ гелвꙋ́йскꙋю и̂ сѐ саꙋ́лъ напада́ше на копїѐ своѐ, и̂ сѐ колесни́цы и̂ вельмѡ́жи собра́шасѧ на́нь. И̂ ѡ̂бозрѣ́сѧ вспѧть (саꙋ́лъ), и̂ ви́дѣ мѧ, и̂ призва́ мѧ. и̂ рѣ́хъ: сѐ а҆́зъ. И̂ рече́ ми: кто̀ ты̀ ѐсѝ; и рѣ́хъ: а̂маликі́тинъ ѐсмь а҆́зъ. И̂ рече́ ми: прїидѝ оу́бѡ на мѧ̀, и̂ оу̂бі́й мѧ̀ ꙗ҆́кѡ ѡ̂бѧ́тъ мѧ тма̀ лю́таѧ, ꙗ҆́кѡ ѐщѐ дꙋша̀ моѧ̀ во мнѣ̀. И̂ ста́хъ надˢ ни́мъ, и̂ оу̂би́хъ ѐго̀: вѣдѣ́хъ бо, ꙗ҆́кѡ не бꙋ́детъ жи́въ по паде́нїи свое́мъ. и̂ взѧ́въ вѣне́цъ ца́рскїй, и̂́же бѣ̀ на главѣ̀ ѐгѡ̀, и̂ нара́мницꙋ, ꙗ҆́же бѣ̀ на плещꙋ̀ ѐгѡ̀, и̂ принесо́хъ сїѧ къ господи́нꙋ моемꙋ̀ сѣмѡ. И̂ ѐмьсѧ даві́дъ за ри̂зы своѧ̀, и̂ раздра̀ ѧ҃: и̂ всѝ мꙋ́жїе, и̂́же съ ни́мъ раздра́ша ри̂зы своѧ̀. И̂ рыда́ша, и̂ пла́кашасѧ, и̂ пости́шасѧ до ве́чера ѡ̂ саꙋ́лѣ, и̂ ѡ̂ і̂ѡнаѳа́нѣ сы́нѣ ѐгѡ́, и̂ ѡ̂ лю́дехъ і̂ꙋдиныхъ, и̂ ѡ̂ до́мѣ і̂сра́илевѣ, ꙗ҆́кѡ и̂збїе́ни бы́ша мече́мъ. И̂ речѐ даві́дъ о҆́трокꙋ возвѣсти́вшемꙋ ѐмꙋ̀: ѡ*т*кꙋ́дꙋ ты̀ ѐсѝ; и̂ речѐ: сы́нъ мꙋжа прише́льца а̂маликі́тина ѐсмь а҆́зъ. И̂ речѐ ѐмꙋ̀ даві́дъ: ка́кѡ не оу̂боѧ́лсѧ ѐсѝ воздви́гнꙋти рꙋ́кꙋ твою̀ погꙋби́ти хрїста гс҃днѧ; И̂ призва̀ даві́дъ ѐди́наго ѡ*т* о҆́трѡкъ свои́хъ, и̂ речѐ: и̂дѝ, оу̂бі́й ѐго̀. и̂ оу̂бѝ ѐго̀, и̂ оу́мре.

Беларуская рукапісная Біблія пач. XVII ст.

И сталосѧ потом ꙗко ȣмерлъ саȣлъ, же сѧ дв҃дъ воротил ѡт поражки амалика, и мешкал в сикелагу два дни. А днѧ третего ȣказалсѧ чл҃вкъ идȣчи^{s} зъ ѡбозу Саȣлового, роздерши ѡдѣне, и головȣ порохом посыпавши. А коли пришол до дв҃да палъ на ѡбличе свое и поклонилсѧ. И реклъ до него дв҃дъ: ѡтколе идешъ; котори^{s} реклъ до него: ȣтеклъ есмъ зъ ѡбозȣ израилского, же ȣтеклъ людъ з битвы, и много з людȣ полегаючи померло. и саȣлъ и ѡанаѳан сын его згинȣли. и реклъ дв҃дъ до него: ꙗко вѣдаешъ же ȣмер саȣлъ и ѡанаѳанъ сын его; реклъ младенец з трафунку пришел есмъ на горȣ гелвȣйскую. А саȣлъ всткнены^{s} на меч свой, а возы и ездныи приближалисѧ к нему. И ѡбойзрѣвшисѧ назадъ а ȣзрѣвши мене взывал мовѧчи: хто есть ты; и реклъ есмъ до него: естесмъ Амаликита. и реклъ мнѣ стань надо мною а забий мѧ, бо мене знѧли тѧжкости, ижъ еще всѧ дȣша моѧ во мнѣ есть. А стоѧчи над нимъ забил есмъ его, бом видѣлъ же ȣже живъ быт не моглъ по ȣпадку. и взѧл есмъ корону котораѧ была на головѣ его, и манели з раменѧ его, и принеслъ есмъ тут до тебе пана моего. ȣхвативши теды дв҃дъ шаты свои роздерлъ, и вси мужове которыи з ним были. и жаловали и плакали, и постилисѧ ажъ до вечера длѧ саȣла и ѡанаѳана сына его, и длѧ людȣ господнего и длѧ дому изра^{s}левого же полегли мечем. и реклъ дв҃дъ до младенца которы^{s} ему был повѣдал: чемус се не боѧл поднести рȣки твоей, абыс забил помазанца гс҃днего; И призвал дв҃дъ ѡдного з слугъ своих реклъ: пойди а заби^{s} его. и ȣчинил такъ, и ȣмерлъ.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексютовіч М. А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд. Мн., 1958.
2. Анічэнка У. В. Моўныя асаблівасці выданняў Ф. Скарыны і рукапісных спісаў В. Жугаёва//Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. 1966. № 1.
3. Анічэнка У. В., Жураўскі А. І. Беларуска-іншаславянскі сінкрэтызм мовы выданняў Францыска Скарыны. Мн., 1988.
4. Апримене А. Ю. Особенности падежных форм имен существительных в Апостоле Ф. Скорины//Leksikos ir sintakses klausimai. Шяуляй, 1974.
5. Апримене А. Ю. К вопросу изучения орфографии письменных памятников//Mokymo ir auklejimo problemo. Шяуляй, 1974.
6. Апрымене А. Ю. Некаторыя асаблівасці займеннага скланення ў Апостале Ф. Скарыны//Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. 1975. № 5.
7. Апрымене А. Ю. Асаблівасці дзеяслоўных форм у Апостале Ф. Скарыны // Беларуская лінгвістыка. Мн., 1975. Вып. 7.
8. Баханькоў А. Я. Сінтаксіс скарынінскіх выданняў//450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.
9. Будилович А. Сочинения профессора П. В. Владимирова. А. Житие Алексея, человека божия. Б. Доктор Франциск Скорина: Его переводы, печатные издания и язык//Зап. Имп. Акад. наук. Т. 69, кн. I. Спб., 1892.
10. Булахаў М. Г. Прыметнік у беларускай мове. Мн., 1964.
11. Булахаў М. Г. Аб словаўтварэнні скарынінскіх выданняў//450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.
12. Булич С. Церковнославянские элементы в современном литературном и народном русском языке. Спб., 1893. Ч. I.
13. Булыка А. М. Адлюстраванне фанетычных рыс беларускай мовы ў выданнях Ф. Скарыны.//450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.
14. Булыка А. М. Чэшская лексіка ў выданнях Ф. Скарыны//Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. 1970. № 4.
15. Булыка А. М., Жураўскі А. І., Крамко І. І. Гістарычная марфалогія беларускай мовы. Мн., 1979.
16. Булыко А. Н. Западнославянская лексика в изданиях Франциска Скорины//Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979.
17. Булыко А. Н. Лексика изданий Ф. Скорины как источник исторического словаря белорусского языка//Франциск Скорина — белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мн., 1989.
18. Вайан А. Руководство по старославянскому языку. М., 1952.
19. Ван-Вейк Н. История старославянского языка. М., 1957.
20. Владимиров П. В. Доктор Франциск Скорина: Его переводы, печатные издания и язык. Спб., 1888.
21. Воўк-Левановіч Я. Мова выданняў Францішка Скарыны//400-лецце беларускага друку. Мн., 1926.

22. Журавский А. И. Важнейшие особенности языка изданий Франциска Скорины//Франциск Скорина и некоторые вопросы развития книги в Советском Союзе. Вильнюс, 1979.

23. Журавский А. И. Язык предисловий Франциска Скорины//Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979.

24. Журавский А. И. Франциск Скорина//Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986.

25. Журавский А. И. Языковые особенности «Малой подорожной книжки» Ф. Скорины//Франциск Скорина белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мн., 1989.

26. Жураўскі А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1967. Т. 1.

27. Жураўскі А. І. Мова друкаваных выданняў Ф. Скарыны//450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.

28. Карский Е. Ф. Белорусы. Т. III. Очерки словесности белорусского племени. 2. Старая западнорусская письменность. Пг., 1921.

29. Кривчик В. Ф., Можейко Н. С. Старославянский язык. Мн., 1970.

30. Linde S. B. O statucie litewskim ruskim językiem i drukiem wydanym wiadomość. Warszawa, 1816.

31. Ломцеў П. Скарына як пачынальнік беларускай літаратурнай мовы// Беларусь. 1945. № 3.

32. Ломцеў П. Георгій Скарына — першы беларускі кнігавыдаўца//Беларусь. 1945. № 6.

33. Martel A. La langue polonaise dans les pays ruthenes, Ukraine et Russie Blanche. 1569—1667. Lille, 1938.

34. Мова беларускай пісьменнасці XIV—XVIII стст. Мн., 1988.

35. Murko M. Zur russischen Literaturgeschichte//Archiv für slavische Philologie. Zwölfer Band. Berlin, 1890.

36. Назор А. О словаре хорватско-глаголической редакции общеславянского литературного (церковнославянского) языка // Вопр. языкознания. 1966. № 5.

37. Парукаў А. А. Важнейшыя арфаграфічныя асаблівасці неперакладных выданняў Скарыны//Рэгіянальныя асаблівасці беларускай мовы, літаратуры і фальклору. Гомель, 1973.

38. Парукаў А. А. Некаторыя марфалагічныя асаблівасці неперакладных выданняў Скарыны//Беларуская мова і мовазнаўства. Мн., 1978. Вып. II.

39. Парукаў А. А. Словаўтваральная сістэма назоўнікаў у неперакладных выданнях Скарыны//Беларуская мова і мовазнаўства. Мн., 1975. Вып. III.

40. Парукаў А. А. Асаблівасці лексікі скарынінскіх неперакладных выданняў//Беларуская мова і мовазнаўства. Мн., 1976. Вып. IV.

41. Парукаў А. А. Лексіка-семантычная варыянтнасць у прадмовах і пасляслоўях Скарыны//Беларуская мова. Мн., 1980. Вып. 7.

42. Парукаў А. А., Клеўжыц Г. А. Выражэнне галоўных членаў сказа ў прадмовах і пасляслоўях Скарыны // Беларуская мова. Мн., 1987. Вып. 15.

43. Picchio R. Church Slavonic//The Slavic Literary Languages: Formation and Development. New Haven, 1980.

44. Подокшин С. А. Франциск Скорина. М., 1981.

45. Сацута І. У. Дзеясловы прошлага часу ў перакладных выданнях Ф. Скарыны//Беларуская лінгвістыка. 1985. Вып. 27.

46. Сацута І. У. Дзеясловы цяперашняга і будучага часу ў перакладных выданнях Ф. Скарыны//Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. 1985. № 1.

47. Свежинский В. М. Факторы формирования языка скорининских изданий// Франциск Скорина — белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мн., 1989.

48. Свяжынскі У. М. Слова Скарыны. Мн., 1984.

49. Слоўнік мовы Скарыны/Склад. У. В. Анічэнка. 1. А—О. Мн., 1977; 2. П — Я. Мн., 1984.

50. Соболевский А. И. Доктор Франциск Скорина: Его переводы, печатные издания и язык: Исследования П. В. Владимирова //Журн. М-ва нар. просвещения. 1888. Окт.

51. Соболевский А. И. История русского литературного языка. Л., 1980.

52. Станівський М. Ф. Старослов'янська мова. Львів, 1964

53. Флоровский А. В. Чешская Библия в истории русской культуры и письменности: (Франциск Скорина и продолжатели его дела)//Sbornik filologicky. SV. XII. Praha, 1940—1946.

54. Шакун Л. М. Ф. Скарына і пытанні гісторыі беларускай літаратурнай мовы//450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.

55. Шакун Л. М. Стилистика скоринининских предисловий//Франциск Скорина — белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мн., 1989.

56. Якубинский Л. П. Избранные работы. Язык и его функционирование. М., 1986.

ЗМЕСТ

УСТУП 5

АРФАГРАФІЯ 11

НАЗОЎНІК 22

Асновы на * *о* . 22
Адзіночны лік . 22
Множны лік 29
Парны лік 36
Асновы на * *u* . 37
Адзіночны лік . 38
Множны лік 40
Парны лік 42
Асновы на * *а* . 43
Адзіночны лік . 43
Множны лік 45
Парны лік 48
Асновы на * *і* . 50
Адзіночны лік . 50
Множны лік 52
Парны лік 54
Асновы на *ŭ* . . 54
Адзіночны лік . 54
Множны лік . 55
Асновы на зычныя 56
Адзіночны лік . 56
Множны лік 58
Парны лік 60

ЗАЙМЕННІК 62

ПРЫМЕТНІК 78

Формы іменных прыметнікаў 78
Формы поўных адносна-якасных прыметнікаў 82
Прыналежныя прыметнікі 89
Формы ступеней параўнання якасных прыметнікаў 94

ЛІЧЭБНІК 96

ДЗЕЯСЛОЎ 105

Цяперашні час 106
Будучы час 113
Аорыст 118
Імперфект . 123

Плюсквамперфект 127
Перфект . . 129
Загадны лад . 138
Умоўны лад . 145
Дзеепрыметнік 148
Інфінітыў 161
Нетэматычныя дзеясловы 163
Формы парнага ліку 170

ЛЕКСІКА 172

ЗАКЛЮЧЭННЕ 210

ДАДАТАК 234

Быццё, гл. XLI, В. 1—41 235
Вульгата 235
Чэшская Біблія 1506 г. 236
Пераклад Скарыны . 238
Астрожская біблія 239
Сучасная царкоўнаславянская Біблія . . 241
Беларуская рукапісная Біблія пач. XVII ст. 243
Другая кніга «Царствы», гл. 1, В. 1—15 244
Вульгата 244
Чэшская Біблія 1506 г. 245
Пераклад Скарыны . 245
Астрожская біблія 246
Сучасная царкоўнаславянская Біблія . . . 247
Беларуская рукапісная Біблія пач. XVII ст. 248

Літаратура 249

Научное издание

Булыко Александр Николаевич
Журавский Аркадий Иосифович
Свежинский Владимир Митрофанович

ЯЗЫК ИЗДАНИЙ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

Минск, издательство «Навука і тэхніка»

На белорусском языке

Навуковае выданне

Булыка Аляксандр Мікалаевіч
Жураўскі Аркадзій Іосіфавіч
Свяжынскі Уладзімір Мітрафанавіч

МОВА ВЫДАННЯЎ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

Загадчык рэдакцыі *У. М. Ківатыцкі*
Рэдактар *А. М. Садоўская*
Мастак *Вікт. В. Саўчанка*
Мастацкі рэдактар *В. В. Саўчанка*
Тэхнічны рэдактар *С. А. Курган*
Карэктар *З. Я. Губашына*

ІБ № 3613

Друкуецца па пастанове РВС АН БССР.
Здадзена ў набор 31.01.90.
Падпісана ў друк 25.06.90.
Фармат 60×90¹/₁₆.
Папера офс. кн. журн.
Гарнітура літаратурная.
Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 16,0.
Ум. фарб.-адб. 18,0.
Ул.-выд. арк. 17,17.
Тыраж 940 экз.
Зак. № 279
Цана 3 р. 30 к.

Выдавецтва «Навука і тэхніка»
Акадэміі навук БССР
і Дзяржаўнага камітэта БССР
па друку
220600. Мінск, Жодзінская, 18.
Друкарня імя Францыска Скарыны
выдавецтва «Навука і тэхніка».
220600. Мінск, Жодзінская, 18.

Булыка А. М. і інш.

Мова выданняў Францыска Скарыны / А. М. Булыка. А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі.— Мн.: Навука і тэхніка, 1990.—253 с.

Б 90

ISBN 5-343-00447-4.

Язык изданий Франциска Скорины

Праца прысвечана 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны. У ёй даецца агульная характарыстыка беларускай літаратурна-пісьмовай мовы эпохі Скарыны. У выніку вывучэння непасрэдна па арыгіналах пражскіх кніг Скарыны паказаны арфаграфічныя і фанетычныя асаблівасці гэтых выданняў, выяўлены суадносіны царкоўнаславянскіх, беларускіх і заходнеславянскіх элементаў у сістэме назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, дзеясловаў. Асобны раздзел прысвечаны вывучэнню лексікі скарынінскіх кніг.

Адрасуецца філолагам, спецыялістам у галіне гісторыі беларускай мовы, усім, хто займаецца вывучэннем гістарычнага мінулага беларускага народа.

Б $\frac{4602020100-110}{M316(03)-90}$ 140—90

ББК 81.2Бел+76.11



3 р. 30 к.

МОВА ВЫДАННЯЎ СКАРЫНЫ